**Іван Шамякін**

# Пошукі прытулку

Аповесці

Мінск
Юнацтва
2001

УДК 882.6-93
ББК 84(4 Беи)6-44 Ш 19

Мастак У. М. АНІСЬКА
*Для старэйшага школьнага ўзросту*

ISBN 985-05-0430-7

©Шамякін І. П., 2001

# СЛАЎСЯ, МАРЫЯ!

## Гісторыя кахання, любові, жыцця

> Любовь — благо, быть любимым — счастье. Какое странное и верное слово, что муж и жена (если они живут духовно) не двое, а одно существо.
>
> Леў ТАЛСТОЙ

Пасля таго ўжо, як я праводзіў у апошні шлях маю незабыўную Машу, жонку і найлепшага сябра, я прачытаў у Буніна, здаецца, у «Деревне», герой чытае ў свяшчэннай кнізе (няма, аднак, зноскі, з якога гэта Евангелля ці апостальскага паслання): «Плачу и рыдаю, егда помышляю смерть и вижу в гробе лежащую по образу божию созданную нашу красоту, безобразную, безгласную, не имеющую вида...»

Уразіла моцна, але згадзіцца, што ў труне ляжала безобразное, я не мог і не магу дагэтуль, хоць учора адбыліся саракавіны. І ў труне, пасля сямі месяцаў (як выяўлена хвароба) цяжкой невылечнай хваробы — лейкоза — яна была для мне прыгожай. Я халадзею ад уяўлення магілы. Але бачу яе ва ўсіх сваіх успамінах, думах толькі жывой — по «образу божию созданную красоту».

Больш імпануюць мне словы, якія пачуў у пасрэдным фільме «Командор и Анна»; там драматург суцяшае ўдаву загінуўшага на атамных выпрабаваннях героя: «Калі з двух людзей, што кахаюць адзін аднаго, жывы застаецца адзін, гісторыя іх жыцця, іх кахання прадаўжаецца».

Гэта праўда. Гісторыя нашага з Машай кахання, любові, жыцця прадаўжаецца, пакуль я хаджу па зямлі і магу трымаць у руцэ пяро. І гэта дае мне права напісаць яе: гісторыю нашу. Для дзяцей, унукаў, для усіх, хто кахае, хто будзе кахаць — для тых, хто зліецца ў «одно существо».

Ёсць яшчэ адна прычына для такога вельмі цяжкога па душэўным стане майго сачынення.

На памінальным абедзе ў дзень пахавання я сказаў, якой бясцэннай і незаменнай Маша была памочніцай у маёй пісьменніцкай працы: перадрукавала не адзін дзесятак тысяч старонак рукапісаў (я пішу ад рукі, не асвоіў машынку — не было патрэбы), перачытала гэтыя ж тысячы старонак карэктур, і неаднойчы, некаторыя па некалькі разоў пры перавыданнях, я карэктуру перавыданняў не

чытаў — шкадаваў часу, ён патрэбны быў для напісання новага, я жыў, калі сачыняў новы раман, аповесць, п'есу.

Пасля мяне выступіў Іван Навуменка і сказаў:

— Іван Пятровіч расказаў, якой памочніцай была яму Марыя Філатаўна. Але ён не сказаў самага істотнага, што для літаратуры важней. Марыя Філатаўна з'явілася прататыпам многіх вобразаў жанчын у шамякінскіх раманах, аповесцях. Можаце ўявіць, якая гэта была натура, які характер, калі гэтага хапіла на дзесятак, калі не больш, яркіх, запамінальных характараў беларускіх жанчын.

І гэта праўда. Я не часта задумваўся над гэтай асаблівасцю сваіх твораў. Але я не знаў блізка многіх жанчын, а вобразаў стварыў сотні. «Трэба ўмець!» — казаў Андрэй Макаёнак. Бліжэй за ўсё да Машы — Саша Траянава з «Трывожнага шчасця», гэта рэч у многіх сваіх і сюжэтных хадах, і характарах аўтабіяграфічная, асабліва аповесць першая «Непаўторная вясна» і аповесць пятая — «Мост»; у аповесці «Агонь і снег» Сашы няма, але Пятро жыве, ваюе, кахаючы яе.

А хіба Таццяна Маеўская з «Глыбокай плыні» не Маша? І сюжэтная канва з першай часткі — жыццё сям'і Кротавых у акупацыі. А фельчарка Тася Батрак з рамана «Вазьму твой боль», Поля з «Атлантаў і карыятыдаў», якія па часе напісання адстаюць ад першага майго рамана гадоў на трыццаць, — у іх характар маёй жонкі, яе вернасць, адданасць мужу, дзецям. Ёсць вобразы, якія па сюжэце далёкія ад жыцця Марыі Філатаўны, але тыя з маіх калег, якія блізка ведалі яе, як Андрэй Макаёнак, Іван Навуменка, Алесь Савіцкі, пазнавалі асобныя рысы. Такая Вольга Ляновіч з «Гандляркі і паэта», Надзея са «Снежных зім». Вольга — зусім іншы характар — імпульсіўная, у нечым нават авантурная, нахабная, што Машы было зусім не ўласціва. Але калі я пісаў раздзелы пра яе каханне і яе свядомае ўступленне ў барацьбу з акупантамі, я, добра помню, не раз думаў: а на каго з прататыпаў, якія акружалі мяне, «прымераць» яе ўчынкі? Хто мог бы ў дадзенай сітуацыі паступіць так, як вымагае сюжэт, а не інакш? Ядвіга Паўлаўна? З яе, сваёй суседкі, пісаў іншыя рысы Вольгі — весялосць, дасціпнасць, умение гандляваць. Але гераічныя... Ядвіга здольная на подзвіг? На такі, які дыктаваўся логікай развіцця характара; я слаба ведаў яе. Маша? Толькі Маша магла гэтак стаць падпольшчыцай, ехаць у партызанскую зону і, выкрытая паліцаем, узарваць яго і сябе. Толькі Маша! Я нават спытаў яе: «Змагла б?» Яна прачытала рукапіс і не адразу адказала: у Вольгі заставалася дзіця і ў яе была ў акупацыі малая Ліна, яна не вазіла партызанам міны, але ў сітуацыі, якія пагражалі смерцю, траплялa. Яна адказала: «У мяне

было столькі нянавісці да іх, да немцаў, што я на ўсё пайшла б... на смерць дык на смерць. Ты хіба не пайшоў бы?»

Аднак я забягаю наперад.

Яшчэ пра адзін вобраз, у пэўным сэнсе парадаксальны, супярэчлівы. Галіна Адамаўна, жонка доктара Яраша з рамана «Сэрца на далоні». Ніхто, нават Андрэй, не пазнаў у Галіне Машу. А між тым, каюся, гэта была своеасаблівая помета аўтара ўласнай жонцы за яе... рэўнасць. Некаторы нядоўгі час Маша, маючы траіх дзяцей, раўнавала мяне да кожнай спадніцы.

Нельга было зірнуць на прыгожую жанчыну, пацалаваць руку Лене Макаёнак, што Маша аднойчы ўбачыла; няшчасная была мая галава: пасля таго вечара яна спіхнула мяне з ложка, калі я дзеля прымірэння палез з пяшчотамі.

Маша, перадрукоўваючы рукапіс, пазнала рысы сваёй рэўнасці і сказала без злосці, бадай, з гумарам: «І тут ты абсмактаў мяне, пісака».

Між іншым, зноў я апярэджваю расказ пра падзеі нашага доўгага жыцця. 58 гадоў разам! Я лічу і пяць армейскіх ваенных гадоў: і там, у Запаляр'і, яна была заўсёды са мной, а я з ёй тут, у Церусе, у знаёмых з маленства лясах Маркавіцкага лясніцтва.

У ранейшых сваіх успамінах я не раскрываў чытачу гісторыю тыпаў і прататыпаў, мне здавалася, гэта аслабіць эмацыянальнае ўздзеянне: апісаў сваю жонку! Але ўсё роўна ўдумлівыя літаратуразнаўцы, як Іван Навуменка, Андрэй, гэта прачытвалі. Цяпер, калі Машы не втала, я не думаю, што гісторыя нашага кахання, жыцця штосьці «ўкрадзе» з мастацкіх твораў. Бадай, наадварот. У маладых чытачоў, асабліва ў тых, хто вывучае літаратуру, яна павінна выклікаць павышаную ўвагу і цікавасць, даць уяўленне, як нараджаецца мастацкі твор.

Я пісаў самага дарагога мне Чалавека пад іншымі імёнамі, ставячы яе ў розныя сітуацыі, якіх у сапраўднасці не было, якія сачыняліся аўтарам. Без гэтага не было б мастацкага твора.

Я абавязаны напісаць пра яе жывую, рэальную, такую, якой яна была, — вельмі простай, зямной і ў той жа час незвычайнай. Я не паўтару сваіх герaінь, хіба толькі адну — Сашу Траянаву: у «Непаўторнай вясне», у «Мосце» многа біяграфічнага. Але такі паўтор мяне не палохае і не можа спыніць.

Ітак, — вось яна — гісторыя нашага кахання, нашай любові, нашага доўгага жыцця.

Леснікоў, як і Міхала з «Новай зямлі», і ў савецкі час нярэдка пераводзілі з месца на месца, па волі ляснічага, часта без тлумачэння прычыны. Так увосень 1933 года перавялі майго бацьку з абхода пад Краўцоўкай у Пыхань (афіцыйная назва — Епофань, народ скараціў, і цяпер прыжылася народная назва). Пыхань — цэнтр лясніцтва з добрым домам ляснічага, аб'ездчыка, з чырвоным кутком, з крамай, сушылкай для шышак. Бацьку перавялі туды не леснікам, а... крамшчыкам. Была гэта ласка ці здзек пана Войтава — і дагэтуль пэўна не ведаю. Бацьку шэсць гадоў назад парубшчыкі падстрэлілі, і ён моцна кульгаў (аднак гэта не пашкодзіла Пятру Шамяку пасля таго яшчэ трыццаць гадоў вартаваць лес і лічыцца лепшым лесніком). Дык паспагадаў ляснічы ці паздзекаваўся? Здзек быў у тым, што граматы ў бацькі было два класы царкоўнапрыходскай школы. Але куды дзенешся, кал і пад Краўцоўку яшчэ летам прыехаў новы ляснік. Між іншым, бацьку тады ж прапанавалі новае месца — ва ўрочышчы Воленка пад Пракопаўкай. І мы паехалі туды. Пагрузіліся на тры фурманкі, ехалі цэлы дзень — ажно дваццаць вёрст. Не ведаю, як бацька дамаўляўся: ездзіў жа прымаць абход. Але калі мы позна ўвечары прыехалі з самымі малымі, ляснік, якога звалілі, не пусціў нас у леснічоўку — са стрэльбай выйшаў. Круглікаў быў партызан грамадзянскай вайны. Ад ранения ішлі дзівосы партызана ці ад таго, што сын яго быў пракурорам — не ведаю.

Пераначаваўшы на двары (дзяцей Круглікаў усё ж пусціў у хату), мы на другі дзень рушылі назад пад Краўцоўку. Маці ўсю дарогу плакала: «А калі і Харкоў не пусціць?» Харкоў пасмяяўся: «А я ведаў, што ён вас не пусціць, гэты «будзёнавец» і не такія «конікі» выкідваў».

Тры месяцы бацька рабіў пажарнікам — сезонная праца.

І вось мы едзем у Пыхань. Безумоўна, для нас з Паўлам пераезд — падзея, хоць з Краўцоўскай школай я развітваўся са смуткам: любіў настаўніцу Валянціну Андрэеўну Рабцаву і нават паспеў закахацца ў дзяўчынку, якая прыехала з сястрой-крамшчыцай у нашу школу. Апранутая ў крамнае, яна паланіла мяне, трынаццацігадовага эстэта, незвычайнасцю, непадобнасцю на «палатняных» краўцовак, мурзатых, босых. У Гашы былі туфелькі, панчохі, як у гарадскіх. І мова гарадская. Надзвычайная з'ява дзіцячая закаханасць, памойму, нават Талстой і Бунін не апісалі ўсю пекнату такога наіўнага кахання.

З Пыхані да Краўцоўкі восем вёрст, і я ў выхадныя колькі разоў хадзіў туды. Цягнула пабачыць Гашу. Праходзіў міма яе хаты, заглядваў у акно, але ні разу так і не пабачыў. І каханне згасла.

У Пыхані сям'ю крамніка пасялілі ў доме, другую палавіну якога займаў чырвоны куток, там праходзілі сходы леснікоў, рабочых, і нам чутны былі ўсе размовы, і мне асабіста яны здаваліся цікавымі: грамацей, як называў мяне бацька, я ведаў амаль усе тайны прафесіі. Але суседства з чырвоным кутком дало мне значна больш — багацце кніг, на якое ў Краўцоўцы быў голад: усё, што было ў Валянціны Андрэеўны, я прачытаў, а больш кніг ні ў каго з бацькоў маіх аднакласнікаў не было. Якія кнігі!

У пачатку я карыстаўся кніжнай шафай нелегальна: выявіў, што калі ўзлезці на грубку, то там каля самай столі — шчыліна ў суседнюю палавіну, з якой трапляў на тую ж шафу; дзіця лесу, лазіў, што вавёрка.

Але здарыўся камічны выпадак. Кал і я корпаўся ў кнігах, прыйшоў загадчык кутка кульгавы Цімох Цыкуноў, пасля ляснічага самы адукаваны чалавек.

Куды дзецца? І я залез у шафу ў ніжні адсек — на падшыўкі газет. А Цімох прыйшоў не адзін — з сябрамі, і яны селі гуляць у шахматы. І я, нябога, заснуў у шафе і выдаў сябе храпам. Хлопцы вывалаклі мяне, здзівіліся, але смяяліся.

— Ты як трапіў сюды, кот шкадлівы?

— Дзядзечка Цімох, а я кнігі ў вас бяру, але, прачытаўшы, кладу назад. Палічыце — усе на месцы.

— Дзівак! Па кнігі мог бы хадзіць і праз дзверы.

Во жыццё настала: доступ да ўсіх кніг! Я дагэтуль удзячны Ціможу, якому лес, на жаль, адвёў мала гадоў: сухоты касцей звялі яго ў магілу, ад сухот памерла і яго сястра, з якой я хадзіў у Церухскую школу.

Да Церухі было больш трох кіламетраў па лясной дарозе, абапал якой стаялі гонкія сосны, бярозы, дубы, шапкамі сваімі дастаючы аблокі.

З Пыхані хадзіў я і брат мой Павел — у трэці клас. А побач, на другім беразе рэчкі Церуха, быў ладны пасёлак Каралін, адкуль хадзіла нямала вучняў. Але сяброўства з імі не наладжвалася: я картавіў, і яны дражнілі мяне, хоць у Краўцоўцы чамусьці ніхто не звяртаў увагі, ніхто не крыўляў.

Школа змяшчалася ў былым папоўскім доме, два класныя пакоі, займаліся паралельна пяты і сёмы, тосты — у другую змену; «першая ступень», як называлі малодшыя класы, вучылася ў дарэвалюцыйнай школе, маленькай, струхнелай, халоднай.

Мяне пасадзілі з двума хлопцамі, імёны якіх я не помню. Але імёны траіх дзяўчат, якія сядзелі за маёй партай, захаваліся на ўсё

жыццё. Як не помніць! Маша Кротава! Ліда Блінцова, Тамара Дзегцярова.

Маша была маленькая, рыжанькая, з вялікімі блакітнымі вачамі, вельмі жывымі, выразнымі, у іх адбіваліся ўсе яе пачуцці — здзіўленне, радасць, расчараванне, крыўда. Маша была самая ціхая і самая далікатная, па-сучаснаму сказалі б — інтэлігентная. Былі такія дзеці і ў сялянскіх сем'ях.

Дзяўчаты ў першыя ж дні выявілі, што я добра рашаю задачы, і патрабавалі, каб рашэнне перадаваў ім — на паперцы, настаўнік Старосценка быў строгі, яго баяліся, і я баяўся. Але Тамара была дзяўчынка настырная і смелая. Калі я не даваў рашэнне, яна і Ліда скублі вавёрчын каўнерык майго паліто, пашытага з бацькавага фрэнча. І так выскублі, што ўтварыліся лысіны, бацька ўбачыў іх — здзівіўся:

— Сабакі лізалі твой каўнер, ці што? Зімовая вавёрка. Гомельскія барышні з рукамі адарвалі б, каб павёз такую вавёрку.

Не скажу, што я закахаўся ў Машу, як у Гашу. Але ўвагу маю яна прыцягвала і як бы набівалася на сяброўства. Я даваў ёй — не языкатай Тамары — рашэнне задач, яна, заглядваючы праз плячо, неяк вельмі ўмела паказвала на мае памылкі ў дыктантах; я «плаваў» у рускай мове; дачка святара Валянціна Андрэеўна дала мне добрыя веды па беларускай мове і чамусьці не лепшыя па рускай; здаецца, толькі ў арміі я навучыўся пісаць без памылак.

Дырэктарам школы быў Салодкі (забыўся імя яго, імя па бацьку) — чалавек вясёлы і дасведчаны, яго аповяды пра грамадзянскую вайну, пра яго ўдзел у ліквідацыі банды Галакі (імя гэтае было на языках у сялян вакольных вёсак, і асабліва прыпаміналі бандыта дабранскія яўрэі). Але Салодкі меў звычку даваць хлопцам пстрычку па носе ці алоўкам па лбе. Мне даставалася часта, бо на мяне скардзіліся каралінскія дзяўчаткі, што па дарозе я іх б'ю. У Краўцоўцы я паводзіў сябе прыкладна — лепшы вучань, ды і наогул ні з кім не біўся ні да таго, ні пасля. А тут чамусьці стаў хуліганісты — па-за школай, з каралінцамі, якія здзекаваліся, называлі мяне «калова», хоць да таго часу я ўжо вымаўляў «р» зусім нядрэнна.

Запомніўся адзін выпадак — крыўдны і кранальны. Салодкі колькі разоў папярэдзіў, каб я пастрыгся, бо хадзіў лахматы, як краўцоўскі воўк (чаму краўцоўскі — няўцям мне было). Помню, з-за ўпартасці ці таму, што ў Пыхані не было каму пастрыгчы, я адкладваў гэтую працэдуру. І тады Салодкі прынёс вялікія нажніцы — казалі, авечыя, — пасадзіў мяне на перапынку на табурэт і пачаў сам стрыгчы. Дырэктар слабы быў псіхолаг: не ўяўляў, як гэта вучню

пятага класа было абразліва... Перад усім жа класам! Большасць вучняў зларадна смяялася — дзеці жорсткія — і кідала ўедлівыя жартачкі: «Стрыгуць, як барана». І толькі адна худзенькая дзяўчынка не смяялася, яна стаяла насупраць, на твары яе адбівалася пакута, быццам стрыглі яе самую, а ў шырокіх, заўсёды як бы здзіўленых вачах плавал і слёзы. Гэта была Маша. Яна спачувала мне, шкадавала, бадай жа, па-матчынаму. Яе спагада кранула мае «ачарсцвелае» сэрца. Расчулены, я ледзьве ўтрымаўся, каб не зараўці. І, помню, падумаў: «Во адзіны сапраўдны сябра. Даражэй за сястру. Цяпер адной ёй буду паказваць рашэнне задач».

І з таго дня праяўляў да яе асаблівую ўвагу, хоць яна пачала пазбягаць мяне і памылкі не падказвала, бо дзяўчаткі-сарокі пачалі стракатаць, што ляснік — Машын жаніх. Яна саромелася. А мая брацкая пяшчота да яе расла. Пэўна, тады ўжо магла б вырасці ў юнацкае каханне, каб мы вучыліся разам — у шостым класе, у сёмым. Але хадзіў я ў Церухскую школу ўсяго месяцы тры.

Бацька мой пратаргаваўся ў краме, мусіў прадаць цёлку, каб пакрыць нястачу. Між іншым, бацькаву працу я ненавідзеў, можа, больш, чым мая маці. Яна баялася, што ён пратаргуецца, помню, як галасіла, калі рэвізія выявіла нястачу: «Пасадзяць дурня ў турму». Я ненавідзеў па іншай прычыне: з-за абавязкаў, якія бацька ўсклаў на мяне па краме. Была картачная сістэма. З імяннога ліста кожнага спажыўца бацька выразаў маленькія картачкі-квадрацікі, на якіх надрукаваны былі назвы прадуктаў — «хлеб», «крупа», «сахар», «рыба» і г. д. Кідаў іх у агульную скрынку. Мой абавязак — разлажыць іх па прадуктах, палічыць, запісаць, запакаваць. Рабілася гэта, як правіла, позна ўвечары, калі, стомлены за дзень дарогай у школу, урокамі, я кляваў носам і часта кідаў «крупу» ў «соль» ці «мыла» ў «цукар». Бацька часам угледжваў гэта і біў па руках. А пасля аднаго здарэння я дэманстрацыйна нядбайна ставіўся да гэтай нуднай працы. Бацька адвозіў картачкі ў Гомель — у ОРС (отдел рабочего снабжения). Аднойчы ён праявіў дабрыню — узнагародзіў мяне: узяў з сабой. У ОРСе прыгожая — для мяне, эстэта, — высокая стрыжаная жанчына ў доўгай чорнай спадніцы прыняла ў бацькі запакаваныя, перавязаныя ніткамі карткі, дала бацьку распісацца на нейкай паперы (між іншым, гасцінец тут жа схавала ў шуфляду стала), перапісала мае падлікі — колькі «хлеба», колькі «крупы» і, не распакаваўшы нават картачкі — вынікі маіх пакут, не палічыўшы, кінула ўвесь скрутак у грубку, дзе агніста палалі бярозавыя дровы. Мяне гэта страшна ашаламіла. Столькі бацькавай працы, маіх падлікаў, матчынага

страху — і ўсё вось так проста ў агонь. Што ж гэта робіцца, людзі добрыя?!

Выйшаўшы з ОРСа, я заплакаў. Бацька здзівіўся:

— Ты чаго?

— Картачак шкада. Малыя маглі гуляць, — сёстры мае.

— Дурак, — засмяяўся бацька. — Я думаў, ты мужык, а ты баба саплівая.

Бацька за сваю кар'еру крамшчыка легка расплаціўся — цялушкай, якую я два леты пасвіў і любіў; я ўвогуле любіў кароў і не любіў свіней, на шчасце, у лесе іх не пасвілі — рохкалі ў закутку.

Ляснічы паспачуваў бацьку і пашкадаваў — назначыў леснікам усё ў тую ж «Воленку». Паўгода ляснічы ваяваў з непаслухмяным партызанам і ўсё ж перамог — выселіў Круглікава з леснічоўкі. Пераехалі туды сярод зімы. А сямігодка ў Макаўі, за сем кіламетраў. І мяне адаслалі заканчваць пяты клас у Карму, да бабулі. Там я вучыўся і ў шостым. Але бабуля жыла бедна, без каровы, і мы ледзьве не галадалі. Вясной амаль кожную суботу я бег у «Воленку» за 25 вёрст, каб прынесці гладышку малака, галку масла.

У Карме я хадзіў на вячоркі, дзе збіраліся старэйшыя хлопцы, дзяўчаты, і з якіх нас гналі настаўнікі. Але мы ўжо цалаваліся з аднакласніцамі, а я нават са старэйшай на год — Маняй Хацковай.

У сёмы клас я пайшоў у Макаўе. Што такому сем кіламетраў! Бацька дамовіўся з макаўцам, каб у выпадку дажджу, завірухі я мог застацца паначаваць. Ні разу за год не застаўся. Адзін я ішоў тры кіламетры — да Пракопаўкі, а адтуль у вялікім гурце пракопаўскіх, будзішчанскіх вучняў, і паходы гэтыя былі самыя цікавыя — дурэлі, жартавалі.

Я закахаўся ў аднакласніцу Марусю Антоненку. Але яна, відаць, не дарасла яшчэ да гэтага пачуцця і рабіла глупствы — паказвала мае «любоўныя пісьмы» вучням, з мяне смяяліся. Назначыў спатканне, а яна прыслала на мост хлопцаў, якія зрабілі мне «цёмную», ледзьве не кінулі ў ваду. Назло ёй я назначыў спатканне другой аднакласніцы — Каці Кузьменка з пасёлка Данец, гэта тры кіламетры ад «Воленкі», і бегаў туды — чатырнаццаць кіламетраў у школу і са школы. Гэты свой «подзвіг» і Кацю, малую і сталую, я амаль жа дакументальна апісаў у апавяданні «Непрыгожая», якое крытыкі лічылі лепшым маім апавяданнем, нават Янка Брыль, выдатны навеліст і раўнівы да творчасці калег, да маёй асабліва, пахваліў.

Раскідана — у розных творах, у «Трывожным шчасці» найбольш поўна — апісаў я гісторыю свайго юнацтва, сваіх дзіцяча-юнацкіх захапленняў і таго кахання, што засталося на ўсё жыццё, што дало

мне найлепшага сябра — жонку, маю Машу, і з ёй поўнае чалавечае шчасце.

Успомніў маленства, успомніў нашмат больш, чым запісаў, — і як акунуўся ў цёплую плынь той Церухі, дзе з дзяцінства «Маруся мыла ногі». Калі купаўся ў мелкай рэчцы ў сталыя гады, то заўсёды нейкім асаблівым непаўторным чуццём адчуваў, што вада, у якой яна мыла ногі, не сплыла ў Сож і Дняпро, яна заставалася тут, перад хатай Кротавых, перад маёй дачай і паіла мае пачуццё жыццятворнай сілай — мяне, бацьку чатырох дзяцей. Мяне да старасці хвалявала ўсё, што звязана было з яе маленствам, з яе сталым жыццём. Я пакла-

няўся сцежкам, па якіх яна хадзіла, рэчцы, у якой купалася. Я радуюся, што не здрадзіў табе душэўна, не таіў сваіх дробных грахоў. Знаю: ты была яшчэ больш шчырая і адкрытая.

Тваё сэрца было на маёй далоні. А можа, наадварот: мае — на тваёй. Ці не ад адчування гэтага я так назваў свой раман?

І я слаўлю наша каханне! У першую чаргу тваё. Хоць усё пачалося ад мяне, ад майго дзіцячага, юнацкага захаплення, ад маёй прагі кахаць і быць каханым. Лічу, што лес мяне ўзнагародзіў — падарыў Цябе. Ён зводзіў нас на жыццёвых сцежках. Мы ж маглі згубіць адзін аднаго ў віры жыцця. Нам наканавана было пражыць жыццё разам.

2

«Воленка» была райскім кутком. Сама «Воленка» — роўны квадрат лесу паўтара на паўтара кіламетра, раздзелены крынічкай, з аднаго боку якой рос стары лісцёвы лес — бярозы, асіны, дубы, з другога, на ўзвышшы, — малады густы сасняк. Хто яго пасадзіў да рэвалюцыі? Памешчык? Дзяржава?

Каб абход абмяжоўваўся толькі «Воленкай», у лесніка было б бесклапотнае жыццё. Але дзве трэці абходу складала «Гардуноўская дача». Чаму дача — Бог ведае. А гэта кіламетры за тры ад «Воленкі», за Данцом, куды я бегаў на спатканне. І цягнулася гэта дача кіламетры на чатыры — пад самыя Гардуны, за якімі пачыналася бязлесная зона. І рос там пераважна малады сасняк. І высякалі яго з вёсак бязлесся. Парубшчыкі лясных вёсак — не парубшчыкі. Яны ўмелі красці лес так, што амаль не заставалася слядоў. А калі калектывізацыя пакінула сялян без коней, то набегі на лес прыкметна зменшыліся. І не парубшчыкі, якія seклі лес пераважна зімой, был і лесніковай трывогай, а летнія пажары ў гэтай праклятай бацькам дачы. У спякоту ён там дняваў і начаваў. «Воленку» сцерагла маці, яна

ж вяла гаспадарку, праўда, там ужо памагалі мы; толькі я, гультай, кніжнік, любіў пасвіць каровы, лежачы з кніжкамі пад дубамі, а араў, баранаваў і нават касіў мой брат Павел. Яму не давалася вучоба, але працаўнік ён быу адменны; вайна забрала жыццё добрага гаспадара.

Парубкі і пажары ў Гардуноўшчыне знясілілі бацьку; вялікі пажар — і вылеціш з працы, а гэта страшыла і яго, і маці: ляснік жыў усё ж лепш, чым калгаснікі, меў кавалак зямлі, каня, пару кароў. І бацька пачаў шукаць спакайнейшае месца. У сваім Маркавіцкім лясніцтве ніхто не дасць, ды і зразумець могуць няправільна: «Воленка» лічылася не самым цяжкім абходам — для маладых і здаровых леснікоў. Бліжэйшае лясніцтва — Добрушскае, бліжэйшае ад Кармы, ад сваякоў. Яны, сваякі (некаторыя рабілі там леснікамі, пажарнікамі, рабочымі), памаглі дамовіцца з мясцовым ляснічым.

Вясной 1936 сям'я пераехала ў Камень — так называлася бліжэйшая, за два кіламетры ад леснічоўкі, веска ў Расіі.

Я застаўся на кватэры ў сябрука свайго Сашы Шклярава, каб закончыць школу. Скончыў выдатна.

Паміж Каменем і беларускім лесам у тое лета пачалі будаваць ваенны палявы аэрадром. Ваенныя інжынеры, якія жылі ў нас у леснічоўцы, узялі мяне за дзесятніка — замяраць земляныя работы, якія выконвалі грабары — не цыгане, хутчэй малдаване; існавала, выходзіць, армія такіх вандроўных працаўнікоў з коньмі, з адмысловымі павозкамі — была патрэба ў іх. Магчыма, праца на аэрадроме ці парады вайскоўцаў абумовілі выбар далейшай вучобы — тэхнікума будаўнічых матэрыялаў, хоць настаўніца беларускай мовы і літаратуры Яўгенія Анціпава настойліва раіла мне паступаць у педтэхнікум, і я абяцаў ёй. Чаму не пайшоў на настаўніка — адзін Бог ведае. «Неисповедимы пути господни». Пакручастыя шляхі чалавечыя, і не сам ён выбірае іх — вядзе лес.

Экзамены вытрымаў паспяхова, нават пахвалу атрымаў ад фізіка немца Грайпінера, якога ўсе баяліся і які вельмі рэдка хваліў каго-небудзь з абітурыентаў.

Прыехаў на заняткі за два дні да навучальнага года. Размясціўся ў інтэрнаце. І ў першы ж вечар студэнты старэйшых курсаў прапанавалі:

— Малеча! Хто хоча схадзіць да медычак? Там вечар.

Нямногія вясковыя хлопцы ў сваім сялянскім адзенні адважыліся на такі подзвіг. А я... хіба мог прапусціць нагоду апынуцца ў дзявочым царстве! Ведаў, што ў групе нашай толькі дзве дзяўчыны.

У двор медтэхнікума вартавы нас не пусціў — лезлі праз плот. Не вельмі гасцінна сустрэлі «цаглянікаў» медыкі-хлопцы: была даўняя

вайна паміж нашым мужчынскім тэхнікумам і іх жаночым, дзе хлопцаў было не па два ў групе, як у нас дзяўчат, але і не так шмат, і хлопцы іх не былі арламі, а таму дзяўчаты гарнуліся да нашых і аўтадарожнікаў, і рэўнасць нярэдка пераходзіла ў канфлікт, але медыкі заўсёды былі бітыя. А нашы па заканчэнні вучобы жаніліся на медычках.

Вечара ніякага не было. Але, мабыць, угледзеўшы больш надзейных жаніхоў, дзяўчаты высыпалі з інтэрната ў двор; старэйшыя ж былі знаёмыя, мелі сімпатыі.

І мы гусакамі хадзілі сярод кветніка са стракатых сукенак і прывабных тварыкаў. У мяне, эстэта і дзявочага прыхільніка, разбягаліся вочы. Колькі іх тут, прыгажунь! Во куды трэба было паступаць!

І раптам абпякло мяне — цуд! Прайшло два з палавінай гады, а я адразу пазнаў яе, падрослую, папрыгажэлую, не такую ўжо рыжую, у яркай крамнай сукенцы ў зялёны гарошак. Сэрца чамусьці пусцілася ў галоп. Ад нечаканасці? Ад радасці? Я ўсё-такі за гады захаплення кармянскімі і макаўскімі дзяўчатамі часам успамінаў менавіта яе — Машу Кротаву, яе вочы ў тумане слёз і пакутлівы выраз на твары, калі мяне Салодкі стрыг авечымі нажніцамі.

У яе здзіўлена і, здалося мне, радасна пабольшалі вочы. Яна першая спытала:

— Ты?

Я паўтарыў яе пытанне:

— Ты? Ты тут вучышся?

— Паступіла.

— І я паступіў...

І, бадай, — усё, што мы сказалі.

Яна прыветліва і прывабна засмяялася. Але ні ў мяне, пятнаццацігадовага донжуана, ні ў яе не хапіла смеласці выйсці з гурту першакурсніц, адысці ўбок і пагутарыць, як належыць добрым старым знаёмым. Неяк атрымалася, што дзявочая плынь падхапіла яе і аднесла ў інтэрнат, куды я пайсці не адважыўся — з-за сарамлівасці і з-за папярэджання старэйшых: не адрывайся ад нас, а то медыкі хоць і слабакі, а могуць аднаму намяць бакі — за дзяўчат сваіх. І ў тую ж ноч я до.ўга не мог заснуць — не ад радаснай узбуджанасці, што я студэнт, а ад таго, што перада мной стаяў вобраз Машы, іе здзіўленыя вочы. Як яны пашырыліся, як выпраменьвалі радасць! Я пераконваў сябе: гэта менавіта радасць ад сустрэчы са мной. І фантазіраваў, як у першы ж выхадны пайду ў медтэхнікум — адзін! Нікога не пабаюся! — знайду яе, і мы будзем сустракацца па вечарах у вялікім славутым Гомельскім парку, будзем любавацца палацам

Паскевіча. Аднаго не дапускаў, што мы пацалуемся, як цалаваўся я з Кацяй, да якой не было глыбокага пачуцця, акрамя юнацкай цікаўнасці. Не, з Машай у нас будзе зусім інакш — будзе самае высокае каханне, як у тых раманах, якія паспеў прачытаць.

Я пайшоў у медтэхнікум і... не сустрэў там Машу. Раз, другі, трэці. Без вынікаў. Адважыўся прасіць дзяўчат, каб знайшлі яе і паклікалі. Але адны не ведалі аднакурсніцу: «Дзе мы будзем шукаць табе яе?» Іншыя смяяліся:

— Дзевачкі! Глядзіце, ад любові ў яго вочы гараць, як у ката.

Сустрэў Тамару Дзегцярову. Здзівіўся:

— І ты тут?

— А ты думаў, дзе я павінна быць? У вас, чарапічнікаў?

Набраўся духу:

— Пазаві мне Машу... Кротаву...

Тамара вельмі здзівілася.

— Ужо і тут закахаліся? Лоўкія вы!

— А тут яна? — баяўся, што не вытрымала вучобы, у нас некаторыя адсыпаліся.

— Тут, тут. Лепшая студэнтка, усе хваляць яе.

У мяне радасна затрапятала сэрца.

Але Машу Тамара не паклікала. Ад дзявочай зайздрасці, ці што?

Я напісаў Машы пісьмо. Не адно. Назначаў спатканні, прасіў адказаць. Маўчанне. І я пачаў траціць надзею. І, бадай, страціў яе. Пасля думаў, здзіўляўся, з Машай са смехам успаміналі: кім трэба быць, каб, жывучы ў адным горадзе, займаючыся на суседніх вуліцах, прайшоўшы трыста разоў міма медтэхнікума, я не мог сустрэць, адшукаць дзяўчыну, якая валодала маімі марамі, думкамі?! Між іншым, Тамару сустракаў колькі разоў і толькі пытаўся, як там Маша. Удзячны быў Машы, што не адкрывае маіх пісем з вершамі нават школьнай сяброўцы сваёй.

Праз гэта і праз сваю «няўлоўнасць» яна рабілася для мяне таямнічай, як казачная прынцэса, і яшчэ больш жаданай. Спытаць у Тамары: «А хлопца яна не мае?» — не мог, лічыў, што пытанне такое абразіць Машу. Не можа яна мець хлопца, раз не ідзе на мой кліч.

Што такое выпадковасць? Пытанне, над якім ламалі галовы шмат якія мудрацы. Просты чалавек, відаць, засмяяўся б: выпадковасць і ёсць выпадковасць; у простых людзей усё проста. Філосафы даказвалі: неўсвядомленая неабходнасць і шмат што іншае. Але я прасіў у лесу ўсвядомленай (мной усвядомленай!) неабходнасці. Між іншым, больш складанае пытанне аб існаванні лесу. Ёсць лес? Вызначае ён жыццёвы шлях чалавека? Некалі, малады атэіст, я

трымаўся матэрыялістычнай формулы: чалавек сам вызначае свой лес, а інакш, маўляў, можна дагаварыцца да боскай сілы, якая кіруе жыццём. Цяпер я так не думаю — дзіўная метамарфоза: з гадамі, з вопытам быццам бы адбыўся не прагрэс, а рэгрэс. Цяпер я веру ў лес.

Роўна праз два гады, перад пачаткам трэцяга курса, засумаваўшы ў лесе па культуры, па кіно, я пайшоў у вядомы ў той час Клуб чыгуначнікаў на прагляд фільма — якога, не помню, хоць у той час фільмаў выпускалі не больш дзесятка ў год, і мы, студэнты, глядзелі іх па некалькі разоў.

Не ў фае, а ў зале, да таго, як патухла святло, я ўгледзеў яе, Машу. Яна сядзела наперадзе і збоку, дык бачыў яе курчавыя валасы. Закалацілася сэрца. І было мне не да фільма, таму, відаць, і не помню назвы. ДумКі скіраваны былі на адно: не згубіць яе пасля сеанса ў натоўпе, дагнаць, пагаварыць. Верыў чамусьці, што размова гэта дасць пачатак нашым сустрэчам.

Распіхваў гледачоў лакцямі, гатовы быў ісці па галовах іх, каб толькі не згубіць яе, дагнаць.

Дагнаў на вуліцы; яшчэ не сцямнела, неба над вакзалам адсвечвала ружовым водбліскам, апошні жнівеньскі дзень быў палетняму цёплы, хоць ліпы скідалі ўжо залатое лісце. Яны былі ўтраіх: поўная дзяўчына, якая трымала Машу за руку, як бы баючыся згубіцца, і рыжы хлопец, не, бадай, мужчына ўжо — па ўзросце.

Я абагнаў іх, азірнуўся і зрабіў выгляд, што здзівіўся нечаканасцю сустрэчы.

— Маша! Ты?

Яна збянтэжылася, пачырванела, але відно было, што яна неабыякавая да сустрэчы.

— Можна далучыцца да вашай кампаніі?

— Навошта табе наша кампанія? Табе трэба Маруся, перадаём яе табе, — сказала сяброўка.

— Ну, што ты, Маруся! — полымем успыхнула Маша. — Каму я трэба!

Аднак неяк непрыкметна адстала ад сваіх, пайшла побач са мной. Я зразумеў, што тая другая Маруся, Малчанава, з якой Маша жыла на кватэры, ведала пра мае пісьмы. Але калі я спытаў:

— Чаму ты не адказвала на мае пісьмы? Нядобра гэта.

На твары яе адбілася шчырае здзіўленне, шырока расшырыліся прыгожыя вочы.

— Якія пісьмы? Ніякіх пісем я не бачыла.

Далікатны кавалер, я не мог сказаць, што яна маніць.

На высокім пераходным мосце праз чыгунку, які гудзеў пад нагамі, я паспрабаваў узяць яе пад руку; была завядзёнка, вясковая яшчэ: хлопец, выяўляючы пачуццё, браў дзяўчыну пад руку.

Маша адхіснулася, здзівілася.

— Які ты спрытны!

На дашчаным тратуары «залінейнай» вуліцы мы ўсё больш і больш адставалі ад Марусі Малчанавай і Васі, шафера, які кватараваў у тым жа доме, заляцаўся па чарзе, расказала Маша, то да адной, то да другой медычкі, вадзіў у кіно.

— Але каму ён трэба такі... Яму хутка трыццаць гадоў, і ён быў жанаты...

Як гэта супакоіла мяне! Сапраўды, хіба гэта пара для семнаццацігадовай дзяўчыны!

Мы ўспаміналі пяты клас. Тры месяцы сумеснай вучобы, а столькі ўспамінаў! Праўда, на нейкі момант з'явілася ў мяне боязь, што яна ўспомніць, як мяне стрыглі, і я падрыхтаваў абарончую рэакцыю: весела пасмяяцца. Не ўспомніла. І гэта напоўніла мяне ўдзячнасцю і нейкім асаблівым замілаваннем да яе.

На сёмым небе апынуўся, калі Маша раптам прапанавала:

— Давай пагуляем па Бакуніна, а то там на нашай Астроўскай яны будуць сядзець на лавачцы, і да іх выйдзе Вольга Маршаліха, дачка гаспадыні. Яны будуць аглядаць цябе. І колькі будзе размоў!

Яна агледзела мяне, і я сам зірнуў на штаны свае і чаравікі. Не, за адзенне мне не сорамна: зарабіўшы за лета на аэрадроме, які ўсё яшчэ будаваўся, немалую суму, я апрануўся, як належыць студэнту трэцяга курса. Ад картавасці я даўно пазбавіўся. І пагутарыць маю пра што: мала хто з маіх сяброў прачытаў столькі кніг, як я, усе выхадныя праводзіў у бібліятэцы.

Мы хадзілі па рыпучых тратуарах вуліцы, на якой стаялі лужыны і расла густая трава.

— Мы будзем страчацца, Маша?

— Ты хочаш?

— Вельмі хачу.

Яна весела засмяялася.

— А ты такі ж...

— Які?

— Добра рашаеш задачкі.

Я зарагатаў.

— Я ў тэхнікуме лепшы па матэматыцы. А вось хіміі не люблю, а ў нас іх ажно чатыры: неарганічная, арганічная, алкалоідная... Сустрэнемся заўтра?

— Так хутка?

— Хутка! Цэлыя суткі чакаць!

— Як доўга! — яна іранізавала, у яе ўжо тады было добрае пачуццё гумару. — Не, заўтра не абяцаю. Першы дзень заняткаў. Нас могуць паслаць на практыку ў бальніцу. Давай у нядзелю.

Да нядзелі было тры дні, і я ледзьве не застагнаў ад роспачы. Але вяртаўся з першага спатканця і падскок• ваў ад радасці, што цяля. Дзякаваў лёсу, упершыню паверыў у яго — у свой шчаслівы лес. Нечакана ён зблізіў нас. Нават пасяліў амаль побач, праз чыгунку: з двума сябрамі я кватараваў у яўрэйскай сям'і на вуліцы Сталярнай, якая ўпіралася ў чыгунку, амаль жа насупраць вуліцы Астроўскага.

Так пачаліся нашы спатканіі. Амаль штовечар. Калі ж здаралася, што з-за яе дзяжурства ці з-за непагадзі — дажджу, завірухі, моцнага марозу — мы. не сустракаліся, для мяне гэта былі горкія дні, нічога не лезла ў галаву, нават паслабіў вучобу. Хіба толькі раманы чытаў паранейшаму запоем, класічныя, пра каханне.

Маша доўга не давала пацалаваць сябе ў вусны, вырывалася з абдымкаў, і я хіба паспяваў цмокнуць яе ў шчочку, заўсёды гарачую, нават у халоднае надвор'е.

Дакарала:

— Ты ж абяцаў не быць, як усе.

Я такі стараўся быць непадобным на іншых хлопцаў і на сябе ранейшага, калі не толькі цалаваўся з пракопаўскімі дзяўчатамі, але і лез за пазуху, хоць у большасці нічога там яшчэ не было — маленькія бугаркі. Але цалавацца я навучыў яе неўзабаве.

Перад Машай я хацеў выглядаць незвычайным, сапраўды непадобным да іншых, — рыцарам, для яе і раманы чытаў. Між іншым, яна старалася прачытаць тыя ж кнігі, ці хутчэй наадварот: я прачытваў абавязкова тое, што чытала яна, мы абодва не адставалі адзін ад ад нага: ты прачытала за тры дні, дык я прачытаю за ноч. І прачытваў. Цяпер здаецца наіўным, але ў той час не толькі мы, але многія маладыя людзі лічылі ўзорам чалавечых адносін «Что делать?» Чарнышэўскага. На каго з герояў я хацеў быць падобны — не помню. Адчуваў, што на Рахметава не цягну. А для Машы ідэалам стала Вера Паўлаўна, яна хацела кахаць, жыць гэтак жа, як далёкая гераіня. Я сумняваўся, што можна жыць так у наш час. Мы спрачаліся.

З маёй закаханасцю звязана мая першая спроба пісаць прозу. На зімовых канікулах, седзячы ў лесе, у самотнай адзіноце, я сачыніў, менавіта сачыніў, дзённік. Выдумаў рамантычную гісторыю: маладая прыгожая жонка ляснічага (не было такой жонкі! была кабета сярэдніх гадоў з трыма дзецьмі, якую бачыў я ўлетку, калі адносіў

нейкія паперы бацькавы) закахалася ў мяне (во герой!). Безумоўна, па просьбе яе ляснічы запрасіў мяне, студэнта, інтэлігента, на абед. І абед быў — як у раманах, я не ведаў, які відэлец, нож. Даўгі высокаінтэлігентны дыялог старонак на дзесяць. Размова пра жыццё і пра кнігі, у тым ліку і пра «Что делать?»

Наіўная гісторыя сачынялася для Машы, каб узняць, як кажуць сёння, свой імідж у яе вачах: во які я герой! На мяне замужняя жанчына кінула вока. Праўда, доўга вагаўся: паказваць ці не паказваць сваё сачыненне. Падрыхтаваў яе вусна і потым паказаў запаветны сшытак. На чарговым спатканні яна маўчала, і я ад нецярпення чапляўся нагамі за гнілыя дошкі тратуара.

— Прачытала?

— Прачытала.

— І што?

Маша характэрна зморшчылася, прыплюснуўшы свае шырокія, што азёры, вочы.

— Цалаваўся ты з ёй?

— Ну што ты! За каго ты мяне лічыш! Я ўвесь час думаў пра цябе.

— Манюка ты.

— Ты не верыш мне?

— Веру, веру...

Але бачыў, адчуваў, што Маша іранізуе, вельмі тонка. Пасля, праз паўтара гады, яна з вясёлым смехам прызналася, што не паверыла ніводнаму слову з таго, што было ў тым дзённіку. Больш такіх дзённікаў я не пісаў. Занатоўваў толькі праўдзівыя падзеі і думкі.

Але лічу, што каханне наша памагло мне стаць пісьменнікам. У тую ж зіму я напісаў апавяданне пра фельдчарыцу, якая ў дождж ці снег ідзе ў далёкую леснічоўку, каб прыняць у леснічыхі роды, першыя ў сваёй практыцы. Прымае і вельмі радуецца нараджэнню чалавека (уплыў апавядання Горкага) і свайму ўменню.

Да гэтага я пісаў вершы. Чытаў іх на пасяджэннях літаб'яднання пры «Гомельскай праўдзе». Няўрымслівы і амбіцыёзны Кастусь Кірэенка граміў мае вершы ўшчэнт, хоць яго сябра, далікатны Леанід Гаўрылаў, знаходзіў у вершах маіх «паэтычныя зерні».

Прачытаў апавяданне — не без страху. І — о цуд! — мяне, маладога аўтара, пахвалілі аднагалосна, нават бязлітасны Кастусь, сябра мой у сталыя літаратурныя гады.

Вясна пасля суровай зімы, калі ў дваццаціградусны мароз нават такія закаханыя маглі гартаваць свае пачуцці не больш паўгадзіны-гадзіну, прынесла радасць сустрэч да світання. На кватэру Маша

мяне не запрасіла ні разу — саромелася. Само сабой я не мог запрасіць яе ў свой катух, дзе нас трое ўдыхалі пах прымусу. І ў кіно не хадзілі, пасля прызналася: саромелася, што бедна апранутая.

Але вясна прынесла і смутак. Маша канчала тэхнікум (у іх тры гады, у нас — чатыры). Куды яе размяркуюць на працу? Можа, у такую далеч, што і не дабярэшся туды? Узрадаваўся, што ў Рэчыцкі раён — недалёка. На выпускны вечар яна не запрасіла: такія цнатлівыя мы былі. Ды, здаецца, мяне не было ўжо ў Гомелі: групу студэнтаў паслалі на практыку ажно ў Данбас, у Канстанцінаўку, на завод, дзе рабілася цэгла для доменных печаў.

Ад ту ль штодня слаў ёй лісты, у вёску Артукі, куды яна паехала, ведаў з дня размеркавання. Маша адказвала не так акуратна, але кожнае яе скупое пісьмо (у выяўленні пачуццяў яна заўсёды была скупая) было для мяне найвялікшай радасцю, я насіў лісты ля сэрца і перачытваў па шмат разоў, нават даходзіў да такой сентыментальнасці, што цалаваў: ад паперы патыхала непаўторным водарам яе вуснаў, рук, валасоў, яе дыханнем.

Між іншым, адыходзячы ў ліпені 1941 года з Артукоў у Церуху з двухтыднёвай Лінай пехатой праз дзве ракі — Дняпро і Сож, праз балоты, міжрэчча — Маша разам з дзіцячым скарбам несла гэтыя пісьмы. Шкада, што пасля яны згубіліся. Як бы хоць адно з іх спатрэбілася ў гэтую шчаслівую і сумную гісторыю — з сумным фіналам.

3

Вярнуўшыся з Кастрамы (пасля Данбаса мы праходзілі практыку на Волзе на заводзе сілікатнай цэглы), я наманіў бацькам, што тэхнікум пасылае нас у краяведчы паход — працяг практыкі, і, выпрасіўшы ў маці нейкую дзесятку, паехаў да Машы. Бацька быў узлаваны: траціўся такі памочнік у час сенакосу і жніва.

— Ту рак ты, а не турыст, — казаў ён.

«Турак» у бацькі была як лаянка на чалавека няцямнага, нядбайнага, хітрага, які адлыньваў ад фізічнай працы, іншай працы бацька не прызнаваў; нават тое, што рабілі ваенныя інжынеры, будуючы аэрадром, не лічыў за працу: «Прахалоджваюцца начальнічкі!» Калі гасціў у мяне, сталага літаратара, і Маша адарвала мяне ад стала нейкім гаспадарчым даручэннем, а я сказаў, што мне трэба працаваць, бацька хмыкнуў:

— Хіба гэта работа?

— А за што ж мне грошы плацяць?

— За розум.

Такі ён быў, бацька мой Пятро Мінавіч.

У 1954 годзе я паехаў турыстам у Югаславію. Ездзілі 21 дзень — доўга. Югаславія зачаравала мяне — прырода і людзі, хоць да савецкіх некаторыя яшчэ адносіліся з насцярогай. І, аднак, нідзе, хіба толькі пазней у Нью-Йорку, я не перажываў такога смутку — па Машы, па дзецях: шасцігадовай Тані, чатырохгадовым Сашы. Смутак нараджаў успамін, гісторыю нашага кахання, нашага жыцця. І ў адну з бяссонных начэй я сказаў сабе: дык вось жа яна, гатовая аповесць, бадай, самая праўдзівая з усяго, што я напісаў. Нічога не трэба выдумляць, шукаць сюжэтныя хады, кампазіцыйныя рашэнні. Усё падказвала ўласная біяграфія. Прыехаў дадому і, можа, за якія два-тры месяцы «выдыхнуў» «Непаўторную вясну».

Але, усё было так, як напісалася. І лепш ніводзін перыяд сваёй біяграфіі я не напішу і зараз, у сталыя гады, пазнаўшы (ці забыўшы ўжо?) усе тайны творчасці. Так я ляжаў на ўзбочыне дарогі ля чыгуначнага пераезда на выездзе з Рэчыцы — чакаў машыны. Не дачакаўся. Колькі ў 1939 годзе хадзіла машын па палявых дарогах? І пайшоў пехатой — «усяго» 30 вёрст, зняўшы свае парусінавыя чаравікі, каб зусім не разваліліся. Перад Артукамі памыў у канаве ногі, абуўся і — вось я, Маша, твой жаніх, як мяне ахрысцілі ў вёсцы. Маша, хоць і адказала на мае пісьмо «прыязджай», — моцна збянтэжылася, пасля прызналася, што, угледзеўшы мяне, схавалася ў садзе і доўга вырашала, што рабіць.

Гаспадыня, удава, маці дваіх дзяцей, сустрэла мяне непрыветліва.

— А хто ты ёй?

Разгублены, я недарэчна зманіў:

— Брат.

Мана мая яўна не спадабалася Ані, і, можа, праз гэта яна выяўляла сваю непрыязнасць ва ўсе дні майго гасцявання. Колькі часу я гасціў? Тыдзень, пэўна, а можа, і больш. Жылі бедна, і для гаспадыні лішні ядок быў у наклад. Помню, у той першы вечар častавалі мяне конаўкай малака з акрайцам чэрствага касцістага хлеба. Але хіба не так я вячэраў дома, у бацькоў?

Не ласункі мне патрэбны былі. Маша! Перакананне, што яна кахае мяне па-ранейшаму. Амбулаторыя, дзе фельчарыца была поўнай гаспадыняй, размяшчалася ў суседняй хаце раскулачаных. І мы праводзілі час там. Мы цалаваліся. Але пра большае я і падумаць не адважваўся — такая цнатлівасць жыла ў нас, васемнаццацігадовых.

Малая дачка гаспадыні падгледзела нашы пяшчоты і ў час абеду абвясціла:

— А яны цалаваліся.

Маці чамусьці злосна пляснула яе рушніком.

Спал і мы ў той пярэдняй палавіне хаты, якая належала кватаранцы, да мяне спала там малая, я заняў яе кароткі ложак. Ён стаяў паміж грубкай і сцяной, што перагароджвала хату. Маша спала каля акна на сваім вузкім жалезным (бальнічным, ці што?) ложку. О, якія гэта былі ночы! Сон не адольваў мяне. Ды і Маша не спала, чуў па яе дыханні. Я напакаваны быў самымі пяшчотнымі пачуццямі. Але ніводнай «крамольнай» думКі, ніякага непрыстойнага жадання! Уся радасць была ў тым, каб чуць яе дыханне, водар яе, ні з чым непараўнальны. У аповесці, пэўна, ёсць і хлапецкія жаданні, знарок не перачытваю, але калі ёсць, то гэта яўна мастацкі вымысел. Было жаданне блізкасці, калі мы цалаваліся ў садзе ці амбулаторыі, але толькі не ўначы, я не дапускаў думкі, што магу вылезці з-пад прасцірадла і ў майцы і трусах пайсці за грубку, ды ажно — да яе ложка. Гэта якраз тое, што запомнілася на ўсё жыццё і з чаго пасля, праз шмат гадоў, пасля радаснай салодкай блізкасці, мы абое весела смяяліся, асабліва тады, калі норавы сталі іншымі і такой ідэалісткай была хіба наша Таццяна.

І яшчэ што запомнілася. На другую ці трэцюю ноч, калі мы ўсе паснулі, па фельчарыцу прыехалі з суседняй вёскі. Роды!

Як мяне гэта ўсхвалявала!

— Я паеду з табой.

— Ты што — чокнуўся? Cпі.

Які сон! Затарахцелі колы — і ў мяне раптам успыхнула дзікая рэўнасць. Яна паехала ўначы з маладым мужчынам! Такой рэўнасці я больш ніколі не перажываЎ: Дурань, безумоўна, быў! Але хто з нас, асабліва ў такім узросце, кіруе сваімі пачуццямі?!

Выскачыў у сад, кідаўся, як тыгр у клетцы. І пакуты гэтыя цягнуліся доўга. Маша вярнулася пасярод дня, узбуджаная, радасная, ажио ззяла ўся, вочы гарэлі, што абвастрыла маю рэўнасць. Але яна дзіўна пагасіла яе.

— Такога харошанькага хлопчыка прыняла, — і тут жа засмуцілася. — А сям'я бедная-бедная. Загарнуць не было ў што. У суседкі пазычалі.

Гэта яе радасць ад нараджэння чалавека дала мне, як кажуць, козыр; я адкрыў ёй нібыта даўнюю мару: мець сына ці дачку. Маша спачатку задумалася, яна была ўжо сталая, потым сур'ёзна сказала:

— Дурань ты, мой жаніх, — «жаніх» — з іроніяй. — Ты не знаеш, якая гэта адказнасць. Малако на губах, тэхнікума не скончыў — а давай яму сына, гатовенькага. Ідзі купі, калі такі спрытны.

Я пакрыўдзіўся.

З першых дзён я адчуў, што я не жаданы госць для гаспадыні, якая амаль не гутарыла са мной, нальле міску капусты — і будзь здароў! А тут, падазрона мніцельны, пачаў думаць, што і Маша не супраць, каб я хутчэй адбыў. Я зразумеў гэта, калі яна са смехам прачытала мне ў часопісе вясёлую грузінскую быль: гаспадар паказаў госцю на птушку ў садзе: «Бачыш, сядзіць». Пляснуў у далоні: «Глядзі, паляцела!»

Я пасмяяўся разам з ёй. Мы і там спаборнічалі з ёй у чытанні. Побач жыў стары настаўнік, у яго была вялікая бібліятэка, ён выпісваў часопісы. Пазней, калі я прыехаў у тую непаўторную вясну, якая парадніла нас на ўсё жыццё, Маша расказала, як спалохаў яе гэты стары гуманіст. У яго доўга і цяжка хварэла жонка, і ён аднойчы папрасіў Машу: «Зрабіла б ты, дачка, ёй укольчык, каб не пакутавала. Балюча глядзець».

— Ты знаеш,— казала Маша,— я ледзьве не самлела. Яму балюча глядзець, а мяне, маладую, штурхае на злачынства. Бач ты яго! Я пасля адна баялася заходзіць да хворай. Аню брала ці Надзею, сяброўку-настаўніцу. І ніякіх уколаў не рабіла, хоць боль у пакутніцы быў страшэнны, і, можа, камфару трэба было ўкалоць.

Маша была надзвычай аддданы, чулы і па-свойму хітры лекар. Яна добра разумела псіхалогію хворых, асабліва старых сялянак. А якія лекі меліся ў сельскім медпункце да вайны?! Цяпер няма. Але яна ведала: адаслаць бабулю без парашка — назаўсёды пазбавіцца кліенткі, ды і якая слава пойдзе пра яе, фельчарыцу: нічога не ўмее, нічога не мае! І яна прыдумала адмысловыя парашкі, абсалютна бяскрыўдныя пры любой хваробе: соду з цукрам. Праз колькі дзён бабулі прыходзілі, прыносілі яйкі і шчыра дзякавалі: «Ай, дохтарка, як жа памаглі твае парашочкі!»

«Грузінская птушка» стала для мяне намёкам. І я на другі ж дзень сабраўся ў дарогу. Ад снедання адмовіўся. Назло ёй вырашыў пайсці не на Рэчыцу, а праз Дняпро — да Сожа, каб там паплыць на параходзе да Гомеля. Маша, засмучаная, ад чаго я трохі злараднічаў, адгаворвала:

— Кажуць, ад Рудні да Дзятлавіч дарога праз балоты.

— А што мне балоты! Бачыў я не такія балоты! — успомніў ягаднае — паміж Кармой і Добрушскім лясніцтвам.

Маша правяла мяне па дарозе на Холмеч і ўручыла вузялок з хлебам і яблыкамі. І гэтым расчуліла да слёз. Дазволіла пацалаваць сябе.

Балюча я перажыў сваю паездку. Было адчуванне ўніжанасці ад непрыветлівасці Ані. Як паехаць другі раз? Думка, што я пазбаўлены магчымасці пабачыць Машу, пацалаваць яе, нагнятала цяжкую роспач. Ад роспачы такой маладыя нярэдка канчаюць самагубствам; такая чуласць і ранімасць у гэтым узросце!

Цяжкі жнівень я перажыў, ажно маці заўважыла маю самотнасць. Лістоў Маша не слала, так дамовіліся, што на хатні адрас яна не будзе пісаць, каб не перахапілі бацькі. А я пісаў ёй і адносіў пісьмы ажно на станцыю Злынка, пошце ў Камені не давяраў.

З нецярпеннем чакаў пачатку заняткаў. І — о радасць! — у тэхнікуме мяне чакала пісьмо ад Машы. І якое пісьмо! Такіх, скупая на выяўленні пачуццяў, яна яшчэ не пісала. Кожны радок дыхаў прызнаннем у каханні. Разумела, што пайшоў пакрыўджаны. Прасіла прабачэння. Ад сябе і, што дзіўна, ад Ані. І запрашала прыязджаць. Але вучоба на апошнім курсе была напружанай, да таго ж дырэктар Аранаў уладкаваў мяне ў бібліятэку: да дзевяноста рублёў павышанай стыпендыі яшчэ сто пяцьдзесят. Шчасце для бедняка! За такое месца нельга не трымацца. Помню, з першай палучкі заказаў сабе ў атэльe (ці не адзіным у той час на ўвесь Гомель? Ноч стаяў у чарзе) добры касцюм. У ім выглядаў не горш за студэнтаўгараджан. Бацька сказаў, калі я прыехаў у такім касцюме:

— Жаніх.

Адгадаў: я адчуваў сябе жаніхом у поўным сэнсе, толькі нявеста была далека — ад бацькоў маіх за 100 вёрст!

Пад канец вучобы месяцы два, калі не больш, адводзілася на дыпломны праект. Задание атрымаў глабальнае: спраектаваць цэх цэментнага завода з усімі разлікамі — будаўнічымі і вытворчымі.

Былі студэнты, якія стагналі ад гэтай працы. А мне само чарчэнне падабалася — творчасць! Я ледзьве не начаваў у чарцёжнай. Але не толькі ад любові да працы — ад задачы: апярэдзіць усіх іншых, каб пасля папрасіць кіраўніка дыпломнымі працамі адпусціць мяне на тыдзень... Куды? Маніць не стаў. Прызнаўся старому выкладчыку: да дзяўчыны. У Ганчаля адно вока было штучнае — шкляное, але нават у ім, здалося мне, загарэлася добрая цікавасць і нават зайздрасць.

— Думаеш ажаніцца?

— Не знаю. Як яна...

Выкладчык уздыхнуў:

— Каб не армія... — як ведаў, якая доўгая разлука чакае нас.

Перад першым маем я паехаў да Машы. На гэты раз ехаў з камфортам: цягніком да Рэчыцы, адтуль да Холмеч плыў параходам. Дняпро разліўся, што мора, і я, паэт, захапляўся паваддзем, прыгажосцю вясны.

Глыбока кранула ласкавасць Машы, з якой яна сустрэла мяне, расчуліла надзвычайная прыветлівасць гаспадыні і яе дзяцей — сустрэлі як брата. За год Аня і дзеці палюбілі Машу і радаваліся ўсяму таму, што радавала яе, зразумела сялянка, што пачуцці ў нас сур'ёзныя.

Маша расказала ў той жа вечар, што Аня пасля мінулагодняга прыезду майго адгаворвала яе ад такога жаніха, сватала за мясцовага настаўніка, маладога, з багатай сям'і.

— Ды я сказала ёй: акрамя Івана, мне ніхто не трэба. Не выйду за яго — застануся векавухай.

Божа, якое шчасце чуць такое! У лістах яна не выказвала так свайго кахання. А тут сказала больш — чаго я не мог чакаць. Яна адкрыта выказала, прызналася ў жаданні выйсці за мяне замуж. Выходзіць, і армія яе не палохала. Я ўзнёсся пад аблокі.

На вуліцы было холадна, і мы сядзелі ў амбулаторыі, у цеплыні. Маша яшчэ ўдзень пратапіла грубку.

У тую першамайскую ноч неяк проста, без майго настойлівага дамагання адбылося наша... грэхападзенне. Задавальнення я не атрымаў. А Машы, відаць, было балюча. Яна заплакала. Я спалохаўся.

— Табе нядобра?

— Не, нічога. Я знала, што так будзе.

— Адкуль ты знала?

— Дурань! Я ж медычка. Я вучыла...

Першага мая мы лічылі днём нашага шлюбу, хоць у пасведчанні аб рэгістрацыі стаяла дата 24 чэрвеня 1940 года: мы пайшлі ў сельсавет, калі я на крылах прыляцеў да жонкі сваёй пасля сканчэння тэхнікума.

Прачытаў у Талстога: «Для того, чтобы был честный брак, нужно стремление к полному целомудрию».

Вельмі слушна. Цяпер я ўпэўнены: трываласць нашага шлюбу (пяць ваенных гадоў разлукі!) была абумоўлена нашым імкненнем «к полному целомудрию». Такое было выхаванне ў сялянскіх дзяцей — прыроднае. А лепшыя пачуцці выхоўваліся класічнай літаратурай. Я глыбока перажываю, што ўнучкі мае, захопленыя сучаснай нізкаякаснай літаратурай, пошлым кіно, не разумеюць магічнай сілы класікі. А ёсць жа і ў іх прыродная цнатлівасць — ад бабулі, ад маці!

Радасці я не прывёз: мяне размеркавалі на працу ажно ў Беласток. Можна было адмовіцца, ахвотнікаў туды хапала. Але... па-

першае, мы выхаваны былі ў незвычайнай законапаслухмянасці, па-другое, ганарова ж: у Заходнюю пасылалі лепшых выпускнікоў, у Беласток — мяне аднаго.

Але раней, чым паехаць туды, я захварэў. Плыў ад Машы на параходзе, стаяў на палубе з самымі радаснымі ўспамінамі, узнёслымі марамі, пісаў вершы і... схапіў крупознае запаленне лёгкіх. Цяжкое. Прытомнасць страціў праз дзень ці два ў кінатэатры. Адтуль трапіў у бальніцу. Ніякіх антыбіётыкаў яшчэ не было, хвароба працякала вельмі цяжка, урач пасля сказала, што я «ў сарочцы нарадзіўся», пры такіх выпадках нямала памірае.

Не помню я, не помніла Маша, хто ёй прыслаў пісьмо аб маёй хваробе. Ці мой сябра Міша Бахун, з якім былі ў кіно і які наведваўся да мяне, ці хтось з яе аднакурсніц-гараджанак, якія рабілі ў бальніцы: кагось з іх я мог папрасіць. Атрымаўшы вестку, яна тут жа вырашыла ехаць да мяне. А гэта было не так проста, як можа здацца сучаснікам. Тады, улетку 1940 года, выйшла дурная пастанова: за прагулы, за спазненні — пад суд. Каб нікога не пасвячаць у сваю паездку ў Гомель, акрамя вернай Ані, і вярнуцца ў адзін дзень, Маша ўвечары, на ноч гледзячы, пайшла пехатой да Рэчыцы. Адна. Трыццаць кіламетраў! Пасля, у шчаслівыя сталыя гады, яна расказвала пра гэты паход як пра вясёлую прыгоду. Стомленая, пад раніцу прысела пад дрэвам узбоч дарогі. Каб сагрэцца, нацягнула на сябе медыцынскі белы халат. Пачула крокі: ідзе чалавек. Узнялася насустрач, каб спытаць, ці правільна яна ідзе. Убачыла мужчыну з ладным клункам. І толькі аклікнула яго, як мужчына кінуў клунак і пабег прэч ад белай здані; Маша зразумела, што яго спалохала тады, калі ў досвіткавых прыцемках разгледзела, што сядзела на краю могілак.

Крызіс ужо мінуў, я ачуняў і, можна ўявіць, як узрадаваўся, калі ў палату ўвайшла яна, мая жонка. Так з гонарам і прадстаўляю яе суседзям:

— Мая жонка.

Сядзела яна доўга, пакуль хтосьці з былых аднакурсніц, з-за ганебнай зайздрасці, не данёс галоўнаму ўрачу Басі Ісакаўне. Тая накрычала на палатную сястру, на наведвальніцу, адабрала халат. Але яна выкладала ў тэхнікуме, вяла практыку, помніла лепшую студэнтку і, выслухаўшы яе споведзь, дазволіла пасядзець яшчэ.

Маша не сказала мне, што паедзе ў той жа вечар і зноў будзе ісці ад Рэчыцы да Артукоў усю ноч, каб заўтра быць на працы, не трапіць пад суд. Во жыццё было!

У Беластоку я тры месяцы карміў клапоў на кватэры ў нейкай збяднелай ушчэнт рускай дваранкі, бабулі з вывіхамі: то яна расказ-

вала, як прыгожа жыла да «бальшавіцкага перавароту», то замыкалася і падазрона сачыла за намі: ці не маем мы намер загнаць яе ў Сібір? Можа, дзеля аховы яна пусціла ў цесную кватэрку — два маленькія пакойчыкі — двух «бальшавікоў»; напарнікам маім быў нейкі, бадай, такі ж падазроны, як бабуля, бухгалтар-ленінградзец.

У райпрамкамбінаце, дзе я служыў, мясцовыя палькі і яўрэйкі любілі мяне: пан гжэчны, далікатны, ветлівы; начальнік, адстаўны вайсковец, магчыма, з НКУС, ганяў іх часам да непрыстойнасці груба. Мяне не любіў, раўнаваў, казаў: «Што ты, камсамолец, падлізваешся да гэтых панскіх курваў? Дай ім уладу — яны нам з табой вочы выкалюць».

Не падобныя былі жанчыны, дзяўчаткі на крыважэрных: вельмі паслужлівыя, чаем нас паілі, мяне і начальніка; пячэнне іх ён еў з задавальненнем, не баяўся, што атруцяць.

У прамкамбінаце, акрамя іншых дробных фабрычак, майстэрняў, было добрыя дзесяткі два цагляных і чарапічных заводзікаў. Мая сфера, я вёў іх. На «заводы» гэтыя ганяў мяне начальнік у камандзіроўкі. Там я карміў блох, начаваў у хлявах. Гаспадары нацыяналізаваных прадпрыемстваў нярэдка адносіліся да ўсходніка адкрыта варожа, рэдка хто запрашаў павячэраць. Кантралёр з мяне быў ніякі, звесткі аб прадукцыі мне давалі ліпавыя, начальнік мой разумеў гэта і чырванеў ад гневу:

— Гаўно ты, а не савецкі работнік!

Такую праўду я не мог аспрэчыць. І кінуць працу нельга — засудзяць, закон бязлітасны. Ды і выехаць нельга без дазволу арганізацыі: на былой мяжы існаваў прапускны рэжым. Было адно збаўленне: прызыў у Чырвоную Армію. І я марыў аб гэтым шчасці. Кажу гэта без іроніі: служба ў арміі — ганаровы абавязак. Так мы былі выхаваны, абаронцы Радзімы. Аднаго не магу дагэтуль уцяміць, і ніхто не мог растлумачыць мне, чаму тысячы маладых людзей, накіраваных у Заходнія Беларусь і Украіну, павінны былі для прызыву вярнуцца ў ваенкаматы, дзе першапачаткова прыпісаны: прызыўнікоў не знімалі з уліку. Але для мяне гэта была радасць — ехаць дадому.

Абвясцілі прызыў — і на чыгунцы тварылася стоўпатварэнне. На «Гродна — Мінск» білета не ўзяў. Па падказцы свайго начальніка, які стаў добрым, паехаў праз Брэст. Уначы перад Брэстам пагранічнікі знялі з поезда вялікую групу, у якой нямала было і жанчын. Ноч трымалі ў нейкай адрыне. На другі дзень прызыўнікоў пасадзілі-такі ў поезд у патрэбным нам напрамку — на ўсход.

Прайшоў у Гомелі камісію: прыгодны, чакай накіравання ў часць. Дзе жывеш? Даў Машын адрас. Але зазірнуў у лес да бацькоў. І

тут прызнаўся ўрэшце, што ажаніўся, трэба ж вытлумачыць свой ад'езд на другі ж дзень. Ашаламіў маці. А бацька зрэагаваў крута:

— Толькі дуракі жэняцца перад арміяй.

Я — дурань. Але шчаслівы. Дзён дзесяць, да прыходу павесткі, жыў з Машай, як з жонкай, не таячыся. Дні горкай радасці. Мы марылі пра дзіця, якое назаўсёды звязала б нас. Цяпер і Маша хацела дзіця. Але неаднойчы ў яе вырываўся крык душы:

— Божа мой! Тры гады! Народзіцца і вырасце наш сын...

— Дачка, — чамусьці мне хацелася дзяўчынку.

— Няхай будзе дачка. Хіба не ўсё роўна!

У «Непаўторнай вясне» з фактаграфічнай дакладнасцю напісана наша развітанне. Маша вяла мяне па рэчыцкай дарозе кіламетраў пяць; шмат разоў я прасіў яе вярнуцца.

— Далека ж... Дзе тая Рэчыца!

— А табе блізка? Я нярэдка за дзень у тры вёскі наведваюся.

Мы трымалі адзін аднаго ў абдымках, не маючы сілы адарвацца. Нарэшце Маша як бы адпіхнула мяне і хутка пайшла назад. А я стаяў і глядзеў ёй услед, чакаючы, калі яна азірнецца. Яна азірнулася далека, на ўзгорку. Праз пяць гадоў растлумачыла:

— Не магла, бо плакала, не хацела, каб ты бачыў мае слёзы.

Прыгадаю адзін яе горкі расказ, які па вядомых прычынах не трапіў у аповесць. Яна расказала: тыдні два назад вярнуўся звольнены з арміі чырвонаармеец, а месяц назад выйшаў загад: звальняецца ў сваім адзенні, свайго яму не выслалі, бо сям'я нічога не мела, прыехаў у паношаным да дзірак армейскім, а пазаўчора прыехалі з ваенкамата і забралі армейскае, а ў хлопца і штаноў няма, і ботаў, ляжыць на печы.

— Як гэта горка, Ваня! Чаму мы такія бедныя? Калі ў цябе чаго не будзе хапаць, ты мне паведамі, я куплю і прышлю.

У бацькоў я апрануўся ў самае горшае, у такіх лахманах ехалі ўсе астатнія. І здарылася так, што месяцы праз тры пры праверцы асабістых рэчаў у мяне не хапіла аднаго стаптанага чаравіка, і я мусіў пісаць Машы, і яна прыслала новыя жоўтыя чаравікі, кашулю, цёплыя шкарпэткі; старшыну здзівіла: такое дабро будзе гніць тры гады! Шкарпэткі надзець нельга было. Толькі смярдзючыя анучы.

Сумна і горка ўспамінаць: у пачатку вайны нейкі «геній» даў каманду: асабістыя рэчы адасланць дадому. Куды? Большая частка Беларусі была захоплена немцамі. Але чаравікі і шкарпэткі я забраў, як дарагую памяць, і доўга трымаў у ранцы; нейкі праверпчык са штаба дывізіёна ці корпуса выявіў іх, канфіскаваў ды яшчэ ўляпіў камандзіру гарматы пяць нарадаў за тое, што дрэнны прыклад

паказваў байцам сваім; амаль кожны з іх трымаў нештд Цывільнае — матчына ці нявесціна. Дрэнныя псіхолагі былі нашы начальнікі, найгоршыя з іх — інтэнданты.

4

На ўсё жыццё запомніўся балючы смутак і ў доўгай дарозе ад Гомеля да Мурманска, і там, у Запаляр'і, дзе ўжо ў канцы кастрычніка ляжаў глыбокі снег і светлы дзень працягваўся нейкія тры гадзіны.

А самае цяжкае было: немагчымасць пісаць Машы штодня, як абяцаў. На «личное время» адводзілася па гадзіне два разы ў тыдзень, ды і ў гэтыя гадзіны шмат хто з нас, курсантаў, чысціў бульбу ці туалеты, а ўсе іншыя мылі і прышывалі падкаўнерыкі.

Я папрасіў дазволу пісаць у сталоўцы ў пасляабедзенны «ціхі час». Мой камандзір разліку засмяяўся на такую просьбу. Але я адважыўся звярнуцца да камандзіра батарэі армяніна Папіка Тамразяна.

— Што пісаць?

— Апавяданні.

— Друкаваўся?

— Так, — не друкаваўся, але меў адказы ад самаго Міхася Лынькова на мае апавяданні, дасланыя ў «Полымя рэвалюцыі». Насіў гэтае пісьмо ў кішэні. Паказаў камандзіру. Прачытаць па-беларуску армянін не мог. Паверыў на слова і пранікся да мяне своеасаблівай павагай, бо выйшаў з інтэлігентнай музычнай сям'і. І я атрымаў дазвол пісаць у «мертвый час», як называлі гэтую гадзіну. Разы два Тамразян зазірнуў у сталоўку: чым я займаюся? Пісаў. І ён здзіўлена хітаў галавой, яўна задаволены маёй настойлівасцю: ахвяраваў сном. А сну не хапала, на занятках па будове пушкі, прыбора кіравання артылерыйска-зенітным агнём, палітпадрыхтоўцы мы бязбожна спалі, я ў тым ліку: Запаляр'е, зіма, недахоп кіслароду ўвогуле, а тым больш у цесных зямлянках.

Між іншым, калі праз шмат гадоў мы сустрэліся ў Маскве ў Віктара Вольскага, у якога проста быў талент па пошуках аднапалчан, адстаўны палкоўнік Тамразян успомніў мяне толькі тады, калі Віктар са смехам нагадаў:

— Гэта той, што пасля абеду пісаў у сталоўцы. Лічыце, што вы яго зрабілі пісьменнікам.

Маша пісала радзей, і я пакутаваў ад прыступаў дурной рэўнасці, ажно пакуль яна не напісала, што ў нас будзе дзіця. Вельмі ўзрадавала гэта мяне і неяк душэўна заспакоіла.

Пра пачатак вайны я, бадай, поўна і аўтабіяграфічна напісаў у аповесці «Агонь і снег», якую крытыкі прызналі лепшай у пенталогіі. І ўжо ў старасці дапоўніў паказ свайго ўдзелу ў абароне Мурманска ў рамане «Зеніт». Пра воінаў-дзяўчат хацелася напісаць даўно, але, прызнаюся шчыра, баяўся Машынай... не тое што рэўнасці, пэўнага незадавальнення, а ёй жа перадрукоўваць вялікі раман. Баяўся дарэмна: «Зеніт» яна ацаніла гэтак жа высока, як і «Сэрца на далоні», «Атланты...», «Гандлярку...». А жонка мая была самым аўтарытэтным крытыкам і ніколі не памылялася: што хваліла яна — хвалілі ўсе, калегі і чытачы, што прымала з маўклівым скепсісам — тое і ў чытачоў не выклікала захаплення.

Месяцы праз два пасля пачатку цайны я атрымаў Машын ліст, што ў нас 10 ліпеня нарадзілася дачка; пісала яна яшчэ з бальніцы ў Холмечы, немцы былі пад Смаленскам, а на палескім напрамку не ўзялі яшчэ Гомель. Навошта ім было лезці ў балоты? Варожая авіяцыя няспынна (палярны ж дзень!) бамбіла порт, станцыю, горад. Батарэя, дзе я ўжо камандаваў разлікам, выпускала сотні снарадаў за суткі. Не веру тым, хто сцвярджае, што краіна не рыхтавалася да вайны. Адкуль на далёкай поўначы было столькі снарадаў? І пазней, калі фіны перарэзалі Кіраўскую дарогу, мы ніводнай гадзіны не заставаліся без боепрыпасаў.

У такой напружанай абстаноўцы, пад бомбамі, я пісаў Машы пра сваю радасць ад нараджэння дачкі. Я верыў у жыццё! Я верыў, што яна эвакуіруецца, не задумваючыся, як гэта зрабіць з грудным дзіцем. Думаю, што лісты тыя ў Беларусь палявая пошта ўжо не адсылала.

Пачаліся пошукі блізкіх па радыё — штодзень перадавалі пасланні франтавікоў і тых, хто паспеў выехаць у глыбокі тыл. Гэта былі кранальныя пісьмы, асабліва калі людзі знаходзілі адзін аднаго: «Дарагі Ваня! Мы пачулі тваё пісьмо. Я з дзецьмі знаходжуся ў Куйбышаўскай вобласці, мой адрас...».

Я напісаў некалькі лістоў на радыё, шукаючы Машу. І нейкая «жартаўніца» адказала на мой палявы адрас. Вельмі ўсхвалявала мяне гэтае пісьмо. Почырк не Машын. Але подпіс «Твая Маша» і паведамленне, што з Гомеля мы выбраліся шчасліва, што Леначка здаровенькая. Што гэта было? Недзе ваяваў яшчэ адзін Іван Шамякін? Але чаму жанчына не дала свой адрас? Жарт? Для такога часу вельмі жорсткі. З пошукамі блізкіх так не жартавалі. Прысылалі пісьмы ў адказ на радыёпошук, але сур'ёзныя, шчырыя. Адзін такі ліст — Жэні Бугровай, якая выехала са Смаленска ў Свярдлоўск, стаў пачаткам нашай доўгай перапіскі. Колькі пісем я напісаў ёй ужо з Гомеля, тайна

ад Машы. Тая мне «да запатрабавання» на Гомельскі паштамт адказала хіба аднойчы, бо ў канцы вайны была прызвана ў армію і там выйшла замуж. Але я ўдзячны ёй за... «літаратурную практыку». Яна была адукаваная дзяўчына, начытаная, пісала цікава, з развагамі на шмат старонак. Зразумела, што я стараўся, як кажуць, «не ўдарыць тварам у гразь». Яна мне пра раман Дастаеўскага, якога я да вайны не чытаў, я ёй — пра баявыя подзвігі, рэальныя і сачыненыя. Чамусьці я ёй сачыняў з лёгкай душой, лічачы гэта не маной, а творчасцю; гэта развівала маю фантазію. Я набіваў руку «як сачыніцель». Пісьмы былі доўгія; пасля перадыслакацыі ў Петразаводск і далей — у Польшчу і Германію — турбот з паперай не было. З нашых лістоў можна было сачыніць «раман у пісьмах». Але яе пісьмы Маша спаліла — не паверыла, што мы не бачылі адзін аднаго.

У «Начных зарніцах» пачатак біяграфічны з выдумкай эпізоду з нямецкімі дыверсантамі. І сям'я Траянавых — сям'я Кротавых: той жа бацька, зварот сясцёр, сына ў родную хату, што прымусіла мачыху пакінуць яе. «Баявыя эпізоды» — мастацкі вымысел. Не было ў Церусе маладзёжнага падполля. Але людзі ваявалі, у прыватнасці бацька — Філат Азаравіч Кротаў. Нейкі час ён рабіў пісарам пры старасце. Прыйшлі нашы — Філата «замялі»: служыў немцам. Аплакалі дочкі бацьку. І плакалі, і лаялі: прасілі ж не ісці на службу. Але праз ты дзень ці два Філат Азаравіч вярнуўся. І тады толькі расказаў дочкам усю праўду. Былы партызанскі камандзір, які заняў у Гомелі высокі пост, пацвердзіў яго паказанні органам: не сам ён пайшоў лічыць пастаўкі акупантам — па заданні партызан, доўга з'яўляўся іх сувязным. Але даведак стары ні ў кога не ўзяў і праз некалькі гадоў райком партыі адмовіў у прыёме ў рады КПСС яго сыну Мікалаю, інваліду вайны, загадчыку фермы, з-за таго, што бацька, па чутках, запэцкаў сябе ў акупацыю. Доўга разбіраліся.

«Пошукі сустрэчы» — суцэльны вымысел. Акрамя аднаго эпізоду: пахода Сашы-Машы за Дняпро, да сваёй былой гаспадыні Ані. Маша расказала: сасніла сон, што я там. У вайну верылі снам, варажбе. Не магла не пайсці. Можна ўявіць сілу яе пачуцця, прагу ўбачыць мужа, калі ўлетку 1942 года ў час разгулу і сапраўдных партызан, і бандыцкіх атрадаў (былі такія, я апісаў правакацыйны «партызанскі» атрад яшчэ ў «Глыбокай плыні») пайшла па дзікіх балотных, лясных мясцінах міжрэчча, праз паліцэйскія гарнізоны ў Дзятлавічах, Холмечы, Рудні. Акрамя злых людзей, у вайну і ваўкоў развялося незлічона.

Акрамя гэтага паходу, Маша рызыкавала неаднойчы і разоў колькі была на краі гібелі. Ішла ў Навабеліцу (20 кіламетраў), каб

выменяць нейкія два дзесяткі яек на соль; соль была галоўным дэфіцытам. Апраналіся для такіх паходаў маладыя пад старых бабуль — у лахмоцце, нават валасы пасыпалі попелам і пэцкалі твар. Абагнаў грузавік з нямецкімі салдатамі. Магчыма, па абрысе вузялка ўбачылі фрыцы, што нясе бабуля. Адзін «знаўца» мовы закрычаў:

— Матка! Яйкі дай, дай-дай — і ту-ту марш на Хомель, — падвязём, маўляў.

Маладая гарэзлівасць часам і ў незвычайных абставінах штурхае на неабдуманыя ўчынкі. Маша паказала аматару яек фігу. Абураны фашыст ускінуў аўтамат. Шчасце — сусед яго (былі і сярод немцаў людзі) ударыў па аўтамаце, і чарга высекла іскры на шашы. Смерць, гвалт падсцерагалі на кожным кроку. Але трэба было жыць! Філат Азаравіч і Мікалай, выдатныя бандары, рабілі бочкі. Але як прадаць іх? Зімой Вольга і Маша запрагаліся ў санкі-самацяжкі, грузілі на іх бочкі адна ў адну і везлі ў Навабеліцу (у Гомель праз мост цераз Сож з такім грузам не пускалі) ці часцей (лепшы «бізнес»!) — на Украіну, у Рэпкі — за трыццаць вёрст. Туды і назад — 60! Унучкі нашы не верылі, калі бабулі расказвалі ім пра такія паходы. Мне сорамна за ўнучак, якім ад Ждановіч да дачы (тры кіламетры) прайсці клопат. Гераіняй жонка мая і яе старэйшая сястра Вольга, святая праведніца, сябе ніколі не выдавалі. Але помнячы дурныя лыжныя паходы ў Запаляр'і (да вайны) на 20-30 кіламетраў, я з вялікай натугай мог уявіць, як дзве згаладалыя жанчыны цягнулі санкі з бочкамі. Выйгрышны эпізод для аповесці, але я не выкарыстаў яго, гераічныя сцэны падпольнай дзейнасці здаваліся больш натуральнымі, чым суровае жыццё.

Прывезлі за бочкі нейкі пуд ячменю, панесла Маша на млын, засыпала, і ў гэты момант верхні жорнавы камень раскалоўся, цяжкія кавалкі праляцелі міма жанчыны з двух бакоў. Збялелы млынар кінуўся да яе:

— Цэлая? Ну, дачка, доўга жыць будзеш.

На жаль, нядоўга. 77, здаецца мне, так мала! У такім узросце Талстой запісваў: «В старости отмирают способности, внешние чувства, которыми общаешься с миром: зрение, слух, вкус, но зато нарождаются новые не внешние, а внутренние чувства для общения с духовным миром, — и вознаграждение с огромным излишком. Я испытываю это. И радуюсь, благодарю и радуюсь».

У Машы гэтае пачуццё общения з духоўным светам нарадзілася пасля смерці Сашы, і гэта зрабіла яе яшчэ больш добрай да ўсіх блізкіх, да ўсіх людзей. Чаго яна страшэнна баялася — што пасля нашай смерці дзеці будуць судзіцца за маёмасць, нажытую бацькавай

працай. Шмат разоў прасіла напісаць завяшчанне. Пісаў разы тры, у дзённіку пісаў, але да натарыяльнага афармлення не давёў — з-за інерцыі ці з пачуцця няёмкасці перад людзьмі. Можа, спадзяваўся на дзяцей. І, відаць, дарэмна. Маша мела больш жыццёвай практычнасці.

Дывізіён стаяў у Кандалакшы, калі пачалося ўвосень 1943 года вызваленне таго кутка Гомельшчыны, дзе жылі мае бацькі, дзе была Церуха; я не сумняваўся, што калі яна не паспела эвакуіравацца (з грудным дзіцем!), то, безумоўна, перажыве навалу толькі ў бацькоўскай хаце. З хваляваннем і страхам прыліпаў я да рэпрадуктара, шчасце мае было ў тым, што пасада камсорга дывізіёна не толькі дазваляла мне слухаць у штабе радыё, але і абавязвала: першы прапагандыст, я павінен быў несці навіны афіцэрам і салдатам.

Ура! Вызвалена Злынка! Значыць, і Камень — мае бацькі. Тут жа пішу ліст, не адзін, пасылаю запар штукі тры. Во я, ваш сын, жывыздаровы! Ці былі весткі ад Машы, да вайны яна пісала ім, пра што паведаміла мне. Ці ёсць вестка ад Паўла, брата майго?

Вызвалілі Церахоўку. Але райцэнтр за 40 кіламетраў. Нарэшце блізка — Дабранку. І толькі дні праз тры ў зводцы Саўінфармбюро назвалі родную майму сэрцу Церуху. Пісьмы былі ўжо напісаны, і я адсылаў іх ледзьве не штодня, пакуль не атрымаў адказ. Маша, родная, любая мая, і маленькая Ліначка! Я жывы! Я жывы. Як вы? Як вы? Гэта былі не безгалосыя словы. Гэта быў крык і радасці, і страху: а калі прыйдзе трагічны адказ? Толькі франтавікі з раёнаў, якія былі пад акупацыяй, могуць зразумець мае пачуцці — незвычайнае чаканне невядомасці: радасці ці цяжкога гора. Між іншым, раней, чым ад бацькоў, я атрымаў вестку ад Машы. Ад радасці я заплакаў. Парторг Канстанцін Калбека (я хараша апісаў яго ў «Зеніце»), з якім я жыў у адной зямлянцы, чалавек іранічны і скупы на выяўленне пачуццяў, таксама расчуліўся да слёз. Я прачытаў яму ліст ад Машы, пра якую да таго расказваў неаднойчы, і ён, бацька траіх дзяцей, якія жылі ў Маскве, іранічна хмыкаў на маё захапленне:

— Мала яна табе піша.

Ударыў што абухом. Сапраўды, чаму так мала, так скупа? Пасля больш чым двух гадоў болю, трывогі, страху! Перад вайной, калі яна хадзіла ў Артуках цяжарная, яе пісьмы ўсе больш набліжаліся да маіх па сваей рамантычнай узнёсласці, радасці, смутку і болі, што так доўга яшчэ чакаць канца маёй службы. Я суцяшаў абяцаннем, што, калі міне год, абавязкова прыеду на пабыўку. А тут — як ваеннае данясенне: дзякуй Богу, перажылі і ў яе сям'і ўсе жывыя. Нават

нейкая дзіўная рэўнасць з'явілася: выходзіць, не сербанулі гора, ЯК многія іншыя?

Паток маіх пісем як бы разварушыў Машу, яна душой адчула, як я прагну падрабязнасцей, і пачала пісаць даўжэй, расказваць пра жыццё ў акупацыі. Між іншым, і пра тое, што пасля таго, як сасніла мяне, пайшла ў Артукі. «Куды толькі ні хадзіла — не баялася, а тут баялася, калі ішла праз балота, усіх: людзей, ваўкоў і дзікіх сабак».

Кранула моцна такая даверлівасць: аднаўляліся тыя адносіны, якія мы выказвалі адзін аднаму ў даваеннай перапісцы.

Прыйшло нярадаснае пісьмо ад бацькоў: «А Павел не піша. Ці жывы ён? Можа, ты напісаў бы высокаму начальству».

Наіўныя мае бацькі! Пасля вайны я разы чатыры пісаў у Падольскі архіў. Кожны раз называлі розныя франты і розныя часці, дзе служыў Шамякін Павел Пятровіч. Я выступіў у «Известиях» з прэтэнзіямі да архіву. Напісалі некалькі франтавікоў, з імі служыў Павел. Але зноў-такі розныя франты, розныя адрасы і даты гібелі.

І ўсё роўна адчуваю віну перад памяццю брата: не давёў пошукі да канца, залішне паглыбіўся ў сваю літаратурную працу, а можа, нейкі час і купаўся ў праменнях славы. Ганьба мне! Цяпер ніякія выданні, ніякія прэміі мяне не цешаць, хіба трохі радуюць, што даюць нейкі лішні мільён (жах! усе паняцці пераблыталіся, свет перавярнуўся дагары нагамі).

Бязлітасны быў да сябе Талстой і запісваў у дзённік: «Удивительное дело: я знаю про себя, как я плох и глуп, а между тем меня считают гениальным человеком. Каковы же остальные люди?»

А ён любіў гэтых людзей. І я люблю. Веру, што такіх, як Маша, як Вольга, нямала.

Цяпер аплёўваюць савецкі час. А між тым у хвалёных дэмакратаў нічога не расце, а ўсё рушыцца. А як хутка аднаўлялі жыццё саветы нават у ваенны час.

Адразу ж пасля вызвалення работнікі толькі што адноўленага райвыканкама, у большасці інваліды, хадзілі, ездзілі па вёсках, бралі на ўлік настаўнікаў, медыкаў, аграномаў. Асабліва дэфіцыт быў урачоў, фельчараў, бо іх прызвалі ў армію яшчэ ў пачатку, усіх — мужчын і жанчын. Машы прапанавалі месца ў Маркавіцкай бальніцы, гэта кіламетраў за дваццаць ад Церухі, праз лес, які я ў маленстве вытаптваў, пасучы каровы, збіраючы грыбы, ягады, носячы паперкі: пошта з лясніцтва ішла эстафетай — ад лесніка да лесніка.

Акрамя фельчарскіх абавязкаў — інваліды на перавязкі ішлі толькі да яе, яна загадвала аптэкай. Простая праца? Не, не простая. У яе абавязкі ўваходзіла ездзіць па лекі, нешта выдзялялі і цывільнаму

насельніцтву. Нельга было інвалідаў пакінуць без ёду і бінтоў! А ездзіць трэба было ў Гомель у аптэкаўпраўленне — за сорак кіламетраў. Ездзілі на бальнічным кані. Спачатку з конюхам-інвалідам, але здароўе не заўсёды дазваляла яму, таму нярэдка ездзіла сама. Начавала там жа, у аптэчнай канторы, бо меўся закрыты двор — паставіць каня. Украсці каня ў Гомелі маглі як піць даць. На мяса. Вайна зрабіла ўсіх татарамі, нават мая маці пачала есці каніну. Але ў Гомелі ўжо быў парадак.

— А дарогі ты не баялася? Праз такі лес? Да чорта ж дэзерціраў было, паліцэйскія былыя хаваліся.

— Былі. Аднойчы ў бальніцу заглянулі ўначы па перавязачны матэрыял. Але ты знаеш, я іх чамусьці не баялася. Я не думала пра іх. Адзіны клопат: як там Ліначка адна? Ці накормяць яе гаспадары?

У Гомель яна ездзіла, у Церуху амаль кожную нядзелю хадзіла, каб у добрых цётак сваіх сабраць які дзесятак яек для малой.

У 1944 годзе эпідэмія сыпняку. У бальніцы, разлічанай на дваццаць ложкаў, ляжала на падлозе да сотні чалавек. Паміралі. Дзяўчына, з якой я канчаў тэхнікум, Насця (не магу ўспомніць прозвішча) памерла. Натуральна, што ў такіх умовах Маша не магла не заразіцца тыфам і дачку заразіла. Хварэлі вельмі цяжка, з высокай тэмпературай, з трызненнем, непрытомнасцю. Кватаравалі ў набожных старых. Але «святыя» гэтыя не ўступілі фельчарыцы чыстую палавіну хаты, тулілася з дзіцем у трохсценку, за шырмай каля печы. «Адна выгода, што зімой цёпла было». Калі захварэлі Маша, Ліна, дачка набожнай пары, праведнікі гэтыя, баючыся заразіцца, ні разу не наблізіліся да хворых, не падалі вады. Вельмі гэта пасля абурала Машу: калі расказвала, яе ажно ліхаманіла. Андрэй Макаёнак колькі разоў спыняў яе: М І

— Не трэба, Маша! Не трэба ніякіх успамінаў! Бог ім суддзя.

— Не хачу ім боскай кары, але забыцца не магу. Такой неміласэрнасці нідзе не бачыла.

Ратавалі іх, хворых, тыя ж інваліды: прыносілі прадукты, хто што меў, гаіла іх чалавечая дабрыня, побач з душэўнай жорсткасцю гаспадароў яна, дабрыня іх, была асабліва дарагой.

— А тыя двое «святых» і пасля таго, як я і Ліна ачунялі, не саромеліся прасіць у мяне рыбін тлушч, на якім смажылі бульбу.

(Больш за ўсё мяне здзіўляў гэты тлушч: калі ішла такая вайна, сельскай бальніцы адпускалі па бутлі рыбінага тлушчу. Загадка! Як для мяне з'ўляецца загадкай, што ў 1941-1942 гадах у Мурманску ў зенітчыкаў не было гадзіны, каб не хапала снарадаў. Аднак я паўтараюся.)

Кротавы ўсе былі спагадныя: з Церахоўкі хадзіла старэйшая сястра Вольга, якую ж адразу пасля вызвалення заклікалі на пошту, з другога боку, з Церухі, за такія ж 20 кіламетраў хадзіла пятнаццацігадовая Клава, несла перадачы ад цётак, цётка Вася Ермакова, суседка Маня Кротава і ў акупацыю самі недаядалі, а неслі яйка, крыначку малака, лустачку сала Ліне. Вялікая сіла — чалавечая дабрыня! Адкрыўся фельчарска-акушэрскі пункт у суседняй Пракопаўцы, і Маша папрасілася ў загадчыцы аддзела аховы здароўя туды. Прычына была дзіўная: ёй пачаў аддаваць знакі мужчынскай увагі галоўурач Лебедзь. Маша спалохалася: што пра яе можа падумаць жонка ўрача, таксама ўрачыха, ды і іншыя людзі? Не дай Бог, нядобра. Сумленне, жаночы гонар, вернасць мужу для яе былі вышэй за ўсё. Такой яна заставалася ўсё жыццё!

Пераехала яна ў Пракопаўку — тую, праз якую я хадзіў з Воленкі ў сёмы клас. Пракопаўка толькі часткова гарэла. У парку захаваліся некаторыя будынкі — былы панскі дом, двухпавярховы дом для абслугі, даваенны драўляны дом канторы саўгаса, у якім размясціліся сельсавет, медпункт, пошта. Машу з дзіцем падсялілі ў пакойчык цаглянага дома да сям'і пагарэльцаў — сям'і франтавіка, будучага старшыні калгаса Панаса Баранава, з якім я пасля сябраваў не адзін дзесятак гадоў.

Жонка Панаса Глаша, маці яго, дзеці Ніна і Грыша былі людзьмі высокай сялянскай маралі. Яны не прыкідваліся дабрадзеямі, як тыя маркаўскія, але выяўлялі сапраўды хрысціянскую евангельскую дабрачыннасць.

Маша пасля расказвала:

— Жыццё шасці чалавек у маленькім пакойчыку (я пасля жыў у гэтым пакойчыку тры гады і напісаў там «Глыбокую плынь») была пасля Маркавіч раем...

— Добры рай!

— Не жартуй. Ты не ўяўляеш, як гэта грэе, калі чужыя людзі як свае. Я бегала цэлы дзень па вёсках (сем вёсак!) і была спакойная, бо ведала, што дзіця будзе дагледжана, накормлена. Мы жылі адной сям'ёй. Усё ў адзін кацёл: іх малако, гародніна, мой паёк... І праца задавальняла — самастойнасць. Інваліды і тут мяне любілі. І жанчыны, удовы.

Маша скупа пісала пра свае пачуцці, ды і пра жыццё сваё, не так, як я, сачыніцель: мае пасланні — раздзелы будучых раманаў, аповесцяў. Але вусна Маша расказвала цікава, жывапісна і пра падзеі, і пра людзей, і гэта давала багацейшы матэрыял для напісання тых твораў, падзеі якіх я сам не перажыў, як у «Глыбокай плыні».

Вясковыя падзеі жыцця Маеўскіх (прататыпаў Кротавых) расказала Маша, партызанскія — чалавек, які жыў за сцяной, з якім я працаваў разам, — старшыня сельсавета Іван Сяргеевіч Бібікаў, былы партызанскі камандзір, які перажыў жудасную трагедыю: немцы і паліцаі расстралялі ўсю яго сям'ю — маці, жонку, траіх дзяцей. Выпіўшы, Бібікаў кожны раз плакаў. Яго гора рвала маё сэрца. Думаю, такая блізкасць прататыпаў герояў абумовіла поспех першага майго рамана; зачытвалі яго да дзірак, так пасля чыталася хіба «Сэрца на далоні». Праўда, варта зрабіць папраўку на час: пасляваеннае бясnúmжжа і адсутнасць такой «заразы», як тэлебачанне, ды і радыё ў тыя гады, і кіно на сяле былі рэдкай раскошай.

Даволі гісторыі стварэння «Глыбокай плыні», каб паказаць, якім незаменным памочнікам была жонка ў працы маладога пісьменніка, філалагічна слаба адукаванага. Але ніжэй я прывяду і іншыя прыклады. Вобраз Машы быў бы няпоўны без гэтай яе дапамогі мне, непрыкметнай, незаўважнай, арганічнай, як само жыццё — наша шчаслівае жыццё.

Я парушыў паслядоўнасць апісання, праца над раманам больш арганічна ўпісалася б у наша пракопаўскае жыццё. Але як напісалася — так напісалася, гэта не раман, каб вывяраць кампазіцыю і ўсе іншыя дэталі яго. Гэта плынь успамінаў. А яна зусім не роўная, не спакойная — яна бурная, і розныя перыяды па-рознаму ўспамінаюцца. І ў розны час. Часцей за ўсё ў бяссонніцу. Прайшло два месяцы, як не стала яе, маёй Машы, а боль не сціхае. Бывае, што ўспаміны плывуць спакойна, а бывае, што хочацца выць, як раненаму зверу. Жывуць на дачы Ліна, Таня, унук, унучкі, Вольга Філатаўна, а мяне гняце адзінота. Учора пасля пасяджэння рады СП Рая Баравікова і Валянціна Коўтун пачалі выказваць спачуванні, і я заплакаў; жанчыны ажно збянтэжыліся: такі стары дзед плача! Што ж, стары — тое ж дзіця, але дзіця разумнае. Талстой запісваў у дзённіку: «Чем старше я становлюсь, тем воспоминания мои становятся живее. И удивительно, вспоминаю только радостное, доброе и наслаждаюсь воспоминанием не меньше, иногда больше, чем наслаждался действительностью».

Я таксама ўспамінаю толькі радаснае. Але не скажу, што маю ад успамінаў большую асалоду, чым ад жыцця з Машай. Жыццё ёсць жыццё! Яно вышэй за любыя ўспаміны, за любыя філасофскія развагі, разумовыя пабудовы. А можа, я не дайшоў яшчэ, як кажуць, да «кандыцыі старасці», калі не застаецца нічога, акрамя ўспамінаў? Але баюся: дайду — і жыццё скончыцца, бо не будзе чаго ўспамінаць.

Свой апошні цыкл мініяцюр Янка Брыль назваў: «Чытаю, пішу, жыву». Я напісаў бы з іншым знакам: «Чытаю, пішу — жыву».

Часам думаю: колькі разоў смерць пралятала нада мной вельмі блізка. У першы дзень вайны пры першым налёце, калі кулямётная чарга з «Хенкеля» перабіла баннік, які я трымаў у руках, каб выбіць снарад, які заклініла. Калі праваліўся пад лёд. Але часцей успамінаю іншы выпадак, можа, нават не самы небяспечны: бомбы падалі бліжэй — і гэта не называю блізкасцю смерці: на вайне як на вайне, каля тых, хто быў на перадавой пралятаві тысячы куль, снарадаў. Што зберагло тых, хто вярнуўся? Малітвы блізкіх? Але маліліся, бадай, за ўсіх.

Мая павышаная ўвага да жыцця, асцярожнасць яўна з'явілася пасля таго, калі прыйшла вестачка ад Машы, што яны з Ліначкай жывыя, здаровыя. Да таго я паводзіў сябе, як усе франтавікі: не думаў пра смерць. Тым больш што зенітчыкаў яна наведвала рэдка; немцы батарэі атакавалі ў пачатку вайны, пасля, калі іх загналі на вышыню, не помню ніводнага факта прыцэльнай бамбёжкі, да слова, у нас у дывізіёне, у корпусе супрацьпаветранай абароны, любы новы манеўр ворага тут жа паведамляўся ўсім часцям загадам па корпусе. Успамінаю адзін, здавалася б, малазначны факт. Але ад успаміну халадзею дагэтуль. Зіма 1944. Я, дывізіённы «прапаведнік», паехаў на батарэю МЗА[1], якая прыкрывала мост цераз бурную раку Коўда, гэта кіламетраў за 60 ад Кандалакшы, дзе штаб і батарэі нашы. Ехаў, як заўсёды, грузавым саставам, які вёз з Мурманскага порта на поўдзень англа-амерыканскую дапамогу. Саставы доўгія, прыкрываліся МЗА чужых дывізіёнаў, але свайго брата зенітчыка пускалі. Аднак ехаў я кожны раз з трывогай: часцей поезд не спыняўся на станцыі Коўда, і мне прыходзілася скакаць на хаду, а я не такі ўжо спрытны скакун. У той дзень ўсё вакол было засыпана свежым, некранутым снегам, да таго ж змяркалася рана — за Палярным кругам. Я стаяў на пляцоўцы вагона, на ніжняй прыступцы і трывожыўся больш звычайнага, бо не пазнаваў мясціны, дзе можна скочыць у адхон, увосень — на мяккую зямлю, зімой — у мяккі снег.

Тут саставы сцішылі ход, бо паваротка — абход Коўдзінскай «губы».

Разлічыў: яшчэ паўхвіліны і можна адпусціць парэнчу, сігануць у снег. Міг — і я скочыў бы на мост цераз невялікую, але глыбокую — паміж скал — рэчку. Верная смерць. Дагэтуль не магу сцяміць, што мяне стрымала. Анёл-ахоўнік? Матчына ці Машына мальва? Калі колы

---

[1] Малакаліберная зенітная артылерыя.

вагона прагулі па мосце, я, акамянелы, застылай рукой трымаўся за парэнчы. Як расшчапіць пальцы? Скочыць я не мог больш. Пэўна, даехаў бы да Беламорска. Але на мае шчасце састаў спыніўся на станцыі Коўда.

Лёс? Але, лес, хоць ніхто не ведае, што гэта такое — лес. Не помню, дагэтуль ці пазней здарыўся на гэтай Коўдзе выпадак, які ашаламіў увесь дывізіён. На мост цераз бурную раку немцы і фіны скінулі паўтысячы бомб, і ніводная не трапіла ў мост. Але адна пацэліла ў чалавека — у санінструктара нашай батарэі Аляксея (не магу ўспомніць прозвішча), які займаўся мірнай справай — лавіў рыбу. Чалавека разнесла ў шмаццё, не было чаго хаваць. Лёс? Жорсткі.

Прызнаюся, магчымасць такой недарэчнай смерці спалохала мяне, як не палохала ніводная бомба, што разрывалася недалёка ад пазіцыі батарэі. У гармату, суседнюю з той, якой я камандаваў, прамое пападанне было толькі ўлетку 1942 года, калі масавым налётам (армада ў 70 бамбардзіроўшчыкаў!) фашысты спалілі Мурманск, тады ў нас забіла чатырох чалавек. Але той выпадак не зрабіў такой псіхічнай траўмы, як скачок з цягніка, які, на шчасце, не адбыўся. Пра страх, які перажыў, я расказаў настаўніку і сябру майму Калбеку Канстанціну Дзмітрыевічу. Ён любіў мяне як сына і амаль ультыматыўна патрабаваў ад нампаліта Нужненкі не камандзіраваць мяне больш у Коўду, не дамовіўшыся з камандзірам батарэі ці ўзвода, які суправаджае састаў, каб машыніст зрабіў хвілінную супынку.

І другі выпадак, які яшчэ больш спалохаў мяне, бо здарыўся ўжо пасля вайны ў Ландсбергу, былым нямецкім горадзе, які перайшоў Польшчы. Быў спякотны чэрвеньскі ці ліпеньскі дзень. І мы, расслабленыя мірам, дэмабілізаваўшы палову асабовага складу — дзяўчат, не маючы баяздольнасці, загаралі ў прамым і пераносным сэнсе. Перабраліся на другі бераг імклівапльыннай Варты, на абсталяваны немцамі пляж (вайскоўцаў пускалі па адноўленым яшчэ ў вайну чыгуначным мосце), мы адпачывалі, як курортнікі, — купаліся і загаралі. І раптам крык на рацэ. Тоне дзяўчына. Мяне скаланула: а калі наша, са шпіталя ці з часці? Загінуць пасля вайны! Плавец я быў не высокай вывучкі, Сож каля Гомеля ні разу не адважыўся пераплыць. А тут апантана кінуўся ратаваць. А ўменне ж ніякага. Дзяўчына схапіла маю руку і так сціснула, што паралізавала, сінякі засталіся. Мы ныралі, сёрбалі ваду. Нас несла на ўзарваны мост. Ударыліся б аб вострыя жалезныя пруты — і амба! Ды раптам адкуль ні вазьміся ваенны кацер. Маракі падляцелі, двое кінуліся ў

раку і ўмела ўзвалаклі нас на кацер. Дзяўчына аказалася полькай — з тых, што першымі асвойвалі новыя землі. Маракі ведалі яе.

Эпізод гэты я апісаў у «Мосце», рэтраспектыўна, — як Пятроў успамін. Пра яго напісаў Машы, яўна пахваліўшыся: во які я герой! Пра Коўду не пісаў, каб не спалохаць: і паездкі мае небяспечныя.

Сталы ўжо, я ледзьве «не аддаў канцы» ад цяжкіх аперацый. Але жыву. Жыву. А Машы няма. Я пісаў, як у вайну смерць пралятала над ёй. Але... лес? Выходзіць, не можа ён, лес, увесь час быць шчаслівым. Траціць сваю станоўчую энергію?

І зноў жа Талстой; разгарнуў учора том і прачытаў: «...всё-таки основа и разума и всей духовной жизни есть способность воспоминания».

Нельга не пагадзіцца. Але памяць нярэдка падводзіць. Думаю пра Машу, пішу, а не ўспомніў, што сёння роўна два месяцы, як яе не стала, Вольга напомніла, і мне зрабілася нядобра. Вінюся, Маша. Няхай нішто не патрывожыць тваю душу.

Мы недакладна ведалі дзень яе нараджэння. Паўстагоддзя адзначалі 17 сакавіка. А ў мінулым годзе выпадкова выявілі, што ў пашпарце запісана 7 сакавіка. Хто памыліўся: сама Маша ці пашпартыст? Вольга кажа, што бацька іх, Філат, называў апошнюю дату. Але бацька пры ўсёй сваёй начытанасці ніколі не віншаваў дачок, бо наўрад ці помніў даты нараджэння ўсіх шасцярых дзяцей. Але затое Маша помніла дні нараджэння не толькі сваіх дзяцей, унукаў, але пляменніц, пляменнікаў, іх дзяцей — яе дваюрадных унукаў. Кожнаму са сваіх рабілі свята, мне — цэлы юбілей. Свае імяніны любіла, але без чужых гасцей, акрамя хіба Андрэя Макаёнка. Ён не забываў павіншаваць, і гэта яе кранала, хоць знакі павышанай увагі да асобы сваёй не любіла. Клопат пра іншых быў сэнсам яе жыцця. Калі Андрэй, развёўшыся з Ленай, адзін жыў на дачы і не з'явіўся на мой дзень нараджэння — 30 студзеня, Маша ўстрывожылася:

—Захварэў.

— Можа, забыўся?

— Не мог ён забыцца!

І на другі дзень я паехаў да яго, даехаў на машыне да «Беларусі», а там два кіламетры таптаў сцежку ў снезе, які валіў усю ноч. Андрэй з высокай тэмпературай ляжаў у непрапаленай дачы.

Аднак залішне пакручастая сцежка маіх успамінаў. З такімі адхіленнямі не выберашся з іх за многія месяцы. А колькі мне Бог адвёў жыцця? Нехта з французаў, здаецца, сказаў: «Трэба мець час, каб напісаць коратка». Я ніколі не ўмеў пісаць коратка, як Янка Брыль. Я меў мала часу? Можа, і мала. Але мне зайздросцілі, што я

напісаў шмат. Цяпер не зайздросцяць, бо няма перавыданняў, і творчасць наша ў мінулым; рушылася дзяржава — рушыліся таленты, час параўнаў усіх нас, працавітых і гультаяватых, таленавітых і не вельмі. Літаратура — дама капрызная і здрадлівая. Мне плакаць хочацца за лёс драматургі Макаёнка, прозы Мележа, паэзіі Панчанкі. Тыя, хто нібыта ваюе за нацыянальнае адраджэнне, калі ўгледзецца, спіхваюць з п'едэстала нават Купалу і Коласа, каб заняць іх месцы. Божа, наколькі вышэй была мая Маша. Яна ні на хвіліну не займала чужога месца, толькі сваё, адведзенае ёй Богам і жыццём!

5

Лета 1944. Пачалося вялікае наступление амаль усіх франтоў. Карэльскі рушыў на дзень ці два раней Беларускіх — глабальнай аперацыі «Багратыён». У канцы чэрвеня вызвалілі Петразаводск. І літаральна на другі дзень 33-ці асобны зенітна-артылерыйскі чырвонасцяжны дывізіён быў зняты з пазіцый у Кандалакшы, Афрыкандзе, Коўдзе і пагружаны ў саставы. Не рабілі тайны, куды перакідваюць.

Я выказваў сваё здзіўленне наяўнасцю снарадаў у Мурманску — ні гадзіны без снарадаўі Я гэтак жа здзіўляюся дагэтуль: адкуль браліся вагоны? Два дні — і два саставы!

Гэтую і ўсе наступныя перадыслакацыі — ад Петразаводска да Ландсберга на Варце — я падрабязна напісаў у рамане «Зеніт». Хіба магу адзначыць наша спакойнае, бадай мірнае (Фінляндыя выйшла з вайны) жыццё ў сталіцы Карэла-Фінскай рэспублікі. Кармілі па тылавой норме. Але для мяне была радасць: мора выдатнай паперы; у Кандалакшы апавяданне «У снежнай пустыні» я напісаў на руска-фінскім слоўніку; паперу на лісты (а дзяўчаты любілі пісаць) выдавалі з большай ашчаднасцю, чым сто грамаў франтавых, якія старшыны палавінілі: выгадвалі сабе і начальству.

Я «купаўся» ў паперы. Але не помню, каб напісаў штось вартае ўвагі, як «У снежнай пустыні». Я пісаў лісты Машы. Я закідваў яе пісьмамі з доўгімі развагамі аб нашым каханні, аб нашай будучыні — пасля вайны. Шкадую, што тое не захавалася, яно было б цікавым дакументам часу.

Маша адказвала не так часта і каратка. Без любоўных излияний — не любіла сантыментаў. Да таго ж у яе не было часу. Тут формула працавала сваім прамым сэнсам: якраз адсутнасць часу вымушала пісаць лаканічна, без тых адступленняў, разваг, вадзяністай філасофіі, якія дазваляў сабе я, камсамольскі прапагандыст, * пачынаючы пісьменнік. Але не толькі гэтымі якасцямі было абумоўлена маё частае пісанне. Я жыў каханнем да жонкі, любоўю да дачкі. Я лічыў сябе

шчаслівым чалавекам — яны ёсць у мяне. Бадай, ніхто з маіх равеснікаў, прызыўнікоў апошняга мірнага года і ваенных гадоў, не меў такога шчасця. Акрамя ўсяго, я адчуваў віну перад Машай і як бацька замальваў яе (але пра гэта пасля). Праз год яна скажа мне: «Я па пісьмах тваіх здагадвалася, што небязгрэшны».

Не трэба залішне многа прызнанняў! Ва ўсім павінна быць разумная мера, у каханні таксама — ці, можа, нават — тым больш у каханні.

У «Зеніце» герой — я — сустрэў перамогу ў шпіталі. У сапраўднасці ў шпіталь я не трапіў, хоць быў аглушаны на Одэры, куды паехаў з пражэктарысткамі. Але помню, што пасля радаснага салюта на світанку, першым мірным, я апынуўся ў абгароджаным нямецкім гародзе, дзе яшчэ нічога не пасеялі, але вырасла трава, і паводзіў сябе ў адзіноце, як дзіця: куляўся, качаўся, смяяўся, плакаў.

Ніхто з маіх калег, якія прайшлі фронт, не напісаў гэтага адчування ў тую пераможную ноч. Не, здаецца, ёсць у Юрыя Бондарава. Праслязіўся нават Калбека, саркастычны парторг, які высміхоўваў маю сентыментальнасць. Плакалі дзяўчаты — тыя, у каго загінулі бацькі, браты, жаніхі.

З усходам сонца я сеў пісаць Машы: новы дзень, новая эпоха, новае жыццё — новыя думкі. Зноў шкадую, што тое не захавалася. Цікава, якія яны былі, думкі, развагі першага мірнага дня? Залішне ўзнёслыя? Наіўныя? Хапала ў іх усяго. Але аднавіць такое пісьмо немагчыма. Аднавіць радасць таго дня. Шмат пасля было ў жыцці радасці, але ніводная не набліжалася да тае адзінай, калі з'явілася перакананне, што ты прайшоў страшэнную бязлітасную вайну і застаўся жывы, не скалечаны. Помню адно, што напісаў ці, можа, і не напісаў, але што гучэла ў кожным радку: «Я вярнуся да цябе, Маша! Я вярнуся!» Пяць гадоў назад я сказаў гэтыя словы на рэчыцкай дарозе. Пісаў іх у пісьмах даваенных, у пісьмах пасля вызвалення. Але ці так яны гучалі, як у дзень Перамогі?!

Праз месяц-паўтара звалілі дзяўчат. Не прыгарнуўся я ні да адной з іх, але развітваўся з імі з глыбокім смуткам. Акрамя таго, што большасць з іх былі выдатнымі салдаткамі, яны саграваді мужчынскую палавіну, няхай некаторыя і грахоўна, але, як казалі тады, «вайна ўсё спіша».

Іранічны Калбека не без смутку сказаў каля вагонаў, з якіх дзяўчаты выглядалі, як злоўленыя птушкі:

— Мне шкада іх.

І мне было шкада іх. Чаму? Не разумею. Цяпер гляджу на бабуль — былых франтавічак, партызанак і кажу ім, у размовах, у кнігах: «Вы шчаслівыя людзі».

Маша лічылася ўдзельніцай вайны — рабіла ў тыле. Па яе прафесіі не ў тыле яна працавала — на перадавой: памагала раненым. Помню, як у Пракопаўцы інваліды, абураныя, на іх думку, несправядлівай дзяльбой юнраўскіх анучак (а было нямала сапраўды анучак — стар'ё слалі амерыканцы), сказалі мне, сакратару партарганізацыі:

— Каб ты, Пятровіч, не быў Марусіным мужам, мы табе намялі б бакі. Скажы дзякуй жонцы сваёй, яна асцерагае цябе.

Яна асцерагала мяне больш за паўстагоддзя! Ад злых людзей, ад хвароб, ад літаратурнай багемы, ад захаплення славай і ад рознага глупства.

Там, у Германіі, я ўпершыню сур'ёзна заняўся творчасцю, пісаў не ў «мёртвую гадзіну» пасля абеду — у «мёртвы сезон» («мёртвы» ў сэнсеібаявой і палітычнай падрыхтоўкі; вайна скончылася, f яна ўсяму навучыла — і страляць, і жыць!). Сядзеў у пласторным пакоі нямецкага дома перад стосам выдатнай паперы, перад масіўным чарнільным прыборам, які я не паляніўся прыцягнуць дадому (адзіная каштоўная рэч, якой калегі пісьменнікі зайздросцілі).

Парторг Калбека, застаючы мяне за сачыненнем, скептычна хмыкаў:

— Сядзіш, шчалкапёр?

— Сяджу.

— Сядзі, сядзі. Работа любіць дурняў.

Цьмяна прыгадваю, як узнікла задума сюжэта «Пометы». Ці не ад таго, як мы з тым жа Калбекам не здолелі забраць у нямецкім доме скуру на падошву? Я напісаў гэты эпізод у «Зеніце». Дробязь перарасла ў высокую гуманную ідэю: не помсціць мы прыйшлі на іх зямлю, у савецкага афіцэра (у маёра Раманенкі — героя «Пометы») зусім іншая мараль, чым у фашыста, які расстраляў у Беларусі маёраву сям'ю.

Можа, тады, над першай сваёй аповесцю, зразумеў, за якую цяжкую працу бяруся — не цэглу фармаваць!

За пяць гадоў я адарваўся ад беларускай моўнай стыхіі, добра яшчэ, што ўсе гады меў у ранцы беларускую кнігу — зборнік вершаў Паўлюка Труса, які захапіў, калі ішоў у армію. Вывучыў вершы на памяць. Нават чытаў іх дзяўчатам — архангельскім, комі, і — дзіўна! — яны слухалі.

Рукапіс адаслаў Машы. Не помню, па маім жаданні ці сама яна адаслала яго ў часопіс «Беларусь». Галоўнаму рэдактару Іллі Гурскаму

аповесць падабалася, але аб'ём для тонкага часопіса вялікаваты, і ён перадаў яе ў

«Полымя» Пятрусю Броўку. У апошнім нумары 1945 года адбыўся мой дэбют.

У жніўні я выпрасіў у камандзіра дывізіёна два тыдні адпускных. Рваўся сустрэцца з жонкай, дачкой. Дарога была пакутлівая: з Брэста ледзьве выехаў.

Прыехаў у Церахоўку і, выскачыўшы з вагона, пабег да Пракопаўкі, чамадан быў лёгкі, нічога ў Германіі не набыў, не як некаторыя, што везлі па паўвагона.

Уразіла Воленка: уся высечана — і стары лес, і малады сасняк. Але хата лесніка, у якой я жыў, ацалела.

Знаёмы парк, парадзелы, праўда. Знаёмы дом. Па Машыных апісаннях знайшоў пакой, у якім жыла жонка і дачка. Машы не было. Малая Ліна расплакалася, калі я ўзяў яе на рукі. Што паду мала чатырохгадовае дзіця? Ведала ж, што ў яе ёсць тата.

Сустрэча з Машай адбывалася без сантыментаў, без слёз і ласкавых слоў, бо прысутнічалі маці і дачка Баранавы. Маша азірала мяне неяк здзіўлена і насцярожана. Можа, таму, што я добра адкарміўся на нямецкіх харчах, а яна — скура ды косці. Насцярожанасць устрывожыла. Але выгляд яе не расчараваў, яна па-ранейшаму была любая, жаданая, пяцігадовая разлука, палярныя вятры не астудзілі пачуцці.

Упэўнены, што шчырасць — ніякіх тайн! — нас зблізіць, я ўначы прызнаўся ў адзіным сваім граху. Меў сувязь са сваёй падначаленай, калі яшчэ быў камандзірам гарматы, кароткую — некалькі дзён; камандзір батарэі, які сам адкрыта жыў з дзяўчынай, прысякаў амаралку — разлучыў нават сур'ёзна закаханых: «вымяньваў» яго ці яе на такога ж грэшнага з іншай батарэі ці службы пры штабе.

(Між іншым, гэтая мая звышсумленнасць падводзіла мяне і пазней, не ў сямейным плане — у службовым, літаратурным.)

У цемры я не мог бачыць выраз твару яе, словамі яна ніякіх эмоцый не выказала, але паўтору блізкасці не дазволіла: перабралася з вузкага ложка на голую ляжанку. Эмоцыі яна выявіла дні праз тры, калі мы пехатою ішлі да маіх бацькоў — у Добрушскае лясніцтва.

Сустрэлі чараду кароў, якіх гналі з Германіі змораныя доўгай дарогай бранскія жанчыны. Я пачаў па-салдацку гулліва размаўляць з імі. Адна мацюкнула мяне:

— Знайшоў дзеўку, дык вядзі куды вядзеш, бугай адкормлены.

Адышлі — і Маша страшэнна абурылася. Не мацюжніцай. Мною. Маёй развязнасцю. І выдала мне так, як пасля не выдавала ні разу ў прыступах рэўнасці.

— Цынік ты! Распуснік! А такія пісьмы пісаў... Брахун!

Ад блізкасці, пакуль гасцілі ў бацькоў, спачатку ў маіх, пасля ў Церусе, яна не ўхілялася, але рабіла гэта як бы пад прымусам, папрасіла мяне асцерагацца, каб ёй не зацяжарыць.

Бацька мой са сваёй сялянскай непасрэднасцю пакрыўдзіў яе. Пры сустрэчы агледзеў нас і бухнуў:

— Сын наш вон які спраўны, а ты якая...

Маша крыўды не выдала, адказала жартам:

— Сына немцы кормяць. А мяне... дзевяць кіло амерыканскай фасолі ў месяц.

Маці маёй Маша спадабалася, палюбіла яе. На сястру маю Галю мела крыўду, якую не забывала і пазней. Год назад Галя прыйшла ў Маркавічы, Маша сустрэла залоўку як родную, а тая выпытвала ў суседак, як нявестка паводзіць сябе тут: ці не гуляе? Гэта Машу абразіла, абразу гэтую доўга не магла дараваць.

У паходах і пераездах пралящела паўмесяца. У канцы майго водпуску быў апублікаваны ўказ аб дэмабілізацыі з арміі радавых, сержантаў старэйшых узростаў і спецыялістаў народнай гаспадаркі — інжынераў, тэхнікаў, настаўнікаў, медыкаў. У ваенкамаце, дзе трэба было адзначыцца па прыездзе і ад'ездзе, мне сказалі, што я маю права звольніцца тут, дома. Але мяне пацягнула ў дывізіён, у якім праслужыў пяць гадоў, да баявых сяброў — развітацца з імі.

Пасля шкадаваў, што паехаў, бо нейкія два месяцы цягнуліся даўжэй за пяцігодку — так рваўся дадому, да Машы. Каханне мае за дні сустрэчы нікольні не аслабела, нягледзячы на яе абурэнне і цяпер зразумелую мне адчужанасць. Моцна трывожыла, што ад жонкі ні слыху ні дыху. Апраўданне давалі нараканні на палявую пошту: у мірны час яна пачала працаваць горш, чым у ваенны.

Нарэшце звальненне. У канцы кастрычніка. Дзе я пісаў пра доўгую, у шэсць сутак, дарогу дадому — у мірнае жыццё? У «Мосце», безумоўна, пра перыпетыі з вагонамі, з маімі кнігамі. Я вёз мяшок кніг. Во мае трафеі! У нейкім маёнтку мы выявілі рускія кнігі са штампам Смаленскай бібліятэкі. Я перавозіў іх, аформіў у дывізіённую бібліятэку і... адабраў для сябе — для вучобы. З паведамленнем з «Полымя» аб прыняцці «Пометы» я цвёрда вырашыў: іду ў школу ў той вёсцы, дзе Маша, і тут жа паступаю на завочнае аддзяленне педінстытута. Што і зрабіў, калі вярнуўся.

Як дабрацца з Церухоўкі да Пракопаўкі з мяшком кніг? Пазваніў са станцыі Вользе, яна рабіла ў райцэнтры на пошце.

— Я пазваню ў сельсавет. Маша папросіць у калгасе каня.

Чакаў гадзіны тры з нецярпеннем. Вечарэла. І я ўскінуў мяшок на плячо, чамадан у руку — і.дай Бог ногі і сілу ў нагах. Але груз не па сіле. Каб не голыя кусты, схаваў бы кнігі ў гушчары. Але як схаваеш увосень! Шкада было: дождж можа памачыць, найдаражэйшы ж скарб — кнігі. Калі ўжо бадай знямогся, пашанцавала: дагнаў дзядзька на падводзе і пад вёз франтавіка.

Машы дома не было. Малая пазнала бацьку, ахвотна пайшла на рукі, і гэта было вышэйшай узнагародай за праліты пот.

— А Маруся пайшла цябе сустракаць, — паведаміла старая Баранава.

— Без каня?

— Дзе ты возьмеш таго каня! Колькі іх у калгасе? Пяць ці сем.

Маша вярнулася параўнаўча хутка, здзівілася:

— Як жа гэта мы размінуліся?

Але я зразумеў, што бачыла яна мяне. Але чаму не сустрэла? Таму што я быў на возе? Пасаромелася фурмана? Яе пацыент, інвалід.

На другі вечар наладзіла вечарыну з нагоды звароту мужа, усе бацькі, жонкі адзначалі гэтую, можа, самую радасную ў жыцці падзею: вярнуўся жывы! На закусь нават сала было. Дзе ўзяла? Пазычыла? Захавала для такой нагоды з таго, што ёй зрэдку прыносілі ў знак удзячнасці за лячэнне? У застоллі сядзела вясковая ўлада: старшыня сельсавета, старшыня калгаса — партызан і франтавік, абодва інваліды.

Жанчыны пілі самагонку за шчасце Марусі. Хіба ж не шчасце — муж вярнуўся? Сама гаспадыня асаблівай радасці не выяўляла. На гэта звярнулі ўвагу. І Маша як стрэсла з сябе скруху — павесялела.

Не ў тую ноч — пазней, прыжыўшыся, я з папрокам спытаў яе:

— Ты ніводнага пісьма не напісала?

— Я пісала.

— Не атрымаў...

— Я напісала тры, — і характэрна пазмрачнела, пачуцці вельмі выразна адбіваліся на яе твары. — Але не адаслала. Я пісала, каб ты не вяртаўся да нас.

— Чаму? — ашаломлена спытаў я.

— Ты не знаеш чаму? Я так верыла табе! Так верыла. Мае расчараванне расло...

Гарачая хваля ўдарыла ў патыліцу: з-за сваёй мужчынскай нявытрыманасці я мог страціць сваё шчасце!

— А пасля паду мал а: а дзе я знайду другога такога дурня? Колькі вас засталося, жаніхоў нашых! Ды якая я нявеста — з дзіцем. Зраблю Ліначку сіратой пры жывым бацьку...

— Разумніца ты мая...

— Не падлізвайся.

Шчасце вярнулася — і я супакоіўся. Хутка зразумеў, што Маша кахае мяне па-ранейшаму, толькі выяўляе гэта інакш, чым да вайны. На ласкавыя словы яна заўсёды была скупая, але каханне сваё, у сталыя гады — любоў, умела выказаць нейкай асаблівай увагай, надзвычайным клопатам — як да мяне, так і да дзяцей. А тады, у першыя месяцы нашага сумеснага бед нага і ўсё роўна шчаслівага жыцця, яна найлепш выразна выяўляла свае глыбокія чыстыя пачуцці прыступамі... рэўнасці. Магла спіхнуць мяне з нашага вузкага жалезнага ложка. Магла шыбнуць у мяне што-небудзь, але заўсёды мяккае, быццам і злосць, і гульня. У прыступе такой рэўнасці спаліла пісьмы Жэні Бугровай, маёй завочнай карэспандэнткі, не верыла, што так хораша, ласкава можна пісаць чалавеку, якога ніколі не бачыў у вочы, а начытаная рамантычка, па сутнасці, паміж радкамі прызнавалася мне ў каханні. А неўзабаве, калі я пачаў рабіць у школе, Машына рэўнасць з умоўнай, да далёкіх невядомых зенітчыц і Бугровай, стала больш прадметнай — да настаўніц. Працавала выкладчыцай беларускай мовы мая аднакласніца Маруся Антоненка, у якую я ў сёмым класе быў закаханы, пісаў запісачкі, назначаў спатканні, на якое замест Марусі на мост з'явіліся хлопцы і зрабілі цёмную мне.

Аб гэтай даўняй дзіцячай прыгодзе я расказаў з іроніяйі са смехам, але Машы здалося, што старое можа ўваскрэснуць.

Неапраўданая рэўнасць часам абурала, але і радавала: раўнуе — значыць кахае. А яе каханне — самае дарагое, што я меў, яно давала энергію для творчасці, для працы ў школе, для партыйнай дзейнасці, даволі няпростай для таго часу. Мяне па падказцы райкама выбралі сакратаром сельсавецкай партарганізацыі. На той час — шэсць калгасаў без тэхнікі, у лепшым калгасе «Воля» — семнаццаць коней. Зімой трэба было падняць людзей — зноў тых жа дзяўчат — на лесанарыхтоўку; заданні былі жорсткія, шахты чакалі стойку, чыгунка — шпалы. Вясной — сяўба. Разбіся, а пасей! За зрыў пасяўной цягнулі на бюро райкама старшыню калгаса, старшыню сельсавета і сакратара партарганізацыі. Але больш цяжкім, чым лес і сяўба, была нарыхтоўка малака і мяса. Жывёлы няма, а ўсё роўна здай назначаныя 46 кілаграмаў мяса, колькі малака — дык і не помню ўжо.

За правал нарыхтовак маглі не толькі выключыць з партыі, чым паламаць біяграфію, але і на прымусовы лесапавал адаслаць.

Але — дзіўна! — я нічога не баяўся, працаваў весела, з аганьком, у райкаме мяне цанілі. Калі я пачаў друкаваць апавяданні ў «Гомельскай праўдзе», сакратар Пятро Гарцуеў на пленуме хваліў мяне.

Цяпер здзіўляюся: адкуль браў час, імпэт, сілу волі? Удзень — школа, ўвечары — сход, партвучоба. Позна ўначы — за пісьмовы стол. (Які пісьмовы? Стол быў адзін — калека на трох ножках, дзве табурэткі — і гэта ўся мэбля).

З такой жа самааддачай працавала і Маша. Я яшчэ спаў, а яна ўжо прымала ў амбулаторыі хворых. А пасля бегла да тых, каго трэба наведаць дома. Ні адзін хворы не заставаўся без увагі. І ўсё пехатой. А участак — дзевяць вёсак. Не спынялі яе ні дождж, ні снег. А яка я была апратка! Які абутак! Успамінаю — плакаць хочацца.

Жылі мы вельмі бедна. У аповесці «Мост» я апісаў гэтую беднасць, калі герой — я — знясілены, не мог данесці паўтара пуды бульбы, насыпаныя лесніком напавер: атрымаеш палучку — аддасі. Настаўнікам — 600 рублей, калі пуд бульбы каштаваў дзвесце (зарплату выдавалі параўнаўча акуратна, медыкам сельскім па паўгода не плацілі, як і ў наш «шчаслівы» час вяртання ў капіталістычны «рай»).

Вясной 1946 года, калі ў Малдавіі, на Украіне мерлі людзі, мы таксама, можна лічыць, галадалі. Па бульбіне-дзве нам з Машай, кубачак малака з той жа бульбінай малой — гэта было ўжо шчасце, калі ўдавалася раздабыць такі «багаты» рацыён. А фасолевы суп, забелены малаком, здаваўся царскай ядой.

Можа, гэта прагучыць парадаксальна, але я ўпэўнены, што нястачы, беднасць і бескарысная адданая праца дзеля людзей умацоўвалі, цэментавалі нашу любоў, так я называю тое, што паступова ўсталёўвалася паміж намі. Менавіта — любоў, яднанне дзвюх душ. Каханне — гэта агонь, які запаліста ўспыхвае, але лёгка можа і патухнуць. Гэта — песня, якая дае асалоду, але можа хутка і скончыцца. А калі з'яўляецца любоў, то яна звязвае навечна. Яна — не мёд, яна — жытнёвы хлеб, у якім маеш патрэбу штодня, і яна, любоў, як хлеб арганізму, дае жыццёвую сілу пачуццю. Не думаю, што я тады разумеў гэтак жа. Але тое, што Маша забывала на мой грэх, а калі і ўспамінала, то з нязлой ужо іроніяй, і нягледзячы на прыступы рэўнасці да Антоненкі ці яшчэ да кагось з рэальных жанчын, я адчуваў да яе ўсё большую і большую замілаванасць, пяшчоту і, можа, самае галоўнае, удзячнасць, што яна не кінула мяне, не выставіла за дзверы, як ката, што нашкодзіў. Я не ўяўляў жыцця без яе. Куды б я пайшоў? На цагельны завод? Там, пэўна, не галадаў бы. Але што мне

дала б тая праца? Яна не дала б магчымасці тварыць, вучыцца. А так мяне пасярод навучальнага года залічылі на завочнае аддзяленне педінстытута. І я пісаў. У сорак шостым я замахнуўся на вялікую працу — на раман. Адкуль такая смеласць? Сюжэт першай часткі дала Маша. Натуральна, што яна стала прататыпам Таццяны Маеўскай. Я не люблю чытаць напісанае нават самым блізкім чытачам, хоць рукапіс пасля даю ахвотна: чытайце на здароўе. А тут неяк угледзеў, што раніцай (была вясна, світае рана) Маша з вельмі сур'ёзным тварам чытае, што я напісаў за ноч, а пісаў я па некалькі старонак нямецкага гросбуха (прывёз у запас і паперу). Не пужануў яе, хоць усхваляваўся: як ацэніць? За снеданнем спытаў:

— Ну як?

— Што?

Паказаў вачамі на рукапіс.

— Ты падглядаў, што я чытаю. Хітрун!

— А хіба ў нас могуць быць тайны адно ад аднаго?

— У цябе яны ёсць. У мяне — не.

— І ў мяне няма. Проста слабавольны я.

Перад гэтым Маша зрабіла нязлосную праборку мне: тры дні таму мы з Бібікавым прынялі запрашэнне Антоненкі павячэраць у яе бацькоў, і я, баязлівец, стаіў гэта ад жонкі. А хто ў той галодны час мог адмовіцца ад вячэры? Маша разумела гэта і рэўнасці не дала волі. Паддражнівала, і ўсё.

Высокіх ацэнак яна не давала не толькі ў пачатку маёй творчасці, але і тады, калі я стаў народным, лаўрэатам і меў сотню выданняў.

Тады, помню, яна сказала:

— Пішаш ты цікава. Але пра жыццё ў акупацыі ты пытайся ў мяне. Я табе раскажу ўсё, што перажылі мы.

Так з'яўляліся падзеі сям'і Маеўскіх, на думку крытыкаў, больш дакладныя, праўдзівыя, чым раздзелы партызанскія, хоць Бібікаў, чалавек гаваркі, расказваў многа і ахвотна, але, відаць, на яго ўплывала ўжо партызанская літаратура, у той час даволі яшчэ недасканалая — запісы па гарачых слядах. Калі «Глыбокая плынь» выйшла асобнай кнігай, рускі пераклад выйшаў у «Советском писателе» у тым жа 1949 годзе (во аператыўнасць!), я неаднойчы чуў, як былыя партызаны расказвалі пра свае подзвігі не па ўласных успамінах — па маім рамане: больш уражліва, лагічна завершана, а галоўнае — аснова жыццёвая. Гэта лагічна: чалавеку хочацца празаічнае жыццё сваё ўзняць да паэтычнай легенды. Толькі чэрствыя прагматыкі гэтага не робяць.

Дзесьці ў канцы 1946 я адаслаў першую частку рамана ў «Полымя». Не чакаючы прысуду ёй, актыўна, з уздымам пісаў другую. Упэўненасць дала Маша сваёй ацэнкай. Не магу не успомніць добрым словам рэдактараў часопіса. Машынкі ў мяне не магло быць, усё пісаў, перапісваў ад рукі. І яны, рэдактары, чыталі, правілі па рукапісе, пасля чаго аддавалі на перадрук машыністцы. Да прыезду ў Мінск я нават не ведаў, што машыністцы трэба заплаціць. І рэдактар, і машыністка лічылі, што браць плату з сельскага настаўніка — непрыстойна. Адданыя справе людзі!

Адданыя... Гэтая адданасць справе, спагада хворым магла прывесці не толькі Машу, але і нас з Лінай да трагедыі.

Нямала было хворых на сухоты. Вяртаючыся ад іх, Маша старанна мыла рукі ў амбулаторыі, чысты халат мыла паўторна.

Аднойчы, пасля паходу ў Будзішча, я ўгледзеў яе нязвыкла ўзбуджанай. Насцярожыла, што яна не цалуе, не лашчыць дачку.

— Была ў туберкулёзніка?

Маша, характэрна прыжмурыўшыся, задумалася, рашаючы дылему: казаць ці не казаць?

— Мала што была...

— Адвезла ў бальніцу?

Уздыхнула цяжка.

— Не. Былі з Акулінай у Галі Бондаравай. Згасае дзяўчына: адкрытая форма, дыханне не з хрыпам — са свістам. Не есць нічога. І маці яе папрасіла: «Дзеткі, можа, яна з вамі з'ела б малачка з тварагом». І мы селі. І сёрбалі з адной міскі. Нельга было адмовіць. Даць зразумець, што жыццё яе згасае? А ёй так хочацца жыць! Каб ты пабачыў, там сам сеў бы...

Відаць, я не сеў бы сёрбаць з адной міскі, бо жэст жонкі і акушэркі не мог зразумець.

Да таго я ніколі не павышаў на Машу голас — так асцерагаў яе і свае пачуцці, помнячы, што яна была гатова на рашучы крок. А тут не вытрымаў. Пасінелы ад страху, гневу — перажыць вайну, каб памерці ад сухот? — ашалела закрычаў:

— Ты звар'яцела? Дзіця загубіць захацела? Фельчарка бязмозглая! У Акуліны тваёй што галава, што жывот — адным... набітыя. А ты ж... ты разумны чалавек! Здавалася мне...

Дзіўна, вострая на язык, яна нічога не адказала на мой істэрычны крык, яна даравала нават непрыстойны сялянскі эпітэт. І я зразумеў, што спалохана мая дарагая жонка не менш за мяне. Тыдні тры адварочвалася ад малой, кал і тая лашчылася. Клалася асобна спаць. А потым кінула мне ўедлівы жарт:

— Ты ўсё яшчэ баішся мяне пацалаваць? Нікчэмны баязлівец! Глядзі — развучышся. Ці маеш на кім практыкавацца?

Бог быў літасцівы да нас, маладых. Хоць як сказаць літасцівы... Маша часта здзіўляла. Не, тады гэта не здзівіла — узрадавала незвычайна. Калі мы трохі пабагацелі, не галадалі ва ўсялякім разе, Маша раптам спытала:

— А ты не хочаш другое дзіця?

О, якое шчасце! Вядома ж, хачу! Хтось з сучаснікаў можа сказаци: маладая бяздумнасць. Не! Дзяцей пасля вайны w раджалі самыя бедныя і не баяліся. А ў нас жа была цвёрдая ўпэўненасць, што яшчэ год-два — і мы будзем жыць як людзі. А што гэта за сям'я — з адным дзіцем?!

Але доўгае галаданне знясіліла арганізм маладой жанчыны. Першае гора — выкідыш. Я не проста перажываў, я моцна спалохаўся за яе здароўе. Пакуль хварэла, прыбягаў са школы на кожным перапынку. Нікому не казаў, якая хвароба ўлажыла Марыю Філаіаўну ў ложак, але бабы народ здагадлівы, толькі ў здагадцы іх крыўдным было, што лічылі: аборт.

Схадзіў да Баранава, не пасаромеўся папрасіць пазычыць малака, сала. Залатыя людзі былі гэтыя Баранавы! Машу крануў мой клопат пра яе здароўе. Аднойчы яна пагладзіла маю руку і ласкава сказала:

— Які ты харошы ў мяне.

О, якое гэта было шчасце, такое прызнанне: харошы і ў мяне. Я — яе, яе! На ўсё жыццё!

Недарэмна кажуць: не было б шчасця, ды няшчасце памагло. Пасля хваробы адносіны нашы як бы перайшлі ў новую вышэйшую стадыю, набылі новы сэнс — той, які заставаўся да канца жыцця, нягледзячы ні на рэўнасць яе, якая часам успыхвала, ні на бытавыя сварКі, часцей з-за дзяцей, пазней — з-за ўнукаў: выхоўвала іх бабуля, а дзядуля, стары скептык і буркала, часцей за ўсё крытыкаваў яе залішне ліберальнае выхаванне, хоць сам не аддаваў ім увагі столькі, як яна, вельмі ж быў заняты творчасцю, працай у Саюзе пісьменнікаў, у Вярхоўным Савеце; усім абавязкам сваім я аддаваўся з апантанай шчырасцю. Вяскоўцы любілі сваю фельчарыцу. І яна аддавала ім не толькі свае веды, вопыт, увагу, цеплыню сэрца — да хворага ў дальнюю вёску магла пайсці ў любы час, у любое надвор'е, — але магла аддаць апошняе. Прыгадваю два выпадкі, якія ў той кароткі міг нават абурылі мяне, а пасля захапілі.

Пасля грашовай рэформы і адмены картачак у снежні 1947 года я ў хуткім часе атрымаў ганарар за першую частку «Глыбокай плыні»,

зменшаны, праўда, у дзесяць разоў, але ўсё ж тысячы паўтары. Паехаў у Гомель і купіў цэлы салдацкі рэчавы мяшок прадуктаў: каўбасы, масла, кансерваў, крупы, пячэння, цукерак. Ледзьве давалок ад станцыі, як той мяшок з кнігамі. Суседкі прыходзілі паглядзець на такую смакату, як на дзіва, радаваліся і засмучаліся: «Няўжо і нашы дзеці калі-небудзь будуць есці такое?», «Не дажывём да такога».

А дні праз тры я выявіў, што ад пакупак маіх мала што засталося. Закіпеў:

— Куды дзелася?

— Аддала.

— Каму?

— Хворым дзецям. — І ласкава абняла: — Ваня! Не злуйся. Хіба магла я не даць Паўліку? Яму ручкі гранатай адарвала. Ці Нінцы Міхальчанцы? Сухотнае дзіця. І дзецям Салодкага дала.

Салодкія — дзеці таго дырэктара, што некалі ў Церусе стрыг мяне, як барана. Яго ў 1937-м пасадзілі. Маці перабралася ў сваю вёску Чарацянку. Дзяўчаткі хадзілі ў пяты і сёмы класы. Вучыліся выдатна. Але малодшая разы два самлела каля дошкі — ад голаду. Маша тады моцна выдала нам з Бібікавым.

— Кіраўнікі! Балбатуны! Галодным дзецям памажыце!

— Памаглі б, каб бацька іх на фронце загінуў.

— Іван Сяргеевіч, пасаромейцеся! Вы ж добра ведалі Салодкага, казалі: залаты чалавек. Ды, нарэшце, дзеці за бацьку не адказваюць. Сталін сказаў.

Другі выпадак. У 1946-м прыслалі «дапамогу» па лініі ЮНРА (арганізацыя дапамогі разбуранай Еўропе). Да нас дайшло літаральна шмаццё амерыканскае (як не сорамна было такое пасылаць?!). Але клопату нам было не з гэтым шмаццём, а яго дзялёжкай. Людзі за вайну і пасля абнасіліся ўшчэнт. У акупацыі сеялі лён, пралі і ткалі. А пасля аднаўлення калгасаў хто мог дазволіць сабе пасеяць на прысядзібным участку лён? Хапіла б зямелькі пад бульбачку. Соткі нярэдка абразалі — за невыпрацоўку працадзён у калгасе.

Натуральна, кожная кофтачка, спадніца, штаны, няхай і паношаныя, з'яўляліся дарагім набыткам. Камісія тыдні два дзяліла. І колькі было нараканняў, скарг, абвінавачванняў! Мы, начальства — Бібікаў і я, неаднойчы хаваліся ад інвалідаў: тыя, падвыпіўшы, сапраўды маглі пабіць. З адзеннем было прасцей: што прыслалі — тое дзялілі. Найбольшы клопат быў з абуткам. Яго было некалькі мяшкоў. Але з кучы, што заняла пакой пошты (на вокнах былі краты), ледзьве выбралі дзесятак парнага. Дзівосы! Атрымліваючы няпарныя чаравікі, людзі смяяліся і плакалі, праклінаючы і заакіянскіх дабрадзеяў, і

сваё роднае начальства, якое, маўляў, павыбірала лепшае. Каму трэба быў няпарны абутак? Але як ён атрымоўваўся? Інваліды горка жартавалі: «А чаго вы здзіўляецеся, бабы? Яны там думаюць, што ўсе мы аднаногія засталіся».

Самі інваліды выбралі чаравікі жаночыя, парныя, самыя лепшыя. І ўрачыста ўручылі сваёй фельчарцы.

— Табе, Філатаўна, больш за ўсіх прыходзіцца хадзіць. Гэта табе не ад амерыканцаў — ад нас.

Кранулі Машу да слёз.

А праз тыдзень чаравікі зніклі.

Я абурыўся:

— Каму аддала? Думала? Скажуць: столькі нахапалі, што раздаюць.

— Як ты баішся, што скажуць. Не скажуць. Вольга Шклярава замуж выходзіць. А ў што абуцца не мае. І я аддала ёй... Каб ты пабачыў, як усцешылася дзяўчына!

На змену абурэння прыйшло замілаванне дарагім чалавекам. Такой яна была маладая, бедная. Такой засталася і ў сталыя гады, зрабіўшыся адносна багатай.

## 6

У чэрвені 1947 года мяне прынялі ў Саюз пісьменнікаў. Адзіны прафесійны літаратар на ўсю Гомельшчыну! Як не ганарыцца? Але як паказаць гонар, калі ў жыцці нашым нічога не змянілася? Людзі не разумелі, што гэта такое — друкавацца ў тоўстым часопісе. Нават калегі мае — настаўнікі. Вось каб мне далі літэрныя картачкі! Але ніхто іх не даў — ні Саюз пісьменнікаў, ні райвыканкам. Сакратар райкама Гарцуеў абяцаў, але... «абяцанка — цацанка, а дурню радасць», як любіў казаць мой бацька.

Становішча палепшылася з адменай картачнай сістэмы. Не, не з самой адменай, а з ганарарамі маімі, якія давалі магчымасць купіць прадукты. Пакуль людзі не мелі грошай, магазіны былі багатыя на асартымент. А я пісаў шмат. У паўзах паміж працай над раманам пісаў апавяданні — для «Гомельскай праўды», бадай, па заказе загадчыка аддзела культуры Абрама Рабіновіча, з якім шчыра пасябраваў. Ён быў чалавекам, які пасля апублікавання першай часткі «Глыбокай плыні» прызнаў ува мне сапраўднага пісьменніка і ганарыўся нашей дружбай. Была яшчэ паштарка Надзя Старосценка, якая пачала глядзець на мяне як на прышэльца з іншага свету, з чаго Маша смяялася: аднойчы Надзя спытала, ці не баіцца яна жыць са мной. «Талент жа Богам даецца», — была перакананя.

У Саюзе пісьменнікаў я паскардзіўся на свае «сельскія ўмовы». І адказнаму сакратару Паўлу Кавалёву, з якім гаварыў па-сяброўску (да «генерала» Броўкі не дабіраўся), прыйшла ідэя рэкамендаваць мяне ў партыйную школу. Ідэя падабалася мне. 1200 рублёў стыпендыі! Удвая больш, чым плацілі настаўніку.

Але Маша спалохалася. Яна была цяжарная. Ізноў застацца адной у Пракопаўцы? Ды я сказаў, што без яе не паеду. А дзе жыць у Мінску? І ў наш час гэта клопат. А ў сорак восьмым годзе?.. Здаўшы экзамен, пайшоў да дырэктара школы Ільі Паўлавіча Кожара прасіць інтэрнат. Адмова была рашучая: сямейным інтэрната няма! Але не помню, у якім кантэксце размовы Кожар «адкрыў», што я аўтар «Глыбокай плыні». У гэты час друкавалася другая — партызанская частка рамана, і там камандзір злучэння — Ружак, прататыпам якога быў Кожар. Адразу перамяніўся суровы партызанскі генерал (у сапраўднасці, пры знешняй суровасці, гэта быў добры чалавек). Упікнуў, што, пішучы раман, я не звярнуўся да яго.

— Не адважыўся.

— Дарэмна. Пісьменнік павінен быць што партызан: прайсці там, дзе ніхто не можа прайсці.

Пасля я выконваў гэты дэвіз.

Інтэрнат Кожар не здолеў мне даць, але, калі я знайду прыватную кватэру, з прапіскай паможа.

Тыдзень, калі не больш, хадзіў я да знямогі па прыватным сектары Мінска, пераважна ў раёне Камароўкі, Лагойскага тракту; мабыць, цягнула бліжэй да Дома друку, дзе змяшчаліся ўсе часопісы, выдавецтвы.

Пачуўшы, што ў нас будзе ажно двое дзяцей, адно груднае, гаспадары гаварыць не хацелі; кватэраздымшчыкаў хапала, жылля не хапала.

Ратавала мяне, што я атрымаў ганарар і меў магчымасць заплаціць за год наперад. Наняў пакойчык метраў дванаццаць па Лагойскім тракце, амаль побач з Домам друку (ля скрыжавання цяперашніх вуліц Коласа і Сурганава). Стары драўляны дом, падзелены паміж дзвюма сёстрамі і братам, які здолеў атрымаць кватэру дзесьці за горадам у «Водаканалтрэсце». Лічылі, што мне пашанцавала. А што? Недарэмна кажуць: «З мілым рай і ў будане». Для мяне — з мілай. Але мілая, родная, блізкая хадзіла, па нашых разліках, на апошнім месяцы. А таму з вялікім хваляваннем спяшаліся пераехаць.

Пракопаўцы шкадавалі. На развітальнай вячэры, на якую мы не паскупіліся, жанчыны плакалі:

— Марусечка, не будзе ў нас такой фельчаркі, бо няма ў свеце другой такой.

Маша таксама расплакалася.

На станцыю нас адвёз сам старшыня Панас Баранаў.

Багаж наш быў незвычайны: адзіны жалезны ложак, які мы набылі. Маглі ложак купіць і ў Мінску, але гэтым даражылі па вядомай прычыне.

Дробязь, але запомнілася. Пакуль я атрымоўваў багаж, Маша пачула па радыё паведамленне аб павышэнні цэн на паштовыя адпраўленні, і гэта яе чамусьці спалохала і засмуціла. Запомнілася таму, што з нас новы сябра Андрэй Макаёнак часта смяяўся:

— Маша, раскажы, як ты спалохалася цаны на маркі.

Прырода парушыла нашы разлікі: роды адцягваліся. Пачаліся заняткі ў школе, і я сядзеў на лекцыях, шт > на іголках. Вісеў на падножцы трамвая, каб хутчэй дасхаць дадому. Не заглядваў нават у Дом друку, хоць туды моцна цягнула — да калег, да новых сяброў.

Ускокваў у хаціну — з палёгкай выціраў пот з ілба: Маша ў калідоры на керагазе гатуе абед.

Зацяжка з нараджэннем дзіцяці трывожыла мяне.

Машу мая трывога цешыла, яна жартавала.

Разбудзіла яна мяне гадзіны ў чатыры раніцы восьмага кастрычніка:

— Пара. Схваткі.

Я страшэнна разгубіўся:

— Што ж рабіць? Дзе ўзяць машыну?

— Якая машына? Пайшлі.

— Пехатой?

— Не бойся, несці мяне не будзеш. Дайду.

Ішлі па пустых завулках па асеннім холадзе — і мяне калаціла ад хвалявання, ад страху. Маша жартавала.

Добра, што да 1-й бальніцы рукой падаць, кіламетр які, не больш.

Накарміўшы Ліну, пабег паўторна ў радзільнае аддзяленне. Выйшла сястра:

— У вас толькі што нарадзілася дачка.

Ледзьве не самлеў ад шчасця. З глыбокім хваляваннем пісаў Машы доўгае пісьмо, не падумаўшы, што ёй пакуль што не да излияний маіх.

Праз два тыдні забраў жонку з дзіцем у свае «харомы», тады трымалі ў раддоме доўга, па-мойму, гэта было апраўдана. Дзяўчынку назвалі Таццянай. У год смерці маці ёй споўнілася 50 год. Працаўніца,

апантаная, як маці. Не, бадай, як бацька: апантаная ў творчасці, а не ў хатняй працы. Дацэнт універсітэта, член СП, літаратуразнаўца, фалькларыст, аўтар унікальнай кнігі па беларускай міфалогіі, якую, між іншым, выдавецтва выпускав ўжо тры гады. Во дзе могуць затаптаць любы талент: чалавек не можа дачакацца кнігі і губляе веру ў сябе, у людзей, траціць творчае натхненне.

Жыццё ў нас было незвычайнае, супярэчлівае. Ад пракопаўскага галадання мы адразу перайшлі на багаты стол. У магазінах усё было. Каўбасы ўсіх гатункаў, асаблівай смакаты — кракаўская, палтаўская. Ікра ў бочках! Помню, дэфіцыт быў на малочныя прадукты, і Маша мусіла замест малака піць піва, каб у яе было да» волі малака для Танечкі.

Але ў «харомах», калі паставілі яшчэ адзін дзіцячы ложак, нельга было размінуцца двум чалавекам. Кухня — палічка за грубкай, у якой па-сялянску ў чыгунку варылася страва. Дзе канспектаваць «Капітал»? Дзе вучыць філасофію? «Бытие определяет сознание». Але хацелася большага, чым вучыцца. Цягнула пісаць. Здалёк, у сытым быце, жыццё ў жабрацкіх калгасах, дзе я правёў тры гады, здавалася рамантычным, поўным стваральнага пафасу. І ў мяне нарадзіўся сюжэт новага рамана — пра вёску, пра афіцэра-франтавіка Максіма Лескаўца — да ўмоў нялёгкага мірнага жыцця. У першым варыянце раман называўся «Блізкі час». Рэдактарам не спадабалася. Майстра па назвах Анатоль Вялюгін параіў перарабіць на «У добры час». Што лепш? Адчуваў, што-і тое, і тое — не «Глыбокая плынь», славы такой не прынясе.

Класікаў марксізму я канспектаваў дома, калі дзеці і Маша засыналі. А каб пісаць — папрасіў дырэктара выдавецтва дазволіць прыходзіць у Дом друку і працаваць у пакоі рэдакцыі мастацкай літаратуры. Машы не падабаліся гэтыя мае паходы, але яна маўчала.

Кажуць: у цеснаце — не ў крыўдзе. Так. Але тады, калі нішто і ніхто не перашкаджае нармальнаму адпачынку, сну. А нас даймалі... клапы. Жах, колькі іх, паразітаў, было! І ніякага ратунку. Дом-клапоўнік. Яны паўзлі праз шчыліны з палавіны гаспадыні. На дзіця. Каб ратаваць малую, пад ножкі ложка ставілі каструлі з вадой. Але яны, гады, пікіравалі са столі, як праклятыя «юнкерсы», якія я ўсё яшчэ сніў.

Але больш, чым мае вячэрнія паходы ў пусты Дом друку, Машы не падабаліся наведванні піўнушак.

Мастацкая багема, відаць, з'ява такая ж даўняя, як само мастацтва. Бражнічалі ў Рыме, у сярэдневяковых Францыі, Іспаніі, Галандыі. У Расію яна прыйшла пазней — у эпоху Пушкіна, калі мастацтва і

літаратура выйшлі з манастыроў. Расквітнела багема ў часы Блока — на дэкадэнцкім полі. З прыходам у літаратуру сялянскіх і пралетарскіх паэтаў багема набыла размах рускага разгулу, у якім гінулі многія таленавітыя людзі, Ясенін, напрыклад.

«Вадзілі казу» беларускія творцы і да вайны, натхніцелямі былі такія «геніі», як Алесь Кучар, і ён жа даносіў на п'яную «свабодалюбівую» балбатню сваіх калег, і некаторыя з іх паплаціліся за гэта жыццямі ці трапілі на катаргу.

Пасляваенная багема мела сваю адметнасць, сваю небывалую дагэтуль асаблівасць. Людзі вярнуліся з вайны, акрыленыя перамогай і з радасцю, што засталіся жывыя. Так-так, пілі не з-за душэўнага разладу — пілі з радасці. Няцяжка ўявіць, як цягнула ў кампанію такіх маладых творцаў, як я. Пасядзець побач з Пятром Глебкам, выпіць з ім — гэта ж гонар. А галоўнае паслухаць яго, разумнага, эрудыраванага, знаўцу гісторыі агульнай і асабліва гісторыі беларускай літаратуры. Пятро Фёдаравіч не баяўся расказаць і пра Александровіча, і пра Мікуліча, і пра Скрыгана, і пра Гартнага, Чарота, якія скончылі жыццё ці былі яшчэ ў далёкай Сібіры. На гэтых шумных сустрэчах я атрымаў тое, чаго не магла даць ніякая партшкола. Не кажу ўжо пра сваіх равеснікаў, учарашніх франтавікоў і партызан. Як яны, таленавітыя назіральнікі, дапаўнялі веданне ваеннага ліхалецця ва ўсіх яго праявах. Успамінаю расказы партызанаў Уладзіміра Карпава, Алеся Рылько, Янкі Брыля, франтавікоў Андрэя Макаёнка, Анатоля Вялюгіна, які зайздросна ведаў і ваенныя, і партызанскія дзеянні, мінскае падполле. А рэвалюцыянер-падпольшчык Піліп Пестрак, які прасядзеў адзінаццаць гадоў у польскіх турмах! Адзін Пестрак — цэлы універсітэт. Дарэчы, і класікаў марксізму-ленінізму ён ведаў больш грунтоўна, чым мы з Андрэем, слухачы партшколы, а можа, чым і выкладчыкі нашы.

Хіба магло не цягнуць да гэтых людзей прагнага да блізкай гісторыі маладога раманіста! Ужо тады я выношваў сюжэт рамана пра мінскае падполле, але адчуваў, што не валодаю матэрыялам. Задуму сваю не здзейсніў і пазней, калі не лічыць «Гандляркі і паэта». Не здзейсніў таму, што афіцыйныя гісторыкі так заблыталі гісторыю падполля і так перагрызліся паміж сабой, што я не адважыўся ўзняць гэтую глыбу гераізму і здрады, зацятай барацьбы розных груп, якія засылаліся Панамарэнкам, Берыя і Цанавам, ваеннай разведкай, а магчыма, і немцамі.

Сустрэчы незабыўныя. Акрамя гісторыі, даўняй і нядаўняй, гарачыя спрэчкі пра літаратуру, пра тыя творы, якія з'яўляліся ў

друку: паэмы, аповесці, раманы. Адным словам, універсітэт! Літаратурны універсітэт!

Акрамя клапоў маленькая Танечка пакутавала ад дыятэзу, і сон яе часта перапыняўся, што драбіла і наш з Машай сон, і я сядзеў на лекцыях з чыгуннай галавой, часта спазняўся, за што Кожар аднойчы па-бацькоўску нацягаў мяне за вуха.

П'яныя кампаніі нашы былі чыста мужчынскія, і Маша верыла гэтаму і жаночай рэўнасці не праяўляла. Яна верыла, што для мяне гэта яшчэ адна школа — літаратурная. Але каб не пілі. Яна радавалася, калі ў наш цесны пакойчык прыходзілі госці. Дзякуй Богу, пачаставаць было чым: грошы меліся і магазін побач. Гасцямі нашымі ў той час нязменна былі Андрэй Макаёнак, Аляксей Кулакоўскі, зрэдку Пятро Васілеўскі, які вучыўся ў Маскве ў інстытуце кінематаграфіі. Усе трое любілі нашу сям'ю, нашых дзяцей. А мы з Машай любілі іх — выдатнага гумарыста, рагатуна Андрэя, эрудыта з маскоўскай закваскай Пятра, скептыка, нігіліста, які адмаўляў нават Маркса і Леніна (у той час! Страх на нас наганяў), разважлівага, пасялянску памяркоўнага Аляксея, трохі цяжкадума, вельмі üivураТНага ў быце, парадачак на яго стале быў адменны, крануць штосьці баяліся нават дзеці; цынік Пецька выводзіў Аляксея тым, што рабіў на стале беспарадак — раскідваў газеты, кнігі. Старэйшы за нас амаль на дзесяць гадоў, Аляксей перажываў «маскоўскую безалаберщчыну» Васілеўскага. Супакойваў яго вялікі дыпламат Андрэй, які ўмеў усе словы і дзеянні перавесці ў жарт, у «чалавечую камедыю».

Машы Кулакоўскі спадабаўся з першага ж знаёмства. Асабліва цаніла яго негатыўнае стаўленне да багемных куцяжоў.

— Разумны чалавек — ва ўсім разумны. Не тое, што вы, шалапуты.

Лес нас звёў і тым, што мы кватаравалі на адной вуліцы праз дзве драўляныя развалюхі. Маша адразу ж пасябравала з Нінай Ульянаўнай, жанчынай такога ж складу характару, толькі больш пакорлівай. Іх зблізіла нядаўна перажытае. Ніна, можа, менш сутыкалася з пагрозай смерці, чым мая жонка, але нагаладалася ці не больш, жывучы ў эвакуацыі з маленькім сынком у Варонежскай вобласці, працуючы сельскай настаўніцай.

Кожны выхадны, святочны мы па чарзе абедалі то ў нас, то ў Кулакоўскіх. Як толькі месціліся ў такім пакойчыку, як наш! Нязменна прысутнічаў і весяльчак Андрэй, у якога нашы жонкі былі платанічна ўлюбёныя.

Ды неўзабаве адзін выпадак, бадай, камічны, разбурыў высокую думку Марыі Філатаўны пра суседа.

Прыехала мая ці яе сястра, не помню. Адным словам, было на каго пакінуць дзяцей, каб схадзіць у кіно, пасля з'яўлення Танечкі Маша не магла адлучыцца больш як на паўгадзіны — толькі ў магазін, пакідаючы малую на першакласніцу Ліну.

Вядома ж, не маглі не запрасіць Кулакоўскіх. Ніна ўзрадавалася, ёй таксама не часта выпадала такое шчасце — далучыцца да культуры.

Аляксей трохі разгубіўся. З Нінай ён яўна гаварыў перад тым, таму звяртаўся да мяне:

— Не, братачка, не магу. Трэба ў рэдакцыю. Малады аўтар прыйдзе, зямляк, са Старобіна. Трэба пракансультаваць, разам з ім паправіць апавяданне, якое я адабраў да друку.

Ніна адна не пайшла, Аляксей быў патрыярхальным мужам, дамастроеўскім.

Пайшлі самі і не ў той кінатэатр, пра які ішла размова. Фае цеснае. Прастаялі ў куце. А селі ў зале на свае месцы — і Маша раптам уздрыганула, сцялася, збялела, быццам убачыла штосьці страшнае.

— Што з табой? Што здарылася?

— Глядзі: шляхцюк твой!..

— Хто?

— Не бачыш? Аслеп? Таму і не бачыш, што і сам такі...

— А пры чым я тут? Зноў за рыбу грошы? Бачу я, бачу. Ну і што? Мала з кім чалавек можа сябраваць...

— Ты апраўдаеш любую гадасць. Ні-са-це-лі!

Наперадзе ад нас і збоку сядзеў патрыярх наш Алёша Кулакоўскі з чужой жанчынай, нахіляўся да яе, шаптаўся. Вось што абурыла ахоўніцу маралі, святую Марыю.

— Так і хочацца пайсці і даць яму ляшча. І ёй! Добранькая кансультацыя! Кансультант! — І паднялася з месца, пайшла ціснуцца да праходу. Страшэнна спалоханы, я кінуўся за ёй. Схапіў за руку:

— Ды ты што? Спыніся!

— Не бойся. Стану я пэцкаць рукі аб такога! Але сядзець у адной зале з імі не хачу.

У доўгай дарозе дадому Маша, на маю спробу апраўдаць сябра, адкрыла агонь па мне. Я не адбіваўся. Мяне трывожыла адно: каб яна не сказала Ніне.

— Скажу!

— Сям'ю хочаш разбіць з-за глупства?

— Добрае глупства. Хто разаб'е сям'ю, дык гэта ён, калі не даць па руках.

Ніне не сказала. Але моцна здзівіла і Ніну, і Аляксея, калі на чарговай сустрэчы пачала ўедліва кпіць з паважанага Аляксея Мікалаевіча. Андрэй падтрымліваў Машу:

— Малайчына, расцём, Маша! Хутка мы з табой будзем камедыі пісаць.

Аляксей абурыўся і пакінуў цеснае застолле, кінуўшы:

— Так гасцей не прымаюць!

А пасля выгаворваў мне:

— Ты, братачка, скажы сваёй жонцы: я такіх жарцікаў не люблю. Што за дурныя намёкі! Няхай не забывав, хто я, хто яна.

Такія словы здаліся мне неразумнымі: для мяне яна была вяршыняй усяго таго высокага, што несла ў сабе жонка і маці. Я аддаваў ёй перавагу над сабой, асабліва што датычыць захавання маралі, духоўнасці, вернасці, адданасці — усяго-ўсяго, чым так шчодра надзяліла яе прырода, сям'я, народныя традыцыі, і што яна непахісна пранесла праз усё жыццё.

А праз месяц ці два нас з Кулакоўскім «ажанілі»: Саюз пісьменнікаў выдзеліў нам у студзені 1950 года на дваіх адну чатырохпакаёвую кватэру. У новым доме, у цэнтры горада — па вуліцы Карла Маркса. Пяты паверх, праўда. Жылая плошча на сям'ю — 24 м$^2$. Такая прастора! Але ў той час гэта было вялікае шчасце — атрымаць такі прытулак! Цяпло цэнтралізаванае. Але газу не было; для пліты, для калонкі ў ванне насілі дровы з падвала, а туды іх трэба было завезці, папілаваць, пакалоць. Прызнацца, баяўся я такога цеснага сусед ства. Баяўся, што праўдзівая, шчырая, адкрытая, смелая жонка мая не ўжывецца з залішне паважным, нярэдка пыхлівым Аляксеем Міхайлавічам.

Я прасіў Машу:

— Калі ласка, не чапай Аляксея.

Яна адказала:

— Не вучы мяне жыць з людзьмі.

І — ніводнай сутычкі. Пры такой цеснаце! Карэктнасць адносін маёй жонкі і суседа павучальная. Пра дабрэйшую Ніну Ульянаўну я ўжо не кажу.

Хоць Кулакоўскаму, пэўна, было нялёгка. Помню, можа, праз паўгода сумеснага жыцця ён ледзьве не афіцыйна запрасіў мяне ў свой пакойчык.

— Зайдзі, калі ласка, Іванка, трэба пагаварыць.

Я ажно ўстрывожыўся: што здарылася, што так — амаль афіцыйна? Хоць у Аляксея мелася слабасць паіграць у вялікасць. Ён у той час пісаў успаміны В. І. Казлова «Людзі асобага складу». Старшыня

Прэзідыума Вярхоўнага Савета стварыў свайму «літаратурнаму апрацоўшчыку» (так пазначалася ў кнізе) нядрэнныя ўмовы — даў кабінет у Прэзідыуме. Аляксей любіў запрасіць туды ці мяне, ці кагосьці з калег, правесці паўз міліцыянера і прыняць з этыкетам кіраўніка. Андрэй высмейваў яго бюракратызм. Аляксей не крыўдзіўся, смяяўся:

— Во лайдак, усе дэталі ўгледзеў, я іх не заўважыў. Вучыся, Іванка, у цябе не хапае ў творах дэталяў.

Слабы сюжэтчык, ён надаваў асаблівае значэнне дэталям і гэтым вызначаўся сярод празаікаў.

Аляксей пасадзіў мяне каля стала, на якім быў незвычайны парадак.

— Не здагадваешся, чаму я цябе паклікаў?

— Не. Спалохаў. Так афіцыйна.

— Даруй, братачка, але інакш я не магу. Даўно хацеў пагаварыць.

— Пра што? Мірна ж жывём.

— Мірна... Але знаеш, братачка, Марыя Філатаўна дрэнна ўплывае на Ніну.

— Чым? Як? — я падскочыў з крэсла.

— Не знаю, дзеяннямі ці словамі. Якімі — не чуў. Але Ніна мяняецца не ў лепшы бок. Раней яна ніколі не пярэчыла мне...

— І ты лічыш, што гэта добра? Феадал ты, Аляксей. Мусульманін.

— Шкада мне цябе, Іванка. Жывеш пад пятой.

— Чыёй? Машы? Каб ты ведаў, як мне добра пад такой пятой.

— Рабская ў цябе псіхалогія.

— А ў цябе — дамастроеўская. У нас поўная роўнасць. А ў цябе Ніна — рабыня.

— Цішэй ты. Пачуюць. Пагавары ўсё ж з Марыяй Філатаўнай.

— Я? Не! Пагавары сам.

Задумаўся Аляксей і шчыра прызнаўся:

— Баюся я яе, братачка.

Я зарагатаў:

— Машы? Здзівіў. Ды яна дабрэйшы чалавек.

— Дабрэйшы... Але, знаеш, занадтасвабодалюбівая. Я з такой жонкай не ўжыўся б.

— Значыць, мы розныя.

— У цябе, братачка, іншы характар. Ты церпіш усе яе слоўцы, якімі яна джаліць цябе.

— Мне не балюча. Мне прыемна. І гаюча.

— Прабач, Іванка, але я не сцярпеў бы, каб мая сказала такое. Такім мяне выхавала жыццё. Лічы, што размовы не было.

Але я расказаў пра яе Машы. Яна засмяялася:

— Нічога я не казала пра іх адносіны. І ў што-што, але ў чужое жыццё ніколі не лезла і не лезу. Аднойчы, праўда, вырвалася, калі Ніна прыйшла на кухню са слязьмі: «Не будзьце вы авечкай, Ніна Ульянаўна!» Ён, відаць, пачуў.

Так Маша ўплывала на іншых. І на Кулакоўскага ў тым ліку; ён прыкметна змяніўся ў сваіх адносінах з Нінай. На лепшае.

Аляксей моцна здзівіў, калі праз год гарсавет выдзеліў мне асобную трохпакаёвую кватэру.

— А я супраць! — сказаў ён за вячэрнім чаем, які мы часта пілі разам у больш прасторным, чым нашы пакоі, калідоры. — Я прывык да вас, прырос душой, і ні з кім больш жыць не жадаю.

— У табе гаворыць зайздрасць, — жорстка ўпікнуў я. — Але ты забываеш, што ў нас трое дзяцей.

Гэта яго ўтаймавала, бо зайздрасць, напэўна, была. Мне ў тым годзе прысудзілі Сталінскую прэмію за «Глыбокую плынь». Прэмія ўзняла мяне, вывела ў рады саюзных пісьменнікаў, бо прэміі мелі толькі Броўка, Танк, Куляшоў, нават Лынькоў не меў.

А за год да новай кватэры, 8 верасня 1950 года, менш як праз два гады пасля Танечкі, у нас нарадзіўся сын Саша, наша радасць і наш найбольшы ў жыцці боль. Само яго нараджэнне прынесла бяду: у раддоме Машы занесяі інфекцыю, і яна тыдні два знаходзілася ў крытычным стане: ляжала ł тэмпературай 40. Які жахлівы страх я перажыў! Страціць Машу — о Божа! Застацца ўдаўцом, маючы траіх дзяцей! Больш цяжкага лесу немагчыма ўявіць. Ды Бог быў літасцівы да Машы, да дзяцей, да мяне. Праз месяц я прывёз яе ў два цесныя пакойчыкі. Цяжка паднімалася тройчы маці на пяты паверх. Прыйшлося шукаць хатнюю работніцу. Між іншым, Кулакоўскія ўжо мелі яе: шляхціц Аляксей Міхайлавіч трымаўся дамастроеўскіх прынцыпаў, але цягнуўся за багатымі — тады работніцы былі ў модзе.

Маша да канца жыцця здзіўлялася, як мы, сем чалавек, размяшчаліся на 24 метрах (з той вясны ў нас жыла сястра Машы Клава, студэнтка мединстытута). І ў Кулакоўскага было ўжо двое дзяцей. Да таго ж часта начавалі сваякі і землякі Аляксея — старобінцы, у гэтым сэнсе ён быў надзвычай дэмакратычны. Вось так і жылі! І я пісаў «У добры час». Кулакоўскі хоць меў кабінет у Прэзідыуме, дзе мог схавацца ад тлуму і шуму.

Асобная кватэра для сям'і, тым больш для такой сям'і, можна лічыць, шматдзетнай — вялікае шчасце. Толькі апынуўшыся ў ёй, мы

адчулі гэта. Маша адчула. І я. У яе мелася кухня, дзе яна была поўнай гаспадыняй: што хачу, тое і раблю. Была спальня, прасторная і ціхая — у двор, дзе яна размясцілася з малымі — Таняй і Сашам. А ў мяне — кабінет, дзе я і пісаў позна ўначы, і спаў. Праўда, у кабінет мой зазіралі з вуліцы прахожыя — першы ж паверх, якраз насупраць увахода ў клуб Міністэрства унутраных спраў. Упершыню мы набылі прыстойную — для таго часу — мэблю. Груваткая, праўда. Шафа для адзення — дубовы кантэйнер, які пераставіць з месца на месца маглі чацвёра дужых хлопцаў, не менш.

Трое дзяцей, муж, дабрабыт на сярэднім узроўні — чаго табе хочацца, жанчына? Вары абеды, гадуй дзяцей. Не, Машу гэта не задавальняла. З пераезду ў Мінск яна марыла аб вучобе, мара яе — медінстытут. Але не было там ні завочнага, ні вячэрняга аддзяленняў. Вучоба Клавы паказала, якая ў будучых урачоў нагрузка.

Пайсці на стацыянар, маючы траіх дзяцей, — пра гэта і думаць нельга было. На гэта мог падбіваць толькі гумарыст Макаёнак:

— Адкалі такі нумар. Няхай пузаты празаік паняньчыцца з дзяцьмі.

І Маша адкалола. Нельга ў медыцынскі — пайду ў педагагічны! Там мелася вячэрняе аддзяленне. Яна магла б вытрымаць і хімію, і фізіку. Але яна разумела, які памочнік трэба мне: філолаг! Маючы грудное дзіця (усіх дзяцей яна карміла грудзямі самае малое год), Маша пачала рыхтавацца ў інстытут. Выдатна вытрымала прыёмныя экзамены і ў 1952 годзе стала студэнткай пядінстытута. На заняткі хадзіла як на свята, хоць нямала і прапускала — хварэлі дзеці, хатняя работніца, сялянка, так, як маці, дагледзець не магла. Але, нягледзячы на ўсе перашкоды, вучылася адменна, здзіўлялася, што маладыя яе каляжанкі — такія гультайкі, элементарных заданняў не выконваюць. Я пазнаёміўся з некаторымі яе выкладчыкамі, і ўсе яны у адзін голас гаварылі пра студэнтку, маці траіх дзяцей, з захапленнем. У той жа прыкладна час я набыў першую пішучую машынку, і Маша хутка асвоіла яе. Я, між іншым, маючы сваю машыністку пад рукой, так і не навучыўся друкаваць на машынцы. Усё жыццё я пісаў ад рукі, а Маша перадрукоўвала. А пісаў я, паўтару, шмат. Акрамя раманаў, аповесцяў, я ў тыя гады выдаваў безліч публіцыстыкі. Кожная газета лічыла, каб пад свята, знамянальную падзею выступіў вядомы пісьменнікламўрэат. Броўка, Куляшоў, Танк не любілі журналістыкі і пры звароце да іх адрасоўвалі рэдактараў да маладога Шамякіна. Між іншым, другі малады лаўрэат Янка Брыль таксама ўмеў адхрысціцца ад газет, яму лягчэй — ён беспартыйны, а пры размове са мной націскалі на партыйнае сумленне, на партыйны абавязак: «Каму ж і

пісаць, як не вам!» Калі выйшаў у наш ужо час шасцітомны бібліяграфічны даведнік «Беларускія пісьменнікі», я сам здзівіўся, колькі там маіх публіцыстычных артыкулаў, прытым не толькі ў нашых газетах, але ў маскоўскіх, украінскіх, малдаўскіх, армянскіх... Зараз шкадую, што столькі траціў энергіі, часу на пустую справу. Але ці варта шкадаваць працу маладосці? Пішу, каб сказаць, як шмат Машы прыйшлося перадрукоўваць. Цяпер ўжо і падлічыць немагчыма, колькі мільёнаў літар адстукалі яе пальчыкі, якія ўсё ўмелі рабіць, і рабілі акуратна, чынна.

Пяць гадоў вучобы — і чырвоны дыплом. А я за гэты час скончыў «У добры час» і напісаў «Крыніцы» — раман, які прынёс мне амаль такую ж славу, як «Глыбокая плынь». Мяне ахвотна выдавала Масква, перакладалі на іншыя мовы. Адным словам, не адставаў ад сваей працавітай жонкі, а яна — ад мяне; мы як спаборнічалі: хто зробіць больш.

Натуральна, што рос наш дабрабыт. Нядоўга мы жылі на першым паверсе — два гады. У 1953 годзе Літфонд збудаваў свой дом. Цэлы дом, кватэр 20! У самым цэнтры горада на рагу вуліц Маркса і Энгельса. І я, лаўрэат, атрымаў там чатырохпакаёвую кватэру. Раскоша! Адзнака таго, як дзяржава клапацілася пра сваіх творцаў. А прайшло ж усяго восем гадоў пасля спусташальнай вайны.

Яшчэ ў 1951 годзе купілі «Победу» і — дзіўна — тры гады трымалі шафера, які рабаваў нас: ледзь не кожны дзень нешта псавалася. Па сённяшнім часе сорамна прызнацца, што я, малады, здаровы мужчына, не мог асвоіць ваджэнне машыны.

У тым жа годзе пабудавалі дачу. У Церусе. Калі рабіў яшчэ настаўнікам, выпісаў лес на хату (не ўяўляў жа, колькі буду жыць у сяле, а ўдзельнікам вайны лес давалі бясплатна, толькі сам пілуй, вазі, рубі зруб). Па парадзе бацькі парубачны білет выпісаў на Добрушскае лясніцтва. І бацька паставіў зруб. Праўда, будыніна стаяла і гніла. Бацька ў кожным пісьме пытаў: што рабіць са зрубам?

Калі завяліся грошы, у Машы ўзнікла выдатная ідэя: перавезці ў Церуху і там паставіць хату. За справу ўзяўся Машын брат Мікалай, інвалід вайны, але надзвычай працавіты чалавек. Разам з бацькам Філатам Азаравічам, абодва бондары, цесляры, сталяры, яны ўсё зрабілі самі, хіба што рамы, дзверы заказвалі. Але з гэтым не было турбот у Церусе — усе майстры, выраслі ў лесе, і ўсім хацелася зарабіць капейку, бо ў калгасе з гучнай назвай «Сацыялізм», вельмі бедным (пасля яго пераўтварылі ў саўгас), працадні аплачваліся толькі тым, што людзі мелі прысядзібныя ўчасткі; хто працадні не выпрацоўваў, маглі абрэзаць гарод з 40 да 15-ці сотак.

Улетку 1952 года сям'я мая адпачывала ў «Сацыялізме».

Маша проста расквітнела. Вярнуцца з дзяцьмі ў родную вёску! Вакол сваякі, суседзі, вяскоўцы, якія любілі яе: у акупацыю яна ўсім памагала сваімі фельчарскімі ведамі, уменнем.

Месца для «дачы» я выбраў насупраць цесцевай хаты, але не на вуліцы (там была прагаліна, бо вясной залівала старое рэчышча, якое падыходзіла да самай вуліцы). Сядзібу рамантык і паэт аблюбаваў на высокім пясчаным беразе; суседзі пасміхаліся: «Што тут будзе расці?» Расло, добры сад вырас пад рупным доглядам Філата — на здзіўленне людзям, а памёр ён — перастаў пладаносіць сад, пачаў сохнуць. Сяляне не разумелі, што мне не бульба трэба, не гуркі, а дачная выгода. А яна была выдатная, трыццаць метраў — і кацiся з абрыву ў мелкую, але чыстую рэчку. У вербах, што раслі вакол, заліваліся салаўі.

Хата магла быць музейным літаратурным помнікам, бо яе наведалі вядомыя беларускія і ўкраінскія пісьменнікі: Андрэй Макаёнак (жыў з сям'ёй па тыдні), Янка Брыль, Піліп Пестрак, Анатоль Грачанікаў, Леанід Гаўрылкін, Аляксей Гардзіцкі, Васіль Казачэнка, Мікола Нагнібеда, Сцяпан Алейнік, Платон Варанько, Багдан Чалы (прыязджаў без нас па грыбы і жыў па колькі дзён), Расціслаў Братунь. Цяжка ўсіх і прыгадаць.

Калі мы пастарэлі, збяднелі ў выніку «вялікай перабудовы», памерлі блізкія ў Церусе, якія даглядалі бедную на наш час хацінку, узнік клопат: што рабіць са сваёй нерухомасцю? Прадаць. Так, адзінае выйсце, пакуль не згніла ці не спалілі дзеці ці зламыснікі. Гады тры рашалі мы з Машай гэтую турботу. І вядома ж, як ні ў чым іншым, больш за мяне вагалася Маша, так ёй шкада было гнязда маладосці. Урэшце адважыліся: прадалі за грашы (2500 долараў) нейкаму церушаніну, які працаваў на Поўначы. Пасля гэтага актугвалту над уласнымі пачуццямі Маша часта казала — і да хваробы, і ў часе хваробы — што сніць Церуху. Дарэчы, унучкі нашы Маша і Славяна былі супраць таго, каб «прадаваць Церуху» (гаварылі так, падваранску). Але яны, маладыя, ідэалісты, а нас, старых, жыццё зрабіла рэалістамі, жорсткімі рэалістамі.

Пішу пра Церуху так шмат, бо ўвесь час адчуваў, як Маша была прывязана да сваёй «малой радзімы». Ды і я жыў не Кармой, якую па сутнасці не ведаў, нават сваякоў не ўсіх ведаў, а Церухай, дзе ўпершыню падлеткам сустрэў Машу — сваё шчасце ажно на 58 гадоў жыцця.

У гэты «церухоўскі перыяд», як я называю, наша каханне як бы гартавалася, я ехаў на тыдзень-два ў Мінск, вяртаўся — і мы

сустракаліся як маладажоны, перажывалі мядовыя дні, смешна хаваючыся ад дзяцей.

Я назваў украінцаў, якія наведалі Церуху. Не ўсіх. Сяброў там было больш. У гэтыя гады ўсталяваліся мае добрыя сувязі з Кіевам. Выйшаў раман «Глыбокая плынь» у перакладзе Васіля Казачэнкі, рыхтавалася выданне «Крыніц». Кіеў я наведаў упершыню ў 1954 г. на 300-годдзе ўз'яднання Украіны з Расіяй. У 1955 г. набраўся смеласці на «Победе» з дзецьмі паехаць у Дом творчасці ў Адэсу. Па дарогах таго часу гэта сапраўды быў подзвіг — ды і які вадзіцель з мяне! Год назад атрымаў правы, амаль не здаючы экзаменаў. Аднак паездка ўмацавала мае сяброўскія адносіны з украінцамі. Сям'і маёй гаспадары аказвалі асаблівую ўвагу, як гасцям. Пры паездцы назад нас узяў «на буксір» Сцяпан Алейнік, ён ездзіў з прафесійным шафёрам, да Кіева па самых дрэнных дарогах я ехаў без трывогі і страху. Аднак і дагэтуль здзіўляюся сваёй рызыкоўнай смеласці. А пазней было так. У Гомелі з прадуктамі была не лепшая сітуацыя. А жыць у Мінску прывыклі багата; дзецям Маша ні ў чым не адмаўляла. І мы садзіліся з Машай у машыну, без дзяцей, безумоўна, і ехалі ў Кіеў — за 240 кіламетраў.

Заязджалі ў двор пісьменніцкага дома па вуліцы Чырвонаармейскай, ад дома гэтага пачынаўся Крашчацік. Тут жа рынак. Усе цэнтральныя магазіны. Усе выгоды. Рабілі рэйды і загружалі машыну. Але ні разу не ўдалося выехаць дадому ў той жа дзень, нягледзячы на самыя строгія папярэджанні Машы. Чалавек яна была надзвычай інтэлігентны, цнатлівы, больш за ўсё баялася замінаць людзям, хоць сама прымала мноства гасцей, аддаючы ім свой ложак, лепшыя пасцелі.

Усю дарогу цвярдзіла:

— Ваня! Дамаўляемся: не начуем.

— Не начуем! — шчыра згаджаўся я.

Але як вырвацца ад такіх гаспадароў, як украінскія пісьменнікі?

— Івану Пятровічу, пакрыўдзіце, — казалі Васіль Казачэнка і яго жонка, наша зямлячка Ірына Сяргееўна, да іх далучаліся Збанацкія, Алейнікі.

І вяртаўся я на другі дзень з цяжкай галавой.

Пра жыццё ў Церусе я мог бы напісаць нямала, бо гэта незабыўныя дні і месяцы. Хораша было Машы, дзецям. Хораша пісалася мне, нягледзячы на цеснату; між іншым, дзеці ніколі не перашкаджалі мне працаваць. І, можа, самае галоўнае: я жыў у гушчы народнага жыцця. Сяляне з павагай адносіліся да вядомага пісьменніка. Мясцовае начальства лічыла за гонар падтрымліваць сяброўскія адносіны. Вось

яны перашкаджалі, бо часта арганізоўвалі рыбалкі на Сожы і... «проста п'янства без прычыны». Асабліва прыязныя адносіны ў мяне, сына лесніка, усталяваліся з ляснічым Мікалаем Палявіковым і дырэктарам саўгаса Міхалам Мураўкам.

Машы хацелася даць «ответный прием», але абеды такія ці вячэры канчаліся тым, што ў доме з'яўлялася рыба, мяса, грыбы, памідоры, гуркі. Не было патрэбы ехаць у Кіеў.

У 1959 годзе ў нас з'явілася дача пад Мінскам. Гарсавет, запаўняючы «Мінскае мора», пабудаваў дачны пасёлак і прадаў дачы вучоным, пісьменнікам, ветэранам вайны; дарэчы, ніводнага партыйнага ці савецкага работніка ў ліку пакупнікоў не было, ім проста не прадалі б. Але ўсё роўна ў Церуху мы прадаўжалі ездзіць, праўда, не на ўсё лета — тыдні на два-тры. Дзеці вымушалі. Машу цягнула. Ды і мяне. Здаралася, што я ехаў адзін — папрацаваць у цішыні. Але адзінота не спрыяла прадукцыйнасці. Без Машы і дзяцей мне не вельмі каб пісалася. Мяне натхняла жончына блізкасць. Не жартую. Але гэта так. Сцёртае слова — натхняла. Але Маша сапраўды такі натхняла на творчасць. Ад яе як бы сыходзілі нейкія асаблівыя флюіды натхнення, працавітасці. Ні разу ў жыцці яна не спытала, як некаторыя жонкі маіх калег:

— Чаму ты не пішаш? Садзіся за стол! Вунь Шамякін колькі напісаў.

Але ніколі не ўзнікла плётка, што я пішу пад прымусам жонкі. Самыя языкатыя бабы ні ў чым не асудзілі Марыю Філатаўну. Жонка Івана Навуменкі Ядвіга Паўлаўна, наадварот, асуджала мяне, што я закабаліў жонку, дзяцей напладзіў, да кухні прывязаў, за машынку пасадзіў.

Можа, і прывязаў. Грэшны. і Пасля паспяховага заканчэння інстытута Маша рваІ лася ў школу. Але я спалохаўся, што праца яе парушыць мой рытм жыцця, я пазбаўлюся выдатнага памочніка. Як важна ў нашай працы: з-пад пяра — на машынку, каб шліфаваць па машынапісным тэксце.

Дарэчы, як ні дзіўна, лепшы сябра сям'і Андрэй Макаёнак на гэты раз падтрымліваў мяне, прызнаючыся, што ён зайздросціць нашай гармоніі, у яго жыццё з Аленай не ладзілася. Ды нядоўга сумавала яна па працы.

У верасні 1960 года мы паехалі ў круіз — паплылі па Дунаі. Упершыню Марыя Філатаўна выязджала за межы Саюза, да таго я вазіў яе ў Ленінград, у Маскву — на экскурсію і на дэкаду беларускай літаратуры і мастацтва. Маршрут круізу: Ізмаіл — Вена, назад да балгарскага порта Лом і далей на аўтобусе ў Сафію і адтуль — у

Бухарэст; з Бухарэста — поездам дадому. Усе радасці. І сапраўды гэта было радаснае падарожжа. Камфартабельны цеплаход «Амур», камфартабельныя каюты, выдатнае харчаванне: запраўляліся ў замежных партах, а стаяў выдатны паўднёвы верасень, вінаград, дыні, кавуны, яблыкі, грушы — за капейкі, ды і купляць не трэба было, толькі ў бары, а ў сталоўцы ўсё было на сталах. У бары — любыя напіткі па савецкіх цэнах, нам — за чэкі, замежнікам — за валюту. Два цеплаход ы, «Амур» і «Дунай», пабудаваныя ў Аўстрыі, толькі пачыналі свае рэйсы, па сутнасці рэкламныя. Да Вены нас плыло чалавек сорак пры змяшчальнасці на 200 чалавек. Усе мінчане. Свае. Некаторых я знаў. З астатнімі пазнаёміліся па дарозе да Ізмаіла. Плыў Алесь Адамовіч, які добра падрыхтаваўся да круізу: усё ведаў пра Дунай, Белград, Будапешт, Вену, Сафію. Другі такі эрудыт акадэмік Турбін Мікалай Васільевіч. З ім і яго жонкай мы пасябравалі. Яны хвалілі Машу:

— Якая ў вас жонка! Разумніца. Далікатная.

А Маша з усімі была такая — і з сялянамі, і з акадэмікамі.

Падарожжа яе зехапіла. Як прагна Маша знаёмілася са славутымі помнікамі еўрапейскіх сталіц і ўсіх мясцін, дзе былі супынкі! Асабліва ўражанне на яе зрабілі Белград, Вена, Сафія, Дунай, Катаракты, дзе горы сціскаюць раку і плынь яе такая імклівая, што па беразе пракладзена чыгунка, каб маласільныя судны супраць цячэння цягнуў паравоз.

Будапешту яна ўдзяліла менш увагі, на экскурсіях хадзіла як разгубленая.

— Табе нездаровіцца?

— Не, проста так. Мадзьяры ў акупацыю паводзілі сябе горш за немцаў. Не знаю, як да іх адносіцца.

— Цяпер яны нашы сябры.

— Сябры! А што яны зрабілі чатыры гады назад? Сэрцу не загадаеш, яно ў мяне такое, — Маша цяжка ўздыхнула, ахопленая невясёлымі ўспамінамі.

У Вене замест трох дзён стаялі шэсць: рамантавалі цеплаход. Аблазілі ўсе куткі. У Вене села паўсотні немцаў, і яны сапсавалі наш настрой: багатыя выціснулі нас, беднякоў, з бара і ўвогуле паводзілі сябе нахабна, быццам гаспадары судна не мы — яны.

Жонку маю і Турбіну гэта моцна абурала.

Некаторыя з мужчын, як назло, віталіся менавіта з жанчынамі:

— Гутэн таг.

Калі ішлі ўдваіх, адказваў я. Маша дакарала:

— Ты з імі яшчэ вітаешся...

— А ты што — не адказваеш? — бадай, спалохаўся я.

— Адказваю. Як не адкажаш! Такія мы. Але пасля мне хочацца плюнуць на сябе. Вітаюцца якраз тыя, якія па ўзросце яўна ішлі на нас. Вунь двое па-руску спрабуюць гаварыць. Адкуль ведаюць? Адтуль, з вайны.

У падарожжы гэтым каханне наша разгарэлася з новай сілай. Мы, па сутнасці, перажывалі мядовы месяц. Праз дваццаць гадоў пасля шлюбу!

Але пад канец Маша пачала сумаваць па дзецях. Праз гэта ў Сафіі адбылася стрэсавая сітуацыя — для яе, вельмі ўражлівай. Толькі размясціліся ў гасцініцы «Балкан» — заказвай тэлефонную размову з Мінскам. Проста ж, мова зразумелая, балгарская, і нас дзяжурныя тэлефаністкі добра разумеюць. Але грошы... На тры дні прабывання ў Балгарыі нам выдалі леваў — кот наплакаў. Пайшоў уніз да адміністратара: колькі мі нута размовы з Мінскам? Мінут на пяць леваў хапала. Але Маша не магла не пагаварыць. Заказалі. Далі Мінск, чуваць выдатна, дарагія дзіцячыя галасы. Ліны, Тані, Сашы. Усім маці хоча сказаць колькі слоў. А час ляцеў імкліва. Канчаўся наш ліміт. І я мусіў груба вырваць у жонкі трубку.

— Вы нагаварылі адзінаццаць мінут.

О Божа! Як расхвалявалася мая жонка!

— Што ж будзем рабіць! Што можам прадаць? Мой пярсцёнак залаты? Каму?

— Пакінь мяне ў заклад.

Маша ўзлавалася на мае жарты.

Я супакоіў яе. З намі плылі прафесар Шчэрба і яго жонка, з імі мы таксама пасябравалі. А іх зяць, вядомы спецыяліст Валянцін Яжоў, з якім я быў знаёмы, знаходзіўся ў Сафіі, вучыў нашчадкаў Кірыла і Мяфодзія пісаць сцэнарыі.

— Шчэрбы выручаць. Яжоў цесцю дасць левы.

І ўсё роўна Маша, пакутніца, не спала ўсю ноч: такі эмацыянальны мела характар.

Раніцою, пазычыўшы ў Шчэрбаў грошы, я пайшоў разлічвацца і — сюрпрыз!

— Вы гаварылі пасля дзевяці па льготным тарыфе. З вас... і сума ўдвая меншая.

Як падслухоўвалі наша вячэрняе бедаванне. Маша пасля казала, што самыя светлыя ўражанні ў яе ад Балгарыі. Не толькі з-за гэтага выпадку. Балгары ўсюды вельмі дружалюбна прымалі савецкіх турыстаў. Гэта мы асабліва адчулі, пераехаўшы Дунай. Румыны не мелі

такой гасціннасці, а нярэдка проста хамілі; селі ў цягнік наш, савецкі, а месцы да Ясы занятыя, да раніцы сядзелі на чамаданах.

З Дуная мы прывезлі дунайку — Алесю. Яна нарадзілася 16 чэрвеня 1961 года. Трэцяя дачка! Чацвёртая радасць. Але ці не зашмат дзяцей? Не. Дзеці — шчасце сям'і. Не нараджаць Маша не магла.

У гэтай доўгай паўзе ў адзінаццаць год была цяжарнасць. І Маша адважылася на аборт, хоць я пярэчыў.

Пасля яна казала:

— Ты не ўяўляеш, які гэта жах. Не фізічны — маральны. Каб ведала, ніколі не пайшла б на гэта. Я сню дзіцятка, якое забіла. Ад гэтага можна звар'яцець.

І праз трыццаць шэсць гадоў цяжка хворая неаднокчы казала мне:

— Я знаю, за што мяне Бог карае.

— За што? — спытаў я першы раз, не сцяміўшы адразу.

— Ты знаеш — за што. Грэх на мне адзін.

Помню, як бянтэжыліся і адначасова радаваліся старэйшыя, калі я прывёз з раддома маму з маленькай. Прывёз сам на ўласнай машыне на дачу. Канчаўся чэрвень спрыяльнага лета, і палавіна горада палымела ад спелых клубніц.

Дзеці напаўнялі жыццё радасцю.

А колькі было іншых радасцяў — творчых!

Поспехі мае раслі. Кнігі выходзілі на многіх мовах. Рос дабрабыт. З «Победы» перасеў на «Волгу». Дача ў Ждановічах, хата ў Церусе, куды мы хоць ненадоўга ездзілі. Кожнае лета: без Церухі сумавала не толькі Маша, але і я, і дзеці.

Я пісаў, як і дзе ўзнікла задума «Непаўторнай вясны». Напісаўшы яе, убачыў: дык гэта ж біяграфія майго пакалення, а не толькі наша. Стварыўшы ў 50-я гады тэтралогію, я ў 1963-1964 гадах напісаў «Мост» — пятую аповесць у гэтую самую аўтабіяграфічную эпапею. Аповесць атрымала такую ж высокую ацэнку, як і «Непаўторная вясна», «Агонь і снег».

Машы пенталогія падабалася. Кніга многа раз перавыдавалася, і Маша з ахвотай прачытвала карэктуры; я шкадаваў час на такую працу, ды і навошта, кал і ёсць такі блізкі карэктар. Перад «Мостам» я сачыніў «Сэрца на далоні», бадай, самы чытабельны мой раман. Пасля апублікаваццдя ў «Раман-газеце» я атрымаў сотні пісем, мяне зацягалі на чытацкія канферэнцыі. Разы два я ўзяў на іх Машу. У нейкім ваенным гарадку жонкі афіцэраў пачалі дыскусію па вобразе Галіны Яраш з-за яе паталагічнай рэўнасці: адны — за яе, другія — рэзка асуджалі. Машы падабаліся тыя, што апраўдвалі Галіну. Між іншым,

яна адкрыла тое, што я адкрыў даўно: канферэнцыі, шчырыя незафармалізаваныя выступленні жанчын (мужчыны так не ўмелі выступаць, асабліва па варунках сямейных адносін) давалі багаты матэрыял для стварэння жаночых вобразаў. Крытыка і чытачы адзначалі, што асобы слабага полу вылеплены больш аб'ёмна, выразна. Але, безумоўна, не толькі канферэнцыі памагалі гэтаму — усе праявы жыцця, якое я ўважліва назіраў, і ў першую чаргу тое, што жонкай маёй была жанчына, якая багата выяўляла ўсе чалавечыя эмоцыі — каханне да мужа, любоў да дзяцей, вернасць, адданасць, рэўнасць... усё-ўсё.

Думаю, што пасля нараджэння Алесі пачуцці нашы набылі новы сэнс. Гармонія, бадай, узнікла раней. А каханне — тое, што звязвае мужчыну і жанчыну, з узростам, з аслабленнем палавога цягацення перарасло ў любоў у высокім сэнсе гэтага слова, у роднасць — такую, якую варта пісаць з вялікай літары. Так, мы зрадніліся, сталі адным цэлым.

Прачытаў у адным артикуле: «Жизнь двоих — это как танец, где каждый должен чувствовать друг друга и слышать одну мелодию. Если этого нет, не может быть истинной любви». Трапна, дасціпна. Але павярхоўна. Танец — гэта забава. Жыццё — не забава. Яно часта вымушае слухаць розныя мелодыі. Але ўсё роўна трэба «танцаваць» зладжана. У гэтым вялікая тайна і вялікае «мастацтва», якое прыходзіць з тым, што я называю роднасцю. Адчуваць адно аднаго пад адну мелодыю — проста. Адчуваць пад розныя знешнія мелодыі — во ў чым сакрэт. А для гэтага павінна быць у душах адна мелодыя, імя якой Гармонія.

Уваскрашаць у памяці (што нялёгка) гісторыю напісання твораў — зацягнуць споведзь і мімаволі адціснуць Машын вобраз за заслону ўласнай славы. А яна, слава, грэла ў тыя маладыя гады, а цяпер яна — што зімовае сонца: чым ярчэй свеціць, тым мацней мароз. Да таго ж «біяграфіі» некаторых твораў я напісаў ужо — «Сэрца на далоні», «Гандлярка і паэт», «Петраград — Брэст». Паўтарацца не варта, хоць чытачы, безумоўна, будуць розныя. Але, прыгадаўшы «Гандлярку...», я ўспомніў тое, чаго не пісаў раней: як я зрабіў жонку памочнікам у стварэнні аповесці. Усё іншае Маша прачытвала пасля таго, як было напісана. Заўвагі былі скупыя, але заўсёды трапныя. Выхаваная на класічнай літаратуры, Марыя Філатаўна мела бездакорны густ.

«Гандлярка...» давалася мне нялёгка. Па-першае, жыццё ў акупаваным Мінску — дэталі яго выпытваў у тых, хто жыў тут. Па-другое, гісторыя падполля, даволі складаная сама па сабе і яшчэ больш заблытаная гісторыкамі, якія з'ядалі адзін аднаго. Хто з'яўляўся

арганізатарам падполля: Іван Кавалёў ці Ісай Казінец? Спачатку намерваўся ўціснуць гэтую тэму ў сюжэт; твор разросся б да аб'ёмнага рамана. Вырашыў: не трэба! Лес жанчыны — во аснова! Незвычайнай жанчыны — гандляркі! У той час station становучая гераіня — гандлярка! Жах! Калі «Гандлярка і паэт» была вылучана на Дзяржаўную прэмію, тры мае сябры паехалі ў Маскву на савет па беларускай літаратуры і... завалілі аповесць менавіта па гэтых матывах: каго аўтар выводзіць у гераіні падполля — гандлярку! Быццам ад таго, што Вольга гандлявала на Камароўцы сваёй гароднінай, яна страціла свае чалавечыя і жаночыя якасці.

Знаходзячыся, як і ўсе іншыя, у палоне дагматаў, і ідэалагічных, і літаратурных, я таксама пісаў Вольгу з пэўнай насцярогай. Незвычайнасць яе характару ставіла перад аўтарам нямала пытанняў, галоўнае з якіх: як такая жанчына можа паступіць у той ці іншай сітуацыі? І я адкрыў шлях праверкі. Прадумаўшы сітуацыю, але не напісаўшы яшчэ, я звяртаўся да Машы: як бы яна паступіла, каб апынулася ў такіх умовах, у такіх узаемаадносінах з людзьмі — з падпольшчыкамі, паліцаямі. Маша нялёгка адказвала на мае пытанні:

— Дай падумаць.

— Думай.

А на другі ці трэці дзень казала:

— А каб табе добра было. Цэлую ноч не спала з-за тваёй Вольгі. Ты дрыхнуў, а я ўсё думала.

І што мяне радавала: як правіла, яе ход быў такі ж, які ўжо быў у маёй галаве, часцей — больш дакладна выверны. Гэта пераканала мяне, што я на правільным шляху ў стварэнні вобраза гандляркі і падпольшчыцы.

Пасля рэдка гэтак жа «эксплуатаваў» сваю памочніцу. Але пры стварэнні вобраза Таісы ў рамане «Вазьму твой боль» я мусіў зноў звярнуцца да Машы. З той тольКі розніцай, што раман быў напісаны. Не было фіналу, нейкіх дзвюх старонак.

Маша прачытала, доўга думала, пасля сказала:

— Я яго забіла б.

Логіка сюжэта падводзіла да гэтага, але сацрэалізм не даваў мне права пасылаць гераіню на злачынства.

Словы яе ашаламілі: мая Маша здольна на гэта?!

— Ды ты што? — расчараваны абурыўся я.

— А што? Каб ты пакутаваў так, як твой цёзка Іван Батрак? І каб гэты гад Шышка замахнуўся на цябе і асірацiў нашых дзяцей?..

Жаночая душа — вялікая таямніца.

Я пайшоў на гэты фінал: Тася робіць Шышку ўкол.

Рэдактар «Полымя», мой сябра Кастусь Кірэенка, схапіўся за галаву:

— Што ты робіш, вялікі гуманіст! Ды нас з табой разнясуць у пух, у шмаццё.

Разнеслі б, напэўна.

Мусіў перапісаць фінал: сачыніў нешта аморфнае, не зусім пераканаўчае.

Здараецца ў аўтара так, што логіка характараў, развіцця сюжэта заводзіць у такія цянёты, адкуль не знаеш, як выбрацца. Я і дагэтуль не прыдумаў іншага фіналу, які праўдзіва завяршыў бы вельмі складаныя адносіны людзей, што завязаліся яшчэ ў вайну і былі паліты крывёю.

7

Дзяцей Маша песціла больш, чым трэба. Ні ў чым не адмаўляла ім. І ўнукаў. Каб не наведаць Алёшу, калі яны перабраліся ў сваю кааператыўную кватэру, дня пражыць не магла.

Можа, адносіны яе да дзяцей былі адзінай прычынай нашых канфліктаў, у прыватнасці тады, калі ўтаймавалася яе беспадстаўная рэўнасць. Іншыя прычыны, бадай, не ўзнікалі. Я купляў ёй кніжкі пра выхаванне дзяцей. Але яна чытала толькі тое, што датычыць здароўя малых дзяцей і падлеткаў. Спока чытала. Ад занудлівых парад бяздзетных дам (часта кніжкі пра выхаванне пішуць бяздзетныя) адмахвалася.

Я зрэдку ўзрываўся:

— Што ты робіш? Ты псуеш дзяцей сваёй празмернай любоўю і пяшчотай.

— Ты тэарэтык, а я практык. Колькі ты бываеш з дзяцьмі? З-за сваіх рукапісаў і пасяджэнняў ты не бачыш іх. А ім трэба ўвага, матчына — асабліва, калі мала бацькоўскай.

Пра ўнукаў:

— Ты не толькі распусціла Машу (унучку), ты псуеш яе бацькоў. Яны цалкам спадзяюцца на бабулю і мала займаюцца дачкой.

— Можа, гэта і праўда. Але я не магу без яе. І без Алёшы. У іх — мае жыццё. Зразумей.

Калі канфлікт даходзіў да белага калення, Маша, як правіла, адступала першая, ішла па сваіх справах, каб даць мне астыць. Астываў я хутка, а яна, пэўна, хутчэй. Не помню выпадку, каб мы дзьмуліся адно на аднаго больш гадзіны-дзвюх. Ні я, ні Маша не маглі зразумець тых мужа і жонку, якія, пасварыўшыся, не размаўлялі па

два тыдні. Так было ў Андрэя з Аленай; Андрэй расказваў, і Маша, бадай, з матчыным болем перажывала за яго.

— Як жа можна так жыць, Андрэй?! Каб я з Іванам, знаходзячыся ў адной кватэры, не перагаварыла дзень, то не знаю, што са мной было б. Я самлела б. Мне здалося б, што рушыцца мае жыццё.

Так, яна жыла з цвёрдай упэўненасцю ў трываласці нашага кахання, нашага жыцця. І я таксама, і гэта напаўняла нашыя ўзаемаадносіны асаблівай, самай высокай радасцю. А што гэта такое: жыць у штодзённай радасці? Няшчасны той чалавек, які не адчуў гэтага хоць бы ў кароткі перыяд свайго жыцця. А ёсць жа тэтя людзі. Мне шкада іх. Няхай чытач уявіць, як гэта цудоўна, якім поўным з'яўляецца жыццё, калі ёсць радасці — ад блізкасці фізічнай і душэўнай, ад дзяцей, ад сумеснай творчай працы, ад славы і даброт, якія прыносіла наша праца.

Але няхай чытач не падумае, што мы ўвесь час жылі ў ідыліі. Не, жыццё суровае. З самых частых бед — хваробы дзяцей. А яны хварэлі многа — Ліна, Саша... Колькі Маша пацягалася па бальніцах з Сашам! У Маскву вазілі, у Кіеў. Перарос, дзякуй Богу. Але ў сталым узросце нажыў іншую хваробу, ад якой маці пакутавала яшчэ мацней, чым пры дзіцячых хваробах. Не зладзілася жыццё з Анатолем Рагаўцовым у Ліны. Развяліся. Божа, баюся ўспамінаць, колькі перажыла ў гэты час Маша. Узлавалася на мяне, калі я сказаў, што не бачу нічога страшнага ў разводзе, мільёны разводзяцца. Для яе развод — трагедыя. Даказвала, што сям'я — святое і непарушнае.

— Не сучасныя ў цябе погляды.

Злавала:

— Пайшоў ты са сваёй сучаснасцю! Не ўздумай легка разводзіць сваіх герояў.

Прыйшлося — у «Атлантах і карыятыдах» сітуацыя была спісана з жыцця: з Андрэя Макаёнка, яго ўзаемаадносін з Аленай.

Нельга не адзначыць яшчэ адной істотнай рысы маёй жонкі: яе прастаты, дэмакратычнасці; для яе ўсе людзі былі роўныя — ці міністр (а ў гасцях у нас былі і міністры), ці просты рабочы. Яна жыла ў пісьменніцкім асяроддзі, яе там паважалі, любілі, але ў яе нямала было блізкіх работніц, сялянак, з якімі яна шчыра сябравала. У першую чаргу церухскія жанчыны, сваячкі, блізкія і далёкія, суседкі. Прыязджалі мы туды — і збіраўся цэлы сход, часцей каля бацькоўскай хаты, радзей каля нашай, бо сялянкі (больш далікатных людзей я не сустракаў) саромеліся мяне, лічылі, што прыходам сваім перашкодзяць пісьменніку, не разумеючы, што расказы іх, заўсёды вобразныя, дасціпныя, — мой хлеб, яны давалі не толькі характары, але і сюжэты,

як напрыклад, для апавядання «Матчыны рукі», самага кароткага і самага кранальнага; усе акцёры-чытальнікі ўключалі яго ў свой рэпертуар.

Побач з дачным пасёлкам у Ждановічах у часе будаўніцтва дач і гадоў колькі пасля стаяў барак, у якім жылі рабочыя, не помню, якой арганізацыі. Жыла там бяздзетная сям'я, ён — забулдыга і выпівака, яна, Марыя Карась, — паляшучка, шчырая працаўніца. Звалі яе гэтак жа — Машай. «Маша з барака» — так яе ведалі ўсе дачнікі. Працуючы дзесьці ў горадзе прыбіральшчыцай, Карась падзарабляла ў дачнікаў. А ўмела яна ўсё: памыць, пабяліць, пафарбаваць, краны адрамантаваць...

Дзве Машы — роднасць характараў! — палюбілі адна адну, як сёстры. Карась захаплялася Шамякінай:

— Марыя Філатаўна! Якая ж вы! Другой такой ні тут, у пасёлку, ні ў горадзе я не знаю. Такія толькі ў нас у Тураве ёсць.

Пасля барак знеслі і Карасям далі кватэру ў Гарадзішчы.

Маша Карась ездзіла да нас і на дачу, і на гарадскую кватэру. У яе быў найлепшы ў ваколіцы гарод, вазіла нам гародніну. А дзесьці ў канцы 70-х яна цяжка захварэла — рак. І тады да яе пачала ездзіць Марыя Філатаўна — і ў бальніцу, і ў Гарадзішча. Грэшны, я нават нейкі час пярэчыў, бо прыязджала жонка ад ракавай хворай вельмі ўсхваляваная, плакала. Хворая, з тэмпературай, ірвалася на пахаванне, але тут я ўжо праявіў волю, якая ў мяне зусім не моцная. Маша пасля крыўдзілася, што я не даў машыну, каб з'ездзіць развітацца з Марыяй Карась.

У бальніцах яна наведвала ўсіх, хто быў блізкі да нашай сям'і. Пра сваякоў я ўжо і не кажу. Для пляменніц яна была найдаражэйшай цёткай. Для Наташы Святагор — маці. Яны гарнуліся да яе, асабліва тая ж Наташа, Тамара Курганская і яе дзеці, якія робяць і жывуць у Нясвіжы, Маша Іванова-Кротава з Гомеля, дваюрадная сястра — яшчэ адна Маша — Рабцава. З любоўю і ўдзячнасцю я занатоўваю іх імёны ў свой расказ пра жонку маю. Але асаблівая ўдзячнасць мая сястры Машынай — Вользе Філатаўне. Яна вырасціла яе, вывучыла. Яна ўжо без малога трыццаць гадоў жыве з Лінай, памагае ёй, хворай, і гэтым аблягчала празмерную фізічную і маральную нагрузку Машы. За сваё доўгае жыццё я не сустракаў другой такой працаўніцы, як Вольга Філатаўна. Вось і зараз пасля смерці Машы яна, толькі яна трымае мяне на дачы, без яе я тут не здолеў бы жыць. А ёй — 84 гады. А яна паднімаецца ў шэсць. Прапаліць лазню, каб мне, панку, была гарачая вада, згатуе снеданне, пасля абед, вячэру. Яе скручанымі артрытам рукамі пасаджаны і

дагледжаны гарод, і мы ямо салату, цыбулю, гуркі, часнок (памідоры ў гэтым годзе не паспелі); жахлівае лета — даждлівае, халоднае.

Кланяюся Вам, Вольга Філатаўна. Дай Бог Вам здароўя і яшчэ многа гадоў актыўнага жыцця.

Лес часам шчодра сыпле чалавеку даброты, а пасля, як бы патрабуючы плату, наносіць удары.

Улетку 1964-га пазванілі з Церухі, што захварэў бацька — Філат Азаравіч. Маша вельмі ўстрывожылася, адчула нядобрае. Яна казала мне раней:

— На бацьку свайго я ў крыўдзе. Не клапаціўся ён пра нас, малых. Каб не Вольга, чаго мы дасягнулі б? Вышэй даярак калгасных не падняліся б.

Але крыўду гэтую даравала. Калі адпачывалі ў Церусе, адносіны яе да бацькі вызначаліся прыкладнай павагай і пачцівасцю, асуджала нявестку Надзю, жонку Мікалая, што тая загружав свёкра працай і не так паважліва адносіцца да яго, як яны, Маша, Вольга, Клава.

Філат быў негаваркі чалавек, ад яго слова не выцягнеш, але я не мог не адчуваць, як ён любіць Машу, як удзячны ёй. І ўнукаў, дзяцей нашых, любіў. З Сашкам хадзіў лавіць рыбу, лавілі таптухай і ніколі не вярталіся з пустой торбай: рыба была на стале кожны дзень.

Маша папрасіла мяне паехаць неадкладна. Я тут жа сеў за руль.

Бацька адчыніў нам вароты. Але меў выгляд хворага чалавека: худы па прыродзе, зусім схуднеў. Узрадаваўся, што мы прыехалі.

На другі дзень я паехаў у Гомель і прывёз урача — начмеда абласной бальніцы Сінякову, добра помню прозвішча гэтай чулай жанчыны. Безумоўна з яе боку быў элемент цікаўнасці — глянуць на жыццё вядомага пісьменніка і, аднак... Паслухала хворага. Выйшлі на вуліцу. І сказала аднаму мне:

— Цяжкая гісторыя. У старога лейкемія. Вострая. Не хачу палохаць, але скажу суровую праўду: жыцця яму засталося тыдзень. Ад жонкі не таіце. Для пацвярджэння дыягназу прышлю лабарантку.

Дыягназ пацвердзіўся.

Бацька згараў што свечка. Маша не адыходзіла ад яго. Прыехалі Вольга і Клава.

Памёр Філат Азаравіч праз адзінаццаць дзён пасля нашага прыезду, на Сёмуху, ва ўзросце 73-х год.

У апошні дзень 1965 года я пайшоў у ГУМ купляць дзецям навагоднія падарункі. Вярнуўся, Маша адчыніла дзверы, і па выразе яе твару, па сцішанасці дзяцей я адчуў, што здарылася нешта незвычайнае. У мяне замлелі ногі.

— Што?

— Памёр твой бацька.

Бацька ляжаў у Добрушскай бальніцы. Але дні тры назад я пазваніў туды, і яго паклікалі да тэлефона. Пагаварылі, ні скаргаў, ні просьбаў ён не выказаў. Я супакоіўся:

— Рамантуйся, бацька.

Яму споўнілася ўсяго 66 гадоў.

Ехалі з Машай у навагоднюю ноч. У пустым вагоне. Са страхам думалі, як дабрацца ад Гомеля: Новы год, выхадны, установы не працуюць, каб папрасіць машыну. Ледзьве ўгаварылі таксіста адвезці нас у Добрушскае лясніцтва — за сорак кіламетраў.

Ляснік Пятро Мінавіч сорак гадоў жыцця аддаў лесу. І пахавалі яго на лясных могілках, пад дубамі. Могілкі былі не лясніцтва, а ваеннай базы. У другі дзень 1966 года новы чырвоны слупок быў усяго трэцім: салдат, які загінуў пры аварыі, бабуля з пасёлка, які вырас у лесе — будаваліся вольнанаёмныя рабочыя базы і звольненыя з арміі, лес навокал казачны. А цяпер там толькі нашых пахавана пяцёра: бацька, маці, сестры мае — Галя, Таццяна, пляменнік Мікалай, сын Галін.

У 1996 годзе я пакланіўся магілам, убачыў жахлівыя сляды радыяцыі: знесены пасёлак, разбуралася вялікая ваенная база — амерыканцы рэзалі снарады, ракеты. Вынік паездкі — сюжэт сумнай аповесці з публіцыстычнай назвай «Зона павышанай радыяцыі».

У сакавіцкі дзень 1970 года пазванілі, што памерла маці мая. Хварэла доўга. Я наведваў яе. Але пасля смерці яе карыў сябе, што не забраў у Мінск. Ці прадоўжылі б сталічныя ўрачы ёй жыццё? Наўрад. Але сумненне грызе дагэтуль.

Зіма была снежная. Снег пачаў хутка раставаць. Дарогі, немагістральныя, сталі непраезджымі. Як дабрацца? Нейкім чынам даведаўся, што ў ЦК нарада сакратароў абкамаў па ідэалогіі. Званю А. Т. Кузьміну: ці ў яго гомельскі сакратар. Я добра ведаў яго, але зараз ніяк не магу ўспомніць прозвішча.

Ён забраў нас з Машай да Гомеля. А каля абкама, хоць была ўжо ноч, стаяў газік, які завёз нас у Дубецкае, так называўся пасёлак каля ваеннай базы, дзе працавала сястра мая Галя, муж яе Аляксей Мальцаў; маці жыла ў іх.

Сынклеція Сцяпанаўна (дзявочае — Калініна) пражыла 73 гады. Усяго. Большую частку жыцця бацькі жылі ў лесе, і так мала Бог адвёў ім жыцця. Маці вельмі цяжка працавала, нават арала, хіба што не касіла, але зграбала пакосы. Гаспадарка ў лесніка немалая: каровы, свінні, куры, гектар зямлі давалі. І ўсё гэта было на плячах і

руках маленькай худзенькай жанчыны. Маці, бадай, да смерці верыла, што Павел жывы. Неаднойчы казала:

— Іван, ён можа, у палоне дзе?

— Ды ўжо вярнуліся палонныя ўсе.

— А можа, жонка такая, што не дае напісаць?

Што было адказаць на гэта? Няхай верыць!

Смерць маці моцна ўразіла мяне. Раптам адчуў сябе старым, хоць мне не было і пяцідзесяці.

Гэтак жа цяжка перажывала і Маша.

У чэрвені 1975 года на Украіне праходзілі дні беларускай літаратуры і мастацтва.

Фэст грандыёзны. Цяпер скептычна хмыкаюць наконт гэтых сустрэч міжнацыянальнага мастацтва. А дарэмна. Пэўны элемент пампезнасці існаваў. Але якая была карысць! Новыя пераклады, пастаноўкі п'ес брацкіх аўтараў. Паказ сваіх дасягненняў іншаму народу. Хіба «Славянскі базар» і многія іншыя фестывалі роўныя тым? Тут больш паказухі!

Вярталіся радасныя, вясёлыя, добра «запраўленыя» гаспадарамі на развітанне. У Мінскім аэрапорце нас сустракалі. Мяне — Таццяна, Навуменку — жонка Ядвіга Паўлаўна. Таня была незвычайная, адвяла Андрэя Макаёнка, нешта сказала яму. Ён пазмрачнеў. А Ядвіга Паўлаўна, пэўна здзіўленая, што я такі вясёлы, сказала:

— Гэта трэба — такая бяда!

— Якая?

— Смерць сястры Марыі Філатаўны. Хіба вам не паведамілі?

— Якой сястры?

— Клавы.

— Клава памерла? — я не вытрымаў і заплакаў.

Я любіў Клаву: разумная, дасціпная жанчына, выдатны ўрач. Але пакутавала ад бранхіяльнай астмы. Я дагэтуль адчуваю сваю віну, што не памог ёй з лячэннем; казалі, што памагалі саляныя шахты ў Закарпацці.

У той трагічны вечар яна рыхтавала дачку сваю Наташу да выпускнога вечара, памагла ёй памыць галаву, надыхалася парамі шампуню... Пачаўся прыступ. Яна ўдыхнула астмапен і... імгненная смерць: параліч дыхальнага цэнтра.

Немагчыма расказаць, якая гэта была трагедыя для Вольгі і Машы. Першыя гады пасля смерці сястры яны амаль кожную нядзелю ездзілі на яе магілу, кветкі там не высыхалі.

30 студзеня 1981 года я адзначаў сваё 60-годдзе. Мне прысвоілі званне Героя Сацыялістычнай Працы. Найвышэйшая ацэнка творча-

сці маёй. Напярэдадні І. Я. Палякоў уручыў мне зорку. Правялі добры вечар у тэатры Янкі Купалы. У дзень нараджэння (дзень быў выхадны) я даваў прыём у кафэ Дома літаратараў. Там былі накладкі, зайздроснікі хоць дробную брыдоту ды стараліся зрабіць (напрыклад: госці збіраліся, а стол быў ненакрыты). Я ж ужо не кіраваў у Саюзе пісьменнікаў, за паўгода да гэтага перайшоў у «Энцыклапедыю» галоўным рэдактарам. Накладкі гэтыя расхвалявалі і мяне, і Машу. Ды і абед быў не надта вясёлы, некаторыя «сябры» мае як бы забывалі на юбіляра — іезуіцкая форма ігнаравання: не ты Герой — мы героі.

Па заканчэнні абеду там жа ў Доме літаратара ў гардэробе я зачапіўся за парожак, упаў і зламаў руку. Як тут не паверыць у народныя прыкметы: быць бядзе, калі на цябе глядзяць зайздросна, незычліва, а можа, нават з пажаданнем няшчасця. І — здарылася бяда. Не адна. Праз дзесяць дзён, 9 лютага, загінула мая сястра Галя. Ехала на веласіпедзе на працу ў ваенгарадок (дарогі тае адзін кіламетр), быў ветраны дзень, і каля самай прахадной, дзе з-за гульні ў сакрэтнасць лес не чысцілі, не высякалі, са старой сасны адламаўся сухі сук, упаў з вялікай вышыні на галаву чалавеку. Такая недарэчная, проста дзікая смерць.

Сам паранены, я выў ад гора. Рука баліць, у гіпсе — як ехаць? Рваўся — Маша не пусціла. Паехалі на пахаванне яна і сын наш Саша. А я застаўся плакаць. Ляжаў, сядзеў, хадзіў у глыбокай роспачы і роздуме. Лічыў сябе атэістам, але звяртаўся да Бога: за што караеш, міласэрны? Няўжо ёсць закон, па якім лес кідае на шалі няшчасці, каб ураўнаважыць даброты і радасці?

А праз дзесяць дзён з рукой — гіпсавай «лялькай» я мусіў ехаць на XXVI з'езд КПСС, дэлегатам якога быў выбраны. Спрабаваў адмовіцца — прыслалі хірурга на дом, які даў патрэбнае заключэнне. Безумоўна, паехаў з Машай, аднаму штаны зашпіліць няма як.

З гасцініцы «Масква» ў Крэмль вазілі на аўтобусе, здаралася, што нас ехала толькі трое: Герой Савецкага Саюза з пабітымі нагамі і маладая калгасніца, якой, пэўна, імпанавала, што яе возяць. Цяжка было сядзець з хворай рукой, слухаць чатырохгадзінны даклад Брэжнева, які ледзь не самлеў на трыбуне — тройчы прасіў перапынак, і перапынкі цягнуліся хвілін па 40. Аднак нікому малодшаму не ўступіў дачытаць сотняй людзей сачынены даклад. Мне шкада было старога чалавека. Прага ўлады вымушае ісці і не на такія пакуты.

А Маша сумавала ў гасцініцы. Па магазінах хадзіць, як звычайна, не было патрэбы: усё прадавалася ў гасцініцы — прадукты і тавары найвышэйшай якасці, тавары — імпартныя. Але магазіны працавалі толькі тады, калі дэлегаты з'яўляліся на абед, і ў вячэрні

час. З'яўляўся я — і Маша імчала штосьці купіць, найперш — прадукты, бо іх можна было адасласць: працавала пошта — і як працавала! Пасылку ўпакоўвалі ў спецыяльныя скрынкі і афармлялі за лічаныя хвіліны, а паштавікоў рабіла дзесяткі два. У першы дзень Маша паведаміла мне, што адаслала ажно чатыры пасылкі. Я жахнуўся:

— Ды ты што! Што пра нас скажуць?

— Адна дама ў сабалях, з Сібіры, на поўны голас хвалілася, што адаслала дваццаць пасылак. Не баіцца, што скажуць.

Але найбольш ашаламіла аператыўнасць па ўсёй лініі: калі на другі дзень увечары пазванілі дадому, пасылка была ўжо дастаўлена на кватэру мінскімі сувязістамі. Працаваць бы так усім службам увесь час! Хоць на савецкую пошту наракаць не варта: у параўнанні з сучаснай яе можна лічыць узорнай.

Так кармілі дэлегатаў, якія ў прынцыпе мала што вырашалі. Але як ірваліся да урнаў пры тайным галасаванні, асабліва з усходніх рэспублік! Мяне так заціснулі, што ледзьве не зламалі зламаную руку. Супраць Брэжнева з пяці з палавінай тысяч прагаласавала тольКі чацвёра. Усяго. Усяго? Тады паверыў, цяпер не веру. Колькі было падману, фальшу! Было? А цяпер няма? Тады куплялі прадуктовымі пасылкамі. Цяпер прыхільнікаў ладу купляюць за фірмы, заводы, магазіны, катэджы. Горка пра гэта думаць. Хочацца напісаць злы раман. Але позна, не хапае сілы. Дзве гадзіны папрацую над гэтымі ўспамінамі і — баліць галава. Здавалася, што сваё жыццё, гісторыю нашага з Машай кахання, любові напісаць лёгка. О, не! Вельмі цяжка. Энергіі забірае больш, чым раман. Можа таму, што рана цяжкой страты адкрытая. Але ці загоіцца яна да канца маіх дзён? Колькі іх засталося, дзён майго сумнага жыцця? А галава баліць не толькі ад працы. Галава баліць за будучыню дзяцей і ўнукаў. Маша слала пасылкі, каб найсмачней накарміць дарослых ужо дзяцей і малых унукаў, клопату пра грошы не мела, іх ляжала нямала ў ашчаднай касе ў Мінску і нават у той жа гасцініцы «Масква» — ганарары за кнігі, якія выдаваліся ў Маскве. А я думаю: дзе атрымаць колькі грошай, каб памагчы дзецям. Выйшла «Палеская мадонна», а ганарар выдавецтва не можа заплаціць: няма грошай. А яны катастрафічна абясцэньваюцца. Дол ар ужо вунь колькі, і цэны няўхільна растуць.

Аднак гэта ўжо не ўспамін і... не Машын клопат. Ведала яна радасці, але і гора, нябога, сербанула праз край.

Акрамя страты блізкіх, былі беды меншыя. Але ці мяльчэйшыя рубцы пакідалі яны — на сэрцы маці, жонкі, сястры?

Хварэлі дзеці. Хварэлі сестры. Хварэў брат. Хварэў я. Толькі яна, Маша, здавалася, не хварэла, ляжала толькі ў раддоме.

Я двойчы апынуўся ў крытычным стане. У 1974 годзе мне выразалі жоўцевы пузыр. Аперацыя была раптоўная, без падрыхтоўкі, пасля цяжкага прыступу, справакаванага банкетам, на якім многа еў. Ачуняў цяжка. Месяц праляжаў у бальніцы.

А роўна праз дзесяць год — зноў аперацыя, яшчэ больш нечаканая і цяжкая. Лёг на абследаванне. Зрабілі каналаскапію і... прадзіравілі кішку. За ноч разгарэўся перытаніт.

На маё шчасце, дзяжурыла загадчыца аддзялення Ірына Аляксандраўна Аляшкевіч. Яна ў выхадны дзень падняла ўсіх святціл. Апераваў зноў жа выдатныхірург Мікалай Астаф'евіч Філіповіч; яму я абавязаны, што жыву дагэтуль. І, безумоўна, Машы. І першы, і другі, і трэці раз, калі я ў 1992 годзе нажыў анемію, яна выхадзіла мяне. Яна літаральна не пакідала бальніцу, толькі ўвечары яе далікатна «выстаўлялі». Пасля другой аперацыі і начавала там, ёй дазволілі, калі мяне з рэанімацыі перавезлі ў люкс, я ж шышка быў — старшыня Вярхоўнага Савета. А пры анеміі ў цяжкі год, калі ляснулі нашы зберажэнні — ганарары за 40 гадоў актыўнай творчасці, Маша карміла мяне месяц цялячай пячонкай і паіла чырвоным віном (прафесар Іваноў, гематолаг, параіў такі рэцэпт). Анемія — не аперацыя, смяртэльнай пагрозы не існавала, але ляжаць у бальніцы прыйшлося больш месяца. І кожны дзень па тры гадзіны мяне «забаўляла» Маша. Яе прысутнасць, яе клопат, расказы пра дзяцей і ўнукаў былі, напэўна, самымі эфектыўнымі лекамі.

Найбольшая наша з ёй агульная трагедыя — смерць сына.

Аляксандр, Саша, Сашачка, якім ён заставаўся для маці і ў сорак гадоў, памёр 12 верасня 1991 года. Раптоўна. Выпіў, лёг дома ў ложак, і жонка яго Таццяна, вярнуўшыся з працы, не адразу нават выявіла, што чалавек мёртвы. Саша скончыў геалагічны факультэт, рабіў геолагам у Рэспубліканскім праектным інстытуце. Любіў сваю працу. Але што гэта за праца? У дождж і мароз — у полі з партыяй рабочых, за якіх нёс адказнасць, але, слабавольны, паддаваўся іх слабасцям, галоўная з якіх — выпіўкі. Цяжка сурова асуджаць такую катэгорыю рабацяг. Напрацуюцца, намерзнуцца — хочацца выпіць. А што пілі ў раёне — у Лунінцы ці Ельску? Што танней — самагон. А закусвалі чым? Мёрзлымі кансервамі. Сын наш сапсаваў страўнік. Колькі разоў мы вымушалі яго лажыцца ў бальніцу. Лажыўся, лячыўся. Але выходзіў з бальніцы, ехаў у экспедыцыі, і ўсё пачыналася спачатку. Не сказаць, што ён стаў алкаголікам, але выпіваў часам

празмерна, не та*с, як бацька: я заўсёды ведаў меру. Што і з кім ён выпіў у той злашчасны дзень — загадка.

Мы з Машай былі на дачы, калі нам пазваніла Таццяна. Усю праўду не сказала: няшчасце з Сашам. Маша яшчэ спадзявалася, што ён жывы, у бальніцы. Прыехалі, калі санітары выносілі на коўдры бездыханнее цела самага дарагога чалавека, нашага адзінага сына, якога мы любілі, можа, глыбей за іншых дзяцей. Але любоўю сваёй, напэўна, і шкодзілі яму: легка верылі яго мане, што нешта зламалася ў машыне, нешта трэба купіць з адзення, з абутку, і давалі грошы. Калі грошай многа — не на дабро гэта.

Глыбіню нашага гора цяжка перадаць. Маці была ў шокавым стане: не помніла, як хавалі, дзе могілкі, дзе магіла. Пакутны боль гэты за сына яна насіла ў сэрцы сваім амаль сем год, да апошняга дыхання. Цяжка хворая, яна перш-наперш пыталася, ці наведаў хто з нас магілу Сашы. Яна наведвала амаль кожную нядзелю ўлетку, пэўна ж, кожную, толькі зімой, у мароз, у непагадзь я амаль жа са скандалам не пускаў яе на могілкі. Ездзіла аўтобусам, з перасадкамі. У пачатку 90-х гадоў я яшчэ вадзіў машыну і вазіў яе, але толькі ўлетку, на зіму ставіў машыну на прыкол. Пасля смерці сына спыніліся нашы паездкі ў санаторыі: Маша катэгарычна адмаўлялася куды-небудзь ехаць ці ісці ў тэатр, у госці; лічыла, што гэта будзе абразай памяці Сашы. А без яе і я не мог паехаць — баяўся адзіноцтва, паехаць і тварыць — які адпачынак!

Мы так зрадніліся, што нам было цяжка пражыць адно без аднаго дзень-два. Калі я быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР з 1980-га па 1989-ты, я нават на сесіі прасіў яе паехаць са мной. Без яе не ведаў, куды дзець час вячэрні, пасля пасяджэнняў. У гасцініцы «Масква» адчуваў сябе што ў пустыні (не ў лесе — у лесе, сын лесніка, я ніколі не перажываў адзіноцтва). Напрошвацца ў госці да кагосьці з калег не дазваляла сумленне, ведаючы, што масквічы не любяць гасцей. Нязменна наведваў свайго франтавога сябра і земляка Віктара Вольскага, дырэктара Інстытута Лацінскай Амерыкі, эрудыта, выдатнага расказчыка, гумарыста. Але нават да такога блізкага чалавека кожны вечар хадзіць не будзеш. І я прасіў Машу паехаць са мной, яна ахвотна згаджалася. Я думаў, каб добра было мне. Эгаіст! І мала думаў, а як жа ёй было сядзець цэлы дзень у нумары адной, чакаючы мяне з пасяджэнняў? Хадзіла па гарадскіх магазінах. Але гэтага занятку яна не любіла нават у Мінску, модніцай ніколі не была, тым больш у шэсцьдзесят гадоў. Дзеля дзяцей, унукаў магла стаяць у чэргах гадзінамі. І дзеля мяне ахвяравала любым сваім камфортам, фізічным і духоўным. Лягчэй мне з ёй выконваць свае дэпутацкія

абавязкі — гатова была ехаць хоць на край свету. У Маскве, праўда, у Машы была адна пацеха — пагаварыць пры сустрэчы і па тэлефоне з жонкай Вольскага Уладзіславай. Такой роднасці душ чужых людзей я мала сустракаў. Да добрых людзей Маша моцна прывязвалася. Горка плакала, калі Віктар паведаміў, што памерла Улада; яе, дыябетычку, загубіла ранение нагі, яна не дала ампутаваць нагу.

Пасля смерці Улады я не мог не бачыць, як цяжка Машы ехаць у Маскву. Але дзеля мяне яна ехала. І мне хораша было з ёй, адчуваючы душэўную цеплыню і клопат.

Хтосьці тады, пэўна, зайздросціў нам: ездзяць у класным вагоне ў Маскву, жывуць у люксе лепшай гасцініцы. А на самай справе ўсё разам — творчасць, дэпутацкія абавязкі і для абоіх нас сям'я — было нялёгкай нагрузкай. Але да смерці сына — прыемнай. Пасля свет страціў усе фарбы, акрамя чорнай. У такім змрочным свеце дарагая мая жонка, маці нашых дзяцей, бабуля ўнукаў, пражыла без малога сем гадоў. Пакутнае жыццё!

8

За тыдзень да таго, як быў пастаўлены страшны дыягназ — лейкоз, Маша перажыла апошнюю ў сваім жыцці радасць.

Я вярнуўся з прагулкі па лесе, і яна сустрэла радасным паведамленнем:

— Ваня! А ў нас радасць. Алеся нарадзіла хлопчыка.

Дванаццаць гадоў назад Алеся выйшла замуж і ўсё не магла нарадзіць. Маша вельмі перажывала за малодшую дачку, хадзіла ў царкву, ставіла свечкі, малілася, каб Бог даў Алесі дзіця. І вось нарэшце жаданае для ўсіх нас адбылося. Я радаваўся разам з Машай. Хлопчыка назвалі Іванам — у гонар дзеда. Расце наш Ванечка. А бабулі, якая чакала яго, няма вось ужо тры месяцы. Не знаю, як у каго з дзяцей, а мая рана не гоіцца. Ці загоіцца? Наўрад. Колькі мне засталося жыцця?

Маша скардзілася на адно — на болі ў нагах. Але ногі ў яе, як і ў мяне, балелі даўно. А лячыцца яна не любіт, па-сялянску спадзявалася на авось: пройдзе, маўляў. Што яна сур'ёзна хворая, я мог заключыць па адным: тры тыдні не здолела паехаць на магілу Сашы. А на дачы працавала па-ранейшаму: варыла, мыла, нават перакопвала на зіму гарод — рыхтавалася да вясны.

Урэшце я вымусіў яе паехаць у паліклініку. І на другі дзень па аналізе крыві быў пастаўлены дыягназ. Любы фельчар не памыліўся б: лейкацытаў 200 тысяч.

— О Божа!— адзінае, што я мог сказаць, калі мне патэлефанавала ўчастковы ўрач Галіна Краўчанка.

Няма патрэбы пісаць гісторыю яе цяжкай хваробы і маіх душэўных пакут. Яны — у маім дзённіку. За сем месяцаў я напісаў многа. Нічога ж іншага не пісаў. Не, «Губернатара» скончыў у час хваробы. Як здолеў!

Але самае дзіўнае, што Маша ў сваім стане, знаходзячыся па два-тры тыдні дома, передрукавала аповесць. 200 старонак! Во працаўніца! Во воля і мужнасць!

Усе дзённікавыя падзеі і думкі расцягнулі б маю споведзь — завяршаю яе асобнымі, найбольш эмацыянальнымі, на маю думку, запісамі. Дзённік — не мастацкі твор, яго не «шліфуеш». Ды і гэтую аповесць не трэба «шліфаваць»: так напісалася ў горы і смутку. Так усплылі ў памяці і светлыя радасці, і чорная жалоба.

Дык вось — дзённік.

**4 верасня 1998 г.**

Будзе адзіны дзённікавы запіс — сённяшні. Перачытваў дзённікі часу хваробы Машы і раптам цюкнула: а навошта? Навошта ўключаць у гэтую ўвогуле жыццесцвярджальную гісторыю апісанне агоніі невылечна хворага чалавека?! Расхвальваць сябе, блізкіх? Выставіць свае душэўныя пакуты? Не трэба! Не трэба!!!

Няхай светлы вобраз Марыі Філатаўны навечна застаецца ў памяці не толькі блізкіх ёй людзей, але ўсіх, хто яе ведаў, а можа, і ў некаторых з тых, хто прачытае гэтую гісторыю нашага кахання, любові, жыцця.

Вам, мае ўнукі, адрасую яе, маю споведзь.

*Ліпень — верасень 1998 г.*

## ПОШУКІ ПРЫТУЛКУ

Под старость жизнь такая гадость.
*А. Пушкін*

1

Прачнуўся Ігнат Андрэевіч як пасля глыбокага наркозу. Не адразу выходзіў з небыцця. Ранкам ён чуў за сцяной галасы сына і нявесткі. Глухія галасы. Яны на нейкае імгненне разбудзілі яго, і тут жа ён зноў заснуў і не чуў, як Андрэй адыходзіў на працу. Сын усё ўмеў рабіць ціха і непрыкметна. Прафесія навучыла ці што? Следчы пракуратуры. Такой жа бясшумнай была і Паліна, нявестка, выкладчыца універсітэта. Яна ні разу не разбудзіла яго ні тады, кал і заставалася дома і гатавала снеданне, абед, ні тады, калі ў яе лекцыі былі з раніцы, і яна спяшалася да сваіх студэнтаў.

Будзілі гукі піяніна: прачыналася чатырохгадовая ўнучка Света і, нягледзячы на сто папярэджанняў, не магла вытрымаць, каб не паказаць сваё музычнае майстэрства, а сыграць яна ўмела адзіную мелодыю «Жил-был у бабушки серенький козлик».

Маці, калі была дома, шыкала на яе:

— Цішэй ты, дзядуля спіць.

— Старэнькія, як маленькія, доўга спяць, так?

— Не ўсе. Твой дзядуля доўга не спіць, у яго бяссонныяночы...

— Ён думае пра бабулю?

Можа, менавіта гэтае апошняе пытанне малой будзіла канчаткова. Але нярэдка і пасля музыкальнай пабудкі засынаў зноў. Ранішняя санлівасць. Не дзіва. Засынаў цяжка, гадзін да трох-чатырох не спаў. Змучаны бяссонніцай, глытаў снатворнае. Таму такі ранішні сон — сапраўды наркозны. Уначы ўспамінае ўсё сваё доўгае жыццё. Думае пра падзеі ў свеце, у сваім інстытуце, куды зрэдку заглядвае, ды і калегі-пенсіянеры, што яшчэ працуюць, звоняць часам. Думае аб сваім хуткім фінале, даволі часта ўяўляе, мадэлюе сваё пахаванне. Ангеліна казала, што гэта грэх — думаць пра ўласнае пахаванне.

— Не хвалюйся, пахаваюць, — казала яна.

Ігнат Андрэевіч нікому не прызнаваўся, але яму хацелася, каб хавалі яго з інстытута, дзе ён прарабіў амаль сорак гадоў — ад малодшага навуковага супрацоўніка да дырэктара. Баяўся, што зусім малады дырэктар не зробіць гэтага. Разоў колькі наважваўся зайсці да яго і папрасіць. Незвычайная просьба. А чаму незвычайная? Хіба ён не мае права на такую апошнюю пашану? Яму было да слёз крыўдна, калі доктара навук Віктара Кляцкова хавалі з цеснай

кватэры. Вельмі не хацелася, каб труна стаяла тут, у пакоі, які сям'я называв сталовай, і выносілі яе з гэтага закутка па вузкай лесвіцы.

Ангеліна да гэтага ставілася проста і гэтак жа проста гаварыла, нават тады, калі ёй выразалі ракавую пухліну. Адзенне падбірала на смерць, з нявесткай раілася, ашаламляючы маладую жанчыну. Яго гэта таксама бянтэжыла, ён прасіў:

— Не гавары ты пра гэта...

— Добра, з табой не буду.

З ім не гаварыла. З сынам не гаварыла. Толькі часам давала наказы. У потай плакала, калі да яе лашчылася малая Света, а ёй тады было два — два з палавінай гадКі. Яна нічога не разумела. І яе стараліся ізаляваць ад ракавай бабулі; бабуля сама цалавала толькі яе ножкі.

Жонка памірала цяжка, яе нават у бальніцу ўжо не ўзялі: безнадзейная.

Ігнат Андрэевіч баяўся так паміраць. У яго сто хвароб: склероз, стэнакардыя, анемія, артроз... Баліць на змену надвор'я сэрца, баляць суставы, слабасць ад недахопу гемаглабіну. Урач, які лечыць яго, кажа, што ўсе гэтыя хваробы несмяртэльныя, што з такімі хваробамі жывуць да ста гадоў. Свістун! Хаця б да васьмідзесяці дачапаць! Да гэтай круглай даты хацелася дажыць, але ж гэта яшчэ тры гады, тысяча дзён. Тры гады — няшмат, так, прынамсі, здаецца, а тысяча дзён — многа. У бяссонную ноч ён падлічыў, што 80 гадоў — гэта амаль трыццаць тысяч дзён. Школі раней пра гэта не думаў. Здзівіўся і з горыччу падсумаваў, што за 20-25 тысяч дзён ён мала зрабіў. Сотня артыкулаў, тры манаграфіі, але ніводная з іх не зрабіла перавароту ў навуцы. Яго тузалі, ён лёгка паддаваўся ўплывам, модзе: спачатку кукуруза, пасля цукровыя буракі, і толькі пад старасць ён спыніўся на старым караняплодзе, што прывёз Калумб ад індзейцаў, які стаў другім хлебам для бедных беларусаў. На кукурузе ён быў прагрэсіўным, на бульбе — кансерватарам. Так і казалі маладыя: «Знасіўся дзед, падбірае азаддзе. Што можна сказаць новае пра бульбу?» Выходзіць, можна. Селекцыйнымі доследамі ён вывеў новыя гатункі. Не дарэмна ж, змясціўшы з дырэктара ў шэсцьдзесят пяць, яго да сямідзесяці двух трымалі на сектары бульбаводства. І з яго думкай лічыліся — у навуковых колах, у міністэрстве, ва ўрадзе. Лічыліся... А за пяць гадоў пенсіянерства забыліся, што не вельмі даўно быў такі нацыянальны вучоны. Праўда, за гэтыя гады свет перавярнуўся дагары нагамі, усё, што ствара лася дзесяцігоддзямі, развалілі маладыя «рэфарматары». Але што далі іх рэформы народу?

Хіба ж можна заснуць з такімі думкамі? А гэта тольКі часцінка яго перажыванняў. Бо іх мора. Галоўныя з іх — вечныя, якія не давалі спакою святым і грэшнікам, філосафам і пісьменнікам.

Ігнату здавалася, што пра смерць ён думае спакойна, часам з бравадай, святатацтвам, зрэдку нават з гумарам. Не, так ён думаў да смерці Ангеліны. Цяпер думае часта і сур'ёзна. Адчуў, што баіцца смерці. Доўга не прызнаваўся сабе ў гэтым. Але аднойчы за вячэрай малая Света нечакана спытала:

— Дзед, а ты хутка памрэш?

І ён пахаладзеў, задрыжала рука, ён паклаў відэлец на стол.

— Хутка, хутка, унучачка.

Маці пляснула малую сурвэткай.

— Што ты плявузгаеш, дурная?

— А што? Бабуля яго там чакае, ёй сумна адной.

— Хто гэта табе нагаварыў?

— А нам у садзіку казалі.

— Бязмозглыя там выхавацелі, — змрочна выказаўся бацька.

А калі яна была ў тым дзіцячым садку? Паўгода назад. Нягледзячы на дзедава супрацьўленне, бацькі завялі малую ў садок, каб аблегчыць старому жыццё; дзіўна клапаціліся немаладыя ўжо тата і мама пра старога бацьку. Без Светы жыццё страціла сэнс. Ды, на яго шчасце, Света хутка ўзбунтавалася.

— Не хачу ў садзік!

І ўзняла лямант.

Заставалася з дзедам. З дзіцячым эгаізмам эксплуатавала яго. Прымушала чытаць гадзінамі, а ў старога ад чытання ўголас балела галава. Прымушала поўзаць па падлозе — з яго хворымі суставамі; потым, каб падняцца на ногі, поўз да канапы ці да стала. Стогне, крэкча. А Света прымае гэта за гульню і смяецца. Ён ведаў, якое было яго жыццё без унучкі, і гатовы быў поўзаць, гаўкаць, выць.

Але радасць яго нечакана скончылася. Разжалавалі дзеда з нянек. Праспаў унучку. Натуральным чынам. Начытаўшыся казак, змораны (у той неспрыяльны дзень увогуле нездаровілася), ён сеў у калідоры ў крэсла і... заснуў. Светка адчула сябе гаспадыняй. Залезла на табурэт, павярнула верхні кран газу, уключыла, паставіла на пліту каструлю з вадой — вырашыла варыць суп. Толькі крупы не адразу знайшла. Шукаючы іх, скінула з паліцы бляшанку з цукрам, нарабіла грукату, разбудзіла дзеда.

Ігнат Андрэевіч убачыў, што натварыла ўнучка, і ледзьве не самлеў.

Зрабіў памылку: расказаў пра здарэнне бацькам. Андрэй пасмяяўся. Спалоханая Паліна ўзлавалася на мужа.

— Табе смешачкі? Дзіця спаліць магло сябе і дом, — і тут жа вынесла прысуд: — Пойдзеш у садок!

— Не пайду!

— Пойдзеш як міленькая.

Завяла з гвалтам, але Света на тэты раз легка прыжылася там.

Без Светы жыццё Ігната Андрэевіча стала, як ён вызначыў, аднамерным і аднафарбным — чорным.

Няпоўны дзень была занятая ва універсітэце Паліна, але нявестка была не з гаваркіх. Не, бадай, такой яна была толькі з ім. А раней... Дзіўна яны памяняліся — і Андрэй, і яго жонка. Раней збіраліся за сталом і, як правіла, вялі доўгую гаворку на самыя розныя тэмы — ад высокай палітыкі да цэнаў, што скакалі галопам. Ангеліна ўсіх яднала, нават хворая. Пасля смерці маці сын замкнуўся, часам прыходзіў з працы пад чаркай, але «кроплі» не давалі яму весялосці, наадварот, наганялі змрочнасць, рабілі нязвыкла маўклівым. Гэта Ігната Андрэевіча моцна трывожыла. Ведаў: праца сынава на нервах. Але баяўся: ці не б'е ён падследных? Для яго, старога чалавека, які ўсё жыццё думаў, як вырасціць багаты ўраджай, накарміць людзей, такое падзенне сына — біць людзей — было б трагедыяй.

Разы два папрасіў:

— Раскажы, Андрэй, цікавыя эпізоды са сваёй практыкі.

— Табе не абрыдла крымінальная хроніка? Усе газеты запоўнены ёю, тэлебачанне. Я ў сауне не магу адмыць гэты бруд.

— Чаму ён расце, крымінал?

— Пакуль уладарыць долар, злачынствы будуць расці.

— А каб уладарыў рубель?

— Думаю, спакусы было б менш. Я ж дапытваю не тых, хто ўкраў пляшку гарэлкі. Гэта справа міліцыі. Мая кліентура — хабарнікі, махляры, а гэта, як правіла, тузы. Ёсць дзесяткі спосабаў прысваення, адмывання грошай завода, фабрыкі, калгаса. Не рабочыя гэта робяць — начальства. Да рэвалюцыі кралі, бралі хабар, але існавалі такія катэгорыі, як гонар і сумленне. І Бог. У каго цяпер гонар і сумленне? Вера ў Бога? Вера стала модай, як джынсы.

Разважанні сына падабаліся, супакойвалі — што датычыла яго працы. Але рэдка сын дазваляў сабе такую шчодрасць — ацаніць падзеі часу, працу пракуратуры. Больш маўчаў. І нявестка маўчала. Ва ўсякім разе, не было таго маленькага сямейнага калектыву, які існаваў пры маці. Тады як спаборнічалі — расказвалі адзін аднаму пра падзеі дня, ды і не толькі дня — жыцця краіны, свету.

Ігнат Андрэевіч вінаваціў сябе: не ўмее з'яднаць. Нават малую Светку не можа ўзяць пад сваё крыло. З ім яна шчабеча:

— Дзядуля, дзядулечка...

А з'яўляецца маці, бацька — і дзеду нуль увагі. Быццам і не існуе яго. Крыўдна рабілася. Толькі калі маці, стомленая, адмаўлялася чытаць ёй казкі, малая пераключала ўвагу на дзеда.

— Дзядулька, раскажы, як ты быў маленькі.

Усё, што было ў сапраўднасці, ён даўно расказаў — як пасвіў свіней, кароў, знаходзіў птушыныя гнёзды, лавіў рыбу; пачынаў расказваць, што чуў пра маленства іншых, а потым увогуле прыдумваў розныя фантастычныя, казачныя гісторыі. Здзіўляўся, што гэтыя гісторыі ўважліва слухала і дарослая выкладчыца. Сядзе збоку, прыкрые вейкамі вочы, быццам дрэмле, але відно: уважліва слухае. Пасля зразумеў прычыну яе цікавасці да яго фантастычных імправізацый: Паліна чытала курс фальклору,.і ёй важна было даць студэнтам тыя народныя легенды, паданні, якіх не было ў падручніку.

Размова, хоць пытанні задавала пераважна Света, Ігнату Андрэевічу падабалася; сама прысутнасць Паліны набліжала да той атмасферы сямейнай калектыўнасці, якую ўмела стварыць Ангеліна.

Але гэта былі кароткія прасветы. А наогул сын і нявестка мала давалі радасці, бо заставаліся па сутнасці безуважнымі да старога бацькі, да яго хвароб. Ён стараўся пераконваць сябе, што як сыты галоднага не разумеў, так і здаровы хворага.

Бясплатныя лекі ветэрану вайны Паліна атрымлівала — ездзіла ў аптэку. Але здаралася, што ён не мог з'ездзіць на прыём да ўрача і нешта трэба было купіць за грошы — які-небудзь звычайны аспірын. У такім разе прыходзілася прасіць некалькі разоў. Абяцалі і забываліся — за яго ж пенсію, а яна была вышэй за Палінін аклад, сын меў больш — дзяржаўны служачы. Адным словам, мелі сярэдні дастатак, дай Бог кожнай сям'і. А харчаваліся бедна: каўбаса, сыры на стале — рэдкасць, купляліся толькі для малой. А так — супы, кашы, бульба. Пад'есці можна... Але калі зніжаецца гемаглабін... Ды ўрэшце гемаглабін мала трывожыў: прымаў жалезістыя прэпараты. Але жалеза, малая фізічная актыўнасць, кашы — усё разам давала старэчую непрыемную хваробу, пра якую каму староннняму, акрамя ўрача, сорамна было казаць. А ўрачы талдычаць адно: не прывучайце арганізм да слабіцельнага, здарыцца, што не будзе яго — памраце. Трэба выкарыстоўваць усе сродкі — грубы харч, клізмы.

Ігнат Андрэевіч цішком папрасіў сына:

— Андруша, пастаў ты мне клізму.

У следчага акругліліся вочы, пэўна, ён палічыў, што такая працэдура прынізіла б яго гонар.

— Я не ўмею. Папрасі Паліну. У яе дыплом медсястры.

Ігнат Андрэевіч сцяўся. Не адразу знайшоў, што адказаць. Урэшце крыва пасміхнуўся:

— Ты не хочаш глянуць на бацькаву старую задніцу? Пасаромеўся б.

Не пасаромеўся. Выходзіць, мала яго хвалявала, ад чаго можа памерці бацька. А яму было зусім не ўсё роўна, ад чаго памрэ: адно — ад сардэчнага прыступу, зусім іншае — ад... запору.

Ігната Андрэевіча даўно ўжо не проста абурала — ашаламляла, што дзеці, некаторыя, спакойна чакаюць смерці бацькоў. Няўжо і Андрэй?! Сын не выяўляў асаблівай трывогі, калі хварэла маці, і яшчэ менш, здаецца, яго хвалюе магчымая блізкая смерць бацькі. Чаму? Па якіх законах прыроды, псіхалогіі, філасофіі? Ён жа, бацька, ледзьве не да жаніцьбы насіў яго на руках, і калі Андрэй моцна выцяў нагу, гуляючы ў футбол, ён узняў усіх прафесараў, у Маскву вазіў.

Што ж, можа, гэта і натуральна. Андрэй, напэўна, гэтак жа вазіў бы Свету, каб тая, не дай Божа, захварэла. А бацька... бацька сваё аджыў, час, як кажуць, і збірацца...

Розумам Ігнат Андрэевіч усведамляў логіку дзяцей і не злаваўся на іх — дай Бог ім шчасця. Але ўсё ж было крыўдна! І каб менш думаць ира сваю няўтульную старасць, ён аглушаў сябе снатворным. І падоўгу спаў. Ніколі не сніў дзяцей сваіх, вельмі рэдка нябожчыцу. жонку. Часцей — інстытут, калегаў, навуковыя дыскусіі, у якіх амаль заўсёды меў паражэнне, і прачынаўся потны, разбіты, з сардэчным болем. Дзіўныя сны. У жыцці ўсё было наадварот. Яму, дырэктару, акадэміку, глядзелі ў рот і згаджаліся з кожнай яго думкай, нават з той, з якой сам не згаджаўся і правяраў на слухачахГ Чаму ж сніцца ўсё наадварот? Яшчэ адна загадка чалавечага мозгу. Іх, напэўна, мільярды — загадак, як клетак у гэтым прыродным камп'ютэры.

...Перастаў гучаць «шэранькі козлік», змоўк Свецін голас: Паліна, шануючы свёкра, гаварыла амаль шэптам, але шэпт яе часам будзіў больш настойліва, чым дзіцячы голас. Усталявалася цішыня, толькі даносіўся няблізкі шум машын.

Стары застаўся адзін. Сто разоў загадваў сабе: выходзіць Паліна, вядзе Светку — спаўзай з ложка, не лянуйся. Не, не хапала сілы перамагчы слабасць, фізічную і псіхічную. Паводзіў сябе, як дзіця.

— Паляжу яшчэ хвілінку. Спаць не буду.

І засынаў. Так здаралася не аднойчы. Нячаста прыходзіла думка, якая ўзбуджала і адганяла сон. Не прыйшла і на гэты раз, наадварот,

падумалася, што ранішні сон — самы салодкі, што няма патрэбы надточваць дзень, які і так паўзе, як чарапаха. Калі прывядуць Свету, ён ажыве, вернецца да чалавечага жыцця, да радасці, няхай і маленькай! Без радасці, хоць якой, жыцця няма, ёсць існаванне, нават тады, калі галава пухне ад думак, самых высокіх — аб лесе чалавецтва. Без уласнай радасці, няхай і бытавой — пазабаўляцца з дзіцем — лес чалавецтва не грэе. Ды і не можа ён сёння грэць, бо аб лесе гэтым светлых думак не бывае — заўсёды чорныя. Так перавярнулася ўсё! Некалі ж ён верыў, што людзі, народы, прынамсі, яго вялікай Радзімы, прыйдуць да светлай будучыні — да камунізму. Усё развалена, спаганена. Дык чаму ж тут радавацца?

Ён, адукаваны чалавек, думаў, што робіцца не тое, ідзём не туды, але выйсця не бачыў. Пісаў у газеты, у Вярхоўны Савет пра тое, што найбольш балела, — пра сельскую гаспадарку, якой аддаў усё жыццё. Адмаўляў «рэфарматарскія» шляхі, стаяў за захаванне таго, што зроблена і прынята народам. Пісаў раней, калі ішлі палітычныя і эканамічныя баі. Цяпер не піша. Стаміўся. Ды і байцы стаміліся, утаймаваліся, многія пагадзіліся, што калектыўныя гаспадаркі чапаць нельга — будзем галадаць. І прэзідэнт думае так. Хоць і цяпер яшчэ, як з кратэра вулкана, выплёскваюцца думкі аб продажы зямлі. Атрутныя думкі! Пра гэтую атруту Ігнат Андрэевіч гады два назад апублікаваў вялікі артыкул. Было жаданне напісаць цэлую кнігу, але адчуў, што «пораху» не хопіць. Цяпер ухваляў уласную мудрасць: за апошні год адчуў, што сіл такі не хапіла б.

Але ў той дзень сасніў, што кніга выдадзена, бачыў яе ў белым каленкоравым пераплёце з дзіўнай назвай «Ідэі Льва Талстога аб зямлі». Хоць чаму з дзіўнай? У яго цэлы агульны сшытак спісаны выказваннямі вялікага мудраца пра зямлю і сялянства.

Прачнуўся, кал і промні залацістымі карункамі зіхацелі на выцвілых гардзінах. Ажно спалохаўся: сонца заглядвала ў яго акно толькі тады, калі добрыя людзі садзіліся абедаць.

З жахам падумаў:

— Колькі ж гэта я праспаў? Рэкорд паставіў. Трэба прасіцца ў Кнігу Гінеса.

Дастаў з-пад падушкі гадзіннік. Без акуляраў не адразу разгледзеў лічбы і стрэлкі. Без дзесяці гадзіна. Сапраўдны рэкорд.

І аднак не адразу падняўся. Не было сілы, каб падхапіцца, як маладому. Расціраў ацёклыя рукі, згінаў ногі — даваў нагрузку на хворыя суставы. Падняўся, сеў. Але канапа, якая раскладвалася, як раскладушка, нізкая. Узняцца з пасцелі на ногі яму не так проста: колькі разоў гайдануўся, як малы, набраў інерцыю і стаў на ногі.

Унучка, калі бачыла такі яго пад'ём, весела смяялася. А калі даваў знаць радыкуліт, клікаў сына, як той быў дома, ці нават нявестку, каб памаглі ўстаць. Але перад гэтым нацягваў спартыўныя шаравары: не паказвацца ж Паліне ў кальсонах. Жыла яшчэ мужчынская цнатлівасць.

Трохі пакрактаў, пакуль нацягнуў шкарпэткі. Але ўвогуле на нагах адчуў сябе чалавекам, вартым гэтага высокага звання. Не спяшаючыся пагаліўся, любіў гэтую працэдуру: добра намыліць шчокі, бараду і да сінявы выскрабці іх. Спрабаваў адпусціць бараду, але не спадабаўся сам сабе: вельмі ж неяк яна мяняла аблічча, як не той чалавек, хоць Андрэй і Паліна даказвалі, што барада яго ўпрыгожвае, бо «як у Хемінгуэя». Гэта здалося насмешкай. Што можа ўпрыгожыць у семдзесят сем гадоў?

Пасля ўмывання падаўся на кухню. Нявесела пасміхнуўся сам сабе: «Людзі абедаюць, а я снедаць буду».

Харчу не надаваў той увагі, як адзенню, быў усёядны, сялянскай закваскі: бульба са скваркамі — найлепшы ласунак. Аднак і старому есці хочацца. Але пасля смерці жонкі прысмакамі яго не песцілі; Паліна не любіла кухні і ўсё рабіла, як кажуць, на скорую руку. Ды і цэны на прадукты шалёныя, мяккая каўбаса вунь колькі каштуе. Аднак на гэты раз стала трохі крыўдна: на паліце — нічога, у халадзільніку — фасолевы суп. Нават масла не засталося. Ведаў: не знарок пакінулі такі сняданак — ад няўважлівасці, нядбайнасці, паленаваліся ўчора завінуцца ў магазін. На дзве зарплаты (у Андрэя яна немалая) плюс яго пенсія — можна яшчэ трымацца, як кажуць, на сярэднім ўзроўні. Добра, што ёсць кава і батон. Ён любіў каву, нягледзячы на папярэджанне дактароў — не злоўжываць. Не злоўжывае: курыць кінуў, піць кінуў. Што ж застаецца, каб даць хоць маленькае задавальненне? Бутэрброд з маслам і кубак кавы? Халестэрыну не баяўся. Ніхто не ведае, ад чаго памрэ, асабліва ў яго гады. У пяцьдзесят ён сачыў за дыетай, дакараў Ангеліну, што яна ні ў чым не абмяжоўвае ні сябе, ні сына. Праўда, над малой Светкай калацілася, лятала па ўсім горадзе, шукала лепшае дзіцячае харчаванне, якога не хапала...

Кава ўзбадзёрыла. Ігнат Андрэевіч сеў за стол дапісваць артыкул пра раянаванне выведзеных іхнім інстытутам гатункаў бульбы. Даўно даводзіў, што не ўсе гатункі любяць адну і тую ж зямлю: той, што добра расце на Браслаўшчыне, не вельмі любіць Палессе і наадварот. Ведаў, што яго доказы павісалі ў паветры нават у савецкія часы. А цяпер?.. Хто будзе чытаць ягоны артыкул і кіравацца ім?! Аднак

пісаў. Праца — сіла, якая трымала на свеце і адганяла адчуванне марнасці, непатрэбнасці жыцця. А жыць яшчэ хацелася!

Жыла ў Мінску дачка Ігната Андрэевіча ад першай жонкі — ад Марыны. Нялёгка складваліся яго адносіны з Тамарай, якой за пяцьдзесят ужо, сама хутка стане бабуляй. Але ён ставіў сабе ў заслугу, што яна, яшчэ калі была студэнткай, прызнала бацьку і пасля многія гады на ўсіх паваротах лесу не рвала сувязі, асабліва тады, калі жыццё і яе змусіла двойчы выйсці замуж. Ён не забываўся, як варожа сустрэла семнаццацігадовая дзяўчына бацьку ў студэнцкім інтэрнаце, дагэтуль вушы гарэлі і жыло адчуванне ўласнай віны. Віна яго была. Але ж ці такая ўжо недаравальная? Не быў ён марцовым катом, не лазіў па чужых пасцелях. Проста не адразу сцяміў, дзе сапраўднае каханне.

Добра панюхаўшы пораху і ў партызанскім атрадзе, куды падлеткам уцёк ад маці, і на фронце, у разведцы, паранены двойчы ў нагу і ў плячо, звольніўшыся з арміі, ён адразу паступіў у Горацкую сельгасакадэмію; да вайны, у школе, марыў пра гэтую навучальную ўстанову. Па заканчэнні акадэміі яго накіравалі ў сваю вобласць, але трапіў не ў родны раён — Хойніцкі, а ў калгас, блізкі да абласнога цэнтра. Калгас быў, безумоўна, слабы, ды патроху «станавіўся на ногі».

І малады аграном з апантанасцю ўзяўся за справу. Наладзіў севазварот, здабыў элітнае насенне, па-новаму арганізаваў працу калгаснікаў. Яму пашанцавала. Старшынёй быў Кузьма Іванавіч Варановіч, чалавек з малой адукацыяй, няпоўнай сярэдняй, але селянін у найлепшым сэнсе, гаспадар. Спачатку ён скептычна паставіўся да нязвыклай актыўнасці агранома, асабліва да яго вучонасці, да жадання вырошчваць хлеб і бульбу па навуцы. Але хутка ўбачыў, што старание Ігната, яго апантанасць, барацьба за парадак добра ўплываюць на людзей, прывіваюць ім веру, што ўсё можна зрабіць лепш, чым рабілася дагэтуль. І «бацька», як называлі Кузьму, палюбіў Ігната.

Ужо праз год мелі нядрэнныя вынікі, якімі Кузьма не пахваляўся перад начальствам; слава яму не патрэбна — быў бы хлеб. Аўтарытэт Ігнатаў асабліва падскочыў у вачах Кузьмы, інтэлігентных вяскоўцаў, калі ён надрукаваў у цэнтральнай газеце артыкул пра вопыт працы — не сваёй, перш-наперш старшынёвай, перадавых паляводаў. Кузьма, хоць і парадаваўся ўпотай, доўга крактаў, круціў галавой, стагнаў:

— Не трэба хваліцца, дарагі Ігнат Андрэевіч. Не трэба. Падвядзём мы сябе пад манастыр. Адзін год паспрыяў, а другі можа і засушыць. На нас пальцамі будуць паказваць.

Такое стаўленне старшыні трохі затармазіла журналісцкую працу агранома. Не, пісаць ён не кінуў, але больш — у цыратавы

партфель, зрэдку друкаваўся ў спецыяльных выданнях, якія не даходзілі да калгаса. Прысылалі яму экзэмпляр, і ён нікому не паказваў.

Па характары Ігнат быў чалавек кампанейскі, вясёлы. У гулянкі з выпіўкай не ўлазіў, але моладзі не цураўся. Не прапускаў вечарынкі, танцы. А хлопцаў яго ўзросту — колькі іх было ў той час! І дзяўчаты, асабліва тыя, да якіх набліжалася ганебнае і злое вызначэнне «векавухі», рвалі агранома на часткі, на танцах выхоплівалі адна ў адной з рук. Настаўніца Ніна Іванаўна стварыла ў школе драматычны гурток і запрасіла яго. Іх ужо бадай пажанілі. Але Ігнат любіў спевы, а таму перайшоў у іншы самадзейны калектыў пры калгасным клубе — у народны хор, якім кіравала настаўніца-пенсіянерка — з тых бабуль, якія ўсё ўмелі і неслі ў сяло культуру; такіх нямала было да вайны і чамусьці мала засталося. Пасляваенныя высокаадукаваныя выпускніцы інстытутаў таго не ўмелі, што ўмелі тыя, хто канчаў тэхнікум ці нават яшчэ рабфак. Не ўмелі ці не хацелі? Не мелі стымулу? Толькі трохі пазней, кал і пабагацелі і дзяржава праявіла ўвагу, народная творчасць на сяле пачала ажываць.

Сталы, разважлівы Кузьма, які ці крануў хоць адну жанчыну, акрамя жонкі (яго так і называлі — Правільны), быў прыкладам: сем'янін, чацвёра дзяцей, аднаго займеў, калі быў у партызанах; маглі вастраловы і пакпіць, але хлопец, вучань ужо, быў, як кажуць, выліты бацька — рыжы, кірпаносы, з характэрным прыжмурам вачэй. І быў у Кузьмы, акрамя спраў гаспадарскіх, яшчэ адзін вялікі клопат: ажаніць усіх хлопцаў, усіх удаўцоў. Са шкадаваннем, з болем казаў:

— Мала іх засталося, хлопцаў. Пабрала вайна. А нявест — вунь колькі! Ім раджаць трэба, папаўняць страты. А таму задача наша: аб'явіць вайну халасцякам, якія без карысці трацяць свае сілы.

Зводзіў маладых, спрыяў усяляк, як толькі заўважаў узаемныя сімпатыі. Сватаў. Ледзьве не на кожным вяселлі сватам быў.

Ігнатава з'яўленне не столькі парадавала Кузьму тым, што калгас набыў вучонага агранома, колькі тым, што набылі яшчэ аднаго хлопца, жаніха. І якога! Дай Бог кожнай жанчыне. І старшыня ці не з першага дня пачаў падбіраць аграному нявесту. Ігнату даводзіў:

— Сям'ёй табе трэба абзавесціся, Андрэевіч. Халасцяк — што гэта за чалавек? Пасвістаў — і нікому ніякай карысці. Жанаты — гэта чалавек! Тварэц! Аснова дзяржавы. Само жыццё — жонка, дзеці — вымушае яго працаваць з найбольшай аддачай.

Парадаваўся, што Ігнат кампанейскі хлопец, ніводнай гулянкі не мінае. Але і заклапаціўся: кожны вечар праводзіць новую дзяўчыну.

Дзве пабіліся ўжо з-за яго. Ці не ветрагон, скакун? Такога нялёгка ажаніць. Папярэдзіў па-бацькоўску:

— Ты аграном, трымай аўтарытэт. Ён у цябе павінен быць высокі.

— А чым я зніжаю яго? П'ю? Гуляю?

— Што не п'еш — за гэта медаль табе варта павесіць. А гуляць... Гуляеш. І гуляй на здароўе. Але не зацягвай халасцяцкае гулянне. Не кружы дзяўчатам галавы. А то яны табе цёмную зробяць. Выберы адну. І не цягні, не муч дзяўчыну. Чалавек тады чалавек, калі ў яго дзеці. Дзяржаве людзі трэба.

Пра сям'ю Ігнат сам думаў: узрост — дваццаць сем гадоў; у іх вёсцы да вайны такіх перастаркамі называлі; пасля пераж\ытага адчуваў сябе дзедам: партызанскія сцежкі, франтавыя дарогі, студэнцкі інтэрнат. І што? Адны танцулькі? Нідзе не сустрэлася тая, без якой не ўяўляў жыццё. А Кузьма мае рацыю са сваёй прымітыўнай паліт-граматай: сям'я — пярвічная ячэйка дзяржавы.

Марыну не адразу ўгледзеў, хоць разоў колькі танцаваў з ёй. Інакш, чым у вячэрнім змроку, убачыў яе на ферме, дзе яна рабіла даяркай. Белы халат, зялёная касынка, з-пад якой выбіваліся каштанавыя валасы. Вочы карыя, у іх як бы адбіваўся ўвесь свет і яе здзіўленне гэтым вялікім светам, рэдкія вяснушкі на мяккім, шырокім, што поўны месяц, твары, вусны — як нафарбаваныя, хоць не ведалі губной памады.

У адно імгненне Ігнат убачыў усё гэта пад яркім летнім сонцам. Нейкай прывабнай жаноцкасцю ўразіў і твар яе, і поўныя грудзі пад халатам, і стройныя ногі, падрапаныя ад укусаў камароў. Не разбурылі ўражанне і мазолістыя рукі, якімі яна брала свежаскошанае зялёнае жыта, каб занесці ў кароўнік.

Марына пахваліла агранома:

— Добра вы прыдумалі, Андрэевіч, — касіць жыта. Як адразу падняліся надоі!

— А якую атаку я вытрымаў, ведаеш?

Паспрачацца давялося і з Кузьмом, і са старымі членамі праўлення: ледзьве не памлелі дзяды ад прапановы скасіць участак маладога жыта, каб узняць надоі. Хто калі касіў жыта? А з чаго атрымаць малако? Канюшыну ў той год не сеялі, бо супраць яе пачалася кампанія.

У наступную суботу на пыльнай пляцоўцы каля школы Ігнат увесь вечар танцаваў з Марынай. Правёў дадому. На другі вечар пацалаваў.

Дзявочы хор загудзеў: аграном закахаўся ў Марыну. Дайшло да Кузьмы. Той ледзьве не падскочыў ад радасці і тут жа пайшоў у наступ:

— Падабаецца табе Парасчына Марына? — спытаў у Ігната.

— Падабаецца, — шчыра адказаў той.

— Дык, братачка ты мой, чаго ж цягнуць? Мы вам такое вяселле закацім! На ўвесь раён. Я тваім сватам буду.

— Так адразу?

— Адклад не ідзе ў лад. Не дваране ж мы, каб па году, па два цягнуць ад заручын да вяселля.

Пераканаў Кузьма Іванавіч, што адкладваць няма патрэбы. Ігнат напісаў маці, што жэніцца. Маці адразу ж прыехала.

Нявестка ёй спадабалася. І сваццця спадабалася: адзін мелі лес — вайна зрабіла іх удовамі.

Жылі дружна. Але нярэдка і сварыліся. З-за чаго? А невядома, чаму сварацца жонка і мужык. Марына была зусім не «мяккая». Узрыўная, што порах. Не саромелася часам і мацюком «пакрыць». У вогуле сяло было мацюклівае: дарослыя на гэта не звярталі ўвагі, быццам нельга было па-іншаму.

Ігната гэтае брыдкаслоўе ашаламляла. У яго вёсцы нічога падобнага не было. Мужчыны часам «загіналі» на працы, каля магазіна на падпітку, дома — хіба ў злосці. Ад жанчыны бадай ніколі не чуў, уявіць не мог, каб маці яго ці цётка Насця маглі гэтак «пасылаць» некага. Нават хлопцы-школьнікі рэдка калі «зрываліся ў памыйную яму». Ва ўсялякім разе, ён асабіста ніколі нікому не сказаў брыдкага слова, зрэдку хіба мог мацюкнуцца на шкадлівую карову, калі пасвіў, адбываючы сваю чаргу; дажыліся, што ніхто не хацеў ісці ў пастухі.

Прасіў Марыну:

— Калі ласка, не лайся. Ты ж жонка агранома. Мяне абражае твой лексікон.

— А што гэта?

— Набор слоў, якім карыстаецца чалавек.

— О, не чуў ты ўсяго майго набору, — весела смяялася Марына. — Але добра, не буду, калі ў цябе такія слабыя вушы. Дзе ты рос? На фронце ваяваў! Чысцюля!

Паабяцала — сціхала.

Перамянілася, калі нарадзіла дзіця, дзяўчынку, якую назвалі Тамарай. Пачала паводзіць сябе, як належыць жонцы агранома, можа, часам нават «пераігрывала», што таксама Ігнату не падабалася. Папрасілася перавесці яе з фермы на іншую працу — чыстую. Што ж,

лагічна. Але дзе ў калгасе чыстая праца? Ды Кузьма Іванавіч хутка знайшоў — зрабіў пасаду касіра, бо выкрыў, што ў бухгалтара, інваліда вайны, які вёў адзін усю бухгалтэрыю і па-старому называўся рахункаводам, нярэдка грошы «прыліпалі» да рук. Урэшце наладжваць бухгалтэрыю патрабавала жыццё: пераходзілі на грашовы разлік, адмаўляліся ад «палачак». Аднаго інваліда на такім участку стала мала, далі яму памочніка і касіра. Пасада ў канторы яшчэ больш змяніла Марынін характар. Аддалілася ад даярак, наблізілася да настаўніц. З'явіліся маладыя выпускніцы ВНУ, якія ўжо не раскідвалі гной і не гадавалі парасят і курэй, як тыя педагогі, што пераЖылі вайну і пасляваенны час, самі галодныя, вучылі галодных дзяцей.

Праз тры гады працы ў калгасе Ігната Андрэевіча забралі ў раён, у сельгасаддзел. Кватэру адразу не далі. Можна было наняць у каго пакойчык, але Марына не захацела ехаць ад маці да чужых. Хто дагледзіць Томку? Ды і за працу трымалася. Дадуць такую ў райцэнтры? А яна на завочнае ў тэхнікум паступіла.

Паўгода Ігнат з'яўляўся наездамі — у выхадныя дні ці кал і інспектаваў гэты або суседні калгас. Дарога недалёкая — дваццаць кіламетраў, але глухая, нячаста па ёй ходзяць машыны, здаралася, што і пехатой тупаў, каб абняць жонку, нацешыцца з малой дачкой. А Марына ўсё чакала абяцанай кватэры.

І здарылася... Для яго, лічыў, шчасце, хоць пераЖыў нямала, а для Марыны — бяда.

А пачалося... З анекдатычнага выпадку. У яго забалеў зуб. Пайшоў у паліклініку. Прыняла маладзенькая дантыстка — Ангеліна Сяргееўна.

Сустракаў яе на вуліцы, адзначаў: прыгожая ўрачыха. Але не больш таго. Гулякам, бабнікам не быў, ад пасяганняў на яго жанчын на застоллях ухіляўся, захоўваў вернасць Марыне. У райцэнтры не хадзіў на танцы — каб не дайшло да Марыны. Яна нярэдка прыязджала і па справе ў банк, і да яго; з жанчынамі фінаддзела, з банкаўскімі вяла знаёмства, падарункі прывозіла — вішні, яблыкі, мядок.

Ды і яго становішча служачага райвыканкама не дазваляла хадзіць на маладзёжныя гулянкі. Салідны чалавек, паважны, жанаты, з выгляду сталы мужчына. Але хто над людзьмі жартуе — Бог ці сатана? Хто зводзіць пары? Як узнікае ўзаемнае прыцягненне, якое называецца каханнем? Загадка прыроды. І ніхто не разгадаў, як загараецца гэты агонь. Ён дае радасць людзям, але нярэдка прыносіць бяду. Ды, пэўна, большая бяда ў тым, што нямала шлюбаў заключаецца без душэўнага агню, а толькі ад кароткага фізічнага прыцягнення.

Ангеліна, якая лячыла зуб, зрабіла балюча. Але, нягледзячы на боль, нейкі дзіўны, нязведаны за трыццаць гадоў ток працяў яго сэрца. Боль — другарадны, фізічны — урачыха хутка пагасіла. Але што не забылася — гэта дотык яе мяккіх рук, што пахлі лекамі, блізкае чыстае дыханне, блакітныя вочы, русыя валасы, што выбіваліся з-пад шапачкі, і ўвесь яе, здавалася, незямны воблік. Засталося гэта і тады, калі ён, развітаўшыся, выйшаў на вуліцу, і стаяла ўваччу ўвесь вечар, не давала заснуць. Заплюшчыць вочы, думае пра справы, пра Марыну, пра Томку, але ўсё і ўсіх засланяюць вочы і рукі Ангеліны.

Яна прызначыла яму з'явіцца праз два дні. Ён не вытрываў: пайшоў раніцою наступнага дня.

Дантыстка здзівілася:

— Баліць?

— Не, не баліць. Але гляньце, як там пломба. Мне здаецца, яна выпала.

Ангеліна раптам пачырванела і ад таго стала яшчэ больш прывабная, жаданая.

З душэўным трапятаннем сеў ён у крэсла. Ведаў, што часовая пломба на месцы. Але яна вычысціла цэмент, паклала новыя лекі.

Твар у твар, вочы ў вочы... Са шчок Ангеліны не сыходзіла чырвань. І мужчына адчуў яе ток, ён перадаваўся праз яе рукі, пальцы. Гэта нараджала неспазнанае пачуццё.

Зноў прыйсці праз два дні. Але зноў ён прыйшоў наступнай раніцою. І Ангеліна не здзівілася, толькі яшчэ больш запунсавелі яе шчокі.

Вылечыла зуб.

Ігнат спалохаўся, што знікла прычына наведвацца ў гэты кабінет. Што ж рабіць? Дзе сустрэцца? Прызначыць спатканне ўсё яшчэ не адважваўся: канешне ж, Ангеліна ведае, што ён жанаты. Адважыўся пацалаваць ёй руку — нібыта на развітанне. Яна спалохалася:

— Ой, што вы, Ігнат Андрэевіч!

Пажартаваў:

— Вазьміце мяне сваім асістэнтам. Сястры ў вас няма.

— А як жа ваша кукуруза? — ведала, што ён апякуе вопытны ўчастак кукурузы ў недалёкім саўгасе.

— Кукуруза вырасце.

— Пакажыце мне яе.

Ён задыхнуўся ад шчасця.

— Увечары. Я вазьму ў загадчыка «газік», і мы паедзем. Згодны?

— Толькі я выйду ў поле. Па пасёлку ехаць не будзем. А то ваша Марына мне косы павыдзірае.

Там, на кукурузным полі, яны ўпершыню пацалаваліся. Праўда, Ангеліна не адразу дазволіла. Спытала:

— А як жа Марына?

Ігнат цяжка ўздыхнуў:

— Не знаю. Не знаю, што робіцца са мной, як пакінуць Марыну... Не, з Марынай як-небудзь разбяруся. Томка! Але знаю адно: без цябе, мой анёл, жыць не магу. Словы са старога рамана. Але гэта праўда, Ліна. Гэта праўда. Памажы мне рашыць гэтую задачу.

— Як жа я магу памагчы? Рашай сам.

Не адразу Ігнат адважыўся сказаць Марыне, цягнуў: а можа, неяк само сабой наладзіцца, можа, астынуць яго пачуцці да Ангеліны, бывае ж так. Не, не астывалі — разгараліся. Сапраўды, дня пражыць не мог, каб не пабачыць сваю каханую. Ангеліна не падганяла яго, не патрабавала разрыву з Марынай. Аднак рабілася самотная, не цалавала прагна, як у пачатку сустрэч, потым цэлы месяц не прыходзіла на спатканні. Іх высачылі, па райцэнтры паляцела чутка, што аграном круціць раман з зубніхай. Дайшло да Марыны. І ў наступны прыезд яго ў сяло Марына сустрэла мужа, як кажуць, у штыкі:

— Ты што гэта вытвараеш там, мой родненькі? Каму ты зубы лечыш? Жонкі з цябе мала?

Адступаць не было куды. З маленства ён вызначаўся шчырасцю, хлусню лічыў найбольшай чалавечай заганай. Таму сказаў адкрыта, пры цешчы:

— Не гарачыся, Марына. Я пакахаў гэтую дзяўчыну. Не магу без яе жыць. І я прашу ў цябе развод. Томцы буду памагаць...

О, як яна ўзвіхрылася! Адразу выліла на яго цэбар лаянкі:

— Кабель! Будзь ты пракляты! Я пракляну цябе! Не будзе табе шчасця! А зубнісе тваёй зубы павыбіваю! — і сыпала, ліла самыя брудныя словы, не саромеючыся маці.

Крычала ў калысцы Томка.

— Крычы, крычы, дзіцятка! Няхай людзі пачуюць, як твой татка сіратой цябе робіць.

Схапіла малую, працягнула да бацькі.

— Плюнь на яго, Томачка, плюнь! Гэта будзе тваё пракляцце.

Але, калі ён павярнуўся і пайшоў да дзвярэй, бо адчуваў, што па-чалавечы з Марынай пагаварыць нельга, яна шыбнула дзіця на рукі бабулі, упала на кален!, схапіла яго за штаны, загаласіла, як па нябожчыку:

— Ігнацік! Родненькі, міленькі мой! Не пакідай мяне! Не пакідай! Пакінеш — павешуся. Я не магу жыць без цябе! На каго ты пакінеш Томачку? Яна прываражыла цябе, тая паненка, зеллем апаіла. Ачомайся, саколік мой. Я цябе да бабы Хадоські завяду.

Ад слоў такіх ён здрыгануўся, не здолеў пайсці з хаты. Нічога не паабяцаў, але скінуў шапку і ўзяў дачку на рукі, каб суцешыць. Гушкаў, цалаваў, шаптаў:

— Томачка, дзіцятка маё, супакойся, супакойся... Спалохала цябе мама. Не бойся, нічога не бойся.

Марына змоўкла, забрала ад яго малую, і тая адразу супакоілася. А разумная і хітрая цешча запрасіла яго паабедаць. І ён згадзіўся. Ён нават падумаў з прыкрасцю пра сябе: «Ну, вось і ўсё. Усё скончылася. Многа шуму з нічога. Хіба такому цямцю-лямцю, як я, рабіць рашучыя крокі?»

І больш за паўгода цягнулася няпэўнасць. Месяцы тры не сустракаўся з Ангелінай, але вельмі рэдка заставаўся начаваць і ў Марыны. Душэўна пакутаваў і ўсё больш пераконваўся, што без Ангеліны няма яму жыцця — таго жыцця, якое радавала б. А якое жыццё без радасці, у штодзённых пакутах?

«Невядома, як бы я пражыў з Марынай, а з Ангелінай амаль паўстагоддзя праляцела, што адзін міг, — часта думаў Ігнат Андрэевіч у бяссонныя ночы. — Але адляцела мая галубка ў паднябессе — і скончылася маё шчасце. Беспрытульны я стаў. Каму патрэбны? »

Адчуванне беспрытульнасці ў сваёй кватэры з сям'ёй сына гняло яго. Ніхто ж не крыўдзіць, унучка радуе, а душэўны спакой не вяртаецца. Можа, вінаватыя не толькі смерць жонкі, старасць, але і развал таго, за што ваяваў, што будаваў усё сваё доўгае жыццё. Нярэдка думаў: хутчэй бы прыйшла смерць. Але разам з тым хацелася жыць, хацелася ўбачыць, што будзе заўтра, ды і страшна было пакідаць дзяцей і ўнукаў адных, хоць адчуваў, што дзеці не баяцца застацца без яго. Такі закон жыцця? Дзе і якая ў яго радасць з дачок? Тамара вырасла без яго, бадай, настроеная супраць бацькі. Зося, любоў яго, як з'ехала з вайскоўцам на Далёк! Усход, дык шле скупыя пісьмы — адно ў паўгода; у другой дзяржаве жыве і... галадае там, як прызналася ў апошнім лісце.

Што ж трымае яго на гэтым свеце? Але ці лепшы той?

3

Пакуль працаваў у раёне, часта заглядваў праведаць дачку — заўсёды з адчуваннем віны.

Марына не пярэчыла яго сустрэчам з малой. Але калі ён прыязджаў, выходзіла з хаты, і маці яе выходзіла. Зусім малая, Томка плакала, і нацешыцца ёю не было калі: на крык прыходзіла бабуля і бесцырымонна забірала дзіця. Падрасла — сустракала ласкава, бо ён кожны раз прывозіў лялькі, цацкі, цукеркі, яна любіла іх. Але пыталася:

— Дзядзя, а вядзьмедзя прывёз?

— Я не дзядзя, я твой тата.

Не, пераканаць не мог: заставаўся дзядзькам.

Папракнуў Марыну:

— Чаму яна мяне дзядзем называв?

— Бо не знае, хто такі тата.

Што можна адказаць на гэта?

Калі пераехаў у Мінск, наведваўся вельмі рэдка. І Тамара — школьніца малодшых класаў — зноў ставілася да яго бадай варожа і ніяк не называла — ні татам, ні дзядзькам, ні Ігнатам Андрэевічам. Нават иадарункаў не прымала.

Хмурылася, адпіхвала прыгожыя сукенкі, кофтачкі, чаравікі.

— Не трэба мне!

Але практычная Марына ўсё забірала, не адмаўлялася ні ад рэчаў, ні ад грошай; аліменты высылаў сам, праз бухгалтэрыю не ішло, лічыў ганебным, каб супрацоўнікі інстытута ведалі, што дырэктар плаціць аліменты. Высылаў нават і тады, калі Тамары споўнілася васемнаццаць і яна стала студэнткай; баючыся, што ганарлівая студэнтка адмовіцца ўзяць з рук у рукі грошы, пасылаў іх Марыне. Так параіла Ангеліна.

Марына напісала аднойчы, калі дачка паступіла ў Інстытут народнай гаспадаркі. Ангеліна растлумачыла: не стрымалася, каб не паведаміць такую радасць, заадно даць пстрычку бацьку: як бачыш, і без тваёй дапамогі выходзіць дачка ў людзі. І яшчэ была прычына (таксама Ангеліціна здагадка): няхай ведае бацька, што дачка побач з ім, у адным горадзе.

Ангеліна параіла знайсці Тамару і запрасіць у госці.

Паехаў у інстытут, з рэктарам меў шапачнае знаёмства. Але мусіў расказачь яму сваю эпапею. Тамару ў спісе першакурснікаў знайшоў не адразу. Не было Выганавай. Няўжо Марына напісала са злосці, таму што дачка не паступіла. Але гартануў спіс далей:.ёсць Мятніцкая Тамара Ігнатаўна. Яго прозвішча! Не змяніла прозвішча Марына, афармляючы пасля разводу дакументы. Ігната Андрэевіча ажно ў жар кінула, дзіўныя эмоцыі апанавалі: і радасць, удзячнасць былой жонцы, і страх — ад адчування, што ў такім разе ўзрастае яго адказнасць за дзяўчо. З пачуццём сораму — нішто сабе бацька,

прозвішча дачкі не ведаў! — мусіў тлумачыць рэктару Марынін характар. Той выклікаў з лекцыі Тамару. Яна з'явілася бледная ад страху: спалохалася, што так нечакана выклікаў сам рэктар.

Ігнат Андрэевіч сцяўся, бы чакаючы ўдару. Рэктар зрабіў злую праверку — як следчы на вочнай стаўцы спытаў у Тамары:

— Ведаеце вы гэтага чалавека?

Тамара, зразумеўшы, чаго яе паклікалі, пасміхнулася бадай гарэзліва.

— Як жа не ведаць, Павел Іванавіч! Гэта мой бацька. Праўда, гадоў пяць я не бачыла яго. Чаму, думаю, ён вам расказаў.

— Ну, я на паўгадзінкі адлучуся, а вы пагутарце тут як дачка з бацькам. Калі пяць гадоў не бачыліся...

Размова не атрымалася. Калі рэктар выйшаў і яны засталіся сам-насам, Тамара сцялася, ды і ён, бацька, не ведаў, пра што гаварыць.

— Ну як, Тома, ты тут?

— Добра.

— Магла б у час экзаменаў заехаць да нас.

— Магла б. Але няпрошаны госць...

— Хіба ты госць? Ты член сям'і.

Яна здзівілася:

— Вашай?

— Прыходзь. Пазнаёмішся з братам і сястрой. Андрэй усяго на два гады маладзейшы за цябе, у дзевяты перайшоў. А Зося ў чацвёртым. Яны добрыя...

— Як бацька.

Ён сцяўся ад гэтага вызначэння якасцей яго і дзяцей: шчыра яна сказала ці з іроніяй? Калі пабрала ўсё ад сваёй вострай на язык маці, то сказала яна гэта яўна з сарказмам... І пакрыўдзіцца нельга: людзі, што валодаюць гумарам, іроніяй — разумныя людзі.

Сама Тамара да іх не з'явілася. Ігнат Андрэевіч, зноў жа па патрабаванні Ангеліны, пайшоў у інтэрнат і прывёў яе на свой дзень нараджэння: сорак пяць стукнула, і ён быў выбраны акадэмікам. Віншуючы, Тамара ўпершыню пацалавала бацьку ў шчаку. Але пасля не з'яўлялася да пачатку новага навучальнага года: з летніх канікулаў прывезла Мятніцкім яблыкаў са свайго саду, з таго, які садзіў яшчэ малады аграном.

Тамара позна выйшла замуж, прарабіўшы гадоў пяць эканамістам на заводзе.

На вяселле запрасіць не прыйшла — прыслала паштоўку са зваротам: «Паважаныя Ангеліна Сяргееўна, Ігнат Андрэевіч...» Ангеліна тут жа пачала разважаць, які купіць падарунак.

— Ты пойдзеш?

— А як жа інакш!

Ігната расчуліла жончына салідарнасць. Але ён нагадаў:

— Там можа быць Марына.

— Абавязкова будзе. І што? У нас дзеці выраслі.

Спрачаліся, які купіць падарунак. Ігнат хацеў дарагую вазу. Ангеліна высмеяла інтэлігенцкую завядзёнку. Халадзільнік ці пральную машыну.

— А калі яны ёсць у жаніха? Слесар — ён багацей за дырэктара інстытута.

— Тады швейную машыну. Тамара яшчэ ў школе, ты казаў, шыла. Калі кінула, няхай успомніць. Вельмі патрэбнае ўменне для будучай маці.

Безумоўна, Марына была на вяселлі, але не госцяй — гаспадыняй. Кіравала кухняй, хоць вяселле было ў сталоўцы, сачыла за парадкам на сталах.

Ігнату хацелася пагутарыць з ёй. Але дзе яны маглі застацца самнасам? Павіталіся на хаду.

— Як жывеш, таварыш акадэмік?

— Жыву.

— А гаворыш без радасць Цяжка быць акадэмікам? А я шкадую, што не стала акадэміхай. Так хацелася! Як ведала, што ты высока ўзляціш.

Засмяялася весела, гарэзліва, як дзяўчына. Ангеліна стаяла блізка і на смех яе навастрыла вушы. Ангеліна раўнівая. Ігнат баяўся гэтай дзіўнай рэўнасці: ніколі не выказвала яе словамі, ніколі не сварылася, ніводнага слова папроку, але магла па колькі дзён не размаўляць, два-тры словы за сталом — і ўвесь кантакт! Спаць клалася асобна, у агульным пакоі на канапе. Маўклівасць яе выбівала са звыклага рытму і — бачыў ён — не лепшым чынам уплывала на Зосю і Андрэя; рэдкая з'ява: можа, па гэтай прычыне дзеці больш гарнуліся да бацькі, можа, таму, што маці была залішне правільная. Ужо стаўшы студэнтам, Андрэй сказаў аднойчы:

— Ты, мама, кніжная.

Ангеліна пакрыўдзілася. Ігнат даў сыну пстрычку, хоць згадзіўся з ім: трапнае выказванне; ён, муж, за многа гадоў не знайшоў такога эпітэта, простага і ёмкага. А чаму яна такая? Зрабілася «акадэміхай»? Пра гэта ён падумаў на вяселлі, і жаданне пагаварыць з Марынай узмацнілася. Але пра што гаварыць? У Марыны яўна няма такога жадання, інакш знайшла б тэму не для падпольнай гаворкі — агульнай размовы, у вясельнай бяседзе.

Ігнат з сумным гумарам падумаў, што Марына з рэўнасці не маўчала б, а «пакрыла б» благавернага гарачай сялянскай лексікай, нягледзячы на яго званні і рэгаліі.

Пасля вяселля бацька і дачка, жывучы ў адным горадзе, не бачыліся гадамі. На свае юбілеі Ігнат Андрэевіч запрашаў Тамару — на 50-годдзе адну, а на 60-годдзе — з вясёлым мужам яе, выпівохам і танцорам. А юбілеі як даганялі адзін аднаго. На самы сумны з іх і, лічыў, апошні, на 75-годдзе нельга было не запрасіць і Паўла-малодшага, і пятнаццацігадовую Насцю.

Праўда, пра юбілей гэты ўспомніў інстытут. Наладзіў ў зале ўрачыстае пасяджэнне. Хто праявіў такую ініцыятыву — не змог здагадацца. Але было прыемна: прыгадалі яго працу добрымі словамі. Пасля, праўда, забылі — ніводнага званка з інстытута. Заходзіў разы два — не знайшоў з кім пагаварыць: усе новыя і ўсе лічаць сябе супервучонымі. У бібліятэцы яго кнігі на першай паліцы. Аіе ці карыстаюцца імі? У дысертацыях, якія зрэдку давалі яму на рэцэнзію, ён вычытваў цэлыя старонкі свайго тэксту без спасылак на аўтара. Ён не пратэставаў — даўняя практыка: цытавалі карыфеяў, з радавых проста спісвалі. Аднойчы ён напісаў на полі адной старонкі «Мятніцкі» — і дысертант перастаў з ім вітацца.

Але ўсё гэта было ў першыя гады пенсіянерства. Цяпер яго выкінулі, напэўна, і са спісу рэцэнзентаў, год не прысылалі ніводнага рукапісу. Крыўдна было. Аднак прасіць не стаў. Можа, і таму яшчэ, што страціў веру ў акадэмічную навуку, якой аддаў усё жыццё. А быў жа час, калі за яго гатункамі бульбы і буракоў з доследнага поля запісваліся ў чаргу блізкія і далёкія калгасы і саўгасы, з Украіны і Расіі прыязджалі. Гэтым можна было ганарыцца: марна праца не гінула — ні яго, ні калектыву, які ён узначальваў.

Відаць, бяда не ў яго старасці, а ў тым, што ад калектыву таго засталася хіба адна назва. Нішто не ідзе на паляпшэнне.

Жаданні ў Ігната Андрэевіча ўзнікалі заўсёды нечакана. У плыні думак, настрояў, пачуццяў выплывала адно, не самае важнае, але такое, што хацелася здзейсніць хутчэй, не адкладваючы. Ведаў: адклад не ідзе на лад. Заўтра запалоняць іншыя жаданні, няхай і нерэальныя, невыканальныя, але яны ўсё роўна пацяснуць сённяшнія, такія простыя для ажыццяўлення.

Успомніў Тамару, яе дзяцей, сваіх унукаў і дакараў сябе, што не бачыў іх, можа, паўгода. Сама старасць — нерухомае балота, час не ляціць, як у маладосці, але як бы робіць касмічныя рыўкі і тым хутчэй набліжае «бегуна» да фінішу. Ляціш у бязважкасці.

З маладым спрытам ускочыў у аўтобус, праз колькі прыпынкаў перасеў у тралейбус. Ліфт, як часта бывае ў гэтым далёкім раёне, не працаваў, што сапсавала настрой. Ці вытрымае яго пасляінфарктнае сэрца сем паверхаў? Адпачываў на кожнай пляцоўцы. Адчуў сябе героем перад знаёмымі дзвярыма — амаль без задышкі! «даскакаў заяц». Захваляваўся перад тым, як націснуць кнопку званка. Адчыніў яму Павел, Тамарын муж. Яго старылі глыбокія залысіны, але маладзілі вочы, напоўненыя іскрамі смяшынак. І цела было маладое, мускулы ажно пружынілі — ён сустрэў госця ў ружовай майцы. Крыкнуў гучна, весела:

— Глядзіце! Хто да нас прыйшоў! Які госць!

Выглянула з кухні ружовашчокая Тамара. Сказала проста, быццам бачыліся раніцай:

— Праходзь, бацька. Да вячэры паспеў.

Хацеў сказаць, што есці не хоча, але гэта была б няпраўда. Есці ён хацеў, тым больш, што з кухні смачна пахла смажаным мясам. Такога вось свежасмажанага мяса не еў ён даўно. Яго кармілі каўбасой, якая выклікала ўсмешку, бо заўсёды прыгадваўся дачны кот, які грэбліва адварочваўся ад такога пачастунку. Тады ўсе рагаталі:

— Во, зараза! Людзі лопаюць, а ён чмыхае. Зажраўся.

Вылецела трохі запознена, пэўна пераапранала сукенку, Насця.

— А-а, дзед! Добры вечар, дзядуля.

— Добры вечар, унучка. Чаму не заглядваеш?

Збянтэжылася, бо не ведала прычыны — чаму?

Ігнат Андрэевіч любаваўся ёю. Яна змянілася за час, пакуль не бачыў. Выцягнулася. Аформілася ў дзяўчыну. Толькі з твару бледная, не такая, як бацька і маці, быццам не з адной кухні харчуюцца.

— Як твае поспехі, Насця?

— Цягну.

— Апошні клас, — нагадаў Павел.

— Гэта я памятаю, што выпускніца. Ляціць час.

— Ляціць, Ігнат Андрэевіч, ляціць. Во і я ўжо лысею, — правёў рукамі па залысінах.

— Чым ты хвалішся, тата? — скрывіла вусны Насця. — Да таго ж, не палысееў яшчэ.

— Хутка, дачка, галава мая будзе, што бубен, — весела засмяяўся. — Во музыку наладзім.

— А Паўла-малодшага няма?

— Дома. Вынаходніцтвам займаецца.

— Ён ужо два патэнты мае, — з гонарам за брата сказала Насця.

Павел рабіў на тым жа заводзе, што і бацька, майстрам-наладчыкам пасля тэхнікума.

На Тамарыным юбілеі Павел Іванавіч скардзіўся, што пасля арміі сын не пайшоў у палітэхнічную акадэмію.

— А талент, далібог, талент. Такое можа скляпаць, што ахнеш. Чэрціць дзень і ноч. Вынаходцам стаў. А вучыцца завочна. Жылісты. Не ў бацьку. У дзеда пайшоў. Акадэмікам стане. Не інакш. Я і задачу яму паставіў: раўняйся на дзеда.

Ігнату Андрэевічу хацелася сказаць, што не трэба раўняцца на яго, бо і ў акадэміка шчасця нямнога. Але ::іба моз::на сказаць такое? Выдаць сваё бязрадаснае жыццё?

Паскардзіцца можна калегам, што самі ў такім жа становішчы, а сваім ні ў якім разе. Перад імі трымай хвост трубой. Але словы пра ўнука нагадалі сына, і ён, бадай упершыню, параўнаў іх прафесіі — следчага і наладчыка станкоў, вынаходцу. Хто больш патрэбны грамадству? Абодва патрэбныя. Аднак чамусьці захацелася, каб Андрэй быў слесарам, а жонка яго простай жанчынай, ласкавай, сардэчнай, добрай гаспадыняй.

Ён, Павел Ігнатавіч і Насця ўсё яшчэ стаялі ў вузкім калідорчыку. А Тамара завіхалася на кухні. Яна гукнула мужу і дачцэ:

— Вядзіце ж дзеда ў сталовую.

Выйшаў з пакоя Павел-малодшы, без слоў пацiснуў дзеду руку.

— Голас у вас змяніўся. Я не адразу пазнаў.

— Пагрубеў? Патанчэў?

— Ды як вам сказаць? Каб Зыкінай, то я сказаў бы: памаладзеў.

Насця засмяялася. І Тамара з кухні падала голас:

— Адзыкаў дзед сваё.

— Не жартуйце. У старых, сапраўды, голас мае цікавую адметнасць: у адных садзіцца да хрыпласці, у другіх — танчэе так, што боязна робіцца: не парваўся б. Запытаю ў музыкаў, як гэтая з'ява называецца.

— Старасцю гэта называецца, мой дарагі ўнук.

— Дык і старасць жа розная. Я недзе чытаў, што найбольш цяжкі перыяд у жыцці чалавека — сярэдні век. Ёсць усходні анекдот: спачатку чалавек — салавей, потым — асёл, працуе, як ён, потым — сабака, сцеражэ багацце, а потым, калі старэе... Насця, кім робіцца? -

— Не помню я тваіх анекдотаў. Можа, пастухом, унукаў пасе?

— А што! Ты ганаровы занятак прыдумала старым.

— Толькі каго пасвіць? Дзяцей бабы не хочуць нараджаць, — сур'ёзна сказаў Павел Іванавіч.

— А чаму бабы? — абурылася Насця.

— Не жанчыны вінаватыя — жыццё, — сказаў Ігнат Андрэевіч са смуткам.

— І мужчыны! Вунь нашага Паўліка ўжо чэрці не ажэняць, — засмяялася Насця. — Сем нявест меў...

— Не кляні, Насцюха. Як толькі цябе аддамо замуж, я тут жа ажанюся.

— Філосафы! Накрывайце стол! — гукнула з кухні гаспадыня. — Дранікі гатовыя!

Ах, вось што так смачна пахне: дранікі на сале! Лепшы ласунак маленства.

Калі Ігнат Андрэевіч увайшоў у самы прасторны пакой цеснай трохпакаёўкі, стол быў ужо накрыты.

Павел Іванавіч зморшчыўся, гукнуў жонцы:

— Тамара! Перасохнуць твае бліны. Чым размачыць? Такі госць — і ўсухамятку!

— Ведаеш ты, дзе размочка.

— Во так і сказала б. А то цямніш, палохаеш гасцей. Насця, чаркі!

Сам выйшаў у суседні пакой і прынёс пузаты ёмісты графін цёмна-карычневай настойкі.

Чаркі імгненна апынуліся на стале.

— Каму даручым разліваць? Хто найлепшы віначэрпій?

— Разалью я, — сказала Тамара, скідваючы фартух і надзяваючы кофтачку. — Я усім знаю норму.

— Ну, першы тост за бацьку. Каб жыў да ста гадоў!

— Навошта? — пасміхнуўся Ігнат. — Каму гэта патрэбна? У няпоўныя восемдзесят няма куды падацца, — і скалануўся: «Навошта такое прызнанне? Як крыўда на Андрэя, на Паліну. А гэта несправядліва».

— Прыходзь да нас, дзядуля, — запрасіла Насця. — Мы будзем весяліць цябе.

— Дзякуй, унучка.

Астатнія яе не падтрымалі — ні Тамара, ні Павелстарэйшы, ні Павел-малодшы. Госць адзначыў іх маўклівую далікатнасць і прапанаваў сустрэчны тост:

— Я вып'ю за вас. За маладых...

— Гэткая маладая? — скрывілася Тамара.

— Не згінайся, бабуля, у пяцьдзесят! — весела запярэчыў ёй муж. — Тады будзеш стагнаць, калі дажывеш да дзедавых гадоў. Хоць і ў бацькі твайго... Што за гады? Дзве сямёркі! Драбяза.

— Гэта праўда. Але сямёркі пікавыя. Чорныя.

— Піце. А то доўга будзеце высвятляць, у каго якія сямёркі, — сказала гаспадыня і першая да дна перакінула сваю чарку.

Пітво смачнае — салодка-горкае, водарнае, на нейкіх ягадах і травах настоенае.

Ігнат даўно не ўжываў алкаголю, і ў яго адразу весела зашумела ў галаве, і прыйшло замілаванне да ўсіх гэтых блізкіх людзей і горкі папрок сабе, што так рэдка наведвае іх. Хацеў перад імі асудзіць сябе і паабяцаць, што будзе прыходзіць. Але і пад чаркай не губляў рэальнасці. Яму хочацца быць у вясёлай сям'і. А ці ўсе тут будуць радавацца яго прыходам? Людзі могуць быць занятыя справамі ці быць не ў настроі. Нават малая Насця. У яе гады не дзед прадмет цікавасці.

— Еш, бацька, еш, — ласкава, па-хатняму, запрашала дачка.

І ён еў апетытна і многа, бо даўно ўжо не меў такой вячэры, бадай, з прыёму ў мітрапаліта... Ды там прысмакі рэстаранныя, а тут усё хатняе: капуста, якая і да вясны трымае сваю свежасць, марынаваныя рыжыкі, сала, паўпатэльні луку і — галоўнае — дранікі.

Падумаў з крыўдай пра нявестку: «Няўжо Паліна не можа спячы такія дранікі? — і вырашыў: — З'езджу на

рынак, куплю сала. Спяку сам. І пачастую сваіх інтэлігентаў».

Не помніў, у якім кантэксце размовы сказаў, быццам пахваліўся:

— А мая нявестка сем моў ведае. Ды навошта, думаю я?

— Як навошта? О, каб я ведаў столькі моў, то гроб бы грошы лапатай. І не якія-небудзь — зялёныя, — сказаў Павел-малодшы. — Я адну ведаю, англійскую, і то магу адхапіць «халтурку». Мовы ў наш час — багацце.

— І разарэнне, — сказала Тамара.

Павел-малодшы і Насця спрабавалі даказаць перавагу рыначнай эканомікі. Дзіўна, што тут аспрэчыла іх маці і даволі пераканаўча. Дзед адчуваў няёмкасць — зноў двое старых б'юць маладых, падводзячы тэарэтычны і практычны падмурак. Павел-бацька не лез ў іх спрэчкі. Але не ўсе ведалі, што вопыт майстраналадчыка дапамог бы яму і аспрэчыць, і падтрымаць любую эканамічную думку, прычым зрабіць ён гэта мог бы проста і доказна — у залежнасці ад таго, што патрэбна было ў той ці іншы момант, якога апанента трэба было спляжыць. На заводзе супраць вучоных-лектараў выпускалі яго, тэхніка-наладчыка, — і нярэдка тэарэтыкі «скісалі» перад практыкам. Больш шчырыя прызнавалі, што тэорыя адстае ад жыцця, абяцалі разабрацца. Дома свае «рэбусы» расказваў хіба сыну. Жонкі баяўся: яна магла паслаць далёка. Бацьку яе шкадаваў: старога склеротыка заблытаць можна лёгка. Але негасцінна гэта: выйдзе, што б'е

ляжачага. Няхай дыскутуе з Насцяй. Аднолькавы ўзровень. Дачцэ сказаў:

— А ты смелая, Насцюха, з акадэмікам не баішся спрачацца. Я баюся.

Насця адказала дзіўна:

— А ён — мой дзед. А табе — акадэмік.

Выходзіць, са сваім, нават дзедам, можна спрачацца смела, а з чужым нельга.

Расслаблены смачнай вячэрай, Ігнат Андрэевіч страціў цікавасць да тых глабальных праблем, якія навязлі ў зубах. Адключыўшыся ад застольнай спрэчкі, ён думаў пра свой лёс. Яму раптам стала крыўдна — ці ў першы раз! Чаму дома ніколі не бывае такой гутаркі з высокаадукаванымі сынам і нявесткай? З малой Светкай размовы больш змястоўныя і цікавыя. Ці ён сам здзяцінеў? Чаму ўрэшце Паліна не накорміць яго такім вось абедам ці вячэрай? Бываюць святочныя абеды ці вячэры з гасцямі. Але задавальнення яны не прыносяць — усё дарагое, казённае, з магазіна: нямецкая каўбаса, нарвежскі селядзец.

Хутка і спрытна Тамара і Насця прыбралі са стала. Ігнату Андрэевічу не хацелася яшчэ ісці з утульнай сям'і.

Павел-сын раптам прапанаваў:

— Мы вас правядзём да тралейбуса. Правядзём, Насцёха?

— Ага, — без імпэту згадзілася сястра.

Ігнат Андрэевіч адгадаў думкі ўнука: баіцца, каб я не засядзеўся. А яму сапраўды хацелася пасядзець тут, пагутарыць, тэму з гэтымі людзьмі знайшоў бы любую, цікавую і для іх, і для сябе. Але тралейбус — вельмі празрысты намёк. Гоняць яго адгэтуль. Ён не быў чалавекам недаверлівым, крыўдлівым, але за сэрца шкрабанула: «Ведай, дзед, свой час».

Было позна, і Тамара, сапраўды, магла заснуць. Але тое, што дачка не выйшла развітацца, правесці да дзвярэй, таксама шкрабанула.

Ішоў па цемнаватай пустой вуліцы і ўзважваў вынік свайго гасцявання: чаго больш? Безумоўна, прыемнасці: размовы з Тамарай і яе мужам, з унукамі — усё гэта дало задавальненне, якога ён, стары, не меў даўно. Але «тралейбус» пад заслону... Не, унук не пакрыўдзіў: якая крыўда можа быць на шчырасць? Ен проста нагадаў пра яго становішча, што дзесьці ў цэнтры горада з-за яго будуць хвалявацца. Тамара яшчэ да таго, як пайшла спаць, прапанавала яму пазваніць дадому. І дачка, і муж яе, не жадаючы таго, нагадалі пра адзіноту ва ўласнай кватэры.

Доўга хадзіў па сваей начной вуліцы. Адзінота, калі застаешся сам-насам. Страшней, калі сярод людзей адчуваеш сябе непатрэбным, асабліва сваім блізкім.

Можа, і пазней хадзіў бы, ды сустрэлася путана, бачыў ужо яе не аднойчы. Зазірнула ў твар, бліснула яшчэ маладымі вачамі.

— Дзед, можаш яшчэ?

— Што?

— Ты не знаеш што?

— Што ты, мілая, не-не, — адказаў ён.

Яна засмяялася.

— Мне шкада цябе, дзед.

— А мне шкада цябе, унучка. Не тую дарогу ты выбрала.

— Ды ну вас!.. Маралісты. Такімі вы нас зрабілі, — павярнулася і пайшла па вуліцы.

А Ігнат Андрэевіч яшчэ нейкі час стаяў на месцы, глядзеў ёй услед: тонкі дзявочы стан, чырвоная шапачка, чорныя калготкі і шэрая кофтачка.

Яму сапраўды стала шкада яе. Страчаная душа, якая, акрамя плоцкага збліжэння, не будзе ведаць ніякіх іншых чалавечых адчуванняў, ніякага кахання. Чалавек ператвараецца ў жывёліну.

Вось яны, адзнакі «новага парадку», «свабоднага жыцця». Такія сцэны, нават у кнігах, у кіно заўсёды псавалі яму настрой, нагняталі страх за дзяцей, за будучыню чалавецтва. Пры самых высокіх тэхналогіях чалавецтва спаўзае ў першабытнасць, траціць заваёвы высокай маралі. Не ўсё было добра раней, але ж з такой брыдотай, пачварнасцю, брудам сутыкаліся меней.

4

Ігнат Андрэевіч сказаў сыну і нявестцы, што хоча наведаць брата. Брат яго Ціхан жыў у Гомелі.

— Чалавеку за восемдзесят перавaліла...

— Але ён яшчэ дзябёлы дзядок, — сказала Паліна.

— Дзябёлы, бо ўсё жыццё сталярыў, смалою набрыняў. І цяпер табурэткі робіць, і іх бяруць. Падатковая інспекцыя аштрафавала. Большага глупства не прыдумаеш: пенсіянер, ветэран робіць у тыдзень адну табурэтку, выносіць на кірмаш — плаці падатак, ты ўжо бізнесмен. Гэта вы такія законы складаеце, юрысты?

Андрэй засмяяўся:

— Ты яўна антызаконнік, бацька. А быў жа законнікам.

— Быў, калі парадак быў.

— Гэта так. Кожны закон павінен грунтавацца на чалавечай маралі. Фірма мэблі — гэта адно. Адзінокі пенсіянер, які робіць тры табурэткі за месяц, — зусім іншае. Да ўсяго патрэбны індывідуальны падыход. Падатковых інспектараў безліч, а праверыць, што за станКі стаяць у Ціхана Мятніцкага, нікому ў галаву не прыходзіць. Напэўна, рубанак, разец, малаток... Бачыў яго фірму. Усё на кухні. Магутны чалавек дзядзька Ціхан.

Ігнату спадабалася, што сын такой думкі пра дзядзьку, і ён нагадаў, што Ціхан яшчэ і «Спіноза», мудрэц і жыцця люб.

— Я не такі.

— Не трэба стагнаць, бацька, — сказала Паліна.

— Я не стагну. Чула ты ад мяне? Можаш назваць старым занудам?

— Не, не чула. Але ў тым і бяда, што вы стогнеце не перад намі. Перад сабой.

— Як ты магла пачуць мой стогн перад самім сабой? Гэта — штось з падсвядомасці.

— А яна — шаманка, у яе маці чарадзейка.

— Ну, ты выдумаеш! Мая маці праваслаўная, ніводнага богаслужэння не прапускае.

Успамін пра старога сталяра даў тэму на ўсю вячэру — пра філасофію жыцця. Нават Светка выказвала свае дзіцячыя фантазіі, і часта зусім не прымітыўныя.

«Вось так бы кожны вечар. А то сядзім, як сычы», — падумаў Ігнат. А ўначы прыйшла нядобрая думка: «Гэта яны таму такія ўзбуджаныя і вясёлыя, што я ад'язджаю, без мяне ім лепш».

Адганяў яе, думку гэтую, але яна назойліва вярталася і вяла за сабой тыя, якія прыходзілі ўжо не аднойчы — пра свой фінал. Не, не смерць страшыла і наганяла жалобу да слёз. Самае цяжкае было ўсведамляць, што нехта з блізкіх сапраўды думае, што без яго ім жылося б... не шчаслівей, не, на гэта наўрад хто спадзяецца ў такім... даруй мне, Госпадзі... у такім бардаку. Але, можа, спакайней, без клопатаў, без гарчычнікаў і клізмаў.

Здзівіўся: позна заснуў — рана прачнуўся. Як тольКі Паліна першы раз бразнула на кухні каструляй.

Поезд адыходзіў у дзевяць раніцы.

У купэ ўвайшоў сусед, адзін, перад самым адыходам поезда. Не павітаўся. Ігнат Андрэевіч павітаўся першы. Пасажыр прыветліва адказаў.

Сеў, падняў каўнер плашча, хоць ў вагоне было даволі цёпла, і літаральна праз пяць хвілін, як састаў крануўся, смачна захроп.

Ігнат пазайздросціў яму і загадаў сабе ўзяць з суседа прыклад.

Прываліўся ў куток каля дзвярэй, павесіўшы на кручок партфель, у якім былі разцы для Ціхана і канадскае насенне гародніны; няхай брат пасее — у каго лепш вырасце.

Прачнуўся ад галасоў у тамбуры. Поезд стаяў.

Сусед глядзеў на яго вясёлымі вачыма.

— Аднак моцныя вы на сон. Я з паўгадзіны пакімарыў, а вы ад Асіповіч да Жлобіна.

— Хіба ўжо Жлобін?

— Не чуеце гармідар на пероне? Плюшавыя лялькі прадаюць.

У купэ ўвайшла пажылая жанчына з вялікім мяккім клункам. Хораша ўсміхнулася. Усмешка гэтая чымсьці нагадала Ігнату ўсмешку Марыны, яго першай жонкі. Тую, даўнюю, на Тамарыным вяселлі. Але калі тое было? Павел у арміі адслужыў. Ці жывая яна, яго першае каханне? Жывая. Пра смерць Тамара ці дзеці яе паведамілі б. Якая ж яна цяпер? Бяззубая бабуля? І дзіўна — у яго моцна забілася сэрца. Быццам ён ехаў на сустрэчу з чалавекам, якога не бачыў чвэрць стагоддзя. Ды не, не з ёй. І не з «вясельнай» маці. А з той Марынай, якую кахаў, якая была яго жонкай паўстагоддзя назад, вясёлай, шумнай.

Заплюшчыў вочы, але прывід Марыны не адступаў. І не адзін. Ён бачыў тры Марыны: маладую даярку ў белым халаце, сівую заклапочаную гаспадыню на вяселлі дачкі. І — як у тумане — сённяшнюю, без выразнага аблічча. Адна старэчая постаць.

«А чаму б мне не наведаць яе? — з'явілася нечаканая думка. — Не чужыя ж. Дачка ў нас. Міма ж буду праязджаць».

Чым больш думаў пра Марыну, тым больш мацавалася жаданне сысці на знаёмай станцыі.

Але было і сумненне. Ці трэба гэта? І страх: як прыме Марына? Ад яе і ад старой можна ўсяго чакаць.

«Ды не, не пагоніць мяне. На Тамарыным вяселлі была ціхая, уважлівая і відно было: радавалася, што побач з дачкой у царкве і ў загсе — яны, бацька і маці.

Хвілін дзесяць сядзеў моўчкі, заглыблены ў свае думкі, у сваю таемную варажбу: выйсці, не выйсці? Гаварлівая новая пасажырка раздражняла. Украінка. Купіла плюш.

— Я ж дабрэнна ўмею шыты. Такі мой бізнес.

А станцыя — тая, на якой ён выходзіў з цягніка і садзіўся ў яго сотні разоў, — няўмольна набліжалася. Спалохаўся: не праехаць бы. Падхапіўся, апрануў пінжачок.

— Вы куды? — спытаў мінскі сусед. — Да Гомеля яшчэ далека.

— Мне не да Гомеля. У Гомель пазней. Мне тут трэба наведаць аднаго чалавека.

Узяў партфель, развітаўся з пасажырамі. Спытаў у правадніка: спыняецца на станцыі?.. Спыняецца.

Усё такое ж, як было і паўстагоддзя назад. Счарнелы элеватар, накрыты новым шыферам. Платформа, здаецца, тая, драўляная, выбітая ботамі, на якую сотні разоў ступалі яго ногі... маладыя ногі. І ліпы, здаецца, тыя ж. Ці такія ж выраслі новыя? За паўсотні гадоў усё магло вырасці. Аднак будынак станцыі той жа, адбудаваны пасля вайны, дзіўна, па тым жа дарэвалюцыйным праекце — з чырвонай цэглы.

Ступіў на дошкі платформы, яны знаёма зарыпелі. Цеплавоз натужна засіпеў, і над элеватарам узляцела чарада вераб'ёў, як і тады, калі гудзелі паравозы.

Так, усё знаёмае. І ў той жа час незнаёмае. Прыстанцыйная веска тая ж, толькі па вуліцы яе пракладзены асфальт. Прагрэс! «Чарнобыльскі», — сумна пасміхнуўся Ігнат Андрэевіч. Нейкая доза нуклідаў асела і тут, праўда, не такая, каб адсяляць людзей. Наадварот, за сялом, пад ляском, вырас цэлы пасёлак. Цагляныя катэджы. Дачнікі? Ці чарнобыльцы? Дачнікі. У чарнобыльцаў дамы былі б аднолькавыя, а тут розныя, штук колькі — цэлыя палацы.

«Нямала багатых напладзілася», — падумаў Ігнат. Ён даўно асуджаў бяздумную будоўлю: у каго большы! Немцы такіх харомін не ўзводзяць. А нашы «з гразі лезуць у князі». Атрымалі свабоду! Усе накапленні — у цэглу, як у зямлю. І ў метал — у машыны замежныя. Мала хто думае пра будучыню дзяцей, дзяржавы. Авантурысты мінулага стагоддзя, капаючы золата ў Кландайку, будавалі за яго Амерыку — заводы, чыгункі, фермы. Што будуюць нашы авантурысты? Зароблена — у зямлю, украдзенае — у Швейцарыю.

Думкі такія мільганулі, як мімалётнае адлюстраванне доўгіх і цяжкіх начных роздумаў.

На пляцоўцы каля вакзала стаялі легкавушкі. Але, калі верыць іх вадзіцелям, ніводная не ішла ў Марыніну вёску. Яно і не дзіўна, няма скразной дарогі — Дняпро.

Пайшоў пехатой. З партфелем у левай руцэ, з кійком у правай. Кульгаў — балелі ногі.

Мінуў вёску. Прайшла адна машына, другая, трэцяя... Галасаваў. Ні адзін малады «новы» не паспачуваў старому чалавеку. Разам з расчараваннем у людзях (не было раней такога, каб калгасны шафёр ці ён, аграном, не падвёз старога падарожніка), разам са стомле-

насцю (двойчы садзіўся на ўзбочыне), з болем у нагах расло расчараванне сваім рашэннем: пабег юнак на спатканне! Стары дурань!

Ну вось яно і сяло, якое ён усе гады працы ў раёне, нават пасля разводу з Марынай, лічыў родным. Любіў яго ці не больш, чым сваю маленькую прыпяцкую вёсачку; пасля Чарнобыля там нікога не засталося, а куды адселены сваякі, не ведаў. Во, брат у Гомелі, сястра — у Оршы.

Не ведаў, якое было свята. Але як толькі ўступіў у вёску, адразу ўбачыў: дзень святочны. На прызбах, на лавачках пад клёнамі (у сяле было многа клёнаў) сядзелі бабулі ў святочных строях.

Ігнат Андрэевіч вітаўся з імі і ўвогуле з кожным сустрэчным, нават маладым. Яму ветліва адказвалі, але яўна не пазнавалі: здагадкі, якія чуў за сабою, былі неўпапад.

Вось і дом. Той, які будаваў, лічы, уласнымі рукаМі — рабіў з цеслярамі, з печнікамі. Ды і сам нямала чаго зрабіў: аканіцы з разнымі ліштвамі, «канёк» над весніцамі. Глядзі, не згніў. Не, абнаўлялі. Марына абнаўляла. Дом па-гаспадарску ашаляваны «вагонкай», якая пафарбавана ў зялёны колер. З клёнаў, якія ён садзіў, застаўся толькі адзін. Але які! Волат.

У яго цяні на лавачцы сядзелі тры старыя жанчыны. Ігнат пазнаў сярод іх Марыну. І вельмі ўзрадаваўся, што яна не змянілася, твар яшчэ не быў спаласаваны зморшчынамі. Чысты, дагледжаны твар старой жанчыны. Квяцістая чырвона-зялёная пасынка прыгожа аздабляла яго.

Наблізіўся, павітаўся. Бабулі адказалі хорам, як адказалі б кожнаму, хто першы даў ім «дзень добры».

Ён прыпыніўся, абапёршыся на кіёк.

— Сядай, добры чалавек, калі стаміўся.

А Марына раптам войкнула:

— Вой!

На яе азірнуліся.

— Дык гэта ж мой Ігнасік! Ці не ў Кіеў ты сабраўся Богу маліцца? — Марына не магла без жартаў. — Цяпер жа ўсе камуністы Богу моляцца.

А пасля ўжо сур'ёзна, як з блізкім, павіталася:

— Дык добры ж дзень, Ігнат Андрэевіч. Не чакала пабачыць.

Дзве бабулі падхапіліся з лаўкі. Адна строга наказала:

— Прымай жа госця, Марына. Не помні зла. Жыві па-евангельску.

Бабулі адышлі.

Калі яны засталіся ўдваіх, Марына нібыта збянтэжылася, як некалі ў маладосці:

— Як жа гэта ты?

— Ды во ехаў... да брата... Не мог праехаць міма. Пацягнула. Пабачыць захацеў.

— Тамару бачыў?

— Заходзіў нядаўна. У карты пагулялі. Вясёлая сям'я.

— Тамары пашанцавала...

«Не як маці», — скончыў у думцы за былую жонку. Але не сказаў, толькі вінавата схіліў галаву.

— Хадзем жа ў хату. Госцем будзеш. Галодны?

— У поездзе не еў, хоць нявестка нешта паклала.

— Нявестка так не накорміць, — засмяялася Марына, і гэты незразумелы яе смех нядобра крануў: не хацелася, каб пра яго нявестку дрэнна падумалі.

Ён сеў на лавачку, на яе цёплае месца. А яна стаяла, адступіўшы на санцапёк. Глядзела сур'ёзна, сумна, спагадліва.

— Пастарэў ты, Ігнатка.

— А хто памаладзеў у мае гады?

— Жэняцца яшчэ некаторыя. Вунь у нас...

— Марына, не блазнуй. Жэняцца тыя, каму няма куды дзявацца, калі няма каму маннай кашы зварыць. А ў мяне свая кватэра, сын... Зося часам прыязджае. І Павел заходзіць, ён добры, а вось Насця ні разу не прыйшла.

— І ты лічыш яе нядобрай? Яна саромеецца. Дзіця. Хадзем у хату. А то вунь ужо збіраюцца паглядзець на свайго агранома. Нямнога тых засталося...

Ігнат цяжка падняўся — стрэльнула ў спіну ад нязвыклай стомы, даўно не рабіў такога шляху.

У «светлай» палове хаты стаяла прыемная прахалода. Пабагацела мэбля — не такая, як у майстра на ўсе рукі дзядзькі Атроха, які ў бедныя пасляваенныя гады мэбляваў, бадай, усё сяло. Цяпер усё фабрычнае: стол, ложак, крэсла, канапа. І тэлевізар не самай даўняй маркі. На сцяне, паміж вокнамі, фотакарткі ў «арцёмаўскіх» бярозавых рамках. Ігната кранула, што сярод іх знайшлося месца і яму, маладому, не аднаму: яны ўдваіх з Марынай сядзяць, схіліўшы, як галубкі, галовы адно да аднаго. Доўга разглядаў фота. Марына нячутна падышла ззаду, спытала:

— Бачыш, якія мы з табой былі?

— Ты — прыгажуня, а я — вахлак.

— Не кажы. Ты быў хлопец — хоць куды.

— Быў…
Марына засмяялася.
— А ты хацеў такім і застацца? Не бывае так. Усе старэем. У малпаў ператвараемся.
— Тваёй старасці не відно.
— Не відно! А бачыш, ніводнай карткі сённяшняй не павесіла. А думаеш, не здымалі? Адзін Павел тры дні шчоўкаў. Не люблю глядзець на сябе старую.
— А мяне ў часопісе памясцілі, і я ганарыўся.
— Цябе памясцілі як вучонага. А вучонасць... не старэе.
— Мудрая ты, Марына. Вучонасць не старэе. Вучоныя старэюць.
— Была б мудрая, калі б не была дурная. Такога мужа ўпусціла.
— Шкадуеш?
— А ўжо ж.
— Прабач. Віна мая. Ты кляла Ангеліну, а яна пра цябе дрэннага слова не сказала.
— Царства ёй нябеснае. Слоў я сказала многа, розных, але злосці не мела... На яе. На цябе мела. Але і табе пасля даравала. Я добрая.
— Я знаю, што ты добрая. І дзякуй табе за гэта. З верай у тваю дабрыню я і завітаў. Ведаў: не прагоніш.
— А куды мы можам гнаць цяпер адзін аднаго? У нас адзін дом — вечны. Але туды не будзем спяшацца.
— Аслаб я, Марына, за апошні год, пасля смерці... Ад станцыі ледзьве даклыпаў...
— Прагаласаваў бы...
— Галасаваў. Ніхто не ўзяў дзеда з кійком.
— Маладыя такія цяпер!.. Гады! Ну, ты адпачывай. А я абед згатую. На скорую руку. Блінчыкі не разлюбіў? І «сатану» спяку. На сале есці будзеш?
— Есці я ўсё ем, а сілы не маю. Толькі ж не на пяцьсем яек, як маладому паляводу. Два максімум. А сала... сала смажанае я даўно не каштаваў.
Марына засмяялася і па-маладому ўвішна пайшла на кухню.
Супакоены, задаволены, Ігнат сядзеў у куточку канапы перад акном, на якое падаў вячэрні цень клёна. Прыгадаў, што клён гэты садзіў ён сам, калі збудаваў хату. І ні разу не сядзеў пад ім. З-за аднаго гэтага варта было ісці ад станцыі. Няхай і баляць ногі.
«Паеўшы, каўтну індаметацын».
Набор лекаў вёз з сабой, уласна, у партфелі і былі толькі лекі, таму і пільнаваў сваё дабро, нават тут па прывычцы паставіў

партфель ля канапы, каля сваіх ног, як бы спадзеючыся, што гэтак, блізкасцю сваёй, таблеткі будуць дапамагаць.

«Як сказаць Марыне, што я хачу на дзянёк-два затрымацца? Адпачыць. Ад каго? Ад Андрэя? Ад Паліны? Не. Ад горада. А больш правільна: пабываць у сваёй маладосці, удыхнуць паветра мінулага. Шкада, што няма яшчэ жніва, малацьбы. Якім салодкім быў водар спелай збажыны!»

Не стаў адкладваць высвятленне свайго становішча: паклікаў Марыну.

— Мар'яша! Дазволіш пабыць у цябе дзянёк-другі? Адпачыць ад... дарогі. Доўгай-доўгай дарогі.

— Ды ты што, Андрэевіч, жыві колькі хочаш. Лічы, што гэта твая хата. Сам бярвенні вазіў, абпілаваўшы на лесапілцы, і цеслярам памагаў. Людзі памагалі табе. Помніш суботнік? Ой, не адрывай ад пліты, блінчыкі гараць!

Заспакоены такой Марынінай шчодрасцю, адкінуў галаву на спінку канапы і непрыкметна і хутка заснуў. Сніў, што яны з Ангелінай прыехалі не на сваю ждановіцкую дачу, а ў гэтую хату. І Ангеліна незадаволеная. Гэта яго хвалявала, ён не мог сцяміць, што ёй не падабаецца, ажно пакуль не пачуў голас Марыны:

— Ігнась, абед гатовы.

Ён з цяжкасцю адарваў галаву ад спінкі канапы.

— Ты трывожна спаў. Каб спакойна, я не стала б цябе будзіць. Намучыўся?

— Не за дарогу. За жыццё, — паспрабаваў жартаваць.

— Табе нялёгка жывецца? — спытала Марына ўжо за сталом.

— Ды не, нічога. Хоць, ведаеш, у мяне лепшы кантакт з малой Светкай, чым з мамай і татам яе, яны цалкам у сваёй працы. І няма ў іх часу і тэм для размовы з бацькам.

— Дык яно ж заўсёды так: малое і старое знаходзяць агульную забаву.

— Ды не толькі забаву. Філасофію. Во што цікава. І гэта зусім не пустая філасофія, не дзіцячыя фантазіі. Фантазіі, але з сэнсам. Калі ўдумацца.

— Тамара малая была вялікая выдумшчыца.

— Не любіць яна мяне.

— Ну што ты!

— Ні разу не праведала. Дачка родная. Крыўдна.

Марына ўздыхнула.

— А ёй, думаеш, не крыўдна было?

— Я разумею.

— Ты ж мудры чалавек.

— Я не наракаю на яе.

— Я так не магу: каб на ўсё жыццё крыўда. Сэрца счарнее.

— А знаеш, я вып'ю тваёй чарадзейнай настойкі. Можа, памаладзею. За цябе. Будзь здаровая. Жыві на
радасць унукам.

Выпіў чарку бурштынавай гарэлкі, настоенай на абляпісе. Спытаў зноў, на гэты раз бадай сарамліва:

— Дык дазваляеш пажыць у цябе дзянёк-другі?

— Ды жыві колькі хочаш, Ігнась. Чужыя жылі. Геолагі. І ў нас нафту шукалі, па гэты бок Дняпра. Не знайшлі. Не шырока яна разлілася ў тым падзямеллі.

Ігнату стала весела, ён пацягнуўся да графінчыка, каб наліць яшчэ.

— Не трэба, Ігнась.

— Японцы даказалі: хто выпівае патрошку, той даўжэй жыве. А я ўжо гадоў дваццаць цвярознік. Пасля першага прыступу.

— Частыя яны ў цябе, прыступы?

— Цяпер — не. Як ні дзіўна. Цяпер — ногі. Аслаблі ногі. А галава трымаецца. Пішу. Яшчэ нават пішу.

— Пра бульбу ці кукурузу?

— І пра жыццё сваё. Без працы не магу. Кукурузу дарэмна занядбалі тут, на Гомельшчыне... Мы ж для Беларусі — што Херсоншчына для Украіны.

— Хочаш, я лазеньку прапалю. І папару цябе свежым венічкам. Была хоць гарачая вада ў сталіцы?

Прыгадаў, што душ прымаў даўно.

Ад думкі пра лазню павесялеў: як Марына будзе яго парыць? Голая?

Пасля абеду, застаўшыся адзін, зноў заснуў, але з перапынкамі, з унутраным сорамам, як на пасяджэнні: спіш — і стараешся паказаць, што ўважліва слухаеш; знаходзіш аловак, заціснуты ў блакноце, хапаешся запісваць пустыя думкі пустых прамоўцаў. Няхай бачаць, што не спіць чалавек.

Прачнуўся не ад сораму перад аўдыторыяй, а ад рыкання кароў. Статак гналі з пашы дадому. Каровы ўзнялі пыл, і ён быў ружовы — заходзіла сонца. Карціна гэтая, якую даўно не бачыў, захапіла і нагадала прыемную прахалоду маленства, маладосці.

Прыйшла Марына з рушніком на мокрых валасах, у доўгім квяцістым халаце, у тапках на босую нагу.

— Ну, я ўжо памылася. Твая чарга. Сарочку чыстую я табе дам, Паўлава засталася.

Лазня стаяла ў канцы гарода каля крынічкі; паўстагоддзя назад яна была паўнаводная, а цяпер каціўся струменьчык — курыцы перайсці. Але насупраць лазняў пакапалі ямы — збіраць ваду. Ад крыніцы пахла прэлым альховым лісцем. А з лазні патыхнула жарам і свежай бярозай.

Ігнат Андрэевіч скінуў сарочку, штаны, але застаўся ў трусах. Марына была ў доўгай, да пят, сарочцы.

— Гэта ты саромеешся? А Божа! — засмяялася Марына. — Быццам я не бачыла... Будзеш хадзіць у мокрых трусах?

У адказ на выклік Ігнат скінуў трусы і палез на палок.

Марына выліла коўш вады на каменне. Пара не абпякла, прыемна пагрэла.

Яна легка пасцёбала бярозавым венікам яго спіну, ногі.

— Худы ты. Можна падумаць, што нявестка не корміць цябе.

— Корміць. Але ў яе не застаецца часу на гатаванне. Суп ды каша. Як салдату.

— Ох, гэтыя вучоныя! Хопіць сцёбаць?

— Каб ногі папарыць. Пырсні на камяні. Можа, падагра мая адступіць. Сагрэюцца суставы.

Марына бадай жа зняла яго з палка, пасадзіла на лавачку.

— Памыешся сам?

— Сам.

— Глядзі, падлога слізкая. Не ўпадзі. Я пасяджу каля лазні. Калі што — кліч.

Выціраючыся і апранаючыся, стары сапраўды адчуў сябе памаладзелым.

Вячэралі ў прыцемку — пілі сырадой з блінамі з пшанічнай мукі калгаснага памолу. На зубах хрумсцелі неразмеленыя зерні. Але які, аднак, смак быў у гэтых бліноў і ў малака!

Не ўгледзеў, як Марына паслала пасцелі, дзве — на шырокім ложку і на канапе. Яму прапанавала ложак. Але тут Ігнат запярэчыў:

— Госць не займае гаспадарскай пасцелі.

І лёг на канапе.

Заснуў хутка, без таблетак, даўно ўжо так не засынаў. Натаміўся, як сказала Марына.

Калі прачнуўся ўначы, не адразу сцяміў, дзе знаходзіцца, куды ісці, дзе дзверы. Доўга шкрабаў па дзвярах, шукаючы зашчапку. Разбудзіў Марыну. Яна адгукнулася:

— Казала, вазьмі пасудзіну.

Ён і тады, увечары, заемяяўся з яе прапановы, і цяпер.

На дварэ была прыемная прахалода. І нязвыклая цішыня. Даносіліся нейкія глухія гукі, здавалася, з далёкага космасу, ад цьмяных зорак. Не, во і зямныя істоты: дзесьці далёка ў лесе пракугукала сава, а блізка ў хляве цяжка ўздыхнула карова.

Да світання не мог заснуць. Чуў, што і Марына не спіць. Але зачапіць яе словам не хацеў: начной размовы баяўся. Пра што могуць старыя гаварыць пасярод ночы? Ноч — для маладых. Заснуў урэшце. І напэўна, мог бы праспаць, як дома, у горадзе. Але Марына, якйя са.ма паднялася з першым промнем сонца — карову выганяла, — палічыла, што старым доўга спаць непрыстойна. Ды і прасіў Ігнат разбудзіць раней — саромеўся, што будзе спаць да паўдня.

Разбудзіла яна бразганнем посуду, збіраючы снеданне.

За якія тры дні Ігнат адчуў сябе дужэйшым: прачынаўся раней, нядоўга драмаў удзень у цяні пад паветкай. А галоўнае — набыў душэўную ўпэўненасць. Усё здавалася блізкім, родным, як у маленстве. Прастору — нібы ўвесь свет твая ўласнасць. Працаваў на зямлі, часта жыў у калгасах, сваю дачу меў. Але ўсё гэта не тое. У камандзіроўках адчуваў адзіноту, хоць рабіў на полі сярод людзей. На дачы гняла цесната: суседняя дача — акно ў акно. Сялянскія хаты гэтак жа прытулены адна да адной, але збудаваны яны разумна, і добры сусед нічым не раздражняе.

Тут адзіноты не адчуваў, хоць ніхто не дакучаў, кожны займаўся сваёй справай. Марына рабіла на гародзе, у полі, дзе выдзелілі ёй участак; зямлі цяпер не шкадавалі, толькі рабі. Ігнат Андрэевіч здзіўляўся, навошта Марыне столькі бульбы. Яна ў адказ уткнула:

— Адарваўся ты ад зямлі. У мяне ж карова і свінні.

А навошта столькі жывёлы? Ці не з першага дня адчуў, што Марына не любіць размоў пра гаспадарку, пра багацце. Пра карову магла гаварыць, як пра блізкую сяброўку, пра малако, якое здавала ў былы калгас, цяперашнюю фірму, па кантракце, але найперш не для таго, каб зарабіць грошай, — каб далі сена, нейкага паўгектара лугу. А добрая палова свініны ехала ў Мінск — дачцэ, унукам. Але гэтую тэму Марына бадай не закранала. Ігнат таксама абыходзіў яе.

Першымі яго сябрамі сталі дзеці. Аднойчы, калі ён сядзеў на лавачцы, падышоў хлапчына, Пятро Выганаў, трэць вёскі былі Выганавы. Смела сеў побач:

— Ну што, скончыў вучобу? — спытаў Ігнат.

— У шосты перайшоў, — з гонарам адказаў хлопец. — З пяцёркамі.

— Малайчына. Вучыся, брат.

— А праўда, што вы вучоны?
— Доктар навук. Акадэмік аграрнай акадэміі.
— Ух ты! А былі калісьці аграномам у нас?
— Быў.
— А на фронце былі?
— І ў партызанах, і на фронце.
— Ух ты! А раскажаце?
— Раскажу.
— Дык я ўвечары хлопцаў прывяду паслухаць вас.

Дзіўна, нечаканы, хоць, здавалася, звычайны занятак, яго, чалавека, які на лекцыях з'еў зубы, расхваляваў. Што расказваць? Як расказваць такім слухачам? Выступаў часам у школах пад Дзень Перамогі, на свята Савецкай Арміі, але ж там ужо выпрацаваная схема. Ды нярэдка меў расчараванне: няўважліва слухалі дзеці, мабыць, вайна абрыдла ім.

Гэтыя шасцёра хлопцаў слухалі надзіва ўважліва, пытанні сыпалі, як гарох. Мабыць, яны разнеслі славу пра акадэміка. У пахмурны святочны дзень сабралася на Марынінай лаўцы група дзядзькоў: равеснікаў яго — чалавекі два, астатнія — маладзейшыя. Але як плуг гадоў узараў іхнія загарэлыя твары.

— Пра вайну ты нам не расказвай — мы не школьнікі. Прасвяці, Андрэевіч, у палітыцы. Вельмі ж заблытаная яна. Па тэлевізары не разбярэш. Адзін дзень адно, другі — другое.

— Таму што слухаем з пятага на дзесятае, калі ўрвеш паўгадзіны.

— А часцей глядзім пад «мухай», — засмяяўся самы малады Іван Браток.

Задача была не лягчэйшая за дзіцячую.

Дома Ігнат Андрэевіч рэгулярна глядзеў тэлевізар, чытаў газеты. Марына газет не выпісвала. Хадзіў на пошту, похапкамі праглядаў тыя з газет, якія паштарка яшчэ не разнесла; мала што заставалася — не выпісвалі людзі газет.

Беручы на пошце газету, адзін з ветэранаў сказаў:

— Хутка развучымся чытаць. Акуляры паламаў — купіць не магу, паўпенсіі трэба, баба не дае. Жонку бачу без акуляраў. Але праўда яе. За што хлеб купіць? Без хлеба не пражывеш. Хлеб будзе, акадэмік?

Ці заўсёды будзем з хлебам? Во — галоўнае пытанне палітыкі. Акадэмік ведаў: пра што б ён ні гаварыў — пра саюз з Расіяй, пра Чэчню, Югаславію, — у гэтай прызбеннай аўдыторыі к лопат адзін — хлеб. Хоць і пра палітыку пытанні падсыпаюць, як грэчку пад калені.

Моршчыся, але адказ дай, не газетны, свой, сялянскі; ты ж селянін, як і яны, усё жыццё змагаўся, каб было больш хлеба і да хлеба. І тыя, хто рабіў з ім яшчэ хлапчукамі, чакаюць незвычайных адказаў на самыя адмысловыя пытанні. І ён хваляваўся, як, можа, не хваляваўся перад выступлением з дакладам на міжнародным сімпозіуме. Цікава і пагутарыць з тымі людзьмі, якія паўстагоддзя назад былі яго галоўнымі памочнікамі на закладцы доследных участкаў. Старыя работы гэтай не любілі, а моладзь да творчасці цягнулася. Ці пазнае ён усіх? Калі сустракаў на вуліцы, некаторых пазнаваў, а некаторыя, у каго пільна ўглядаўся, называл! сябе самі. Здзіўляўся сваёй памяці, увогуле чалавечай памяці. За пяць дзесяткаў гадоў сустрэўся з тысячаМі людзей. І многіх памяць утрымлівала, але з дзіўнай асаблівасцю: больш тых, з кім працаваў, сустракаўся ў маладосці, чым тых, з кім сядзеў у прэзідыумах дзесяць ці пяць гадоў назад.

Не адразу чамусьці падумаў, што калі Андрэй патэлефануе дзядзьку Ціхану і даведаецца, што бацька не даехаў да Гомеля, то можа ўзняць вялікі вэрхал. Такая ў яго праца — шукаць людзей. А тут знік бацька. Куды? Можа падняць усе следчыя органы рэспублікі. Весела падумаў: узніме ўсіх, а пра Марыну не згадае. Хіба Тамары пазвоніць. Але дачцэ Марына пра госця, здаецца, не пісала. Пазваніў Ціхану, папрасіў патэлефанаваць Андрэю:

— Не палохай толькі, што я ў прымакі пайшоў, абразіцца сын.

Андрэй прыехаў у наступную нядзелю на сваёй «вольве».

Марына як бы трохі спалохалася, разглядаючы Ігнатавага сына. Але ён звяртаўся да яе вельмі карэктна, бадай ласкава, падзякаваў, што яна прытуліла ўцекача.

— Я падумаў ужо, бацька, што ты ў Германію падаўся. Ды не, не тыя погляды, немцаў ты не любіш. Ну, а пра Амерыку і гаварыць няма чаго: сусветнага жандара ты ненавідзіш.

Адзін на адзін спытаў у бацькі:

— Ты што, у прымакі падаўся?

— Не гарадзі глупства. Не ў мае гады.

— Бывае і ў твае гады. Як кажуць, серабро ў скроні...

— Ты думаеш, у такія гады жанчына трэба? Душа яе. Адпачыць... у мінулым. Мне спакойна тут.

— Во гэта мне і страшна — што душа. Маму забудзеш, памяць яе. Калі на магіле быў?

— А ты, сын, калі быў?

Андрэй пачырванеў: бацька ездзіў на магілу часта, на аўтобусе, а ён, сын, на ўласнай машыне не знаходзіў часу заглянуць.

Сын прывёз пенсію.

— Светка імянінніца, дай ёй на падарунак.

Аддаў палавіну сумы.

— А ты?

— Мяне накормяць.

Андрэй уздыхнуў:

— Глядзі ж, бацька.

— Куды мне глядзець? Я ўсё жыццё азіраўся. Галавой круціў.

— Не вельмі ты азіраўся. Першы ў атаку ішоў.

— Здаралася, што ішоў. Але калі гэта было! Цяпер — які з мяне воін?

Марына пакрыўдзілася, што Андрэй не застаўся на абед.

— Мне трэба яшчэ ў Светлагорск. Справы, ліха на іх...

— І ў нядзелю — справы?

— У нядзелю крамолы больш. П'юць больш. Выпіў шклянку малака ды пачакаў, пакуль гаспадыня сабрала гасцінцы: вялікі кошык яек, масла, вішань — сваім унукам, меншы — Ігнатавай унучцы Свеце.

Андрэй быў вясёлы. Пажартаваў:

— Пажэніцеся — на вяселле запрасіце.

— Мы ўжо жаніліся. А цяпер позна, — без усмешкі, амаль змрочна сказала Марына, збянтэжыўшы следчага. Андрэй, развітваючыся, пацалаваў старой руку.

— За працу вашу.

— Хіба за працу. Ігнат пасміхнуўся:

— Ты як гжэчны паляк.

Бацьку Андрэй пацісну ў руку, пажартаваў:

— Не ўцякай нікуды больш. Не давай мне лішняга клопату.

Абедалі ўдваіх. Марына ела з апетытам і многа гаварыла. Ігнат маўчаў. Ён ніколі не прымаў рашэнняў з • наскоку, не падумаўшы добра. А тут раптам сказаў:

— А можа, нам і праўда запісацца?

— Куды запісацца? — зрабіла выгляд Марына, што не зразумела.

— Шлюб наш аднавіць...

Марына ўсміхнулася, паўтарыла дзіцячую дражнілку:

— Жаніх і нявеста наеліся цеста. Куры засмяюцца. І сяло рагатаць будзе. У царкву ж трэба ісці. Вярнулася старое. Ты да Бога вярнуўся? А калі вярнуўся, то не грашы. Двойчы аднае і тае ж рукі не прасі. Нельга.

Хацеў спытаць, у якіх святцах гэта запісана, але змаўчаў: самому здалося святатацтвам гаварыць на такую тэму.

Пасля гэтай размовы Марына як бы аддалілася ад яго. Не, знешне нічога не змянілася, але як бы вырас невялікі парожак паміж імі. Не адчужанасці, а нейкай не' сялянскай — інтэлігенцкай далікатнасці. Знікала першапачатковая сваяцкая блізкасць. Усталёўваліся адносіны гасціннай гаспадыні з добрым, чулым, інтэлігентным кватарантам. Марына нават стала рэдка клікаць «Ігнась», а больш — «Ігнат Андрэевіч». У яго ажно страх з'явіўся: не перайшла б на «вы»!

І так падумаў: «А ці не час падзякаваць Марыне за два тыдні гасціннасці і — ногі на плечы». Не хацелася. У горад не хацелася. Ды і ў цікавую працу ўлез: пазнаёміўся з дырэктарам сельгасфірмы, у якую пераўтварыўся калгас, — Кузьмом Гайкам, чалавекам сярэдніх гадоў, былым старшынёй райвыканкама. Хітры гаспадар адразу сцяміў, што са старога вучонага-аграрніка можна яшчэ нешта выцягнуць; ён не толькі палявод, але і эканаміст. А эканоміку трэба перабудоўваць: рынак вымушае, да яго нялёгка прыладжвацца нават такім зубрам, як Гайка. Сядзелі вечарамі, абмяркоўвалі спрэчныя праблемы. А ўдзень Ігнат Андрэевіч складаў праграму развіцця гаспадаркі. Праўда, ён хутка астыў да гэтай працы: для эканамічнай часткі яму давалі пустыя другарадныя бухгалтарскія паперы, як здзекаваліся. Ён паскардзіўся Марыне. Яна ўзлавалася:

— Не лезь, куды не просяць!

— Дык папрасілі ж. Сам Кузьма Гайка.

— О, ты не знаеш гэтую гаечку! Такая гайка каго хочаш закруціць.

А потым пачуў каля крамы, як п'яныя рабочыя лаялі Гайку, Шпільку (бухгалтар — Шпілеўская) і Пальчыка (эканаміст-планавік Пальцаў). Падумаў: «Не бывае дыму без агню. Голас народны...»

Ігнат Андрэевіч працы не кінуў, але некаторыя свае веды не выкладаў. Гайка адчуў гэта і сам параіў:

— А ты на пуп не бяры, Андрэевіч. Часу ў нас хапае. Адпачывай.

— У вас у запасе вечнасць. У мяне — часу нямнога. А хацелася б яшчэ нешта зрабіць.

— Залаты ў вас характар. Вось бы мець такога памочніка. Позна вы з'явіліся.

Але «добранькі» дырэктар прыкметна аддаляўся, ва ўсякім разе, дыскусій эканамічных пазбягаў, пераключаўся на высокую палітыку. Пярэчыў часам знарок, каб «завесці» вучонага і цешыўся з яго гарачнасці. А Марына пачула, папярэдзіла:

— Не гарачыся. Ён знарок табе пярэчыць. Яму што. Яму пяцьдзесят. У яго сэрца — што ў быка. А тваё хліпкае... Беражы сябе.

Такі клопат Марынін кранаў і яшчэ больш збліжеў, так, прынамсі, яму здавалася. І ён не пакідаў надзеі аформіць адносіны так, каб застацца тут, у цішыні, назаўсёды. Успамінаў Светку, сумаваў, пісаў ёй добрыя, ласкавыя, цікавыя пісьмы. Каб можна было з'ездзіць у Мінск і вярнуцца назад! І каб яго чакалі і тут, і там. Эгаістычнае жаданне. Але стары, што дзіця, цешыць сябе нязбыўнымі фантазіямі.

Разам з тым чэрствы рэаліст, ён разумеў, што казкі канчаюцца, нават самыя добрыя. Баяўся, што і гэтая скончыцца, у ціхай чыстай хаце, пад шэпт клёна, дзе ён прыкметна падужэў. Нават хадзіць пачаў без кія. Упікаў сябе, называў прыжывалам, але гэта сумлення не кранала. Урэшце, яму трэба толькі чалавечая цеплыня; харч ён купляе — аддае Марыне тры чвэрці сваёй немалой (у параўнанні з яе) пенсіі. Спачатку Марына саромелася, адмаўлялася браць:

— Што ты, Ігнась! Як кватарант. А ты ж госць мой.

Гэта яго цешыла і жывіла надзею. Горш стала, калі яна пачала ахвотна браць яго долю і чакала, калі Андрэй прышле па пошце бацькавы грошы.

Марына нават спытала, навошта ён збірае «чацвяртушкі».

— Свеце куплю падарунак — абноўку якую.

— Дык ведай жа: тую частку пенсіі, што даеш мне, я адсылаю нашым унукам. Насця вучаніца. А хочацца ж дзяўчыне адзецца. А Тамара, ведаю, не самая шчодрая маці. Тамара — як і я. У маладосці таксама была скупая.

— Я не адчуваў гэтага.

— Бо ўсе грошы, і мае, і твае, былі ў мяне. Ты ж залаты муж быў — не піў, не курыў.

— Цяпер не такі?

— Цяпер ты адзінокі пенсіянер.

— Адзінокі, — стоена ўздыхнуў.

Ашаламіла эпітэтам «адзінокі». Няўжо адчула, што ён душэўна адзінокі? Дык не ж! Тут, з ёю, не адчуваў той адзіноты. Жыве нармальным жыццём.

Марына адкрытая і ў той жа час таемная, як за сямю замкамі. Трэба не адзін пуд солі з'есці разам, каб зразумець усю яе сутнасць жаночую, сялянскую, бухгалтерскую. Хіба адну рысу свайго характеру — дабрыню — выкладвала на далоні. Ды і дабрыню магла здзьмухнуць з далоні ў адзін міг. Праўда, у адносінах да Ігната гэтага не зрабіла ні разу. Некаторым вяскоўцам пасля пахвалы магла тут жа прыгадаць грахі.

У вёсцы яе і паважаюць, і трохі баяцца: многа яна ведала людскіх грахоў — гаспадарскіх, калгасных. Але што цешыла Ігната: ніхто не назваў былую бухгалтарку зладзейкай. Чуў нават такое: «Калгас трымаўся на яе плячах». Найвышэйшая пахвала! А яшчэ пачуў, што Марыну называюць «наша Мардзючыха». Пасмяяліся разам з ёй, успомніўшы фільм са знакамітай актрысай. Не, Марына не такая, Марына мякчэйшая, дабрэйшая. Падумаў так, але ёй не сказаў.

Надышоў сенакос. Пакуль касілі калектыўнае, асаблівых спрэчак не было. Але Марына ездзіла зграбаць сена, стагаваць. Ігнат адгаворваў:

— У твае гады. Не шкадуеш ты сябе.

— Я павінна зарабіць яшчэ хоць пяць сотак. Сёлета трава слабейшая, разліву не было. Летась і трава была добрая, і малака я здала больш, і то ледзь дацягнула да новай пашы.

Вэрхал узняўся, калі пачалі дзяліць сенажаць рабочым — па працы кожнага. Трава была ў пойме Дняпра, за дванаццаць вёрст, а спрэчкі гарэлі ў сяле. Нялепшы сам па сабе надзел быў разбіты на сотню ўчасткаў, няроўных па плошчы. Таму нумаркі цягнулі асобна: большых участкаў, сярэдніх, «сіроцкіх». «Сіроцкія» на лясным балоце: асака. Ніхто не згаджаўся, што рабіў менш. Мала здаў малака? Дык дзеці ж малыя.

У Ігната Андрэевіча не прасілі дапамогі, але яму чамусьці скардзіліся, асабліва жанчыны, Марыніны сяброўкі, суседкі. Можа, спадзяваліся, што ён «націсне» на Гайку, хоць ведалі, што дырэктар у раздзеле не ўдзельнічаў, рабілі па прынцыпе поўнай дэмакратыі: выбіралі камісію, друкавалі нумаркі. А далей тваё шчасце, што выцягнеш: лагчыну з травой па пояс ці касагор, дзе трава пажоўкла ўжо.

Марына не хвалявалася: яна выцягнула лагчыну. Праўда, была і тут свая цяжкасць: частку травы з лагчыны трэба выносіць з вады на бугор — для прасушкі. Сваё сена на лузе не пакідалі, усё перавозілі ўлетку, стагавалі на гародах, складалі пад паветкамі, на гарышчы хлявоў. Частка калгасных стагоў стаяла ля саннай дарогі. Неяк павялося тут, не ў прыклад іншым гаспадаркам, што калектыўнае кралі радзей; Гайка ўмеў арганізаваць ахову, і міліцыя як бы аднаму яму служыла.

Марыне, як заўсёды, пашанцавала: яна выцягнула зайздросны для іншых участак — найгусцейшая трава, падсеяная, з канюшынай.

Касцоў яна наняла за грошы. А зграбала, складала ў вялікія копы сама, каб менш прамачыў дождж, бо заўжды дождж ідзе не там, дзе просяць, а там, дзе косяць. І вазіла сама з дапамогай пляменніц на трактарным прычэпе.

Ігнат не вытрымаў перасыпаць пясок з малымі — напрасіўся калі не падаваць сена, то ўкладваць яго на прычэпе, а гэта работа ўмелых, не кожны ўмее скласці воз так, каб не абрынуўся. На вазы дзедаўскім спосабам, пад рубель, накладвалі часам больш, чым на вялікі трактарны прычэп, які мог бы павезці ў тры разы больш.

Марыне не падабалася, як ён укладвае — ссадзіла з прычэпа, як малога, падпашкі зняла. Спрытна ўзлезла сама. Яна ўмела ўсё.

Ігнат Андрэевіч не мог стаяць склаўшы рукі, узяўся памагаць дзяўчыне.

Марына папярэдзіла:

— Не бяры, дзед, на пуп.

Ён раз ускінуў, другі, трэці... Атрымаў нават пахвалу:

— Глядзі ты, не развучыўся акадэмік.

А потым натрапіў пласт зляжалага сена. З натугай падняў яго над галавой і... не здолеў кінуць на прычэп: ношка крутнула яго, і ён разам з ёй упаў бокам на зямлю, добра, на пацярушанае сена.

Марына войкнула. Саскочыла з прычэпа, падбегла да яго, збялелага ад болю ці спалоху.

— Жывы, Ігнась?

— Жывы. Толькі бок баліць.

— Левы? Нядобра. Не паднімайся. Ляжы. Хатылёвы тут на машыне. Папрашу завезці цябе ў бальніцу.

— Не трэба. Пабаліць і перастане.

— Няхай дактары скажуць.

У яго была з сабой кардыяграма паўгадовай даўнасці. Захапіў для параўнання. Страшнага нічога не здарылася. На шчасце. Марына ажно перахрысцілася. Гэта яго кранула, і ён адчуў незвычайную ўдзячнасць да яе. Яшчэ большую, калі яна згадзілася забраць яго дадому і — Бог літаслівы — расцяжэнне мышцы лячыць дома.

— Тыдзень патрымайце ў пасцелі. Не прымушайце сена грузіць, — сказаў доктар.

— Хіба лыжку ўзяць прымушу.

— Правільна. Мужа трэба берагчы. Мужчыны ў нас мала жывуць.

— Мой будзе жыць да ста гадоў, — засмяялася Марына.

Тое, што выдала сябе за жонку, нарадзіла ў Ігната супярэчлівыя пачуцці: надзею (на што? запісацца ж адмовілася) і страх (да якога часу яна будзе няньчыць яго? а калі боль надоўга?).

Боль праходзіў. І стары адчуваў сябе да радасці ўтульна і спакойна ў прахалоднай хаце, у адзіноце: галоўнае, не страшылі думкі пра будучае, пра смерць.

Марына памагала сваякам парадкаваць сена. Але з'яўлялася заўсёды ў абед, рана вярталася ўвечары: сваяк на сваіх «Жыгулях» вазіў яе дагледзець хворага. Акуратна наведвалася фельчарка. Бок балеў, але ён Нікому не скардзіўся, толькі, чаго не заўважыла Марына, кій з правай рукі пераклаў у левую — гэта паслабляла боль.

Прызвычаіўся і да гэтага болю. Ці мала што ў яго, старога, балела?

Наступіла жніво. Прыпар. Марына жала сярпом дзялянку жыта на сваёй сядзібе.

— Навошта табе жыта?

— А ў мяне свінні. Камбікорму не купіш. На адной бульбе не выкарміць. Ды і самагонку трэба выганяць. За гэтую плату дровы прывязуць. За добрага «гусака» і папілуюць, і паколюць.

Трывожыла Ігната Андрэевіча адно: тое ж адзіноцтва, якое перажываў у шумнай сталіцы. Яго цягнула да людзей.

Жніво было цяжкім, часта лілі дажджы. Разумеў, што гэта бяда. Але любіў такое надвор'е: яно не дазваляла гуляць «у маладосць», давала магчымасць старасці адчуць сваё месца. За лета ён навучыўся прачынацца калі не разам з Марынай, то не намнога пазней. А цяпер зноў бывалі дні, у дождж, калі ён спаў ледзьве не да паўдня. Марына будзіла яго са смехам:

— Снеданне праспіш.

Марыніна абыякавасць да таго, як ён праводзіць час, таксама трывожыла. Абмялеў ручэй яе слоў. Размова набыла бытавы характар, у пэўным сэнсе адчужаны. Яго змрочнасць узмацнялася, калі, здаралася, за доўгі дзень гаспадыня гаварыла дзесятак слоў.

Ён змагаўся з уласнай сумотай. Два месяцы бясхмарнага жыцця былі шчасцем, якое можна было параўнаць з маладосцю.

Чым Марына незадаволена? Можа, яе нехта настройвае? Хто? Тамара? Прыязджала месяц назад і паводзіла сябе, як належыць дачцэ, прыкметна радавалася, што маці і бацька зноў разам.

Чуў, суседка пытала:

— Ды чаму ж вы не пажэніцеся?

Марына адказала грубым жартам:

— Жанілкі высахлі.

Можа, Гайка вырашыў пазбавіцца ад яго і ціснe? Не, не ў такіх Марына адносінах з дырэктарам, каб даверыць сардэчныя тайны.

«Трэба ад'язджаць, — вырашыў Ігнат. — Нязваны госць... Залішне загасціўся».

Але сілы развітацца не меў. Не цягнула ўласная кватэра з маўклівым сынам, афіцыйна карэктнай нявесткай, нават ад бібліятэкі

сваёй у тысячу тамоў адвыкнуў, задавальняла сельская: прасіўся ў рукі не вучоны-біёлаг, а Чэхаў.

«Пагаварыць трэба».

Але размовы баяўся: ведаў, што яна патрэбная, аднак нерашучасць скоўвала, і ён чакаў... чаго — сам не ведаў.

Развязка наступіла нечакана.

Прыслаў сын пенсію. Ігнат вырашыў аддаць Марыне яе ўсю, да капейкі. Працягнуў грошы ў двары, дзе яна клала на страху склепа гарбузы, каб даспявалі.

— Во пенсія.

Марына памкнулася рукою, але тут жа выцерла яе фартухом і грошы не ўзяла,

— Хадзем у хату.

У Ігната ўздрыгнула сэрца: «Вядзе на размову».

На кухні яна ўзяла грошы і паклала іх не ў кішэню — на палічку.

— Глядзі, а то Бруй пазычыць.

Бруй часта прыходзіў пазычаць на пляшку чарніла.

— Не пазычыць, — адчыніла заслонку ў печы, узяла вілы. — Свіней пара карміць.

Ігнат знайшоў ход, думаў пра гэта даўно.

— Можа, мне перавесці пенсію сюды?

— Куды?

— У наш раён.

Марына палезла ў печ дастаць вялікі чыгун і чужым голасам спытала:

— А ты хочаш застацца тут навечна?

У Ігната замерла сэрца.

«Ну, во і ўсё. Што можна сказаць?»

Узнікла жаданне папрасіць: «Марына, не гані мяне». Але ўспомніў, як яна, маладая, поўзала каля яго ног, галасіла: «Ігнасік, даражэнькі, не кідай мяне». Не, ён так прасіць не можа.

— Дзякуй, Марына.

— Няма за што. Скончыўся дачны сезон. Дамоўка чакае. Света.

Дастала чыгун, узяла брудным ручніком, вывернула бульбу ў карыта, пачала таўчы.

Кухня напоўнілася парай.

З белай пары Марына вінавата ўсміхнулася яму. А ён зноў сказаў:

— Дзякуй табе за гэты дачны сезон. Ён прадоўжыў мае жыццё. Калі мне паехаць?

— Калі хочаш.

— Не, выстаўленаму за дзверы заставацца нельга.
— Так ужо і выстаўленаму! Якія мы гордыя!
— Ды не, гонару ў мяне засталося нямнога.
— Начуй. Пагаворым. Развітаемся па-свойску, пачалавечы.
— Дзякуй.
— Не дзякуй ты на кожным слове. Як чужыя.
Пагаварыць не давялося: Марына на цэлы вечар знікла.
Пачаў пакаваць партфель і спалохаўся: рэчаў накапілася многа, больш, чым вёз, едучы да брата; сын двойчы прывозіў бялізну, боты купіў асеннія, на цёплай падкладцы — тое, што трэба для яго хворых ног. Трэба прасіць у Марыны нейкую торбу. Расклаў рэчы на лаўцы: ведаў, што Марына не пакіне так — спакуе неяк, па гэтай часці яна мастак, як і большасць жанчын.
Лёг рана. Але заснуць не мог.
Марына прыйшла, наблізілася да ложка, пачула, што ён не спіць, спытала:
— Дык едзеш?
— Еду.
— Заўтра?
— Заўтра.
— Ранішнім?
— Добра было б, але як дабяруся да станцыі? У сем ідзе. Пехатою не дайду са сваім багажом.
— Я папрасіла ў Гайкі машыну. Дамовілася з Іванам. У шэсць яго «мардасет» будзе пад вокнамі. Спі спакойна.
— Дзякуй табе.
— Заўтра падзякуеш. Спі. Дабранач.
І — дзіўна — ён заснуў. Не засталося, выходзіць, трывожных думак, нявырашаных праблем. Пасміхнуўся са свайго жадання застацца ў Марыны. Чаго захацеў! Пацягнула памерці пад шум клёна, які даўно-даўно пасадзіў сваімі рукамі. А з клёна ўжо ападае чырвонае лісце, пакуль адзінокія лісткі, але ці доўга да таго, калі яны абсыплюцца ўсе. Стары клён з дуплом будзе стаяць голым. І гэта ўжо не твой клён. І дом не твой. Твайго тут нічога не засталося. Акрамя ўспамінаў пра маладосць. Але ўспамінай ты Ангеліну.
Андрэй не сказаў, але яўна падумаў: застанецца бацька тут — здрадзіць памяці не толькі маці, але і ім, дзецям сваім. А што здрадзіў Марыне, Тамары — пра гэта ніколі не думаў: ні раней, ні цяпер. Ён памагаў ім чым мог, і яны прымалі яго дапамогу.
Некаторыя сяльчане скалілі зубы: «Маладажоны». Не ведаў, як Марыну, а яго гэта ніяк не кранала. У яго засталося адно духоўнае

жыццё — яно не прымае кепікаў. Духоўнае — за межамі чалавечага асуджэння ці ўхвалы.

«Гэта маё! І нічыё болый!»

З перакананнем у недатыкальнасці яго духоўнага жыцця прыйшоў спакойны сон, у апошні раз па-вясковаму кароткі.

Марына разбудзіла яго ў пяць раніцы.

Рэчы пакавала ў сінюю цыратавую торбу. А яшчэ ж партфель. Нялёгка будзе паднімацца ў вагон. Але свет не без добрых людзей.

— Я спякла табе дранікаў.

Сапраўды, сальнымі дранікамі смачна пахла. Але калі паспела спячы?

— Даўно не еў пасярод ночы. Але твой дранік з'ем, бо дзе яшчэ такіх пакаштую.

— Навучы нявестку.

— Задужа вучоная для дранікаў. І ўвогуле — шляхцянка. Мужыцкай ежы не прызнае, панскую гатаваць не ўмее.

— Цяжка табе з ёй?

— Ды не. Яна добрая. І нас яднае Светка.

Пад акном загурчэла машына.

— Во і Іван тут як тут.

Ігнат апрануў плашч.

— Не холадна табе будзе?

— Ды не. Асенні, на падкладцы. Андрэй знаў, што прывезці.

— Я не пайду цябе праводзіць. А то яшчэ расплачуся.

— І не трэба. Лішняе хваляванне. І табе. І мне.

— Не. Да машыны я рэчы данясу. Але цалавацца будзем без сведкаў.

Марына горача абняла яго, тройчы пацалавала — у шчокі. Ён пацалаваў яе ў вусны, па-маладому.

Калі ад'ехалі, убачыў праз задняе шкло, што Марына стаіць каля веснічкаў і, здалося яму, рогам белай хусткі выцірае вочы.

Марыніны слёзы кранулі. І ён адчуў сябе вінаватым. Але ў чым — зразумець не мог.

Шафёр спытаў:

— У госці, Ігнат Андрэевіч?

— Дадому.

— А на сяле гудзелі, што вы маеце пажаніцца.

— Жанаты я ўжо быў. На Марыне. Роўна паўсотні гадоў назад. Хіба цяпер я падобны на жаніха?

Іван засмяяўся.

— Адзін паэт сказаў: «Любви все возрасты покорны». Са школы помню.

— Не, Іван. Ёсць мяжа. Пушкін вельмі мала пражыў, каб рабіць такія абагульненні.

У халоднай зале станцыі было пуста. Бедна апранутая жанчына спала седзячы. Паклаўшы ёй галаву на кален!, драмала дзяўчына.

Ігнат Андрэевіч на дыбачках прайшоў да лаўкі каля акна. Колькі хвілін сядзеў бяздумна. Схамянуўся ад дажджу, што забарабаніў у шыбы. Ён услухаўся ў шум дажджу і раптам адчуў, што ў яго мокрыя шчокі і закалола ў вачах. Ён не здолеў паварушыцца, каб дастаць з кішэні насоўку. Увайшоў яшчэ адзін пасажыр. Ігнат Андрэевіч заплюшчыў вочы, у іх бліснулі вясёлкі. І ў рознакаляровай вясёлцы паўстаў вобраз малой Светы. Яна сказала:

— Добрай раніцы, дзядуля.

## У ЗАСЕНІ ПАЛАЦА

1

У паходзе за пакупкамі яны заўсёды спрачаліся. Дарога ў дальні ад іх дома магазін, «чалавечы», як называла яго Галіна Пракопаўна, ішла міма шыкоўнага прыватнага супермаркета. Але сама Галіна ніколі не заходзіла туды. Адно расстройства — ад таго, што там прадавалі і чаго яна не магла купіць: мала ў кішэні месцілася грошай. Можна, канечне, спусціць адразу дзве пенсіі, парадаваць страўнікі. А пасля? Лажыся і памірай? Але паміраць яшчэ рана. На лепшае жыццё спадзявання няма. Аднак, пакуль ёсць хлеб і кефір, — жыві. І радуйся. Унукам яшчэ трэба памагчы. У дачкі яны добра накормленыя. А сын... Ды ўнучка Ленка прыбягае з універсітэта, каб пасёрбаць бабулінай капусты. А бабуля ўмее «з тапара» згатаваць наварысты боршч ці суп.

Адам Фадзеевіч, наадварот, амаль ніколі не прамінаў супермаркет.

Жонка здзіўлялася:

— Што цябе цягне туды?

— Для мяне гэта наглядны падручнік. Па ім я вывучаю палітэканомію капіталізму. Як ён рос...

— І расце.

— Ты знаеш, рос ён інакш. У нетрах феадалізму. У нас ён расце не паводле Маркса.

— Як не паводле Маркса? Усюды капіталізм рос на разбоі. На прыгнёце. На войнах. Хіба Маркс не пісаў пра гэта?

— Ты маеш рацыю. Але ж наш хатні капіталізм адметны. Крымінальная сутнасць яго іншая.

— Махінацыі падменены разбоем?

— А ты акуратна чытаеш газеты?

— Я усё чытаю. Раней — адны раманы. А цяпер гісторыю і эканоміку.

— Чысты тэарэтык. А практыкі не знаеш.

— Усё я знаю. Пахадзіў бы ты столькі па магазінах... Не дзеля таго каб паглядзець, а каб накарміць сям'ю.

Так было і ў той дзень.

— Зойдзем?

— Што ты там не бачыў?

— У такую кармушку трэба часта заходзіць. Наглытаешся сліны — і сыты. Нешта ўнучцы купім.

— У кашальку амаль нічога не засталося.

Галіна Пракопаўна ведала, што мужа не пераканаеш: пойдзе. У яе таксама была пэўная цікавасць, але яна страшэнна не любіла здаваць поўную торбу, а ў ёй апроч хлеба, малака ляжаў качан капусты. І на гэтым хацела схітраваць.

— Ты заходзь, а я пайду, — ведала, што пасля аперацыі ён не дазваляе ёй насіць цяжар.

— Не, так мы не дамаўляліся. Або ты чакаеш мяне на вунь той скамейцы, або я пайду з торбай. Не плаціць жа за яе ахову.

— Ну што за чалавек! Як малое дзіця.

Убачыў яго каля каўбаснага аддзела. Свайго былога намесніка па аддзеле Савета Міністраў — Прытоку 1вана Піліпавіча, ён займаўся матэрыяльным забяспечваннем прамысловых будоўляў. Добры работнік быў, вельмі спрытны, штодня «трусіў» Дзяржплан. Але зрэдку даходзіла да вушэй начальніка аддзела, што нячысты на руку. Стрыжэўскі не верыў: «Што ў нас украдзеш? Станок? Гарэлка і масла — не наша сфера».

З каляскай, напоўненай пакупкамі, Іван спыніўся каля віннага аддзела, вітрына якога шмат каго вабіла.

Музей. Адмысловыя імпартныя пляшкі. Яшчэ больш адмысловыя этыкеткі, па якіх можна было чытаць геаграфію свету — па руінах палацаў, жанчынах з амфарамі накшталт старажытнагрэчаскіх, вінаградніках, размаляваных бочках. Так, тут ёсць што выбіраць! Які піток ён, Адам, — дэгустатар, але і ён неаднойчы падоўгу стаяў перад гэтай выставай, але толькі аднойчы купіў пляшку сваёй беларускай гарэлкі «Два буслы». Буслы гэтыя кранаді ўспамінам пра маленства. Вось гэтак яны стаялі на хаце суседа Макара: той усцягнуў на хату кола. Адась прачынаўся — адразу ў акно: ці стаяць буслы? два? адзін? Калі адзін — трывожыўся: як адпусціла бусліха свайго бусла? Але вось ён прылятаў, яна задаволена клекатала. А калі з'явіліся маленькія жаўтаватыя яшчэ бусляняткі, клёкату стала больш. Клёкат гучаў на ўсю вёску, бо гнёзды былі не толькі на Макаравай хаце. А паехаў, да Чарнобыля яшчэ, наведаць родныя мясціны і вельмі засмуціўся: ніводнага гнязда. Толькі на балоце за рэчкай убачыў адзінокага бусла. Парадаваўся — жывы вястун чалавечай радасці, але і засмуціўся — так мала іх засталося, буслоў. Куды падзеліся? Быў і пасля Чарнобыля. Вёска адселена, ніводнага чалавека не засталося, двары, гароды зараслі быльнікам. Але на балоце хадзілі буслы. Не адчуваюць, не разумеюць птушкі, як небяспечна лавіць тутэйшых жаб, хоць хто ведае: можа, жабы не набіраюць радыяцыі?

З такімі думкамі ён купляў «Двух буслоў», з такімі развагамі піў перад Галяй па чарцы перад вячэрай. Смакаваў. І здавалася горкая

саладкай ад успамінаў пра буслоў. Што тое віскі са старажытным шатландскім палацам! Адна гарката.

Прытока купіў пузатую бутэльку французскага каньяку і дзве пляшкі віна. Не помніў цаны, але ведаў, што віны такія ў недасягальнай для пенсіянера цане.

«Аднак жыве мой былы намеснік!»

Расказвалі, што Прытока — адзін з багатых камерсантаў-прадпрымальнікаў, мае магазін сантэхнічнага абсталявання, бензакалонкі і яшчэ нешта.

Стрыжэўскі не зайздросціў, але яго грызла думка: няўжо накраў Іван яшчэ тады, калі быў яго намеснікам?

— Пад маім кіраўніцтвам краў, — сказаў ён неяк жонцы са злосцю на самога сябе, у вогуле быў злосны на ўсё былое кіраўніцтва. Кралі, зладзюгі! У некаторых пытаў: «Што краў? Як?»

Крыўдзіліся. Галя ту зал а яго:

— Не крыўдзі людзей. Вітацца ніхто не будзе.

— Няхай не вітаюцца — чорт з імі!

Але ўрэшце астыў да іншых. Цікавіў Прытока: пад яго кіраўніцтвам працаваў і актыўны камуніст быў! І на табе! Французскія каньякі жлукціць, паразіт. У яго карцела спытаць: адкуль багацце? Але за тры гады ні разу не давялося сустрэцца з былым намеснікам тварам у твар. Недалёка жывуць адзін ад аднаго. А вось жа не сустракаюцца. Заходзіў у яго магазін. Але ж хіба сам гаспадар гандлюе? Вымуштраваныя на заходні манер хлопцы. Чамусьці настойліва раілі купіць шведскі унітаз. Ён жартаваў: «На кран грошай няма. Я ўжо як-небудзь на старым...»

І вось ён, дарагі намеснік яго, Іван Піліпавіч, аматар камандзіровак, сябра ўсіх дырэктараў машынабудаўнічых заводаў, што добра памагала ў працы аддзела.

У Стрыжэўскага ажно затахкала сэрца. Падыходзіць ці знікнуць у натоўпе пакупнікоў? Прытока стаіць да яго спінай, не бачыць. Як будзе паводзіць сябе пры сустрэчы? Як глядзець будзе? Як багаты на бедняка — з вышыні? Але ж я не пасаромеюся і паслаць... Паду маеш, фігура!

А калі сустрэне па-чалавечы — ёсць прычына пагутарыць з даўняй шчырасцю. Падышоў. Стаў плячо ў плячо.

Іван павярнуў галаву і, здаецца, шчыра ўзрадаваўся:

— Ба! Каго я бачу! Ці ты гэта, Адам Фадзеевіч? Малайцом глядзішся. Паправіўся. А я, глядзі, схуднеў...

Сапраўды, Прытока схуднеў у параўнанні з тым, калі сядзеў побач у кабінеце.

— Ад такога харчу схуднеў? — з саркастычнай усмешкай кінуў Стрыжэўскі на каляску. Прытока нават сумеўся трохі.

— Жонка імянінніца...

— А-а, — паверыў Адам у прычыну багатых пакупак. — Перадавай Яўгеніі Васільеўне... не забыўся я імя? маё віншаванне. Узрост не пытаю. Жонкі нашы заўсёды маладыя, хоць даўно бабулі.

— А схуднеў я, Адам Фадзеевіч, ад клопатаў. Людзі, далёкія ад рынку, думаюць, што жыццё прадпрымальніка — ляжы на запечку і разяўляй рот: піражкі ўпадуць, як таму герою Гогаля. Як яго? Пацюк? Ты так не думает?

— Я? — думаў ён горш, але сказаць — ускладніць адносіны. — Я пра людзей не думаю. Кожнаму сваё. Я пра сістэму думаю. Можаш пасмяяцца, але я па-ранейшаму перакананы, што будучыня ўнукаў нашых — у сацыялізме. Сацыялізм — у вучэнні Хрыста.

— У Бога паверыў?

— Не ведаю, ці паверыў. Але Біблію прачытаў. І тры тамы «Энцыклапедыі хрысціянства» праштудзіраваў. І, здаецца, паразумнеў трохі. Неўміручая філасофія!

— Значыцца, жывеш кнігамі? — адкаціўшы каляску да касы, спытаў Прытока, але не даехаў — спыніўся. — Але духам святым жывы не будзеш. Да яго трэба каўбаса. Пенсію тваю знаю. Сам такую атрымліваю...

— І за пенсію трымаеш магазін? — у Адама Фадзеевіча злосць стэнакардычным болем сціснула грудзіну.

Але загадаў сабе: «Не сарвацца. Не ўмею гаварыць з «новымі».

— Магазін корміць мяне. Не скарджуся. Маю за што каньяк купіць. Ты нідзе не падрабляеш?

— А дзе? Не трэба такія тэхнары. Нямецкіх хапае.

— Не вельмі ж ты жывеш на адной пенсіі.

— Жонка працуе яшчэ. Машыністкай на радыё.

— А вось я забыўся імя тваёй жонкі. Сорамна.

— Галіна Пракопаўна.

— Проста. Але чым прасцей, тым горш трымаецца ў памяці.

У касе Прытока разлічваўся доўга — шмат пакупак. Стрыжэўскі без торбы, з пустымі кішэнямі прайшоў без затрымкі, але перад выхадам спыніўся: чакаў былога калегу, каб развітацца. Той нагрузіў дзве ёмістыя торбы.

— Паднесці?

— Паднясі да машыны.

— Ты сам за рулём?

— Сам.

Да пляцоўкі, дзе стаялі машыны, было недалёка.
На паўдарозе Прытока спыніўся, пільна агледзеў даволі яшчэ дзябёлую постаць «пралетарыя», пасміхнуўся нейкай сваёй думцы.
— А знаеш што, Адам Фадзеевіч, ідзі да мяне на працу.
У Стрыжэўскага неяк дзіўна ўзляцелі на лоб кашлатыя сівыя бровы. Хвіліну маўчаў.
— Кім?
— Запраўшчыкам не пойдзеш?
— Не пайду!
— Забеспячэнцам... не тыя сілы. Паездак шмат. Адкінь свой гонар і ідзі... вартаўніком.
— Вартаўніком?
— Не магазін вартаваць. Не калонку. Дачу.
— У цябе такая дача, што патрэбны пастаянны вартаўнік?
— У наш час усё трэба вартаваць. Падумай. Плачу, як нікому, за такое дзяжурства сто долараў. Грошы ў наш час! Вось табе мая візітоўка. Хатняга тэлефона тут няма. І дачнага. Офіс. Але я там падоўгу не заседжваюся. Звані настойліва, калі надумаеш. Але не цягні. Пакуль што там дзеці жывуць. Але збіраюцца ў Грэцыю на адпачынак.
Паставіў торбу, працягнуў руку, пацiснуў хораша, па-сяброўску, значна цяплей, чым пры сустрэчы. Не сумняваўся, што купіў работніка.
Адам Фадзеевіч, ашаломлены, стаяў і глядзеў Прытоку ўслед, пакуль ён не знік за таніраванымі шыбамі «аўдзі».
Не пачуў, як падышла жонка.
— Пацешыў душу?
— Не. Не пацешыў. Не ўдалося прайсці па аддзелах. Знаёмага сустрэў.
— Гэта той, што пайшоў з важкімі торбамі да машыны?
— Да « аўдзі».
— Я ў іх не разбіраюся.
— Не пазнала — хто?
— Нехта знаёмы, а ўспомніць не магу.
— Прытока.
— Той? Твой?
— Мой! Цяпер невядома, ён — мой, ці я — яго.
— Чым ты ад яго можаш залежаць?
— Ён прапанаваў мне працу.
— У камерцыю не пойдзеш. Ненавіджу.
— Ідэйная,аднак,ты.

— Ад цябе вучылася. Якую працу Прытока прапанаваў?

— Ніколі не адгадаеш. Пералічыш сто пасад...

— Ён мог прапанаваць тое, што прынізіць цябе. 1ншага зажэрны магнат не мог прапанаваць свайму былому начальніку. Во я, а во — ты, смецце за мной падмятай.

— Праца вартаўніка можа прынізіць?

— Вартаўніка? — Галіна Пракопаўна ажно адхіснулася.

— Дачы. Катэджа.

— О Божа! Дажылі!

— А чым дрэнная праца для пенсіянера? На прыродзе. Дзень спі. Уначы... думаю, са стрэльбай хадзіць не трэба. Сумна, канечне. Для маёй калектыўнай натуры. Але прыварак добры: сто долараў паабяцаў. Больш чым стаўка міністра. Валяюцца яны пад нагамі? У нас з табой ніводнага долара. А за Юркаву вучобу трэба шэсцьсот заплаціць. Насця не выцягне.

Галіна спынілася, вочы набрынялі слязамі.

— Адась, родны мой, не ідзі. Не прыніжайся. Няхай згарыць яго дача агнём.

Дарогаю дадому ўгаворвалі адно аднаго: Галіна ледзьве не са слязамі, ведаючы мужаву ўпартасць. Адам Фадзеевіч без знаёмай ёй катэгарычнасці, нібыта з гумарам, але яна адчувала: гумар невясёлы, хістаецца чалавек.

Дома Галіна сказала:

— Давай падключым дзяцей. Правядзём сямейную раду.

Стрыжэўскаму спадабалася ідэя: ёсць прычына сабрацца. Дачкі ён не бачыў месяцы тры: Насця апантана працуе ў праектным інстытуце, а жыве далека, ажно ў Серабранцы. Сына Хведара таксама бачыць хіба позна ўвечары, калі той спакушае і яго паглядзець чарговы бяздарны баявік, ці раніцою — разам голяцца, снедаюць. Пенсіянеру няма куды спяшацца, але ён не парушае хатні рэжым, не прымушае Галю гатаваць два снеданні. Хоць усё роўна абед прыходзіцца падаваць двойчы ды і вячэру нярэдка таксама: маці вельмі сачыла, каб сын быў заўсёды накормлены свежай хатняй стравай, не буфетнай.

Хведар не затрымаўся. Насця прыехала з мужам — маўклівым аўтамеханікам, разгаварыць якога ўмелі толькі жонка і цешча.

Шматслоўны Адам Фадзеевіч і скардзіўся, і абураўся, і смяяўся, што зяць за дзве гадзіны святочнага абеду ў гонар жонкі-імянінніцы ці сказаў два дзесяткі слоў. Апраўдвала яго хіба адно: глупства ніколі не гаварыў, словы ўзважваў, як на лабараторных вагах.

Размову па сутнасці пачалі за сталом у час вячэры. Хведар прымусіў:

— Давай, бацька, пачынай «савет у Філях». Здамо Маскву французам?

— Ён хоча здаць, — сумна сказала Галіна Пракопаўна.

— Дык, можа, у бацькі розум Кутузава? — сказала Насця, выклікаўшы добры смяшок.

— Ты заўсёды будзеш за бацьку, — быццам нават пакрыўджана ўпікнула дачку маці.

— Мама, я нічога яшчэ не ведаю.

— Не цягні, стары, вала за хвост.

Адам Фадзеевіч не без гумару расказаў пра сустрэчу з Прытокам і яго нечаканую прапанову. Змоўк, агледзеў дзяцей: што ў каго адбілася на тварах? Асаблівага нічога. Толькі Насця сцялася, як ад болю.

— Дык у чым праблема? — спытаў Валянцін.

— Маці катэгарычна супраць: гэта прынізіць мяне — вартаваць дачу былога падначаленага! Так, Галка, я перадаю твой пратэст?

— Так.

— Я таксама супраць, — сказала Насця.

— І ты, Брут? — не без расчаравання пажартаваў Адам. — На цябе я спадзяваўся.

— Не трэба прыніжацца, тата, перад такім хапугам.

— Не злоўлены — не дакажаш, што злодзей. Хоць для мяне ўсе Прытокі — загадка. Сапраўды, адкуль грошы?

— Няхай следчыя разбіраюцца. А нам што? — сказаў Валянцін. — Я таксама шукаю, у якую б фірму перайсці з гэтага гаража, каб атрымаць чалавечую зарплату. Колькі вам туз дае?

— Сто зялёных.

— Вартаваць — і больш нічога?

— На словах — так.

— Можна ісці. Гонар не ўкусіш. А ён кусаецца, наш гонар, нас жа і хапае за сцёгны.

Аднак разгаварыўся маўчун!

— Можна ісці, — сказаў Хведар. — Успомніш маладосць: вершы будзеш пісаць. Пісаў жа.

— Пісаў. Толькі ніхто іх не чытаў.

Жанчыны засталіся ў меншасці. Дэмакратыя. Галіна ўзлавалася:

— Ну, ідзі, сцеражы крадзенае дабро! Беспрынцыповы ты чалавек, Адам.

— Страціў я свае прынцыпы, — сумна згадзіўся Стрыжэўскі. У Насці ажно слёзы бліснулі ў вачах: так шкада ёй стала бацькі.

2

На дачу ехалі ў мікрааўтобусе «форд». Прытока паказваў сваю ўласнасць, хацеў, каб Стрыжэўскі пазайздросціў. Але Адам не выяўляў ніякай зайздрасці, бо яе не было. Яго хвалявала адно — уступленне ў высокую пасаду вартаўніка. З імі ехала Прытокава жонка — Яўгенія Васільеўна. Стрыжэўскі ведаў яе з часоў сумеснай службы з яе мужам: разоў колькі былі ў гасцях адзін у аднаго, часцей у Прытокі, ён любіў зборы. Стрыжэўскі не любіў ды і субардынацыі трымаўся: няма чаго запрашаць падначаленых! З імі ехаў яшчэ адзін чалавек, падобны да пратэстанцкага пастыра — кашуля чорная са стаячым каўнерыкам і капялюш чорны, адмысловы — з шырокімі палямі.

Прытока не пазнаёміў іх. Незнаемы сам адрэкамендаваўся:

— Архітэктар Курмеш Алег Іванавіч.

Адам злосна падумаў: лічыць, што раба рабу няма чаго адрэкамендоўваць.

Курмеш не з гаваркіх. Ды і гаспадар быў сёння нешматслоўны. Гаварыла Яўгенія — пра тое, што можна было пачуць у кампаніі жанчын пенсійнага ўзросту, — пра рынак, магазіны, цэны. Стрыжэўскаму падабалася прастата жанчыны, яна адганяла яго змрочныя думкі, ён любіў такіх непасрэдных красамоўных людзей.

Дачны пасёлак, у які Адам Фадзеевіч не наведваўся гады тры, уразіў новым выглядам. На месцы саракагадовых пачарнелых дач выраслі катэджы, гаспадары якіх спаборнічалі ў адмысловасці архітэктуры і аб'ёмах будоўляў. Старыя дачы куплялі ў збяднелых уладальнікаў. Такіх дачных пасёлкаў тры ў ваколіцах сталіцы. Участкі — пятнаццаць сотак, электрычнасць, вада, нават газ падведзены. Што яшчэ патрэбна? Спыніліся на другім краі пасёлка, каля самага, бадай, вялікага катэджа. Палац! Нават вежа, як у старажытных палацах. Навошта? Тут Стрыжэўскі адчуў сябе не наймітам у былога падначаленага, не, больш ніzкай і залежнай істотай, ледзьве не рабом, — упершыню прыйшло гэтае цяжкае, як валун, слова. Яго нават Галіна не прамовіла ні разу. Работнік называла, але работнікі ўсе мы былі і будзем — у дзяржавы, камерсанта, феадала, капіталіста, у Бога, д'ябла. Дзён колькі таму, будучы свабодным, ён, напэўна, пажартаваў бы з вежы.

— Ну вось і мая «хижина дяди Тома».

Архітэктар засмяяўся. Гаспадыня чамусьці пазмрачнела. Адам Фадзеевіч выскачыў і, засланіўшы далонню зыркае ліпеньскае сонца,

найперш паглядзеў на вежу. З гумарам падумаў: «Можа, вежа — гняздо для вартаўніка». Але і гэты жарт не сказаў, бо бачыў, як пільна сочыць за ім гаспадар. Чакае рэакцыі. Не дачакаецца! Агледзеў дом. Архітэктура не ўразіла, акрамя вежы і арачных вокнаў другога паверха. Уразіў плот — цагляны, у два метры вышынёй і з працягам у лес. Хто дазволіў расшырыць участак? Грошы. Грошы ўсё могуць расшыраць.

Збоку ад жалезных варот — цагляны будан.

«Во гэта для вартаўніка, — падумаў Стрыжэўскі. — Мая сабачая будка. Што ж, не горшы варыянт для прытулку».

За варотамі груба гаўкаў ваўкадаў.

Прытока адчыніў калітку — сабака радасна заскуголіў. Гаспадар узяў вартаўніка пад руку і разам з ім наблізіўся да сабакі.

— Знаемся, Бокс, гэта твой кармілец. Сябруйце. Дома сабакі не маеш?

— Шмат клопату. І харчу.

— Не скажы! Але многа і пацехі.

— А я яго баюся і, калі прыязджаю, прашу Івана ўзяць на ланцуг, — сказала Яўгенія.

— Івана на ланцуг? — рагатнуў Прытока.

— Івана я не баюся, ён рахманы.

— Пашчасціла табе, што муж рахманы.

— Рахманы, але спрытны, — сказаў Адам Фадзеевіч. — Як то кажуць? Паварочісты.

— Спалучэнне — што трэба. Дзякуй за высокую ацэнку. Але хадзем пакажу, што табе вартаваць.

Увайшлі ў дом.

Пярэдняя, можа, цеснаватая. Але пакоі ўражвалі прасторнасцю, святлом, паркетам, шпалерамі, яўна зробленымі на заказ. Найбольш падабаўся другі паверх: у меншых, з ніжэйшай столлю пакоях, абабітых вагонкай, была асаблівая ўтульнасць і цеплыня, пахла сасной. А ў пакоі, дзе стаяў більярдны стол, пахла нявыветраным тытунём і каньяком.

Адам прыкінуўся не работнікам — калегам, сябрам.

— Іван, навошта табе столькі пакояў?

У Прытокі пахаладзелі вочы, без усмешкі звярнуўся да архітэктара:

— Курмеш! Навошта ты накурмешыў столькі пакояў?

Архітэктар засмяяўся:

— Такі заказ.

— Сацыяльны? — іранічна спытаў Стрыжэўскі.

— Не ўцягвай мяне ў палітыку. У маім становішчы меншая хата непрэстыжная.

«Аднак, — падумаў будучы вартаўнік. — Высока ён ставіць свой прэстыж».

З балкона другога паверха Прытока паказаў на другі дом у глыбіні ўчастка пад соснамі — на адхопленай тэрыторыі. Дом быў незвычайны. Першы паверх — два боксы гаража. А другі — з маленькімі вокнамі.

— А гэта што? — спытаў Стрыжэўскі.

— Здароўе.

— Што?

— Якія мы дапатопныя! Такі зубр, як Стрыжэўскі, не можа здагадацца аб функцыі гэтага збудавання. За гаражамі — сауна. Там жа — басейн. Яго яшчэ будуюць.

Сапраўды, з будынка, калі прыехалі, выглянулі тры рабочыя ў спецвопратцы.

Спусціліся, паглядзелі «здароўе». Сауна была гатова, у ёй «грэліся», бо з дзвярэй парыльні патыхнула распаранай бярозай.

Басейн авальнай формы рабочыя выкладалі блакітнай пліткай з узорамі казачных рыбак. Выключная плітка. Адам ніколі не бачыў такой, нават цяпер, у імпартны час.

— Плітка з твайго магазіна?

Не адказаў гаспадар, сказаў пра іншае:

— Тры дні назад укралі плітку і латунныя краны. І Бокса не пабаяліся, зладзюганы. Таму і бяру вартаўніка. Свайго. Тут ёсць, але адзін на ўвесь пасёлак. Ды хіба той угледзіць! І адказнасць яго ўмоўная, не спытаеш.

— Дык я буду ў адказе за кожны кран? У прарабы я не пайду, каб сачыць за рабочымі.

— Спалохаўся? Не бойся. Прарабам, каб ты і хацеў, цябе не ўзялі бы. Мы ўмелі кіраваць, але не ўмелі працаваць. За будоўлю адказвае Курмеш.

У Адама Фадзеевіча расла раздражнёнасць супраць гаспадара і яго багацця. Хацелася паслаць Прытоку... Але сто долараў утаймоўвалі ўсе адмоўныя эмоцыі. З-за гэтага было горка, крыўдна.

— Накармі Бокса, каб ён прывык да цябе. Там яму прывезлі сабачы харч, рэкламны.

Гэта было ўжо занадта: загад карміць сабаку. Сам пасля здзіўляўся, як не сарваўся. Падумаў: «Пры чым тут сабака? Ён будзе маім памочнікам, і з ім, сапраўды, трэба ўстанавіць прыязныя адносіны».

Узяў у гаспадыні кулёк, смела падышоў да будкі, насыпаў у вялікую цынкавую талерку знаёмых па рэкламе шарыкаў.

Бокс хапіў адзін, другі, захрустаў і падняў на таго, хто даў харч, вочы, як бы запамінаючы яго, і ў жоўтых вачах яго свяцілася ўдзячнасць.

— Ёсць стыкоўка! — весела гукнуў Прытока. — Лічы — паразумеліся. Хто корміць, таго хутка разумеюць. І звяры, і людзі.

Зноў, што ўдар пад дыхавіцу. І зноў прыйшлося зматаць у клубок распушчаныя ніткі сваіх нерваў.

— Можа, па чарцы вып'еце? — спыталася наіўная Яўгенія. — Столькі працавалі разам.

Іван Піліпавіч кінуў на жонку жорсткі пагляд: не лезь, куды не просядь.

І гэта таксама крутнула, але па-іншаму — больш у бок добрай душы Яўгеніі.

«Пайшлі вы са сваёй выпіўкай».

— Вып'ем. Але не сёння. Сёння мне яшчэ ехаць у Бабруйск. Вось табе ключы. Ад каліткі, ад варот, ад сауны. Але сам не ўключай электранагравальнік. Я цябе навучу. Ад гаража...

— Ад дома?

— Ад дома табе не патрэбны.

— Не давяраеш? — пасміхнуўся Адам Фадзеевіч ужо без злосці.

— Каб не давяраў, то не запрасіў бы. Ну, шчасліва служыць. Я заўтра буду.

— Я хацеў бы з'ездзіць у горад. Зубную шчотку ўзяць.

— Эх, салдат! Ехаў на службу і анучы забыўся.

— Я да вечара вярнуся, — пайшоў, пагладзіў сабаку. — Чакай, Бокс. Я цябе не падвяду.

— Правільна! — рагатнуў Прытока. — Падвесці можна гаспадара, а не яго сабаку.

У машыне чамусьці працяглы час маўчалі. Усе. Нават гаварлівая гаспадыня. Урэшце Іван спытаў:

— Чаму маўчыш, Адам Фадзеевіч?

— Думаю.

— Пра што?

— Хіба няма пра што падумаць?

— Ёсць, канечне. Думай, думай. Гэта добра, калі думаецца. Чалавек актыўна жыве. І нешта можа прыдумаць.

Выскачыўшы з мікрааўтобуса, Адам Фадзеевіч, не азіраючыся, махнуў рукой: бывайце. А ўголас сказаў:

— Апошні раз я цябе бачу, дабрадзей! На халеру мне твой палац!

Але пахадзіў па двары, павітаўся з пенсіянерамі, з якімі праводзіў час. Сумуюць людзі без працы! А ёсць жа яшчэ здаровыя мужчыны. Намацаў у кішэні ключы на бірульцы, дастаў, пакруціў у руцэ і раптам вырашыў бадай з радасцю за тое, што воля ёсць.

— Не! Паеду! Паспытаю і такога хлеба!

Канапка была жорсткая, зробленая, як знарок, каб вартаўнік моцна не спаў. Да таго ж кароткая — ногі ўпіраліся ў сцяну. Павернешся — калені вісяць.

Адаму сапраўды не спалася. Першыя ночы гэтая «сабачая будка» так не абражала: натуральнае месца вартаўніка. А ў тую ноч у галаве грымела, як на небе. Набліжалася навальніца. Бліскала, грымела. Ад страху, пэўна, скуголіў у сваёй будцы Бокс.

Чалавек-вартаўнік таксама па-свойму скуголіў: стагнаў, уздыхаў, мацюкаўся, чаго амаль ніколі не рабіў. На гэтай усходцы, на якой апынуўся за сотню зялёных, выяўляць свае пачуцці дазволіў сабе адпаведна становішчу. Яго абурэнне супраць Прытокі, якое за тыдзень службы як бы сцішылася, набліжалася з хуткасцю і магутнасцю блізкай навальніцы. Тыя дні спакойна спаў, відаць, таму, што начавалі гаспадары: сам Прытока, Яўгенія, іх дачка Раіса з мужам і малымі дзецьмі. Учора маладыя паехалі ажно ў Грэцыю. Гэта было адзінае, чаму Адам пазайздросціў. «Пражыў жыццё, даслужыўся ажно да халуя, а мала куды з'ездзіў, мала што пабачыў, — але тут жа ўпікнуў сябе: — Не грашы, Адась, па Саюзе паездзіў, ва ўсіх рэспубліках не адзін раз быў. А хіба ў нас, у той жа Грузіі, Арменіі, менш экзотыку чым у Грэцыі ці Іспаніі? І гісторыі не менш. Толькі ведаць яе трэба. Мы не ведалі. Цяпер, разваліўшы Саюз, пачалі цікавіцца, хто яны такія — чэчэнцы, напрыклад. Толькі чым захапіцца ў той жа Арменіі? Усе збяднелі — вінаградныя і тундравыя. Дзякуй Богу, мы без нафты і ўрану не бядней за іншых. Трымаемся. На чым? Апускаемся і мы, ідзём у батракі да Прытокаў».

Навальнічная ноч, маланкі як бы распалілі яго злосць на Прытоку. Менавіта ў гэтую ноч яго абурэнне дасягнула апагея. І ўласнае прыніжэнне яго прычыніла сардэчны боль. Боль гэты знаёмы, ён упершыню з'явіўся, калі загадчык аддзела пакідаў кабінет у Саўміне, не разумеючы, што здарылася ў краіне, магутнай, узброенай атамнымі бомбамі. Да каго пераходзіць улада? Праўда, у нас не глушылі абухом па галаве, ва ўладзе застаўся той жа добры Кебіч. Але ад старых, без дасягнення пенсіі, пазбаўляліся. У імя чаго? Дзеля каго?

Добра, што і прытокі пакідалі высокія паверхі. Але выявілася, што прытокі адыходзілі не з пустымі рукамі.

«Дзе накраў? Пад маім кіраўніцтвам!»

І гэта выклікала асаблівы гнеў. З такога пачуцця ў многіх людзей узнікае бунт. Хацелася гукнуць у навальнічную ноч:

— Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!

Каму гукнуць? Адкуль? З сабачай будкі? І хто ты такі? Вартаўнік украдзенага ў гэтых хлопчыкаў дабра?

Хіба ў такую ноч з такімі думкамі заснеш? Падняўся. Вобмацкам не знайшоў аднаго чаравіка. Уключыў святло. Дзіўна яно падзейнічала: асвятліла навальнічныя эмоцыі і... патушыла іх. Выходзіць, страсці палалі ў цемры пад успышкі бліскавіцы і грымоты. Катаецца Ілья на свяшчэннай калясніцы.

Вылез з будкі: Бокс радасна завішчаў, пэўна, яго палохала навальніца. Глянуў угору і ўбачыў, як дзівосна свеціцца «касмічная антэна» — пералівамі святла — белага і блакітнага.

Любуючыся антэнай, на нейкі момант забыўся, каму належаць тэлевізары. Некалі ён курыраваў тэлевізійны завод і трымаў у свядомасці катэгорыі народнай уласнасці. Тэлевізары, іх два ў доме — карэйскі, «Самсунг», — і ўсё ж...

Мацюкнуў гаспадара.

— Чаму ты баішся даць ключ ад дома? Што там у цябе, што я мог бы з'есці? Паглядзеў бы тэлевізар у ранні вечар. А ў такую навальніцу іх варта адключыць і ад электраэнергіі, і ад антэны.

Схамянуўся. Вылаяў сябе.

— Аднак у цябе нараджаецца халуйская псіхалогія. Ды няхай яны згараць гэтыя «самсунгі». Будзе ведаць бос, як не давяраць. Добры гаспадар мог бы і пакойчык адвесці з ложкам, дзе можна было б па-чалавечы адпачыць. Уначы не спіш — няма на чым, удзень — машыны і бульдозеры гудуць побач...

Чаго захацеў. Якой увагі. Гэта табе не прафсаюз! Хочаш зарплату, якую мае цяперашні загадчык аддзела, — не так многа нашых родненькіх з балярынамі, сядзі ў сваім боксе разам з Боксам. Бяздарнае імя даў і добраму сабаку. Скажы дзякуй, што цябе не прывязваюць на ланцуг. Бокса — на дзень, цябе — на ноч каля плота ад лесу. Прыйдзе час — прывяжуць. Няхай «новыя» набяруць сілу і возьмуць уладу. Яны пакажуць нам дэмакратыю — у вачах пацямнее.

Бліснула над галавой, не пракатаў — ляснуў гром каротка і моцна, ажно па вушах ударыла. Упалі буйныя кроплі дажджу.

— Хавайся, Адась, ад прыроднай стыхіі. Ад сацыяльнай не схаваешся. Яна ўжо цябе паставіла на калені, сагнула.

Калі Стрыжэўскі заступіў на варту, на дачы жыла дачка Прытокі з двума дзецьмі, хлопчыкам і дзяўчынкай, а на ноч прыязджаў сам гаспадар — часам адзін, іншы раз з жонкай. Гаспадар асаблівых

інструкцый не даваў, асаблівай пільнасці не патрабаваў: спіш у сваёй будцы — cпі. А потым сам некуды мусіў ехаць — рабіць бізнес. Тады сказаў вартаўніку:

— Галоўны твой аб'ект на гэтыя тры ночы — дзеці. За іх адказваеш галавой.

Баяўся багаты нападу. Адам хацеў сказаць: «Дзяцей сцерагчы я не наймаўся». Але стрымаўся: дзеці ёсць дзеці, іх заўсёды і ўсюды трэба сцерагчы, сваіх і чужых.

З Раісай жыццё было шыкоўнае: яна вартаўніка карміла тым, што ела сама і дзеці, а гэты харч, які ён еў у тыя даўнія часы, калі займаў пост, роўны міністру, з'яўляўся хіба на святочным яго стале. Не жыццё — маліна. Галіна спытала неяк па тэлефоне:

— Можа, табе ежы прывезці?

— Ды ты што! Мяне тут закормліваюць заморскімі прысмакамі. Жыву, як кот!

Раіса паехала купацца ў Міжземным моры. І на другі дзень гаспадар не прывёз яму нават хлеба. І на вячэру не запрасіў. Увогуле паводзіў сябе васалам. З машыны не вылез адчыніць вароты, сігналіў сярдзіта: адчыняй! Адам не адразу нават здагадаўся, што гэта ён; ці мала ў пасёлку машын! Па тры ў некаторых. Дзіўна, што ў Прытокі толькі дзве — «аўдзі» і «форд», мікрааўтобус; ездзіў Іван Піліпавіч на «аўдзі», сыну Вадзіму машыну не давяраў ні малую, ні вялікую. Стараста пасёлка Самарын Васіль сказаў па сакрэце, што ў Вадзіма, у п'янага, ДАІ забрала правы. Бацька пэўна вырашыў не выкупляць іх дзеля сынавай бяспекі. Разумна.

Дачка паехала, і бацька абвясціў, што едзе за мяжу.

— Адпачываць, Іван Піліпавіч?

— Які адпачынак. Рабіць справу. Я не адпачываў ужо гадоў восем, забыўся, што гэта такое — адпачынак. У гэтым сакрэт усяго, што я нажыў, чаму зайздросцяць людзі. Зайздросціш?

— Павер, што не. Няма ў мяне тваёй жылкі. І добра, што няма. Спакайней жыць. А так пагнаўся б за табой і, не дагнаўшы, спляжыўся б... Надарваў бы сэрца.

Прытока засмяяўся.

— Цяпер ты разумееш, як ён рос, капіталізм, які Маркс і Ленін хацелі знішчыць. Тонкая кішка. Прыватнаўласніцкія гены самыя жывучыя. І множацца яны па меры росту ўласнасці.

— Ісус выступаў супраць уласнасці. Помніш у Новым Запавеце? Ад Мацвея ці ад Лукі...

— Гэта толькі пацвярджае маю думку. Калі і вучэнне Хрыста за дзве тысячы гадоў не перарабіла прыроду чалавека...

Між іншым, гэта была, бадай, апошняя палітычная спрэчка. Больш Прытока не лічыў патрэбным спрачацца з вартаўніком — батраком сваім...

— Кал і я сігналю, адчыняй вароты.

«Які пан», — падумаў, а ўголас адказаў:

— Слухаюся, Іван Піліпавіч.

І пасля такога лакейскага адказу сам на сябе плюнуў: «Адам! Не прыніжайся!»

Толькі паставіўшы машыну ў гараж і ідучы ў дом, Прытока павітаўся са сваім былым начальнікам: падаў руку, але не ўсю далонь, з поціскам, як звычайна вітаюцца людзі, а толькі два пальцы, бо на мезенцы віселі ключы ад машыны. Ведаў Адам Фадзеевіч гэтую хамскую манеру: быў у іх адзін намеснік старшыні, які так вітаўся з падначаленымі. Гэта ўсіх абурала. І ён нядоўга кіраваў; з'яднаўшыся, і ніжэйшыя могуць зваліць «высокага». Пры той, партыйнай дэмакратыі. Прытоку не зваліш, бо і аб'яднацца няма з кім.

Харчу Прытока зноў не прывёз, хоць вартаўнік прасіў прывезці хлеб, грошы прапаноўваў, ад чаго багач грэбліва скрывіўся. Але, будзе такі туз купляць хлеб для вартаўніка!

Прыйшлося ісці да суседа — старасты пасёлка —г пазычаць хлеб. Той пачаставаў, даўно запрашаў, ды Адам Фадзеевіч адмаўляўся, хоць пасля папракаў сябе: выходзіць, баіцца гаспадара. Ганьба!

На гэты раз выпіў — на злосць гаспадару. І позна ўвечары сутыкнуўся з Прытокам: пайшоў у лазню набраць вады, а туз стаяў голы, выціраўся ручніком, толькі што пакупаўся ў басейне ў непадагрэтай вадзе.

— Вытры мне спіну, Адам, чалавек першы.

У звычайнай лазні чаму не выцерці нават чужому. А тут... Што гэта — чарговы прыём прыніжэння? Завагаўся.

— Добра натры. Каб гарэла.

— Спаць не будзеш.

— Буду. Слухай, даўно хацеў сказаць: на людзях звяртайся да мяне на «вы». Госці мае не зразумелі, прыйшлоея тлумачыць. Смяяліся, як мы памяняліся ролямі.

— «Вы» дык «вы», мой дабрадзею. Давайце ручнік. Цёр — як толькі скуру не здзёр. Пад лёгкім жа «парам» быў. І пар гэты гаспадар пачуў.

— Адам Фадзеевіч, прабач, але я мушу... Яшчэ раз пачую такі дух ад цябе — размова ў нас будзе кароткая.

— У Самарына быў — ён чарку наліў, — і вылаяў сябе: «Перад кім я апраўдваюся?»

— У Самарына ці ў Куйбышава — не мае значэння. Ты на службе. Па начах не спіце! Можаце ўдзень адсыпацца...

Цэлы вечар пляваўся, што цёр нахабніку-злодзею задніцу.

«Яшчэ адно такое ўніжэнне — і будзь здароў, Іван Піліпаў. Згары ты разам са сваім палацам!»

Раніцою, калі Прытока паехаў (тэлефон у будцы быў паралельны, але падключаны так, што ён размовы з палаца не чуў: адключаўся апарат у будцы, а яго, трэба думаць, слухалі), пазваніў Галіне:

— Хлеба мне прывязі.

— Што? Не корміць карміцель-паіцель? — нявесела засмяялася жонка.

— Таўсцею вельмі ад іх ежы.

— Дык, каб не таўсцеў, да хлеба трэба яшчэ нешта?

— Трэба.

— Так бы і казаў ад разу.

Прытока паехаў за мяжу, і ў той жа дзень пад вечар з'явіўся яго сын Вадзім з дзяўчынай. Пазнаёміў:

— Мая нявеста Валя. Праўда, я маю густ?

Валя зачырванелася, шчыра засаромелася.

— Калі ласка, Вадзім.

— А я не цябе хвалю. Я сябе хвалю, што з тысяч дзяўчат, якія шлындаюць па Мінску, выбраў цябе. Ганарыся!

Адаму Фадзеевічу дзяўчына спадабалася. Не з тых, што шлындаюць, як сказаў шматвопытны жаніх. Ён паважаў маладых людзей, не сапсаваных яшчэ амерыканскімі фільмамі — такімі, што вусцішна іх глядзець з уласнай жонкай.

Валя запрасіла вартаўніка на вячэру. Можа, таму, што адрэкамендоўваючы яе, Вадзім сказаў:

— Адам Фадзеевіч, былы міністр. Цяпер пенсіянер, адпаведна свайму званню знайшоў службу.

— Мяне знайшлі. Твой бацька. У мінулым — намеснік мой.

Вадзім сказаў нявесце:

— Вучы сацыялогію на асобах пераходнага часу. Валя — аспірантка і піша дысертацыю па сацыялогіі. Як яе называеш? «Асоба ў перыяд пераходнай эканомікі». Так?

— Інтэлігенцыя ў гэты перыяд, у пераходны.

— Сур'ёзная тэма.

І ўжо за сталом Стрыжэўскі спытаў:

— І як вы ацэньваеце яе — інтэлігенцыю?

— Па-рознаму. А хіба яна не розная? Навуковая, мастацкая і тая, што пайшла ў камерцыю. Мяне цікавіць апошняя. Матывы разрыву з былымі прафесіямі. І куды яна ідзе?

— У капіталізм.

— Не так проста. Калі прыняць такі тэзіс, тады няма чаго даказваць, няма чаго вывучаць. Я капаю глыбей. Як яна разлагаецца.

З галавой дзяўчына. Але чамусьці спрачацца з ёй не хацелася, можа, баяўся, што аспірантка загоніць яго ў кут.

Прапанавалі каньяк. Стрыжэўскі адмовіўся. Ці не дзейнічала папярэджанне старога Пратокі? Не! Пляваў ён на яго папярэджанне. Аднак сказаў:

— Мне вартаваць.

— Іван Піліпавіч баіцца, што ўкрадуць катэдж?

— Не катэдж, а нас з табой. А раней — Раю з дзецьмі. Палезе які дурань — напалохае.

— І вы цэлую ноч не спіце?

— Сплю. Але чуйна. У мяне ж ёсць памочнік — Бокс. Загаўкае — я на нагах.

— І што вы рабілі б, каб хто палез?

— У мяне ёсць стрэльба, я паляўнічы... зараджаная соллю.

— Чым?

— Вось ёю, — паказаў на сальніцу, — толькі буйнейшай. Некалі ў юнацтве я пакаштаваў солі, прабачце, мяккім месцам... за яблыкамі лез да суседа. Да гэтага часу помню. Успомню — баліць.

Валянціна і Вадзім зарагаталі.

Не спадабалася Стрыжэўскаму, што дзяўчына засталася начаваць. Але разважыў: а ці шмат цяперашніх нявест захоўваюць цнатлівасць да шлюбу? Вадзіму і Валі не па семнаццаць, год ужо сустракаюцца. Ён у якія часы — у патрыярхальныя! — у райцэнтры спакусіў Галіну да таго, як пажаніліся.

Ляжаў у будцы пасля добрай вячэры з дарагім віном (віна выпіў), і ў яго з'явіліся эратычныя пачуцці — ад успамінаў пра маладосць, пра блізкасць з жонкай, ад уяўлення, чым займаюцца побач у катэджы Вадзім і Валя. З гумарам падумаў: «Ёсць яшчэ порах, дзед. А што за дзіва! Шэсцьдзесят пяты год. Жэняцца ў семдзесят пяць, у восемдзесят нават. На ўсходзе, дзе ёсць магчымасць ажаніцца з маладой, дзяцей робяць. Гарманальная сфера не так хутка старэе».

Але хутка думкі ад саромнага пераключыліся на сур'ёзнае. Выпіўшы каньяку, Вадзім выдаў яшчэ адзін бацькаў бізнес. Пачалося з яго вадзіцельскіх правоў. Не без хітрасці Стрыжэўскі спытаў:

— Няўжо ўсемагутны Прытока не можа выкупіць тваё пасведчанне?

— Хочаце шчыра? Дык я вам скажу. А мне і не хочацца мець іх.

— Чаму?

— Я не хачу ездзіць у Германію. Спачатку цікава было, а потым я звяў, памятаю, як нас патрэслі пшэкі. Во гады! Пісталет каля вуха трымалі.

І Вадзім расказаў пра бізнес, якім бацька займаецца дагэтуль, але ўжо без сына. Яны ехалі ўтрох (і бацькаў шафёр) цягніком у Германію, добра схаваўшы долары.

Куплялі там патрыманыя машыны. І пригнялі ажно шэсць штук. Навар быў — дай Бог. Цяпер бацька ездзіць з Андрэем, нікога трэцяга браць не хоча, не давярае, таму і злосны на яго, Вадзіма, што ён «прапіў» правы свае.

— Во табе тэзіс, Валя, як нарошчваецца капітал. І як мяняецца псіхалогія ў людзей.

— А другі тэзіс — мой лес: з міністраў — у вартаўнікі, сцерагчы капітал, — сказаў Стрыжэўскі.

— Вас гэта моцна прыніжае, што вы на такой службе?

— Не, не прыніжае. Я зарабляю на хлеб.

Сказаў няпраўду: пачуццё прыніжэння астыла, але часам узгараецца, як з вугольчыка агонь.

## 4

Прыехала кампанія: тры хлопцы, тры дзяўчыны, Валі сярод іх не было. І дзяўчаты гэтыя, як кажуць, «пазнаваліся па паходцы»: тыя, што зарабляюць на жыццё сваім целам. Ад іх убрання, парфумы несла вульгарнасцю.

Стрыжэўскі разгубіўся: уявіў, якая вакханалія можа распачацца ў гэтым чысценькім яшчэ катэджы. Чысціню і парадак там, пасля ад'езду дзяцей, наводзіла сама гаспадыня Яўгенія Васільеўна. Гэтая высокая, з выгляду нязграбная жанчына ў працы паказала сябе надзвычай увішнай. Адаму ажно захацелася памагчы ёй. І памог. Так што, да парадку ў кухні, у сталоўцы, на тэрасе і ён прыклаў рукі; таму і сваёй працы было шкада. З'явілася думка: не пусціць такую падазроную кампанію. Але як ён не пусціць? Сын гаспадара — сам гаспадар. У яго ключ ад катэджа, а яму, вартаўніку, ключа не даверылі: ён — вартаўнік. І Стрыжэўскі чартыхнуўся: «Ды пайшлі вы! І старыя, і маладыя! Рабіце што хочаце!»

І маладыя рабілі што хацелі. Святло запалілі амаль ва ўсіх пакоях першага і другога паверхаў. На ўсю ваколіцу грымела музыка

— тая музыка, якую ён, стары кансерватар, ненавідзеў гэтак жа, як многае іншае, што падкідвалася праз акіян вось такім вадзімам, такім учарашнім школьнікам, якія пісалі сачыненні пра высокія матэрыі, класічных герояў, пра свае жыццёвыя мары. І вось іх мара...

Горка і брыдка было старому чалавеку. Плакаць хацелася. Пасадзіў сябе ў будку і чытаў «Тры сястры» Чэхава. Раней глядзеў у тэатры і асаблівага захаплення не меў, а тут папрасіў жонку прывезці што-небудзь пачытаць. Галіна прывезла том п'ес, бо лічыла «Чайку», «Тры сястры», «Вішнёвы сад» вяршыняй сусветнай драматургіі: Шэкспір, Мальер, нават Талстой — значна ніжэй; настаўніца не даказвала гэта вучням, але сваіх дзяцей, мужа, блізкіх перakанала.

— Сядзі, Адась, пад соснамі і чытай Чэхава. Смутак іх, сясцёр, і смутак мой зліваюцца, мне робіцца лягчэй.

Адам разгарнуў том і прачытаў словы Вяршыніна: «Через двести, триста лет жизнь на земле будет невообразимо прекрасной, изумительной».

«О Божа! Стала жыццё хоць трохі лягчэйшым праз сто гадоў? Ад гэтай лірыкі? А праз дзвесце? Што будзе праз дзвесце? Паляцім на Марс? Можа, і паляцім. Але ці стане чалавеку лягчэй жыць? Ці знікнуць боль і смутак? Войны, голад?»

Каб не гэтая дурная музыка, што аглушыла лес, пасёлак, з Чэхавым ён забыўся б на ўвесь бардак, які робіцца навокал і ўвогуле ў свеце. Вось яно — «изумительное» жыццё!

Вадзім званіў удзень з горада, прасіў напусціць у басейн вады. Вада была там, нагрэлася ад ліпеньскай спёкі, ён сам «умацоўваў нервы» — акунаўся раніцой.

Ведаў, што пасля музыкі і каньяку палезуць купацца.

Выглядваў у акенца. Убачыў: пайшлі ўсе разам. Купацца, безумоўна, будуць разам, церціся адно аб аднаго ў невялікім басейне, як карпы ў магазінным карыце.

«Няхай робяць што хочуць, мяне не датычыць».

Паглыбіўся ў чытанне, узрадаваны, што наступіла вязкая, што мёд, вячэрняя цішыня.

Але не вытрымаў.

«Трэба глянуць. Каб падагравальнік не ўключылі. Спаляць. Чужое дабро, а шкада».

Але не пайшоў праз дзверы памяшкання, дзе размяшчаўся басейн. Пайшоў праз гараж. Ад гаража ключ Прытока чамусьці даверыў.

З гаража дзверы вялі ў вузкі накой, які гаспадар, калі паказваў сваё збудаванні, назваў чамусьці «сакрэтным». Хоць што ў ім сакрэтнага? Тут стаялі нізенькі столік і два старыя крэслы.

З «сакрэтнага» — ход у сауну, у парыльню з трохпрыступкавым «лежаком» з габляваных бярозавых дошак. Можаш — лезь на самы верх, не можаш — грэйся ўнізе.

З сауны — дзверы ў басейн. Дзверы былі адчынены. І Адам Фадзеевіч убачыў тое, чаго не бачыў у самых амаральных фільмах — брыдкую сексуальную оргію.

Усё гэта было настолькі нечалавечае і так абразіла чалавечую сутнасць старога, што яму захацелася закрычаць на гэтых адзічэлых жывёл. Але інстынкт самааховы прымусіў падумаць, што ў сваім звярыным экстазе яны проста ўтопяць яго. Загінеш не за нюх табакі.

— Цьфу! Брыдота!

Чым жа скончыцца такая оргія?

Стаміліся «героі». Селі на бар'ер басейна ўсе шасцёра. Адна з путан яшчэ раней дастала з рыдыкюля доўгую, як бы самаробную, цыгарку. Запаліла, зацягнулася. Другая крыкнула:

— Эй, глядзі, не выцягні ўсю. Мы цябе ведаем.

Курыльшчыца перадала цыгарку ёй. Тая — Вадзіму. І так, седзячы, без слоў, жанчыны і мужчыны глыбока зацягваліся. І вочы іх пачыналі блішчэць, як у катоў. Наркотык!

Адкрыццё такое не толькі абурыла Адама Фадзеевіча — пэўным чынам спалохала. Не ведаў і не думаў, што нетолькі недзе там, у амерыках, але і ў нас так труцяць сябе наркотыкамі. Людзі з вышэйшай адукацыяй — Вадзім прынамсі.

Моцна ляпнуў дзвярамі. Спадзяваўся, што грук разгоніць гэты прытон. Дзе там! Яшчэ добрую гадзіну не выходзілі з басейна. А потым зноў аглушальная музыка з катэджа і жаночы віск. Адам пастукаў у дзверы:

— Спыніце музыку!

— Дзед! Не лезь не ў свае справы. І не падглядвай за маладымі. Зайздросціш? Сорамна старому!

Сапраўды, навошта яму лезці не ў свой агарод? Захацеў перавыхаваць тых, хто апынуўся ў балоце? Апусці рукі, дзед!

Раніцой дзяўчаты выскачылі чарадой не на вуліцу — у лес. Хлопцы выходзілі па адным, як пабітыя сабакі. Вадзім пайшоў апошні. Зазірнуў у будку, папярэдзіў:

— Дзед! Ты ж глядзі! Шануй сваё месца. Твая хата з краю.

— Мая хата з краю.

— На табе ключ, прыбяры там. Насвінячылі мы.

Але Адам Фадзеевіч не стаў прыбіраць. А ўдзень прыехала гаспадыня. Агледзела «парадачак», не стрымалася, прыйшла ў будку, паскардзілася:

— Вадзік пагуляў. Брыдка глядзець. Такі неарганізаваны хлопец. І дома ў яго ўсё раскідана.

«На што іншае — на брыдоту ён спрытны», — са злосцю на бацькоў падумаў Стрыжэўскі. Карцела расказаць, што свінства на кухні, у сталовай нішто ў параўнанні з тым, што ён бачыў у басейне. Але пашкадаваў маці, ды і саромеўся расказаць пра такое жанчыне.

Памог ёй прыбраць. Пранікся павагай да багачкі, якая не цуралася ніякай бруднай працы і рабіла ўсё ўвішна, акуратна.

Дні праз два прыехаў Прытока. Сам на «аўдзі», а за ім — вялізны фургон. Фургон загналі ў двор, і двое цяжкавагавікоў разгрузілі з яго цяжкія скрынкі.

Стрыжэўскі стаяў, глядзеў. Прытока хадзіў міма, перакідваўся нязначнымі словамі накшталт: «Як ты тут? Нармальна? »

— Як вы з'ездзілі, Іван Піліпавіч?

— Ды вось, бачыш, што-нішто набыў.

Але што — не сказаў. Памагчы не папрасіў. І здалося Адаму: гаспадар сачыў, каб вартаўнік не пайшоў услед за грузчыкамі.

Скрынкі насілі ў катэдж, і па галасах было чуваць: спускаліся ў падвал, якога яму не паказалі. Што ў гэтых скрынках? Не унітазы ж. Сантэхніку бізнесмен завёз бы ў магазін. Навошта яму «перасадка»? Прытока ўмее лічыць грошы. Значыцца, нешта такое, чым ён адкрыта не гандлюе. Сакрэтны тавар. Невядома, што ён, Адам, сцеражэ тут. Пэўна ж, штосьці такое, што прыйшло кантрабандай ці будзе адаслана кантрабандай, неабавязкова на захад, можа, і на ўсход, у Расію, на мяжы з ёй мытні толькі на магістральных шляхах. Ды і груз яны правяраюць так сабе — дзеля заспакаення сумлення.

Скрынкі не давалі заснуць — хацеў адгадаць, што ў іх, якой яшчэ камерцыяй займаецца Прытока. Што і адкуль яму прыплывае? Вось ужо сапраўды прытока!

На наступны дзень гаспадар доўга спаў — змарыўся за тыдзень «камандзіроўкі». Прыехала Яўгенія Васільеўна. Не стаіла, расказала, мусіла расказаць, бо асушылі Іванаў бар — выжлукцілі марачны каньяк. Калі прыбірала, пра гэта не падумала, не магла падумаць, бо бар зачынены на ключ. Выходзіць, Вадзім меў свой ключ.

Стрыжэўскі чуў, як бос грымеў на жонку:

— Распусціла сукінага сына!

— Я распусціла? Сам ты і распусціў. Хто прывучыў яго да каньяку? Бацька. «Адна чарка не пашкодзіць». Во табе і чарка!

Увечары Прытока папрасіў вартаўніка пасцябаць яго венічкам у сауне. Адам узрадаваўся: ёсць магчымасць папарыцца і самому, даўно марыў, але ніхто не запрашаў, а сам не адважваўся ўключаць награвальнік: не па рылу такая раскоша! Прытоку не спадабалася б!

Голыя яны як бы сталі роўныя, у лазні ўсе роўныя. Акунуліся ў басейне, зноў палезлі на паліцы.

— Распарыць старыя косці, — сказаў Іван Піліпавіч. І размякчэлы, прыгадаў Вадзіма:

— Жонка кажа, што здорава насвінячылі... Сынок мой з гопкампаніяй. Што ты не ўгаманіў?

— Я? Яны з мяне мачалку зрабілі б.

— Колькі іх было?

— Трое. З Вадзімам, — і запнуўся: казаць, не казаць?

Здагадаўся Прытока:

— І... колькі з імі?

— Тры. Адпетыя прастытуткі.

— І ў басейне купаліся?

— Не проста купаліся. Такое выраблялі!.. — І Адам Фадзеевіч намаляваў жывапісную карціну таго, што бачыў. — І курылі адну цыгарку. Можаш здагадацца, што гэта.

Загарэлы распараны твар боса наліўся крывёю, а вочы зрабіліся жоўтыя, ён цяжка задыхаў.

— Сволачы! Яшчэ заразу занясуць. Ваду ты мяняў?

— Мяняў.

— Але не памыў з хлоркай. Спусціў ваду, напусціў вады, — у Прытокі гнеўна заторгаліся сківіцы.

— У басейн, можа, і не занясуць. А што Вадзіма могуць надзяліць СНІДам — дык гэта вельмі нават рэальна ў наш час. А яшчэ другая небяспека — прывыкне да наркотыкаў.

Твар Прытокі з чорнага стаў шэрым.

— Ідыёт! Трыбухі выпушчу!

— Да гэтага ён прыязджаў з нявестай. Культурная дзяўчына, Валя, аспірантка. Не думаю, што яны не жывуць. Мала яму? На ліха яму панельныя дзеўкі! Не семнаццаць гадоў. Жаніце яго хутчэй.

— Я яго ажаню! — і паставіў кропку, перапыніў непрыемную размову:

— Добра, Адам. Дзякуй за інфармацыю. У лазні мы можам і на «ты».

У басейн больш не пайшоў — пабаяўся заразы. Адам, аднак, з прыемнасцю акунуўся.

А дні праз два ўбачыў, як Прытока «жаніў» сына.

Вадзім прыехаў з раніцы з сябрам. Бацька ў гаражы корпаўся ў машыне. Вадзім крыкнуў яму:

— Прывітанне, бацька!

Не адказаўшы, Прытока выйшаў з гаража, падышоў і замасленай рукой уляпіў сыну гучнага «ляшча», раз, другі...

Хлопец адскочыў, крыкнуў:

— За што?

Сябра яго спалохана выскачыў за брамку.

— Не знаеш — за што? Пачну тлумачыць — горкі яблык з цябе будзе! Сукін сын! Падонак! З кім звязаўся! З прастытуткамі!

Вадзім гнеўна бліснуў вачамі на будку і, баязліва адступаючы ад бацькі, выскачыў на вуліцу.

— Не паказвайся мне на вочы! Няхай цябе прастытуткі кормяць!

Дапякло. Не баяўся, што пачуюць суседзі.

Праз тыдзень Вадзім, аднак, прыехаў на дачу. Выходзіць, ключы ў яго не забралі. Са Стрыжэўскім размаўляў — як быццам нічога не здарылася. Запрасіў глядзець тэлевізар. Дэмакрат!

Адам Фадзеёвіч з хітрай наіўнасцю спытаў:

— Што гэта твой бацька ўсё давярае: гараж, сауну, а ў дом не пускае? Што я вартую?

— У бацькі майго шмат дзівацтваў. Ён чалавек непрадказальны.

— Калі разам працавалі, я не лічыў яго дзіваком. Разважлівы кіраўнік. Кантактны.

— Працаваць ён умее. І ладзіць з людзьмі.

На тэлевізар Адам спакусіўся. І ад чаркі каньяку не адмовіўся. У думках пахваліў Вадзіма, што той незлапамятлівы. Іншы не дараваў бы такога даносу.

Паглядзелі навіны. Вадзім каменціраваў падзеі даволі трапна, выказаў задавальненне, што епынілі бамбардзіроўкі Югаславіі. Такая гуманнасць хлопца, еалідарнасць з далёкімі сябрамі ўлагодзіла Адама Фадзеевіча ў адносінах да яго. Недурны хлопец. Дзіўна было б, калі б чалавек, які скончыў універеітэт, быў доўбня доўбняю. Аднак оргія ў басейне... Заносіць іх, ох заносіць!

Вадзім на вечар зменшыў узровень адзіноцтва, якое ўжо гняло Адама, хоць побач жылі людзі. Але некаторыя нават з тых, хто жыў у запляснелых старых дачах, ставіліся да яго як да добраахвотнага вартаўніка добрага капіталіста. Прытока ў пасёлку быў новы чалавек, купіў старую дачу ва ўдавы, разбурыў яе і першы збудаваў шыкоўны палац; з ім не збліжаліся, не хадзілі на паклон, ды і ён паводзіў сябе аднаасобнікам і мала з кім завёў знаёмства. Вітаўся, праўда, з усімі, хто ішоў пасёлкам, але вітаўся так, быццам рабіў ласку. А людзі былі з

гонарам, выхаваныя ў іншых сацыяльных умовах, і на ўласніка катэджа глядзелі як на злодзея. Пра ўсіх багатых народ меў такую думку. А дзе можна было зарабіць грошы на такі палац? Не адна сотня тысяч долараў. Украсці. Можа, не ў прамым сэнсе, але падпольны бізнес (што ў скрынках?) — хіба не тое ж рабаўніцтва ў дзяржавы ці ў другога такога ж «удачніка».

Скрынкі Стрыжэўскага цікавілі больш, чым што іншае. Што ў іх? Але іх Прытока хутка вывез. Такім жа чынам, як прывёз: уначы, у закрытым фургоне. Што за матэрыял і куды яго павезлі — так і засталося таямніцай за сямю пячаткамі. Стрыжэўскаму толькі заставалася пасміхнуцца: «Дрэнны ты разведчык, Адам, сын Фадзееў».

У другі раз, зноў у такі дзень, калі старога Прытокі не было на дачы, Вадзім прыехаў з сябрам на яго машыне. Гэты сябра на дачы яшчэ ні разу не з'яўляўся, прынамсі, пры Стрыжэўскім; выглядаў ён значна старэйшым за Вадзіма: вусаты, мужчына гадоў пад сорак.

Вадзім цёпла павітаўся з вартаўніком, моцна пацiснуў руку.

— Мы пагуляем на більярдзе.

Доўга стукалі шары. Адам Фадзеевіч разы два зайшоў, пагля-дзеў. Вадзім гуляў так сабе, па-аматарску, Юрый Віталье віч (так звяр-таўся да яго Вадзім) паказваў прафесійную гульню: лажыў шары ў лу-зу адзін за адным, партыя канчалася за пяць мінут. Гулялі на долары, Вадзім тут жа весела разлічваўся, расставаўся з зялёнымі без шкадавання.

Стук шароў сціх. З адчыненага акна кухні пацягнула смажаным мясам, у вартаўніка ажно сліну пагнала, бо другі дзень сядзеў на хлебе і аўсяным супе, запраўленым алеем, які варыў у сваім буданчыну на электраплітцы. Між іншым, плітка яго абурала найбольш: у доме такая газавая пліта, а ён мусіць кухарыць у «сабачай будцы», у якой няма дзе павярнуцца.

Вадзім выйшаў з катэджа, ветліва запрасіў, звярнуўшыся незвычайна:

— Дзядзька Адам, пайшлі перакусім. Паганяў шары — нагнаў апетыт.

Стол быў багаты: смажаныя катлеты, зялёны гарошак, ікра чырвоная, шпроты; маючы грошы, усё можна купіць.

Чырвонае віно было наліта ў бакалы. Каньяк — у чаркі. Адам Фадзеевіч не звярнуў увагі на гэтую, трохі незвычайную асаблівасць сервісу — папярэдні разліў.

— Вы што будзеце — віно, каньяк? — спытаў Юрый Віталье віч.
— Я адно віно. Нашы інспектары не ўнюхаюць добрае віно, бо не каштавалі...

— А вы не будзеце начаваць?

— Я — не. Перад жонкай не апраўдаюся. Вадзім заначу е.

— Думаю, што мне выпіць.

— Не пашкодзіць, калі і каньяк, і віно, — засмяяўся Вадзім.

— Ісціну гаворыш, сын мой, — згадзіўся Стрыжэўскі. — Вып'ю чарку каньяку, а потым віно. Каб не ап'янець. Вартую прыватную ўласнасць. Ганаровая ў мяне пасада, — сказаў з горкай іроніяй.

— У кожнага свой лес, — супакоіў Юрый. — І ад яго нікуды не падзенешся. Я працую шаферам, а скончыў інстытут.

Выпіў каньяк, закусіў, потым асушыў бакал віна.

— Чароўны напой.

— Бо грошы надзвычайныя, — засмяяўся вусаты.

Віно так спадабалася, што Адам Фадзеевіч наліў сабе другі бакал; не піў такога, можа, гадоў дзесяць. І каньяку яшчэ адну чарку перакуліў. Развесяліўся. Анекдоты расказваў, Вадзім і вусаты весела смяяліся. Але хутка вартаўнік звяў.

— Нешта мяне на сон хіліць. Я мінулую ноч дрэнна спаў, душна было, камары...

— Спаць захацелася з-за таго, што вы пілі «грымучую сумесь» — каньяк з віном.

— Але, вучылі ж мяне людзі добрыя, што мяшаць нельга... добрае з выдатным. Калі вы мяне не гоніце, то я сяду ў вунь тое мяккае крэсла і паўгадзінкі падрамлю. Мне паўгадзіны хопіць. Я ведаю сябе, са мною гэта здаралася.

Сеў у крэсла і адразу ж заснуў.

Для праверкі Вадзім паклікаў яго. Не адгукнуўся. Вусаты рагатнуў:

— Гатовы. Правераны сродак.

Мінут праз колькі Вадзім і вусаты паднялі Адама Фадзеевіча, акуратна, ласкава, пад пашкі, вынеслі на двор, пасадзілі ў машыну. Зачынілі катэдж, вароты і махнулі ў горад.

Стары спаў, толькі зрэдку нібы пляваўся.

Задума ў Вадзіма была злая і дурная: паказаць Стрыжэўскага бацьку, няхай паглядзіць, у якім стане бывае яго высокаадукаваны вартаўнік. Апраўдваўся ж перад бацькамі:

«Дзеўкі былі. А наркотык — гэта фантазія п'янага Адася».

«П'янага?»

«Языком не варочаў да нашага прыезду. Ды мы пачаставалі... У басейн у адзенні залез. Дзяўчат лавіў».

«Сачыні што-небудзь больш праўдападобнае», — не паверыў бацька.

Няхай жа пераканаецца. Пакажам гаспадару яго вартаўніка ва ўсёй красе.

Намер меў такі працяг: паказаўшы бацьку, не везці назад на дачу, палажыць каля манумента Мінскугерою, на мяккую траўку. Няхай прачнецца ў ганаровым месцы! Во здзівіцца. Доўга помніць будзе італьянскае віно. Са службы бацька яго выганіць. Няхай піша мемуары.

Ведаў, што бацька ў позні вечар будзе дома: на дачу не паехаў, быў на банкеце, які наладжвала блізкая яму фірма, яе алігарх Сарока. Шафера не стаў затрымліваць, а сам пасля чаркі за руль не садзіўся, трымаўся жалезнага правіла. Таму на дачу не паехаў.

Стрыжэўскага прывезлі ў двор дома, дзе жыў Прытока. Вадзім падняўся ў кватэру. Бацька яшчэ не спаў. Вярнуўся з банкета цёпленькі і, як заўсёды пад чаркай, расказваў маці, што адбывалася ў Сарокі, з кім і пра што ён гаварыў. Пазнаёміўся з літоўцам, з якім варта мець справу, дамовіліся заўтра правесці дзелавую сустрэчу.

— Нешта рана ты сёння, — змрочна сказаў Прытока сыну.

— Я табе прывёз падарунак.

— Які яшчэ падарунак?

— Хадзем — паглядзіш. У машыне ляжыць. Паднімаць цяжка.

— Не тлумі галаву. Бярыся нарэшце за розум. Маці вунь ссохла, чакаючы цябе кожную ноч да раніцы. Дзе ты грошы бярэш?

— Мне даюць крэдыт. А ў машыне — твой хвалены вартаўнік, праведны камуніст. Мы прыехалі з Віталевічам, а ён не тое што языком не варочаў — у поўнай адключцы быў. І мы вырашылі такога вартаўніка паказаць гаспадару.

Устрывожаны, Прытока, як быў апрануты па-хатняму — у халаце, выйшаў за сынам. Спусціліся на ліфце.

Вусаты адчыніў дзверцы машыны. Загарэлася святло. Стрыжэўскі ляжаў на баку.

Прытока адразу схапіў яго руку, каб праверыць пульс, з палёгкай уздыхнуў: б'ецца. Гнеўна сказаў Вадзіму:

— Ніколі не думаў, што мой сын такі ідыёт. Чым вы яго напаілі?

— Нічым.

— А ты, вусатая гідра, памаўчы. Я цябе ведаю. Ведаю, якія заказы ты выконваеш...

— Ды вы што?!

— А вы не падумалі, што стары чалавек можа памерці? Зараз жа вязіце яго дадому, здайце жонцы. Няхай ратуе. Самі, ідыёты, не засвечвайцеся.

Бацькавы словы спалохалі Вадзіма. Пра трагічны фінал ён не думаў, хацеў сыграць камедыю.

— Дзе ён жыве, бацька?

Прытока помніў адрас, сказаў. Але і прыгразіў:

— Здарыцца горшае — на мае долары не спадзявайся. Сядзеш як міленькі. Будзеш ведаць пачым фунт ліха.

Ліфт у доме Стрыжэўскага не працаваў, і прыйшлося цягнуць пацяжэлае цела на чацвёрты паверх. Задыхался. Пачалі звярамі глядзець адзін на аднаго.

— Звязаўся я з табой, ідыётам. Трэба мне твая сотня. Цягні сам!

— Вітальевіч, мы ж з табой пуд солі з'елі. Не кідай мяне аднаго. Што я буду рабіць?

— Ідзі звані ў кватэру. Скажы, каб забралі свайго бацьку.

Вадзім узрадаваўся. Як яны не дадумаліся да гэтага на першым паверсе!

Вадзім скочыў на паверх, настойліва пазваніў. Не адразу за дзвярамі адгукнуліся — спалі.

— Хто?

— Там ваш бацька ляжыць п'яны. На лесвіцы.

— Які бацька? Чый? Не шукайце дурняў! — жаночы голас змяніў мужчынскі.

— Гэта кватэра Стрыжэўскага? Дык ён жа! Ён.

Вадзім пабег уніз, грукаючы чаравікамі.

Галіна Пракопаўна бачыла ў «вочка», што магчымы рабаўнік пабег ад дзвярэй. Маніць? Не, крокі заглухлі ўнізе. Грукнулі дзверы.

Галіна кінулася да тэлефона, набрала нумар дачы — яго нумар, Адасёў. Маўчыць.

Сын узброіўся кухонным малатком-сякерай, якім сякуць і адбіваюць мяса, і выйшаў на лесвічную пляцоўку. У гэты момант Стрыжэўскі застагнаў. Тады яны з маці кінуліся ўніз.

— Бацька!

Галіна загаласіла прыглушана:

— Адасік, родненькі. Дык ты ж ніколі так не напіваўся? Хто ж цябе напаіў?

— Не трэба, мама. Каб людзі не чулі, не бачылі. Занясі п'янага ў кватэру.

Але што рабіць? Як памагчы?

— Трэба «хуткую», мама. Выклікалі «хуткую дапамогу».

Галіна толькі тады трохі супакоілася, калі Адам пачаў стагнаць, расплюшчыў вочы, але глядзеў непрытомна.

«Хуткая дапамога» зрабіла ўкол, каб падтрымаць сэрца. Урачы ўсё ж вырашылі забраць «хворага» ў бальніцу.

У бальніцы яму прамылі страўнік. Аднак свядомасць яго ўсё яшчэ была адключана.

А калі на другі дзень, позна, Адам Фадзеевіч прачнуўся ў поўнай свядомасці, да яго падышла ўрач-псіхіятр і спытала:

— Вы што, хацелі скончыць жыццё такім чынам?

— Я? Ды вы што! У мяне ніякай трагедыі, у мяне добрая сям'я. З чаго вы зрабілі такую выснову?

— Лабараторны аналіз паказаў конскую дозу клафеліну.

— Клафеліну? Божа! Яны хацелі мяне атруціць.

— Хто?

— Доўгая гісторыя, — ён паказаў вачамі на суседа па ложку.

— Добра, раскажаце пасля. Следчаму.

На трэці дзень жонка забрала яго з бальніцы.

— Званіў Прытока, пытаўся пра тваё здароўе.

— Пашкадаваў воўк кабылу: пакінуў хвост ды грыву. Хоць не думаю, што паганцы гэтыя труцілі мяне з яго благаслаўлення. Навошта яму?

Галіне ён расказаў сваю «эпапею» яшчэ ў бальніцы. Прытока пазваніў яму ў той жа вечар.

— Як адчуваеш сябе?

— Тваімі малітвамі.

— Слухай, давай забудзем дурны жарт майго сына. Адпачні дзень-два і выходзь на баявы пост. Я табе зарплату дабаўлю.

Стрыжэўскі не думаў пра гэта, а тут яго цюкнула:

— Навошта мне тваіх дваццаць долараў! Я ў цябе мільён вазьму.

Прытока цяжка задыхаў у трубку.

— Як гэта ты возьмеш мільён, якога, дарэчы, у мяне няма?

— Праз суд. За нанясенне шкоды майму здароўю, за маральнае зганьбаванне. Аналіз у «хуткай» паказаў наяўнасць клафеліну, іншай атруты... Не сам жа я глытаў яе.

Дыхание боса зрабілася частым і цяжкім.

— Піць не трэба на рабоце!

— Мая слабасць — не адмовіўся ад запрашэння. Хацеў паразумецца з Вадзімам, хацеў дапамагчы табе паставіць яго на правільны шлях.

— За гэта дзякую... Але... Ты хочаш падаваць у суд?

— Мне не да жартаў. Да таго ж ты ведаеш па рабоце: я слова на вецер ніколі не кідаў.

Доўгае маўчанне.

— Чуеш, Іван, сын Піліпаў?

— Чую. Чую. Ну то ж, паспрабуй судзіцца з Прытокам. Некаторыя судзіліся...

— І што?

— Выйшлі з суда апляваныя.

— Я не выйду так...

— Выйдзеш як міленькі. А калі і выйграеш працэс, радасці не нажывеш.

— Пагражаеш?

— Папярэджваю.

— А ў мяне прыстаўка, і размова наша запісваецца.

— Вунь ты як? З прыёмам мафіі.

— Ды не, з крымінальным вышукам. Каб вывесці сапраўдных мафіёзі на чыстую ваду.

— Давай! Давай! — Прытока зларадна рагатнуў. Размову слухаў увесь «савет у Філях», як Адам называў сваіх: жонку, сына, дачку, зяця, унукаў. Ухвалілі:

— Добра ты яго напалохаў.

— Няхай не спіць, злодзей.

— Думаеце, я проста палохаў? Я ўжо напісаў заяву ў суд. Во! — узяў са століка папку.

Заяву чыталі моўчкі, але ўсе разам — галава да галавы.

Першай «налажыла рэзалюцыю» Галіна Пракопаўна:

— Не трэба!

— Чаму не трэба?

— Не трэба нам яго брудныя грошы.

— Грошы не пахнуць.

— Ты можаш нешта адеудзіць. А ён цябе пасля са свету зжыве.

— Кілера нойме.

— Усяго мы баімся. Таму і працвітаюць прытокі. Дыскусія не была такой доўгай, як пры вырашэнні ісці яму вартаўніком ці не ісці. Тады галасы падзяліліся. Цяпер жа было аднагалоссе:

— Не судзіся, тата. Не прыніжай сябе. Будзь ён пракляты са сваімі мільёнамі!

— Паслухайся дзяцей, Адась.

— Змовіліся вы ці што?

— Як мы маглі змовіцца, не ведаючы, што ты надумаў. Судзяцца яны, багачы, вырываючы, як шакалы, кавалкі адзін у аднаго. Нам сабачы кавалак не трэба! Пражывём!

Адам Фадзеевіч слухаў, здавалася, незадаволена, а потым раптам весела засмяяўся.

— Дзівакі вы, мае родныя: ад мільёна зялёных адмаўляецеся! Сямейную фірму арганізавалі б.

— Не трэба нам фірмы, у нас ёсць больш надзейны калектыў — сям'я. Аснова грамадства, — глыбакадумна сказала Насця.

— Ну, ты лётаеш у аблоках. А ты, зяцёк?

— Я на гэты раз з тымі, хто бліжэй да філосафаў. У іх — уся мудрасць часу.

— Хопіць, філосафы, байкі баяць. Давайце на стол накрываць. Зробім свята. А хіба не свята? — маці адчувала сябе пераможцай.

— А выпіць дасі?

— А табе можна?

— Урачэбнай забароны не было.

— У такім разе вып'еш. Вішнёвай настойкі. Дамо бацьку?

— Дамо! — хорам адказалі і малыя, і дарослыя. Усім стала весела. Як на свята.

Адам Фадзеевіч глядзеў на дзяцей і смяяўся разам з імі, бо ганарыўся імі. Ганарыўся тым, што аднадушна яны адмовіліся ад перспектывы адсудзіць... мільён не мільён, а нейкую суму пэўна.

Такія дзеці — яго бацькоўскае шчасце!

## ГУБЕРНАТАР

Дзве «Волгі» імчалі па вузкай шашы, што разразала густы лес. У святле фар гонкія сосны выглядалі фантастычна-казачнымі: густабронзавыя ствалы, серабрыстая, як запарошаная інеем, ігліца галін у недасягальнай вышыні. А там, куды фары не закідвалі снапы святла, вісела цяжкае чорнае пакрывала жнівеньскай ночы. Зоркі можна было ўбачыць, глянуўшы ўбок, у вузкія прагаліны паміж дрэвамі. Пад імі ўнізе, вырываючыся з святла, цемра застывала, бы смала. І здавалася, што ўвесь белы свет счарнеў, скамянеў і назаўсёды пазбавіўся святла і жыцця. У такім суседстве святла і цемры было штосьці ірэальнае, фантастычнае. Гэта і ўзбуджала, і страшыла, і як бы адрывала ад зямнога жыцця.

Такое адчуванне было ў Вікенція Паўлавіча не ўпершыню пры начной яздзе. Але раней гэтае незвычайнае адчуванне забаўляла — якія толькі хімеры не ўявяцца! — і весяліла. Сёння ж чарната на небе і на зямлі бадай палохала. Ён пасміхнуўся з гэтага свайго пачуцця, але далека не так па-дзіцячаму весела і бяздумна, як раней: і ў святле, і ў цемры жыццё ідзе, і яно ў сорак пяць яшчэ даволі светлае, не гледзячы на тое, што навокал шмат што валіцца і рушыцца. Цяпер жа ён ехаў з пачуццём трывогі... За што? За паслязаўтрашні дзень? Ці за вынік свайго жыцця — філасофскі роздум усіх мудрых? Але ж яму рана падводзіць вынікі жыцця. Вельмі рана. Ён можа падвесці вынікі кампаніі — выбарчай. Ды і гэта рана. Вынікі падвядуць без яго пасля-заўтра.

Пасля сённяшніх сустрэч, ажно трох за дзень, яму можна асабліва не трывожыцца. Адчуваць сябе пераможцам? О, не! Ён не такі дурань. Ад таго, відаць, і трывожыцца, і ў філасофскую чарнату акунаецца, што дагэтуль не можа зразумець нечаканы ход свайго галоўнага суперніка на выбарах губернатара. О, гэта зубр, перад якім ён, Вікенцій, адчуваў сябе маладым аленем. Былы першы сакратар абкама партыі Пятро Пятровіч Мудроны. Ад но прозвішча чаго варта! Пяць гадоў маўчаў. Вынырнуў. Быў губернатарам і зноў хоча стаць ім. Не дурань. Выбраў момант, калі ў людзей настальгія па тым недалёкім часе, які называлі сацыялістычным, дасягнула свайго апагея.

Мудроны скалаціў магутную каманду — усіх былых падхалімаў сваіх сяброў, двое з якіх, не без яго дапамогі, сталі буйнымі камер-сантамі і, безумоўна, фінансавалі яго выбарчую кампанію. Гойсалі па вобласці на пяці машынах, з міліцэйскай міргалкай. Не тое, што ён, бядняк. Каб не Ваня Залоза, ніводнай машыны не меў бы, ездзіў бы на сустрэчы маршрутнымі аўтобусамі. Залаты чалавек Залоза. Быў жа

некалі яго начальнікам — першым сакратаром райкама камсамола, дзе ён, Вікенцій, лічыўся трэцяй сошкай — загадчыкам аддзела прапаганды. Аднак жа не палез Іван у губернатары, сам прапанаваў падтрымаць яго, гісторыка, прапагандыста, які на перабудове, прыватызацыі капейкі не нажыў. Зразумеў Залоза, што не сам ён, які дарос да старшыні райвыканкама і трохі мае ад прыватызацыі, а падначалены яго, святы бяссрэбранік, — бездакорная кандыдатура.

Натуральна, што невялікая, але дружная яго каманда, і сам ён засяродзілі ўвесь агонь на старым зубры; астатнія трое кандыдатаў у параўнанні з Мудроным — цяляткі.

Ваня даўно падкінуў ідэю адкрытай дыскусіі — дыялога. Мудроны ўхіліўся. І раптам за тры дні да выбараў згадзіўся. Сам прапанаваў дальні ад цэнтра горрд, дом культуры льнокамбіната.

Учора адбылася іх сустрэча. І натуральна, што малады кандыдат палажыў старога на лапаткі. Залоза памог выцягнуць усе даўнія грахі Мудронага: і што сын падбіў машынай чалавека, і бацька ратаваў яго ад суда, і што траім дзецям даў добрыя кватэры, і што за капейкі па сучасных цэнах прыватызаваў дачу.

Народ гудзеў. Тэлевізіёншчыкі млелі ад драматычнага сюжэту.

Мудроны «перамудрыў», даўшы згоду на дыялог: мабыць, не думаў, што тэлебачанне дасць запіс у той жа дзень, амаль нічога не скараціўшы з таго, што казаў пра яго супернік.

А сёння раніцою ў гасцінічны «люкс» да свайго кандидата ўскочыў Залоза і з дзвярэй закрычаў:

— Ура, Віця! Танцуй!

— Не прайшло ж галасаванне, каб танцаваць.

— Стары корч зняў сваю кандыдатуру! Абвясцілі па радыё.

— Ды ты жартуеш!

Шмат што здзіўляла Вікенція Паўлавіча ў сённяшнім жыцці. Але такога здзіўлення не перажыў за ўсё жыццё. А пазней, пасля вялых стомленых выступленняў у саўгасе і райцэнтры пачала калоць у сэрца незразумелая трывога. Чаму? З-за чаго? Не радасць, а трывога? А тут, у лесе, уколы трывогі пачасціліся.

Будучы губернатар ехаў у другой машыне на заднім сядзенні. Ахоўнік Міхаіл Палавінка спаў, але часта прачынаўся. Залоза сядзеў побач і, мабыць, каб не даць вадзіцелю заснуць, расказваў пра свае, яўна выдуманыя, любоўныя прыгоды.

Шафёр рагатаў. Вікенцій Паўлавіч не любіў такія гісторыі:

— Фантазёр ты, Іван.

— Клянуся, Віця. Хіба я расказваў, калі вярнуўся з курорта? Не расказваў. Дурнем трэба быць, каб расказваць супрацоўнікам. Хтось

передаў бы нашым прыгажуням, а сярод іх знайшлася б такая, што тут жа данесла б маёй Марыне. І аблысеў бы зусім. Яна і так пытае: «Ад чаго ты, Ваня, рана так лысееш?» — і сама адказвае: — «Ад чужых падушак». Вунь Вікенцій Паўлавіч на чужых падушках не спіць — і глядзі, якая ў яго чупрына.

«Здзекуецца, гад», — падумаў Вікенцій, бо чупрына яго таксама моцна парадзела за гады рэформаў. Ды і кампанія па выбарах у губернатары каштавала, можа, не адной пасмы на галаве. Ён адчуваў у сабе сілы, верь^, што можа пераламаць негатыўныя з'явы рыначных адносін. Ён не прынімаў таго рынку, які дзеліць грамадства на багатых і бедных і апошніх робіць яшчэ бяднейшымі, заганяе ў галечу. Ён заставаўся сацыялістам, але ўжо не тым — не марксісцкім. Прачытаў «Капітал»: калі вучыўся, не адужаў. Раскрытыкаваў Маркса, выпрацоўваючы сваю тэорыю. А што? Марксізм — не догма, а напрамак дзеяння. І ён заўсёды, са школьных гадоў, быў перакананы, што не багі гаршкі лепяць. І меў упэўненасць, што і ён здатны зляпіць свой гаршчок. Дайце толькі гліну! Таму ж Івану Залозе нібыта ў жарт прызнаваўся:

— Каб я выказаў хоць дзесятую частку той крытыкі марксізма тады, калі вучыўся ў камсамольскай школе, вылецеў бы адтуль, што корак. Во ў чым была наша бяда — нікому не дазволена было думаць самастойна. Крок улева, крок управа — калі не куля, то тумак. А я ж не вораг марксізму. Перакананым сацыялістам быў заўсёды і застаўся ім. Мне толькі трэба поле для праверкі маёй тэорыі на практыцы.

І відаць, Іван Залоза, былы кіраўнік раёна, старэйшы па гадах, прызнаў у ім тэарэтыка, «новага Карла Маркса» і ўступіў яму пяршынства, пайшоў за ім, каб памагчы яму заваяваць гэтае поле. Вядзі нас, Вікенцій, да светлых вышынь сацыялізма! Камунізм не патрэбны! Твой сацыялізм дае кожнаму прастор шырэйшы, чым пры капіталізме. Капіталізм Іван Залоза адмаўляў ва ўсіх яго іпастасях, хоць у гады развала партыі і разгульнай прыватызацыі не пасаромеўся прыхапіць што-ніштo з таго, што дрэнна ляжала. А пры сацыялізме шмат што ляжала безгаспадарча. І тыя, што сядзелі на алімпе, забываліся, што дзяржава — гэта людзі, якія выхоўваліся не толькі ў піянерскіх атрадах, але і бацькамі, што ніяк не маглі пазбавіцца ад перажыткаў праклятага мінулага: грабці да сябе, а не ад сябе.

Тэорыя Вікенція ўлічвае гэтую спадчыну: можаш быць багатым, але не забывайся пра бедных, ствары ім чалавечае жыццё — як у Швецыі.

Залоза пачаў новую вясёлую гісторыю, але тут жа перапыніў яе.

— Юрка! Пасігналь гэтаму ліхачу, а то праскочым паваротку.

— Якую паваротку? — спытаў Вікенцій Паўлавіч.

— Абяцаў жа я ў пачатку падарожжа, што пакажу вам рай на нашай грэшнай зямлі.

— Навошта нам рай?

— Хай! Табе ўжо і рай не трэба! Глядзі, пачуе архангел — загоніць у пекла.

— А ты хочаш быць у раі?

— А хто не хоча добрай чаркі, юшкі і шашлычка?

— Завадзяга ты, Іван.

— Без завадзяг сумна жылося б.

Між тым шафёр паміргаў фарамі і, мабыць, убачыўшы, што пярэдняя машына не збаўляе ход, моцна пасігналіў.

Палавінка прачнуўся, падскочыў — ажно ўдарыўся галавой аб крышку кузава. Насмяшыў.

— Што сталася?

— Глядзі — НЛА на дарозе.

— Губернатара выбралі. Уся вобласць салютуе. А ты спіш. Прачысці горла. Замачваць будзем.

— Замачваць будзем у панядзелак, калі бабкі падаб'ём.

— Без рэпетыцыі? Ты што гэта!

На пярэдняй машыне загарэліся стоп-сігналы. Затармазіла, з'ехала на ўзбочыну, спынілася і прапусціла іх наперад. Паехалі на нізкай хуткасці.

— Круці баранку, Юрка, налева.

Нырнулі пад кашлатыя яліны. Тут, на грунтавой пакручастай лясной дарозе, пераплеценай карэннем дрэў, лес у святле фар выглядаў здзіўляюча, таямніча. Такой карціны, такімі фарбамі, не напісаў яшчэ ніводзін мастак у свеце. Нечакана ельнік скончыўся, і бярозавы гай засвяціўся некранутай белізной, як сарамлівая нявеста.

— Ух ты! — не вытрымаў Палавінка.

— А што? І цябе праняло? А я табе і не такія дзівосы пакажу!

Пайшоў гушчар арэшніку. Фары высвечвалі гронкі арэхаў. Потым палезлі на гару. Натужліва выў матор.

Буксавалі колы ў пяску. Дарогу абступалі магутныя карабельныя сосны.

— Высока твой рай, Іван.

— На тое ён і рай!

Спыніліся за пяць крокаў ад нияркага кастра, над якім на дубовым дручку вісеў ёмісты закопчаны кацёл. А збоку, за якія два-тры крокі, гарэла яркай чырванню вугалле другога кастра — шашлычнага. Побач стаяў мангал і вёдры.

Насустрач гасцям выйшаў з цемры лесу барадаты чалавек у цёмным кіцелі з зялёнымі пятліцамі і жалудамі на іх і ў фуражцы з такой жа эмблемай на зялёным аколышку.

— Не заснуў, Арцём?

— Не заснуў, Іван Яўменавіч. Але дрыжэў. За юшку. Баяўся — пераварыцца. Думаў, што вас перахапіў хто.

— Хто гэта можа перахапіць нас?

— Такіх пачэсных гасцей ці мала хто захоча мець.

— Дзічына ёсць?

— Мокне ў віне. Шкада было віном заліваць. Дарагое ж вельмі.

— Для губернатара нічога не шкадуй!

— То хіба што губернатару! А нам, смяротным, дык і воцат добра.

— Воцат страўнікі раз'ядае. А яны ў нас не луджаныя.

Вікенцій Паўлавіч, павітаўшыся з лесніком за руку, услухаўся ў незвычайны шум. Дзесь блізка ўнізе, як пад зямлёй, журчэла вада.

— Што гэта? Рэчка?

— Рэчка. Глядзі, не скаціся. За тымі памечанымі соснамі — кру^ы абрыў. Але ёсць палогі спуск. Хочаш акунуцца?

— Я і так чыхаю.

— Нос чарку чуе.

— Ну чарадзей ты, Іван!

— Лепшага памочніка не знойдзеш.

— Ды і трудна.

— Не трудна, а немагчыма.

З другой машыны, якая спынілася побач з першай, вылезлі члены каманды: банкір Андрэй Падбярозскі і Эдуард Сімакоў. Залоза і банк знайшоў, які згадзіўся падтрымаць будучага губернатара; не аднаму Мудронаму запускаць руку ў банкаўскія сейфы. Па палажэнню аб выбарах не дазволена браць дабрачынныя сродкі, але законы пішуцца для дурняў і непісьменных. Паспрабуй выбрацца без грошай!

Іван Залоза з вялікімі намаганнямі пераканаў кандидата, упартага законніка, прыняць дапамогу банка. А з банкам можна і дзічыну ў віне вымачваць.

Сімакоў — стары сябра Вікенція, таксама ідэолаг, вучоны, кандыдат навук, быў таўставаты для сваіх трыццаці пяці; прайшоў ад машыны і задыхаўся.

— Ну, філосафы! — закамандаваў ім Залоза. — Скідайце мундзіры! Закасвайце рукавы — і за працу. Табе, Эдуард, як тэарэтыку, насаджваць дзічыну на шампуры. Толькі падоўгу не думай над кожным кавалкам — вуголле стыне, — фанерай памахаў над жарам,

пыхнуў на сяброў дымам, іскрамі. — Табе, Вікенцій, расстаўляць чаркі і варажыць над пляшкамі.

— А ты што будзеш рабіць?

— Я? Што вы рабілі б без мяне! Я буду кіраваць. Няўжо ты, банкір, не дапяў яшчэ, што самае цяжкае — кіраваць. Хоць што табе кіраваць! Грошы ёсць каму лічыць, хапае клеркаў...

— Адсталы ты чалавек, Іван, калі так думаеш. Раней, чым лічыць, грошы трэба было набыць.

— Іх набыла савецкая ўлада. А мы прысвойваем — як хто ўмее. А ўмеюць добра, — сур'ёзна сказаў Вікенцій Паўлавіч.

— Чулі? Губернатар у нас такі! Марксіст-сацыяліст. Дрыжы, капіталіст! Ён правядзе нацыяналізацыю, і твой банк аб'яднае з дзяржаўным.

— У выбарчай платформе гэтага няма.

— Правільна, Андрэй. А табе, Іван, раблю трыста сорак першае папярэджанне: ніякага губернатара! Да выбараў. Ды і пасля. У мяне імя ёсць.

— Што платформа! А папярэджанне прымаю, таварыш... Слухай, Вікенцій Паўлавіч... А як да цябе звяртацца... ну, не нам, мы свае, — народу? Таварыш губернатар ці пан губернатар?

— Таварыш. А што да платформы, то мая платформа — што нафтавая ў моры: і мора бяссільнае сарваць яе.

— Во за гэта люблю вас, Вікенцій Паўлавіч. За непахіснасць. З-за гэтага пайшоў за вамі, — Палавінка быў адзіны ў камандзе, хто звяртаўся да кандыдата на «вы», хоць некалі і працаваў у тым жа раёне, да дзяўчат разам хадзілі. Залоза рабіў яму заўвагу: «Мы — каманда аднадумцаў. Мы — браты, як у масонскай ложы». Вікенцій змаўчаў, падумаў, што залішняя фамільярнасць нават сяброў яму без патрэбы, калі ён сядзе ў губернатарскае крэсла. І хітры чэкіст адразу адзначыў гэтае маўчанне будучай першай асобы: «Віцька ўжо трымае дыстанцыю. І я буду трымаць. Не зашкодзіць».

Між тым шафёры прынеслі вялікі брызент і расклалі паміж кастрамі.

Убачыўшы, што Сімакоў выконвае сваю працу з вучонай павольнасцю, яму пачалі памагаць і Вікенцій, і Падбярозскі. Тым часам Юрка прынёс з багажніка цяжкую кардонную каробку, а Сцяпан, шафёр другой машыны, — дзве торбы. Вікенцій здзівіўся:

— Цэлае вядро мяса. Навошта столькі!

— Не хвалюйся. З'ямо. Палічы, колькі едакоў! І ўжо галодныя. Калі абедалі? У гадзіну дня. А цяпер адзінаццаць ночы. Дык займіся сталом. Нарэж памідораў, гуркоў.

Вікенцій Паўлавіч папрасіў лесніка паліць яму на рукі і заняўся больш чыстай справай: расстаўляў на брызенце пузатыя чаркі, шклянкі для вады, раскладваў на вялікіх аркушах паперы гуркі, памідоры, перац, чырвоную рыбу. Першыя шампуры ляглі ў гнёзды мангала, пастаўленага на вуголле; апетытны пах юшкі, якая астывала ўжо, забіў востры водар смажанага мяса і цыбулі.

Залоза пацягнуў носам.

— Ну чым вам не рай? У раі такога не пачуеце. Там пахне прэсным, кветачкамі.

— Рай-рай, — згадзіўся Падбярозскі.

— Рай, — пацвердзіў Сімакоў і пажартаваў: — ТольКі цяжка вызначыць — які? Капіталістычны? Ці сацыялістычны?

Засмяяліся.

Ляснік вызначыў:

— Сялянскі. Рыбацкі. Што, пры сацыялізме юшкі не елі? Ці каўбасы? Цяпер — не па кішэні.

— Будуць па кішэні, — паабяцаў Вікенцій Паўлавіч.

На гэтае абяцанне гаваруны з каманды не адгукнуліся, як бы замялі. Не паверылі, што каўбасы будуць па кішэні лесніку, ці што?

Пераключыліся на выбары.

— Я ўсё думаю: што прымусіла старога мерына ўдарыць у аглоблі? — задумліва спытаў Палавінка.

— Правільна будзе — вылузнуць з аглобель, — засмяяўся Залоза. — Бачылі, як у нядбайнага гаспадара, які не сцягнуў гужы, конь вылузваецца з аглабель, і калі гаспадар не трымае лейцы, конь і хамут можа скінуць, ударыцца ў бег пад адной сядзёлкай...

— Мудрыш ты над Мудроным, Іван. Хто конь, хто гаспадар?.. Няма гаспадара. У гэтым наша... што?.. шчасце ці няшчасце?

— Там дагаворымся, што робім мы, што вышэйшая ўлада... — сказаў Вікенцій Паўлавіч.

— З тваёй жа платформы: больш самастойнасці абласцям.

— Эканамічнай.

— Дзе самастойная эканоміка, там і палітыка больш незалежная і ад цэнтра, і ад прэзідэнта.

— А што да Мудронага, то я бачыў, як пасля дыскусіі ён каўтаў нітрагліцэрын. Можа, з інфарктам ужо ляжыць.

— І такі стары атопак лез на такую высокую гару?

— Людзі да старасці дзеці, — заўважыў стары шафер.

— Каб жа дзеці. Уладалюбцы.

— Камандаваць і дзеці любяць.

Шашлычны дух гусцеў. Не адзін ласун Сімакоў праглынуў сліну.

— Гэта залп па мне? — спытаў Вікенцій. — Дык хтохто, а ты, Іван, знаеш, што я не любіў камандаваць.

— Знаю-знаю... Аднак палітыкай сытыя не будзем. Прашу да стала. А такога стала і каралі не мелі. Хіба да цывілізацыі, якая сапсавала і жыццё, і чалавека.

— Палітыкай сыты не будзеш... А не дай нам пагаварыць — змарнеем, — засмяяўся Сімакоў, мякка апусціўшыся на брызент. — Не хадзіў, а ногі баляць.

— Жалезныя ногі трэба, каб насіць такое пуза.

— Не чапай майго пуза, банкір. Гэта табе не мяшок з грашамі.

Рассаджваліея, смеючыся. Хто сеў па-ўсходняму, скрыжаваўшы ногі, хто і на бок заваліўся, з асалодай пацягваючыся: цэлы дзень сядзелі то ў прэзідыумах, то ў машынах.

— Ну, хто віначэрпій?

— Гаспадар.

— А хто тут гаспадар?

— Губернатар — гаспадар.

— Іван, надзяру вушы! Накаркаеш, што мяне пракоцяць.

— Хто цябе пераважыць? Ну, чорт з вамі. Я арганізаваў — я і камандую. Але наліць памагайце — да ўсіх чарак не дацягнуся.

Вікенцій Паўлавіч адкаркаваў пляшку віна «Каберне», наліў у падсунутую да сябе шклянку.

— Вікенцій Паўлавіч, — ажно застагнаў Сімакоў, — зноў ты кісляціну? Ад таго ў цябе і язва была. Хлабысні ты шклянку каньяку. Адразу пачуеш сябе на небе.

— Не заклікай на неба, прафесар. Зямны рай лепш. Во ён.

Іван Залоза наліваў у чаркі каньяк і... пераліваў, хоць застолле і асвятлялі фары машыны.

— Ты што, краёў не бачыш?

Жарт барадаты, аднак усе засмяяліся, прагна аблізваючы вусны.

— Ну, а тост першы твой, Вікенцій. Будзем лічыць, што ты аксакал сярод нас.

— Ну што ж, за працу, якую мы зрабілі...

— І якую зробім.

— За тую, што будзем рабіць, мы яшчэ вып'ем... не адзін раз.

— Ну дык я п'ю за вас усіх. За вашу бескарыслівую дапамогу. Папрацавалі вы...

— Па-сяброўску.

— За сяброў сваіх і п'ю.

— А мы — за цябе.

Падбярозскі выплюснуў трэць шклянкі каньяку ў рот з размаху.

Сімакоў цадзіў праз зубы, смакуючы кожны глыток, стогнучы ад асалоды, уцягваючы носам каньячны водар.

— Заразліва ты п'еш, Эдуард. Перанімаю твой вопыт, — засмяяўся Палавінка.

— А каньяк толькі так і п'юць... А вы — што ў халяву выліваеце. Не навучы вас...

Згаладала кінуліся на закусь. Жывапісная гара памідораў, гуркоў, перцу ў хвіліну знікла.

— Замарылі чарвяка? А цяпер кароткая выбарчая нарада. Давай распішам, хто паслязаўтра куды едзе. Ва ўсіх буйных гарадах у нас павінен быць свой кантроль. Крывель крывіць не будзе. А дзялок Лапіцкі — сам некая! быў старшынёй выбарчай камісіі і вывучыў усе махінацыі...

— За махінацыю — суд.

— Наіўны ты чалавек, асветнік. Мне трэба застацца ў цэнтры, у штабе. Але я наведаюся ў бліжэйшыя равны. Ты куды, Эдуард? Вязі сваіх кантралёраў — лічыльнікаў. На кожным участку — нашы. Яшчэ адзін скачок, і мы на кані.

— Ці пад канём, — пасміхнуўся Вікенцій Паўлавіч.

Ён такі моцна сумняваўся ў сваёй перамозе, пакуль

Мудроны не зняў з выбараў сваю кандыдатуру. Загадкавы дэмарш. Але ў яго, маладога кандыдата, з'явілася акрыляючая ўпэўненасць, бо Крывеля і Лапіцкага і ён не ўспрымаў сур'ёзна, ва ўсякім разе, не баяўся. Сёння цэлы дзень адчуваў сябе бадай жа губернатарам. А тут, у гэтым лясным раі, у дэмакратычнай кампаніі — ляснік, вадзіцелі — упэўненасць пачала слабець, і ён, чалавек самакрытычны, у думках пасміхаўся са свайго хлапецкага ўзлёту. Не ўпасці б з вышыні.

Арцём ужо падаваў юшку ў металічных місках, і Вікенцій Паўлавіч падняўся, каб не запэцкаць касцюм; ён, кандыдат, убраўся ў лепшае, што меў, і толькі адзін Залоза дазволіў сабе джынсы, у якіх выходзіў і на трыбуны. Але і Залоза падняўся з юшкай.

І тут з-пад абрыву ляснуў стрэл. Куля свіснула над іх галовамі і мякка ўвайшла ў бліжэйшую елку.

Вікенцій яшчэ не паспеў сцяміць, у чым справа, як Залоза ўмомант шыбнуў сваю міску, выхапіў ягоную, шпурнуў у бок стрэла, потым закрыў здзіўленага кандыдата сабой, абшчапіў, груба паваліў на зямлю і нейкі міг ляжаў на ім. Астатнія таксама прыціснуліся да зямлі, як байцы пад кулямётным агнём. Адзін Міхаіл Палавінка выхапіў з кабуры пад пінжаком пісталет і кінуўся да абрыву.

Там затрашчалі кусты, нешта цяжкае бултыхнулася ў ваду.

Палавінка стрэліў раз, другі, пасля паузы — трэці.

— Аднак, — прастагнаў Сімакоў.

— Аднак, — паўтарыў Падбярозскі.

Залоза, задыханы, быццам пасля бойкі, скаціўся з кандыдата. Вікенцій Паўлавіч, падняўся, звярнуўся да Залозы:

— Дзякуй табе, Іван. Надзейны ты таварыш... Не забуду.

— А ты думаў, усё проста? На вайне, як на вайне, — сказаў Залоза.

За гаспадаром падняліся шафёры. Вярнуўся з цемры ў святло фар Палавінка. Папракнуў:

— Няўжо нікому не хапіла розуму выключыць фары? Добра, што адзіночка. Скаціўся ў ваду і пабег па рэчцы. Не дагоніш у цемры. Каму ты прагаварыўся, ляснік?

— Што рыба маўчаў, таварыш начальнік.

— Разбяромся.

Юрка кінуўся да машыны і выключыў фары. У густой цемры, не бачачы адзін аднаго, насцярожана змоўклі, слухаючы цішыню. Удалечыні за рэчкай фыркнуў конь.

— Аднак. На кані стралец.

— Баль закончаны?! — загадаў ці спытаў Палавінка.

— Скончаны! — рашуча сказаў кандыдат.

— Брызент у машыну! Ляснік, збярэш астатняе. Тлела вугалле кастра, на якім варылася юшка. Пры гэтым святле пахапкам сабралі ў першую чаргу пляшкі з пітвом — на гэта не забыліся шафёры. А шашлыкі ў мангале і ў казанку юшку пакінулі.

Калі на вузкай палянцы разварочваліся, Юрка стукнуў Сцяпанаву машыну. Стары шафёр, забыўшыся на ўсё іншае, выскачыў з кабіны, гладзіў пакалечанае крыло, енчыў на ўвесь лес.

Залоза высунуў галаву з машыны, злосна загадаў:

— Не галасі, што баба! Не твая машына — губернатарава.

— Ды я трыццаць гадоў ваджу і — ніводнай аварыі! Што мне скажуць у гаражы? А табе, шчанюк, — да Юркі, — я морду наб'ю. Развярнуцца не ўмееш!

— Садзіся за руль! І не псіхуй!

— Не псіхуй, не псіхуй... Легка вам казаць...

Але ў машыне, калі яна яшчэ кавыляла па карэннях лясной дарогі, Залоза весела засмяяўся.

— Шашлыкі не захапілі? Ну і дурні! Такіх шашлыкоў не паспыталі. З дзічыны! Елі вы шашлыкі з дзічыны? Ты, Міхаіл, еў, бо вашы і міліцыя — першыя браканьеры.

Палавінка хмыкнуў.

— Крыўдна не тое, што мы не з'елі. Крыўдна, што тэрарыст можа з'есці.

— Вясёлыя вы людзі, — зусім нявесела сказаў Вікенцій Паўлавіч. — Шашлыкі пашкадавалі.

— Знаеш, пан губернатар, якое залатое правіла, асабліва ў тваім ранзе? У любой сітуацыі заставацца аптымістам. Усё перажывём! І шашлыкі з'ямо, Міхаіл. Праз тры дні, як толькі партрэты Вікенція Паўлавіча з'явяцца ва ўсіх газетах.

— Плюнь праз левае плячо, — сказаў кандыдат.

— Каму з нас не хочацца мець вас губернатарам? А я да стральца дакапаюся.

— Капай, Міхаіл, глыбей. Такі ў цябе хлеб.

У дзень выбараў абласныя газеты далі на першай паласе інфармацыю, што машына кандыдата ў губернатары была абстраляна з густога лесу.

Газетныя кіёскі апусцелі за гадзіну, даўно ўжо так не куплялі газеты.

Вікенцій Паўлавіч абурыўся.

— Хто мог даць такую дурную інфармацыю? Хаця б праўду напісалі.

Залоза весела смяяўся.

— Раскрыць выбаршчыкам, што кандыдат п'янстваваў? Не паверацъ, што ты не п'еш.

— А тут... Калі стралялі ўночы з лесу і не пацэлілі, то хто мог бачыць, што стралялі? Толькі дзеці і жанчыны могуць паверыць. А кожны, хто трымаў зброю, скажа: лухта несусветная.

— Нам не пашкодзіць і лухта.

— Ну, Іван, калі гэта твая работа, то рыхтуйся да добрага прачоса.

— Ну што ты! Думаю, гэта Эдзік, ён жа піша ў газеты, апавяданні друкуе. Наш Чэхаў.

— А яму навошта няпраўда?

— Яму галоўнае — сачыніць. Пісьменнік жа! Не сачыніць — пахудзее. Ад чаго ты думает, ён такі тоўсты?

Ад таго, што сачыняе.

— Падазрона вясёлы ты сёння.

— Бо ўпэўнены ў нашай перамозе.

— Дай Бог.

І Бог даў.

У дзень свайго ўступлення на высокую пасаду Вікенцій Паўлавіч спачатку адчуваў сябе імяніннікам. Хадзіў па прасторным кабінеце. Захапляўся яго памерамі:

— Футбольнае поле, а не кабінет.

І адначасова асуджаў:

— Навошта будавалі такія кабінеты? Сапраўды, савецкія кіраўнікі хварэлі на гігантаманію. Сваёй уласнасці не мелі... не дазволена, але калі хто меў магчымасць стварыць раскошу за дзяржаўны кошт... Гэта нас і загубіла, — асекся на слове «нас». — А чаму я сябе далучаю да іх? Я, як кажуць, яшчэ бегаў у кароткіх штоніках. А што я мог зрабіць у камсамоле? Славіў іх.

Задумаўся. Успомніў запавет, які прыняў: заўсёды і ва ўсім быць шчырым — з самім сабой і з людзьмі; шчырасць — адзіная палітыка, якая можа ўпрыгожыць кіраўніка такога рангу, таму ён падпарадкаваў сваю праграму; гэтаму бязлітасна прызнаўся: «Славіў! — але тут жа змякчыў прысуд: — Хіба адзін я? Быў час, была эпоха, як напісалі нашы дасціпныя паэты».

Спыніўся перад шыкоўнай кніжнай шафай з карэльскай бярозы і столікам з мяккімі крэсламі. Між іншым, першае самастойнае рашэнне яго — прыбраць мяккую мэблю, замахнуўся, было і на кабінет: аддаць пад бібліятэку, пад агульны аддзел, але тут жа тармазнуў сваю аскетычнасць: неразумна, смяяцца стануць, будавалася ж так — прыёмная, два кабінеты: старшыні і намесніка. Прэстыж, нарэшце.

У шкле шафы палюбаваўся сваім адлюстраваннем, хоць яно і ламалася на карашках кніг. Застаўся задаволены — не сабою, гальштукам: Іван падарыў, папракнуўшы: «Што ў цябе за гальштук — замурзаны ды і па колеры — як у вясковага модніка». Ён рэдка займаўся сваім гардэробам, і быў гардэроб заўсёды сціплы. Маша адпрасавала яму касцюм, пакамечаны ў выбарчых паездках, — лепшага не меў, і грошай у доме заставалася толькі на хлеб і на малако. Паспрабуй накарміць такога бэйбуса, як яго сын! А дачку — адзень пасучаснаму. Але дзяцей успомніў з ласкавасцю, замілаваннем. Яны ў яго выдатныя, у свае школьныя гады бадай ні разу не зрабілі прыкрасці — ні двоек не прыносілі, ні шыбы Нікому не разбівалі. Толя без усякай страхоўкі здаў усе прадметы на «выдатна» на ўступных экзаменах ва універсітэт. На пятым курсе ўжо. Пра аспірантуру думае. Маці ўжо гаварыла з ім на гэтую тэму: ці не мог бы закінуць слова вучоным? Баяўся пакрыўдзіць жонку, гаварыў мякка, але са сваёй заўсёдняй прынцыповасцю:

— Маша, на што ты мяне штурхаеш: губернатар просіць за сына. Як ты не разумееш? Смяяцца будуць. У прамовах — адно, у жыцці — тое ж, што рабілі ўсе...

— І будуць рабіць, — уздыхнула Марыя Іванаўна.

— Пры мне не будуць!

— Наіўны, ты, Віця. Перабольшваеш свае сілы.

Успомніў жонку, тую нядаўнюю размову ўначы, калі нават Толя і Таня, нацешыўшыся тэлевізарам, салодка спалі. Пасміхнуўся. Гледзячы на карашкі экцыклапедыі, звыкла разгладзіў вусы — але іх не было: перад выбарамі пагаліўся. Цяпер пашкадаваў і цвёрда вырашыў:

— Адрашчу, — і задаволена пасміхнуўся. — Ну што, Марыя Іванаўна, дык хто аказаўся мацнейшым — стары Мудроны ці твой бязвусы муж? А ты не верыла...

Звярнуў увагу на пустыя паліцы. Яўна ж з іх прыбралі кнігі, і прыбралі, відаць, Маркса і Леніна, вунь толькі даведачную пакінулі.

Вырашыў вярнуць іх: лепшыя эканамісты, палітыкі і філосафы яшчэ не выраслі.

І зноў, не ў першы раз, падумаў самакрытычна пра слабасць сваёй платформы: у яе няма кітоў, на якіх бы яна стаяла, — тэорыі. У апошні год прагна чытаў літаратуру пра вопыт высокаразвітых краін; кніг такіх пераклалі нямала ўжо, але больш пра эканоміку, пра палітыку — мала, а філасофскага абгрунтавання рыначных адносін у сукупнасці з усімі працэсамі, якія адбываюцца ў грамадстве, у псіхалогіі людзей, — і зусім мала... Што такое сучасныя класы і што адбываецца паміж імі? Хацелася як можна больш прачытаць пра арганізацыю грамадства, якое назвалі «шведскім сацыялізмам». Але якраз такіх прац і не было. Нешта пішуць рускія аўтары — тыя, што нядаўна славілі марксізм-ленінізм. А перакладаў са шведскай мовы зусім няма. Не хочуць шведы пісаць? Разлянілiся ад сытага жыцця? Ці няма чым хваліцца перад цэлым светам? Кітайцы бадай лепшы сацыялізм будуюць. Кітайскі — больш да сэрца, але зноў жа толькі з падачы рускіх аўтараў.

Ад думак такіх ажно стаміўся. Сеў у зручнае, хоць і нямяккае крэсла за вялікі пусты стол. Пакуль ніводнай паперкі: накапленні старой улады прыбралі.

І тут апанавала трывога... Усё тэорыя, тэорыя... Высокія матэрыі. А практычна што? З чаго пачаць? Што рабіць? Дзве гадзіны ўжо ён гаспадар кабінета. І за дзве гадзіны не зазваніў ніводны з чатырох тэлефонных апаратаў. Што гэта — байкот? Ад такой думкі ў пот кінула. А калі так і далей будзе? Ды не. Чаго-чаго, а званкоў хопіць. Жыццё ідзе. А без начальства ў нас працаваць не навучыліся. Хто

яшчэ не ведае, што ён заняў вялікі кабінет, хто будзе вывучаць нораў новага губернатара, хто далікатнічае: чалавек наваселле спраўляе, а яму надакучаюць... Трэба і самаму пра сябе даць знаць, праявіць ініцыятыву.

Ранішнім сваім крокам, першым у гэтых сценах, Вікенцій Паўлавіч быў задаволены. Раней, чым зайсці ў свой кабінет, ён ласкава пагаварыў з сакратаркай Матронай Піліпаўнай, сівой ужо жанчынай. Яна глядзела на новага губернатара спалоханымі вачамі і пэўна палічыла сваім абавязкам паведаміць:

— Я маю пенсійны ўзрост.

— А што, вам у космас ляцець? За гэтым сталом, бачу, вы камп'ютэр асвоілі... можна доўга сядзець.

— Я і сяджу чатырнаццаць гадоў... а ўсяго...

— Не бойцеся. Старыя кадры я ў крыўду не дам.

І пайшоў не ў свой кабінет, а да першага намесніка Каржакевіча.

Маладзейшы за яго, адзеты ў новы гарнітур (не помніў: заўсёды сустракаў яго такім элегантным, ці ён так адзеўся для сённяшняга дня?). Сяргей Аўдзеевіч пачціва падняўся і, здалося, пабляднеў. Гэта Вікенція Паўлавіча здзівіла, бо чуў, што ён незалежны, прынцыповы, нікому не баіцца праўду сказаць, хоць часам гэтая незалежнасць перарастала ў ганарыстасць і фанабэрыю, за што яго асуджалі.

Павіталіся за рукі і добрую хвіліну разглядвалі адзін аднаго — вывучалі, хоць і дагэтуль сустракаліся не аднойчы. Але тады Каржакевіч стаяў вышэй, цяпер наадварот.

Намеснік закурыў цыгарэту, прапанаваў пачак начальніку і здзівіўся, што той не курыць.

— І гарэлкі не п'яце?

— Часам — віно.

— Доўга жыць будзеце. А я выпальваю па два пачкі ў дзень. І гарэлку п'ю, — сеўшы не за рабочы стол, а за доўгі — для нарад, напроціў Вікенція Паўлавіча, адразу, без уступу і падрыхтоўкі, выявіў свой прамы характар:

— Дык мне збіраць манаткі?

— Чаму?

— Кожны новы першы — раней, цяпер — прэзідэнт ці губернатар падбірае сваю каманду. Я ў вашай камандзе не быў, я падтрымліваў Пятра, лічыў: стары конь баразны не скрывіць. Возьмеце Залозу?

— Не.

— Не? — Каржакевіч здзівіўся.

— Іван прымае маю прапанову. Але не на ваша месца. Ніжэй. Сам просіцца на кіраўніка справа.

Каржакевіч легка свіснуў і ціхенька засмяяўся.

— Што вас здзіўляе?

— Не, нічога. І ніхто. Усё правільна. Іван Яўменавіч проста знае, што Чувака трэба як можна хутчэй гнаць... вызваляць, прабачце.

— За што?

— Многа накраў. Хопіць. Трэба і іншым нешта пакінуць.

— Здзіўляеце вы мяне. Зналі, што крадзе, і трымалі? Вы колькі кіруеце вобласцю, як Мудры раптам пайшоў у адстаўку?

— Тры месяцы...

— І толькі цяпер раскусілі Чувака?

— Раскусіў даўно. Але таго, хто ўмее красці, нялёгка зняць. Так было, ёсць і будзе. Пакіруеце — пабачыце.

— Так ёсць, але так не будзе!

Намеснік цяжка ўздыхнуў.

— Дай Бог. Дык магу працаваць далей?

— Безумоўна. Калі, канешне, спрацуемся. А цяпер, агледзеўшыся, я прыйду да вас за навукай. Будзеце вучыць?

— О! Гэта новае. Ніводзін першы не вучыўся ў сваіх намеснікаў.

— Вы так думаеце? Гонар не дазваляў прызнацца, а вучыцца вучыліся. Толькі дурань ні ў каго не вучыцца.

Сяргей Аўдзеевіч весела засмяяўся.

— А плакаць не будзеце, калі я буду біць вас лінейкай па руках? Бацька мяне біў. Здорава памагала.

— Толькі ж не вельмі важкую лінейку выбірайце. А то я музыка, глядзіце, якія тонкія пальцы.

— Я люблю прадметы важкія, моцныя. Жонка гадоў дзесяць пілуе, што я ніяк не замяню ў спальні шафу з дубовых дошак. А мне шкада. Гадоў сорак назад склеена нашымі лепшымі ў свеце мэблярамі. З пушкі не разаб'еш. Перасунуць з месца на месца — трэба не менш чацвярых добрых малайцоў.

Дзіўна, але менавіта гэтая дробязь — шафа — дала дозу сімпатыі да гэтага стыльна апранутага чалавека. Не мела значэння, што гэта — кансерватызм, ашчаднасць. Ашчадным ён быў і сам, і Маша, і дзяцей выхоўвалі ў беражлівасці. А кансерватызм... У маладосці ваяваў супраць кансерватараў. А цяпер і гэтая рыса стала падабацца ў людзях: такія не ламаюць бяздумна ўсё старое, не рэфармуюць жыццё з наскока.

Зноў спыніўся перад пустымі паліцамі кніжнай шафы. Пастаяў, падумаў, выйшаў у прыёмную.

— Матрона Піліпаўна, там у шафе пустыя полкі. Што вынеслі? Маркса і Леніна?

— Канешне, класікаў, Вікенцій Паўлавіч, — жанчына стоена ўздыхнула.

— І дзе гэтыя кнігі?

— Думаю, у Васіля Антонавіча на складзе. Ён чалавек культурны, такія кнігі не мог выкінуць у макулатуру.

— Пастаўце, калі ласка, іх на месца.

— Зараз жа?

— Не. Пасядзіце ў прыёмнай. Мне хочацца з пэўным парадкам прыняць першага наведвальніка. Зраблю першы крок да... бюракрата.

— Вы бюракратам не станеце.

— Бог яго ведае. Не хачу стаць ім. Але напэўна буду. Нікуды не дзенешся — такое жыццё!

І ён неўзабаве з'явіўся, першы прасіцель. Загучаў голас у невялікім настольным дынаміку — ажно спалохаў:

— Вікенцій Паўлавіч! Да вас просіцца на прыём Барэйка.... Кажа, вы яго ведаеце.

Не прыгадаў чалавека з такім прозвішчам.

Матрона Піліпаўна прынесла паперку: «Барэйка Сцяпан Фаміч, шафёр аўтабазы выканкама».

— Ах, Сцяпан! — і адчуў няёмкасць: два тыдні ездзіў з ім і не даведаўся прозвішча. «Такая мая ўвага да людзей! Да старога чалавека: Сцяпан, Сцяпан. Як і да маладога Юркі. Пасаромейся, губернатар».

Падняўся, сам выйшаў у прыёмную. Павітаўся з шаферам за руку; рука шурпатая, мазолістая, выходзіць, не толькі баранку круціць. Чалавек вельмі збянтэжыўся.

— Заходзьце, заходзьце, Сцяпан Фаміч.

Зайшоў, стаў пасярод кабінета, збянтэжана камячыў фуражку, то чырванеў, то бляднеў.

— Ды вы сядайце.

Не сеў. Махнуў шапкай і — як у ваду кінуўся.

— Таварыш губернатар! За што ж мяне з работы гоняць? Тры гады да пенсіі.

— А за што?

— А я не помню, што я сказаў, калі шчанюк той, няўмека, машыну стукнуў. Ну вылаяўся, відаць. Хоць і гэтай прывычкі не маю.

— І за гэта вас звальняюць? Хто?

— Дырэктар.

— А дырэктару хто сказаў?

— А я падумаў — вы...

— Ды што вы!

Адразу падумаў: «Відаць, Іван, зараза. Яшчэ не заняў пасады, а ўжо камандуе. Але ж і арганізатар. Свой чалавек, надзейны. Грудзьмі заслоніць... і ад кулі, і ад слова. Без такога шчыта з'ядуць. Але як табе паказаць тваё месца? Каб без слоў зразумеў...»

— Ды вы сядайце, Сцяпан Фаміч. І не хвалюйцеся. Будзеце працаваць. Такімі кадрамі не кідаюцца, — і ўміг прыйшло рашэнне, якое здалося бездакорным: — Хочаце мяне вазіць?

— Вас? — шафёр ажно падняўся з крэсла.

— А што? Толькі вам я магу даверыць сваю персону.

Як пазваніць вашаму дырэктару? Як імя яго? — не помніў дырэктаравага тэлефона, толькі дыспетчара.

Прыйшлося падключаць Матрону Піліпаўну. Вікенцій Паўлавіч набраў тэлефон кіраўніка аўтабазы.

— Міхаіл Васільевіч? — і назваў сваё прозвішча. Дырэктар не дачуў ці не паверыў.

— Хто? Хто?

— Ваш новы губернатар, як вы называеце.

— Слухаю, Вікенцій Паўлавіч, — голас уміг змяніў• ся — стаў мядовы.

— Я хачу, каб мяне вазіў Барэйка Сцяпан Фаміч. Дырэктар захлынуўся, ажно дзіўна каўкнуў і цяжка

задыхаў у трубку.

— Ведаю, што вы намерваліся звальняць яго. За што? Не можаце сказаць? А робіце акт беззаконня, прабачце, самадурства. За такое ў дэмакратычным грамадстве здымаюць дырэктароў...

— Не я...

— Знаю, што не вы. Хто — ведаю. З ім будзе асобная размова. Паколькі мне зацверджана па штаце два шафёры... Я выбіраю Барэйку і Ліпая. Старога і маладога! Маю права на выбар?

— Слухаю, Вікенцій Паўлавіч. Палажыўшы трубку, спытаў у Сцяпана:

— З Юркам спрацуецеся?

— З Юркам? Задавака. Але хлопец нічога. У вашых руках...

— Не ў маіх — у вашых. Вы — яго бацька. Барэйка засмяяўся і нечакана незвычайна пахваліў:

— А вы — чалавек.

Сапраўды, незвычайна. Пахвала такая здалася найвышэйшай, ніхто ні разу яшчэ не даваў такой атэстацыі — чалавек!

Успамінаў — і пасміхаўся, думаў: «Так проста быць Чалавекам. I — во парадокс! — так няпроста ім заставацца ў любой сітуацыі. Здолею?»

Праз якую гадзіну ледзьве не сарваўся. У кабінет не ўвайшоў — уварваўся кіраўнік справамі выканкама Чувак. Дзверы, глядзі, што нагамі адчыніў, грымнуў імі — шыбы задрыжэлі. Чырвоны, з шалёнымі вачамі, яўна прыняў для смеласці спіртнога. Не павітаўся. Крыкнуў з парога:

— Ну што, новая мятла?! Мяцеш з парога?

Вікенцій Паўлавіч насцярожана падняўся з крэсла.

— Яшчэ не мёў, але буду мясці.

— I Чувака першага — пад нож?

— Чаму пад нож? Дзіўная ў вас тэрміналогія. Дамо вам пасаду.

А сам закіпеў злосцю не на Чувака — нахабніка, а на далікатнага Каржакевіча: ён жа сказаў, што кіраўніка справамі трэба мяняць, бо задужа многа накраў, і, выходзіць, ён жа, далікатны Сяргей Аўдзеевіч, тут жа перадаў Чуваку іх размову.

— Значыцца, вырашана?

— Вырашана.

— Хутка ты вырашаеш, губернатар! Глядзі, паслізнешся. Вызваляеш месца дружку свайму? Дык я табе скажу: прайдзісвет ён, твой Залоза.

Такая ацэнка даўняга сябра яго і цяперашняга вернага памочніка бадай абразіла. А яшчэ непрыемна кранула, што Чувак кажа яму непачцівае «ты», — не хварэў на залішні гонар, але хамства не цярпеў.

Стрымаў сябе і сказаў ветліва:

— Вы з ім працавалі, з Іванам Яўменавічам?

— Не.

— А я працаваў. I не скажу, ніхто не скажа, што ён краў... Былі ў яго слабасці... Але ў каго іх няма?

Чувак сцішыўся, змяніўся з твару: з чырвонага зрабіўся бледным.

Спытаў бадай пачціва:

— Дык мне здаваць справы?

— Каму?

— Як — каму! Вы ж назначылі Залозу.

— Я нікога яшчэ нікуды не назначаў, працуйце.

Чувак хвіліну пастаяў, падумаў.

— Ды не, спадар губернатар. Чакаць, пакуль вы пакажаце мне на дзверы, я не буду. Во заява — па ўласным жаданні, — і дастаў з

бакавой кішэні паперу, разгарнуў, палажыў перад губернатарам. Вікенцій Паўлавіч кінуў на яе вокам і сказаў:

— Пачынаеце з крыўды вы дарэмна. А за заяву магу сказаць дзякуй. Мне лягчэй. Я яшчэ не навучыўся звальняць.

— Навучыцеся, — няветліва сказаў Чумак і, не развітваючыся, выйшаў, але дзвярамі больш не грукнуў — зачыніў ціха.

І аднак Вікенцій Паўлавіч адчуў сябе брыдка — як плюнулі на яго. Ён са школьных гадоў баяўся такіх сітуацый, у яго, як казалі хатнія, матчын характар — мяккі, далікатны; Варвара Ціханаўна за ўсё жыццё не пасварылася ні з адной суседкай і дзяцей гэтаму вучыла. Можа, таму ён і не лез на высокія пасады. Які д'ябал падбіў яго палезці так высока? Ці толькі высокая ідэя — боль за развал вялікай краіны, боль за збядненне народа?

«І што ты хочаш? Ашчаслівіць народ? Чым? Выгнаўшы зладзюгу Чувака? Ну, выганю я яшчэ пяць — дзесяць такіх чувакоў... І што? А іх ужо тысячы развялося, як прусакоў. З усіх шчылін лезуць. А я не знаю, якое зелле супраць іх прыдумаць. Ды і што прыдумаеш? Тое, што сачынялася партыяй? Дык за любы зварот да мінулага, няхай ён будзе звышразумны, мне такіх сабак навешаюць, што свае адвернуцца. Той жа Іван... Як ні дзіўна, былы першы сакратар райкама партыі зрабіўся рыначнікам. Ды і я... хіба я супраць рынку? Я — за. Але каб за разумны, цывілізаваны. Дзе прачытаць разумнае пра шведскі сацыялізм, пра кітайскі вопыт? Няўжо Маркс і Ленін так памыляліся? Не, штосьці тут не так. Дактары, акадэмікі, растлумачце! Маўчыце? Ды не, здаецца, і не маўчаць, але перажоўваюць газетныя ісціны. Журналісты фактамі жыцця даказваюць больш, чым тэарэтыкі. А можа, і пачаць з таго, што сабраць вучоных? Столькі галоў! Падагрэць іх, распаліць, сутыкнуць! Няхай паспрачаюцца! А я паслухаю. Нехта ж, ды, думаю, і не адзін скажа разумнае. Трэба ж мець, хоць які ідэалагічны, тэарэтычны падмурак!»

Сеў у крэсла, спытаў па селектары:

— Матрона Піліпаўна, хто ў нас займаецца навукай?

— Якой?

— Усімі навукамі. Універсітэтамі, інстытутамі.

— Быў аддзел, але яго скасавалі. Цяпер усё ў аблана — школы, інстытуты...

— Прабачце. Я не дабраўся яшчэ да штатнага раскладу. Хто загадчык?

— Дык Сімакоў жа, ён з вамі ездзіў.

Ажно ў галаву ўдарыла. Як можна забыцца, што загадчык аблана Эдуард, з якім знаёмы з камсамола? Во гэта заскок дык заскок! Вушы загарэліся ад сораму.

«Думай, Вікенцій! Думай! Раней, чым націснуць кнопку селектара. Любую кнопку. Няўвага да людзей, да іх пасад, характараў — недаравальны грэх для любога кіраўніка. Асабліва для таго, каму далі такое гучнае званне — губернатар».

Рабочы ў спяцоўцы прынёс кнігі. Цэлы мяшок. Цяжкія, што цагліны. Бадай злосна грукнуў мяшок на падлогу, на паркет.

Вікенцій Паўлавіч абурыўся. Абурыла не тое, што так непаважна кінуў кнігі — кнігі! Абурыла, што не павітаўся нават, слова не сказаў. Кінуў: во ваша дабро! І пайшоў. Чым незадаволены? Падумаў, што вяртаецца былая ўлада? А чым яму дрэнна было пры старой уладзе? І што яму дала новая?

Ды Бог з ім, з рабочым. У кожнага свой характар. Ды ці мала што яму магло сапсаваць настрой. Мог той жа Чувак на развітанне даць разгон, спагнаць злосць на падначаленых.

Дастаў з мяшка том Леніна, зморшчыўся. Кніга была бязбожна запылена. Адчыніў дзверы ў прыёмную, папрасіў:

— Матрона Піліпаўна, дайце мне анучыну якую чыстую кнігі выцерці.

Сакратарка не адразу прыйшла з двума ладнымі шматкамі блакітнай фланелі.

— Вы, Матрона Піліпаўна, вытрыце пыл, а паставіць... я сам пастаўлю.

Узяў том Леніна, разгарнуў. Прачытаў: «С другой стороны Рабкрин должен быть сведен к 300-400 служащим, особо проверенным по части добросовестности и по части знания нашего госаппарата, а так же выдержавшим особое испытание относительно знакомства их с основами научной организации труда вообще и, в частности, труда управленческого, канцелярского и т. д.»

Здзівіўся. «І на гэта забыліся? Не помню, каб за апошнія шэсць гадоў хтось прыгадаў ленінскія словы... Гэтыя і многія іншыя. А між тым як актуальна яны гучаць».

Матрона Піліпаўна, убачыўшы, як губернатар паглыбіўся ў чытанне, выцірала і складвала кнігі бясшумна, стаіўшы дыхание. Вікенцій Паўлавіч чытаў.

Увайшоў Каржакевіч, прысеў каля стала. Гаспадар зірнуў на яго і дачытаў абзац.

— У што вы так паглыбіліся?

Вікенцій Паўлавіч загарнуў кнігу.

— Ленін? — здзівіўся намеснік. — Вы штудзіруеце Леніна? Думаеце, вернемся ў сацыялізм?

— Думаю, што вернемся. Але не сёння. І не заўтра. Гадкоў... Не скажу праз колькі... не праз адзін дзесятак. І сацыялізм той будзе зусім іншы. Чыталі пра шведскі вопыт? А я на днях прачытаў выказванне аднаго старога, які не занімаў высокіх пасад, але стаў бацькам самай вялікай нацыі — Дэн Сяопіна. Я нават выпісаў яго словы, — дастаў з нагруднай кішэні запісную кніжачку. Во яны: «Які сэнс у ярлыках — «капіталістычны», «сацыялістычны»? Галоўнае — развіццё прадукцыйных сіл, павышэнне жыццёвага ўзроўню». Але я гатовы аспрэчыць і Дэна. Каб ісці да мэты і не блукаць, трэба знаць дарогу, а дарога ў палітыцы і эканоміцы — тэорыя. Без яе — як цёмнай ноччу ў лесе.

— Не распішуць вас журналісты, убачыўшы ў шафе гэтыя кнігі?

— Няхай распісваюць. Чаму мы ўсіх баімся? Кніг баімся. Дэмакраты!

— Дарэмна вы так раптоўна Чувака выгналі.

— Я не выганяў яго. Ён сам падаў заяву па ўласным жаданні. Ад вас ён выскачыў раз'юшаны.

— Ад мяне?

— А каму я сказаў, што Іван Залоза просіцца на кіраўніка? Нікому не казаў...

У Каржакевіча перасмыкнулася шчака.

— Ваш Іван яшчэ ў час выбараў крычаў, што разгоніць усіх нас.

— Ну і дурань. Хоць на Івана гэта не падобна. А чаму вам раптам стала шкада Чувака? Вы ж самі сказалі: злодзей.

— Злодзей. А хто ў наш час не крадзе?

— Вы што, сабе не верыце?

Каржакевіч засмяяўся.

— З вамі небяспечна гаварыць... на некаторыя тэмы.

— Давайце мы з вамі не будзем запускаць руку ў дзяржаўнае, і нашы падначаленыя перастануць... не адразу, безумоўна, але...

— У дзяржаўнае мала хто ўжо запускав руку. Эканоміка шматукладная. Можна браць у прыватным. І не красці, у банальным разуменні гэтага слова. Самі дадуць.

— Хабар? За што?

— А вы знаеце, даюць за слова, за добрае слова.

— Не цямніце, Сяргей Аўдзеевіч. Я знаю вагу слова, знаю, як яно цэніцца. Але тое слова, за якое могуць даць хабар, мае матэрыяльную вагу: вы падтрымалі атрыманне крэдыту, стварылі рэкламу, падказалі

перспектыўную прыватызацыю, выгоднае акцыяніраванне, памаглі, каб АПУ адвяло лепшы ўчастак для забудовы.

Каржакевіч засмяяўся.

— А вы ведаеце кухню.

— А хіба я на небе жыў?

— Але якія мы былі б кіраўнікі, каб не рабілі таго, што вы пералічылі. Гэта наша праца. Памагаць трэба не толькі вагоннаму заводу, але і сумеснаму з немцамі тарнаму заводу.

— Але за гэта вам дзяржава плаціць зарплату.

— Хто ў наш час жыве на зарплату?

— Вы выдаеце сябе.

— Вы робіце абразлівыя вывады. Я жыву на зарплату. Але каньяк часам п'ю чужы. І піва бясплатнае... Які б вы не былі звышсумленны, адгарадзіцца ад людзей сцяной вам не ўдасца, а ў іх, у людзей, свае нормы жыццяўклада. І іх, нормы гэтыя, проста так, адным махам не пераробіш. Дазволю сабе параіць вам: не спрабуйце сякчы з пляча. І не пératварайцеся ў новую мятлу. Чувак грыміць наконт мятлы. Але дзвярыма не грукае, абыходзіць упраўленні, аддзелы, чуллівых жанок да слёз даводзіць.

— Акцёр.

— Акцёр, — згадзіўся Каржакевіч і сумна ўздыхнуў: — Усе мы акцёры, толькі тэатр наш пагарэў.

3

Паездка ў сталіцу не дала тых вынікаў, на якія спадзяваўся, таму настрой быў не лепшы. Думаў: «Не навучыўся я выбіваць. Іван кажа: гэта талент — умець выбіць. І лічыць, што ён найлепшы выбівала з усіх нашых выбівал. Трэба было ўзяць яго». Ішоў пехатой на працу, што рабіў часта, хоць ахоўнік — упаўнаважаны КДБ Міхаіл Палавінка — пратэставаў супраць гэтага, папярэджваў:

— Вы глядзіце: губернатараў страляюць, як курапатак.

— Не палохай. Я не з баязлівых.

А Іван, самы блізкі чалавек, неяк за кавай папракнуў:

— Танную папулярнасць нажываеш сваімі прагулкамі. А мы дрыжым.

Але Вікенцій Паўлавіч ведаў, што гараджанам падабаецца дэмакратычнасць губернатара: з ім можна і на вуліцы пагаварыць.

Вярнуўся а другой палавіне ночы. Не даспаў. Галава чыгунная. Але звонкае асенняе паветра — уначы падмарозіла — хораша ўзбадзёрыла. Сцяпану загадаў спаць да паўдня. Не будзе стары спаць, Юрка спаў бы. А Сцяпан скардзіцца, што мала работы.

— Мала вы ездзіце.

— Бензін дарагі.

— І сямейныя вашы... жонка, дзеці. Няўжо ім не трэба?

— Няхай не разяўляюць рот сямейныя. Службовая машына не для прыватных паездак.

— Каб жа ўсе так лічылі, — і стары шафёр цяжка ўздыхаў — ці ад таго, што не ўсе такія, ці ад таго, што сумна яму цэлы дзень забіваць у гаражы «казла».

Прайшоў — і ўзбадзёрыўся, як аднавіўся. На ліфце паднімаўся зусім з іншым настроем, чым той, што застаўся ад паездкі. «Чорт з імі, гэтымі сталічнымі бюракратамі!»

Адчыніў дзверы ў прыёмную і... ашаломлена застыў: замест Матроны Піліпаўны на сакратарскім месцы сядзела другая жанчына — маладая, эфектная, з густам падфарбаваная, з моднай прычоскай. Але ашаламіла не сама нечаканая падмена. Ашаламіла, што насустрач, запунцавеўшыся, паднялася даўно знаёмая, яшчэ з камсамола, прыгажуня Аня Апановіч, інспектар райана, сакратар камсамольскай арганізацыі ўсяго выканкама. Не толькі яны, камсамольцы, але некаторыя ўжо і пасівелыя дзядзькі былі закаханы ў яе.

Ён, Вікенцій, разы тры цалаваўся з Аняй, але быў ужо жанаты і дакараў сябе нават за словы, якія аднойчы сказаў ёй: «Шкадую, што рана ажаніўся». Адчуваў сябе вінаватым перад Машай. І пасля таго пазбягаў заставацца з Аняй адзін на адзін, а яна не аднойчы набівалася ў паездкі па раёну. Не ўзяў ні разу — баяўся грэхападзення.

І вось яна ў яго прыёмнай. Якім чынам? Якім... Іванава штукарства. Толькі гэты вялікі камбінатар мог знайсці яму такую сакратарку. «Колькі гадоў я не бачыў яе? Гады чатыры. Не пастарэла. Такая... Аднак, дзе ты, камбінатар, выкапаў яе? Во ўжо праўда: з-пад зямлі можаш дастаць...»

Кароткую хвіліну цягнулася яго трохі збянтэжанае здзіўленне, але гэта дало ёй магчымасць павітацца першай — з ласкавай усмешкай:

— Добрай раніцы, Вікенцій Паўлавіч.

— Добры дзень, Ганна Фядосаўна Апановіч. Так?

— Не забыліся? — яна ціха засмяялася.

Ён наблізіўся, праз стол працягнуў жанчыне руку. Яе рука была гарачая, а яго, з вуліцы, халодная. І цеплыня гэтая пацякла па руцэ ў... куды? у сэрца? І гэта яго спалохала, ён адняў руку.

— Вы падмяняеце ці... на пастаянна?

— А хіба Іван Яўменавіч з вамі не гаварыў? — яна як спалохалася.

— Гаварыў, гаварыў... Але не сказаў, каго знойдзе.
— Мяне знайшоў.
— Нядоўга шукаў.
Ганна засмяялася неяк дзіўна.
— А яны сябруюць з маім мужам. Не раз і не два бралі чарку ў нас на кватэры. Івану мае рыжыкі падабаюцца. Не грыбны быў год, а ў мяне рыжыкі ёсць. Не адмовіцеся пакаштаваць? Толькі без чаркі не той смак...
— Запрасіце яго да мяне.
— Яўменавіча?
— Яго, яго, чорта лысага, — буркнуў Вікенцій і пайшоў у кабінет. А сакратарка глядзела яму ўздагон і вельмі ж загадкава пасміхалася.
Залоза ўскочыў з папкай папер, але ўбачыў, што губернатар нахмураны, што асенні дзень, і не палез вітацца за руку, як звычайна, — зрабіў выгляд, што забыўся на прывітанне.
— Як з'ездзілася?
— Што ты робіш?
— А што?
Вікенцій Паўлавіч бліснуў поглядам на дзверы ў прыёмную.
Іван выбраў лепшую абарону — наступление.
— Ты ж мне даручыў займацца кадрамі апарата. Акрамя тваіх намеснікаў і загадчыкаў упраўленняў і аддзелаў...
— Іван, не круці. Я цябе бачу наскрозь, вялікі камбінатар.
— А што, не падабаецца? — і вельмі здзівіўся. — Аня не падабаецца? Ну, ты даеш, пан губернатар!
Што адказаць такому нахабніку? Паддайся такому...
— Куды ты Матрону падзеў? — спытаў строга, падумаўшы: «Калі зволіў — мала табе не будзе».
— А я перавёў яе да сябе загадваць сектарам. Зарплата вышэйшая. Перад пенсіяй ёй гэта важна.
Вікенцій Паўлавіч расслабіў сціснутыя кулакі.
— Хітруган ты, Іван, сын Яўменаў.
— Вікенцій Паўлавіч, дарагі мой чалавек! Толькі дурні не маюць хітрасці. А я не дурань.
— Што не дурань, то гэта праўда. Ну, што там у цябе ў папцы? Новыя камбінацыі? Не ўздумай паказаць мне камбінацыю з трох пальцаў — раскушу...
Залоза весела засмяяўся.
— Ну што ты, Вікенцій. Каб я!.. Ды лепшага памочніка ты да пенсіі не знойдзеш.
— Да пенсіі я застануся без памочнікаў.

— Не дазволім!

— Самаўпэўненасці ў цябе... — і падумаў: «За такі падхалімаж варта даць пстрычку па носе. Не даю. Прывучаюся? Не расслабляйся, Вікенцій!»

— Як твой аукцыён?

— Выдатна.

— Нават выдатна? Не думаў.

— Бо не цэніш маіх здольнасцей.

— І што прадалі?

— Усё, што зацвердзіў губернатар, прыватызавалі. Добра папоўнілі бюджэт. Не будуць урачы галадаць.

— Не люблю я гэтага слова. Народ правільна перайначыў: прыхватызацыя.

— Вялікі ты марксіст, Вікенцій. Маркса, Леніна ў шафу паставіў...

— А ты выкінуў бы, як Чувак? Ты хоць прачытаў «Капітал» у партыйнай школе?

Залоза весела аскаліўся.

— У школе не чыталі. У школе здавалі экзамены. А перад экзаменам мы добра частавалі прафесара.

— У тым і бяда, што мы гультаі і ад гэтага невукі. Цяпер які толькі бруд не выліваюць на Леніна. Сто прафесараў, учарашніх марксістаў расстаўляюць коскі ў ленінскай фразе: «Расстрелять нельзя помиловать». І забываюць, колькі Ленін напісаў. А мы з табой добрага артыкула не сачынілі. І ніхто не ўспамінае, што ў Леніна ёсць і такое выказванне: «Каким будет социализм, этого мы знать не можем». А ты кажаш! — Вікенцій Паўлавіч паглыбіўся ў даўгі спіс, дзе былі пералічаны аб'екты, пакупнікі, сумы, за якія прададзены. Хмыкнуў разы тры. І раптам ажно скалануўся, адкінуўся на спінку крэсла.

— Чувак купіў кандытарскі магазін?! За якія даходы?

— Вікенцій Паўлавіч! На аукцыёне пракурора не садзяць, які пытаў бы: адкуль у цябе грошыкі?

— Але мы з табой знаем, што накраў твой Чувак.

— Чаму ён мой? Канешне, накраў. Але не дакажаш. Правярала кантрольная палата па тваім загадзе. І што выявіла? Смешную дробязь.

— Бо і ў правяральшчыкаў рыла ў пуху.

— Не дакажаш.

Вікенцій Паўлавіч схіліўся над спісам і тут жа зноў адкінуўся:

— Іван! Чартаўшчына нейкая атрымліваецца: Чувакоўскі кандытарскі тайней, чым абутковы... Як гэта атрымалася? Ды ў

кандытарскім плошча ў тры разы большая, абсталяванне, па-мойму, там нават італьянская пякарня...

Залоза зрабіў здзіўленыя вочы, схіліўся над сталом, заглядваючы ў спіс.

— Праўда тайней? Не танней. Адна цана.

— Але магазіны розныя.

— Чорт яго знае! Я з малатком не сядзеў. Аукцыён ёсць аукцыён. Загадак на ім не менш, чым у жыцці. Думаеш, мяне не здзіўлялі там і цэны, і конкурс? А чым ты растлумачыш, што за кравецкую майстэрню і пачатковай цаны ніхто не прапанаваў?

— І не прадалі?

— Не прадалі. Знялі з аукцыёна. Я зняў. Скажу шчыра: цябе пабаяўся, ведаючы тваю ўнікліваець.

— Не вельмі ты баішея.

— А ты хацеў, каб баяліся?

— Вось гэтага я не хачу, — і зноў у спіс, чытаў павольна, перад некаторымі аб'ектамі і прозвішчамі паставіў птушачкі, пытальнікі.

— Што ты адзначаеш?

— Трэба ўдакладніць, што за людзі пакупнікі. Мы з табой павінны ведаць сваіх «герояў». Нам з імі ваяваць.

— З імі ці супраць іх?

— Калі зладзюгі, то і супраць.

— Уедлівы ты чалавек, Вікенцій. Але хачу сказаць табе адно: не ваюй супраць «новых». Яны ўжо сіла. Клас. Другой рэвалюцыі не зробіш. Падтрымай іх.

Губернатар уздыхнуў.

— Дажылі мы з табой, што мусім падтрымліваць тых, каго раней пасадзілі б.

— Што зробіш. Не мы рабілі рэвалюцыю.

— Ты называет рэвалюцыяй гэтую прыхватызацыю? Дык я цябе прашу: пры мне не ўжывай гэтага слова «рэвалюцыя» ў такім вось кантэксце. Яго нават самі «новыя» і іх лакеі-прафесары не ўжываюць.

Залоза смяяўся, як з вясёлага анекдота, ён умеў смяяцца — галасіста, заразліва.

— Слухай, Іван. А вось тут Чарняк Ірына Яўменаўна цырульню адхапіла. Не твая сястра?

— Не, не мая.

— А па-мойму, у цябе ёсць сястра Ірына.

— Ёсць. Але яна ў Гродна.

— Яўмен — рэдкае імя.

— Цяпер стала рэдкім. А калі нарадзіўся мой бацька, то было нярэдкае. У бацькі дваюрадны брат — Яўмен... Ты як быццам не верыш мне.

— Ды не. Табе я веру, Іван. Будзе трагедыя — для мяне, — калі я страчу веру ў такога чалавека, як ты. Я не забуду, як ты прыкрыў мяне ад магчымай кулі.

— Дзякуй за добрае слова. Яно даражэй за медаль.

— Што ў цябе яшчэ?

— Помніш, я табе казаў... Многія ўстановы выкарыстоўваюць памяшканні, якія збудаваны за дзяржаўны кошт... за народныя грошы, за партыйныя — за нашы з табой узносы — у карысных мэтах: здаюць у арэнду пад офісы, магазіны. Колькі бяруць арэнды, каму яна ідзе, у чыю кішэню — адзін Бог ведае ды і той, не маючы добрай бухгалтэрыі, відаць, заблытаўся. Арэнда — дзяржаўныя грошы. І галоўнае — жывыя. Іх можна не закладваць у бюджэт, не выносіць на савет.

— Не любіш ты савет, дэмакрат.

— Савет я люблю — калектыўны розум. Ты помніш: без пленума райкама я не прымаў ніводнага рашэння, на бюро выносіў толькі цякучыя. Я не люблю людзей, якія сунуць свой нос куды не трэба. Як той Бажалаў. Думае, калі ён старшыня дэпутацкай камісіі, дык абавязаны заглядваць не толькі ў паперы канцылярыі, але і ў маю галаву.

Вікенцій Паўлавіч цяжка ўздыхнуў.

Бажалаў гэты нядаўна сцёбнуў яго ў газеце, што ён не выконвае свае выбарчыя абяцанні: заклікаў да галоснасці, а ў яго апараце тая ж атмасфера, што і пры партакратах і што кіруе не ён, губернатар, а кіраўнік справамі — былы сакратар райкама Залоза.

— Ты мне лекцыі не чытай. Давай прапановы.

— Прапанова кароткая: гаспадарамі гэтых дамоў павінны стаць мы. А цяперашнія гаспадары павінны стаць арандатарамі — арандаваць патрэбныя ім плошчы ў адміністрацыі губернатара. Я падрыхтаваў распараджэнне. Твой аўтограф — і...

Вікенцій Паўлавіч узяў паперу, глянуў, лёгка свіснуў:

— Дваццаць сем аб'ектаў? Махнуў ты, Іван!

— А што, пэцкацца з-за двух-трох? Чарнілы ў аўтаручцы даражэй будуць, чым мы заробім.

— Не гудзі. Галава баліць. Дай падумаць.

Удумліва паглыбіўся ў спіс дамоў і іх цяперашніх гаспадароў.

— Нагарадзіў ты... Навукова-даследчы цэнтр радыяцыі... Яго закрыеш? Мне галаву знясуць.

— Мы ж нічога не закрываем. Наадварот, ствараем умовы. У цэнтры гэтым паўтара дзесятка супрацоўнікаў — і такое памяшканне! Трэць здаюць у арэнду

дзвюм фірмам, якія да радыяцыі не маюць ніякага дачынення. Кажуць, за арэнду купляюць абсталяванне. Доўга купляюць. А вынікі — дзве дохлыя дысертацыі. Навука называецца!..

— Ну, а вось гэта ўжо не лезе ні ў якія вароты.

— Што?

— Тваё жаданне абрабаваць творчых людзей. Аддзяленні трох творчых Саюзаў — пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў — займаюць двухпавярховы домік. І гэты дом вочы табе мазоліць?

— А ты паглядзі, чым яны там займаюцца — не прасыхаюць цэлы дзень. За што п'юць? Думаеш, за ганарары? Хто ім плаціць ганарары? За арэнду п'юць. Яны ж з дванаццаці пакояў пакінулі сабе чатыры. А плата арэндная — самая нізкая. Якія добранькія! Яўна розніцу атрымліваюць натурай. Спіртавой. Між іншым, арэндуе там фірма, якая займаецца рэалізацыяй малдаўскіх він.

— Пасівееш з табой.

— А ты не бяры ўсяго да сэрца. У цябе — вунь які штат. Раздзялі на ўсіх. Гэты клопат даручы мне. З мяне даволі твайго кручка на паперы.

— Знаеш, Іван, сын Яўменаў... часам мне здаецца, што ты лічыш мяне за дурня.

Залоза пазмрачнеў і высмаркаўся ў насоўку — як заплакаў:

— Крыўдзіш, Вікенцій Паўлавіч.

— А ты не крыўдуй.

— Я не крыўдую. Але ж...

— Добра. Пакінь мне гэтае распараджэнне. Я падумаю. Параюся з юрыстамі. Хоць чакай... Сюды патрэбна яшчэ тлумачальная запіска — чый дом, што за дом, плошча, якую займаюць гаспадары...

Залоза весела засмяяўся.

— Ну, у цябе без працы не застанешся. Запісачка такая... на дзве старонкі... у дзесяць не ўложышся.

— Мала ў цябе пісараў? Матроне даручы. Яна і замерае, і падлічыць, і на камп'ютэры набярэ, і яна ж юрыст.

— Залішне давяраеш юрыстам. А большых дагматыкаў і блытанікаў, як гэтыя гора-законнікі, я не сустракаў.

— Не настройвай мяне супраць юрыстаў. Можаш паверыць на слова: цану ім я знаю... Ну, паехалі далей.

— А далей я буду цябе здзіўляць.

— А ты часта здзіўляеш. І я ўжо баюся новых дзівос. Але куды ад цябе падзецца? Здзіўляй.

— Мудроны просіць адвесці зямлю пад будаўніцтва двух магазінаў.

— Мудроны? Пятро? Дарагі наш правадыр?

— Ён.

— Якія магазіны ён хоча будаваць?

— Прадуктовыя, якіх не хапае. Нельга адмовіць.

— Адвесці яму зямлю мог мэр, яго прэрагатыва.

— Але адначасова ён просіць вызваліць ад уплаты разавага збора за ўстаноўку гандлёвых кропак. Ні ў якой пастанове гэтага няма. Але ў практыцы ёсць. Губернатарам дадзена такое права, я праверыў.

— Здзівіў ты мяне — што праўда, то праўда. Ай да Пятро Пятровіч! І хто ў яго будзе гандляваць? Сам стане за прылавак?

— У яго зяць і дачка камерцыяй займаюцца, але... у «сабачай будцы».

— Слухай, растлумач ты мне, усёвед. Каго не сустрэну з былых нашых кіраўнікоў — у кожнага то сын, то зяць, то дачка ці жонка займаюцца камерцыяй. Што гэта? Мода? Уменне перабудавацца раней за іншых? Расчараванне ў сацыялізме? Дык нядрэнна ж жыў Мудроны пры сацыялізме.

— Вікенцій Паўлавіч, усё прасцей. Гэтым людзям у пераходны час лягчэй было ўзяць банкаўскі крэдыт... А можа, хтосьці і ў партыйную касу залез ці ў дзяржаўную. Чувак пэўна ж запусціў руку, каб цяпер купіць кандытарскі магазін. Крэдыт яны вярнулі праз год-два, калі інфляцыя абясцэніла гэтыя сумы, а законнікі нашы лавілі варон. Ды і ім, законнікам, было выгадна... ніякай індэксацыі не прыдумалі. Позна прыдумалі. А спахапіліся, калі ўсе, хто не дурань, вярнулі крэдыты. Але ў што гэта абыйшлося дзяржаве?

— Напішы артыкул на гэтую тэму, — Залоза засмяяўся.

— І што ён дасць, артыкул мой? Пісалі і да мяне... Ну, ды хопіць палітыкі. Здзіўляй далей.

— Царкоўнікі і епіскап Веньямін просяць ліцэнзію на ўвоз і продаж спіртнога. На богаўгодную справу — на будаўніцтва храмаў... Мяне здзівіла, што папам плацяць жабрацкую зарплату... — на самой справе Залозу здзівіла іншае: губернатар не засмяяўся з такой пікантнай навіны і здзіўлення не выказаў, а сурова спахмурнеў і нават скрывіўся, як ад зубнога болю.

— Дзе Хрыстос?

— Навошта табе Хрыстос?

— А хто гандляроў выганіць з храма? Мы з табой?

— Такой задачы не стаў, раю табе. Не пад сілу яна нам.

— У разбураным храме і гандляры да месца, так?

— Можа, і так. На захадзе ж навучыліся спалучаць веру ў Бога з бізнесам, не толькі законным. Я чытаў, што італьянскія мафіёзі глыбока рэлігійныя людзі і Бог адпускае ім грахі за іх уклады ў храмы.

— Не Бог адпускае — намеснікі Бога на зямлі.

Залоза вельмі здзіўлена паглядзеў на шэфа:

— Вікенцій! У мяне такое ўражанне, што ты, перакананы атэіст, пачынаеш верыць у Бога.

— Не рабі глыбокіх вывадаў, філосаф. Здзіўляй далей.

— На сёння ўсё. Цо занадта, то нездрова, як кажуць палякі.

— Праўда твая. Мудронаму рыхтуй распараджэнне. Кожны з нас з цікавасцю і нават злараднасцю назірае грэхападзенне бліжняга свайго, асабліва калі той хадзіў у праведніках.

— А сам ты глыбокія вывады робіш, сапраўды філасофскія.

— Не падхалімнічай перад начальствам.

— Не падмажаш — не паедзеш.

— А куды ты хочаш заехаць? Я цябе нікуды не павязу. Сам ты выбіраў гэтую горку, хоць я вызначыў табе вышэйшую. Нас з табой могуць разам вывезці.

— Не будзь песімістам, датэрмінова нас ніхто не вывезе — ні выбаршчыкі, ні прэзідэнт. А будзе набліжацца тэрмін — падумаем: адступаць ці наступаць. Ты яшчэ можаш апынуцца на пятым паверсе Рэзідэнцыі... А я — твой хвост...

— Не закідвай далека. І калі сур'ёзна, то не жартуй на гэтую тэму: наша з табой дэмакратыя патрабуе трымаць язык за зубамі. Не забывай, людзі не развучыліся пісаць і некаторыя любяць і той жанр, які не паспрабаваў класік. Помніш: «Испробовал все жанры, кроме стихов и доносов».

— Талстой?

— Чэхаў. Люблю. Перачытваю дзесяты раз. Зараз — пісьмы. Пачытай пісьмы класікаў. Вельмі павучальна.

Залоза, падняўшыся, пасміхнуўся:

— Не пачую падзякі?

— За што? Што падкінуў працу для майго камп'гатара? — Вікенцій Паўлавіч пастукаў пальцамі па галаве.

— За Аню. Удзячнасць...

— За каго?!

— За Ганну Фядосаўну.

— Рана ты хочаш удзячнасці. Пагляджу, якая з яе сакратарка. Матрона была сапраўдным памочнікам.

— Гэта будзе лепшая.

— Іван! Я табе казаў: тваёй самаўпэўненасці часам зайздрошчу, але нярэдка яна здзіўляе і яшчэ часцей раздражняе. Ты ва ўсім — як бога за бараду схапіў. Сумненні ў цябе бываюць?

— Яшчэ як часта!

— Глядзі ж ты, я і не думаў, што ты ўмееш сумнявацца.

— Але нярэдка яны развейваюцца пасля размовы з табой. Ты не ўяўляеш свайго ўздзеяння на людзей. Не дарэмна за цябе так дружна прагаласавалі.

— Падхалім ты ўсё ж, Іван.

— Але і горкую праўду адзін я магу сказаць. Не так хіба?

Кіраўнік справамі ішоў да дзвярэй, а губернатар глядзеў яму ўслед — без усмешкі, у глыбокай задумлівасці. У апошнія дні разам з улюбёнасцю ў Залозу, удзячнасцю, захапленнем яго старанннай працай з'яўлялася нейкае незнаёмае пачуццё — сумненне, трывога, незадаволенасць. Не мог вызначыць што. Зерне гэтага неакрэсленага пачуцця ўкінула ў душу Матрона Піліпаўна, сказаўшы неяк, як між іншым, без акцэнта:

— А ці не многа ўлады захапіў Іван Яўменавіч? Чувак столькі не меў.

Вікенцію Паўлавічу так не здавалася: Іван любую дробязь узгадняў з ім.

«Аднак жа новую сакратарку падкінуў, што ката ў мяшку. І выкруціўся, хітруган. Паклапаціўся пра

Матрону, пра яе перадпенсійную зарплату, — і, калі дзверы за Залозам зачыніліся, пагразіў яму пальцам: — Ну, мяне ты не перахітрыш, сябра мой. Я цябе бачу наскрозь».

А Залоза, апынуўшыся ў прыёмнай, дзе, акрамя сакратаркі, нікога не было, падышоў да Ганны збоку, схіліўся і цмокнуў яе ў шчаку. Яна рэзка адхіснулася.

— Якая ты баязлівая стала. Адвыкла?

— Іван, май сумленне.

— Я не маю яго? Здзіўляеш. Як табе тут?

— Добра.

— Па-мойму, вельмі добра. І Патап твой задаволены, — мужа яе, Панцеляймона Гаўрылавіча, Залоза яшчэ там, у раёне, называў чамусьці Патапам, што Ганну крыўдзіла. — Ён жа ў цябе прыроджаны камерсант з вопытам камбінацый у райспажыўсаюзе. Чувак задаволены ім.

— Гаўрылавічам усюды былі задаволены. Залоза пасміхнуўся.

— Аднак жа цэніш ты яго.

— Ён — мой муж.
— А я калі буду мець удзячнасць?
— Якую?
— Ты забылася якую? Якую меў некалі ў слаўным райцэнтры. Забылася, як нам там хораша было?
Жанчына залілася чырванню.
— Іван, забудзь. І я забуду.
— О, не! Так не пойдзе. Думаеш, я перацягнуў вас у цэнтр, даў кватэру, уладкаваў на працу толькі для таго, каб здаля табой любавацца, каханне мае незабытае? О, не!
Ганна Фядосаўна праверыла рукой выключальнік селектара.
— Ты не думаеш, што нас слухаюць?
— Баішся «жучкоў»? Ці яго? — Залоза ступіў за крэсла і... пацалаваў у шыю. — Якая ты апетытная! Але можам дамовіцца... Я адыду ўбок, калі ты адрасуеш сваю ўдзячнасць яму, — жэстам рукі паказаў на дзверы кабінета.
Ганна рэзка паднялася. Вочы яе бліснулі гневам, і шчокі пабялелі. Сказала не шэптам — амаль на поўны голас:
— Ну і хамло ж ты, Іван! Хам з хамаў. І я любіла такога чалавека?..
— Шкадуеш?
— Не шкадую. Што было — тое было. Але дараваць табе вось гэта, — вусны задрыжэлі, яна шукала слова, — вось гэтай здрады... Не здрады! — продажа не магу. І не дарую. Я табе не цёлка, што ты прадаеш мяне.
Залоза лісліва захіхікаў:
— Ну, разыйшлася, як халодны самавар... Я пажартаваў. Жарты перастала разумець?
— Я табе прыпомню гэты жарт!
— Давай паедзем у лес па грыбы... рыжыкі пайшлі... — і там прыпамінай што хочаш. Не забылася, як мы збіралі грыбы? Ах, якія грыбочкі!
Спахмурнелы твар жанчыны на міг асвяціла скупая, як асенні прамень сонца, усмешка.
— Чорт ты, Іван! На цябе й пакрыўдзіцца цяжка.
— Крыўдзіцца на мяне — самаму сабе шкодзіць. Я добры. Я наш... Ты знаеш, як ён, — кіўнуў на дзверы кабінета, — мяне любіць. Не дурань — помніць, хто яго пасадзіў у гэтае мяккае крэсла. А ты хочаш адстаўку мне даць... Не спяшайся. Дай ручку, каралева. Даўно не цалаваў жаночай рукі. А люблю...
— Ты не толькі рукі любіш.

— Што праўда, то праўда — не толькі. Усё люблю. Бог стварыў жанчыну на пагібель нам, грэшным.

Узяў яе руку, яна не адняла; ласкава ўгледзеўся.

— Ах, якая ручка! Хто за цябе на гародзе працаваў? Патап?

— Калі-небудзь я цябе так патапну...

— Бі, бі па маёй залысіне. Ад такой рукі любая кара — узнагарода.

— Балбатун ты, Іван.

Скрыпнулі ўнутраныя дзверы ўвахода ў кабінет.

Яны адскочылі адно ад аднаго; сакратарка заняла сваё месца за сталом, падсунула паперы.

Выйшаў Вікенцій Паўлавіч. Трохі здзівіўся:

— Ты яшчэ тут? Да Ганны Фядосаўны заляцаешся?

— А што? Сухар быў бы той мужчына, які не кінуў бы вока на такую жанчыну. Я яшчэ ў раёне не прамінаў заглянуць у аддзел райвыканкама. Бабы плёткі пусцілі. І мая Марына — раўнівая ж да чорцікаў! — прарэдзіла мой чуб. І астудзіла мой жар да замярзання.

— І ты робіш другі заход? Глядзі, скажу Марыне Аляксееўне — дык яна дябе зусім лысым зробіць. Не верце яму, Ганна Фядосаўна! Донжуан. На сустрэчах усіх маладых жанчын перацалаваў. А мне адных бабуль бяззубых падсоўваў. Памочнічак!

Ганна весела засмяялася, мабыць, уявіўшы, як кандыдат у губернатары цалаваўся са старымі; паверыла, што Іван цалаваўся з маладымі, і адчула нейкую дзіўную нязвыклую рэўнасць, але і я на дадала смяшлівага настрою.

Разам з тым Ганна ўпершыню па-жаночы параўнала іх — Івана і Вікенція. І бадай спалохалася, што параўнанне на карысць губернатара: вышэйшы ростам, страйнейшы, без жывоціка, як у Залозы, з інтэлігентным тварам, з глыбокімі залысінамі, якія чамусьці сведчылі не пра старасць, а пра розум. Успомніла канава: «Я адыду ўбок, калі ты адрасуеш сваю ўдзячнасць яму...» Абразілася мацней, чым тады, калі ён сказаў гэта. «За каго ты мяне лічыш, дурань недапечаны? Вось вазьму і — назло табе... — і зачырванелася: — Ой, Божа! Пра што я думаю?!»

4

Сняданне было тым нядоўгім часам, калі яны заставался адзін на адзін, і Вікенцій Паўлавіч расказваў жонцы пра свае справы; разумеў, што гэта хораша іх звязвае. Так ужо павялося дванцаць тры гады назад, — з дня вяселля — яны давяралі адно аднаму свае службовыя клопаты. Абедаў сумесных было нямнога, нават у

выхадныя дні, вячэры — часцей, ды на вячэрах заўсёды прысутнічала дачка, чатырнаццацігадовая стракатуха Таня. Слухалі яе, між іншым, з цікавасцю: Таня ўмела расказваць пра школьныя прыгоды займальна, забаўна, з гумарам.

Раніцою і дачка, і сын рана беглі ў школу, універсітэт. Губернатар ледзьве не штодня затрымліваўся ў кабінеце да позняга вечара. А на работу ніколі не з'яўляўся раней дзевяці гадзін раніцы.

Вікенцій Паўлавіч разумеў: калі ён хоць раз прыйдзе раней, гэта прымусіць змяніць свой рэжым многіх людзей: намеснікаў, сакратарку, ахоўніка, шафёра. А гэтага ён не мог дазволіць, рабіў усё з аглядкай на нормы маралі, этыкет; крый Божа, не даць сабе, як кажуць, забурэць, стаць уладаром: што хачу, тое і варачу. Застацца чалавекам! З яго бяруць прыклад. Хоць той жа Іван не прызнае яго нормаў і часам нават кпіць з яго.

Ён адказваў жартам, але часам і трывожыўся: Іван падмінае пад сябе ўсіх, нават намеснікаў губернатара і яго прымушае часам ісці на змову са сваім сумленнем. Бываюць сітуацыі, калі без Івана разабрацца немагчыма, а ў таго вопыт першага сакратара райкама, у яго, як здаецца часам, нарыхтаваны адказы на ўсе пытанні складанага жыцця.

Марыя Іванаўна сядзела насупраць, праз стол, і глядзела на мужа неяк нязвыкла, яму здавалася пільней, чым звычайна, але папранейшаму ўлюбёна, што яго заўсёды кранала: без малога чвэрць стагоддзя разам і — такая закаханасць! Напісаў бы сучасны пісьменнік — не паверылі б: тургенеўская гераіня.

— Ну як твой Іван? Камандуе?

— О, Іван! Іван — геній! Геній па вядзенні спраў.

— Не перабольшваеш яго здольнасцей?

— Іванавы таленты перабольшыць немагчыма. Я кажу табе:геній!

Марыя Іванаўна засмяялася.

— Не забывай, што я неўрапатолаг, а значыцца, трохі псіхолаг. Твая ўлюбёнасць у людзей — чэхаўская. Але, бывала, што яна і падводзіла цябе.

— Бывала.

— Добра, што ты самакрытычны.

— Ад цябе набраўся. У маладосці я быў ганарысты, самалюбівы.

— Ці не гэта прымусіла цябе выбірацца з такой непрыкметнай пасады ў тузы? Мяне страх апанаваў, калі я пачула вынікі выбараў. Жах! Мой Віця — губернатар. Да кампаніі я з гумарам адносілася: няхай пацешыцца...

— Невысокай ты думкі пра свайго Богам дадзенага...

— Ды не. Думкі я высокай. Але на такой вышыні і ў сне цябе не бачыла... Але ты еш. Ты мала ясі. Пахудзеў. Ці добра вас там кормяць у вашай сталоўцы?

— Не бойся, губернатар з голаду не памрэ. Праўда, я рэдка іду ў залу начальства, а падсаджваюся да каго-небудзь з супрацоўнікаў у агульнай зале...

— І пра цябе ходзяць легенды.

— Легенды — гэта ўзнагарода. Горш, калі пачнуць расказваць анекдоты.

— Людзям не забароніш. Усё могуць сачыніць.

— А як твая новая сакратарка?

Такі нечаканы жончын пераход трохі здзівіў і насцярожыў. «Ужо пусцілі плётку? Не было ж ніякіх падстаў».

— Ты ж яе ведаеш.

— Ды як ведаю. Яна — у райвыканкаме, я — у бальніцы. Ды ў тым пятнаццацітысячным гарадку бадай усе ведалі адзін аднаго, інтэлігенты — напэўна. Асабліва мы, урачы. Але Ганна Фядосаўна пацыенткай маёй не была. Нервы ў яе ў парадку. Наколькі яна маладзейшая за мяне?

Ён ведаў дакладна год нараджэння сакратаркі, але чамусьці не сказаў, хоць пасля дакараў сябе за гэтую... баязлівасць ці што? Дзіўна!

— Яе старэйшая дачка равесніца нашай Тані.

— Мужа яе я помню лепш. Яго радыкуліт мучыў. Калі наведвала дома, пазнаёмілася і з жонкай. А так... дзе сустрэцца замужнім? У магазіне. На рынку. На танцы вы нас не вадзілі.

— Мы з табой хадзілі...

— Хадзілі. І ты раўнаваў мяне да маладых хлопцаў.

— Яшчэ б! А раптам адбіў бы каторы...

— Ад цябе ніхто не адбіў бы.

— Так кахала?

— Так кахала...

— Я табе хачу сказаць: мне падабаецца твой выгляд у апошнія дні. Ты паружавела... Папрыгажэла. Не баліць?

Марыя Іванаўна неяк крыва пасміхнулася:

— І ты так доўга насіў такі камплімент? Не баліць. І аналізы лепшыя, хоць кроў яшчэ не ў норме.

Месяцы чатыры назад яна перанесла нялёгкую аперацыю — выразалі матку. Як ён перадрыжэў тады: а калі рак? Не ўяўляў свайго жыцця без яе. На шчасце, фібрыёма была дабраякасная. Можа, ад

радасці і пачаў удзельнічаць у выбарах, бо тады, упэўнены чамусьці ў сваёй перамозе, падумаў: «Паднясу Машы падарунак».

— Сёння табе будзе сюрпрыз, — спыніла Маша яго ўспаміны.

— Які?

— Толя сказаў, што прывядзе паказаць сваю дзяўчыну.

— Ён што, жаніцца збіраецца?

— Усё можа быць. На апошнім курсе хлопец...

— Вушы яму яшчэ трэба надзёрці.

— А Божа! Які ты кансерватар. Сам ажаніўся ў дваццаць. А Толіку — дваццаць адзін...

— Прыраўняла.

Марыя весела засмяялася.

— Ну і ну! Табе можна, яму — нельга? Няхай жэніцца. Ты толькі не пазніся. І дай мне грошай. Трэба падрыхтавацца. Дзяўчына будзе ў доме...

— А што, ад маёй зарплаты не засталося?..

— Дарагі мой губернатар! Ты не бываеш у магазінах.

— Бываю.

— Але не купляеш. І не ўлічваеш, што ў цябе такія дзеці. Толя і так адзеты горш за іншых студэнтаў. Мне сорамна.

— Затое Таньку ты адзяваеш што прынцэсу.

— Таня ўмее ўзяць асадай. А Толіку ўсё роўна, што на ім. Што, ты надзенеш дзіравыя джынсы? А гэта, кажа, модна.

— Каб ты не цягалася па магазінах, я прышлю прадукты. Дыктуй, што трэба.

— Ты сам паедзеш у магазін? — Марыя Іванаўна бадай жа спалохалася.

— Сам не паеду. Не пусцяць. Ты ж знаеш, як мяне ахоўваюць. Цароў так не ахоўвалі.

— Усё правільна. Ахоўваць цябе трэба, ты так ваюеш з мафіяй. Не рабі такіх жорсткіх заяў. Слухаю па радыё, і... сэрца замірае. Бяда мая, што я ў ахову тваю не вельмі веру.

— Дарэмна. Палавінка надзейны. Да таго ж ён пад кантролем у Івана.

— Ох, Іван!..

— Чаму ўздыхаеш? Івану цаны няма.

— Цаны няма — гэта праўда.

— У магазін я не пайду, не бойся, даручу Івану, — намерваўся даручыць пакупку прадуктаў Ганне Фядосаўне, але не хапіла рашучасці сказаць пра гэта Машы, таму і пераключыўся на Івана.

— А Іван твой возьме са склада сталоўкі, і пісакі «Народнага сейма» заўтра напішуць, адкуль губернатар бярэ прадукты.

— Усяго ты баішся. Я папярэджу. І дам грошы.

— Ёсць яны ў цябе? Дык дай мне.

— Вазьму аванс. У касе заўсёды грошы ёсць. Слухай, а жаніх наш хоць сказаў, што за дзяўчына?

— Студэнтка.

— Вычарпальная характарыстыка, — засмяяўся Вікенцій Паўлавіч. — Дык чакай Сцяпана з прадуктамі.

На пачатку сваёй дзейнасці губернатар хадзіў на працу і з працы пехатой, як не настойвалі на паездках Залоза і начальнік аховы Міхаіл Палавінка. Не ўгаварылі. Але здарылася надзвычайная падзея: позна ўвечары, калі ён сядзеў за сталом, шыбу ў яго кабінеце прабіла куля. Стрэлу не чуў, зброя яўна была з глушыцелем. Але адкуль? Насупраць Дома Саветаў — абласная пракуратура. Ён жартаваў: ці не з кабінета пракурора? Але іншыя не жартавалі. Стрэл гэты распісалі не толькі абласныя, але і цэнтральныя газеты. З Камітэта дзяржбяспекі прыйшла ва ўпраўленне доўгая інструкцыя — як ахоўваць высокіх дзяржаўных чыноў. Ён кпіў з яе, прачытаўшы, але для начальніка аховы інструкцыя — закон. Прымусілі яго ездзіць і на працу, і з працы.

Сёння пасля размовы з жонкай, ад думак пра сына, які напэўна ж абвесціць, што хоча ажаніцца, настрой яго чамусьці ўзняўся да гуллівасці, да гарэзлівасці.

«Мерседэс-600» стаяў каля самага ганку. У доме ўсе дзеючыя пад'езды былі са двара, але губернатарскі адчынілі з вуліцы, паставілі новыя дзверы, паклалі мармуровыя ўсходцы; ён нават не агледзеўся, калі гэта зрабілі, і пасля яму засталося толькі паківаць Івану пальцам. Ды з таго, што з гускі вада.

Палавінка выскачыў з машыны, аббег вакол яе, адчыніў дзверку; ездзілі па-заходняму: гаспадар на заднім сядзенні, ахоўнік — побач з шаферам. Але Вікенцій Паўлавіч не сеў у машыну.

— Давай, Міхаіл, прагуляемся. Глядзі, якая раніца! Сонца. Першы марозец. А то развучымся хадзіць.

— Ох, падставіце вы мяне, Вікенцій Паўлавіч.

— Не бойся. Без мяне цябе з пасады не звольняць.

— А машыну куды?

— Няхай едзе ў гараж.

— А можа, лепш, каб ехала за намі?

— Без гумару ты чалавек, Палавінка. Хочаш трапіць у анекдот? Ды і мяне падстаўляеш. Уяўляеш, што скажуць людзі... Ідзе

губернатар, а машына — следам з хуткасцю пешахода. Мудроны так гуляў?

— Хутка вы пераедзеце ў кватэру Мудронага, у доме абкама... І нам будзе лягчэй...

— Я пераеду? — здзівіўся губернатар.

— А што, Іван Яўменавіч не сказаў? Не выдавайце мяне.

— І ты баішся Івана? Страшней за зайца звера няма?

— Не кажыце.

— Дык Іван мяне без мяне ажаніў?

Гэты сюрпрыз ашаламіў. Ён кіпеў гневам. Ажно пачаў цяжка дыхаць.

— Вы, відаць, прастуджаны, што ў вас адышка? — спытаў Палавінка.

— З вамі, з чарцямі не прастуду, а інфаркт нажывеш. Ні прагуляцца, ні падыхаць спакойна.

— Я тут ні пры чым. Я — палавінка, — заўсёдны жарт ахоўніка, які смяшыў звычайна і вымушаў пажангліраваць словамі. Але цяпер было не да жартаў.

Ганна Фядосаўна ажно спалохалася, убачыўшы, якім гаспадар увайшоў у прыёмную: ніколі не бачыла такім нахмураным, злосным, ён заўсёды з'яўляўся з усмешкай, нярэдка з кампліментам. А тут не павітаўся нават.

— Запрасіце да мяне Залозу.

Здарылася штосьці незвычайнае, бо заўсёды казаў «Івана» і клікаў сам — па селектары. Сакратарка набрала кіраўніка справамі.

— Іван, кліча шэф, — і дадала амаль шэптам: — Але май на ўвазе: кіпіць.

Залоза з'явіўся не адразу. Здагадаўся, з-за чаго ўраўнаважаны і спакойны старшыня можа кіпець. Паклікаў Палавінку.

— Што ты яму сказаў?

— Пра кватэру.

— Лезеш наперад бацькі ў пекла.

— Ты ж сам хацеў сёння сказаць.

— Я знаю, як казаць, а ты... Будзе мне наганяй.

— Не вельмі ты яго баішся.

— Не баюся, але паважаю і не наступаю на балючы мазоль. Маю дыпламатыю. Ну, ды ладна, можа, і лепш, што пайду да яго ўзброены веданнем тэмы.

— З-за чаго ён кіпіць? — спытала Ганна Фядосаўна.

— Знаю з-за чаго.

— Усё ты знаеш.

— Усё. Аднаго не знаю — тваёй душы. Што ты водзіш мяне за нос? Я чакаю тваёй удзячнасці. Калі ты гуляеш у цнатлівасць, не разменьвайся, аддзяч аднаму.

— Іван, калі-небудзь я дам табе па мордзе.

— Гэта ты можаш. Ад цябе, салодкай, атрымаю з задавальненнем.

Вікенцій Паўлавіч хадзіў па кабінеце, як леў па клетцы. На прывітанне не адказаў. Таму Залоза не прайшоў да стала, а спыніўся каля дзвярэй, схіліўшы галаву, як чэхаўскі чыноўнік, — сама пачцівасць і далікатнасць.

Губернатар грымнуў ад дальняга акна.

— Ты што вырабляеш?! — і вылаяўся так, як бадай ніколі яшчэ не лаяўся.

— А што?

— Не прыкідвайся дурнем. Знаеш — што!..

— Знаю. Кватэра?

— Цябе хто прасіў?

Тут Залоза перайшоў да сваёй улюбёнай тактыкі: лепшая абарона — наступление.

— Абавязкі мае не прасілі — загадалі! Я адказваю за тваю бяспеку. На цябе замахваліся ў лесе. Стралялі ў акно. Як я магу гарантаваць тваю бяспеку ў хрушчоўцы? — Залоза наблізіўся да яго, глядзеў у вочы. — Ты мой сябра. Але ў турму за цябе я садзіцца не хачу...

— Многа ты бярэш на сябе.

— Усё бяру. Усё!

Вікенцій Паўлавіч адчуў, што кіраўнік справамі заганяе яго ў кут, і не ў першы раз. І дзіўна: ён, чалавек, які за словам у кішэню не лазіў, перад Залозам адступаў. Мог накрычаць, мог нават выгнаць з кабінета. Але ведаў, што пры любой размове, пры сутычцы, калі сыпаліся іскры, — заўсёды перамагае хітруган Іван. І гэта ўніжала, раздражняла яго, першую асобу ў вобласці, балюча біла па гонары, самалюбстве. Ён думаў, як бы сплавіць Івана куды-небудзь на павышэнне. Парэкамендаваць прэзідэнту? Але было шкада: другога такога памочніка не знойдзеш. Нахабнік, але сябра, а гэта дорага каштуе — мець такога сябра і верыць, што ён не падвядзе, не здрадзіць. Іван не хоча ніякага павышэння: бескарыслівы чалавек, за гэта нельга не паважаць. Але лейцы адпускаць нельга. Тузаць ды тузаць трэба.

— Я сказаў цвёрда: не трэба мне кватэра! Помніш, што я сказаў на выбарах, калі спыталі, ці пераеду я з цяперашняй кватэры?

— Табе не трэба — нам з Палавінкам трэба! Чытаў інструкцыю Камітэта? Пасля такіх двух папярэджанняў злачынна сядзець

склаўшы рукі. Не дай Божа што здарыцца, я кулю сабе ў лоб пушчу. Ты гэтага хочаш?

— Не заганяй мяне ў кут...

— Я не заганяю. Ты сам сябе заганяеш.

— Ды калі я пераеду, апазіцыя распіша мяне, што бог чарапаху...

— Каго ты баішся? Балбатуноў? Каму яны служаць, ты думаў? За грошы яны напішуць усё, што хочаш.

— Задаеш ты мне задачу, — Вікенцій Паўлавіч зноў пачаў мераць крокамі кабінет у глыбокай задуме.

Залоза маўчаў, бо бачыў, што і на гэты раз перамог свайго шэфа, сапраўды загнаў у кут. Ва ўсялякім разе, гнеў яго пагасіў і прымусіў задумацца. Няхай падумае. Падумаць заўсёды карысна. Аднак доўга думае, а гэта бадай небяспечна: доўгі роздум нярэдка прыводзіць да нечаканых высноў.

— Ды ты паглядзі хоць яе, кватэру. Можа, не спадабаецца, дык прыйдзецца шукаць другую.

Вікенцій Паўлавіч спыніўся перад памочнікам, зноў заглянуў у вочы: не здзекуецца?

— Свіння ты, Іван.

— Акцыі мае растуць. Першы раз чую ад цябе такую атэстацыю. А свінні ў наш час у цане.

— Прабач, канешне, я па-сяброўску. Але ж трэба быць бог знае кім, каб дайсці да такога ў сваім здзеку з начальніка і таварыша — яму можа не спадабацца кватэра Мудронага!

— Пры тваім характары ўсё можа быць. Ты ўмееш здзіўляць. Аднак паглядзі ўсё ж кватэру, а пасля ўжо разапнеш мяне на крыжы.

Кватэра ашаламіла. Офісы пасля еўрарамонта (слова прыдумалі!) бачыў, кватэры не. У госці да «новых» не хадзіў, ды і ад запрашэнняў падначаленых, якія маглі зрабіць такі рамонт, адмаўляўся.

Іван напэўна зрабіў такі рамонт, але менавіта таму і да яго не пайшоў, за што зарабіў дакор:

— Трымаеш дыстанцыю, губернатар? Не застанься адзін. Марына так старалася!

Вікенцій Паўлавіч не адважваўся ступіць за парог вялікай светлай залы.

Пакрыты лакам паркет — люстэрка, модніцы могуць глядзецца ў яго.

Лак незвычайны, нідзе не ліпне і не пахне, і хадзьба па такой падлозе ў адных шкарпэтках давала нейкае непазнанае дагэтуль задавальненне.

Абышлі ўсе пакоі. А іх пяць, прасторных, светлых, цёплых, гулкіх ад пустаты, у кожным — адменныя шпалеры. Бялюткія рамы — з пластыка. А дзверы ўсе — пад дуб, пад паркет. Якая ванна! А сантэхніка!

Дык вось ён які, еўрарамонт!

Вікенцій Паўлавіч адчуў, што ў яго ўчасціўся пульс. І завіхрыліся думкі, якія ён дагэтуль вымятаў са сваёй галавы: дай ім волю, такім думкам, — далека завядуць. З сацыяліста зробяць капіталіста.

«Аднак... хіба я не маю права на прыстойнае жыллё? Мудроны за дзесяць гадоў тры кватэры памяняў, гэты дом яўна пад яго будавалі, уваход асобны зрабілі, каб суседзі, яго падначаленыя, не заглядвалі ў яго дзверы, не чулі, чым пахне з яго кухні», — знарок хацеў надаць сваім думкам іранічны сэнс, пасмяяцца з чалавечай слабасці.

Але куды яе дзенеш, сваю слабасць? Даўно філосафы сказалі: слабы чалавек.

Чым даўжэй глядзеў, тым мацней авалодвала жаданне пажыць у такой кватэры. Апраўдваў сваё жаданне: «А чым я горшы за Мудронага? Яго выбіраў пленум па рэкамендацыі ЦК. Мяне выбраў народ. Паўтара мільёна... Ды сам народ, людзі перастануць мяне паважаць за тую... пралетарскую кватэру.

Нейкі выскачка, які разбагацеў бог ведае на чым, будуе сабе катэдж, купляе і злучае дзве кватэры. А губернатар... Памочнікі маюць рацыю: ахову нельга наладзіць. Хаця замахі дзіўныя, як тэатральныя. Сапраўдны забойца, снайпер, не прамахнуўся б. Аднак ігнараваць нельга... Як казала мая маці: беражонага Бог беражэ. А ў мяне яшчэ усё жыццё наперадзе. Дзеці растуць. Сын хутка ажэніцца. А калі я адмоўлюся ад кватэры сёння, якая перспектыва заўтра? Калі паўторна не выберуць, ісці на паклон да якога-небудзь Каржакевіча? Маша — праведніца, яна дрыжыць, каб я, крый Божа, незаконна што не зрабіў, каб нікога не пакрыўдзіў. Але пра кватэру і Маша казала, асцярожна, вінавата: дзеці разнаполыя, ім асобныя пакоі трэба... Трэба. Ды каб і я які куток меў, дзе можна папрацаваць, то не заставаўся б у савеце, не трымаў бы шафера і ахоўніка. Сорамна трымаць пры сабе людзей. Палавінка пэўна ж таму і зацікаўлены, каб цягнула мяне дадому. У такую кватэру будзе цягнуць. І для працы над кнігай будзе кабінет. Во гэты самы малы пакой як раз для мяне...»

Спалохана азірнуўся на Івана: ці не чуе яго думкі? Ды не, не дажыўся яшчэ да таго, каб уголас размаўляць з самім сабой. Але ўзлаваўся на кіраўніка справамі. Такі балбатун, а тут — што язык пракаўтнуў. Ходзіць следам што цень. Знарок маўчыць — дае магчымасць падумаць? Хітруган. Ох, Залоза!

Выйшлі ў прыхожую, і тут Залоза спытаў як бы баючыся, ва ўсякім разе, нязвыкла пачціва:

— Ну што? Пераязджаем?

Вікенцій Паўлавіч выпрастаўся з чаравікам у руках. Іван нават адступіў, чым развесяліў: «Ці не баіцца, што я стукну яго? А варта было б і даць за залішнюю паслужлівасць».

— Знаеш што, Іван? Ідзі ты... знаеш куды?

— Знаю. Але калі і гэтая мая работа — кату пад хвост...

— Многа я тваёй работы забракаваў?

— Але ж крыўдна, Вікенцій Паўлавіч. Так стараўся!

— Свістун ты, Іван, — зусім па-сяброўску, што Залозу ўзбадзёрыла. — Але ведаеш анекдот пра селяніна... ён ад даронай зямлі адмовіўся, бо пан паставіў умову: толькі не райся з жонкай. «Не, паночку, без жонкі не магу». Так і я. Без Марыі Іванаўны не магу.

Залоза пераможна засмяяўся.

— І яшчэ, Іван. У мяне да цябе просьба. Вазьмі ты ў касе для мяне аванс і даручы каму-небудзь з жанчын купіць прадукты, каб Маша сама не хадзіла па магазінах. Сёння ў нас госці.

Іван Яўменавіч, здалося, падскочыў ад радасці.

— Ды для Марыі Іванаўны... за гонар палічу. Сам пайду ў супермаркет.

— Не вельмі размахвайся. Госця адна — сын дзяўчыну сваю прывядзе.

Залоза трохі не падскочыў. Вочы блішчэлі, што ў ката, фізіяномія расплывалася ў давольнай усмешцы. Помнячы выбарчыя прамовы губернатара, ён дагэтуль не адважваўся дастаўляць яму прадукты на кватэру. І вось — прарыў. Лічы: двайная перамога. Трайная. Бо была ў яго яшчэ тайна. «Дарагі мой Вікенцій Паўлавіч! Святы праведнік! Станеш ты такім жа грэшнікам, як і мы. І фірмачку сваю будзеш мець. Не на сябе. На Марыю Іванаўну. Ці на сынка. Можам нават у абход — на нявестку. Няма? Будзе! Сёння ты яе прымеш. Гатовенькую. Прозвішча яна можа пакінуць сваё — дзявочае. Так прасцей... у наш час».

Танька ажно вішчала ад прадчування цікавай сустрэчы: брат прывядзе нявесту на агледзіны. Прыбірала кватэру як ніколі ахвотна, старанна, прыдзірліва, бурчэла, што бабуля.

Марыя Іванаўна бадай не хвалявалася, калі Толя сказаў пра падзею, якая мае адбыцца, хоць халадзільнік пусты і грошай няма. Яна расхвалявалася, калі Іван Залоза прывёз гару прадуктаў. Навошта столькі? Як на вяселле. Але больш расхвалявалі не прадукты, а размова з Іванам, асабліва паведамленне пра кватэру і просьба

паўплываць на Вікенція Паўлавіча, каб ён не супраціўляўся. Маўляў, гэта трэба не толькі для таго, каб палепшыць губернатару ўмовы, але і для яго бяспекі. Пра выпадак у лесе Марыя Іванаўна ведала — пісалі газеты, а пра здарэнне ў кабінеце Вікенцій не сказаў. Вось жа чалавек! І гэта яе моцна ўсхвалявала. Яна заўсёды даводзіла мужу адно: не зазнавайся, не бяры звыш таго, на што маеш законнае права, бойся хабару: хітруганы могуць паднесці яго ў любым выглядзе, зусім не грошы, тую ж кватэру, напрыклад, на якую, як першая асоба ў вобласці, ён сапраўды нібыта мае права. Але як гэта могуць выкарыстаць! Калі для раскошы, то яна — а за ёй у сямейным побыце рашаючае слова — супраць. Але калі новая кватэра пэўным чынам зробіць больш бяспечным жыццё яго і дзяцей, то хіба можа яна выказацца супраць! Паабяцала Залозе пераканаць мужа, і ён ажно падскочыў:

— Цяпер я магу спаць спакойна, маючы такога саюзніка!

Канечне, трохі турбавалі і прадукты. Каб гасцей было столькі, што з'елі б усё — яшчэ б нічога. Але ж прыйдзе адна студэнтка, няхай і галодная. А на іх сям'ю — на тыдзень хопіць. Не прывыклі яны да такіх прысмакаў. Дакарала мужа: «Траціць ашчаднасць мой суджаны. Паўзарплаты ўбухаў. Транжыра! Тані зімовыя боты трэба!»

Вікенцій вярнуўся нязвыкла рана — у шэсць, хоць Толя сказаў, што прыйдуць у восем — ведаў, што раней бацька не з'яўляецца. Пацягнуў паветра носам. Гукнуў:

— Смачна ў цябе, Маша, пахне! Не перастарайся. Прымаем студэнтку. Будзе расказваць ва універсітэце, што губернатар жыве як цар.

— Не перабаршчы... Навошта ж ты столькі прадуктаў прысылаў? Ды якіх!..

Гаспадар заглянуў у кухню, дзе шмат што ляжала на стале, на падаконніку — не памясцілася ў халадзільніку. Легка свіснуў.

— Свіння ўсё ж Іван. Падхалім. Прасіў, як чалавека. А ён... Ну я здыму з яго стружку.

— Віця, Бог з ім. Навошта табе заядацца?

— Зачараваў ён цябе. Гэны можа. Чарадзей. Часам пасля размовы думаю: і якога д'ябла я згадзіўся з гэтым круцялём? Але не пужнеш: свой чалавек, даверанаая асоба. І працаўнік — дай бог. У гэтым яму не адмовіш. Такога кіраўніка справамі не знайсці... А гэта вялікі камбінат — наша губернская парафія... — Вікенцій Паўлавіч укінуў у рот скрылёк салямі. — Смаката аднак.

— Паднясе нам Толік сюрпрыз...

— Які? Абвесціць, што жэніцца? Маша! Дык ты ж марыла пра гэта...

— Якая яна?

— Думаю, дзяўчына як дзяўчына.

— Толя сказаў: маці — аграном, бацька — шафёр і камбайнер.

— Так сказаў? Ну, у такім разе можам сустракаць будучую нявестку спакойна. І можам радавацца. Я баяўся, што дачка камерсанта якога... Падхапіла сынка...

— Але калі непрыгожая, то выскубу Толіку яго рыжыя кудлы, — сказала Таня, якая з калідора слухала размову бацькоў.

— А табе трэба пісаная прыгажуня?

— Мы з ім так дамовіліся...

— Ну добра, ён павінен выбраць прыгожую. А ты каго?

— А я — разумнага.

— Аднак...

Леакадзія спадабалася ўсім — па знешнасці сваёй. Прыгожая дзяўчына... Невысокая, стройная, светлавалосая, з добрымі блакітнымі вачамі. Трохі картавіла, але гэта не псавала ўражання, наадварот, надавала ёй нейкую прывабную дзіцячасць — як бы не ўступіла яшчэ ў сталасць, дзе голас грубее нават у дзяўчы-

Вікенція Паўлавіча бадай узрадавала, што адзета проста, сціпла: значыцца, не модніца, не верціхвостка. Губы, праўда, трохі нафарбавала і бровы падвяла. Але якая дзяўчына гэтага не робіць?

Марыю Іванаўну, наадварот, гэта бадай насцярожыла — такое адзенне: просценькая спаднічка, кофтачкасамавязка; як бы людзі не жылі, але студэнткі так бедна не адзяваюцца, хлопцы яшчэ могуць, а дзяўчат маці з апошняга ўбіраюць. А камбайнёр і аграном нябедныя людзі, пасля старшыні калгаса, можа, самыя заможныя.

Марыя Іванаўна ненавідзела любую паказуху, незалежна ад таго, на што яна скіравана — на багацце ці беднасць.

І яшчэ не спадабалася, што Ліка праз тры хвіліны пасля знаёмства назвала Таню:

— Сятрычка мая.

А Таня, дурніца, павісла ў яе на шыі і паўтарыла:

— Сястрычка мая!

Анатоль глядзеў на бацькоў і нявесту ўзрадавана і збянтэжана. Бачыў, што ўвогуле Ліка падабалася, радаваўся. Бянтэжыўся, што яна такая ўзбуджаная, да бесцырымоннасці; з ім ніколі такой не была.

Яшчэ больш складаныя пачуцці ў Марыі Іванаўны выклікала госця, калі адразу ж пачала паводзіць сябе не як госця, а як гаспадыня.

— Дзе памыць рукі?

Памыла — і на кухню, без запрашэння.

— Што вам памагчы, Марыя Іванаўна? — і, павязаўшы Танін фартушок, пачала ўвішна праціраць талеркі, мыць бакалы, наразаць хлеб. Потым накрывала на стол; Таня хадзіла за ёй і толькі падказвала — дзе ляжыць, стаіць: відэльцы, нажы, гарчыца, перац.

Марыя Іванаўна глядзела на такую стараннасць сынавай дзяўчыны з замілаваннем — не беларучка! — але і з трывогай — і за ўмеласць яе, і вось за такую зусім не сялянскую бесцырымоннасць. З гумарам думала: «Такая нявестка ўсю ўладу ў доме захопіць. Мяне адцісне на задні план. Шчасце гэта ці няшчасце? Для каго? Абы для Толіка было шчасцем. А мне што...»

За сталом напачатку сядзелі паважліва, як бы тольКі менавіта тут знаёміліся па-сапраўднаму, сур'ёзна. Нават рагатуха Таня прыціхла. Але ненадоўга. Выпілі па глытку шампанскага, закусвалі белай рыбай, ікрой, грыбкамі. Падабалася Марыі Іванаўне, што госця не накінулася на прысмакі, якія, можа, і не ела яшчэ ніколі, — каштавала ўсяго патрошку, па-дзявочы стрымана, сціпла. «Не, не такая яна... ёсць прыроджаная тактоўнасць. Накрываючы стол — паказвала сябе. А якой дзяўчыне не хочацца паказаць сябе? Хіба я была не такая перад Вікенціем?» — глянула на мужа, ласкава пагладзіла яго плячо. Ён зразумеў яе пачуцці.

Першы тост, бадай, самы кароткі, сказаў Вікенцій Паўлавіч:

— Будзьма!

Другі сказаў маўчун Толя:

— Давайце вып'ем за Ліку. За нашу дружбу..,

Таня запляскала ў далоні.

— Ура майму брату! Але і за каханне!

— За такі тост асушым бакалы да дна.

Выпілі не па адным глытку. Больш шумна застукалі відэльцы і нажы. Ажывілася гамонка. Таня зацікавілася:

— Толя, раскажы, як вы пазнаёміліся.

— Ну, як... Як знаёмяцца студэнты. Я ўжо і не помню.

— Ну, як ты не помніш, Толя! — амаль пакрыўджана сказала Ліка. — На універсітэцкім вечары на Таццянін дзень.

Таня закрычала:

— Чулі? На Таццянін дзень. Гэта — лес!

— Не трашчы ты, сарока, — ласкава сказаў Вікенцій Паўлавіч.

— Ну, і што на тым вечары? — дапытвалася Таня.

— Я запрасіла Толю на танец...

— Ну і што? — спяшалася Таня. — Патанцавалі — і? Вас прывязала радыяцыя кахання?

Школьніцы вельмі хацелася дапытацца, як гэта бывае, каб ведаць, калі ў самой здарыцца.

А Вікенцій Паўлавіч адчуў поўнае задавальненне: «Таццянін дзень... Гэта, здаецца, у студзені».

Задавальненне адчуў ад таго, што дзеці вунь калі пазнаёміліся, — амаль год назад, калі ён яшчэ быў ніхто. Было б бадай непрыемна, каб Ліка падчапіла яго сына ў пачатку гэтага навучальнага года, калі ён сядзеў ужо ў губернатарскім крэсле. Спытаў:

— Ты на філалагічным, Ліка?

— На гістарычным. Буду пісаць гісторыю нашага часу, калі не нараджаю дзяцей...

«Во ён, подступ», — падумала маці. Яна з нецярпеннем і пэўнай матчынай трывогай чакала, калі Толя скажа галоўнае, да чаго яны з бацькам падрыхтавалі сябе. За сталом ці пасля вячэры? Але першая пра гэта сказала Ліка:

— Нам з Толікам трэба ажаніцца.

На міг усе прыціхлі. Толя апусціў вочы. Бацька паспрабаваў памагчы ім, не вельмі зграбна пажартаваў:

— Ажаніцца трэба Толіку. А табе — выйсці замуж. Дзяўчына цяжка каўтнула. «Хвалюецца аднак, — падумала Марыя Іванаўна з нейкім нават спачуваннем, — з-за гэтага маўчуна нашага ёй трэба было самой сказаць аб гэтым».

— Нам трэба як можна хутчэй...

— Разумею. Я таксама спяшаўся. Але Маша мая цэлы год вадзіла мяне за нос.

На жарт-успамін ніхто не ўсміхнуўся.

Толя, стаіўшы дыхание, палажыў сваю руку на руку нявесты, прыкметна чырванеючы.

— У мяне будзе дзіця. Тры месяцы ўжо. Гэта калі Толік прыязджаў у раён з бацькам... Калі выбары ішлі.

Толя зрабіўся бураковы.

Драматызм моманту сапсавала Таня. Ці, можа, наадварот, вывела бацькоў з утрапення. Яна зарагатала і пачала гучна барабаніць нажом і відэльцам па талерцы:

— Ай да Толя, ай да жох! Не думала, што ў мяне такі спрытны брат!

— Сціхні, Таня, — злосна сказала маці.

— А чаму ты злуеш, мамачка? Радуйся.

— Я радуюся. Я радуюся, — Марыя Іванаўна паднялася, абышла мужава крэсла, абняла і моцна пацалавала нявесту. Сына цмокнула ў макушку.

Узбуджаную развесялелую Таню ледзьве адаслалі спаць: заўтра рана ўставаць. Самі засталіся на кухні і не спяшаючыся мылі посуд. Вікенцій Паўлавіч рэдка займаўся такой працай, жонка проста не дазваляла яму, асабліва цяпер, калі ён выбраўся на высокі пост. І тольКі калі хварэла, ён займаўся гаспадаркай, але тады, на радасць бацькам, актыўна падключаўся Толя, які да таго ваяваў з сястрой — каму што рабіць.

У той вечар Марыі Іванаўне было прыемна, што муж пасля такой падзеі побач. Але доўга працавалі моўчкі.

— Чаму ты маўчыш?

— Думаю. Вось мы і дачакаліся, Віця. З жаніцьбы дзяцей пачынаецца старасць.

— Ды ўжо ж. Пастарэла ўміг. Ціхоня твой хутка бабуляй цябе зробіць.

— Дай Бог.

— Ціхоня, а як на гэта — дык лаўкач.

— Быццам ты такім не быў.

Вікенцій Паўлавіч ажио трохі збянтэжыўся, прыгадаўшы маладосць, каханне, першую блізкасць, і ў яго варухнулася мужчынскае жаданне: чатыры месяцы пасля аперацыі ён не чапаў Машу.

— Мой бацька дзягі даў бы такому жаніху...

— Што ж ён табе не даў?

— Я ж далека быў — у горадзе.

— Віця, не смяшы. Радуйся.

— Ды ўжо ж, у прысядку пайду!

— А я радуюся. Сёння ў мяне ажио залішне радасці... Але і трывогі. Іван сказаў: кватэру табе адрамантавалі. І ты згадзіўся...

— Яны, чэрці, аблажылі мяне што ваўка: усюды сцяжкі, адзін шлях свабодны — на кватэру. Але там сядзяць «стралкі» — уся апазіцыйная прэса, якая прыпомніць мне выбарчыя клятвы...

— Іван кажа: дарэмна ты іх баішся. І праўда. Ты што, не заслужыў кватэру? Іван кажа, што гэта, акрамя ўсяго, для тваёй бяспекі трэба. Кажа, у акно стралялі. А ты не сказаў...

— Ды глупства гэта, Маша. Знаеш, што я падумаў? Я, можа, і не заслужыў такой кватэры. Але ты... ты заслужыла. Чаму табе не размясціць дзяцей па-чалавечы? Не на раскладушцы, як Толік спіць. Урэшце, вунь якія катэджы будуюць. А мы з табой папрацавалі... Я, можа, доўга шукаў свайго месца, скакаў што заяц... А ты хворым усю душу аддавала. Такіх урачоў, як ты, мала. Адным словам... Івана паслаў, але ён, нахалюга, зразумеў, што я згадзіўся. Пераязджаем! Радуйся, мой добры ангел!

Марыя Іванаўна адчула, як у яе моцна закалацілася сэрца — ад радасці. Са студэнцкіх гадоў трэніравала сваю нервовую сістэму — не даваць волю ніякім эмоцыям — ні адмоўным, ні станоўчым; медыцына ведае факты, што і ад вялікай радасці, як і ад гора, паміралі — не вытрымлівала сэрца. Каб супакоіцца, знайшла сабе новую работу — памыць газавую пліту. Выдраіць усё, як перад Вялікаднём. Але што гэта? Сэрца не супакойваецца. Б'ецца ўсё часцей, бо з'явілася проста крамольная думка — яна добра ўсведамляла гэта.

Вікенцій Паўлавіч, седзячы за сталом, выціраў талеркі, бакалы, нажы і ўзбуджана расказваў, як адрамантавана кватэра.

Марыя Іванаўна колькі разоў паварочвалася, пільна глядзела на мужа, як бы здзіўленая яго захопленасцю кватэрай, ніколі не бачыла ад яго такой увагі да побыту сваёй сям'і — чалавек быў бадай абыякавы да любога багацця, і яна менавіта за гэта любіла яго.

І раптам Вікенцій Паўлавіч заўважыў яе хваляванне:

— Маша, ты нешта хочаш сказаць і... як баішся, так?

— Баюся, Віця, баюся. Але сёння такі дзень... усе мы гаворым ці радаснае ці глупства. Адна Танька чаго толькі не нагаварыла, — ступіла ад пліты да стала; спытала шэптам: — Віця, а нельга... каб гэтая кватэра засталася Толіку... Гэта ж на ўсё жыццё. Твой вясельны падарунак...

Вікенцій Паўлавіч падняўся і... выйшаў з кухні.

Марыя Іванаўна чуць не самлела, абаперлася аб стол, цяжка, асцярожна, як пасля аперацыі, апусцілася на табурэт.

А губернатар прайшоў у залу з адной талеркай у руцэ, яму ажно захацелася закурыць; тры гады, як кінуў, і разы тры ўзнікала сітуацыя, калі нясцерпна хацелася зноў закурыць. Але ўспомніў, што пакінуў жонку, нічога не адказаўшы, і таму хутка вярнуўся на кухню з вясёлай усмешкай на твары.

— Усё можна, Маша. Губернатару. Усё. Але што гэта будзе? Першы крок да майго падзення. Добра, калі на гэтым спынюся.

Вікенцій Паўлавіч узяў цэлую гару талерак, прыціснуў іх да грудзей, нейкі момант падумаў і раптам сказаў неспадзявана для яе вельмі рашучым тонам:

— Трэба, Маша! Чорт з імі, крытыканамі! Калі яшчэ будзе другі такі выпадак! Дзеля дзяцей жывём. Для іх працуем. Няхай Толік і гэтая Ліка помняць!.. А я... перажыву. Мы з табой перажывём.

5

Раней Ганна Фядосаўна падавала шэфу паперы праз шырокі стол. Апошнія дні часам, калі трэба нешта тлумачыць, яна станавілася

побач, вельмі блізка, так, што кал і нахілялася, каб прачытаць, то дакраналася грудзьмі да яго пляча. І гэта моцна хвалявала — такая блізкасць прывабнай жанчыны. Яшчэ ў першы дзень яе з'яўлення жартам падумаў: «Гэта мой грэх». Спачатку злаваўся на Івана: знарок, гад, падсунуў такую прыгажуню. А цяпер, бадай саромячыся сваіх думак, Вікенцій Паўлавіч быў удзячны кіраўніку справамі. Такая сакратарка натхняла на працу. Уваходзіла — што ўпускала разам з сабой прамень сонца. Ішла да стала — ён глядзеў на яе твар, з густам напудраны, падмаляваны, на грудзі, якія ў такт крокаў ледзь прыкметна, але ж вельмі прывабна калыхаліся...

А цяпер гэтая яе прывычка — етанавіцца побач. Яўная ж спакуса. Ці гульня? Убачыла, што падабаецца, і вырашыла падражніць. А чаму не? Дражніць не кагонебудзь — еамога губернатара.

Ад яе пахла тонкімі духамі. Гэты пах хацелася ўцягнуць, каб пабольш водару ўвабраць у сябе і захаваць да наступнага яе прыходу. Ды ён разумеў, што сам сябе падманвае: справа не ў духах. Вабіў незвычайны, непаўторны пах яе цела — шыі, рук, грудзей... Хацелася піць гэты водар — прагна, многа. Такое перажываў даўно, у васемнаццаць гадоў, калі закахаўся ў Машу. Больш ніводная жанчына так не хвалявала.

Схамянуўся, напусціў на сябе строгасць, падхапіўся з крэсла, пачаў выкладаць ёй свой чарговы праект рэформаў. У яго было многа самых розных праектаў — тэарэтык! — і ён дзяліўся імі з Іванам, з Каржакевічам, з Палавінкам, нярэдка з ёй, сакратаркай.

Іван часта выказваў скепсіс і... разбураў праект, што злавала, а аднойчы ён выгнаў памочніка прэч. Ды з таго — што з гускі вада. Каржакевіч заўсёды прасіў час падумаць і пасля... не вяртаўся да губернатарскага праекта, рабіў выгляд, што забыўся. «Ну, і чорт з табой!» — думаў Вікенцій Паўлавіч. Палавінка захоплена хваліў нават яўнае глупства, якое шэф падкідваў знарок.

«Падхалім».

А ўвогуле Палавінка меў схільнасць да ўзнёсласці, рамантычнасці. Вікенцій Паўлавіч аднойчы сказаў яму:

— Што цябе, Міхаіл, пацягнула ў органы? Табе вершы трэба пісаць. Ці хаця б раманы.

— Вершы я пісаў. А сюды рамантыка і пацягнула. Думаў, вялікім разведчыкам стану. Зорге. Ці Малевічам. Дзе там!

— Не расчараваны, Зорге, што мусіш ахоўваць таго, каго зусім няма патрэбы ахоўваць?

— Ну, не кажыце. Двойчы стралялі.

— Па-мойму, вы з Іванам хацелі спалохаць мяне...

Абразіўся чэкіст:

— Ды вы што, Вікенцій Паўлавіч! Ды каб я пайшоў на такую правакацыю! Калі вы так думаеце, то сёння ж я падам рапарт. Божа мой!

— Не стагні. Я пажартаваў. Жартаў не разумееш? Вучыся ў Івана. Таго нічым не праймеш — ні жартамі, ні лаянкай.

— Я так не магу.

— Ведаю, што не можаш. Не дайшоў да Іванавай кандыцыі.

— І не дайду!

— Дай Бог. За гэта я цябе люблю — за бясхітраснасць. За сумленнасць. Каб усе такія ў органах былі!

За акном ішоў густы снег. Лажылася зіма. Горад убраўся, што нявеста пад вянец.

Вікенцій Паўлавіч увогуле не любіў зімы — многа клопатаў, а вось такі яе пачатак, калі пасля ўмераных маразоў падаў лёгкі пушысты снег, любіў. Каго не хвалюе першы снег!

Стаяў каля акна, глядзеў, як віхрыліся сняжынкі, даганяючы адна адну, і ў галаве яго гэтак жа віхрыліся думкі. Хадзіў па кабінеце, хацеў яшчэ раз прадумаць свой заўтрашні даклад на нарадзе кіраўнікоў гарадскіх, раённых улад, дырэктароў буйных прадпрыемстваў, прэзідэнтаў фірм, упраўляючых банкаў. За паўгода свайго губернатарства ўпершыню збіраў такую шырокую нараду. Даклад пісаў месяц, варыянт яго тры дні назад даў чытаць намеснікам: «Праўце і крытыкуйце бязлітасна». Але ў мінулую ноч падняўся гадзіны ў чатыры — не спалася ў новай кватэры — і да раніцы бязлітасна чысціў сваё сачыненне, завастраў і так вострыя моманты.

А цяпер правяраў сам сябе: ці не перасаліў ў начной цішыні? Ці правільна вызначыў, якія мясціны даклада зачытваць, а якія пераказваць? Добра ведаў: аудыторыя не любіць, калі прамоўца не адрывае вачэй ад паперы.

Думкі змянялі адна адну, даганялі — як тыя сняжынкі ў сваім, на першы погляд, хаатычным кружэнні.

У новай кватэры, куды пераехаў тыдзень назад, адчувалася пустэча і беднасць — не тая мэбля ды і мала яе на такія харомы. А дзе ўзяць новую? Цэны — вочы на лоб лезуць. Маша наведалася ў салон і, казала, ледзь не самлела. Івану даручыць? — Іван усё зробіць! І варта было б самаму пагаварыць з Корсунам, кіраўніком равна, як аформіць старую кватэру на сына. Яшчэ адзін крок. І не спыніць падзення... Даволі сарвацца, і будзеш ляцець да канца, будзеш чапляцца за ўсё, разбіваць лоб, але падзення не спыніш... Закон... Закон чаго? Любога падзення? «Але ж я чалавек... Я ўладар сваіх

думак, памкненняў, жаданняў. Я магу супраціўляцца. Я магу спыніць падзенне!» — «Дык спыняй жа! Спыняй!» — загадвала Маша. І ён злаваў на жонку: «Легка табе чысценькай быць! А ў гэты пралёт — з кватэрай старой — хто мяне штурхнуў?» Але не гэтая барацьба з самім сабой, спрэчка з Машай, злосць на «дабрадзея» Залозу перашкаджалі засяродзіцца на дакладзе: глухі, ледзь чутны стук машынкі за двайнымі дзвярамі. І тут жа ўпікнуў сябе, што не машынка яму перашкаджае. Машыністка. Ганна стаяла перад вачамі. Ды не, не стаяла, як заўсёды, пачціва ля стала. Праз кісейнае пакрывала снегу бачыў яе побач з сабой. Не побач... у абдымках.

Схамянуўся... «О Божа! Што гэта са мной? Насланнё нейкае. Я мушу глушыць свае пачуцці. Я абавязаны заглушыць іх! Інакш Бог ведае, чым гэта можа скончыцца. Сувязь з сакратаркай — фінал падзення! Далей падаць няма куды. Аня, адступіся, калі ласка. Дай мне падумаць...»

Ці не папрасіў яе ўголас? Бо тут жа адчуў, што хтосьці за спінай як бы хіхікнуў. Крутнуўся. Перад ім стаяў Іван Залоза з нязменнай папкай «На подпіс».

— Ну, ты ўваходзіш, як Шцірліц. Дзеля гэтага ты петлі змазваў? На чым ты хочаш захапіць мяне? Скажу Ганне, каб яна і цябе не пускала без даклада.

— А я тут жа зволю яе з працы, — Залоза выскаліў зубы, бліснуў бакавы залаты; ён дзіўна смяецца, часам на поўны голас, але зуба не відаць, а часам вось так: бязгучна ўсміхнецца, і золата — як на паказ.

— Слухай, Іван, сын Яўменаў... Часам я не магу разабрацца, хто з нас губернатар — я ці ты?

— Ты, ты. Але даўно сказалі мудрыя: караля робіць акружэнне. Ты можаш ганарыцца сваім акружэннем. А хто падабраў табе штат? Парэкамендуй Каржакевіча на павышэнне...

— Не хоча.

— Не хоча?

— Ты ж таксама не хочаш, напрыклад, на яго месца.

— Не хачу.

— Вось гэтага я не магу зразумець. Ты ж самалюбівы чалавек, Іван. Як ты ў раёне гарцаваў на кані!

— Калі тое было. Змяніўся час — змяніліся людзі. І я змяніўся. Я люблю працаваць, а не гарцаваць.

— Працаваць ты ўмееш, — задумліва сказаў Вікенцій Паўлавіч.

— Дзякуй за высокую пахвалу. Упершыню пачуў.

— Не свішчы, Іван. Увесь час хвалю. Але калі ты хочаш, каб прапеў табе дыфірамбы з трыбуны — не дачакаешся. Не было яшчэ ў гісторыі, каб прылюдна хвалілі кіраўніка справамі.

Залоза засмяяўся голасна, але зуб не бліснуў, як перамясціўся ў глыбіню рота. Гэта забаўляла Вікенція.

— Прачытаў я твой даклад...

— І?..

— Нашто ты лезеш у тэорыю? Каму гэта трэба? Практыка трэба, а не тэорыя. Там, — Залоза паказаў вачамі ў столь, — і без таго смяюцца: лезе ў Марксы.

— Куды?

— На месца Маркса. І яшчэ адзін момант. Не чапай Падбярозскага. Агонь па сваіх апраўданы ў адным выпадку — калі просяць: «Агонь на мяне». Гэта робяць разведчыкі. Андрэй не просіць такога агню...

— Забурэў твой банкір. Ходзяць чуткі, што ён валюту пераводзіць за мяжу.

— Чыю?

— Сваю. А можа, і тваю.

— Ну, ты гумарыст, Вікенцій Паўлавіч, — бліснуў зуб. — Знайшоў валютчыка! А хто праверыў чуткі пра Андрэя? Ёсць у цябе хоць адзін дакумент? Няма. І не будзе... І сядзеш ты, прабач, у лужу са сваёй бяздоказнай крытыкай. А гэта ўдарыць па аўтарытэце. А твой аўтарытэт — гэта не толькі твой клопат, але і мой, усяе нашай каманды. А Андрэй — наш. Яго грошы нам з табой яшчэ спатрэбяцца. Мы з табой варочаем мільярдамі, а ў саміх — штаны працёртыя. Мяккі кут купіў? Не. І не купіш без Андрэя. Дазволь узяць у яго крэдыт.

— Не дазваляю!

— Цвердалобы ты аднак. Слухайся разумных люДзей.

— Ты лічыш сябе самым разумным?

Зноў гучны смех без бляска зуба.

— Ва ўсялякім разе дурнем не лічу.

— Гэта праўда: не дурань.

— А раз ты прызнаеш гэта, то атрымай параду. Трэба фарсіраваць Анатолеву жаніцьбу.

Вікенцій Паўлавіч насцярожыўся, твар яго перасмыкнуўся, бо падумаў: «Дажыўся. Без Залозы сына не магу ажаніць».

— Я магу, канешне, аформіць кватэру і на халасцяка. Але калі на сям'ю — наогул ніякіх праблем.

— Ніякіх?

— Ну, можа, цяўкне нехта з падваротні, нешта надрукуе які жоўты лісток — дый усё.

Вікенцію Паўлавічу зусім не хацелася абмяркоўваць сынаву жаніцьбу, тым больш — кватэрнае пытанне. Згадзіўся ён пакінуць кватэру Анатолю толькі таму, што прасіла Маша; не мог ёй, хворай, адмовіць. Але радасць, якую ўбачыў на твары Залозы, калі асцярожна намякнуў таму на магчымасць варыянта — «А ці нельга?» — ашаламіла яго тады і адначасова нарадзіла брыдкае адчуванне падзення; здавалася, ляцеў у шахту, якой няма канца. Таму прапанова Залозы бадай жа ўзрадавала: хутчэй вырашыць гэту праблему; можа, спыніцца падзенне. І даць сабе зарок: стаяць цвёрда! ні на чым не зрывацца!

Не сказаў памочніку ні «так», ні «не»: не хацеў, як кажуць, мусоліць далікатную справу, у якой перамешаны і задавальненне — сын жэніцца! — і непрыемнасць — кватэра.

Маўчаў і Залоза — святкаваў яшчэ адну перамогу.

Настрой губернатара даў Івану адчуванне, што можна вырашаць іншыя пытанні, заляжалыя.

— Вікенцій Паўлавіч, месяц ці, можа, паўтара, я палажыў табе на стол спіс...

— Дамоў?

— Дамоў.

— А чаму хвалююць цябе гэтыя дамы?

— Люблю, каб быў парадак. Вырашым гэта — і хоць маленькую дзірку залатаем у губернатарскім бюджэце.

— Бярэш ты мяне асадай.

— А як цябе яшчэ браць?

— Ну, чорт з табой! Трэба табе лішні клопат — атрымай яго.

Вікенцій Паўлавіч сеў за стол, пакорпаўся ў паперах, не адразу знайшоў спіс. Яшчэ раз уважліва прачытаў яго, задумаўся.

— І ўсё ж мастакоў я выкрэсліваю.

— Ох, дарэмна ты! Самы безалаберны народ. Прап'юць дом ушчэнт.

— Але яны ўмеюць пісаць, маляваць, сачыняць музыку. Ты ўмееш? Мы з табой пастанову, як мае быць, напісаць не здольныя. Каб Матрона стыль не адточвала, лінгвісты смяяліся б.

Залоза засмяяўся так, што бліснуў не адзін — два залатыя зубы. Спускаючыся з чацвёртага паверха на першы па лесвіцы, Іван Яўменавіч пошапкам лаяў губернатара:

— Дурная прынцыповасць! Тысяч сорак зялёных згарэла! Ну, я цябе прымушу і зялёныя ўзяць. Нікуды ты не дзенешся. Жыццё дыктуе. А яно няўмольнае.

Са свайго кабінета паклікаў інструктара гаспадарчага аддзела Ігара Кузьмянёва.

Увайшоў малады атлет баскетбольнага росту, спыніўся каля дзвярэй. Залоза так пільна агледзеў яго з галавы да ног, што той сам пачаў аглядваць сябе — ці ўсё ў парадку.

— Што вы, дзядзька, так ацэньваеце мяне? Як цыган каня на ярмарцы.

— Любуюся, Ігарок, любуюся. Што значыць добры харч!

— А што ў маёй маткі было? Бульба?

— І шала, як смяецца твая сястра. Сала! А гэта харч — дай бог. Без сала вы не сядзелі — я падкідваў.

— Дзякуй, дзядзька.

— Ідзі да стала. Сядай, вывучай дакумент.

Ігар сеў, узяў працягнуты Іванам Яўменавічам спіс, прагледзеў, не зразумеў.

— А што тут вывучаць?

— О, гэта цэлая хартыя! Усе гэтыя дамы забяром пад тваю ўладу.

— Пад маю? — іранічна скрывіўся інструктар.

— Пад нашу ўладу! Але каму кіраваць гэтай аперацыяй, як не табе? Больш нікому даручыць не маГУ. Слухай і матай на вус. Аб'едзеш гэтыя дамы на маёй машыне. З цяперашнімі іх уладальнікамі падпішаш вось такое пагадненне, — працягнуў пачак папер. — У кожнага з іх ёсць арандатары. І не па адным. Сустракаешся з кіраўніком фірмы, якая арэндуе плошчу. Замяраеш гэтую плошчу. Падпісваеш вось такі дагавор. Устанаўліваеш цану за квадратны метр у залежнасці ад стану памяшкання, месцазнаходжання. Але ёсць адзін нюанс: вусная дамоўленасць. Слухай уважліва. Сам на сам кажаш арэндатару: тры чвэрці платы заносіш у дагавор, і суму яны гэтую пераводзяць на рахунак выканкама. Чвэрць кожны выплачвае штомесячна табе наяўнымі. На губернатара не ссылайся. Скажы : кіраўніку справамі патрэбны наяўныя грошы. А каму яны не патрэбны? Хто не згодзіцца з цаной, не таргуйся, не хоча — не трэба. У дзень няхай ачысціць плошчу. Знойдзем іншых, ахвотнікаў многа, бізнесменаў развялося, што сабак, а плошчаў не хапае. Сцяміў?

Яны схіліліся над сталом — галава да галавы, віхрастая і лысаватая, удакладнялі дэталі надзвычайных умоў, і раптам Ігар спытаў таямнічым шэптам:

— А што я, выканаўца, буду мець ад аперацыі?..

— Ты маеш зарплату.

— А хочацца яшчэ і прэміяльныя. Кінулі б пляменніку на яго беднасць...

Залоза ад абурэння стукнуў кулаком па стале.

— Ну, нахаба ты, Ігарышча! Класічны нахабнік. На што ты штурхаеш дзядзьку? Увесь у дзеда, разбойнік. Але калі не будзеш дурнем — будзеш мець і прэміяльныя. На ксераксе размножым распараджэнне губернатара, і кожнаму цяперашняму ўласніку ўручыш. Няхай знаюць, што нацыяналізацыю гэту не Іван прыдумаў. Усе дэталі ўсёк?

Кіраўнікоў адміністрацыйных адзінак і ўпраўляючых камерцыйных банкаў Вікенцій Паўлавіч ведаў усіх, а вось сярод прэзідэнтаў фірм былі зусім незнаёмыя твары.

Яшчэ менш было знаёмых у трэцяй групе — сярод вучоных. Адразу адзначыў гэта і папракнуў сябе: недаравальна не ведаць эліту.

Яны селі ў зале групамі: у цэнтры — адміністратары, злева — вучоныя, справа — прадпрымальнікі.

У часе даклада ўбачыў: найбольш уважліва яго слухаюць вучоныя і прадпрымальнікі. Дэмакратычна выбраныя старшыні яўна не ўнікалі ў сэнс таго, што ён гаварыў. Адны пазяхалі, другія калупалі ў насах, на задніх радах — перамаўляліся. А старшыня дальняга раёна Мікалай Касабуцкі салодка спаў, адкінуўшы галаву на спінку крэсла.

Спачатку Вікенція Паўлавіча гэта абурыла, і ён намерыўся разбудзіць дзеяча ўедлівым жартам — каб зала смяялася. Але тут жа па-чалавечы пашкадаваў. Чалавек прачнуўся гадзін у пяць, калі не раней, каб паспець да дзесяці на нараду, а гэта дзвесці кіламетраў па зімовай слізкай дарозе. Няхай паспіць, нябога.

Увага вырасла нават у старшынь, калі ён ад справаздачы па выніках года перайшоў да тэорыі.

— Давайце, нарэшце, хоць раз падумаем, паразважаем, якое ж грамадства мы будуем. З гэтай мэтай мы запрасілі вучоных. Нельга жыць без ідэі. А мы жывём. Вы думаеце, капіталізм той, высока развіты, — гэта анархія, што хачу, тое і варачу? О, не! Я прачытаў некалькі кніжак амерыканскіх і нямецкіх аўтараў. І я вам скажу — не кожная паасобку, а ўсе разам — гэта сучасны «Капітал». Выразная, без заклікаў, палітычная ідэя, якой павінна трымацца іх — іх! — грамадства, стройная эканамічная тэорыя...

Вушы пэўна натапырылі ўсе групы ад таго, што прамоўца адарваўся ад паперы і пачаў разважаць.

— Іх палітолагі, эканамісты, сацыёлагі ўнікаюць ва ўсе дэталі складанага вытворчага працэсу, не адрываючы яго ад сацыяльных праблем, ад гандлю, бытавога абслугоўвання, адукацыі, аховы здароўя. Маркс да гэтага не дайшоў. Аднак у аснове ўсіх даследванняў сучаснага грамадства ляжыць Марксава тэорыя. Не я зрабіў адкрыццё, што буржуазный ідэолагі вывучаюць Маркса глыбей, чым вывучалі мы, няхай мне даруюць прысутныя тут вучоныя. Я ў першую чаргу маю на ўвазе выпускніка Вышэйшай камсамольскай школы. Сябе. На што цяпер робіцца ўпор там, у іх? На інтэнсіфікацыю працы ва ўсіх галінах... Хто ведае, што такое акмеалогія? — Вікенцій Паўлавіч зрабіў паўзу, як чакаючы — Ці скажуць, што ведаюць. Нясмела падняліся тры рукі. І. як не дзіўна, — не ў групе вучоных, дзве — на баку прадпрымальнікаў і адна — кіраўнікоў.

Пасміхнуўся прамоўца.

— Нямнога. А між тым гэта цэлая навука. Аб вывадзе чалавека на вяршыню сваіх магчымасцей. А магчымасці гэтыя бязмежныя! Свой разумовы патэнцыял мы выкарыстоўваем у лепшым выпадку на дзесяць— дваццаць працэнтаў... Пра акмеалогію я чытаў з цікавасцю. Проста і мудра... Прашу нашых вучоных заняцца гэтай тэорыяй. Растлумачыць усім нам яе сутнасць. Думаю, у наш час ніхто не скажа, што гэта — буржуазная навука.

Ад слоў гэтых, зусім не жартаўлівых, зала засмяялася. Вікенцій Паўлавіч не здзівіўся: прыкмета ўвагі.

— У акмеалогіі надаецца асаблівая ўвага формам заахвочвання і стымулявання якасці працы. Запомніце: не колькасці — якасці! А гэта якраз тое, на чым мы прайгралі...

Гаварыў губернатар аб неабходнасці ўзнавіць народны кантроль, і аб шведскім і кітайскім сацыялізме.

Некаторыя нават дасталі блакноты і пачалі запісваць. Канспектуюць. А гэта ўжо можна занесці ў свой актыў, у сваю перамогу.

Пасля даклада ўсцешыўся: пытанні больш задавалі кіраўнікі і даволі актуальныя, часам злыя. Выступалі востра, з разуменнем працэсаў, якія адбываліся ў іх раёнах, гарадах, самакрытычна і крытычна — у адрас абласной адміністрацыі. Не саромеліся праехацца і па ім: маўляў, замнога тэорыі і мала практыкі.

Працягвалі паступаць паперкі з пытаннямі. Іх чытаў Каржакевіч і перадаваў губернатару. Адну прачытаў, зморшчыўся, як ад кіслага, і адлажыў паперку пад мікрафон тэкстам да стала.

— Што там? — спытаў Вікенцій Паўлавіч.

— На гэтую можна не адказваць. Без подпісу.

— Без адказу не пакінем ніводнага пытання — з подпісам ці без подпісу, — узяў паперку, прачытаў: «Спадар губернатар! — зварот яўна здзеклівы, ніхто так не звяртаўся. — Ці праўда, што вы занялі пяціпакаваёвую кватэру Мудронага, а сваю былую перадалі сыну?»

Кроў ударыла ў галаву.

«Яшчэ не перадаў, а ўжо плёткі папаўзлі. Хто распускав? Іван? Гарадскія ўлады? Але ж ні гарвыканкам, ні райвыканкам ордэра не афармляў: хітры Дыбчык чакаў пісьмовай заявы губернатара, так сказаў Івану».

Доўга адказваў на пытанні, як бы знарок адцягваў адказ на апошняе, хоць у галаве адказ быў гатовы, кароткі і просты, адзіна правільны ў яго становішчы. Вырашыў адказаць менавіта так — і як скінуў цяжкі груз.

— І апошняе... — прачытаў пытанне, —у вас няпоўная інфармацыя. У кватэру Мудронага я перабраўся, але ў старой са сваіх нікога не пакінуў — і сын, і дачка жывуць са мной. Прашу горад пакінуць кватэру за аблвыканкамам, ёсць старыя работнікі, якія жывуць у дрэнных умовах.

Яму запляскалі... вучоныя. Кіраўнікі і бізнесмены прынялі адказ моўчкі. А Залоза крутнуў пальцам каля скроні. Але менавіта гэты яго жэст у большай ступені, чым апладысменты, далі адчуванне, што ён не толькі не праваліўся ў шахту — не, наадварот: узнёсся на пралёт угору, так імкліва, што ажно прыемна захаладала ўсярэдзіне. У кабінеце Іван Залоза голаса не ўзвышаў, а шыпеў, што вуж:

— Каго ты спалохаўся? Іх, гэтых хапуг? Ды калі не лічыць вучоных, то кожны з іх — і дзяржаўнікаў, і рыначнікаў — па палацы збудаваў, а некаторыя не па адным. Ездзіў? Бачыў?

— Вось ты і дасі мне спіс, хто што збудаваў з дзяржаўнікаў, як ты кажаш.

Гэтым Залоза яго не здзівіў. Здзівіў сын. Анатоль ніколі не патрабаваў ніякіх даброт. І пра кватэру не заікнуўся, каб не маці. А тут раптам да ціхай істэрыкі, да пасінення твару пачаў вініць бацьку, што ён не трымае свайго слова, свайго абяцання.

— Табе што, мала пяці пакояў?

— Мы хочам жыць самі. Чаму ты хочаш прывязаць нас да сябе? Мы дарослыя людзі! І ты абяцаў. Ты Ліцы сказаў: гэта ваша кватэра.

— А ты разумееш, што гэта незаконна?

— Для цябе — закон?! Не смяшы, бацька.

Бацька жахнуўся: адкуль гэта ў сына? Ад каго набраўся? Безумоўна, ад нявесты. Яна такая сквапная, гэтая сімпатычная Ліка, вясковая дзяўчына? Жах. Калі гэта так, то адхапіў Толік шчасце!

Нават маці гэта зразумела і сядзела моўчкі, панурыўшыся, баючыся аднаго: каб муж не сарваўся, не накрычаў на сына, не адмовіўся ад удзелу ў вяселлі: ад яго ўсяго можна чакаць — ведала яго ўпартасць, яго прынцыповасць.

Здзівіла, як інфармацыя пра нараду так хутка дайшла да студэнтаў. У той жа дзень. Хто расказаў? Не інакш нехта з навукоўцаў: прыйшоў на лекцыю і замест таго каб чытаць свой прадмет, пачаў расказваць пра нараду ў губернатара. Балбатуны! Пляткары!

Каб спыніць цяжкую і непрыемную размову з сынам, Вікенцій Паўлавіч схаваўся ў сваім кабінеце; дажыў, што дома мае ўласны кабінет! І ў трэці ці чацвёрты раз за тры гады... закурыў.

6

Яшчэ да таго, як Маша вярнулася з бальніцы пасля аперацыі, Вікенцій Паўлавіч рассунуў ложкі і перагарадзіў іх столікам — турбаваўся пра жонку, каб ёй спалася спакойна, бо ведаў, што ён храпун і меў звычай абняць яе, уткнуцца тварам у грудзі. Ад яе цяпла, незвычайнага водару цела ён засынаў хутчэй, чым ад снатворнага; яна, Маша, здымала любое эмацыянальнае напружанне не толькі словамі, але і сваім роўным дыханнем і дотыкам рукі. Ён часта думаў, якое гэта шчасце мець побач такога чалавека, у поўным сэнсе роднага.

Пераехаўшы ў новую вялікую кватэру, дзе спальня была ў два разы большая, яны паставілі ложкі гэтак жа раздзельна, нават з большым інтэрвалам — плошча дазваляла.

Ён звычайна позна чытаў. Увайшоў у спальню на насочках, лёг і па яе дыханні пачуў, што жонка не спіць.

Маша ўздыхнула. Але і на гэта ён не адазваўся. Праз хвіліну яна паклікала:

— Віця! Не спіш?

— Не сплю.

— Віця, ты забыўся, што ў цябе ёсць жонка.

Ён бадай спалохаўся. Пасля аперацыі ў яго ніколі не ўзнікала жаданне блізкасці з ёй, хоць нярэдка сніў іншых жанчын, у апошні час часцей адну — тую, якую бачыў на працягу дня больш часу, чым жонку.

— А можна? — спытаў нясмела.

Маша засмяялася.

— А чаму не? Пяты месяц пайшоў. А гінеколаг сказала, што можна праз месяц.

Ён не паспеў падумаць, што трэба перабірацца на жончын ложак, як Маша апынулася ў яго пад коўдрай.

— Ты баішся? Не бойся. У мяне ўсё ў парадку. Не хвалюйся. Божа, як калоціцца тваё сэрца. Дурненькі. Як хлапчук. Першы раз... там, у лесе, так не білася. Успамінай маладосць... Успамінай прыемнае...

Але ўспомніў ён не мядовыя дні з Машай. Прыйшло іншае. Пачуў пах духоў — тых, што чуў штодня. Сёння Ганна зноў стаяла побач, паказваючы паперы, зноў дакраналася грудзьмі да яго пляча, і ў яго вачах літары дакументаў скакалі ў вясёлым гарэзлівым танцы. Ён не спяшаўся разабрацца ў паперах, і Ганна доўга не адыходзіла. Ён падняўся з крэсла ў парыве абняць яе. Аднак стрымаўся. У каторы раз. Падумаў: «Толькі зрабі гэты крок — і не мінеш падзення». Ды і Залоза можа ў гэты момант адчыніць дзверы; Іван — што дэман, злы дух. О, як бы гэта Івана пацешыла: губернатар цалуецца з сакратаркай! Не ведаў Вікенцій, што кіраўнік справамі толькі і чакаў гэтага; страціўшы надзею аднавіць свае даўнія, «раённыя» адносіны з Аняй, ён штурхаў яе ў абдымкі губернатара — каб аддзячыла за перавод з раёна, за цёплыя месцы сабе і мужу, за кватэру.

Уявіў, як спыняе Ганну, не дае ёй выйсці з кабінета, прагна цалуе, замыкае дзверы і вядзе яе да вузкай канапы...

Уяўленне — але якая сіла ў яго! І ўсё рэальнае адбылося не з Машай — з Ганнай.

Раніцою Маша ззяла, даўно не выглядала такой шчаслівай. Нават Танька заўважыла:

— Ты, мама, блішчыш сёння, што гэты твой блінец.

Маці засмяялася. Вікенцій Паўлавіч не ўсміхнуўся: настрой яму кожную раніцу псаваў сын сваім зацятым маўчаннем — кватэры не даруе.

Пагаварыўшы аднойчы даволі бурна, Вікенцій Паўлавіч не вяртаўся да размовы пра кватэру, бо разумеў, што любыя яго словы сын можа прыняць як апраўданне. А ён ні перад кім не намераны апраўдвацца. Зрабіў — і кропка. Яго слова, яго дзеянні — закон для іх, блізкіх. Добра, што Маша гэта разумеў.

Сына хацелася ўлагодзіць, пажартаваць з ім, абмеркаваць блізкае вяселле. Але не выходзіла з галавы начная радасць. Маша шчаслівая, а між тым, ён здрадзіў ёй, і такая здрада, можа, самая злая: здрадзіць жонцы, лежачы з ёй жа ў сваёй пасцелі. Нават перад Таняй яму было сорамна ў тую раніцу.

Ганна перадрукоўвала пісьмо, нешта не разабрала і прыйшла ўдакладніць. Усё яна разабрала — столькі пісем яго перадрукавала. Але была прычына стаць побач, нахіліцца над рукапісам, каб галава

да галавы, запаліць у ім агонь. Даўно падказвала тонкае жаночае чуццё, што ён не абыякавы да яе. І ёй падабаўся гэты мужчына.

У маладыя гады ў Ганны было шмат паклоннікаў. Хуткае замужжа. Развод. Без кахання выйшла замуж у другі раз. Тут з'явіўся Іван. Праз некаторы час ён падаўся ў абласны цэнтр, куды потым паклікаў і Ганну.

Тут Іван быў не супраць аднавіць свае адносіны з ёй. Ды яна дала адбой. Але не для сябе ён пасадзіў яе ў прыёмнай — для губернатара. Ведаў, што той не донжуан, але які мужчына можа ўстаяць перад такой жанчынай, тым больш, калі яна сама легка пойдзе на збліжэнне! Падштурхоўваў яе ў абдымкі шэфа. Злаваўся, упэўніўшыся, што абодва яны пільнуюць сваю цнатлівасць.

У першы ж дзень, уводзячы Ганну ў абавязкі сакратаркі, Іван абавязаў яе найбольш важныя паперы, асабліва з грыфам «сакрэтна», паказваць яму.

Але хутка яна заўважыла, што некаторыя дакументы Іван не вяртае. Не вяртае не толькі тых, што прыходзяць на імя губернатара, але зрэдку і тых, што выходзілі ад яго, за яго подпісам. Ганна добра разумела, што ў выпадку, калі спахопяцца, дзе дакумент, — на Івана яна нават не зможа паказаць, і ўся віна ўпадзе на яе галаву. Моцна ўзлавалася. І калі ён пачаў дамагацца былой блізкасці, яна пагразіла: скажа Вікенцію, што кіраўнік справамі не вяртае вельмі важныя паперы, па сутнасці, крадзе іх.

З таго дня забылася мінулае, адносіны сталі чыста службовыя.

Вікенцій Паўлавіч не толькі падказаў словы, якія яна «не разабрала», але чытаў уласны тэкст далей, правіў.

Ганна не разгіналася і ўсё мацней прыціскалася грудзьмі да яго пляча, робячы выгляд, што хоча тут жа, па ходдзе, прачытаць яго папраўкі.

А ў аўтара кружылася галава ад яе, і ён без патрэбы правіў свой рукапіс, зусім не ўдасканальваючы яго, наадварот, робячы горш, затуманьваючы думкі.

Ганна бачыла гэта, але маўчала, добра разумеючы, чаму ён зацягвае прагляд пісьма і чаму правіць неўпапад. Але ўрэшце не вытрымала; палажыла мяккую гарачую далонь на яго галаву, лёгенька пагладзіла, а потым сама прагна ўпілася ў яго вусны. Ён задыхнуўся ад асалоды. Але тут жа падхапіўся, абняў яе за талію і павёў да дзвярэй. Яна спалохалася, што ён выпіхне яе ў прыёмную. Не. Ён ціхенька павярнуў ключ і тады абняў моцна за плечы і цалаваў прагна, салодка. Цяпер ужо ў яе закружылася галава. А для яго ўсё

адбывалася па тым сцэнарыі, калі ён тыдзень назад настройваў сябе на блізкасць з жонкай.

Не выпускаючы жанчыну з абдымкаў, ён, ціха ступаючы па дыване, крочыў спіной уперад, усё яшчэ цалуючы яе. І так давёў да дзвярэй пакоя для адпачынку. Ганна паслухмяна ўвайшла туды. Але калі ён падвёў яе да вузкай канапы, пасадзіў і пачаў расшпільваць кофтачку, прагна цалуючы, Ганна рэзка паднялася.

— О, не! Толькі не тут! Зойдуць у прыёмную...

— А дзе?

Яна ціха і бадай радасна засмяялася.

— А гэта ўжо твая праблема.

І вінавата ўсміхалася — як прасіла прабачэння.

Дзверы не скрыпнулі. У прыёмнай званіў тэлефон. Змоўк. Узяла трубку? Але голаса яе за двайнымі дзвярамі не было чуваць — як заўсёды.

Вікенцій Паўлавіч хвіліну стаяў ашаломлены. Ударыла хваля прыкрасці, расчаравання — як падманулі яго. Але праз нейкі момант прыйшло пачуццё ўдзячнасці да Ганны: разумніца! Яшчэ гэтага падзення яму не хапала — у кабінеце з сакратаркай! Але чым больш ён думаў пра тое, што адбылося, тым мацней адчуваў на вуснах слодыч яе пацалункаў. І — што самае дзіўнае — блізкасць з ёй зусім не здавалася яшчэ адным падзеннем.

Вельмі цешыла, што яна сказала яму «ты», гэта зблізіла іх. І ён не можа не споўніць яе спадзяванне. Але сапраўды праблема — дзе? Яго праблема. Упершыню вылаяў сваю пасаду: «Чорт бы яе ўзяў! Без аховы кроку не ступіш. Доўга яшчэ ламаў галаву. І нікога ж не папросіш дапамагчы ў гэтым. Нават машыны сваёй няма. І ключы ад старой кватэры ўжо аддаў».

Аднак што можна прыдумаць?

Здзекліва падумаў пра сябе: «Які ж ты губернатар? Такой дробнай праблемы не можаш рашыць. Смешна. Расчаруецца жанчына ў цябе».

Займаўся справамі, прымаў людзей, а праблема вісела прывабнай прыманкай. Толькі дома перад Машай стала сорамна, і ён крыху астыў, але ўначы перабраўся' на жончын ложак. І зноў адчуў Машыну ўдзячнасць. А самому было сорамна: ён быў не з жонкай. А гэта ўжо можна назваць падзеннем. Але такое падзенне глыбока не кранала.

Адным вынікам сваёй працы быў задаволены: вялікім напружаннем удалося ліквідаваць неплацяжы, людзі атрымлівалі зарплату. Але патрэба ў сродках не змяншалася.

Сядзеў за сталом, чыркаў паперу, думаў. Але думкі пра службовае, грамадскае перапыняліся асабістым: як вырашыць сваю праблему — тую, пра якую нікому нельга сказаць, але якая ўсё больш хвалявала і ўдзень, і ўначы.

Ганна нічога не казала і нават не станавілася побач, падавала паперы праз стол. Але ён бачыў: глядзіць на яго скептычна, насмешліва, з дакорам: «Не можаш рашыць такой праблемы? Эх ты! Губернатар!»

Урэшце прыдумаў. Яго выклікалі на пасяджэнне Савета Рэспублікі. А гэта, прыблізна, на тыдзень. Спытаў у Ганны:

— У цябе ёсць хто ў Мінску?

— Сястра.

— Напішы заяву, папрасі на колькі дзён адпачынак. Паязджай заўтра. Здымі ў гасцініцы «Беларусь» прыстойны нумар. Я прыеду паслязаўтра. Во грошы.

Ганна пачырванела і схавала рукі пад стол. Ён зразумеў: яе спалохалі грошы; атрымаецца, што ён заплаціў ёй. Авансам. Ён таксама пачырванеў, адчуваючы няёмкасць. Але сказаў ласкава:

— Аня, мы ж свае...

Цяжка ўздыхнула. Не адразу ўзяла грошы. Баялася, што грошы апаганяць пачуцці. А ёй хацелася чыстага кахання, мужчына гэты падабаўся ёй больш, чым муж, чым папярэднія любоўнікі. Аднаго з іх, якога бачыла штодня — Залозу, — проста ўзненавідзела за яго нахабства, за брудныя жартачкі і намёкі.

Спрабаваў вырашыць яшчэ адну праблему: вызваліцца ад Палавінкі. Не выйшла: Залоза, даведаўшыся, што Ганна на дзень раней едзе ў сталіцу, адразу сцяміў што да чаго, і адпусціць губернатара без «свайго вока» ніяк не мог:

— Я адказваю за цябе.

Вікенцій ехаў з радасным хваляваннем — як на першае спатканне, з незвычайнымі ўяўленнямі вопытнага мужчыны: юнак такога не сасніў бы. Паспрабаваў дамовіцца ў машыне, што яму трэба наведаць старога сябра, хворага, не ісці ж удваіх.

— Я падзяжуру ў пад'ездзе.

Вікенцій Паўлавіч узлаваўся, вылаяўся.

— Ды ну вас з Іванам! Абрыдлі вы мне, як горкая рэдзька...

Прыехалі ў прыцемку. Размясціліся ў гасцініцы. Пайшлі з Міхалам вячэраць. Ведаў, што ахоўнік любіць выпіць, але тут адмовіўся — служба. «Як жа яго ўсыпіць?» — думаў губернатар, праўда, ужо без злосці, весела. Успомніў пра снатворныя таблеткі, што зрэдку выкарыстоўваў.

І калі Палавінка адлучыўся пазваніць, губернатар пайшоў на «злачынства»: укінуў у «пепсі-колу», якую ахоўнік любіў, ажно дзве таблеткі.

Хутка ён быў у гасцініцы. Ціха пастукаў у дзверы нумара.

Ганна адчыніла адразу. І як толькі ён пераступіў парог, абняла яго, халоднага з марозу, гарачымі рукаМі. Ад яе патыхала тымі ж духамі. Але не духі ён пачуў, а непаўторны водар яе жадання.

Якую мядовую ноч яны правялі!.. Паспалі ці гадзіну. Ён прачнуўся гадзін у пяць. Ганна спала, абняўшы яго, і ён не мог вызваліцца ад яе рукі, каб не разбудзіць.

— Я пайду, радасць мая.

— Паляжы яшчэ хвіліначку.

— У нас чатыры ночы. А цяпер трэба ісці. Палавінка расхвалюецца, што няма мяне, уздыме шум.

Аднак не змог адарвацца, калі знайшоў яе гарачыя вусны...

Таксі не ўзяў. Пайшоў пехатой. Не ішоў — ляцеў. І смяяўся з Палавінкі і Івана.

Радаваўся яшчэ і таму, што ніякага падзення, ніякіх згрызот сумнення не адчуваў. Ішоў героем пасля перамогі.

Вярнуўшыся ў прэзідэнцкую гасцініцу, разбудзіў у нумары Міхаіла. Той адчуў сябе ніякавата: шэф будзіць.

Вікенцій Паўлавіч крыху пакпіў з ахоўніка і адправіўся на паседжанне.

Там пакутаваў: нястрымна цягнула на сон, вейкі зліпаліся. У вялікай зале можна было б і пакемарыць, а тут, дзе няма і сотні пасяджэнцаў, — паспрабуй заснуць... анекдоты будуць расказваць.

І зноў з сынам канфлікт.

Анатолю хацелася шыкнуць па-губернатарску, зрабіць вяселле ў лепшым рэстаране. Можа, не столькі ён хацеў, колькі нявеста вымагала: паводзіла сябе, як шляхцянка, хвалілася, што бацькі прадалі бычка, каб набыць ёй вянчальны ўбор. Ліка як бы дакарала: мае, маўляў, не губернатары — звычайныя сяляне, а нічога не шкадуюць. На баку брата і яго нявесты была Таня. Хітруган Толя, не маючы такой настырнасці, нацкоўваў на бацьку сястру.

А з Таняй гаварыць было цяжка, бацька не мог злаваць на яе ўсур'ёз.

— Ты, тата, Габсек, Плюшкін!.. Хто там яшчэ быў скупы? А яшчэ губернатар! Сорам. Простыя людзі робяць вясёллі ў рэстаранах. А ён заганяе нас у свінушнік — рабочую сталоўку на акраіне горада!

З Толікам з-за такіх слоў ужо пасварыліся б, а Тані і гэта даравалася.

Толя паказаў спіс гасцей з нявесцінага боку... Вікенцію Паўлавічу ажно ў галаву ўдарыла. Ён так стараўся зрабіць вяселле бясшумным, сціплым. Са свайго боку меўся запрасіць чалавек дваццаць, не больш; гэта разам з Машынымі калегамі-ўрачамі. Толя, убачыўшы гэты кароткі спіс, пазмрачнеў і спытаў:

— А мне колькі запрасіць сваіх студэнтаў?

— Ты запрашай колькі хочаш, вяселле тваё.

Дні праз два Толя ў прысутнасці Лікі, падсунуў бацьку спіс — ад жаніха і нявесты. У бацькі заняло дух! Што ён, дарагі сынок, здзекуецца? 130 чалавек!

— А нямнога, сыне?

— А чаго ты баішся? У другіх больш бывае.

— Дурная завядзёнка.

— Не нам яе адмяняць. А калі ты зноў пра грошы, то не палохайся. Лікіна маці сказала: за сваіх яны заплацяць. Яны ж багатыя — сельгасрабочыя! Не губернатары.

Бянтэжылі не расходы. Бянтэжыў збор такой колькасці людзей. Ведаў з вопыта: акрамя тлума і шума, Ніякай радасці такое мнагалюднае вяселле не прыносіць. Сказаў пра гэта разважліва, спакойна.

— Папрасі Ліку пачысціць спіс.

— Ліка хоча, але маці яе не згаджаецца. Цэлы вечар сядзелі, ламалі галовы. Але ў Веры Пятроўны чатыры сястры, адзін брат. А колькі дваюрадных! Кажа, паспрабуй каго-небудзь, хто дарослы, не запрасіць — вораг на ўсё жыццё. І гэта ж, бацька, добра, што людзі так радняцца.

Вікенцій Паўлавіч мусіў згадзіцца, што гэта добра і... здаўся.

У яго была свая праблема: запрашаць Залозу ці не? Палавінку пераканаў: немагчыма, каб яго ахоўвалі яшчэ і на вяселлі ўласнага сына. А Іван — сябра, не запросіш — пакрыўдзіцца. Але ж розум падказвае: сябру гэтаму трэба неяк паказаць на дыстанцыю, якая павінна быць паміж начальнікам і падначаленым. Іван так часта не заўважае яе.

Сам праблему так і не вырашыў, а хітра падкінуў яе жонцы: даў спіс гасцей без Залозы.

— А Іван? — адразу спытала Марыя Іванаўна.

— Знаеш, сябра — сябра. Але няхай адчувае.

— Няёмка, Віця. Так ён стараўся на выбарах. Такіх людзей не забываюць.

— Стараўся! Але дзеля каго больш: дзеля мяне ці дзеля сябе? Прымасціўся дай Бог. Ад вышэйшай пасады адмаўляецца.

— Але ўсё роўна Івана запрасі. Ён прадукты прывёз. Вікенцій Паўлавіч ажно падскочыў:

— Якія прадукты?

— Тры скрыні прысмакаў.

— За якія грошы? Хто яго прасіў?

— Ён сказаў: «Гэта мой уклад у вашу сямейную ўрачыстасць, лічыце мяне спонсарам новай сям'і».

— Чорт вазьмі! Да чаго я дажыўся! Мяне корміць Іван! Маша! Як ты магла ўзяць? Як ты магла ўзяць?

— Я думала, ты ведаеш.

— Першы раз чую! Вось цяпер ён убачыць наша вяселле, як свае вушы.

На другі дзень на праборку Залозы духу не хапіла. Сказаў ціха, афіцыйна, калі той сядзеў з другога боку стала:

— Іван Яўменавіч, я прашу прадуктаў не вазіць, — і чуць больш строга: — Не магу зразумець, каго ты хочаш падставіць — мяне ці сябе?

— Сябе магу і падстаўляю... пад твае ўдары. Цябе ніколі не падстаўлю. Ніколі! Але прымі параду: не ўмешвайся ты ў гаспадарчыя дробязі. А Марыі Іванаўне трэба было дапамагчы. Ёй і так цяжка.

Вянчаліся ў царкве. Рытуал вянчання кранаў сваёй урачыстасцю. Вікенцій Паўлавіч Стаяў у першым радзе прысутных, трымаючы Машу за руку гэтак жа, як жаніх трымаў нявесту.

Упершыню пашкадаваў, што яны з Машай не вянчаліся.

Калі свяшчэннік абвясціў Анатоля і Леакадзію мужам і жонкай, Вікенцій прашаптаў Машы:

— Можа, заадно і мы з табой павянчаемся?

— Віця, не жартуй ты хоць у царкве. Ты сёння як подмаз з'еў: з раніцы смяешся. Даўно цябе такім не бачыла.

— А што! Во сенсацыя — і бацькі павянчаліся!

— Будзе залатое вяселле — павянчаемся.

— Доўга чакаць.

— Чаканне дае імпульс жыцця. Чакай, калі ёсць цярпенне.

— А ты робішся філосафам.

— У цябе вучуся.

— Ну, які я філосаф! Чэрствы прагматык.

— Ды не, ты яшчэ і рамантыкам бывает. Паэтам.

Здалося, што Маша сказала і пра цярпенне, і пра рамантыку з сарказмам. Насцярожыўся: ці не здагадалася пра яго сувязь з Ганнай? І ўпершыню і менавіта тут, у царкве, перад выявай Хрыста і Багамацеры яму зрабілася сорамна за свой грэх. Упершыню

перахрысціўся і папрасіў — не Хрыста... Машу даравацъ яму. Жонка здзівілася, што ён хрысціцца. Больш таго, калі маладыя абменьваліся пярсцёнкамі, з вачэй яго пасыпаліся буйныя слёзы. Шукаў хусцінку і не мог знайсці.

Свяшчэннік, віншуючы і настаўляючы маладых, глядзеў не на іх — на яго, бацьку, залітага слязамі.

— Дай мне хусцінку, я забыўся...

Маша глянула на яго і не толькі здзівілася — бадай спалохалася. Ведала: асаблівай сентыментальнасцю муж яе не вызначаўся, на пахаванні маці не заплакаў. Пасміхнулася, даючы насоўку.

— Старэеш, Віця.

— Старэю, Маша.

«Старэю, а па чужых спальнях лажу, як марцовы кот. Усё, завязваю. Калі дэвіз мой — сумленнасць, то сумленнасць павінна быць ва ўсім: у дзяржаўным і асабістым. З людзьмі, з падначаленымі, з жонкай, з дзецьмі».

Тут, у сваім горадзе, Ганна дамовілася з сяброўкай, былой аднакурсніцай, і тая ўступіла ім на вячэрнія гадзіны сваю халасцяцкую аднапакаёўку. Няпроста было пазбавіцца аховы, але чаго не зробіш дзеля жанчыны! На ўсе перасцярогі забываеш, смакуючы ўзнагароду, якую атрымліваеш. А ўзнагарода была вельмі прыемная, Ганна ўмела падарыць незабыўную радасць.

Але тут, у царкве, на вянчанні дзяцей, уся яго рамантычная гісторыя здалася такой бруднай, што ён сам сабе стаў брыдкім. Здалося, што здрадзіў не толькі Машы, руку якой сціскае ўсё мацней, як бы баючыся, што выпусціць — і назаўсёды, а здрадзіў сыну, нявестцы, Тані, людзям, якія спадзяюцца на яго. Мімаволі азірнуўся і здзівіўся, можна сказаць, спалохаўся. Уваходзілі ў царкву — людзей было няшмат, свае. А цяпер невялікая царква прыгараднага сяла была поўная. Гэтыя людзі — яго госці, сваякі нявесты, вяскоўцы і гараджане, старыя і маладыя, нават дзеці.

У фае сталоўкі гасцей сустрэў... Іван Залоза.

Вікенцію Паўлавічу, калі ўбачыў яго, ажно кроў ударыла ў галаву: «А ён як тут апынуўся? Хто яго запрашаў? І чаму з многімі з гасцей, з якімі ён, гаспадар, не паспеў пазнаёміцца, Іван вітаецца, як з добрымі знаёмымі, з некаторымі жанчынамі нават цалуецца?» Адна жанчына пляснула ў далоні, аглядаючы Залозу, як дзіва, і выгукнула:

— А Іваначка! Як жа цябе разнясло! Ці не кавун ты праглынуў? Быў жа што трасціначка, калі бегаў да мяне на спатканне ў Барок.

— Насця! Не выдавай старыя тайны.

Весела рагаталі.

Фантасмагорыя — ды і толькі! І тут Залоза — свой чалавек. Іван усюды свой!

Убачыўшы губернатара, кіраўнік справамі кінуў іншых гасцей і хутка пайшоў насустрач. Працягнуў руку.

— Віншую, Вікенцій Паўлавіч. Ад усяго сэрца.

— А ты як тут?

— Ха! Думаеш, калі ты забыўся пра мяне, то і ўсе забыліся? Не, Івана не забылі. Нявеста — мая пляменніца. Дачка дваюраднай сястры.

— Што ж ты маўчаў? — руку падаў. — За віншаванне дзякую.

— Чаму маўчаў? Бо не ведаў, пакуль сястра не прыехала на вяселле запрасіць. Ты бачыш, колькі іх у мяне.

Івана зноў акружылі сваякі. І Вікенцій Паўлавіч ціха выслізнуў з гэтага кола цётак і дзядзькоў. Пайшоў у залу сталоўкі. І зноў быў ашаломлены. На сталах былі закускі, якіх у меню і блізка не было, — ікра чырвоная, сёмга, каўбаса розных гатункаў і іншыя далікатэсы. Іванава карэкціроўка.

«Чорт лысы! Ну, я табе пакажу. Я ўсе гэтыя прысмакі за твой кошт аднясу, — але тут жа зразумеў, што гэта наіўна; Іван, канешне, пашкрабе патыліцу, але ўласнай капейкі не выкладзе, у ягоных руках уся казна губерніі. — Не, з казны ён не стане браць. Ён возьме ў «новых», у банкіраў. І выйдзе, што губернатар за іх кошт гуляў вяселле сына».

Вікенцій Паўлавіч паверыў, што да запрашэння на вяселле Іван не ведаў, што яго пляменніца — нявеста губернатарскага сына.

Яму і ў галаву не магло прыйсці, што само вяселле — справа Іванавага практычнага розуму, яго здольнасці да камбінацый, умения з усяго зрабіць палітыку. Праўда, памагла выпадковасць. У час выбараў Залоза спыніўся ў вёсцы ў роднай сястры. І ў першую ж нядзелю, седзячы за сталом, убачыў, што па вуліцы ішоў сын... Вікенція Паўлавіча Толя з дзяўчынай. Во куды занесла яго!

Даведаўшыся, што дзяўчына — яго сваячка, ён імгненна пралічыў камбінацыю.

Тут жа была паклікана маці Лікі Вера Пятроўна, дваюрадная сястра Залозы, такая ж валявая і ўчэпістая, як ён, — парода! Агітаваць яе доўга не трэба было. Якая маці не думае, як выдаць дачку замуж! А калі яшчэ за такога хлопца! Анатоль сам па сабе спадабаўся, а калі ёй вытлумачылі, хто ён і што яму свеціць, няхай не яму — бацьку, але ж ад бацькоў дастанецца і сыну, то ў маці, як кажуць, зуб загарэўся. Такога жаніха не выпусціць з рук!

Неўзабаве маці прывяла Ліку. І дзядзька растлумачыў пляменніцы, хто такі Толя, што яго чакае, а з ім і яе. Ліка хоць і была з вецярком у галаве — весялуння, спявачка, плясуння, але як і большасць у іхняй сям'і валодала практычнасцю, здаровым сэнсам. Адразу сцяміла ўсю выгаду такога шлюбу. Ды і жаніх, дзякуй Богу, не зломак, не недарэка — хлопец што трэба! Ва універсітэце не адна заляцаецца! І натуральна, што Ліка ўчапілася ў свайго Толю, што клешч. Не на крок не адпускала. Усё лета вазіла яго ў сваю ягадную і грыбную вёску. І дазволіла яму тое, што нікому да яго не дазваляла. І гэтым прывязала яго, хлопца чыстага і сумленнага, так трывала, што адвязацца ён ужо не мог. Ды і не хацеў. Бацька запярэчыў было супраць ранняй яго жаніцьбы, але ўбачыў Ліку — і лёгка здаўся. Ліка ўмела заваражыць.

...Вікенцій Паўлавіч, убачыўшы такую плойму гасцей, спалохаўся аднаго: замучаюць просьбамі.

Яго акружалі, адразу ўтварыўся натоўп, калі ён цалаваўся з цёткамі, сёстрамі, швагерамі, вітаўся з пляменнікамі. Але дзіўна — ніводнай просьбы. Далікатныя людзі сяляне. Інтэлігенты не ўтрымаліся б — лезлі б што мухі на мёд. А вось гэтыя людзі прагна слухаюць, што ён кажа, смяюцца з яго жартаў, жартуюць самі, але ведаюць парадак і прыстойнасць: вяселле не для вырашэння сур'ёзных спраў, не для скаргаў сваіх на цяжкае жыццё.

Увайшлі ў прасторную залу сталоўкі, калі маладыя стаялі за сталом, у поўнай шлюбнай красе, па грудзі прыкрытыя букетамі руж. У Вікенція Паўлавіча ажно дух заняло. І зноў, як у царкве, ён адчуў сябе новашлюбным і зноў моцна сціснулася сэрца з-за здрады сваёй Машы. Яе захапіла свацця. Але ён падышоў да яе, сказаў нявесцінай маці з гонарам:

— Ну, як нашы маладыя, Вера Пятроўна?

— Ой, Паўлавіч! Не кажыце! Мая — каралева. Але ж і ваш прынц. Хоць ікону з іх пішы.

Узяў Марыю Іванаўну за руку і, як маладую, павёў да «прэзідыумнага» стала, за якім стаялі маладыя.

Першы тост сказаў сам гаспадар, без філасофіі:

— За шчасце маладых!

— Каб яны будаваліся, але не перабудоўваліся. Жылі без рэзкіх паваротаў, на якіх можа моцна занесці. Куляйцеся толькі ў ложку, — дапоўніла яго свацця.

Не такі ўжо дасціпны жарт, але госці весела рагаталі і пляскалі.

Сяляне казалі тосты кароткія і шчырыя. І хоць Іван Залоза абвясціў, што будзе каравай, — ён самазвана захапіў ролю тамады — некаторыя жанчыны падносілі падарункі тут, за сталом.

Прыйшлося змірыцца з прысутнасцю Івана Залозы, больш таго, прызнаць, што ён вельмі неабходны, бо дзве трэці гасцей — па нявесцінай лініі, а Залоза ведае іх, а каго з маладых не ведаў, яму падказвалі — хто, чый, і ён уміг арыентаваўся. Сам Іван закаціў тост хвілін на дзесяць. Даклад аб ролі сям'і ў новым грамадстве, пра абавязкі жонкі перад мужам, мужа — перад жонкай. Але слухалі яго ўважліва, хоць ужо і былі на падпіцці.

Калі на краю стала, дзе сядзелі самыя маладыя, два хутка ап'янелыя студэнты пачалі разборку і схапілі адзін аднаго за грудкі, падняліся тры атлеты ў аднолькавых сініх касцюмах і вывелі пеўняў праветрыцца пад асенні дождж.

«Іван прадугледзеў», — падумаў Вікенцій Паўлавіч і адчуў нават удзячнасць кіраўніку справамі і сябру за яго ўважлівасць і прадпрымальнасць: нічога не забывае.

Добра скончылася вяселле. Усе засталіся задаволеныя. Зацалавалі і маладых, і іх бацькоў. Ды і паміж сабой госці перацалаваліся, нават тыя, хто дома, у вёсцы, можа, і не вітаўся.

Марыя Іванаўна радавалася не толькі таму, што сын ажаніўся з простай дзяўчынай, што вяселле згулялі палюдску, але і свайму самаадчуванню: вельмі нялёгкі дзень — колькі клопатаў, хваляванняў! — аднак за чатыры месяцы пасля аперацыі яна бадай ніколі не адчувала сябе такой здаровай, бадзёрай, вясёлай.

Вярнуліся апоўначы. Раздзяваліся, ходзячы на насочках, перагаворваліся шэптам — каб не патрывожыць сон маладажонаў. Ды і Таня ўжо даўно прыціхла ў сваім пакойчыку.

Ляглі кожны на сваім ложку. Сцішыліся. Колькі хвілін пракручвалі, як па відэамагнітафоне, падзеі памятнага дня. Але ў хуткім часе за сцяной заскрыпеў ложак.

Марыя Іванаўна шчасліва засмяялася амаль на поўны голас.

— Чуеш, дзядуля? Мы ж таксама абвянчаліся сёння.

Вікенцій ахвотна перабраўся пад жончыну коўдру і ўпершыню пасля доўгага перапынку ён не думаў ні пра каго іншага — толькі пра жонку. Гэта стала яшчэ адной радасцю дня. І ён загадаў сабе: «Усё! З Аняй — усё».

## 8

У трэці раз у прыёмную прыйшоў стары чалавек з сівой бародкай, інтэлігентна апрануты, ціхі, ветлівы, але настойлівы. Яму

трэба да старшыні. Ганна Фядосаўна растлумачыла, што старшыня прымае па асабістых пытаннях адзін раз у тыдзень — па пятніцах.

Стары прыйшоў у панядзелак. Ветліва растлумачыў:

— У мяне не асабістая просьба. У мяне — дзяржаўная справа. Хачу засцерагчы старшыню ад сур'ёзнай памылкі.

Вікенцій Паўлавіч знаходзіўся ў будынку саветаў, але праводзіў нараду з кіраўнікамі гарадоў і гарадскіх пасёлкаў у зале пасяджэнняў. Нарада зацягнулася.

Стары цярпліва чакаў.

Ганна Фядосаўна пашкадавала яго, растлумачыла, што пасля нарады ў многіх мэраў абавязкова знойдуцца пытанні, якія патрабуюць тэрміновага рашэння тут, у кабінеце.

Стары цяжка паўздыхаў і мусіў пайсці.

І вось ён зноў тут. А Вікенція Паўлавіча няма — у раёне.

— А ў мяне ножкі баляць, каб часта хадзіць. Сёння ліфт не працаваў. Бачу, вы добрая жанчынка. Я вам даручу пісьмо на імя старшыні. Але з адной умовай, і вы паабяцаеце, што выканаеце яе: не распячатваць канверт.

— Мой абавязак — раскрыць. А можа, у канверце — Бог знае што.

— Бомба? Я падобны да тэрарыста? — стары дробненька засмяяўся. — Я, мілая жанчына, якраз ахоўнік парадку... Ну што ж, прыйду яшчэ раз, — і цяжка, з дапамогай кіёчка, падняўся з крэсла.

Ганне стала шкада старога.

— Добра. Абяцаю вам не раскрываць.

Гадзіны дзве трымалася, гатовая выканаць абяцанне. Але жаночая цікаўнасць нарастала: што там? А дадзенае слова яна ніколі цвёрда не трымала. Ганна зачынілася ў кабінеце і не разрэзала канверт, а расклеіла, нагрэўшы над настольнай лямпай.

Пісьмо ашаламіла жанчыну. Сэнс яго: ці ведае губернатар, ці ведае змагар з карупцыяй і махлярствам (так, маўляў, ён кляўся пры выбарах — што прысвеціць усю сваю энергію барацьбе з хабарніцтвам, парушэннем законнасці), што яго акружаюць зладзеі, хапугі, казнакрады? Галоўны сярод іх — Залоза. Прыводзілася некалькі фактаў, якія хабары Іван узяў за адвод зямельных участкаў, за прыватызацыю базы за мізэрную суму. Як разам са сваім сябрам, упраўляючым банкам, яны прысвоілі мільярды рублёў, адпушчаныя мінфінам на падтрымку сельскай гаспадаркі, на ўборку збажыны, бульбы, кармавых, пракруцілі сумы праз банк, працэнты налічылі «Сельгасбуду», праз гэты трэст безнаяўныя грошы ператварылі ў наяўныя, і наяўнасць гэтая паплыла... Каму — няхай разбяруцца рэвізоры,

следчыя пракуратуры. У асабістай гутарцы, калі старшыня прыме яго, стары гатовы даказаць дакументальна, што Залоза, Падбярозскі і яшчэ колькі чалавек з іх кампаніі маюць валютныя рахункі ў маскоўскіх і кіеўскіх камерцыйных банках. Не выключаецца, што маюць і ў швейцарскіх, але гэтага ён, выкрывацель, на жаль, даказаць не можа.

Вось такое пісьмо на тры старонкі машынапіснага тэксту.

У першыя хвіліны Ганна Фядосаўна адчула зларадпасць: «Я даўно знала, што ты жулік, Ванечка. Ты і мяне хацеў уцягнуць у аферу, шпёнкай зрабіць. Чаго захацеў! Каб я ўсё даносіла табе — кожнае пісьмо, кожную размову. Не на дурную натрапіў. Ты мог спакусіць мяне, слабая я. Але каб красці разам з табой... Не! Капейкі чужой не прысвоіла». Але тут жа яе апанаваў страх: а калі перадаць Вікенцію — што будзе? Калі дакажуць хоць частку таго, што ў пісьме, — турма Івану. А ў турму яна нікога не хацела садзіць, тым больш свайго былога каханка. Але, пазнаўшы характар губернатара, не сумнявалася: што-што, а такога нахабнага хапання Вікенцій Паўлавіч не толькі сябру не даруе — брату роднаму, сыну. Да турмы, можа, ад дабрыні сваёй і не давядзе, але з працы пагоніць з трэскам ці хутчэй без трэску — ціха. Каб яна была ўпэўнена, што толькі з працы Іван паляціць, пісьмо сёння ж лягло б на губернатарскі стол. Залоза ў якасці непасрэднага начальніка не падабаўся ёй напамінкамі пра мінулую сувязь, беспардонным штурханнем у абдымкі другога мужчыны, быццам яна ўласнасць яго, рабыня, наложніца, патрабаваннем даносіць яму аб усіх дзеяннях, словах, пісьмах Вікенція.

Што ж рабіць? Стаіць пісьмо і ад аднаго, і ад другога? А калі гэты ўпарты стары праб'ецца да губернатара, спытае пра сваё пісьмо?

Прачытала пісьмо яшчэ раз. І раптам заўважыла: не арыгінал — ксеракопія. Не аддаў стары арыгінала. Чаму? Не даверыў? Але калі копія, то іх можа быць колькі трэба.

На сваім ксераксе зрабіла яшчэ дзве копіі.

Два дні вырашала, што рабіць з пісьмом. Рэдка з мужам раілася па службовых справах, а тут не вытрымала — расказала пра пісьмо. Панцеляймон яе — чалавек добры, мяккі, але бесхарактэрны. Ён доўга і шумна абураўся:

— Во зладзюга! Во бандзюга! А такі ж прынцыповы быў. А цяпер сам мільярды хапае. Расстраляць мала сукінага сына! Не я пракурор. Я закаціў бы яму...

Але Ганна добра ведала свайго мужа.

Ён выпусціў пару, астыў і застаўся верным псіхалогіі прыстасаванца.

— Але чорт з ім, Аня. Не адзін ён крадзе. І не нам яго судзіць! Да нас ён заўсёды быў добры.

«О Божа! — ледзь не застагнала Ганна. — Ведае ж гэты атопак, што я была любоўніцай яго. І тады... толькі аднойчы п'яны даў мне тумака. І цяпер усё даруе — за пасаду, якую атрымаў, за кватэру... Праклятае жыццё!»

— Пакажы яму пісьмо. Няхай ведае нашу ўдзячнасць. Закінь, як кажуць, наперад. Такі гад заўсёды будзе ва ўладзе. Калі захоча, і Вікенція спіхне.

Згадзілася пісьмо паказаць. Івану. А Вікенцію? Зусім не аддаваць? Не, нельга. Стары не супакоіцца. А падстаўляць сябе пад удар няма за што. І зноў думала колькі дзён, ажно пакуль стары не з'явіўся зноў. На шчасце, губернатара сапраўды не было ў кабінеце.

— У вас там у пісьме адраса няма. Дайце адрас, тэлефон. Мы вас паклічам.

Але стары адрас не даў. Баіцца? Каго? Няўпэўнены ў сваіх звестках?

Паказала пісьмо спачатку Івану, як параіў муж.

Залоза сеў каля яе стала, пачаў чытаць.

Ганна пільна сачыла за выразам яго твару. Здзівілася: якія нервы аднак! — ніводзін мускул не ўздрыгнуў, толькі разы тры ён зняважліва хмыкнуў.

Скончыў чытаць, узняў вочы на сакратарку, і вочы яго спалохалі жанчыну — яны гарэлі гневам.

— Не паказвала?

— Не.

— А чаму ксеракопія? Копій нарабіла?

— Стары даў такое — копію.

— Хто ён, стары?

— Адрас не пакінуў. Подпіс ёсць, разборлівы.

— Дык не паказвала?

— Іван! Я буду маніць табе?

— Ну, дык я сам пакажу, — і хутка падняўся з крэсла з пісьмом у руках.

— Ты пойдзеш да самаго? Ты падвядзеш мяне...

— Не бойся... Я не падвяду цябе. Я скажу, што ты пры мне раскрыла канверт і пакуль раскрывала іншыя, я пацікавіўся гэтым пісьмом. І натрапіў на данос на сябе. Усё гэта, Аня, паклёп чысцейшай вады. Я знаю, хто яго сачыніў. Мой даўні «сябра». Вікенцій ведае яго, па почырку пазнае, — і накіраваўся ў кабінет губернатара.

— Зараз у Ганны перахапіў пісьмяцо адно. Падкінуў ёй нейкі стары. Не ёй — табе. Чытай і... радуйся.

Вікенцій Паўлавіч сеў за стол і чытаў павольна, уважліва. Залоза глядзеў на яго гэтак жа пільна, як перад тым Ганна на яго, і яму не спадабалася гэтая павольнасць і сур'ёзнасць — ажно вуснамі варушыць, быццам хоча вывучыць на памяць, і ніводнай усмешкі, ніводнага скептычнага хмыкания. Не даў яму дачытаць да канца. Выгукнуў абурана:

— Бачыў ты падобны паклёп?! Лухта несусветная! Яўна почырк Карлюка, майго даўняга «прыяцеля». Ён увесь час закідваў сваімі пісьмамі пэўныя ўстановы. Потым дзесьці знік, маўчаў. Але жывы курылка! Жывы! Вылез. Цяўкнуў з падваротні. Цяпер чакай, закідае і цябе пісьмамі. Рыхтуй камісіі!

Вікенцій Паўлавіч маўчаў, сур'ёзны, задумлівы. Перагортваў лісткі пісьма, як шукаў там нечага. Гэтая яго задумлівасць і такая ўважлівасць да пісьма спалохалі Залозу, які нічога і нікога не баяўся, які ў блізкім коле сваіх людзей, з Андрэем Падбярозскім, Мішам Палавінкам, пад чаркай хваліўся, што ён самаго бога трымае за бараду. А тут раптам адчуў, як пахіснулася яго ўпэўненасць, як сціснулася, стаілася сэрца, а потым грукнула так, што балюча зрабілася. Трэба наступаць!

Лепшая абарона — наступление. І ён закрычаў:

— Ты чаму маўчыш? Надзьмуўся, ажно губы пастель.. Ты што, паверыў чаму-небудзь з гэтага шызафрэнічнага трызнення?

— Не, не паверыў.

— Дзякуй Богу. Я знаў, што ты не паверыш! Знаў! Ганне не даў пісьма прачытаць! Да цябе кінуўся. Хіба ты не знаеш Івана Залозу?! Больш вернага памочніка ў Цябе няма! Канечне, былі грахі. Баб любіў. Чарку любіў. Але піў за свае. Пачастунак толькі ад блізкіх людзей прымаў. Але каб хабар!.. Ды я павесіўся б, каб хабар узяў!

Вікенцій Паўлавіч маўчаў. Але праніклівы Залоза

бачыў, адчуваў, што не яго слухае ўважліва — сваё думав. А якія гэта думкі? Што ў яго галаве?

— Не падабаецца мне, Віця, тваё маўчанне. Не сяброўскае яно. Чалавек, якому я душу аддаў, не павінен так маўчаць!

— Я веру табе, Іван. Але мяне трывожыць, што прыходзяць такія пісьмы. На нас з табой такіх памыяў не павінны выліваць!

— Ды хіба карлюкам забароніш? У газетах вунь што плявузгаюць! На прэзідэнта. Дык што ўжо казаць нам, грэшным? — Залоза прыкінуўся сіратой, ажно голас задрыжэў. — Звярні ўвагу: ксеракопія. Значыцца, арыгіналы пасланы вышэй. Будзеш мець задаваль-

ненне чытаць. Але настройся, Віця, на адпор! Не аддай свайго лепшага сябра на заклание.

— Не аддам. Спі спакойна.

— Папрашу Ганну зрабіць копію для мяне. На пенсію пайду — унукам пакажу, каб разам пасмяяцца.

— На пенсію разам пойдзем. І разам будзем смяяцца.

— Змрочна жартуеш, Віця: у сорак тры на пенсію. Пенсіянеры не смяюцца.

— Яшчэ як смяюцца. Анекдоты ў газеты прысылаюць выключна пенсіянеры. Спытай у рэдактара.

Іван выскачыў у прыёмную вясёленькім, нават Ганна не часта бачыла яго такім, хіба на добрым падпіцці. Сумна падумала: «Пераканаў Вікенція. Гэты сатана любога ачаруе, заварожыць».

— Зрабі, Анюта, копію гэтага гістарычнага дакумента, буду ўнукам паказваць. Прыклад чалавечай няўдзячнасці: як святога чалавека могуць зрабіць злодзеем. Шчасце наша з табой, Аня, што губернатар разумны чалавек. Слава яму!

А між тым губернатар быў моцна ўзрушаны. Пры кіраўніку справамі не паказаў сваёй узрушанасці. А калі Залоза выйшаў, усхвалявана падняўся, прайшоўся па кабінеце, задумліва пастаяў каля акна, гледзячы на пустую плошчу. Сцямнела. Ішоў дождж са снегам. Ён сапраўды не верыў, не хацеў верыць таму, што ў пісьме. Страшна расчаравацца ў блізкім чалавеку. Але разам з тым не адмаўляў старое народнае прыслоўе: не бывае дыму без агня. Ды і раней даходзілі, глуха, праўда, чуткі пра банкаўскія махінацыі.

Узнікла безліч пытанняў. Ганна... Як пісьмо апынулася ў Івана? Ён кажа: пры ім раскрывала, і ён заглянуў, убачыў сваё прозвішча. Як яна магла не выканаць патрабаванне кіраўніка справамі паказаць яму? Няма такой інструкцыі ні пісьмовай, ні вуснай, праз яго ідзе сакрэтная перапіска. Усё так. Акрамя дробязі: пошта, акрамя спецыяльнай, ніколі не прыходзіць у канцы дня. Значыцца, Ганна паказала пісьмо раніцою Залозе першаму. І не сказала на працягу дня свайму непасрэднаму кіраўніку. Чаму? Пабаялася, бо пісьмо захапіў Іван, цэлы дзень вывучаў, выпрацоўваў тактыку. І выпрацаваў... Ход нечаканы і смелы. На што разлічваў? Ашаламіць губернатара. Паказаць, што ніякіх даносаў не баіцца, бо не адчувае за сабой ніякай віны.

«Ой, ці так, Іване? А можна ж прачытаць тваё залішне смелае дзеянне інакш: спалохаўся ты, моцна спалохаўся. І акрамя выкліка: «Нікога не баюся! Чысты я і бязгрэшны, што дзіця!» — было жаданне, народжанае страхам: найхутчэй паглядзець на маю рэакцыю. Чакаў, што я паляпаю па плячы: «Нічога, Ваня, не бойся! Я веру табе, як

самому сабе». Я сказаў, што веру яму. Але па плячы не паляпаў. Я сказаў, што мяне трывожаць такія пісьмы. Іх было нямала. Не пра цябе — пра раённых, гарадскіх кіраўнікоў. І пра Падбярозскага было. Карупцыя праела людзей, што іржа. Што зрабілася з людзьмі? Калі і ты, Іван, туды ж — літасці ад мяне не чакай. Тваё дзеянні з кватэрай, з вяселлем мне не спадабаліся. Я даў табе па носе. Але то была сяброўская пстрычка. Калі ж хоць частка фактаў гэтага пісьма пацвердзіцца, я не пстрычку табе дам, а садану з усёй сілы».

Адарваўся ад акна. Зноў пахадзіў па кабінеце. У прыёмнай стукала машынка, як сігнал: «Я тут», хаця рабочы дзень даўно скончыўся.

Раней ён нярэдка сам выходзіў у прыёмную ўзяць патрэбную паперу. Прыемна было лішні раз паглядзець на сваю эфектную каханку, ад якой патыхала дарагімі духамі і... заклікам. Калі ў прыёмнай нікога не было, дакранаўся да яе пляча, рукі і такім чынам «заводзіў» сябе на вячэрні сеанс.

Пасля сынавага вяселля, пасля таго як у царкве перад іканастасам, перад маладымі і Машай даў сабе абет, ён стаў баяцца Ганны, пазбягаў заставацца з ёй адзін на адзін, бо ведаў, што немінуча прыйдзецца тлумачыць свае паводзіны. А гэта, разумеў, вельмі і вельмі нялёгка.

У прыёмную не выходзіў. У кабінет клікаў па селектары тады, калі там нехта быў. Трэба сказаць, што і яна вытрымлівала характар, не навязвалася, працу пакідала «па званку», перад тым, як пайсці, нязменна пытала па селектары:

— Я вам не трэба, Вікенцій Паўлавіч?

А сёння вось сядзіць. Так доўга робіць копію для Івана? На гэта хопіць адной хвіліны. Самаго Івана не чуваць — падыходзіў да дзвярэй, слухаў: толькі стук машынкі.

Але чаму не нясе пісьмо? Трэба прачытаць яго яшчэ раз. Удумліва, у адзіноце, пры такім чытанні можна вычытаць не толькі тое, што начыркана шарыкавай ручкай, але і тое, што стоена паміж радкамі. Папрасіў па селектары:

— Ганна Фядосаўна, дайце мне гэтае пісьмо. Пачуў, як яна падскочыла ад машынкі — ажно грукнула крэслам. Але пісьмо не прынесла ў той жа міг, вытрымала колькі хвілін.

Пачціва, як новенькая супрацоўніца, палажыла на стол зялёную папку з грыфам «На подпіс».

— І што мне падпісаць? — усміхнуўся Вікенцій Паўлавіч. — Як у добрую даўнасць прапісаў бы я чыноўніку Залозе штук трыццаць губернатарскіх бізуноў. Крадзі ў меру!

— А думаеце, краў?

— Іван? Я сказаў, што веру яму. А выйшаў ён, і апанавала мяне сумненне. Гэта ж эпідэмія, Аня! Крадзёж, хабарніцтва... Хапугі загубяць дзяржаву.

А жанчыну ўсхвалявала не тое, што ён сказаў, а толькі адно слова, зварот да яе: Аня. Зварот блізкага чалавека. Адчула, што моцна загрукала сэрца, як у дзяўчыны, якая прыйшла на першае спатканне. Спачатку пачырванела, потым пабляднела. І калі ён схіліўся над пісьмом, шэптам спытала:

— Віця! Як разумець твае паводзіны? Канец любві нашай?

Ён узняў галаву, уважліва і шчыра паглядзеў у яе вочы і таксама па-юнацку пачырванеў. Выйшаў з-за стала, мякка ўзяў яе за плячо, пасадзіў у крэсла для наведвальнікаў, сам сеў насупраць.

— Аня, паслухай мяне і зразумей. Ты разумная, добрая. І я люблю цябе, я ўдзячны табе за радасць, якую ты мне дала. Але паслухай і не смейся. Я раскажу табе, што са мной адбылося... — і ён прыгадаў вяселле сына. — Мне стала раптам балюча, сорамна, што я, сталы чалавек, бацька, хутка дзедам стану... людзей збіраюся выхоўваць, моладзь... А сам... сам чым займаюся?! Ну, каб не любіў я Машу, каб разлад... дык не ж... люблю яе, удзячны ёй... Адным словам, перажыў я... ачышчэнне ці што?.. Я атэіст, але ў царкве перад Ісусам Хрыстом, перад усімі святымі слова даў: не грашыць! Табе смешна?

— Не, не смешна. Я сама аднойчы перажыла нешта падобнае. Не ў царкве, праўда. Але ў мяне не хапіла сілы волі. Слабая...

— Дык ты разумееш?

— Я разумею цябе... разумею.

— Дзякуй табе.

Ганна паднялася, за ёй — ён. Стаялі твар у твар, вінавата і сумна ўсміхаліся.

— Дзякуй за радасць...

— Дазволь мне... пацалаваць цябе ў апошні раз.

Ён не адступіў. Яна кінула яму рукі на плечы, зусім зблізку паглядзела ў вочы, потым сціснула далонямі яго галаву і... пацалавала не ў вусны, а ў вочы, як малога.

Вікенцій Паўлавіч рэдка расказваў жонцы пра свае службовыя турботы — хапае ў яе сваіх, сямейных, хатніх. На шчасце, нявестка не белаплучка, добра памагае па гаспадарцы: ні Толя, ні Таня не застаюцца без снедання. Марыя Іванаўна з лёгкай душой пайшла на працу ў бальніцу і адразу ажыла пасля хваробы і аперацыі. І гэта надало душэўную раўнавагу не толькі ёй, але і яму, асабліва пасля пакаяння, якое адбылося ў царкве пры вянчанні маладых. Цяпер яго не трывожылі ніякія згрызоты сумлення. Ён ачысціўся перад Машай

— самае галоўнае, і калі ўжо сталі вернікамі ўсе былыя атэісты, то можна лічыць, што і ён пакаяўся перад Богам.

Машы ён не толькі расказаў пра пісьмо, але і паказаў яго, што рабіў рэдка — не прыносіў дакументы дадому.

Маша чытала доўга, як малапісьменная. А ён сачыў за выразам яе твару — як ён зменьваўся з кожнай хвілінай: ад цікаўнасці да адбітку страху. Чаму страху? Якія асацыяцыі яе палохаюць?

— Верыш... наконт Івана?

Яна адказала не адразу, кусала ніжнюю губу.

— Веру.

— Калі ты верыш, што ён злодзей, ты не можаш не жадаць яму кары. Во і парай: якой кары заслугоўвае чалавек, якога я лічыў сваім сябрам і верным памочнікам?

Маша задумліва маўчала, на твар яе ўпаў цень, вусны перасмыкнуліся.

— Чаму ты маўчыш?

— Віця... мне страшна. Заб'юць яны цябе. Вікенцій Паўлавіч сарваўся з канапы і пайшоў у дальні кут пакоя, адтуль сказаў:

— Ну, гэта ўжо глупства. Каму я патрэбны!

— Губернатар мой дарагі! Ты як на небе жывеш. Паглядзі, што робіцца вакол!

— Але ж мы гаворым не пра бандытаў. Пра сяброў.

— З чаго пачынаюць бандыты? Калі твой Іван разам з Андрэем укралі хоць дзесятую долю таго, пра што і піша гэты чалавек, то твае найлепшыя сябры не спыняцца ні перад чым, калі ты кранеш каго з іх хоць мізінцам.

— Не наганяй страху. Я не палахлівы. Каго і чаго я баяўся калі-небудзь? Можна палічыць ананімкай і выкінуць на сметнік. Але я так не лічу. Я павінен дакапацца да ісціны. І ты мяне не спыняй. Ты заўсёды натхняла мяне.

Марыя Іванаўна цяжка ўздыхнула. Размову перапыніла Таня: вылецела са свайго пакоя вясновым ветрам.

— Рашыла! Рашыла! Сама! Задачу па трыганаметрыі. Тата! Мама! Перад вамі — Соф'я Кавалеўская!

Кадравыя пытанні ўзнікалі часта. Але спраўляўся з імі губернатар без рашучасці, бо мала што вырашаў адзінаначальна — раіўся з намеснікамі, памочнікамі; найперш з Іванам Залозам. І калі той ухваляў, справа вырашалася з зайздроснай аператыўнасцю. А вось калі Іван выказваў нават сумненне ў мэтазгоднасці кагосьці вызваляць... Самае цяжкае было зволіць чалавека, а назначыць — шмат працей.

Не падабалася дзейнасць пракуратуры: злачыннасць расце не па днях — па гадзінах, міліцыя дае высокі працэнт выкрыцця, а ў пракуратуры месяцамі ляжаць справы.

Меў нялёгкую размову з пракурорам Якавам Талочкам. Атлусцелы, з цяжкай задышкай вартавы законапарадку выціраў пот і ўздыхаў, як апоены конь. Не вельмі нават адбіваўся, ва ўсялякім разе крытыку прымаў, валіў усё на намеснікаў: маладыя гультаі! Калі верыць яго шчырасці, то не вельмі і за сваё высокае крэсла трымаўся, гатовы перайсці на спакайнейшую пасаду, толькі каб не намнога ніжэйшы аклад: сям'ю трэба карміць: позна ажаніўся, дзве дачкі школьніцы яшчэ, а сын — інжынер на заводзе, паўгода зарплаты не мае.

Шкада стала чалавека. Аднак цвёрда вырашаў замяніць на маладзейшага, тым больш што меў кандыдатуру. Працаваў у суседняй вобласці раённым пракурорам яго аднавясковец Алег Пакумека, маладзейшы за яго гадоў на сем. Алег быў з унікальнай, славутай сям'і. У вёсцы з даўніх часоў гаварылі пра гэтую сям'ю, што такіх сумленных людзей не толькі ў іх раёне няма, але, можа, і ва ўсёй Беларусі. Пра іх сумленнасць хадзілі легенды. Быў галодны год, а на гародзе знесла яйка курыца суседкі, і галодныя малыя прынеслі тое яйка цётцы Хадоры. З Маняй Кумекай, Алегавай маці, бабы на калгаснае поле на праполку не хацелі хадзіць: не давала пасядзець лішнія дзесяць мінут. «Бабачкі, пасядзелі — і хопіць, за работу пара, вунь колькі іх, бурачкоў, палоць!» Сярод вяскоўцаў, сталых і малых, была нават гульня: хто ўспомніць хоць адзін выпадак, каб хтось з Кумекаў зманіў, ці нешта стаіў; ніхто не мог успомніць.

І вось чалавека з такой сям'і хацеў узяць губернатар на працу.

Пазваніў генпракурору. Той згадзіўся, што Талочку трэба перамяшчаць. Пакумеку не помніў, але праз тыдзень, навёўшы даведкі, згадзіўся, што кандыдатура добрая.

Калі Вікенцій Паўлавіч сказаў пра гэта Івану, той пазеляне́ў і пайшоў у наступ, як рабіў гэта нярэдка, карыстаючыся правам сябра:

— Ты што, з глузду з'ехаў? Такімі кадрамі, як Талочка, не раскідваюцца. Гэта зубр! Зубр! І не стары яшчэ! Усё, давай паставім кропку: Талочку не чапаем! А Кумеку свайго вазьмі на горад: Кузьмянёва трэба ў шыю гнаць.

— Чаму табе не падабаецца Кузьмянёў?

— Задавака. Свістун. З сур'ёзнымі людзьмі гаворыць, як з дзецьмі: адзін ён вырас, усе астатнія яшчэ пад стол бегаюць.

— І з табой так гаварыў?

— Паспрабаваў бы! З усіх пракурораў я баюся аднаго — жонкі, — Залоза весела засмяяўся. — Значыцца, дамовіліся? Зубр застанецца ў нашай пушчы.

Вікенцій Паўлавіч уздыхнуў; для Залозы гэта быў знак: кропка пастаўлена.

Але на гэты раз губернатар не скарыўся перад напорыстасцю свайго кіраўніка справамі. Ад Талочкі дамогся заявы аб вызваленні па ўласным жаданні — сам завёз заяву генпракурору. Разам з ім падрыхтавалі праект указа прэзідэнта аб вызваленні Талочкі і аб прызначэнні пракурорам вобласці Пакумекі Алега Піліпавіча. Залоза, прачытаўшы ўказ у газеце, злаваў страшна, якіх толькі слоў не кідаў у адрас сябра. Але прыйшоў да яго ў кабінет — і ні слова аб назначэнні, а Вікенцій Паўлавіч чакаў грому і маланкі. «Няўжо не прачытаў? »

Ды не, Залоза ведаў. Ведаў даўно — ад Талочкі, змешваў таго з гразёй, што ён напісаў па ўласным жаданні: баязлівец, дэзерцір, у кусты хаваецца! Абурэнне сваё губернатару выявіў на гэты раз зусім інакш — паслужбоваму: быў пачцівы, ветлівы, захоўваў субардынацыю: «Ты мяне не слухаеш, і я табе не сябра».

Вікенцій Паўлавіч прачытаў падтэкст; насцярожыўся, але разам з тым бадай весела падумаў: «Пачакай. Заўтра-паслязаўтра я паднясу табе яшчэ адзін сюрпрыз».

Рабіла ў апараце выканкама намесніцай начальніка фінансавага ўпраўлення жанчына з ласкавым прозвішчам Калінка. Сумленнасць мела Івона Багданаўна кумекаўскую, характер — незвычайны па прынцыповасці і смеласці. Многія лічылі яе склочнай, няўжыўчывай, сварлівай. Не ў кабінеце, не ў жаночай прыбіральні, а на любой высокай нарадзе яна магла разнесці ўшчэнт кіраўніка любога ранга — ад свайго начальніка да губернатара. У кіраўніка справамі былі з Івонай складаныя адносіны. Іван колькі разоў падгаворваў губернатара вызваліцца ад яе.

І таму назначэнне Калінкі старшынёй народнага кантроля ашаламіла Залозу. А тое, што сябра зноў не параіўся з ім, спалохала. Каб насаліць Вікенцію, напісаў заяву «па ўласным жаданні». Але хутка астыў, падумаў са злосцю, што губернатар толькі гэтага і чакае. Дык не дачакаецца! Здзівіў Вікенція тым, што нават не заікаўся пра гэтае сенсацыйнае назначэнне.

Таго пісьма Калінцы не паказаў. І пра Залозу, якому адводзілася ў пісьме нямала месца, ні слова не сказаў. Гаварыў толькі пра тое, што да яго даходзяць нараканні на банк і канкрэтна — на яго ўпраўляючага Падбярозскага. Івона Багданаўна расказала яму пра банк, а ведала яна многа. Выходзіць, усё фінансавае ўпраўленне

валодае фактамі. І маўчаць? Чаму маўчаць? Вікенція Паўлавіча гэта ўзлавала. Папракнуў Івону:

— Ад каго ад каго, а ад вас не чакаў прынцыпа «мая хата з краю».

Яна адбіла папрок:

— Дрэнна вы слухалі, Вікенцій Паўлавіч. Помніце маё выступленне следам за Дубадзелам? Падбярозскага не назвала? Дык таму, што ўсе лічаць яго вашым сябрам.

— І што, я ў гэтай кампаніі?

— На вас пальцам не паказваюць. Але аб тым, што абводзяць яны вас вакол пальца, — пра гэта шэпчуцца...

— Хто яны?

— Залоза, Падбярозскі, Чувак...

— І Чувак там?

— Больш таго — Мудроны.

Губернатар ажно застагнаў:

— Што робіцца, Івона Багданаўна!

— Ваша бяда, што вы верыце людзям.

— Ды як жа жыць без веры!

— Давярай, кажуць, але правярай, Вікенцій Паўлавіч.

Залоза прыйшоў да губернатара зялёны, у яго ўпершыню трэсліся рукі. Даўно, да выбараў, дамовіліся: выберуць, не выберуць — застаёмся сябрамі, падтрымліваем адзін аднаго і будзем шчырымі адзін перад адным; ніякай далікатнасці, а тым больш падхалімажа перад тым, хто зойме высокі пост. А калі так — то на ж табе, пантаварыш губернатар:

— На каго ты нацкоўваеш гэтую бабу? На сваіх? На тых, хто прывёў цябе ў гэты кабінет?..

— Народ прывёў.

— Што ты гародзіш, тумак! Народ! Народ прыводзіць, калі яго вядуць. З кім ты хочаш застацца? Хто цябе падтрымае? Івона? Пакумека? Ды яны цябе ў лыжцы вады ўтопяць. Думаеш, ты бязгрэшны? Бязгрэшных людзей не бывае... І на сонцы плямы ёсць. А ты — не сонца. Усіх не сагрэеш.

Вікенцій Паўлавіч абурыўся нахабствам падначаленага, няхай і сябра, але прымусіў сябе стрымацца.

— Ніяк не магу зразумець, чаму ты, Іван, так разышоўся? Я ў цябе — тумак. Не залішне? Я не паверыў таму пісьму пра цябе. Але такая балючая твая рэакцыя міжволі прымушае падазраваць, што і ты добра пагрэў рукі каля банкаўскага кастра. Зайцоў палілі ці прэзідэнтаў?

Залоза звяў і пачаў апраўдвацца:

— Я ж не ўтойваў, што зяць прыватызаваў магазін. На сябе я купіў акцыі «Белдрэва». А што, аддаваць іх хапугам? Свабодны рынак! Ён дзейнічае. І ніхто яго не адменіць — ні ты, ні прэзідэнт. Дык чаму я не маю права мець акцыі? На пасаду ў камерцыйную структуру я не пайшоў, хоць мне прапаноўвалі дванаццаць тваіх акладаў, дарагі мой губернатар. Значыцца, за доўгім рублём не пагнаўся. За грашы служыў табе верай і праўдай. А ты плюеш на старых сяброў.

— Ні на каго я не плюю. І служыш ты не мне, а дзяржаве.

— А што, дзяржава — абстракцыя? Дзяржава — гэта людзі. Мы з табой. А людзі або трымаюцца адзін аднаго, або грызуцца і з'ядаюць бліжніх сваіх...

— Злы ты робішся, Іван.

— Жыццё такім робіць. Тыя ж людзі.

— І я ў іх ліку?

— Не напрашвайся на камплімент. Я сёння сапраўды злы. Падбярозскаму шыю намыль, але справу закрый. Я ведаю, што напіша твая Івона. Помні, Віця: мы — ад но цэлае.

Заключэнне па рэвізіі, якое прынесла Калінка, ашаламіла і... спалохала.

«І гэта рабілася пад маім «мудрым» кіраўніцтвам? Божа мой!»

— Вы паказалі гэта Падбярозскаму, Івона Багданаўна?

— Не, не паказвала. Паказваюць акт звычайнай рэвізіі. А там, дзе крымінал... Пакажы — тут жа ўсе дакументы знікнуць, ніводзін следчы не дакапаецца.

— А мне што рабіць з гэтым?

— Лажыце на стол пракурору. Усё астатняе — у яго кампетэнцыі. Талочка закрыў бы, бо і ён грэшны. Што зробіць Пакумека — не знаю. А праўда, што вы з адной вёскі?

— Праўда.

— Кажуць, пра іх сям'ю анекдоты ходзяць?

— Харошыя анекдоты. Дай Бог, каб пра ўсіх такія. Пра іх сумленнасць.

— Глядзі ты! Выходзіць, яшчэ не перавяліся сумленныя людзі.

Што зробіць Алег Кумека — сумнення ў губернатара не было. Але думка, што разам з Пядбярозскім можа грымнуцца і «верны сябра» Іван Залоза, прынесла цяжкія перажыванні. Расказаў жонцы. І быў не рады, бо і яна не магла заснуць, у тры ночы разам глыталі заспакаяльнае.

У апошні дзень года Іван Залоза з'явіўся ў кабінеце губернатара вясёлы і жыццярадасны, любыя праблемы вырашаў проста, жартуючы. Прынёс апошнія зводкі гадавых вынікаў, пераважна — у сельскай гаспадарцы, прамысловасць падлічыць не паспела. Вынікі не быліасабліва радаснымі, але суцяшалі: хлеб, бульба, кармы для жывёлы будуць. Перазімуюць людзі. А гэта галоўнае. Не будуць людзі галадаць — будзе ён кіраваць, бо яшчэ на выбарчых сходах неаднойчы заяўляў: «Мэта мая — накарміць людзей. Як толькі атрымаю звесткі, што хоць у адным раёне, у адным сяле, горадзе людзі галадаюць, — тут жа падам у адстаўку. Пайду на чыгунку. Не, на рэйкі не лягу. Да універсітэта я сцэпшчыкам вагонаў рабіў. Маю прафесію!»

Яму пляскалі са смехам: свой!

Іван сказаў:

— Я табе зараз выкажу запрашэнне. Але ты дай абяцанне, што не здзівішся і не адмовішся.

— Як я дам абяцанне, калі не знаю, куды ты запросіш. А калі на гільяціну?

— Не бойся. Блізкаму чалавеку галаву не адсякаюць.

— Яшчэ як адсякаюць! Кажуць, ёсць малітва: Божа, пазбаў мяне ад сяброў, а з ворагамі я сам спраўлюся. Дык куды ты хочаш запрасіць мяне? Новы год я сустракаю ў сям'і. Да нас сваты прыедуць, твае дваюрадныя...

— Шампанскае будзеш піць дома. Мы, твая баявая каманда, вырашылі сабрацца разам... пасля выбараў не збіраліся. Недаравальна. А год быў удалым. Ёсць што ўспомніць. Усе мы разам з табой пераможцы, што там пра нас не пісалі б ананімы. Збяромся келійна, але не як змоўшчыкі — як пераможцы. Андрэй запрашае ў свой кабінет... Пасядзім, успомнім паходы, даўнія і блізкія. Калі зуб у каго ці на каго — вырвем зуб. Свае людзі! Клятву давалі...

Вікенцій Паўлавіч быў ашаломлены: запрашае Падбярозскі? З якой мэтай? Хоць Івона і не паказала яму акт праверкі, але аб выніках ён не можа не здагадвацца. На што ж разлічвае банкір? Улагодзіць яго, губернатара? Даць пераканаўчыя тлумачэнні ў вузкім коле сяброў, аднадумцаў? Можа, пакаяцца пры сведках? «Выходзіць, і я яго аднадумец? Радуйся, Віця. У гжэчнай кампаніі будзеш каштаваць заморскія віны. Аднак што рабіць? Адмовіцца катэгарычна? У адзін раз парваць усё, што звязвала нас? І адразу выдаць сваю падазронасць? Прынцыпова, але груба. Праціўніка трэба вывучаць, а тым больш тых, каго да ўчарашняга дня лічыў сваімі сябрамі,

паплечнікамі, памочнікамі. А людзі гэта недурныя. Вельмі ж цікава, які будзе іх ход. Адмовіцца ад такога псіхалагічнага эксперымента было б , проста недаравальна».

— Хто там будзе?

— Як кажуць палякі, кампанія невелька, але пажондна. Нумар першы — ты. Хачу быць другім. Але аддаю месца гаспадару, ён — банкір. Палавінка. Мудроны.

— А ён якое мае дачыненне?

— Ён наш. Гэта па нашай падказцы ён зняў сваю кандыдатуру і расчысціў завалы на дарозе.

— Ты мне адкрываеш такія тайны праз паўгода? Чаму тады маўчалі?

— Бо ведалі твой характар. Баяліся, што ты мог нешта выкінуць.

— Уяўляеш, як мне хочацца вас назваць, мае верный памочнікі?

— Называй як хочаш, мы не пакрыўдзімся — хоць гаршком, толькі ў печ не стаў.

— Падхалім ты, Іван.

— Падхалім, бо доўга быў акружаны падхалімамі.

— Такога нахабы, як ты, свет не бачыў.

— І не ўбачыць.

Залоза адчуў сваю перамогу і ззяў, што намаслены блінец. Яго ўжо мала хвалявала, што губернатар колькі хвілін ходзіць па прасторным кабінеце, па мяккім дыване яўна ў глыбокай задуме, каб утаймаваць душэўную буру, кідае ўедлівыя рэплікі. Але яны, гэтыя, можа, і непрыемныя словы, якраз і радавалі Івана Яўменавіча, бо ён добра бачыў, адчуваў, што шалі пераважваюць у бок прыняцця запрашэння.

— Службовую машыну адпускай. Паедзем на маёй. Я сам за рулём.

— Пасля стала за руль?

— Выклічам дзяжурную. А то і пехатой пройдзем, падыхаем перадснавагоднім паветрам. З Міхаілам і са мной нічога не бойся.

— Нашто цяпер ахова?

— Не ігарй героя. Нікому гэта не патрэбна. Рвуць і страляюць ад Брэста да Сахаліна.

— У нас, дзякуй Богу, ціха.

— Ціха, ціха... Не наклікай ліха! Давай збірайся, зачыняй сейф. А я праверу сігналізацыю. У навагоднюю ноч ахова будзе звышпільная. Каб ніякіх нечаканасцей.

У кабінеце Падбярозскага крэслы стаялі вакол невялікага журнальнага століка ў глухім куце паміж вялізным сейфам і старой адмысловай шафай.

Гаспадар насіў з халадзільніка, які стаяў у прыёмнай, ікру, белую рыбу, салаты, памідоры, вяндліну, сялянскае сала...

Вікенцій Паўлавіч не абедаў — пакідаў «ёмкасць» на навагодні стол, а таму зараз у яго разгарэўся апетыт. Падбярозскаму памагаў Іван. Палавінка адкаркоўваў бутэлькі; адкрыўшы «Напалеон», употай зрабіў дэгустацыю.

Вікенцій Паўлавіч не стрымаўся — пажартаваў:

— Міхаіл! Правяраеш, ці не атручана?

Палавінка не збянтэжыўся.

— Гэта ўжо рэфлекс, Вікенцій Паўлавіч, — усё правяраць.

— Здаровыя ў цябе рэфлексы. Дай Бог кожнаму.

Мудроны засмяяўся. Яны ўдвух стаялі каля стала, не занятыя ніякай працай.

— Пабудзем у стане беспрацоўных, — пажартаваў губернатар. — Як вам жывецца, Пятро Пятровіч?

— Цяжка жывецца, Вікенцій Паўлавіч. Думаў, пайду на пенсію, сяду на дачы, з унукамі буду вазіцца, мемуары пісаць. Дзе там! Сын і зяць запраглі ў фірму. Самі лётаюць па свеце, а бацьку пасадзілі ў канторы: кіруй усімі падраздзяленнямі — вопыт кіраўніцтва маеш. Маю. Але скажу табе: лягчэй было вобласцю кіраваць, там штат быў!.. А тут, лічы, адзін. І вока май пільнае: крадуць! Такія рэспектабельныя людзі, інтэлігенты... толькі міргні — з-пад цябе выцягнуць, штаны здзяруць. Трэба законы, дарагі наш губернатар! Скажы прэзідэнту: трэба законы!

— Пятро Пятровіч, а сумленне вас не грызе, што вы з прававернага камуніста так хутка перарабіліся ў перакананага капіталіста?

— Не грызе. Калі тыя, хто кіруюць дзяржавамі, уласнымі мільярдамі варочаюць, то што застаецца нам, грэшнікам? Каціцца ў кювет, у канаву? А я не хачу! Я сам яшчэ хачу жыць і пра дзяцей сваіх і ўнукаў думаю. Я пляшкі ўбачыў, і мне захацелася выпіць.

— Добра. Усе прымуць вашу філасофію. А хто будзе думаць пра бедных?

— Мы вас выбралі — вы і думайце, — Мудронаму яўна не хацелася працягваць дыскусію.

— Думаю, Пятро Пятровіч. Але з чаго памагчы? Усё расхапалі. Калі яшчэ і зямлю прадамо, то ні адзін прэзідэнт, ні адзін губернатар не накорміць народ.

Падбярозскі расстаўляў закусь, але і сачыў за размовай:

— Таварышы! Панове! Сябры мае! Давайце выкінем палітыку за акно. Кажуць, італьянцы ў навагоднюю ноч увесь хлам выкідаюць. Мудра. Хіба не так, пан Мудроны? Палітыка — хлам. Уся наша бяда ў тым, што мы запалітызаваны, як ніхто ў свеце.

— Думаеш, дзе-небудзь жывуць без палітыкі? Простаму люду, напрыклад, на Захадзе, да лямпачкі парламент, прэзідэнт, пакуль якая-небудзь палітычная акцыя не ўдарыць па кішэні. Вось тады яны выходзяць на вуліцу, патрабуюць замяніць урад. Быў я ў Францыі, Італіі. У нас любы бомж ведае пра палітыку больш, чым іх рабочы, які едзе на работу на ўласным аўтамабілі. Во калі заўтра падаражае бензін — тады на гэтую палітыку ён адгукнецца...

— Умеюць і там бунтаваць. Рэвалюцыі пачыналіся ў Францыі. У нас яны скончыліся, — глыбакадумна заключыў Мудроны.

— Вы думаеце, скончыліся? — запярэчыў Вікенцій Паўлавіч. — А па-мойму, сапраўды вялікая рэвалюцыя яшчэ наперадзе.

— Не палохай нас, пан губернатар! — гукнуў Іван Залоза.

— Ужо пара да стала! Вікенцій Паўлавіч і Пятро Пятровіч — у мяккія гнёзды, а мы ўжо на калы, як вераб'і, — «калы» — жорсткія крэслы, але з адмысловымі разнымі спінкамі.

— Губернатару — першае слова, — сказаў Мудроны.

— Не, першы скажу я, — Падбярозскі не паспеў яшчэ сесці, схапіў налітую Залозам чарку. — Не на правах гаспадара. Гаспадаром сябе не лічу. Гаспадар тут Вікенцій Паўлавіч...

Залоза, заплюшчыўшы адно вока, даў банкіру зразумець: перабор.

— Не, Іван, не перабор. Гаспадар той, каго выбраў народ. І мы яго служачыя...

— Народа, — удакладніў Вікенцій Паўлавіч.

— Так, у высокім сэнсе — народа. А ў чыноўніцкай субардынацыі — таго, хто намі кіруе. Але не збівайце мяне. Я ўмею лічыць грошы, але не вялікі мастак гаварыць.

«Грошы ты добра лічыш. У сваёй кішэні!» — падумаў губернатар, і яго раптам апанавала злосць на сябе: з-за цікаўнасці ён прыняў запрашэнне і вымушаны выслухоўваць падхалімскія словы .

— А сказаць мне хочацца. Мы канчаем год. Знамянальны год, для нас — асабліва. Мы ўсенародна выбралі губернатара. Старое слова гэтае гучыць па-новаму, бо змяніўся яго сэнс. І я ганаруся, што меў дачыненне да выбараў, памог ім чым мог.

«У першую чаргу сабе ты памагаў», — Вікенцій Паўлавіч пасміхнуўся няпэўнай усмешкай, якую Падбярозскі, відаць, прыняў за выяўленне ўдзячнасці. Ён натхніўся. Але яго ўздым сапсаваў Залоза.

— Андрэй! Не сушы нашы душы.

— Іван! Яна ў цябе даўно засохла, калі ты не разумееш важнасць моманта — што пад Новы год мы сабраліся сваёй кампаніяй — усе, хто даваў клятву вернасці, хто цягнуў выбары...

— Я не цягнуў. Я — канкурэнт, — сказаў Мудроны.

— Вы, Пятро Пятровіч, зрабілі больш за ўсіх нас, зняўшы сваю кандыдатуру.

— Усё роўна народ падтрымаў бы Вікенція Паўлавіча! — сказаў Палавінка.

— Правільна, Міхаіл Фадзеевіч. Всь пра гэта я і хачу сказаць.

— Андрэй, злітуйся. Абвяшчай тост!

— А тост можа быць толькі адзін. За нашага губернатара!

— Во гэта слова банкіра! Адчаканіў, што залатую манету. За губернатара!

— Давайце вып'ем за год, які мы канчаем далека не бліскуча, але, дзякуй Богу, не з горшымі вынікамі, чым былі да нас.

— За год, Вікенцій, мы вып'ем. А цяпер — за цябе, — падкрэсліў сваю блізкасць Залоза, здзівіўшы Мудронага, і першы звонка чокнуўся з губернатарам.

Выпілі і за год стары, і за год новы, і за ветэрана — чалавека з прозвішчам, якое найлепшым чынам характарызуе яго. І Мудроны ўзрадаваўся, што дзіця, пахвале сваім заслугам — мінулым ці сучасным? Залоза яўна меў на ўвазе новыя заслугі прэзідэнта фірмы. А губернатар думаў, што ні ў пісьме ананіма, ні ў акце Калінкі Мудроны не праходзіць, значыцца, звязаны з гэтай падазронай кампаніяй нечым іншым.

«Але ж пэўна звязаны, калі запрошаны на такую надзвычайную сустрэчу. «Гістарычную», — сказаўбанкір. — Што ж, будзем лічыць яе сапраўды гістарычнай. Аледлякагаў?»

Пасля пятай ці шостай чаркі, калі лік збіваецца, загаварылі тлумна, усе разам, не слухаючы адзін аднаго, аднак слухаючы адзінага цвярозага — губернатара.

П'яны Залоза сказаў на гэты конт:

— З табой, Вікенцій, я заўсёды баяўся піць. Як падумаеш пасля, што адзіны цвярозы слухаў нашу п'яную балбатню, не па сабе робіцца. Матка родная! Што мы маглі нагарадзіць!

Цвярозы губернатар сапраўды ўсё заўважаў. Бачыў, што шчыра п'юць і натуральна ап'янелі толькі двое — Залоза і Палавінка.

Пятро Пятровіч па ўзросце сваім піў стрымана, і яго ніхто не прымушаў. А Падбярозскі, які ў выбарчых паездках не аднойчы добра перабіраў, тут яўна манкіраваў. Пры гэтым хітрасць сваю прыкрываў

мутнай плынню слоў — тостаў, жартаў, прымавак: ніколі раней не выяўляў такой дасціпнасці.

Нарэшце Вікенцій Паўлавіч вырашыў выкарыстаць свой аўтарытэт. Падняў тост за Новы год — каб ён быў больш дабрабытны для народа... Выпіў сухое віно да дна, падняўся і сказаў:

— Ну, вось што, хлопцы, кожнаму з нас трэба яшчэ парадаваць сям'ю, павіншаваць з Новым годам. На сёння ставім кропку.

— Хвіліначку, Вікенцій Паўлавіч,— зусім цвяроза сказаў Падбярозскі. Падняўся, дастаў з кішэні звязку ключоў, адным, самым вялікім, адчыніў агромністы сейф, дастаў адтуль ладны пачак, не па-банкаўску ўпакаваны, перавязаны чырвонай стужачкай. Сказаў урачыста:

— Дарагі Вікенцій Паўлавіч! Мы, вашы сябры і памочнікі, вырашылі паднесці вам навагодні падарунак. Гэта матэрыяльная ацэнка вашых заслуг і нашай любові да вас — за тое, што вы нікога з нас не расчаравалі... Тут — дробязь. Не палічыце хабарам. Не! Гэта — вашы працэнты. На ўклад, які мы ўсе разам, усе, хто падтрымліваў вас, палажылі на ваш рахунак на выпадак другога тура галасавання. Пятро Пятровіч сэканоміў нам гэтую суму. Мы іх перавялі ў валюту.

Запанавала цішыня, здавалася, ніхто не дыхаў. Вікенцію Паўлавічу прыгадалася заключэнне Івоны Калінкі, як у банку сваім людзям завышалі працэнтныя стаўкі. Можна ўявіць, як іх завысілі губернатару — на чужыя грошы. Пралічвалі наперад.

Банкір працягваў пачак, і ў яго дрыжэлі рукі. А Вікенцій Паўлавіч палажыў свае рукі за спіну, як бы не давяраючы ім. На твары Мудронага застыла замілаваная ўсмешка, якая з'явілася разам з доларамі. Залоза і Палавінка схіліліся над сталом і выцягнулі галовы, быццам баючыся, што могуць прапусціць самае значнае. А значнае — як губернатар возьме грошы. Утварылася паўза.

Падбярозскі як бы адчуў непамерны цяжар трыццаці тысяч долараў, палажыў пачак на стол каля талеркі губернатара.

Вікенцій Паўлавіч падумаў: «Няўжо здымаюць скрытай камерай? Але дзе яна?» Здавалася, не было месца, дзе маглі б схаваць камеру.

Пачаў адсоўваць цяжкае крэсла, каб выйсці. Даючы яму дарогу, падхапіўся Мудроны. А Залоза самлела адкінуўся на спінку крэсла і глуха прапанаваў:

— Давайце хоць вып'ем аглаблёвую.

— Давайце, — згадзіўся губернатар і сам наліў сабе віна.

Выпіў і выйшаў з-за стала.

— А грошы? — шэптам спытаў банкір.

— Грошы? Завязі заўтра ў школу для дзяцей-інвалідаў, здай дырэктару. Распіску прышлеш мне.

Пайшоў да дзвярэй.

Мудроны цёр далоні.

Залоза наліў поўны бакал каньяку, залпам асушыў.

Палавінка дзіўна хмыкнуў — ці то яму захацелася засмяяцца, ці то заплакаць. Падбярозскі схапіў пачак і сунуў іх у бакавую кішэню пінжака. Глуха кінуў:

— Ідыёт!

— Хто? Губернатар? Ці сам ён?

Вікенцій Паўлавіч яшчэ спаў (да чатырох гадзін разам з маладымі глядзеў навагоднюю перадачу), калі яму пазваніў Алег Пакумека і далажыў: на світанні наш кантрольны пост на ўкраінскай мяжы затрымаў машыну ўпраўляючага банкам Падбярозскага Андрэя Мінавіча, ехаў з жонкай і дачкой; у машыне чатырыста тысяч долараў, многа каштоўнасцей, пашпарты з замежнымі візамі. Падбярозскага арыштавалі, з членаў сям'і ўзялі падпіску аб нявыездзе.

Ніяк не мог уцяміць, навошта зладзею спатрэбіўся ўчарашні спектакль. Закалыхаць пільнасць хабарам у трыццаць тысяч? Зрабіць губернатара сваім саўдзельнікам? У любым выпадку план не ўдаўся, і, відаць, таму ён вырашыў збегчы.

10

Упершыню Юрка прыехаў без ахоўніка.

— А дзе Палавінка?

— Захварэў.

Пра яго хваробу адразу ж далажыла Ганна Фядосаўна.

— Міхаіл Фадзеевіч захварэў.

— І не далі падмену? Дзякуй Богу, хоць адзін дзень буду мець волю, без аховы паеду ў раён, — пажартаваў Вікенцій Паўлавіч. Хутка прагледзеў пошту — ці няма чагосьці звыштэрміновага? Выйшаў у прыёмную, спытаў у сваіх — у каго што? Некаторым назначыў час. Прыём пачаў з дальніх — з тых, хто выехаў з дому пасярод ночы — дарога зімовая, не разгонішся. Старшынь Двух райвыканкамаў прыняў разам:

— Знаю, што ў вас агульныя пытанні.

Сапраўды, у кожнага пытанняў было куча. Нялёгка разабрацца ў іх. Але трэба. Унікаў у сутнасць. Спрачаўся. Абодва кіраўнікі ўпарта трымаліся сваіх думак, ведаючы дэмакратычны характар губернатара, яго падатлівасць. Абмяркоўвалі праект закона аб мясцовых паДатках: як зрабіць іх такімі, каб стымулявалі інвестыЦыі? Пакуль

тармозяць. Ідэальна — знізіць падаткі. Але тады адкуль узяць зарплату настаўнікам, урачам, служачым?

Падчас спрэчкі зазваніў прамы тэлефон. Вікенцій Паўлавіч падняў трубку. Цішыня. Але праз хвіліну званок паўтарыўся.

— Я слухаю.

Музыка, спевы, дзіцячыя галасы.

— Я слухаю.

— Губернатар? У вашай машыне ляжыць бомба, — голас юнацкі — таго ўзросту, калі кажуць «голас ламаецца». А дыханне цяжкае, быццам той прабег па лесвіцы знізу ўгору.

— Хлопцы! Не хуліганьце! Я зараз жа вылічу ваш нумар. Мне гэта няцяжка. І дрэнна вам будзе.

Адразу адбой. Губернатар паглядзеў у мікрафон трубкі, быццам мог там убачыць таго, хто званіў. Растлумачыў наведвальнікам:

— Не хочацца час траціць. Дзеці хуліганяць. Не першы званок, што Дзесьці падложана міна. Дайшло, што эвакуіравалі пасажыраў з вакзала, студэнтаў з корпуса, хворых з аддзялення бальніцы. Дзякуй Богу, ніводная міна не ўзарвалася. Але колькі гэта каштуе нерваў ды і сродкаў.

— А цяпер дзе?

— Пагражаюць узарваць «белы дом». Не спалохаліся?

Наведвальнікі засмяяліся.

Пасля не мог зразумець, чаму не сказаў, што папярэджвалі аб бомбе ў яго машыне. Не паверыў. Якая бомба? Глупства. Гараж пад аховай. Юрка і асабліва Сцяпан не адлучаюцца ад машыны. А калі і падымаюцца ў прыёмную, то зачыняюць, і замкі ў «мерседэса» такія, што нават вопытны ўгоншчык не адразу адчыніць. Ды і хто адважыцца ўдзень на плошчы каля Дома Саветаў корпацца ў машыне губернатара?

Працягнуў размову — і забыўся на званок. Прымаў ужо другога наведвальніка, калі ў кабінет зайшла Ганна Фядосаўна і папрасіла:

— Вікенцій Паўлавіч, можна на дзесяць мінут машыну? Трэба забраць у Дыбчыка пастанову, а ён грыпуе.

— Калі ласка.

Ганна выйшла. Вікенцій Паўлавіч павярнуўся да субяседніка і нават не ўспомніў, на чым перапыніў размову. У галаве нешта спрацавала: «А калі пра бомбу праўда? Тады і яе... І Юрку...»

Падхапіўся, апантана кінуўся ў прыёмную. Ганны не было — ужо сабралася і выйшла. Выбег у калідор і пачуў знаёмы стук яе абцасаў на лесвіцы. Паімчаў следам, сігаючы праз некалькі прыступак. З марша другога паверха закрычаў:

— Аня! Аня! Ган-на!

Крычаў такім голасам, што з бліжэйшых кабінетаў выглянулі супрацоўнікі.

Яна пачула. Здзіўленая, павольна пачала падымацца наверх. Выглянула з-за паварота лесвіцы, спалохана спытала:

— Што здарылася, Вікенцій Паўлавіч? Я вам трэба?

Ён збег да яе.

— Я сам паеду. Сам!

— Да Дыбчыка?

— Не. Мне трэба!

— Вось так? Без паліто? Без шапкі? На двары семнаццаць градусаў! Што здарылася? Вы пабялелі. Няшчасце дома?

— Прынясіце мне дублёнку.

У Ганны здзіўлена расшырыліся вочы: незвычайная просьба. Чаму сам не можа падняцца на адзін паверх?

— Я пачакаю тут.

— Калі ласка.

Абцасы гучна застукалі над яго галавой. Ён падняўся следам за ёй на свой паверх і літаральна выхапіў з яе рук дублёнку і шапку. Шалік упаў на падлогу. Ён не заўважыў яго. З размаху, як робяць школьнікі, усунуў рукі ў рукавы, шапку надзеў задам наперад і кінуўся ўніз, здзіўляючы супрацоўнікаў, якія сустракаліся, неўласцівай шпаркасцю.

Іней, які казачна ўпрыгожыў дрэвы, пасерабрыў і чорны аўтамабіль. Праз таніраванае шкло ледзь прасвечваўся сілуэт шафёра. Юрка, адкінуўшы галаву на сядзенне, салодка спаў у цёплай кабіне: у яго нядаўна нарадзілася дзіця, і ён недасыпаў. Здаралася, засынаў у крэсле ў прыёмнай, і жанчыны смяяліся з яго: во напрацаваўся, нябога!

Як яго прымусіць пакінуць машыну? Сказаць, што ў машыне міна? Не паверыць, прыме за жарт.

Вікенцій Паўлавіч асцярожна адчыніў дзверку. Юрка прахапіўся.

— Прабачце. Ванька зноў не спаў усю ноч.

— Скокні, Юрка, наверх. Вазьмі ў мяне на стале жоўтую папку. Мне яна спатрэбіцца.

Юрка выскачыў з машыны і знік за параднымі дзвярамі.

Ключ застаўся.

Вікенцій Паўлавіч сеў на яго месца і завёў матор, з хвіліну з пэўнай насцярогай слухаў яго шум.

«Дзе яна можа быць, тая бомба? Глупства!»

Уключыў хуткасць. Легка крануўся. Павольна, як стажор, праехаў па плошчы. Машына ап'яняла, будзіла азарт. Падчас губернатарства за руль садзіўся рэдка: становішча не дазваляла, ды і Палавінка быў катэгарычна супраць гэтага; не пускалі нават на пярэдняе сядзенне, — сядзеў на заднім, дзе праз «хітрыя» шыбы яго не было відаць.

Машына паслухмяна імкнула наперад, набірала хуткасць. Вікенцій Паўлавіч выехаў на ціхую бакавую вуліцу, потым — цэнтральную. Угледзеўшы знаёмы губернатарскі «мерсэдэс», рэгуліроўшчык перакрыў рух з усіх чатырох бакоў. Але Вікенцій Паўлавіч не паехаў на жоўты, паслухмяна спыніўся. І ў гэты момант грымнуў выбух. Разнесла задняе сядзенне, вылецела бакавое шкло, машына задымілася. Паставы не разгубіўся: рвануў дзверку і выхапіў вадзіцеля. Вельмі здзівіўся, што гэта сам губернатар. Ён быў жывы і ў свядомасці, але ўвесь акрываўлены; паспеў яшчэ сказаць:

— Ганіце ад машыны людзей! Яна можа ўзарвацца.

Са стратай крыві трацілася прытомнасць. Вікенцій

Паўлавіч яшчэ помніў, як міліцыянер і два дужыя шафёры пасадзілі яго ў мікрааўтобус, як машына сарвалася з месца. Бальніца, на шчасце, была блізка. Але як прывезлі туды, як падхапілі санітары, як завезлі ў аперацыйную — гэта засталося за мяжой свядомасці. Жыццё і святло вярнуліся, калі пачаў выходзіць з наркозу. Не паверыў, што жывы. Здзівіўся. Перад вачамі плыў знаёмы твар. Не адразу пазнаў, што гэта Маша. Пазнаў — узрадаваўся, бо нарэшце ўсвядоміў: жывы!

Пасля лічыў, што яму пашанцавала. На шчасце, міна была залажана пад задняе сядзенне, на шчасце, не прабіла бензабака і машына не ўзарвалася. На шчасце, ён не сеў на сваё звыклае месца, дзе якраз і знаходзілася міна, якая магла моцна «пашкуматаць самыя далікатныя органы», — пажартаваў ён на трэці дзень пасля цяжкага ранения ў размове з Машай.

Найбольш цешыла, што ён паслаў Юрку за папкай, а сам сеў на яго месца. Чаму сеў? Гэта адразу зразумела Маша і нічога не пыталася, толькі ў вачах чыталася сумная пахвала. Зразумелі яшчэ двое — Ганна і Юрка. Ганна прыйшла ў бальніцу на другі дзень і праз слёзы сказала:

— Дарагі наш чалавек. Ты ж ратаваў мяне і Юрку. Не адмаўляйся, калі ласка, не адмаўляйся. Я знаю: табе пазванілі. Так?

Юрка прыйшоў праз тыдзень, не адзін, — з жонкай і сваім сыночкам.

Ларыса стала перад яго ложкам на калені і плакала, як малая. І ён адчуваў сябе няёмка: навошта рабіць з яго героя?

Пакумеку і следчаму мусіў сказаць пра званок, інакш дзеянні свае немагчыма вытлумачыць.

— Падазрэнні?

— Ніякіх. Здаецца, я нікому не наступаў на мазоль.

— Са справай Падбярозскага не можа быць сувязі?

— Ды не. Ніякай! Абсалютна. У гэтым цвёрда перакана968ны.

Але Пакумека задаваў, здавалася, наіўныя пытанні:

— Чаму захварэў Палавінка?

— А хіба чалавек не можа захварэць?

— Чаму вас пакінулі без аховы?

— А на чорта яна мне? Я ад яе паўгода адбіваўся.

Бачыў, што пракурора нішто не пераконвае.

Бачыць Івана Залозу чамусьці не захацеў. Чаму — сам сабе адказаць не мог. Ведаў, што Іван з'яўляўся ў першы ж дзень, калі ён не адышоў яшчэ ад наркозу, ляжаў, як у тумане, і да яго нікога, акрамя жонкі, не пускалі. На другі дзень, калі далажылі пра наведвальніка, сказаў урачу:

— Не трэба, я стаміўся.

Аднак Залоза ўсё роўна прайшоў: хто можа спыніць кіраўніка справамі губерніі?

Іван расплакаўся перад ім натуральным чынам — слёзы сыпаліся што боб.

— Чаму ты не хочаш пускаць мяне?

— Не я — урачы.

— Эх, Віця, Віця! Ды я двое сутак з сардэчным прыступам ляжаў. Я не я буду, калі не знайду гэтага падлюгу, звера. На каго замахнуўся, гад?! Я падняў на ногі ўсё МУС, усю пракуратуру. Асабіста прэзідэнту далажыў. І я табе клянуся: больш гэты гад міны падкладваць не будзе. А на суд над ім я пайду галоўным абвінаваўцам. І я скажу... задрыжаць усе такія...

— Дзякую, Іван, за твае словы. Ты загаіў мае раны. Гэта ты рабіў заўсёды...

У бальніцы Вікенцій Паўлавіч праляжаў паўтара месяца: больш дзесятка асколкаў — не жарт. Пасля далечваўся ў санаторыі. Адтуль напісаў прэзідэнту просьбу вызваліць яго ад пасады губернатара (угаварыла Маша), але пакінуць на працы ў выканкаме радавым служачым: «Зжыўся з людзьмі і пераходзіць у іншы калектыў не хачу».

У першы дзень яго праводзілі на працу ўсёй сям'ёй — жонка, Толя, Таня, Ліка. Ён пратэставаў, але адбіцца ад іх было немагчыма. Дзеці пературарылі провады ў гульню, жартавалі:

— Эксгубернатару трэба асаблівы эскорт. Хацеў я падняць свой курс... Такога не было ў гісторыі, каб караля ўрачыста праводзілі ў дворнікі.

— Толік! Мы аднолькава думалі. Я ў класе сказала, і ўсе рваліся. Плакаты пісалі.

— Яшчэ чаго не хапала! Караля — у дворнікі! Чула, Маша? Ой, надзяру я вам вушы!

— Да нашых вушэй, тата, цяжка дацягнуцца.

Марыя Іванаўна шчасліва пасміхалася з жартаў дзяцей. Яна сапраўды радавалася, што Вікенцій ужо не губернатар.

Ішоў пачатак красавіка. Снег амаль растаў, на газонах зазелянела трава. Але ўчора ўвечары яе прыцярушыў сняжок — зіма развітальна махнула белым крылом. А раніцою ўступіла ў свае правы вясна. Неба — што вымытае, без адзінай хмурынкі, блакіт ажно вочы сляпіў. І на плошчы, дзе ранішняе сонца не засланялі дамы, яно зусім растапіла снег, і па канаўках паміж плітамі на плошчы весела беглі звонкія ручайкі.

— Не баішся, тата? — без жарту, з сур'ёзнай заклапочанасцю спытала Таня.

— Чаго?

— А вунь як той барадаты глядзеў на цябе... З нейкай нядобрай усмешкай.

— Чаго баяцца радавому чалавеку? Каму я трэба? Загадчык аддзела культуры! Цяпер я мушу баяцца: ці пацягну аддзел? Ці спыню развал культуры? Во мой клопат. Губернатар не спыніў. А ўсміхаўся... Хтось можа зларадна пасміхнуцца: ездзіў на «мерседэсе», а цяпер тупае пехатой. Ды і то наўрад, ведаючы і пра выбух, і пра тое, што я сам папрасіўся з губернатараў. Пісалі ж газеты... Распісалі, як героя. Во такі герой ваш бацька! Здзіўляць свет больш не буду. А працаваць буду, як ваша мама — без паказухі. Хоць у культуры гэта нялёгка. У медыцыне і то ўмеюць некаторыя паказаць сябе. Я не прасіўся на гэты аддзел. Тут, як кажуць, без мяне мяне ажанілі. Але я не адбіваўся. Некалі ж рабіў у культуры, маю нейкі вопыт.

Спыніліся метраў за трыццаць да парадных дзвярэй Дома Саветаў.

— Ну, бяжы, каза, а то спознішся ў школу.

Таня цмокнула бацьку ў шчаку і сапраўды пабегла.

— А вы ўжо спазніліся, — сказаў студэнтам. — А бегчы вам нельга... Не лезьце ў перапоўнены тралейбус.

Ліка прыкметна акруглілася за пяць месяцаў, што прайшлі ад вяселля. Цяпер яна шчасліва засмяялася, задаволеная сваім становішчам.

— Ну, трымай хвост трубой, бацька, — пажартаваў Толя.

Калі дзеці адышлі, Марыя Іванаўна спытала:

— Хвалюешся?

— Каб вы так не праводзілі, можа, і не хваляваўся б. Прасіў жа.

— Гэта не я — яны, — кіўнула ў бок, куды пайшлі дзеці. — Ім захацелася. Яны сапраўды лічаць цябе героем. Мяне радуе Ліка... што яна не з пароды Залозаў. Яна — наша. Яна падтрымала мяне раней за Таню, калі я сказала, што буду адгаворваць цябе ад губернатарства твайго. Дзякую, што згадзіўся.

— Шкадую, што не згадзіўся з табою тады, перад выбарамі...

— Ну, ні пуха табе ні пяра.

— К чорту!

Увайшоў у дзверы спакойна, бадай весела і... разгубіўся. Вестыбюль быў поўны людзей. Знаёмыя ўсе твары: супрацоўнікі ўсіх упраўленняў, аддзелаў, служб. У першы міг не сцяміў, з якой нагоды яны сабраліся, пакуль не загучалі дружныя воплескі.

Ногі памлелі.

«Яны сустракаюць мяне... Божа! Якая недарэчнасць! Навошта? Адзіная мая заслуга, што я застаўся жывы. Але ці сапраўды мая? Урачоў і Машы».

Наперад выйшлі Іван Залоза і Ганна Фядосаўна.

Узлаваўся на Івана:

— Гэта ты арганізаваў мітынг, балабол няшчасны? Навошта? Ты нічога не робіш без карысці. Ох, выдам я табе! Ох, выдам!

Але тут жа падумаў: «Што я выдам? Залежаць буду ад гэтага «вернага сябра». Мы памяняліся ролямі...»

Залоза гаварыў, як калектыў шкадуе, што страціў такога кіраўніка. Але і радуецца, што Вікенцій Паўлавіч застаўся менавіта з імі для далейшай працы. Поспехаў яму!

Залоза добра прадумаў сваю прамову: не перабраў у выхваленні, не ўжыў высокіх слоў, і гэта супакоіла Вікенція Паўлавіча. Ва ўсякім разе жаданне добра прабраць Івана за мітынг знікла. Калі Іван скончыў, Вікенцій Паўлавіч, каб папярэдзіць іншыя выступленні, пакланіўся нізка натоўпу і сказаў:

— Дзякую вам, людзі добрыя.

Неўзабаве былі абвешчаны выбары новага губернатара. У ліку шасці прэтэндэнтаў было прозвішча Залозы Івана Яўменавіча. Выберуць?

## АБМЕН

1

Аксён Пракопавіч сядзеў на кухні і паглыблена чытаў кнігу на нямецкай мове з мноствам матэматычных формул. Не, не проста чытаў, як раман, а ўдумліва вывучаў, рашаў задачы, выпісваў іх у агульны сшытак. Час ад часу ў захапленні цмокаў языком, зрэдку хмурыўся, яўна дакараючы ці то аўтараў, ці то сябе, што не дайшоў да такога. Не лічыў, што ён авалодаў усімі таямніцамі навукі навук — вышэйшай матэматыкі — яны ж невычарпальныя. Нямала адкрыў сам і яго калегі — вучоныя іншых краін. І вось яшчэ адно цікавае адкрыццё зрабілі нямецкія вучоныя, муж і жонка, і, як сказана ў прадмове, паднеслі нечаканы сюрпрыз. Вельмі шкадаваў, што калега Гукавец даў яму кнігу на адну ноч. Жмот. Знарок, каб падражніць яго, раззадорыць, нагнаць зайздрасць: ты лічыў, што ты бог гэтых формул, а ты — усяго вучань, глядзі, што падносяць невядомыя немцы.

Злавіў формулы, па якіх з немцамі можна паспрачацца. Але для гэтага трэба мець кнігу ва ўласнай бібліятэцы, праверыць высновы яе на вучнях — аспірантах, дактарантах. Аднак чортаў Гукавец! Маніць жа, што кнігу яму далі на два дні. Быў нядаўна ў Германіі, адтуль прывёз. Але Гукавец усю вучоную дарогу зайздросціць яму, брыдкасці не робіць, але падражніць можа.

Аксён Пракопавіч падняўся з-за стала, пахадзіў па цеснай кухні, заглянуў у акно, за якім падалі рэдкія сняжынкі — першыя вестуны блізкай зімы. Ён некалі марыў вывесці закон крышталізацыі і падзення сняжынак. І вось гэтак жа адкрыў, што да яго гэта зрабілі шведскія фізікі. Спазніўся. І тут спазніўся: такую кнігу павінен быў напісаць ён, большасць формул — яго. Не напісаў. Чаму? Цяпер яго задача — аспрэчыць немцаў. Але гэта праца не адной ночы, на гэта спатрэбяцца месяцы.

Пакудлачыў свае рыжаватыя валасы, пагладзіў галаву там, дзе ўтвараліся ўжо залысіны. Аблысенне — прыкмета старасці. А яму ўсяго трыццаць шэсць, самы малады прафесар, ён у трыццаць абараніў доктарскую. Шырока крочыў. А цяпер як бы што прымусіла запаволіць хаду. Што?

Не мог сабе прызнацца, што яго працы пэўным чынам замінала жонка Ядвіга. Кахаў яе, песціў. І раптам прыйсці да высновы, што яна перашкаджае? Не!

Аднак вось і зараз. Магла б яна хоць трохі прыглушыць тэлевізар. Грыміць за сцяной. Перадавалі б класічную музыку — яна

стымулюе творчы працэс, пад яе хораша думаецца, няхай не матэматычнымі формуламі, часцей за ўсё — філасофскімі катэгорыямі аб сэнсе жыцця. Але думкі ўзнёслыя, не бытавыя, не дробязныя. А тут нейкі джаз. А такая музыка раздражняе і прыніжае мысленне да «бренности всего земного», да «суеты сует», як казаў яшчэ цар Саламон. А ён, прафесар Крапіўка, ніколі не лічыў і не лічыць, што жыццё — мітусня. Не, жыццё чалавечае — найвышэйшы дар Божы, у такім вызначэнні ён, матэрыяліст, цалкам згодзен з біблейскім вызначэннем. Чалавек — найвышэйшая субстанцыя. І нарадзіўся ён, каб пераўтварыць свет. А для гэтага патрэбныя вось такія матэматычныя формулы, без іх не зробіш новыя механізмы, камп'ютэры, не паляціш у космас да суседніх планет.

Падумаў: «Заўтра загляну ў акадэмічную бібліятэку, можа, яны атрымалі гэтую кнігу. Але калі Гукавец узяў яе адтуль — не хутка яна вернецца назад. Не, трэба заказваць. Заўтра ж закажу праз расійскую «Міжнародную кнігу». Але які доўгі шлях! Мінск — Масква, Масква — Берлін. І назад. Ды і грошы — не па маім сучасным заробку. Ядзя заенчыць. Ну, грошы дробязь. Дзеля навукі... Дзеля навукі жыцця не шкадавалі...»

Увайшла Ядвіга. У шаўковым кітайскім халаце з яркімі экзатычнымі кветкамі на ім. Высокая, статная, з распушчанымі, ненатуральнага колеру валасамі. Яна іх пафарбавала ў нейкі бэзавы колер. З-за гэтага ў іх была сутычка. Але ўрэшце ён змірыўся: і такая яна падабалася яму. Усё ў ёй падабалася: і вочы, і вусны, і трохі кірпаты нос — сялянскі твар, але прыгожы і прывабны. Праўда, калі ён сказаў, што ў яе сялянскі твар, Ядзя пакрыўдзілася і ўзлавалася, і бадай не ў жарт сказала:

— Не забывай, што я шляхцянка.

— Ах ты, мая шляхцяначка! Пані Ядвіга...

— Але, пані.

Ён ва ўсім патакаў ёй, а яна наадварот — усё рабіла як бы яму на злосць, але ніякія яе «конікі» пакрыўдзіць яго не маглі.

Спытала:

— Сушыш мазгі?

— Ад матэматыкі мазгі не сохнуць. Думаю, колькасць энергетычных клетак расце, множыцца.

— Хіба мала табе тых, што ёсць?

— Я не ведаю, колькі іх у мяне ёсць, ніхто яшчэ не палічыў. Але часам здаецца, што мала. Вось як зараз, калі ўчытваюся ў гэтыя формулы, — ён паказаў на разгорнутую кніжку.

Яна адным вокам заглянула ў кнігу, цяжка ўздыхнула.

— У вачах скачуць іксы і ігракі.

Аксён засмяяўся.

— Я не ведаю тваіх формул, але мне здаецца, што ў мяне залішне клетак. Калі іх было менш, людзі жылі шчаслівей. Мая маці была шчаслівая жанчына. Маладая. Нараджала дзяцей...

— Нараджай і ты, пра што я прашу. Табе дваццаць восем гадоў...

— Давай закрыем гэтую тэму, а то пасварымся зноў. Сёння я хачу зацягнуць цябе ў ложак да таго, як засну сном праведніцы. Ці ўся твая патэнцыя пайшла ў формулы? — Ядвіга засмяялася.

Аксён не адказаў. Ён, што юнак, саромеўся такіх адкрытых размоў.

Ядвіга шумна наліла з крана ў чайнік вады, як бы са злосці чыркнула запалкай, запаліла канфорку газавай

пліты. Села ля стала:

— Каву будзеш піць?

— Вып'ю. Падкармлю свае клеткі кавай і цукрам.

— Каньяку выпі.

— Ды ты што! Знаеш жа, што я зарокся...

— Зарокся каньяк піць... Можа, і каханнем займацца зарокся?

— Жартуеш. Але ж я не хлапчук...

— Дзядуля ў трыццаць шэсць! Баішся, што секс забірае шмат энергіі? Але ж гэта іншая энергія, не тая, што трэба на формулы.

— Ты так думаеш?

— О Божа! Даў ты мне мужа...

— Дрэннага ён табе мужа даў?

— Ды не, добрага, усе сяброўкі мае зайздросцяць. ЧыЬтае золата. Скарб.

Ядвіга расчырванелася. Аксён ведаў гэтую чырвань: заводзіцца. Але з-за чаго — не ўцяміў. А мог бы ўцяміць, бо не першы раз такое здаралася, калі размова пераходзіла на тэму, якой ён пазбягаў. Мог бы здагадацца, што жонка кіпіць з-за яго няўвагі, абыякавасці да яе жаночай пекнасці, да яе жадання зацягнуць яго ў ложак.

Яна закусіла алую, што малініна, губу, і з карых вачэй яе пасыпаліся жоўтыя іскры. Да яе матэматык лічыў, што іскры з вачэй — выдумка паэтаў і раманістаў. Нічога з вачэй не сыплецца — звужаюцца, расшыраюцца... Ажно не: калі расшыраюцца, мяняюць колер і тады сапраўды здаецца, што з'яўляюцца іскры. Упершыню ўбачыў такое ў яе, у сваёй каханай, яшчэ да вяселля. Думаў, што гэта суб'ектыўнае ўспрынящце: закаханаму як толькі не прадстаўляецца

прадмет яго кахання, у якіх толькі паэтычных, менавіта паэтычных (тады ён ацаніў паэтычныя метафары і эпітэты), выявах не паўстае.

Ведаў, што гэтая яе расчырванеласць, закушванне губы — сімптомы гневу. Але з-за чаго яна гневаецца?

Чаго ёй не хапае? Сексу? Але ж хіба сэнс жыцця толькі ў гэтым? Такое жаданне ён лічыў паталогіяй, частае збліжэнне апраўдваў толькі ў тым разе, калі на мэце мець нараджэнне дзіцяці — невядома, калі адбудзецца зачацце. Але ж Ядвіга не хоча дзяцей: «Рана мне нюхаць пялюшкі».

Калі жонка распалялася, ён маўчаў. Яму нават часам падабалася, калі яна, што каменне, кідала ўніжальныя словы, лічыў, што ён іх заслужыў, бо не стаў Эйнштэйнам. Горш сябе адчуваў, калі Ядзя была — і нярэдка — добрая, лашчылася:

— Аксёнчык мой любы! Ты ж у мяне геній.

І «геній» гаварылася без іроніі; выходзіць, яна сапраўды лічыць яго геніяльным. Ад такога вызначэння любы прыстойны самакрытычны вучоны павінен збянтэжыцца.

Засвістаў чайнік.

Ядвіга не паварушылася.

Чайнік свістаў, што паравоз, брынчэла накрыўка, гатовая, здаецца, узляцець.

— Ты што, не чуеш? Аглох? Характар аднак! Як у тваёй маці.

— Не чапай, калі ласка, маёй маці, яна пяцярых дзяцей выгадавала. І зараз яшчэ кароў доіць, — Аксён Пракопавіч падхапіўся, выключыў газ пад чайнікам.

— Добрыя ж дзеткі... два прафесары!.. А маці вымушана кароў даіць!

«Заводзіцца, аднак, мая ненаглядная. Але мяне ёй не сарваць. Я — жалезабетонны, як яна аднойчы назвала мяне».

— Дык не хоча яна ні да каго ехаць. Ні да сыноў, ні дадачок. Уяўляю...

Хацеў сказаць: «Уяўляю, як бы яна жыла з табой», — але своечасова прыкусіў язык: не варта падліваць масла ў агонь.

— Будзеш каву?

— Буду. І каньяк.

— Не. І табе не раю. Уцягнешся... не дай Божа.

— Баішся жонкі-алкагалічкі? Не бойся. Я не ўцягнуся: я Богу малюся, у касцёл хаджу...

«Адзін-два разы схадзіла і прылічыла сябе да святых? Ці не паспешліва?» — хацеў сказаць, але зноў не сказаў — пабаяўся.

Ядвіга ўвішна паднялася, дастала з шафкі кубкі, насыпала ў іх растваральнай кавы.

— Колькі цукру пакласці?

— Больш.

— Нажывеш ты дыябет.

— Дыябет не ад цукру.

— Адзін Бог ведае — ад чаго.

— І вучоныя.

— Нічога твае вучоныя не знаюць.

— Невысокай ты думкі пра нашага брата.

— Я — пра медыкаў. Веру, што ты формулы знаеш. Столькі грызеш іх... Ляжам сёння раней спаць?

Аксён цяжка ўздыхнуў, перагарнуў непрачытаную частку кнігі.

— Гукавец даў мне кнігу на адну ноч.

— Кніга даражэй, чым жонка?

Ён бадай весела засмяяўся.

— Жонка заўсёды са мной.

— Значыць, ёю можна падціраць падлогу?

— Ну што ты! Хоць раз я сказаў табе дрэннае слова?

— Я перастала разумець, «что такое хорошо...». Дык не будзеш каньяк?

— Не. Трэці раз пытаеш.

— А я вып'ю.

Пайшла ў пакой. Вярнулася з пачатай пляшкай і з крышталёвай чаркай. Пляснула з бутэлькі ў кубак з кавай, наліла поўную чарку.

— За тваё здароўе, Аксён Пракопавіч.

— Будзь здаровая, Ядвіга Эдуардаўна.

Смачна адпіла паўчаркі, сёрбнула гарачую каву, падзьмухаўшы на чорную вадкасць.

Прафесар схіліўся над кнігай, пранікаючы ў сэнс новай формулы. Спяшаўся, бо ведаў: калі Богам дадзеная прымасцілася насупраць з пляшкай і чаркай — не да навукі будзе. Што зрабіць, каб яна хутчэй пайшла? Не, уселася грунтоўна! І схавацца яму няма дзе — два цесныя пакоі: у адным тэлевізар, у другім — двухспальны ложак. Тэлевізар яна ўключыць, у спальні прымусіць раздзецца.

— Слухай, што гэта ў цябе за прозвішча — Крапіўка? Курам на смех, — стары яе канёк. — Вазьмі мае. Прафесар Закрэўскі! Гучыць? Яшчэ як. А то — Крапіўка! Добра, што я не запісалася на тваё прозвішча. Смяяліся б усе сваякі — Ядвіга Крапіўка. Няхай ужо быў бы Крапіва. Думалі б, што ты сын таго Крапівы. Яго кнігі ўвесь свет ведае. А твае формулы? Дзесятак-два такіх жа апантаных шызікаў,

як ты. Матэматыка, канешне, навука — прызнаю. Але ў ёй усё адкрыта яшчэ ў Старажытным Егіпце. Што вы адкрываеце? Што? Прасвяці мяне! Што ў гэтым «рамане» з формул, ад якога ты не можаш адарвацца?

— Я табе раскажу. Толькі дай мне, калі ласка, дачытаць.

— Выганяеш, дарагі мой Аксёнчык?

— Прашу.

— І імя табе падабралі пад прозвішча. Аксён! Калі ўпершыню пачула, то смяялася. Не думала, што Аксён стане маім Ксенем. Ксеня — бабскае штосьці... Не дзіва. Бацькі праектавалі не цябе, а дзяўчынку, але з-за нейкай генетычнай памылкі атрымалася... Што? Сумесь пеўня з дыназаўрам. Вунь якая дубіна вырасла!

— Якую лухту ты нясеш, мая ненаглядная. Каб хто паслухаў, то пэўна заключыў бы: у бабы крыша паехала.

— Я — баба?

— А хто ты? Трашчыш як сарока.

— Я табе бабу прыпомню! У ложак да мяне не лезь! Скіну! Будзеш спаць каля тэлевізара. Можа, паразумнееш.

Было ўжо, што, раз'юшаная, яна спіхвала яго з ложка. Вясёлае жыццё! Канапка ў зале — так яны гучна называлі пакой у дванаццаць квадратных метраў — была кароткай для яго росту і спаць на ёй нязручна. Аднак на гэты раз Аксён амаль узрадаваўся, што не трэба ісці ў спальню. Калі заседжваўся за працай, то ішоў туды з бояззю: не разбудзіць бы жонку. А яна кожны раз прачыналася. Часам цяжка ўздыхала:

— О Божа!

— Спі-спі.

— Каторая гадзіна?

— Поўнач.

— Манюка. Якая поўнач. Я ўжо выспалася.

Ведала, што ўжо тры гадзіны ночы.

Але яшчэ цяжэй было, калі яна, прачнуўшыся, абдымала яго, гарачая, пахучая, і пачынала лашчыцца, ласкаць яго. Ён саромеўся і вельмі перажываў, што ніякія ласкі яго не кранaлі, бо галава ўсё яшчэ забіта формуламі. У такія хвіліны ён праклінаў сваю навуку, а пасля перажываў з-за гэтага, быццам дазволіў сабе святатацтва ў адносінах да Матэматыкі. Дакараў філолагаў, якія вырашылі матэматыку пісаць з малой літары. Разумеў, што гэта заскок — так высока ставіць сваю навуку. А як жа іншыя? Фізіка, напрыклад. Фізіку ставіў побач, астатнія навукі — пад матэматыкай. Быў перакананы: нішто не з'явілася і не магло існаваць, развівацца без матэматыкі, — не толькі

хімія, геалогія, архітэктура, але і гісторыя, філасофія, літаратура, мастацтва, музыка. Што такое рытм, рыфма, сюжэт, кампазіцыя? Ці задумваюцца паэты, ведаюць, што гэта матэматычныя катэгорыі? Каб ведалі, то пісалі б значна лепш.

На навуковых сімпозіумах такія ідэі не выказваў: палічаць калегі, што ён абагаўляе навуку навук, як ніхто з вялікіх; Ламаносаў і Кавалеўская гэтага не рабілі.

Расказаў сваю тэорыю Ядвізе. Яна выслухала ўважліва, без іроніі, што яго парадавала, але і спалохала, бо ўбачыў у вачах яе цень неразумення, здзіўлення, страху. Не яе прыгожай галоўцы, якую яна не забівала і сваімі юрыдычнымі пастулатамі, зразумець такое! Ён не знаходзіў у юрыспрудэнцыі матэматычнай стройнасці — суцэльнае бязладдзе. Між іншым, і сама Ядвіга невысокай думкі пра сваю навуку, хоць працуе ў навукова-аналітычным цэнтры Міністэрства юстыцыі. Гэтая работа нядрэнна карміла і корміць яе бацьку, суддзю, яго сям'ю і яе самую: цяпер аклад яе вышэйшы, чым у прафесара універсітэта. Аксён абураўся. А яна лічыла, што так і трэба: на юстыцыі і міліцыі трымаецца дзяржава.

...Ядвіга наліла трэцюю чарку і насыпала ў кубак ажно тры поўныя лыжачкі кавы.

— Можа, хопіць?

— Чаго хопіць?

— Кавы. І гэтай праклятай гары...

— Праклятай, але смачнай. Паспытай — за вушы не адцягнеш.

— Паспытаў.

— Ды ў цябе ж ніякага густу. Сухар ты. Засушыў ты маю маладосць.

— Чым я засушыў яе?

— Сваім занудствам. Такога зануды свет не бачыў.

— Дзякуй за высокую атэстацыю.

— Еш на здароўе.

Яна наліла кіпень і выліла каньяк з чаркі ў каву. Паднялася. Узяла ў адну руку кубак, у другую — бутэльку.

Аксён забраў у яе бутэльку, здзівіўся, што жонка пакорліва аддала яе.

— Не заснеш.

— Не засну. Пакуль ты не пагрэеш.

— Прабач. Але мне трэба дачытаць кнігу. Цікавыя думкі немцы выказваюць. Між іншым, муж і жонка. Гармонія!..

— Ну і чорт з табой! Спі са сваімі немцамі. Усе яны такія ж зануды, як ты. Яны не жывуць — робяць грошы.

— Грошы робяць амерыканцы.

— Гэтыя вывіхнуліся на далярах.

— З цябе мог бы выйсці добры палітолаг, каб ты не лянілася пісаць.

— Буду я сушыць галаву! Няма дурных. Хопіць цябе.

— Я палітыкай не займаюся.

— А казаў, твая навука — чысцейшая палітыка.

— У пэўным сэнсе гэта так. Без яе не існавалі б дзяржавы.

— Ох, як мне ўсё абрыдла! Гуд бай, дарагі мой. Гутэн нахт. Так?

Ён паглядзеў ёй услед, падумаў: «Прыгожая, чартоўка. Якая дасканаласць форм! Вывесці б формулу прапорцый чалавечага цела. Чаго не дарабіў Бог... Аднак чытаць, чытаць!..»

Але высновы немцаў не лезлі ў галаву. Узлаваўся на Ядвігу: расстроіла сваім глупствам творчы настрой.

Трапілася слова, якога не разумеў. Пашукаў у нямецка-рускім слоўніку, там не было: спецыфічна-навуковае. Ад незразумелага слова не разумеў цэлага сказу, думкі, а выснова яўна заключала новае — тое, пра што ён не мог здагадацца з логікі ўсяго доўгага, складанага разважання аўтараў. Хадзіў па кухні, кудлачыў парадзелыя валасы. Злаваўся на жонку: затуманіла мазгі. А яна ў дадатак уключыла гучней звычайнага тэлевізар. Слоў ён не разбіраў, чуў рогат залы. З чаго так іржуць? Папрасіць Ядзю выключыць? Можа, і выключыць, але колькі можа нагарадзіць новых глупстваў!

І думкі ад матэматыкі пераключыліся на жонку, на яе характар, на іх адносіны. Няўжо ўсе сем'і такія? Не, яго бацькі жылі зусім інакш: простыя сяляне, а колькі ў іх было цнатлівасці, павагі адзін да аднаго! Ядзя — дачка інтэлігентаў. Але ці ёсць у яе інтэлігентнасць? Была. Якой незвычайнай была дзяўчынай!

Яны пазнаёміліся на юбілейным універсітэцкім вечары. Танцавалі. Ён, малады, любіў танцаваць. Малады... А ці не рана ты запісаў сябе ў старыя? Не толькі любіў — шыкоўна танцаваў, бо калі яшчэ быў студэнтам, наведваў у клубе прафсаюзаў вечары бальных танцаў. Стары не стары, а жаданне танцаваць знікла. Не знікла — часу шкадаваў, калі засеў за дысертацыю, кандыдацкую, доктарскую. А дарэмна ён шкадуе часу, ад гэтага, можа, і ўзнікае непаразуменне паміж ім і жонкай. Яна не ведае, куды падзець свой час, шукае занятак, і, магчыма, мае задавальненне ад таго, што шпіляе свайго мужа. Спачатку вадзіў яе на танцы туды ж — у клуб. Але там падхоплівалі маладыя скакуны, і Ядзя больш ахвотна танцавала з імі, чым з ім, класным танцорам. І яму было непрыемна. Не хацеў называць гэта рэўнасцю, прыніжаць сябе такім банальным пачуццём,

аднак дотык да яе чужых рук, якія абдымалі яе стан, непрыемна рэзаў па сэрцы. Сказаў ёй пра гэта, тлумачачы, чаму знікла жаданне наведвацца ў клуб. Ядзі гэта спадабалася. Яна весела смяялася.

— Раўнуеш?

— Раўную.

— Значыцца кахаеш. Лепшы доказ.

Гэта было ў дні іх агульнага шчасця. Куды яно дзелася, шчасце? Выходзіць, кароткі яго век. Ці бывае яно на ўсё жыццё?

...Аднак як было ў той першы вечар?

— Як ваша імя?

— Ядвіга.

— Прыгожа.

— А ваша?

— Аксён.

— Ёсць такое імя?

— Ёсць Аксёнаў. Ад Аксёна.

— А як вас малога называлі?

— Маці — Аксёнчык, сябрукі — Ксеня.

Яна засмяялася.

— Дык жаночае гэта імя — Ксеня. А хто вы?

— Я — дацэнт матэматычнага факультэта.

— Такі малады дацэнт? У нас на юрыдычным усе выкладчыкі — старыя апёнкі. Адзін з бародкай.

— У вашы дваццаць вам саракагадовыя здаюцца старымі.

— Адкуль вы знаеце, што мне дваццаць?

— Я ж матэматык. Я ўмею лічыць... Па вачах вашых. Па валасах. Па танцах. Падарыце мне усе вальсы, полькі, мазуркі...

— А рокі?

— Магу і рок.

— Вы ўсё ўмееце.

— Хачу ўсё ўмець, асабліва ў навуцы сваёй.

— Не сумна вам з матэматыкай?

— Яна — што каханая нявеста. Кожны дзень адкрываеш новае. Я і ў вас хачу адкрываць новае.

— Гэта прызнанне?

— Лічыце так. Дзе мы сустрэнемся?

— Тут. Будзе вечар сустрэчы былых студэнтаў.

— Праз тыдзень? Чакаць тыдзень? Я не магу.

— Усе матэматыкі такія нецярплівыя?

— Не знаю, як усе. А я такі.

Была позняя восень — холадна. Але на другі дзень сустрэліся на станцыі метро. Доўга хадзілі пад зямлёй, потым, па яго прапанове, падняліся ў сквер. Каля пад'езда яе дома пацалаваліся.

Пасля трох сустрэч Ядвіга запрасіла яго дадому.

Суддзя Эдуард Феліксавіч Закрэўскі і яго жонка Паліна Іванаўна сустрэлі прыветліва, па-бацькоўску, яўна задаволеныя такім жаніхом сваёй дачкі. Праз месяц — усяго праз месяц! — чамусьці вельмі спяшалася цешча — ён стаў іх зяцем, перабраўся з інтэрната ў прасторную кватэру.

Праз два месяцы ў Ядвігі здарыўся выкідыш, так растлумачыла цешча, калі ён вярнуўся з працы і не ўбачыў жонкі.

У люты мароз гадзінамі прастойваў пад вокнамі гінекалагічнага аддзялення клінікі, гутарыў з ёй праз двайныя рамы жэстамі. Чамусьці пасля гэтага няшчасця цешча як бы аддалілася ад яго. Праз што? Каб уткнула ў чым, то ён, можа, здагадаўся б, што ёй не падабаецца. Не, не сказала ніводнага слова. Але халадок у адносінах адчуваў. Між іншым, і да дачкі Паліна Іванаўна пачала ставіцца больш строга, часцей павышала голас на яе. Ды з Ядвігі — што з гускі вада, нікога яна не баялася, крыкі маці — пусты гук, тым больш што на яе баку былі і бацька, і муж. Ён, Аксён, праўда, ніколі нават не паспрачаўся з цешчай — залішне далікатны, але жонку абараняў сваёй падвоенай увагай і ласкай.

У хуткім часе ім пашанцавала — універсітэт даў маладому дацэнту вось гэтую кватэру. Далека, праўда, у мікрараёне. Але якія шчаслівыя яны былі ў першыя гады жыцця ў гэтай кватэры! Адно хіба непакоіла і хвалявала яго — што Ядзя не нараджала дзіця. Не хацела ці не магла? Гэта трагедыя, калі выкідыш зрабіў яе бясплоднаю.

— Схадзі да ўрача.

— Хаджу. Усё нармальна. Не бойся. Нараджаю я табе кучу дзяцей. Не падлічыш. Дай мне пажыць. Хіба маці твая жыла, маючы пяцярых?

А потым прызналася, што засцерагаецца, прымае таблеткі. Гэта яго бадай абразіла і напэўна паслабіла патэнцыю: дзеля чаго старацца? Дзеля ўласнага фізічнага задавальнення? Амаральна. Хацелася плявацца, калі Ядвіга смакавала бессаромныя фільмы. З-за гэтага часам сварыліся:

— Сухар ты! Нічога цябе не хвалюе, акрамя формул. Няўжо ты думаеш, што Адам і Ева пазналі грэх толькі дзеля таго, каб пладзіць сабе падобных? Не! Яны далі жанчыне і мужчыне найвялікшую радасць — пазнанне адзін аднаго. А нічога ж у гэтым свеце не робіцца без Бога. Ты верыш у Бога? Не верыш. А я веру. І Бог не

забараняе мне хацець цябе. Бог добры, шчодры. А ты абкрадваеш сам сябе. Пастарэеш — пашкадуеш. Жыццё — не ў формулах.

Пракруціў сваё сямейнае жыццё: каляровыя радасці перарываліся бляклымі, а то і зусім чорнымі расчараваннямі.

Глянуў на гадзіннік і схамянуўся: так позна, а кніга яшчэ недачытана. Чытаць, а не забіваць мозг бытавымі дробязямі! Надышоў лепшы час для творчасці: змоўк тэлевізар, Ядвіга пайшла спаць. Ці чытае «Знесеныя ветрам». Кажа, цікавы раман. Але яму шкада часу на двухтомны раман.

Чытаў немцаў да трох гадзін. Не адразу заснуў на кароткай канапцы — лезлі ў галаву формулы, якія можна і трэба аспрэчваць. А яшчэ стала крыўдна, што ва ўласнай кватэры ўласная жонка выжыла яго на нязручную канапу. Але крыўду адганяў: недастойна мужчыны шкадаваць сябе, як маленькага.

Прачнуўся ў сем без будзільніка; «заведзены» быў на гэты час — у восем трыццаць лекцыя.

2

Яго даклад на сімпозіуме зрабіў сенсацыю. Аспрэчванне некаторых доказаў мужа і жонкі Шэйманаў чамусьці асабліва спадабалася немцам, амаль усе яны падтрымалі яго высновы і сказалі яму нямала кампліментаў, ад якіх Аксён часам чырванеў, як дзяўчына. Свае калегі ніколі яго гэтак не хвалілі, хоць прызнавалі яго заслугі ў матэматыцы не без зайздрасць Казалі, немцы скупыя на добрыя словы. Выходзіць наадварот: нашы, заціснутыя ў шоры афіцыйных ацэнак, як бы ставілі задачу: не дай Бог перабольшаць, перахваліць.

За немцамі раскаваліся і яны. І высокая ацэнка мэтраў, па кнігах якіх ён вучыўся, як ніколі раней, пацешыла яго самалюбства. Раней ён адносіўся да сваіх ведаў самакрытычна і амаль ніколі не ставіў сябе побач з вядомымі свяцiламі. А тут раптам адчуў, што вырас да іх узроўню. І гэта напоўніла радасцю і ўдзячнасцю блізкім людзям — маме, звычайнай сялянцы, якая надзяліла яго такім розумам і... Ядзі. Яна ласкава праводзіла яго ў Маскву — як ніколі, — без шпілек і жартаў, з неўласцівай ёй сур'ёзнасцю, як ведала, што яго чакае. І ён упершыню не сумняваўся, што яго поспех парадуе жонку. А парадуецца — значыць, ацэніць навуку, з якой часам нядобра кпіла.

Захацелася прывесці жонцы добры падарунак. Масква завалена экзатычнымі таварамі. Але што выбраць? Па яго грашах. Акрамя рублёў, беларускіх і рускіх, меў дваццаць долараў — ажно дваццаць! — адной зялёнай паперкай, узяў з недатыкальнага запасу, які збіраў на выпадак камандзіроўкі ў далёкае замежжа (ездзіў туды і помніў,

якое гэта брыдкае адчуванне — не мець магчымасці нават даць на чай у атэлі ці рэстаране).

Раіўся з жанчынамі — удзельніцамі сімпозіума, — што можна купіць у падарунак жонцы. Ды паношаныя «сінія панчохі» нічога карыснага параіць не маглі. Больш дасведчанымі ў гэтым былі дзяўчаты-сакратаркі, што абслугоўвалі сімпозіум, і якім яўна імпанавала ўвага да іх бадай самага маладога прафесара. Пачуў: даюць яму высокую атэстацыю — як мужчыну, але гэта яго не цешыла. І парады іх былі фантастычнымі: яны, пэўна, думалі, што вучоны багаты, і называлі рэчы, якія яўна не па яго кішэні. Дапамагла пакаёўка пасольскага атэля: ёй, немаладой ужо жанчыне, жонцы былога высокага партыйнага работніка, ён прызнаўся, якую суму мае.

На прыёме па завяршэнню сімпозіума выпіў чарак пяць гарэлкі, чаго ніколі не рабіў: абыходзіўся за вечар адной-двума. Але тут да яго падыходзілі калегі і на трох мовах — рускай, нямецкай, англійскай — ухвалялі яго здольнасці і чокаліся; ад салодкіх кампліментаў і горкая здавалася салодкай. А ўначы вылезла не слодыч, а гарката: непрыемна, палохаючы, сціскалася сэрца, балела галава, і ён ніяк не мог заснуць, варочаўся з боку на бок.

Сусед яго і сябра Алег Гукавец таксама не спаў, перажываў іншае: зайздрасць і асуджэнне свяціл — пра яго даклад не сказалі ніводнага добрага слова. Уедліва шпільнуў:

— Не спіш, герой трох векапомных дзён?

— Ды не спіцца. Галава баліць.

— Перажоўваеш славу?

— Якая там слава! Што я, студэнт?

— Не скажы. Мы з табой горш за студэнтаў, у маладых менш славалюбства. Гэта хвароба старых.

— Мы з табой яшчэ не старыя.

— Ты — не. А мне — сорак пяць. Да таго ж цябе матэматыка законсервіравала. Самая брыдкая навука!

— Чаму? Навука не бывае брыдкая.

— Любіш свае формулы?

— Люблю.

— Ты не іх любіш — сябе ў іх. Але я зайздрошчу табе. Шчаслівы ты чалавек, Аксён, сын Пракопаў, пан Крапіўка.

— Уедлівы ты чалавек, Алег. Зайздрасць раз'ядае цябе, як іржа жалеза.

— Каб жа жалезны быў! А то — зьлеплены невядома з чаго. Не хацеў я ісці на матэматычны. Бацькі прымусілі, абодва школьныя матэматыкі. Я вершы пісаў.

— Ламаноеаву нішто не перашкаджала пісаць вершы.

— Уепомніў продка! Не вершы ён пісаў — оды імператрыцам і рыфмаваныя хімічна-геалагічныя формулы.

— Магу табе прызнацца. Я і цяпер яшчэ вершы пішу.

— Ну Ламаносаў! Здзівіў. Хоць чаму здзіўляцца? Канешне ж, елавіш сваю Ядвігу. Не дзіва. Такая жонка не толькі вершы прымусіць пісаць — праз галаву куляцца.

Немагчыма было зразумець: захапляецца Гукавец Ядзяй ці асуджае яе? Хацелася, каб захапляўся. У гэтую незвычайную ноч ён быў перапоўнены пяшчотай да яе, у бяссонніцу думкі пра сімпозіум, пра даклад спляталіся з думкамі пра Ядзю. І ўпершыню падумаў, што яго жыццё, яго любоў і каханне — навука і яна; кпіны яе, якія часам раздражнялі, здаліся праявай яе хітра схаванага захаплення ім і яго навукай.

— Давай будзем спаць, Алег. Заўтра многа спраў. А я яшчэ комплекс на Манежнай не бачыў...

— Комплекс паглядзі. Шэдэўр. Добрай ночы, пан Крапіўка.

— Дабранач.

Пасля дыялога з калегам нечакана заснуў і прысніў Ядзю, ад чаго яшчэ мацней пацягнула дадому. І яму пашанцавала: падчас снедання ў буфеце адзін мінчанін абвясціў:

— Хто хоча хутчэй апынуцца дома? У мяне білет на сёння. А справы прымушаюць застацца.

Аксён таксама браў білет туды і назад: так рабілі амаль усе — каб за беларускія грошы. Але назад заўтра. І вось сапраўды пашанцавала. Па-першае, на суткі раней будзе дома. Па-другое, сэканоміць грошы, каб купіць лепшы падарунак Ядзі. Гасцініца гэтая з прусакаМі шалёна дарагая, суткі — тыднёвая яго зарплата.

І ён з задавальненнем памяняўся білетамі.

Цягнік прыйшоў у шэсць гадзін раніцы. Аксён Пракопавіч узяў таксі і за пятнаццаць мінут быў дома.

Адчыніў дзверы як мага асцярожней, каб не разбудзіць жонку. Вось будзе для яе сюрпрыз! Ціхенька распрануўся, зняў чаравікі. На насочках прайшоў у пакой. Але дзверы ў спальню былі прыадчынены, і ён не ўтрымаўся, каб не заглянуць туды. Глянуў і... адхіснуўся. Галюцынацыя? Ад бяссоннай ночы? У вагоне бадай не спаў.

Побач з Ядвігінай галавой з раскіданымі па падушцы косамі з-пад коўдры вытыркалася другая галава — мужчынская, пляшывая.

Не адразу сцяміў што да чаго, спачатку падумаў, што ў яго нядобра з галавой. Не, галава яго на месцы, помніць усе формулы сенсацыйнага даклада. А разгадаць загадку гэтага нечаканага відовішча

— чужы мужчына ў яго ложку — не можа? Ды не, што тут разгадаваць! Усё зразумела. Але да чаго дайшла яго каханая жонка! Усяго ад яе чакаў — любой абразы, але такога... А што рабіць яму? Крычаць? Кінуцца з кулакамі? Сцягнуць з ложка? Каго? Яго? Яе? Але ён няздатны на такі подзвіг, з самага маленства ён не біўся, ды і тады больш білі яго, аднак злосці ні на каго не меў, былыя забіякі ў сталым узросце — яго сябры. Нават Пецька Поклад, дяперашні трактарыст; у дзевятым класе Пецька моцна такі адлупіў яго — за тое, што ён правёў дадому з кіно Ганю Мурашову. Цяпер, калі сустракаюцца, смяюцца.

Аксён працягваў глядзець на ложак, як на дзівоснае відовішча. Забалела галава, кроў грукала ў скроні. А сэрца, здавалася, сарвалася ўніз і білася недзе ў жываце. Страшнае адчуванне — нязведанае ні на адных экзаменах, ні пры адной абароне. Усё зрушылася з месца. Яшчэ міг — і штосьці абарвецца ўсярэдзіне і... канец табе, Аксён. Ад чаго? Ад жончынай здрады? Ад гэтай пошласці? Не, зараз ён нешта зробіць гэткае ж брыдкае, бессаромнае і... наступіць развязка, сэрца вернецца на сваё месца. І ўсё забудзецца, як дурны сон. Ён пойдзе на кухню і згатуе сабе каву. Сабе і... Ядзі...

Яна, мабыць, адчула, што ён глядзіць на яе. Расплюшчыла вочы, убачыла мужа і войкнула. Любоўнік уміг падхапіўся — злоўлены злодзей. Скінуў коўдру, але ўбачыў, што абодва яны — у чым маці нарадзіла, і зноў упаў на падушку, нацягнуў коўдру на пляшывую галаву, мабыць, спалохаўся, што яго будуць біць.

І Аксён ледзь стрымаў сябе, каб не кінуцца і не даць яму кухталёў. Але чаму яму? Ёй!

Але ён не ўнізіцца, каб ударыць жанчыну! Ні ў якай сітуацыі!

І ён зачыніў дзверы, ціхенька адступіў і знясілена апусціўся на канапу. Стала крыху лягчэй: кроў распірала сасуды ў галаве, але сэрца трапятала на сваім месцы — у грудзях, не ў жываце. Дзіўна, ці чуў хто ўдары сэрца жыватом? Можа, таму яно там, што ўчора не вячэраў, патраціў на падарунак усе долары і рускія рублі. Захацелася есці. Яшчэ адна дзіўная рэакцыя. «У цябе ўсё не як у людзей», — смяялася з яго Ядзя. Сапраўды, не як у людзей. Пасміхнуўся і прамовіў:

— Анекдот.

Чуў, як яны шэпчуцца за дзвярамі. Ядзя засмяялася. Гэта ўзлавала: «Яна яшчэ здольная смяяцца! Гэтая...» Ён падшукваў важкае слова і тут жа засаромеўся, што збіраўся вылаяць жанчыну: ніколі не дазваляў сабе такога. А Ядзя ж яго жонка...

Падхапіўся, ступіў да дзвярэй спальні. Паўтарыў уголас:

— Мая жонка... Мая жонка... жонка...

Дзверы не адважыўся адчыніць. Зноў адступіў ад іх, але сеў не на канапу — на цвёрдае крэсла каля стала.

Дзверы чамусьці запішчалі; Аксён не дапускаў гэтага — акуратна змазваў петлі алеем.

Дзверы адчыніліся, і ён высунуў пляшывую галаву, праводзячы вачамі разведку. Убачыўшы, што гаспадар мірна сядзіць, уціснуў галаву ў каўнер пінжака, згорбіўся, чакаючы ўдару, на насочках пайшоў да дзвярэй у калідор.

— Стой! — загадна гукнуў Аксён.

Палюбоўнік паслухмяна спыніўся.

— Сядзь! Будзем знаёміцца!

Ён павярнуўся да канапы.

— Не сюды! Вунь на тое крэсла, каля дзвярэй.

Ён сеў.

Аксён убачыў, што рукі ў яго «госця» дрыжаць, вусны пасінелі. Апанавала злосць на Ядзю і крыўда, што яна пакахала такога пляшывага і плюгавага.

«Не, ён не плюгавы. Адкормлены, што парсюк. Касцюмчык — з іголачкі, замежны, гальштук модны. Не забыўся завязаць. І прычасаў свае парадзелыя патлы. Перад падначаленымі пэўна арол. Ды і перад жанчынамі. Аднак дзе бачыў яго? Як дзе! Аксён, з тваёй памяццю! Вядома ж там, на вечары, у міністэрстве. На афіцыйнай частцы сядзеў у прэзідыуме. Але на прыёме згубіўся. Не танцаваў... Глядзіць, гад, з-пад ілба. Што ты мяне вывучаеш? Я цябе павінен пазнаць! І... што? Пакараць? Які я да д'ябла карацель! У мяне нават слоў карацельных няма, не мастак я на іх, на словы. Адно магу сказаць: ты брыдкі мне... ты падонак. Табе няма на што энергію траціць? Сваю жонку маеш...»

Злодзей кашлянуў, як бы нагадваючы, што ён тут чакае...

— Муж вяртаецца з камандзіроўкі і застае ў спальні... цябе... Як там далей?

— Што далей?

— У анекдоце.

— Я не знаю анекдотаў.

— А што ты знаеш? — голас гаспадара пагрозліва павысіўся, неяк сам па сабе, нервы не вытрымалі. — Як залазіць у чужыя ложкі? Гад ты!

Злодзей баязліва падняўся з крэсла.

— Будзеш біць?

— Цябе? Трэба! Але не хачу пэцкаць рукі аб такую поскудзь. Калі біць, то трэба забіць. Але не сталовым жа нажом. Я выклікаю цябе на дуэль. На рапірах. Калі быў студэнтам, я займаўся фехтаваннем.

Палюбоўнік смела і бадай здзекліва засмяяўся, адчуў, што біццё яму не пагражае. Падняўся, пайшоў да дзвярэй, адтуль сказаў:

— А ты гумарыст, рагаты рыцар.

Ах, сволач! Аксён схапіў цяжкую крышталёвую попельніцу (сам не курыў, але гасцям не забараняў, нават студэнтам, якія прыходзілі здаваць «хвасты»). Ды не кінуў. «Госць» ужо зачыніў за сабою дзверы. Не, не ў гэтым прычына. Ен убачыў, што праз шчыліну прыадчыненых дзвярэй за ім сочаць Ядвігіны вочы. Уніжаўся перад ёй не аднойчы. Але ў гэтай незвычайнай сітуацыі не мог зняважыць сябе кіданнем посуду, біццём шкла. Але не па-мужчынску баяўся яе выхаду са спальні. Што скажа яна? Што павінен сказаць ён?

Напружана чакаў.

Ядвіга не выходзіла.

Колькі ж можна сядзець у бяздзейнасці? Пайшоў у калідор. Убачыў, што «госць» не зачыніў добра за сабою дзверы. Вылаяў яго:

— Пляшывая свіння.

Узяў партфель. Вярнуўся ў «залу». Дастаў электрабрытву. Скінуў пінжак, світэр. Пачаў галіцца. Шум брытвы глушыў думкі. І зноў здалося, што ўсё, што ўбачыў, што сказаў за апошнюю чвэрць гадзіны, — кашмарны сон. Калі пагаліўся, вярнуўся да рэчаіснасці, і яна ўявілася такой горкай, што хацелася плакаць, як малому. Але зноў падумаў пра жонку. Каб яна ўбачыла яго слёзы! Ніколі не ўбачыць яго слёз роспачы, жалю да сябе. Бачыла яна слёзы ў яго вачах — замілавання да яе, захаплення ёю. Больш і гэтага не ўбачыць!

Пайшоў у ванну ўмывацца. Не здрадзіў даўняй звычцы расцерціся мокрым рушніком. Усе гэтыя звыклыя працэдуры занялі пэўны час. Не чуў, як Ядвіга прайшла на кухню, але пачуў пах смажанага. Нядоўга вагаўся: пайсці да яе, не пайсці? Пайшоў. Куды дзенешся!

Яна сядзела за сталом у халаце. Ненатуральнапрыгожая, толькі вочы яе патанулі ва ўпадзінах, пад імі залеглі цёмныя цені.

-Аксён павітаўся не без іроніі:

— Добрай раніцы, мая дарагая жонка.

— З прыездам, мой ненаглядны муж. Сядай. Я падсмажыла каўбасы.

Ён сеў на сваё звыклае месца.

— Як з'ездзіў?

— Добра.

— Як даклад?

— Фурор зрабіў.

— Шчаслівчык.

— Шчаслівчык! Ах, які шчаслівчык я! Жонка мяне ледзьве дачакалася. Сустрэла з абдымкамі.

— Не завадзіся.

— Хто ён?

— Хто?

— Ён. Госць твой.

— Наш чалавек.

— Геніяльна. «Наш чалавек у Гаване». Наш чалавек у маёй пасцелі. Гучыць!

— Каб яна не астывала, пасцель твая.

— Ты замярзала ў ёй?

— Замярзала.

— А ён нагрэў?

— Можа, і нагрэў. Але ж ты саромеўся пра гэта гаварыць. Ты такі цнатлівы! Анёльчык мой...

— Як яго прозвішча?

— Навошта табе? — і хоць бы вочы апусціла, нахабна глядзіць і ўсміхаецца.

— Павінен жа я ведаць, хто ляжаў у маёй пасцелі.

— Табе лепш не ведаць.

— Я павінен ведаць, каму я наб'ю морду.

— Чаго ж ты не набіў? Я чакала, што ты наб'еш. Які спектакль быў бы! Але і яго не атрымалася.

— Табе мала свайго спектаклю?

Яна апетытна жавала каўбасу. Адламывала ў хлебніцы хлеб.

Яму хацелася спытаць:

«Рукі ты хоць памыла?» — але пабаяўся: яна можа запусціць у твар яму гарачай каўбаскай, было ўжо аднойчы, калі яна плёхнула супам.

— Дык як яго імя?

— Ігар. Прыгожа, праўда? Не Аксён.

— Прозвішча? — раптам грымнуў ён.

Ядвіга спалохалася, вочы яе расшырыліся.

— Камяк.

— Камяк... Камяк чаго?

— Ты не можаш даравацъ?

— Не магу.

— Развод? Навошта трапаць адзін аднаму нервы?

— Я падумаю.

— Думай, Чапай. Ты заўсёды хораша думаеш. Разумна. Такая галава не можа прыдумаць глупства, — твар яе пасвятлеў, у вачах загарэліся гарэзлівыя іскры.

І ў той дзень нічога не вырашылі. Яна паехала на працу. Ён лёг спаць на канапе. І дзіўна — заснуў. Прачнуўся, праўда, з галаўным болем, каўтнуў анальгін.

У час вячэры да адносін сваіх не вярталіся. Мірна і ляніва гутарылі на іншыя тэмы.

І на другі дзень змаўчалі. І на трэці. Ён спаў на кароткай канапе, яна — у двухспальным ложку.

І Аксён, ліберал, гуманіст, пачаў думаць, што такі грэх можна даравацъ. Каралям, царам, нават шахам жонкі рогі настаўлялі. Ды і мужчыны далека не усе такія сухары, як ён. Такая пэўна прырода чалавечая — грэх ад Адама і Евы пайшоў.

Яго страшыў шлюбаразводны працэс. Але яшчэ больш ён баяўся застацца ў адзіноце. Што рабіць? Ажаніцца ў другі раз? З кім? І хто гарантуе, што тая, другая, будзе лепшая за Ядзю? Відаць, сапраўды вінаваты ён: не здольны даць жонцы ўсе радасці, якія яна хоча.

3

Аксён Пракопавіч на прыпынку прапусціў свой тралейбус: задумаўся, і спрытныя студэнткі чужога факультэта апярэдзілі яго, штурмам узялі ўваход. Ён не хацеў ціснуцца паміж імі, ды і не спяшаўся нікуды. Думаў аб сваім жыцці, аб сваіх адносінах з Ядзяй. Яшчэ ўначы ён, талстовец, непраціўленец, вырашыў дараваць жонцы, памірыцца і... наладзіць жыццё. Здаецца, яна паразумнела, стала добрая, гаварлівая, папракала, што ён занадта маўчыць.

— Прафесар! Развучышся гаварыць. Хоць навошта табе гаварыць! Ты можаш пісаць формулы. Напішы мне формулу жыцця.

— А ты не ведаеш яе?

— Не ведаю.

— Чытаеш раманы... Столькі класікаў папрацавалі, каб увесці ў нашы галовы формулу жыцця.

— Класікі напісалі Наташу і напісалі Элен, ідыёта Мышкіна і... як яе там, гераіню, з-за якой разгарэўся сыр-бор? З каго мне браць прыклад?

— Выбірай.

— Выбірала-выбірала і плюнула. Жыву як хачу. Свабода! Столькі вылілі чарніла і крыві на нашу эмансіпацыю.

— Разбэшчанасць не свабода.

— Занудлівы ты чалавек, Аксён. Але, як ні дзіўна, я люблю цябе.

І гэтым і словамі перавярнула яму душу.

Уначы цвёрда вырашыў: памірыцца; самае дарагое для чалавека — мір, мір у сям'і, у грамадстве, у дзяржаве.

З'явілася жаданне пайсці да яе ў спальню. Не сумняваўся, што Ядзя прыняла б. Але ён маральна не быў га-

товы. Баяўся. Самога сябе баяўся.

І вось цэлы дзень рыхтаваў сябе да прымірэння. Нават на лекцыі. Даў студэнтам задачу, яны рашалі, а ён думаў. І тут, на прыпынку, напружана думаў, што сказаць ёй, каб не ўнізіць свой мужчынскі гонар і каб яна паверыла не ў яго фізічнае жаданне, а ў душэўную шчырасць.

Не сумняваўся, што такое рашэнне іх праблемы адзіна правільнае — для жыцця, для працы, бо два тыдні не было ні жыцця, ні працы — адны адмоўныя эмоцыі; так можна давесці сябе да псіхбальніцы. Не дзіўна, што людзі ламаюцца ад такіх перажыванняў — і мужчыны, і жанчыны: страляюцца, глытаюць атруту. Дзікунства — пазбаўляць сябе жыцця. Але што зробіш! Бог нечага не дадаў чалавеку ці, наадварот, перадаў лішняе, непатрэбнае; чалавека варта скарэкціраваць.

«Не, ён сам сябе павінен карэкціраваць. Як я зараз. Толькі трэба ачысціцца ад перажыткаў, мабілізаваць волю...»

І — о жах! — убачыў яе, сваю няверную. Яна ехала ў машыне, за рулём, а побач... Кроў ударыла ў галаву ад таго, што побач з ёй сядзеў ён, пляшывы камяк, і морда яго блішчэла, што намаслены блінец.

Аксён адступіў за спіны пасажыраў, што стаялі ў чарзе. Спалохаўся? Чаго? Каб яны не ўбачылі яго? Не ўбачылі, вельмі занятыя дарогай і размовай. Яна смяялася. А ў яго зноў сэрца сарвалася са свайго месца, зноў... не, не загрукала — няроўна заплёхала неяк у жываце, распірала вантробы, бо разануў боль.

— Ну вось табе і мір! Вось табе і мір!

Мабыць, сказаў уголас, бо тыя, хто стаяў побач, паглядзелі на яго са здзіўленнем: што з чалавекам? Здаецца, не п'яны.

Адступіў да ганка універсітэта, як бы шукаючы абароны. Гаварыў сам з сабою:

— А што ты цяпер скажаш? Будзеш плакаць ці скакаць, раб Божы?

Не сумняваўся, куды Ядзя павезла свайго пляшывага. На бацькоўскую дачу. Ездзіла пазаўчора, у нядзелю. Вярнулася задаволеная, прапахлая яловым дымам.

Расказвала, што яны з маці добра прыбралі дачу і добра напалілі — абжылі пасля зімы.

— Хутка на палявыя работы!

Не любіла яна гародніх спраў, прызнавалася; маці ўсё рабіла, а тут — дзіва! — раптам выказала жаданне хутчэй закасаць рукавы. Аксён усё зразумеў.

Пакінуў чаргу і пайшоў пехатою ў свой мікрараён, кіламетраў шэсць. Хацеў стаміць сябе да знямогі.

Хада сапраўды супакоіла, вярнула сэрца на месца. А можа, не хада — цвёрдае рашэнне, супрацьлеглае таму, над якім пакутаваў уначы, у аўдыторыі, на стаянцы: «Так жыць далей нельга! Я не паважаю сябе. Яна здзекуецца з мяне».

Але дома стала шкада сябе, ажно вочы набрынялі слязамі. Хадзіў па цесным пакоі, як злоўлены звер. На кухню не заглянуў, не паабедаў. Але чамусьці часта заглядваў у спальню, перастаўляў на туалетным століку яе флакончыкі і каробачкі. Злавіў сябе на тым, што перастаўляе любоўна, без злосці, як бы надоўга наводзячы парадак. Узлаваўся на сябе.

І раптам прыгадаў сваю дружную сям'ю, з замілаваннем успомніў, як бацька ставіўся да яго званняў. Кандыдата прыняў як бы з разумением. Доктар яго здзівіў.

«Што ета — вышэй за кандыдата?»

«Што ты, бацька, самая высокая навуковая ступень!» — сказала сястра Таня, настаўніца.

«Ты глядзі! У каго ты ўдаўся. Я двойкі па матэматыцы меў ».

«А я толькі пяцёркі», — сказала маці.

Здзівіўся бацька непаважліва: «Няўжо ў цябе ўдаўся?»

А вось прафесар яго вельмі ўзрадаваў. На радасці добра абмыў сынава званне. Танцаваў з качаргою — п'яны ён быў пацешны, бацька яго. А ён толькі аднойчы ў жыцці быў п'яны — па завяршэнні першага курса.

Успамінамі глушыў трывогу. Не трывогу — страх, які нарастаў з набліжэннем вечара.

«А можа, яны заначуюць там? Не, прыедзе! І я скажу ёй!.. Я павінен сказаць. Далей так нельга! Але ці здолею сказаць?»

Баяўся, што з'явіцца яна — і знікне яго рашучасць, зноў будзе гарадзіць глупства, няхай і калючае, але ж безвыніковае. А трэба сказаць адно кароткае слова! Кінуць яго, як камень. У твар ёй кінуць! У твар! Думаў так, але гневу ў душы распаліць не мог. Чагосьці было шкада. Чаго? Не яе, не! Кахання свайго. Восем гадоў жыў з ім, і яно грэла, давала натхненне! У працы, у жыцці. А цяпер трэба ўсё разбурыць! Адным ударам — словам адным. І застацца ў адзіноце. Зразумеў, што палохае: адзіноцтва. У вялікім горадзе. Яно горшае,

чым у лесе. Аднак адступлення не можа быць. Ядвіга можа парушыць яго рашучасць, яна ўмее. Можа, выпіць для смеласці?

Выпіў чарку брэндзі, ёю недапітага. Сагрэла. Але праз колькі хвілін нагнала большага жалю да сябе, няшчаснага. Не бывае ў жыцці поўнага трыумфа. Поспех у адным ураўнаважваецца няўдачай у іншым. Радасць— горам...

«Але чаму я раблю з гэтага гора? Мільёны людзей разыходзяцца. Гэта ж не тое гора, што пахаваць блізкага, самага дарагога, развітацца назаўсёды. А якое гэта гора? Яна ведала, на што ішла. Аднак якая гэта брыдота — фізічная ненасытнасць! Якая недасканаласць розуму! Жывёльны інстынкт. Ды не, у жывёл такога няма, яны спарваюцца для дзетанараджэння. А яна не хоча дзяцей... Чаму? «Нараджу я табе, не спяшайся». Калі? Ужо ніколі... Ніколі».

Ён сядзеў ля стала, сціснуўшы галаву далонямі, калі яна ўляцела. Што вецер, вясёлая, мурлыкаючы незнаемы матыў, яна ведала процьму песень.

— Баліць галоўка? Гаротнічак мой! Пайшоў бы пагуляў. Такі вечар! Вішні зацвілі, — выдала, што была на дачы.

Нырнула ў спальню. Доўга адтуль не выходзіла. А ён не адважваўся зайсці туды: зноў узнікла нерашучасць, бадай страх. Перад ёй? Смешна.

Прымусіў сябе падняцца, увайшоў у спальню. Ядвіга стаяла ў адной сарочцы — не паспела пераапрануцца.

Яе прыгожае цела асляпіла яго, паламала рашучасць.

— Любуешся? Любуйся, любуйся. Можа, у табе абудзіцца мужчына, — яна засмяялася.

— Бачыў я цябе... з ім... у машыне...

— А-а, — застыла з салфеткай, потым хутка накінула халат. — І што?

— Так жыць нельга! — хрыплым голасам выгукнуў Аксён.

— Нельга, — згадзілася яна і рашуча спытала: — Развод?

— Развод!

Яна сцялася, памаўчала, падумала.

— Ну што ж, развод дык развод. Даўно наспяваў. Аксён знясілена прысеў на пуфік — растраціў усю энергію, але адчуваў задаволенасць: нарэшце ў яго хапіла волі! Але шкадаванне сябе не знікла. І ён раптам пашкадаваў неразумнае стварэнне. Так і падумаў: стварэнне, не жанчына, не баба.

— Я пераеду ў інтэрнат, — і тут жа ўпікнуў сябе за такі рашучы крок.

— Ты? О не! Такой ахвяры я ад цябе не прыму. Кватэру далі табе. І ты паедзеш да студэнтаў? Пан прафесар! Не гнiся! Не будзь праведнікам. Паеду я да бацькоў. Навошта старым чатыры пакоі на дваіх? У жмуркі ганяць? — у яе дрыжэлі пасінелыя вусны, але яна спрабавала жартаваць.

Яе высакародства кранула ледзьве не да слёз. Памаўчалі.

— Гэта доўга — развод?

— Ты спяшаешся?

— Тры месяцы чакаць... Так, здаецца?

— Не бойся. Папрашу бацьку... ён дамовіцца з раённым суддзёй...

— Папрасі, калі ласка. Зноў памаўчалі.

— А знаеш, не будзем мы мазоліць адзін аднаму вочы. Я пераеду сёння. Неабходнае вазьму... адзенне... і астатняе — калі прыеду на сваёй машыне. Што аддасі...

— Я ўсё аддам. Акрамя хіба кніг...

— Які ты шчодры! Абы з вачэй прэч! Усяго мне не трэба. Я не голая. Вазьму сваё. Канапка твая мне без патрэбы. У бацькоў — італьянская мэбля.

Зноў стала амаль да слёз шкада сябе... І яе... яе, дурніцу.

«Пашкадуе... Яна пашкадуе? Супакойся, пан прафесар! Не з твайго яна цеста».

Сабралася Ядвіга хутка. Папрасіла Аксёна выклікаць таксі. Ён памог ёй знесці два цяжкія чамаданы.

Спускаліся па лесвіцы, яна ішла ззаду са сваёй сумачкай. Хмыкнула:

— Ашаламлю я сваіх старых.

— Магу зразумець іх.

— Але ім не прывыкаць. Упершыню я ашаламіла іх у дзесятым класе... калі зацяжарыла ад свайго аднакласніка.

Аксён спатыкнуўся. Спыніўся, павярнуўся, баязліва аглянуўся на чужыя дзверы: не пачуў бы хто! Шэптам папрасіў:

— Не трэба, Ядзя. Нашто табе раздзяваць сябе?

— А я хачу раздзецца перад табой. Зусім. Спектакль скончаны. Заўтра буду іграць другі. З другім партнёрам. Каго толькі сыграць? Афелію?

Не ведаў, што адказаць ёй. Толькі адчуў, што шкадуе яшчэ больш. Зламаны чалавек. Але і ўзлаваўся: а хіба яму яна не паламала жыццё?

Калі паклалі ў багажнік чамаданы, Ядвіга сумна ўсміхнулася і вінавата папрасіла:

— Можна цябе пацалаваць?

Моцна абхапіла за шыю, горача пацалавала ў вусны. У яго ажно заняло дыханне, і мацней загрукала сэрца.

Адкрыўшы дзверы машыны, сказала як бы не яму — шаферу:

— Ты добры чалавек, Аксён, я люблю цябе. Машына сарвалася з месца. А ён стаяў і бяздумна

глядзеў ёй услед — спустошаны, разгублены. У Ядвігі шафёр спытаў:

— На вазкал?

— Не, на вуліцу Карла Маркса. Дадому, да бацькоў. Ад мужа...

— Развяліся?

— Разводзімся.

— І так цалаваліся?

— Мы — інтэлігентныя людзі.

— Яно і відаць. А я ўчора сваёй кухталёў надаваў — круціла хвастом перад сябрам маім. І яму даў па мордзе. Я, канешне, на моцным узводзе быў. Цвярозы я рахманы. Ваш піў?

— Не.

— І не біў вас?

— Што вы! Ён прафесар.

— І вы кінулі такога чалавека?

— Я пакахала другога.

— Я паказаў бы табе каханне! Неба ў аўчынку здалося б!

Шафёр павярнуў галаву, зірнуў на яе са злосцю, нахмурыўся і больш нічога не сказаў ні пра яе, ні пра сябе, толькі мацюкнуўся на няўмелага прыватніка:

— Развялося вас, раздалбаеў, маць вашу...

— Не распускай язык! Жанчыну вязеш...

— Я табе не муж, каб ты на мяне цыкала. Важу я такіх па дваццаць на дзень... І напляваць мне на вас.

«Хам», — падумала пасажырка, але сказаць гэта ўголас не адважылася: чаго добрага, высадзіць, ад такога ўсяго можна чакаць.

Маці не ахнула, не пляснула рукамі, не заплакала. Сумна сказала:

— Я лягла пасля абеду і сасніла нядобры сон.

— Сон твой у руку.

— Аксён даведаўся пра гэтага твайго... як яго?..

— Ігара, свет Пятровіча. Даведаўся! Як яшчэ даведаўся! Прыехаў на дзень раней з Масквы...

— О Божа! Адкуль у цябе столькі цынізму?

— Ад сытага жыцця.

— Ах, Ядзя, Ядзя! Калі ты за розум возьмешся? Што бацька?

Суддзя Закрэўскі быў яшчэ на працы. Сустракацца з бацькам Ядвізе не хацелася — хуткі на расправу, гарачы, няхай астыне. Бацька добры, яна любіла яго. Але рукі распускаў. І ў маленстве даставалася часта, і дарослай колькі разоў адвешваў звонкія аплявухі. Але кара не была для яе навукай, наадварот, пасля такога выхавання рабіла ўсё на злосць бацькам.

Пазваніла свайму каханаму. Рабочы дзень канчаўся, але ён знаходзіўся ў кабінеце: адпрацоўваў прапушчаныя для паездкі на дачу гадзіны.

Прапанавала сустрэцца. Адчула, што яму не хочацца сустракацца другі раз на дні. Моцна ўзлавалася, але злосці сваёй не выдала, уніжана папрасіла:

— Мне трэба табе такое расказаць! Такое... Ты парад уешся.

Расказала весела, са смехам, гуляючы па парку. Але радасці ў Камяка не пачула, убачыла, што ён пазмрачнеў. Гэта яе раззлавала яшчэ больш.

Вярнулася дадому як пабітая. І каб абяззброіць бацьку, зарыдала на яго плячы.

Разгублены Закрэўскі ласкава гладзіў плечы дачкі.

— Ну, супакойся, супакойся. Не ты першая, не ты апошняя. Разводзяцца сорак працэнтаў. А сярод маладых — кожны другі.

Суддзя спытала:

— Што вас прымушае, пан Крапіўка, разводзіцца?

— Не наладзілася жыццё. У мяне цяжкі характар. А Ядвіга адказала зусім інакш:

— Аксён Пракопавіч сказаў няпраўду. Вінаватая я. Я пакахала другога і жыву з ім.

У суддзі, сталай жанчыны, і ў сонных засядацеляў, якім абрыдлі такія працэсы, здзіўлена расшырыліся вочы. Пытанняў з іх ніхто больш не задаў. Не раючыся, вынеслі вердыкт: развесці.

Разам спускаліся па лесвіцы з другога паверха. І Ядвіга ўзяла яго пад руку.

— Не пярэчыш? Апошні раз прайду пад ручку з табой. Ты ва універсітэт ці дадому?

— Дадому.

— Я падвязу цябе, у мяне машына.

— Не, не трэба. Дзякуй. Баюся.

— Чаго?

— Раптам завязеш на новую рэгістрацыю. Яна весела засмяялася.

— А ты аваладваеш гумарам. З цябе будзе чалавек.
— А цяпер — не чалавек?
— Цяпер — прафесар, набіты формуламі.
— Гэта я чуў.
— Больш не пачуеш, — адчыніла дзверы. — Сядай.
— Не.
— Ну і дурань.
— Дзякуй.
— Гуд бай, сонца васьмі гадоў майго жыцця.
— Будзь здаровая.
— І табе — новага шчасця.
— Ты не аднойчы ўспомніш мяне.
— Успамінаюць па-рознаму.
— Як хочаш, але ўспамінай, — і нырнула ў машыну, завяла матор.

Ён стомлена пакрочыў пад слякотным майскім сонцам.

Нейкі час Аксён Пракопавіч ішоў бяздумна, душэўна спустошаны. Развод не даў адчування вызвалення. Здавалася, што ён не вызваліўся, а наадварот заблытаўся. Што ў яго засталося? Матэматыка? Але з ёю можна легчы ў труну, а не ў мяккі ложак. З ёю можна паразмаўляць, рашаючы адмысловыя задачы, але да яе не прытулішся, не пацалуеш і не пагаворыш нават аб самым простым — аб жыцці.

Ядвіга ўмела пагаварыць пра жыццё, пра чужое — асабліва, ведала ўсе навіны, быццам мела прамую сувязь з добрай сотняй знаёмых; не толькі міністэрскія, але і універсітэцкія плёткі ведала такія, пра якія ён не чуў.

Спыніўся на скрыжаванні і як застыў; двойчы ці тройчы памяняліся «чалавечкі» на светафоры — зялёныя на чырвоныя і наадварот. Ці трэба яму пераходзіць на той бок? На бок чаго — праспекта ці жыцця? Можа, пайсці на чырвоны перад патокам іншамарак? Затармазілі б яны? Ці змялі б яго? І скончыліся б усе праблемы.

Схамянуўся. Дурныя думкі! Пасаромейся, прафесар! Лягчэй ад вяртання ў рэальны свет не стала. Зноў, як не аднойчы ў бяссонныя ночы пасля ад'езда Ядзі, агарнуў смутак адзіноцтва і жаль да сябе.

Абрабаваны, пакрыўджаны, з выбітым цвёрдым грунтам, на якім стаяў, здавалася, трывала. Але ён не быў, выходзіць, цвёрды, проста яму, аслепленаму сваёй навукай, так здавалася. А чалавек, на якога абапіраўся, бессаромна ашукваў яго.

«Будзь ты праклятая!» — сказаў уголас, ажно нейкая жанчына здзіўлена зірнула на яго, але тут жа дакарыў сябе: нядобра праклінаць

чалавека. Не жадае ён Ядзі зла. «Будзь шчаслівая», — сказаў на развітанне без усялякай злосці, са шчырасцю.

Перабег шырокі праспект, калі светафор ужо маргаў, і машыны, што звяры, рвануліся на яго.

Пасміхнуўся: «А, баішся, фаталіст? — сказаў з іроніяй, як камусь чужому, а сябе ўзбадзёрыў: — Не раскісай, прафесар. Не на ёй свет клінам сышоўся. Вунь іх колькі, Ядзяў, і усе прыгожыя. У летніх кароткіх сукенках. Каралевы!» — і залюбаваўся ножкамі дзяўчат, што ішлі наперадзе, але тут жа папракнуў сябе: — Грэшнік ты, пан прафесар. Не засушылі цябе ні матэматыка, ні... Ядзя. О Ядзя! Яна рассушыла, размачыла. З ёй я быў мужчынам, нават калі яна шпіляла мяне, часам жартаўліва, а нярэдка і злосна. І ў судзе я застаўся мужчынам. Але ж яна. Во чортава адроддзе! Чаму адроддзе? Такая бязлітаснасць да сябе магла быць ад роспачы. Прызналася на лесвіцы, што зацяжарыла яшчэ ў дзесятым класе. І ў судзе — што жыве з другім».

Прыцягнула ўвагу шыльда з кароткім словам «Бар». Сто разоў праходзіў тут і не звяртаў увагі. А тут спыніўся. Паглядзеў, аблізнуў засмяглыя вусны. Адчуў, што хоча выпіць. Халоднай «пепсі-колы» і чагось з градусамі. Кажуць, алкаголь глушыць эмоцыі. Але эмоцыі бываюць розныя. Сёння алкаголь можа памагчы парадавацца, што ён нарэшце вызваліўся. Трэба стымуляваць радасць. Радасць! П'юць з гора, але п'юць і адзначаючы знамянальную падзею. А ў яго сёння такая падзея — паварот у жыцці. Круты паварот.

У бары панавала прыемная прахалода і гэтакі ж прыемны водар розных экзатычных напояў.

За стойкай стаяў малады чырванашчокі бармен, перад стойкай на высокіх кругляках сядзела пара — ён і яна, маладыя, абое ў шортах. Усяго і наведвальнікаў.

— Прашу вас, — прыветліва сказаў бармен і паказаў на правы кругляк воддаль ад маладых. — Калі ласка.

Аксён бар наведваў разы тры, не дома — у замежных камандзіроўках.

Са спрытам заўсёдніка прымасціўся на кругляку.

— Вам што, прафесар?

На слова «прафесар» азірнуліся маладыя, і Аксёну Пракопавічу стала ніякавата. «Адкуль ведае? Падумаюць, што я сюды часта заглядваю».

— Каньяка.

— Каньяк у нас дарагі, французскі.

— Чорт з ім, — сказаў са злосцю. Грошы былі — учора атрымаў аванс, прафесарскі.

— Калі ласка, прафесар.

Наліў трэць высокай шклянкі з тоўстага шкла. Невялікая порцыя

— Лімона?

— Лімона.

Аксён угледзеўся ў бармена: знаёмая фізіяномія.

— Дзе я вас бачыў?

— Я ў вас вучыўся, прафесар.

— А-а, успомніў. Па-мойму, вы добра паспявалі па маім прадмеце.

— Я любіў матэматыку.

— Што ж вас прымусіла?..

— Скгды? Я тры гады рабіў у школе. Але вы ведаеце, якая зарплата ў настаўнікаў.

— Тут больш?

— Не параўнаць!

— А мне сумна, што вы не ў школе.

— Мы вас разумеем, — сказала дзяўчына, цягнучы праз саломінку нейкі кактэйль. — Але зрабіце, каб плацілі ў школе.

— На жаль, я не прэзідэнт.

— А хацелі б ім быць?

— Не, не хачу.

Усе трое весела засмяяліся.

— Піце, прафесар, а то вытхнецца.

Ведаў, што каньяк смакуюць, але выплюснуў усю порцыю ў рот. Абпаліла горла, страўнік; і ўміг ударыла ў галаву. Праз хвіліну-дзве, стала бадай весела, зніклі змрочныя фарбы жыцця.

«З чаго я раблю праблемы? Усё трын-трава. Радасці, выходзіць, на дне гэтай шклянкі. Ядвіга цягнулася да пляшкі, і гэта трымала яе на высокай вясёлай ноце. Але да д'ябла Ядзю!»

— Налі яшчэ, мой добры вучань.

— Калі ласка.

Ад другой порцыі стала яшчэ весялей.

Суседзі разлічыліся, пажадалі яму прыемнага апетыту і пайшлі. І бармен знік за дзвярамі тылавога пакоя. Нейкі час Аксён сядзеў адзін, слухаючы «музыку каньяка» ў сваім арганізме. Прыемная «музыка» — адагнала ўсе перажыванні, ад якіх пакутваў ажно два месяцы. Жыць бы ў такім стане ўвесь час — ні матэматыкі, ні жончыных калючак.

«Да д'ябла жонак! Не ажанюся больш! Вунь калегу майму Мядзведскаму за пяцьдзесят, і ён дагэтуль халасцяк. І нічога — бадзёры, вясёлы, гумарыст, анекдотчык ».

Высмактаўшы лімон, з'еў горкія коркі. Паклікаў бармена.

— Плясні, браце, яшчэ гэтай праклятай гары.

Хлопец здзівіўся.

— Я сёння развёўся з жонкай. А ты жанаты?

— Развёўся таксама.

— Рана. Але, можа, правільна зрабіў. Дай што-небудзь пажаваць, а то я ап'янею.

— Ёсць крабавыя палачкі. І каўбаса.

— Давай і тое, і тое.

Ад трэцяй чаркі весялосць пачала як бы павольна патухаць. А на чацвёртай, якую ён не выплюснуў ужо, а павольна цадзіў праз зубы, раптам успыхнула злосць — на чорным папялішчы лагоды і весялосці. Спачатку нават спалохаўся: злосць на сябе? Услухаўся. Не. На яе і на яго, пляшывага. Сказаў уголас:

— Любое зло павінна быць пакарана.

Бармен не здзівіўся, мабыць, сам трымаўся такой жа думкі.

— А што, калі набіць яму морду?

— Правільна зробіце, — ухваліў бармен, здагадаўшыся каму.

Прафесар схамянуўся: «Што гэта я адкрываю душу перад гэтым хлюстом? Не трэба? Мая тайна — гэта мая тайна. А морду набіць трэба. Пасадзяць? Не пасадзяць. Я ж не збіраюся яго забіваць. Паглажу яму плеш, каб унізіць, як ён, гад, унізіў мяне, забраўшыся ў маю пасцель. Пайду да яго. У міністэрства?.. Не, дадому. Каб жонка бачыла...»

Неяк сядзеў у дэкана. На стале ляжаў тоўсты тэлефонны даведнік. Спачатку бадай машынальна адгарнуў прыватныя тэлефоны. Потым адлістаў літару «К». Хутка знайшоў: Камяк Ігар Пятровіч. Адрас, тэлефон. А памяць у яго на лічбы фенаменальная, запісваць не трэба. Нумар дома, кватэры трымаліся ў галаве, як забітыя цвікі.

«Не паб'ю, дык хоць напалохаю. Ён чакаў, што я паб'ю яго ў тую злашчасную раніцу. А я — размазня. Талстовец няшчасны».

Кароткія ўсходцы здаліся даўжэзнай лесвіцай, як у метро. У тралейбусе жанчыны адварочваліся ад яго. Гэта злавала. Хацелася кінуць ім абразлівае, але стрымаўся: злосць, як і радасць, трэба берагчы.

Доўга стаяў перад дзвярамі, не адважваючыся пазваніць. Слухаў, як тахкае сэрца, пульсуе кроў у скронях. Ад каньяка? Ці ад незвычайнасці сваёй задумы? Разумеў, што ўдарыць ён не здолее — п'яная фантазія. Не дарэмна п'яныя часам робяць нечаканыя, вар'яцкія ўчынкі.

Хацеў ужо спускацца назад. Але з суседняй кватэры выглянула жанчына, мабыць, сачыла ў «вочка», ветліва сказала:

— Пазваніце яшчэ раз. Ірына Уладзіміраўна дома, я нядаўна хадзіла да яе. Хіба заснула...

Адступаць няма як — пазваніў, хаця падумаў:

«А навошта мне Ірына Уладзіміраўна?» Але тут жа загарэлася цікаўнасць: якая ў яго жонка?

Яму без запытання «хто?» адчыніла прывабная, танклявая жанчына, смуглявая, што мулатка: чорныя валасы, модная завіўка, вялізныя карыя вочы, пад чорнымі, як намаляванымі, брывамі.

Не здзівілася, але ўважліва ўгледзелася, пэўна, пазнаючы. І ён пазнаў яе. Некалі звярнуўся ў паліклініку з болем у паясніцы, і хірург паслаў да неўрапатолага. І вось гэтыя мяккія ручкі мацалі і млялі яго паясніцу, ажно рабілася няёмка.

Дык вось якая яна, яго жонка! І ад такой ён бегае налева? І ён зазлаваў яшчэ больш.

«Я такі дам яму па мордзе. Не сёння — заўтра. У міністэрства пайду, знайду яго там».

Прыветліва і вінавата ўсміхнуўся гаспадыні:

— Я пазнаў вас, Ірына Уладзіміраўна.

— І я пазнала вас. У вас цікавае прозвішча — Моіжаўка. Так?

Ён засмяяўся.

— Не так. Крапіўка.

Шчокі яе запунцавелі, і ад гэтага яна стала яшчэ больш прывабная.

— Прабачце. Аднак праз парог... Праходзьце.

Аксён Пракопавіч нясмела пераступіў парог. Зняў капялюш. Яна запрасіла яго ў даволі прасторны пакой са знаёмым «Гарызонтам» і такой жа, як у яго, канапай. Але сервант стаяў шыкоўны, імпартны, за шклом — дарагія сервізы, кубкі, чаркі, фужэры, фарфоравыя фігуркі звяроў. Стол на такіх жа выгнутых ножках, два мяккія крэслы з таго ж камплекта. Як трапіла сюды прымітыўная бабруйская канапка?

Падумаў: на ёй спіць яна, калі даведалася пра здраду пляшывага. Яны — таварышы па няшчасцю. У вачах зашчыпала ад жалю да яе, гаротнай.

— Сядайце, — яна паказала на мяккае крэсла.

Ён сеў, паклаўшы рукі на калені, як вучань у настаўніцкай. Яна села на канапе, насупраць. Нейкі час глядзелі адзін на аднаго. Ён любаваўся ёю, раптам супакоены — перастала балець галава. Яна, бадай, вывучала яго, мабыць, жадаючы здагадацца, з якой нагоды з'явіўся гэты нечаканы госць.

— Вы да мяне?

Аксён Пракопавіч набраў паветра поўныя грудзі і баяўся яго выдыхнуць.

«Што сказаць? Як сказаць? Ганебна стаць даносчыкам. Але я скажу! Я скажу... Яна павінна ведаць... Няхай ведае, а то, можа, жыве ў няведанні і, можа, цешыцца».

Гучна выдыхнуў, узлаваўся на сваю нерашучасць:

— Я прыйшоў даць па мордзе вашаму... пляшываму кату. : УчйИ

Яе вочы расшырыліся ад здзіўлення, сталі яшчэ прыгажэйшымі, але ён убачыў у іх іскрынкі смеху.

— Вы можаце гэта зрабіць?

— Я не знаю. Можа, гэта такая п'яная фантазія. Я напіўся сёння, — і як бы апраўдаўся перад ёй: — Першы раз у жыцці.

— Я не пытаю — за што...

— А я скажу. Сёння я развёўся з жонкай.

— О Божа! — Ірына Уладзіміраўна панурыла галаву і апусціла вейкі.

А яго прабіла на шчырасць, на бязлітасную шчырасць: няхай ведае!

— Я застаў іх у ложку... у сваім... Прыехаў з Масквы.

Яна закрыла твар далонямі.

— Прашу вас. Не трэба. Я ведаю больш. О, колькі я ведаю!

— Ведаеце і церпіце? Жывяце з ім?

— Як мы жывем — адзін Бог ведае.

— Да плюньце вы на яго! Вы такая... — не сказаў, што прыгожая. — І вы маеце кавалак хлеба. У вас добрая прафесія.

— У вас ёсць дзеці?

— Не. Яна не хацела.

— Вам лягка. А ў нас сынок. Я мусіла завезці да мамы, каб ён не бачыў п'янага бацьку. Ён нярэдка прыходзіць п'яны і куражыцца.

— Б'е вас?

— Не. Што вы! Хіба я дазволіла б. Я таксама з характерам. Быў чалавек як чалавек. Гады два назад што ашалеў. Загадчык аддзела... Атмасфера ў іх там такая ці што? Я, урач, хадзіла да варажбітак, суседка сказала, што гэта нейкая зладзейка заваражыла яго. Можа, ваша?.. Прабачце.

— Можа, і мая. Мяне яна заваражыла. Умела...

Ірына сумна пасміхнулася. Пасля слоў пра сынка

Аксён Пракопавіч пранікся да яе нейкай асаблівай павагай. Захацелася ўпасці на калені і пакланіцца. Разумеў, што на такое рыцарства штурхае выпіты каньяк; з намаганнем стрымаў нечаканае жаданне. На калені ён падаў перад маці, калі яна апынулася ў бальніцы, і аднойчы перад Ядзяй, кал і тая прырэўнавала яго да незнаёмай дзяўчыны, з якой пайшоў танцаваць, пакінуўшы жонку адну. Але калі

тое было! Тады яны рэўнавалі адзін аднаго з-за любога неасцярожнага слова, з-за кампліментa: яго — жанчыне, яе — мужчыне.

Нейкі міг яны сядзелі моўчкі, разгубленыя, не ведаючы, што яшчэ можна сказаць адзін аднаму, каб не вярэдзіць раны, а лячыць іх.

І раптам ён нечакана для сябе прапанаваў:

— А знаеце што, Ірына Уладзіміраўна?

Яна насцярожылася.

— Давайце махнём у рэстаран. Гульнём. Патанцуем. Я хораша танцую.

Яна спалохалася:

— Ну што вы! Як я магу? Я тры гады не была ў рэстаране. Я баюся іх. Цяпер — асабліва. Я не пераношу рэстараннай музыкі. У мяне баліць галава. Ды і вам... Вы ўжо выпілі. У вас бледны твар. Я напаю вас чаем. Хочаце?

— Хачу.

Ірына паднялася. Але каля дзвярэй спынілася, вінавата паглядзела на госця.

— Не. Прабачце. А раптам вернецца мой... канец жа дня. Рэдка так рана з'яўляецца. Але, як кажуць, чым чорт не жартуе... І вы можаце сапраўды пабіцца. Ён задзірысты. Не дай Бог. Ваша бойка даканае мяне.

— Не бойцеся. Я не буду біць яго. Не дазволю сабе паставіць вас у няёмкае становішча. Мужайцеся! Але не будзьце талстоўкай!

— Кім?

— Непраціўленкай злу... Са злом трэба змагацца!

— Каб мне вашу рашучасць.

— Думаеце, мне лёгка далося?

— Разумею. Але і вы зразумейце...

Ён пацалаваў ёй рукі, адну і другую. А яна лёгка дакранулася вуснамі да яго ілба і сказала:

— Бог з вамі.

Аксён Пракопавіч выйшаў з пад'езда і ледзь не галёкнуў ад радасці. Парадаваўся за сябе, што і п'яны — не дурань. Парадаваўся вясне, цёпламу вечару, сонцу. Пацешыўся дзецьмі ў пясочніцы, пенсіянерамі, якія з вясёлым смехам забівалі «казла». Але стаяла перад вачамі Ірына, і сэрца сціснулася — за яе. Каб ён мог памагчы ёй! Ды як памагчы?..

5

У напружанай працы падчас экзаменацыйнай сесіі Аксён Пракопавіч забываўся на свае перажыванні. Удзень. Але ўначы яны

наплывалі, што хмары, цёмныя, пагрозныя, і лёгкія, жаданыя. Думаў... думаў пра Ядзю, але яна была як бы ў далечыні, у тумане. Бліжэй стаяла мулатка, смуглейшая, чым была на самой справе, і ад гэтага яшчэ больш таямнічая і прывабная. Сніў яе, часам так, што, прачнуўшыся, чырванеў. Але вобраз Ірыны Уладзіміраўны быў цьмяны, таму і пераўтваралася яна ледзь не ў негрыцянку: нядоўга, вельмі нядоўга глядзеў на яе п'янымі вачамі. Варта глянуць цвяроза, і, можа, тады яна страціць сваю незвычайнасць і не будзе так вабіць; жанчына як жанчына, як тысячы іншых. Але не адразу адважыўся паглядзець на яе — баяўся разбурыць рамантычнае ўяўленне.

Узяў талончык на прыём да неўрапатолага, апраўдаў сябе тым, што ёсць прычына — бяссонніца. Але прынімала другая ўрач, сівая даўгатварая жанчына. На развітанне спытаў баязліва:

— А Ірына Уладзіміраўна дзе? Не працуе?

— А вам трэба Ірына Уладзіміраўна? — падазрона паглядзела на пацыента, і вочы яе сталі халодныя. — Яна была ў першай змене.

А потым і яе вобраз пачаў аддаляцца, як і вобраз былой жонкі.

Сам пазваніць не адважваўся: раптам адкажа пляшывы.

І жыццё яго пачало ўваходзіць у халасцяцкую каляіну.

Ды ў дзень апошняга экзамена, калі ён вярнуўся дадому, стомлены і расслаблены, і бяздумна сядзеў на канапе, Ірына пазваніла сама.

Ён неахвотна ўзяў трубку — ні з кім з калег ці са студэнтаў, што праваліліся на экзамене, гаварыць не хацелася. J

— Слухаю.

— Гэта вы? — голас прыглушаны, задыханы. — Аксён Пракопавіч?

— Ды я, уласнай персонай. А вы хто?

— Ірына Уладзіміраўна, — і, здалося, голас сарваўся.

Аксён умеў скінуў прафесарскі панцыр і быццам пракаўтнуў нешта вельмі смачнае. Закрычаў не сваім басавітым голасам — фальцэтам:

— Ірына? Ірына! Праўда, вы?

— Я... Я... Як вам жывецца, Аксён Пракопавіч?

— Ды жыву! Жыву! Сёння апошні экзамен прыняў.

— І цяпер адзін дома?

— Адзін! У гордай адзіноце. Пераварваю формулы і... лес свой...

Яна памаўчала, але ён чуў яе перарывістае дыханне.

«Чаму яна так хвалюецца?»

— Ірына! Ірына!

— Я слухаю, Аксён Пракопавіч.

— Не знікайце!

— Я не знікаю. Але мяне душаць слёзы. Я не находжу сабе месца. Пазаўчора я... я, — і зноў паўза, — развялася са сваім... Вы далі мне сілу волі...

— Дык чаму ж вы плачаце? Радуйцеся!

— Каб я магла радавацца... Вы радаваліся? Вы напіліся...

— Ад глупства свайго. Ірына! Алё, алё! Дзе вы там?

— Я слухаю.

— Ірына! Ірына! Давайце сустрэнемся!.. Зараз жа! Неадкладна. Я прыеду да вас... у Купалаўскі сквер.

Згодны?

— А не позна?

— Не позна! Глядзіце, яшчэ не сцямнела. Праз паўгадзіны буду каля вас. Выходзьце!..

— Каля лебедзя?

— Каля лебедзя!

Трубку паклаў не адразу, чакаў, што яна яшчэ скажа. Не, гудкі!

Ліхаманкава пачаў апранацца. Збег па лесвіцы што на пажар. Захваляваўся, што няма тралейбуса. А навошта тралейбус, які будзе цягнуцца больш за паўгадзіны! А Ірына чакае. Пачаў «галасаваць».

У машыне падумаў з вясёлым гумарам, што ніколі так не спяшаўся на спатканні — ні на першыя, у дзевятым класе, ні да Ядзі.

Ірыны не было каля хлопчыка з лебедзем. Гэта спалохала. Пажартавала? Не, не магла яна жартаваць!

Прагна ўдыхаў вільгаць ад пырскаў. Але праз колькі хвілін фантан выключылі. Цямнела, але ў цемры ярчэй гарэлі ліхтары. І ён пабег ёй насустрач.

Яна першая схапіла яго за дзве рукі.

— О Божа! Добра, што вы... — не адразу сказала: — Ёсць.

— Добра, што вы ёсць.

— Я не знаходзіла месца. Я мушу застацца ў кватэры... а куды пайсці?.. пакуль не разменяем... Ен паехаў на дачу. Але ў п'янага ў яго самыя нечаканыя фантазіі. Ён мог вярнуцца. А ён дурны п'яны.

— Цяпер ён не кране вас.

— Рукамі — не, хоць даваў волю і рукам. Але словаМі... Я перадрыжэла перад разводам. Мне стала лягчэй, калі ўсё скончылася, а ён вылаяў мяне, абразіў, і я ўвесь астатні дзень праплакала. О, каб вы ведалі, што я перажыла!..

— Я разумею... — і пачаў расказваць пра свой развод.

Яна маўчала, выпусціла адну яго руку і не выпускала другую, як выратавальны круг.

Яны прайшлі з цэнтральнай алеі на бакавую, дзе менш святла.

— Калі вы баіцеся, я магу пайсці да вас.

Ірына выпусціла яго руку і адхіснулася.

— Ды вы што! Як можна! Вы абражаеце мяне.

Аксён засмяяўся.

— Не бойцеся. Я не кусаюся. Я вельмі рахманы. А хочаце, пойдзем да мяне.

— Не, не! Што вы! Я не думала, што вы такі...

— Я не такі, я нармальны. Я нармальны чалавек. Давайце пяройдзем на «ты», і я скажу табе такое...

— Што? — яны стаялі пад ліхтаром, і ён убачыў у вачах яе цікаўнасць, а вусны дрыжэлі.

— Добра, я скажу... Давай заўтра пададзім заяву.

Ірына на міг як акамянела. Потым уткнулася тварам яму ў грудзі; ён асцярожна падтрымаў яе за плечы, якія не ўздрыгвалі ад плачу і не напружваліся ад радасць Доўга маўчала, потым уздыхнула, адхілілася, спытала:

— Вы сур'ёзна?

— Я жрэц сур'ёзнай навукі, — пажартаваў ён.

— Ты — жрэц, — згадзілася яна. — Але што скажуць мае калегі? Што падумаюць! Яны шкадавалі мяне. А я праз тры дні пасля развода зноў збіраюся замуж? Не, Аксён. Я заўтра аформлю адпачынак, паеду ў вёску да свайго сыночка, да мамы. Трэба перажыць. Трэба вынасіць сваё новае каханне... як дзіця.

— Не дзевяць жа месяцаў, — пажартаваў Аксён.

— Не, не дзевяць.

Яны доўга хадзілі, расказваючы адно аднаму чамусьці пра сваё маленства, пра свае студэнцкія гады, і быццам спатыкаліся, калі размова падыходзіла да шлюбаў, — не хацелі называць сваіх былых. Пераходзілі на размову пра матэматыку, пра медыцыну.

Стаміліся, селі на лаўку, і тут яна дазволіла пацалаваць сябе.

Цалаваліся да світання. І смяяліся, што яны — як упершыню закаханыя.

Вяселле адбылося ў жніўні, без шлюбных атрыбутаў. Толькі сведкі: у яго — Алег Гукавец, у Ірыны — яе стрыечная сястра Люда. Да яе ж і паехалі пасля рэгістрацыі, яе маці накрыла святочны стол. Выпілі ажио чатыры пляшкі шампанскага. І гэта было іх вяселле! А праз тры дні (пуцёўкі Аксён узяў загадзя) паехалі на Нарач. У іх быў незвычайны мядовы месяц: абое, перажыўшы крушэнне, не спадзяваліся, што жыццё можа падарыць столькі шчасця і радасці. Праўда, Аксён хваляваўся за Ірыну: яна плавала, што дэльфін, і заплывала ледзьве не на сярэдзіну возера. Хаця плавала не адна — з майстрам спорту, —

рэўнасці ён не адчуваў, а толькі баяўся за яе. Дні два дрыжэў, сігаючы па мастках, узіраючыся ў бліскучую водную гладзь, на якой нырала чырвоная шапачка. Прасіў, маліў не заплываць так далека. Абяцала і... парушала слова, паддавалася азарту. Пабіць хацелася спартсмена, які падбухторваў.

— Паплывём, Ірына Уладзіміраўна?

— Мне муж не дазваляе.

— Аксён Пракопавіч, ды вы проста феадал. Не бойцеся. Жонка ваша выдатная плыўчыха. Каб гадоў на дзесяць раней, я зрабіў бы з яе рэкардсменку.

Мужа яна ні разу не ўпікнула, што перад людзьмі праяўляе сваю ўладу, хоць чула, што з яго пасміхаюцца. Яе цешыў такі яго клопат, страх за яе. Але, перапоўненая шчасцем, яна набыла сваю даўно забытую дзявочую гарэзлівасць. Ён уступіў ёй: шчодра ўзнагародзіў дзяжурнага чаўночніка, аматара чаркі Юзіка, каб той плыў за імі на чаўне.

Ірына сказала:

— Хітруган ты, пан прафесар. Але мне прыемна твая хітрасць, — і пацалавала.

Ёй амаль усе з адпачываючых былі знаёмыя, і яна арганізавала вясёлую валейбольную кампанію, якая ўвечары ператваралася ў «шашлычную»: ішлі на паляну, смажылі шашлыкі, пілі віно.

Да Ірыны жанчыны адносіліся прыветліва, але раўніва: яна была каралевай баляў, заўсёды знаходзілася ў цэнтры ўвагі. Загарэлая, яна сапраўды стала падобная на крэолку. Пасол лацінаамерыканскай краіны, які прыехаў адпачываць, звярнуўся да яе па-іспанску. З гэтага весела смяяліся, расказвалі, як анекдот.

Аксён пашкадаваў, што так хутка праляцеў тэрмін пуцёўкі — залатыя тры тыдні. Сапраўды залатыя, незабыўныя, як ні адзін адпачынак за яго жыццё — на Каўказе, у Крыме, у Балгарыі...

Ірына не шкадавала курорта, бо імкнулася ў новае падарожжа, якое хвалявала шмат мацней.

Паехалі ў вёску, да яе бацькоў. У аўтобусе Ірына сказала:

— Я хвалююся, Сеня. У мяне грубаваты бацька... не крыўдуй, калі ён скажа штосьці не так.

— Пра што ты кажаш, Іра! У мяне тоўстая скура, яе не прабіць словамі. І я не з паноў — з той жа вёскі, знаю я нашых людзей. У іх, бывае, вырываюцца крутыя словы, але ў іх добрая душа.

— Ты ўсё знаеш.

— Усяго не знаю. І людзей не знаю, інакш раскусіў бы...

— Не трэба, Сеня, — Ірына сціснула яго рукі — так кожны раз, калі ён з якой нагоды ўспамінаў былую жонку. — Не забывай: мы, бабы, хітрыя. Мы такое племя...

— Сябе не далучай да гэтага племя.

Яна засмяялася.

— Ты ідэалізуеш мяне. Глядзі, расчаруешся...

— О не! Ніколі!

— Які ты ўпэўнены!

— Я ўпэўнены? Ды я ў задачах сваіх сумняваюся. Толькі ў табе я ўпэўнены.

Бабуля, якая сядзела наперадзе, павярнула галаву, з добрай усмешкай сказала:

— Вы — як галубкі. А немаладыя ўжо. Ты татарка, бабанька?

Ірына засмяялася і сказала:

— Можа, і татарка. Да Любані даходзілі татары. Крымскія. Можа, які і ўпадабаў маю пра-пра-прабабулю. Але я беларуска. І прозвішча маё бацькоўскае беларускае — Шаплыка.

— Ва ўсіх нашых татар беларускія прозвішчы, — сказаў інтэлігентны мужчына цераз праход.

Паўсалона ўцягнулася ў размову: дакуль даходзілі татары, якія, дзе іх білі, дзе яны нашых білі. Дасведчана спрачаліся інтэлігент і хлапчына ў паношаным спартыўным касцюме, мабыць, студэнт, што ехаў памагчы капаць бульбу. Іх слухалі — гісторыкі! вучоныя!

— А я гэтага не ведаў, — прызнаўся жонцы Аксён Пракопавіч. — Які я невук! Вернемся — праштудзірую гісторыю. Не адзін падручнік...

— На ўсё не хопіць часу. Займайся сваёй матэматыкай.

— Не, ты не знаеш, які я зацяты. Калі чаго не ведаю — не засну. Пасярод ночы чытаю.

Ірына горача дыхнула мужу ў вуха, прашаптала:

— Не бойся, са мной ты будзеш спаць, — і зноў засмяялася, ажно інтэлігент цераз праход коса зірнуў на яе: не цікавіцца дамачка гісторыяй, пэўна падумаў: «Хіба такой красуні да гісторыі».

А Ірына сапраўды першая адключылася ад гісторыі і яго адарвала:

— Пагля дзі, які бярозавы гай! Цуд! Як гарыць...

Паабапал шашы стаялі бялюткія бярозы — як нявесты. Іх кроны восень ужо пазалаціла, але яшчэ засталося і зялёнае лісце.

Ад захаплення ў Аксёна заняло дыханне: даўно яго не craналі гэтак родныя краявіды. Ірына дала яму адчуванне прыгажосці прыроды — там, на Нарачы, і тут, на яе зямлі. На яе... Недалёка і яго

зямля: колькі засталося да Хойнікаў! Веска яго не выселена, але калі наведваў бацькоў, борам не захапляўся, думаў аб небяспецы, побач з якой жылі блізкія: нельга збіраць ягады і грыбы, лавіць рыбу.

Праблемы з бацькамі не было. Уладзімір Іванавіч прыняў зяця як свайго аднавяскоўца, адразу на «ты»... І маці... Не, Любоў Андрэеўна ў першыя хвіліны пільна разглядала зяця.

— Што ты так любуешся ім, мама? — засмяялася Ірына.

— Вы праўда прафесар?

— Прафесар, прафесар, мама.

— А я спалохалася, калі ты напісала. Падумала: стары, з сівой барадой... Як у кіно. А вы такі малады. І прыгожы.

— Дзякуй.

Пасмяяліся,

Цяжэй ішло знаёмства з Ірыніным сынам Уладзікам.

Яго не было дома. Ірына пайшла шукаць. Доўга не прыходзіла. І Аксён адчуў, што хвалюецца. Не разумеў чаму. Перад сустрэчай з прэзідэнтам так не хваляваўся, як перад сустрэчай з дзіцем. Урэшце Ірына прывяла сына — светлавалосага хлопчыка, зусім не падобнага на яе. Праз акно ён бачыў, як яна абтрасала хлопчыка, прыхарошвала.

Сказала ў хаце:

— Уладзік, гэта твой тата.

Пяцігадовы чалавек набычыўся, глянуў з-пад ілба і рашуча адказаў:

— Ета не мой тата.

Ірына пачырванела, у бабулі на вачах з’явіліся слёзы. А дзядуля сказаў:

— Ды не мучце вы яго, дайце чалавеку асвоіцца.

Уладзік пацяплеў, калі атрымаў цацкі — цэлую торбу: паравозы, аўтамабілі, ракеты, пісталеты і сур'ёзныя звяры — мядзведзь, леў, слон.

Выказаў сваё захапленне:

— Ух ты! Віцька лопне... Мама, а можна лялька даць Зінцы?

— Можна, сынок, можна. Ты добры хлопчык.

На другі дзень, у суботу, выбіралі бульбу: да сарака сотак гарода ўзялі яшчэ паўгектара зямлі далека ў полі. Трэба жыць! І дзецям памагаць, якія ў гарадах, на зарплаце; трое інстытуты кончылі — урач, інжынер, настаўніца, а без бацькоўскай бульбы бадай галадалі б.

А ў нядзелю — нават Ірына не высветліла, па чыёй ініцыятыве — сабралася чалавек дваццаць сваякоў, суседзяў. Вяселле. Калі маці нагатавала? А можа, ёй няцяжка было, бо сваякі прыносілі сваё — вяндліну, пірагі, масла, смятану. Пілі, елі. Спачатку стрымана, мабыць,

саромеліся новага зяця: прафесар! А пад хмелем разышліся. Ірыніна сястра крычала:

— Ірка! А ты добрага мужыка сабе ўхапіла! Той, пляшывы, мне не прыглянуўся... Цалавацца лез, слюнявы. Я чуць яму не заехала. Казалі, што ён міністр. Праўда? А прафесар — лепш! Калі не барадаты. Не люблю барадатых. Мой Косцік у дваццаць бараду адрасціў. Дурная мода! Хацела яго, соннага, абстрыгчы.

А мужчына, дзядзька Васіль, лез з іншым:

— А што ён у цябе п'е, як певень? Такі дуб, а п'е напарсткамі. У нас так не п'юць. Глушаць яе, заразу, стаканамі.

Ірына сарамліва пасміхалася, як Аксён весела смяяўся — ён любіў сялянскую шчырасць. І выпіўшыя сяляне не здаваліся яму такімі брыдкімі, як гарадскія заўсёднікі піўных павільёнаў.

На трэці дзень шчырай працы, падчас пагрузкі мяшкоў на трактарны прычэп у Аксёна скруціла паясніцу.

Лячылі: цешча клала гарачыя цагліны, Ірына рабіла масаж і ездзіла ў Любань за лекамі. Прымусіла сядзець дома.

У час гэтага «вялікага сядзення» ён паразумеўся з Уладзікам. Сам не ведаў пра свой талент выхаваццеля. Але прыгадаў сваё школьнае захапленне: майстраваў цацкі, лялькі з усяго, што было пад рукой: з дрэва, бяросты, шышак, з паклі, саломы, анучак.

Уладзік любаваўся з яго ўмення, весела выгукваючы:

— Ух ты! Майстра ты, Аксён!

Паясніцу вылечылі.

Канчаліся адпачынкі. Цягнула ў аўдыторыі. Ірына прызналася, што яе не вельмі цягне ў паліклініку.

— Я люблю сваю працу. Але мне так спадабалася на курорце і тут, дома. Ніколі не думала, што чалавек можа мець столькі шчасця, колькі мела я ў гэтым незабыўным месяцы. Ці паўторым мы яго?

— Паўторым, Іра, паўторым. Цяпер яно заўсёды будзе з намі, наша шчасце.

Хацела забраць з сабою сына. Але бабуля гатова была легчы на парозе.

— Пакуль у школу не пойдзе — не аддам!

І дзядуля ажно праслязіўся.

Хлопчык разрываўся паміж маці і бабуляй. Пра горад у яго не захавалася ўспамінаў. А тут, у вёсцы, — казка. Але — мама...

— Мамачка, а ты не забудзеш мяне?

— Сыночак мой маленькі, як жа я забуду цябе? Крывіначка мая!

У аўтобусе ў пачатку дарогі Ірына часта даставала насоўку.

— Іра, не хлюпай носам, а то высаджу, — пажартаваў Аксён.

Яна прытулілася да яго пляча, адчула яго сілу, яго цеплыню і ажыла. Асцерагалася, каб не перадаць смутак яму: ён павінен быць вясёлы, бо яго весялосць, якую назірала ў санаторыі, у бацькоў, — яе шчасце. У іх жа зусім іншае жыццё, чым было ў яе з тым... І яна павінна зрабіць усё магчымае, каб яно заўсёды заставалася такім.

Спытала ў Аксёна:

— Хто сказаў: «Свята, якое заўсёды з намі»?

— Хемінгуэй.

— Ты ўсё знаеш! — і пацалавала яго ў шчаку, не саромеючыся пасажыраў.

6

У першы ж дзень працы Ірына прынесла навіну: у іх паліклініку сыходзяцца плёткі з усяго горада.

Яна прыйшла позна, калі Аксён працаваў пры святле настольнай лямпы. Заглянула ў пакой, уключыла люстру.

— Не сляпі вочы. У гэтым начніку трэба памяняць лямпачку. Эканоміць не будзем, — яна гэта часта паўтарала, аднак сама эканоміла — на сабе, на харчы і на адзенні, што было предметам іх любоўнай спрэчкі.

Нядоўга мыла рукі; звычайна даўжэй, як перад аперацыяй, з мылам і шчоткай; Аксён жартаваў з гэтай яе павышанай прагі да чысціні. Села з другога боку стала, хоць рэдка так садзілася, калі ён працаваў: старалася нічым — ні словам, ні рухам — не перашкодзіць яму.

Аксён глянуў на яе і па бляску вачэй, па ўзбуджанасці зразумеў, што ёй не церпіцца нешта расказаць.

— Хочаш, я здзіўлю цябе?

— Толькі не вельмі. Каб не пашкодзіла працы. Я пішу праграму для ВНУ.

Ірына нервова засмяялася:

— Дык слухай жа... Мой ажаніўся з тваёй...

— Цябе гэта здзівіла? Мяне — не. Як казала мая маці: два чобаты — пара. Здзівіла іншае: «мой», «твая»... Іра! Мая былая, твой былы. І Бог з імі. А цяпер ты мая...

— А ты мой. Не, мяне не здзівіла. Пацешыла. Камедыя! Памяняліся жонкамі. Ці, наадварот, мы памяняліся мужамі. Такога Мальер і Чэхаў не прыдумалі. Аднак чаго ў жыцці не бывае. Будуць яны верныя адзін аднаму, як думаеш? Няма з маіх калег нікога блізкага хоць да аднаго з іх...

— Цябе цікавіць, як яны будуць жыць?

— Цікавіць? Не, не цікавіць. Я знаю... Сумленне ў іх... у яго і ў яе...

— Кожны атрымаў, што заслужыў. Я — скарб, якога, можа, і не заслужыў...

— Што ты, Сеня! Ды і што я... прызнаю, што я скарб? Не лічы мяне скарбам!

— Лічу...

— Ты ўпарты.

— Я ўпарты толькі ў працы і ў каханні да цябе.

— Ты прымушаеш мяне чырванець.

— Давай забудзем іх.

— Давай, я забыла, я даўно забыла, — горача запэўніла Ірына. — Мне смешна стала. А смешнае заўсёды цікавае.

— Што ж, я таксама пасмяюся.

Больш яны не вярталіся да гэтай навіны ні ў той вечар, ні ў наступныя дні.

Надыходзіў Новы год. Але надвор'е было зусім не снежаньскае: у шыбы вокнаў барабаніў дождж.

Аксён Пракопавіч сядзеў у «зале» за пparticlesасторным сталом — не тое, што кухонны, — і пісаў, абклаўшыся кнігамі, часопісамі, рукапісамі, падручнік па вышэйшай матэматыцы. Праца захапляла, бо занатоўваў усе навейшыя адкрыцці ў гэтай галіне — вучоных свету і свае ўласныя.

Ірына сядзела ў мяккім крэсле і вязала. Яна любіла вязаць, нейкі час рабіла гэта на кухні ці ў спальні. Але прафесар адкрыў новую «формулу»: яму лепш думаецца, калі жонка побач. Яна ніводным словам не перапыняла яго думак, але ён чуў, як яна, зусім па-дзіцячаму, ціха сапіць сваім курносым носікам. У вогуле ёй хацелася, каб ён спыніў працу: занадта ўжо зацята сядзіць, стамляецца.

Ён ведаў, што яна чакае, калі ж нарэшце ён адарвецца ад сваіх формул. Дарэчы, яна цікавілася напісаным і шмат у чым разбіралася — на ўзроўні студэнтаў другога курса, і ён ахвотна тлумачыў ёй вялікія мудрасці сваёй навукі.

Ірына ніколі не дазволіла сабе ўключыць тэлевізар, нават калі муж чытаў газету. Але ён штодня абмяркоўваў з ёю праграму перадач, і яны разам выбіралі фільм ці канцэрт, які будуць глядзець. У іх аднолькавыя густы: любілі канцэрты, музыку і не любілі баевікі, хоць мусілі іх глядзець, бо яны часта ішлі па ўсіх праграмах. Што робяць бацькі, у якіх дзеці ва ўзросце, калі ўсё гэта захапляе? Ірына перажывала:

— Няўжо і там, дома, глядзяць гэта?

— Ты думаеш, для вёскі асобая праграма?
— Загубіць нас цывілізацыя.
— Разумныя людзі знойдуць сродкі абароны ад такой, з дазволу сказаць, цывілізацыі.
— Ты аптыміст. А я...
— Не скажы, што ты песімістка. Не дазволю!
— Новы муж — грозны муж.
Не цытавала Пушкіна дакладна, каб не ўспамінаць старога мужа; пасля таго як прынесла навіну, ні разу не ўспамінала, жыццё з ім — што дурны сон.
Аксён глянуў на гадзіннік.
— Прабач, Ірыначка, помню, што пачаўся канцэрт. Але хвілiначку. Я запішу некалькі думак, а то за ноч магу забыць.
— Пра што ты кажаш! Канцэрт можна глядзець і з сярэдзіны. Ды хіба іх мала яшчэ будзе, канцэртаў! Усе не перaслухаеш...
— Я зараз, я зараз...
Настойліва зазванілі ў дзверы. Ірына ажно ўздрыгнула.
— Хто гэта ў такі час?
Аксён хутка пайшоў да дзвярэй, паглядзеў у вочка. Убачыў выцягнуты твар аднаго чалавека. Не пазнаў — хто. Але аднаго не баяўся — адчыніў. І тут жа з трэскам зачыніў, не баючыся стукнуць дзвярамі па лысіне няпрошанага госця, які нахрапам лез у кватэру.
— Хто там? — гукнула Ірына.
У Аксёна перасохла ў горле і моцна загрукала сэрца.
— Памыліўся...
Але яна не чула ніякага дыялога паміж гаспадаром і тым, хто памыліўся кватэрамі, і выйшла ў прыхожую, уключыла святло. Глядзела на мужа з насцярогай і бадай са страхам. Здагадвалася. Позіркам спытала: «Ён?»
Аксён крутнуў галавой:
— Не.
«Не казаць ёй? Можа, няпрошаны госць зразумеў, што яго не пусцяць, і пойдзе...»
Не, зноў доўгі званок і грукат кулаком у дзверы.
— Адчыні!
Аксён, моцна ўстрывожаны, глянуў на жонку. Яна стаяла, прытуліўшыся да касяка, і твар яе змярцвеў. Куды падзелася смуглявасць! Пасінелыя вусны прашапталі:
— Божа мойЁ
Аксён злосна крыкнуў:
— Што табе трэба?

— Аддай маю жонку, гад! Зладзюга! Ты ўкраў маю жонку!

— Ты памыліўся адрасам, Камяк! Няма тут тваёй жонкі! Твая жонка на Купалы. Дарэмна ты так далёка ехаў.

— То не мая жонка. То твая. Аддай маю!

Аксён крыкнуў са злосцю — такой, якую бадай ніколі не праяўляў за ўсё жыццё.

— Пайшоў прэч! А то спушчу цябе з лесвіцы! Стукнулі дзверы суседняй кватэры. Жанчына нешта сказала — не разабраць. Камяк мацюкнуў яе. Тады яна сказала выразна:

— П'яная свіння! — і ляпнула дзвярыма.

— Чуў, Камяк, як прыстойныя людзі цябе называюць? Пасаромейся! У міністры лезеш. Вучоны юрыст!

— Аддай, гад, маю жонку! А то я разнясу твае дзверы!

— Яшчэ раз грукнеш — я выклічу міліцыю. І ты вылеціш са свайго міністэрства без парашута!

— Дзе Ірка? Пакажы мне Ірку! Няхай яна скажа!.. На каго яна прамяняла мяне?.. Мяне! Ды ты знаеш, хто я?

— П'яны дурань.

— За абразу я на цябе падам у суд.

— Давай, давай. Найцікавейшы працэс будзе. Хвіліну «госць» перад дзвярыма бубніў нешта неразборлівае, потым сказаў плаксівым голасам:

— Ах, вы так? Дык я лягу перад вашымі дзвярамі і... памру. Памру! Няхай людзі скажуць...

Што скажуць людзі, Аксён Пракопавіч не пачуў, бо Ірына ўчапілася ў яго рукаў, адвяла ад дзвярэй, горача зашаптала:

— Сеня, ён сапраўды можа легчы, п'яны ён, што вар'ят... дурны. Калі ён ішоў ад тралейбуснага прыпынку, то прамок. А ў нас у пад'ездзе скразняк. А ў яго мінулай зімой было запаленне.

— Добрая душа. Дык, можа, адчыніць яму? І падставіць яму морду? Няхай б'е. Некалі хацеў пабіць яго... І ад гэтага п'янага жадання атрымаў шчасце — цябе.

— А што рабіць? Што?

Камяк змоўк, але гукі за дзвярамі засведчылі, што ён сапраўды лажыцца.

Тэлефонны апарат стаяў у прыхожай на палічцы. Аксён Пракопавіч набраў нумар і гучна крыкнуў:

— Міліцыя!

Ірына павісла на яго руцэ.

— Не трэба, Сеня, не трэба!

Ён прашаптаў:

— Не перашкаджай. Я набраў нумар сваёй кафедры.

У яе здзіўлена расшырыліся вочы. А ён зноў гукнуў:

— Міліцыя! Да нас у дзверы ломіцца п'яны хуліган. Пагражае. Хто гаворыць? Прафесар Крапіўка. Наш адрас... Выязджаеце? Прашу хутчэй! Я бяссільны даць яму адпор. І суседзі баяцца.

Ірына прытулілася да яго.

— Які ты вынаходлівы.

— Цішэй. Чуеш?

За дзвярыма пачулася крахценне, лаянка, а потым, сціхаючы, злыя крокі на лесвіцы — Камяк уцякаў.

— Нахабнік і трус!

Ірына нервова засмяялася.

— Перашкодзіў дапісаць старонку. Ну, ды Бог з ёю. Будзем слухаць музыку. Яна супакойвае. Пра яго забудзем.

Нейкі час глядзелі і слухалі канцэрт моўчкі.

Але Ірына не стрымалася, уздыхнула.

— Баязлівец і ... п'яны дурань. Але мне шкада яго. Несаладка, відаць, з Ядвігай...

— Выкінь з галавы, Іра! — бадай сурова загадаў Аксён.

Яна сцялася, захуталася ў пуховую хустку.

— Я даўно забылася. Даўно. І каб ён не з'явіўся...

— Не верадзі душу. Ты ж добра знаеш фантазію п'яных.

— Яго фантазіі я знаю. Перад суседзямі няёмка.

— Растлумачым. Няхай пасмяюцца. З нас смяяцца не будуць. Бачаць, як мы жывём.

— Дзякуй табе, Сеня.

— Табе дзякуй, Іра, — павярнуў галаву і пацалаваў яе шчаку, да якой вярнулася заўсёдная смуглявасць. Яна ўзяла яго руку і пацалавала, чым збянтэжыла яго, хоць цалавалі яны рукі адно аднаму сотні разоў. І стольки ж прызнаваліся ў каханні — як юныя. І на гэты раз Ірына не ўстрымалася:

— Я люблю цябе, Сеня.

— А я дзякую Богу, што ён падарыў мне тваё каханне.

## 7

Аксён Пракопавіч выйшаў з двара бальніцы і ўбачыў сваю былую жонку. Ядвіга спускалася з ганку прыёмнага пакоя з пакетам у руцэ.

У яго не было ніякага жадання сустракацца з ёй, але сутыкнуліся тварам у твар — не схаваешся.

— А, Аксён! — бадай радасна выгукнула жанчына. — Здароў, прафесар!

— А-а, ты, — ён як бы здзівіўся. — Наведвала кагось?

— Не. Сама выпісалася.

— Хварэла? Што з табой?

— Ты не ведаеш, з чым ляжаць у гэтай бальніцы? Калі была з табой, я двойчы аказвалася тут — у «камандзіроўках». Ад цябе тайна. Ты — карась-ідэаліст, не зразумеў бы. А ты чаго аціраешся каля бабскай бальніцы?

— Я? — на хвіліну завагаўся: казаць? не казаць? А чаму не сказаць пра радасць сваю! — Я... мне толькі што Іра праз акно паказала дочачку нашу, тры дні назад нарадзілася. Вылітая Ірачка.

Ядвіга пазелянела і як бы збянтэжылася. Але на міг. Тут жа саркастычна хмыкнула:

— Ты робішся бабай, пан прафесар. «Вылітая Ірачка!» Ірачка! Якая сентыментальнасць! Усе бацькі такія слюнцяі?

— Чаму ты такая злосная? Зайздросціш?

— А чаму мне радавацца?

— Табе нявесела жывецца?

— Вельмі весела.

— А весялосць і ёсць радасць.

— Зануда ты, Аксён. «Вылітая Ірачка»... Ха!

— Ірыну не чапай.

— Цаца-цаца. Парадзіха па-за падазрэннем, як каралева. Маўчу. Але пачастуй мяне.

— Чым?

— Я хачу выпіць. А ў мяне няма грошай. Мама не перадала. Мяне цягне выпіць!

— Не зрабіся алкагалічкай.

— А можа, я ўжо стала ёю. У пад'ездах, праўда, не валяюся. Дама рэспектабельная... Але выпіць люблю. Хіба пры табе я не піла? Святы адзін ты... Усе астатнія грэшныя.

Хацеў сказаць, што ў яго няма грошай, але пабаяўся, што яна можа вылаяць яго, сапсаваць радасны настрой. І трохі шкада яе стала. Ды і ўрэшце, чаму і яму не выпіць чарку каньяка ці бакал віна за сваю Славяначку... Імя прыдумала Ірына, але яму спадабалася.

Пайшлі ў бок Вяснянкі.

— У цябе не цяжкая торба? Дай я пранясу.

Аддала.

— На, нясі. Некалі ты мяне насіў на руках.

— Я — насіў?

— Забыўся? Кароткая ў цябе памяць, прафесар. Формулы не забываеш?

— Не забываю.

— А я думала, Ірачка зацьміла тваю памяць. «Вылітая Ірачка!» Чуеш, чайкі рагочуць?!

Ішлі па мосце праз Свіслач. Над вадасховіш^ім лятал! чайкі, як бы ўстрывожаныя нечым. Была другая палова дня, але чэрвеньскае сонца стаяла яшчэ высока і пякло няшчадна.

Аксён пачуў, што Ядвіга цяжка дыхае.

— Дарэмна ты хочаш выпіць.

— Шкадуеш грошай?

— Грошай не шкадую. Цябе шкадую.

— Чаго мяне шкадаваць? Я яшчэ маладая. Ведай гэта, мой незабыўны. Павер: я цябе не забываю. Ты — чала-век!..

— Дзякуй. Такой атэстацыі я яшчэ не меў. Чалавек! Гучыць горда!

— Ты і з Ірачкай так размаўляеш?

— Не, не так.

— Здагадваюся, як ты сюсюкаеш. «Вылітая Ірачка!»

— Нам усё ж лепш развітацца.

— Не! Я хачу выпіць!

Не адразу знайшлі, дзе даюць у разліў. Ядвіга лаяла гандаль.

Спыніліся на вуліцы каля магазіна. На сонейку стаял! столікі.

— Табе што?

— Любой атруты, толькі мацнейшай.

Аксён заказаў ёй брэндзі, сабе — віна. Яна ўпікнула:

— Ты ўсё ж баба.

— Гэта мяне не абражае. Баба дык баба. Мая маці называе сябе бабай.

Пацешыўся, што рука ў яе не задрыжэла, калі яна падняла шклянку, і не выпіла залпам, як алкаголікі, піла маленькімі глыткамі — смакавала. З выпітым знікала бледнасць, смутак у вачах, яна набывала ранейшы выгляд прыгожай жанчыны.

— Як ты жывеш, Ядвіга?

— З кім?

— Ды з тым... Донжуанам...

— З пляшывым катом, хочаш сказаць...

— Я не абражаю і ворагаў...

— Які ён твой вораг! Лічы, сябра. Падарыў табе Ірачку.

— Кпі, але без злосці. Іру мне падарыў Бог.

— Во як! А мне хочацца падпаліць увесь свет.

— Не трэба, Ядзя. На каго ты злуеш?

— На сябе. А рыцар той... Я даўно дала яму выспятка пад зад.

— Прабач. Ні слова больш... Я не лезу ў тваю душу.

— Можаш лезці — у ёй пуста.

Аксён паклікаў бармена, каб разлічыцца.

— Закажы яшчэ.

— У мяне мала грошай. Усё патраціў на пасаг Славяначцы.

— Каму?

— Славяне. Нашай маленькай.

— Што за імя?

— Прыгожае імя.

— Прыгожае, — згадзілася Ядвіга. — Я хачу яшчэ выпіць.

— Не магу.

— Зануда ты і скупердзяй. Пялюшачкі купіў! Ды твая квактуха нагатавала іх на другі дзень пасля шлюбу. Знаю я такіх...

— Ты толькі сябе не знаеш.

— Сябе не знаю. Дык не закажаш яшчэ?

— Не.

— Ну і чорт з табой, — паднялася і, не развітаўшыся, пайшла ў бок прыпынку.

Аксён Пракопавіч нейкі час глядзеў ёй услед з усмешкай на твары. З палёгкай уздыхнуў, разлічыўся і пайшоў у другі бок — да сваёй аўтобуснай лініі. Ішоў павольна, але яму здавалася, што ляцеў. На Ядвігу забыўся. Перад вачыма стаяла Ірына з маленькім ружовенькім чалавечкам на руцэ. Яна смяялася. Ён шаптаў іх імёны:

— Ірынка, Славянка.

Прахожыя недаўменна азіраліся на яго.

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

**ЗМЕСТ**

СЛАЎСЯ, МАРЫЯ!
ПОШУКІ ПРЫТУЛКУ
У ЗАСЕНІ ПАЛАЦА
ГУБЕРНАТАР
АБМЕН

Шамякін І.

Пошукі прытулку: Аповесці: Для ст. шк. узросту / Маст. У. М. Аніська. — Мн.: Юнацтва, 2001. — 350 с.

ISBN 985-05-0430-7.

У кнігу народнага пісьменніка Івана Шамякіна ўвайшлі новыя творы: аўтабіяграфічная аповесць «Слаўся, Марыя!», прысвечаная жонцы; «Губернатар», галоўнымі героямі якой з'яўляюцца сам губернатар і яго памочнік-пралаза, што змог арганізаваць яму і выбары, і «каханне», і яго ж забойства; «Пошукі прытулку» — пра пажылога чалавека, якому не было дзе прытуліцца на старасці гадоў; «У засені палаца» — пра сучаснага бізнесмена, і «Абмен» — пра цікавыя жыццёвыя калізіі закаханых.

УДК 882.6-93
ББК 84(4 Беи)6-44